# ХРЭСТАМАТЫЯ
## *па беларускай дзіцячай літаратуры*

# ХРЭСТАМАТЫЯ
# *па беларускай дзіцячай літаратуры*

Складальнік *М. Ф. Шаўлоўская*

Дапушчана Міністэрствам народнай адукацыі БССР
у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў педінстытутаў па спецыяльнасцях
«Педагогіка і методыка пачатковага навучання»
і «Педагогіка і псіхалогія (дашкольная)»

2-е выданне, перапрацаванае
і дапоўненае

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
1989

ББК 84 Бел я73
Х 95

Р э ц э н з е н т
канд. філал. навук В. А. Л а ш к е в і ч

В пособие включены произведения устного народного творчества, белорусской детской литературы дооктябрьского периода, белорусской советской литературы для детей.

Второе издание (1-е изд.—1984 г.) дополнено произведениями П. Бровки, П. Глебки, А. Пальчевского, П. Рунца, М. Калачинского, И. Науменко, М. Гомолко, П. Мисько, В. Зуёнка, А. Гречаникова и других писателей.

**Хрэстаматыя** па беларускай дзіцячай літаратуры: Вучэб. да-
Х 95 паможнік / Склад. М. Ф. Шаўлоўская.— 2-е выд., перапрац. і дап.— Мн.: Выш. шк., 1989.— 511 с.
ISBN 5-339-00176-8.

Хрестоматия по белорусской детской литературе.

У дапаможнік уключаны творы вуснай народнай творчасці, беларускай дзіцячай літаратуры дакастрычніцкага перыяду, беларускай савецкай літаратуры для дзяцей. Другое выданне (1-е выд.— 1984 г.) дапоўнена творамі П. Броўкі, П. Глебкі. А. Пальчэўскага, П. Рунца, М. Калачынскага, І. Навуменкі, М. Гамолкі, П. Місько, В. Зуёнка, А. Грачанікава і іншых пісьменнікаў.

Прызначаецца студэнтам педінстытутаў па спецыяльнасцях «Педагогіка і методыка пачатковага навучання» і «Педагогіка і псіхалогія (дашкольная)». Можа быць выкарыстаны студэнтамі-філолагамі, навучэнцамі педвучылішчаў і вучнямі сярэдніх школ.

Х $\frac{4602040000-027}{М\ 304(03)-89}$ 49—89 **ББК 84 Бел я73**

**ISBN 5-339-00176-8**

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1989

## АД СКЛАДАЛЬНІКА

Новае выданне «Хрэстаматыі па беларускай дзіцячай літаратуры», як і папярэдняе, прызначаецца ў якасці вучэбнага дапаможніка студэнтам факультэтаў дашкольнага выхавання і педагогікі і методыкі пачатковага навучання педінстытутаў. Перад складальнікам стаяла задача, арыентуючыся ў асноўным на гэту катэгорыю чытачоў, у адпаведнасці з вучэбнай праграмай адабраць з вялікага матэрыялу дзіцячай літаратуры найбольш істотныя, характэрныя не толькі для творчасці асобнага пісьменніка, але і для канкрэтнага літаратурнага перыяду тэксты мастацкіх твораў, каб даць выразнае ўяўленне аб гісторыі паступальнага, інтэнсіўнага станаўлення і развіцця беларускай літаратуры для дзяцей.

Ад папярэдняга другое выданне адрозніваецца перш за ўсё паўнатой матэрыялу. Павелічэнне аб'ёму хрэстаматыі дало магчымасць увесці ў дапаможнік 26 новых раздзелаў, прысвечаных творчасці пісьменнікаў розных літаратурных перыядаў. Цяпер студэнты змогуць пазнаёміцца, напрыклад, з арыгінальнай, самабытнай творчасцю Алеся Гаруна, з узорамі творчасці старэйшай беларускай пісьменніцы Зоські Верас, з навейшымі мастацкімі творамі сучасных пісьменнікаў, што пішуць для дзяцей (В. Зуёнка, Б. Сачанкі, А. Грачанікава, Д. Бічэль-Загнетавай і інш.). Пашыраны ў новым выданні раздзел вуснай народнай творчасці, новымі творамі папоўніліся раздзелы, прысвечаныя асобным аўтарам, якія былі прадстаўлены ў хрэстаматыі раней (Я. Купалу, К. Чорнаму, Я. Брылю, В. Вітку, Н. Гілевічу, Э. Агняцвет, Р. Барадуліну).

Пэўныя ўдакладненні зроблены ў кампазіцыі дапаможніка: парадак падачы матэрыялу пастаўлены ў залежнасць ад пачатку літаратурнай творчасці пісьменніка.

У новым выданні хрэстаматыі, як і ў першым, даюцца кароткія біябібліяграфічныя даведкі, у якія ўнесены неабходныя дапаўненні і ўдакладненні.

Хрэстаматыяй па беларускай дзіцячай літаратуры могуць карыстацца не толькі студэнты факультэтаў дашкольнага выхавання і педагогікі і методыкі пачатковага навучання, а і студэнты філалагічнага і дэфекталагічнага факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, а таксама вучні сярэдніх школ.

# УСТУП

Беларуская савецкая літаратура для дзяцей вызначаецца высокім грамадзянскім пафасам і гуманістычнай накіраванасцю. Гэтыя яе рысы склаліся на аснове выкарыстання і развіцця лепшых традыцый вуснай народнай творчасці і класічнай літаратуры. Працоўны народ — таленавіты мастак і мудры педагог — стварыў нямала калыханак, пацешак, казак і песень, загадак, прыказак і прымавак, якія з даўніх часоў маральна і эстэтычна выхоўвалі падрастаючае пакаленне. Да жыватворных крыніц фальклору, мудрай народнай педагогікі звярталіся і сёння звяртаюцца пісьменнікі. Асабліва гэта прыкметна ў іх творах для дзяцей. У беларускай літаратуры фальклорныя традыцыі выяўляюцца ўжо ў вершах для дзяцей, напісаных Ф. Багушэвічам («Калыханка») і А. Гурыновічам («Каток», «Рыбак»).

Беларуская дзіцячая літаратура — самая маладая з усходнеславянскіх дзіцячых літаратур. Першыя значныя здабыткі яе адносяцца да пачатку XX ст., калі для маленькага чытача пачалі пісаць Цётка, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, З. Бядуля. Рэвалюцыйныя падзеі таго часу прымусілі царскі ўрад адмяніць забарону выдання кніг на беларускай мове, дазволіць навучанне дзяцей у нацыянальнай школе на іх роднай мове. Узнікла патрэба ў стварэнні вучэбных кніг. Такія кнігі неўзабаве з'явіліся. У 1906 г. пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» выдала першы беларускі буквар «Беларускі лемантар» — без прозвішча аўтара. У гэтай кнізе, акрамя азбукі, даваліся пачатковыя звесткі па граматыцы і тэксты для чытання. Кніга мела не толькі адукацыйнае, а і выхаваўчае і эстэтычнае значэнне. Важнай падзеяй стала з'яўленне падручнікаў-хрэстаматый «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі (1906) і «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа (1909), выпушчаных тым жа выдавецтвам. У чытанках змяшчаліся лепшыя фальклорныя творы, празаічныя і паэтычныя творы саміх аўтараў, напісаныя ў дыдактычных мэтах спецыяльна для гэтых выданняў. Цётка ў сваёй кнізе прапануе маленькаму чытачу малюнкі жыцця беларускай вёскі («Нядзеля», «Мая вёска»), апісанне прыроды («Лес», «Мой сад»). Улюбёна і зацікаўлена, з захаваннем этнаграфічнага каларыту паказаў сялянскі побыт, эмацыянальна і каларытна «ажывіў» прыроду Якуб Колас у «Другім чытанні...» («Вясковая дарога», «Палеская вёска», «Вясна», «Зіма», «Прылёт птушак» і інш.). Настаўнік па прафесіі, Якуб Колас разумеў, што літаратура мусіць не толькі вырашаць адукацыйныя задачы, але і выпрацоўваць у дзяцей самастойнасць мыслення, абуджаць і развіваць іх фантазію,

творчую думку. Таму ў адным з раздзелаў кнігі («Казкі») ён змяшчае фальклорныя творы, што вызначаюцца глыбокай народнай мудрасцю. Я. Колас вядзе юнага чытача ад пазнання простага да спасціжэння складанага, сацыяльна значнага (казкі «Дуб і чароціна», «Цяжкая доля», «Песня птушкі»). «Другое чытанне...» пісьменніка адыграла вялікую ролю ў пашырэнні асветы ў Беларусі ў дакастрычніцкі час, у станаўленні і развіцці беларускай нацыянальнай культуры, дзіцячай літаратуры.

Адной з найважнейшых у дакастрычніцкай творчасці беларускіх пісьменнікаў была тэма гаротнага, пакутлівага дзяцінства. Яна раскрываецца ў апавяданнях Цёткі («Міхаська»), З. Бядулі («Малыя дрывасекі», «Тулягі»), Я. Коласа («Дзеравеншчына», «Сірата Юрка»), дзе ў цэнтры ўвагі — абяздоленыя дзеці вясковай беднаты, чым і тлумачыцца выкарыстанне аўтарамі змрочных фарбаў пры абмалёўцы вобразаў. У той жа час у некаторых апавяданнях З. Бядулі («Дзе канец свету?», «Велікодныя яйкі») і Я. Коласа («У старых дубах») паказаны светлы жыццёвы пачатак, створаны вобразы цікаўных, дапытлівых дзяцей, якія вельмі любяць прыроду, умеюць знайсці ў ёй неразгаданае, таямнічае. Шчырасць, непасрэднасць успрымання маленькім чалавекам свету вельмі яскрава раскрываецца ў апавяданні З. Бядулі «Юлька».

Для дзяцей у дакастрычніцкі час пісаў і Максім Багдановіч. Яго казка «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык», створаная на фальклорнай аснове, паклала пачатак развіццю жанру паэмы ў беларускай дзіцячай літаратуры.

Традыцыі дзіцячай дакастрычніцкай літаратуры — сацыяльная накіраванасць, гуманістычны пафас, глыбокае пранікненне ў духоўны свет дзіцяці — жывуць і плённа развіваюцца ў савецкай дзіцячай літаратуры. З першых гадоў Савецкай улады Камуністычная партыя і Савецкі ўрад надаюць вялікую ўвагу праблемам развіцця літаратуры для маладога пакалення. У рэзалюцыі XIII з'езда РКП(б) (1924), у пастанове ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па паляпшэнню юнацкага і дзіцячага друку» (23 ліпеня 1928 г.) адзначалася неабходнасць стварэння высокамастацкіх твораў, якія б садзейнічалі камуністычнаму выхаванню моладзі.

У першае паслярэвалюцыйнае дзесяцігоддзе да юнай аўдыторыі звяртаюцца Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Уладзімір Дубоўка, Міхась Чарот, Янка Маўр, Андрэй Александровіч і іншыя беларускія пісьменнікі. Іх творы друкуюцца ў першых беларускіх савецкіх часопісах для дзяцей — «Зоркі» (1921—1922), «Беларускі піянер» (1924). Адчуваннем радасці жыцця напоўнены вершы Я. Купалы «Сын і маці», «Кароль», у якіх паэт услаўляе веліч рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Іх сэнс асабліва ярка раскрываецца, калі параўнаць іх з дакастрычніцкімі творамі Цёткі, Коласа, Бядулі пра трагічны лёс вясковых дзяцей. Пачэснае месца ў дзіцячай літаратуры 20-х гг. заняў верш Я. Купалы «Піянерскае», пафас, паэтыка якога ў многім ідуць ад верша «Арлянятам»; ён гучыць як страсны заклік да юнага пакалення быць у авангардзе будаўнікоў камунізму. Жыццесцвярджальнасць, мажорны тон увогу-

ле былі характэрныя для ўсёй тагачаснай савецкай паэзіі, бо кожны пісьменнік звяртаўся з палымяным паэтычным словам да юнага пакалення, агітаваў яго будаваць новы свет.

У 20-я гг. у дзіцячай літаратуры працягвае развівацца такі традыцыйны «дзіцячы» жанр, як казка. Праўда, некаторыя педагогі і пісьменнікі выказвалі думку аб непатрэбнасці і нават шкоднасці казкі ў выхаванні савецкіх дзяцей. Дыскусія па гэтым пытанні ўрэшце завяршылася перамогай тых, хто выступаў за развіццё казкі ў савецкай літаратуры. Неабходнасць выкарыстоўваць набыткі народнай казкі адзначаў, у прыватнасці, М. Горкі, які адстойваў права на фантазію і выдумку ў творах для дзяцей (артыкулы «Аб казках», «Пра безадказных людзей і дзіцячую кнігу нашых дзён», «Чалавек, вушы якога заткнуты ватай»).

У беларускай савецкай дзіцячай літаратуры традыцыі фальклору, у тым ліку казкі, і ў гэты час заставаліся надзвычай моцныя. У 1926 г., напрыклад, на старонках часопіса «Беларускі піянер» былі надрукаваны вершаваныя казкі Я. Коласа «Дзед і мядзведзь» і «Рак-вусач». Асабліва папулярнай стала апошняя, напісаная паводле сюжэтаў народных казак «Зайчыкі« і «Цяжкая доля», змешчаных у «Другім чытанні...». Алегарычным вобразам жыта, якое расказвае раку пра сваю нялёгкую долю і тым самым развейвае яго сум, услаўляецца і сцвярджаецца жыццё-подзвіг, самаахвярнае служэнне грамадству. У казцы паэтызуюцца фаўна і флора беларускага краю; тэма прыроды ў ёй цесна звязана з тэмай бацькаўшчыны. Казка «Рак-вусач» вызначаецца высокімі ідэйна-мастацкімі вартасцямі і садзейнічае выхаванню ў дзяцей патрыятычных пачуццяў. Я. Колас апрацоўвае і выдае асобнымі выданнямі такія народныя казкі, як «Воўк-дурань», «Два маразы», «Леў і воўк», «Зайчыкі», «Пчала і шэршань», «Як пеўнік ратаваў курачку», дзе ўслаўляюцца працавітасць і кемлівасць працоўнага чалавека, асуджаюцца сквапнасць, гультайства і іншыя заганы людзей.

У беларускай дзіцячай літаратуры 20-х гг. побач з вершаванымі паспяхова развіваюцца празаічныя жанры. Гістарычнае мінулае, героіка грамадзянскай вайны, сучаснае жыццё — вось змест празаічных твораў для дзяцей Я. Коласа, М. Лынькова, К. Чорнага, З. Бядулі, Я. Маўра, А. Якімовіча і іншых пісьменнікаў. Значнай падзеяй у літаратурным жыцці таго перыяду стала юнацкая аповесць Я. Коласа «На прасторах жыцця» (1926), у якой паказаны актыўны ўдзел савецкай моладзі ў будаўніцтве новага жыцця. Сцёпка і Аленка, галоўныя героі твора, радасна ўспрымаюць тыя змены ў жыцці краіны, што прынёс Вялікі Кастрычнік. Яны адчуваюць адказнасць за лёс разняволенай Радзімы, настойліва авалодваюць ведамі (заканчваюць школу, вучацца на рабфаку), непасрэдна ўдзельнічаюць у стваральнай калектыўнай працы. Аўтар надзяліў іх лепшымі рысамі характару, уласцівымі савецкай моладзі той пары. У гэтым творы Я. Колас паспяхова вырашае праблему станоўчага героя, надзвычай важную для літаратуры 20-гг. Пісьменнік не спрашчае падзей, а імкнецца паказаць тыя цяжкасці, з якімі ўсталёўвалася новае ў жыцці. Героям аповесці даводзіцца пераадольваць суровыя

жыццёвыя выпрабаванні. Стыль твора — сінтэтычны, ён характарызуецца спалучэннем адзнак рэалістычнага і рамантычнага пісьма.

Вялікая роля ў станаўленні і развіцці нацыянальнай дзіцячай літаратуры належыць Я. Маўру, які дэбютаваў у часопісе «Беларускі піянер» аповесцю «Чалавек ідзе» ў 1926 г. У цікавай і даступнай для юнага чытача форме пісьменнік знаёміць яго з матэрыялістычнай тэорыяй аб паходжанні чалавека, з раслінным і жывёльным светам даўніх часоў. Зусім натуральна гучыць у аповесці вывад, што гаспадаром зямлі чалавека зрабіла праца, а не звышнатуральныя сілы. Гэтай аповесцю Я. Маўр пераканаўча даказаў, што і пра сур'ёзныя, нават чыста навуковыя рэчы можна пісаць займальна, цікава, даступна.

Я. Маўр прыйшоў у дзіцячую літаратуру са сваімі тэмамі, праблемамі і жанрамі. Адной з такіх тэм было жыццё і барацьба народаў далёкіх «заморскіх» краін. Сурова асуджаецца каланіяльная палітыка капіталістычных краін у яго аповесці «У краіне райскай птушкі» (1928), развенчваецца буржуазная тэорыя аб жорсткасці туземцаў, «дзікуноў» і паказваецца іх дабрата, высакародства ў аповесці «Сын вады» (1928). Добра ведаючы асаблівасці дзіцячай псіхалогіі, улічваючы цягу дзяцей да незвычайнага, пісьменнік насычае сюжэты гэтых аповесцей, асабліва першай, займальнымі эпізодамі, напружанымі сітуацыямі, нечаканымі таямнічымі здарэннямі. У рамантызацыі подзвігу, у гуманістычнай накіраванасці гэтых і іншых прыгодніцкіх твораў Я. Маўра нельга не бачыць творчага наследавання традыцый класічнай прыгодніцкай літаратуры — традыцый Фенімора Купера, Майна Рыда, Марка Твена, Жуля Верна. Але творы гэтага жанру ў беларускага пісьменніка, як правіла, вызначаюцца героіка-рэвалюцыйным пафасам.

Блізкія па ідэйным гучанні да аповесцей і апавяданні Я. Маўра «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні», у якіх аўтар звяртаецца да тэмы дзяцінства. І Тубі, і Сідры, і Джузепе — героі гэтых апавяданняў — жывуць у тых краінах, дзе ёсць прыгожае мора, хораша спяваюць райскія птушкі. Аднак гэтая прыгажосць не робіць жыццё дзяцей шчаслівым. Тубі, каб пракарміць сям'ю, вымушаны ныраць у марскія глыбіні па дзівосныя жамчужыны. Сідры, кожны раз рызыкуючы сваім жыццём, за невялікую плату згаджаецца быць прынадай пры паляванні на кракадзілаў. Беспрытульны Джузепе ловіць у вадзе манеты, якія для пацехі кідаюць у ваду багатыя людзі. Гэтым дзецям няма калі захапляцца навакольнай прыгажосцю, экзотыкай паўднёвай прыроды; яна для іх ператварылася ў боль і пакуту. Пісьменнік-гуманіст Я. Маўр гнеўна асуджае такія сацыяльныя парадкі, пры якіх адны (меншасць) жывуць у раскошы за кошт эксплуатацыі другіх (большасці); ён спачувае бяздольным, прыніжаным, зняважаным.

Аднак Я. Маўр не абмяжоўваецца паказам бяспраўнага становішча народаў каланіяльных краін, ён спыняе ўвагу і на іх рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбе. Аб гэтым сведчыць напісаны на аснове рэальных падзей — паўстанне на Яве супраць галандскіх каланізатараў у 1926 г.— раман «Амок». Гэта адзін з лепшых твораў пісьменні-

ка, які вызначаецца сацыяльна-філасофскім зместам і ў якім сюжэтная шматпланавасць спалучаецца з вострай займальнасцю. Ён быў першым беларускім раманам для юнага чытача.

Такім чынам, у 20-я гг. Я. Маўр пачаў распрацоўваць новую для беларускай дзіцячай літаратуры тэму — жыццё працоўных каланіяльных краін. Творы пісьменніка адкрывалі савецкім дзецям далёкі свет, які тады не атрымаў яшчэ мастацкага ўвасаблення ў беларускай літаратуры. Дзякуючы Я. Маўру дзіцячая літаратура пашырыла свае жанравыя межы — у ёй з'явіліся прыгодніцкая і навукова-папулярная аповесці. Дваццатыя гады наогул былі перыядам актыўных пошукаў нашай маладой літаратурай новых тэм і жанраў.

Значнымі дасягненнямі вызначаецца літаратура для дзяцей у 30-я гг. У гэты час савецкі народ прыступіў да выканання велічных планаў першых пяцігодак, і перад усёй савецкай літаратурай, у тым ліку і перад літаратурай для дзяцей, паўстала задача ўсебаковага і глыбокага мастацкага адлюстравання напоўненых рамантыкай і гераізмам працоўных будняў, тых грандыёзных стваральных працэсаў, што адбываліся ў краіне. Паспяховаму развіццю дзіцячай літаратуры садзейнічалі пастановы ЦК ВКП(б) аб усеагульным пачатковым навучанні (1930) і «Аб выдавецтве «Молодая гвардия» (1931). На I Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў (1934) С. Я. Маршак выступіў з дакладам «Пра вялікую літаратуру для маленькіх», у якім гаварылася пра спецыфіку і праблематыку дзіцячай літаратуры, падводзіліся вынікі яе развіцця за гады Савецкай улады, адзначаліся поспехі беларускіх пісьменнікаў у стварэнні школьнай аповесці («ТВТ» Я. Маўра).

Па-ранейшаму ў развіцці дзіцячай літаратуры, у камуністычным выхаванні юнага пакалення вялікую ролю адыгрываў у гэтыя гады перыядычны друк. На старонках часопіса «Іскры Ільіча» (так з 1929 г. стаў называцца «Беларускі піянер») і газеты «Піянер Беларусі» (пачала выходзіць з 1929 г.) друкаваліся творы Я. Коласа, Я. Купалы, А. Якімовіча, Я. Маўра, З. Бядулі, К. Чорнага і іншых пісьменнікаў.

У Заходняй Беларусі ў 1927 г. быў створаны дзіцячы часопіс «Заранка», рэдактарам-выдаўцом якога была Зоська Верас. У ім змяшчаліся творы Я. Коласа, К. Буйло, М. Машары, але для яго друкавання не было сродкаў, і часопіс у 1931 г. перастаў існаваць.

У 30-я гг. адбываецца далейшае развіццё дзіцячай літаратуры ў жанравых і тэматычных адносінах. Заўважаецца імкненне да эпічнага адлюстравання рэчаіснасці — развіваецца аповесць і паэма. Пашыраюцца жанравыя магчымасці казкі: побач з паэмай-казкай з'яўляюцца аповесць-казка, п'еса-казка. Тэматычнаму ўзбагачэнню дзіцячай літаратуры садзейнічала перш за ўсё тое, што яна смялей стала асвойваць новыя сферы нацыянальнага жыцця. Пры гэтым паглыбленаму адлюстраванню жыцця садзейнічала ўмелае спалучэнне розных часавых вымярэнняў, кантрастнае супастаўленне сучаснага і мінулага (апавяданні «Сям'я» Я. Маўра, «Сцяпанавы дзеці» К. Чорнага, «Навагодняя ёлка» З. Бядулі).

У тагачаснай літаратуры наогул і ў дзіцячай у прыватнасці

заўважаецца тэндэнцыя да паглыбленага псіхалагізму, да пранікнення ва ўнутраны свет герояў. Найбольш выразна гэта відаць у апавяданнях Я. Маўра «Шапка», «Падарожжа вакол дома», «Бярозавы конь» і інш. Пісьменнік сцвярджае, што дзеці адчуваюць і перажываюць сапраўднае шчасце ад самых звычайных рэчаў — новай шапкі ці бярозавага каня, і для дарослых вельмі важна ўмець у час заўважыць гэта і ўсё зразумець.

У 1930 г. з'явіўся глыбока патрыятычны твор Я. Маўра — аповесць «Палескія рабінзоны», прасякнутая ідэяй вялікай любові да роднай беларускай зямлі, да яе цудоўнай прыроды. Праз чатыры гады выходзіць з друку яго аповесць «ТВТ», у якой узнімаецца пытанне працоўнага і політэхнічнага навучання дзяцей. Валодаючы багатым жыццёвым вопытам, пісьменнік тактоўна вучыць юнага чытача заўважаць у будзённых праявах жыцця вялікі сэнс. Героі аповесці стварылі таварыства ваяўнічых тэхнікаў (ТВТ) на правілах гульні, але менавіта праз гульню яны далучаюцца да агульнаграмадскіх працоўных спраў. «ТВТ», як і аповесць А. Гайдара «Цімур і яго каманда» (1940), карысталася вялікай папулярнасцю ў дзяцей і выклікала рух тэвэтэтаўцаў. Дарэчы, і гайдараўская аповесць выклікала цімураўскі рух па ўсёй нашай краіне і нават за яе межамі.

Праблема выхавання ў сям'і і школе вырашаецца ў аповесці К. Чорнага «Насцечка» (1940). Аўтар з вялікай любоўю малюе вобраз Насцечкі — добрай, чулай, старannай, уважлівай да старэйшых дзяўчынкі. Процістаўлены ёй у творы вобраз Сержа, які расце эгаістычным, жорсткім, саманадзейным. Чорны сцвярджае, што вінаваты ў гэтым яго бацькі, бо яны закрылі для хлопчыка свет духоўнасці. Паказваецца ў творы і жыццё людзей старэйшага пакалення, слаўныя традыцыі якога павінны прадоўжыць нашчадкі. У гэтай аповесці пісьменнік выявіўся як тонкі і ўдумлівы псіхолаг.

Многія творы 30-х гг., адрасаваныя юнаму пакаленню, былі прысвечаны гераічнай барацьбе нашага народа за ўстанаўленне Савецкай улады. Менавіта такую тэму распрацоўвае М. Лынькоў у аповесці «Міколка-паравоз» (1936). Фарміраванне характару галоўнага героя твора Міколкі адбываецца ў працэсе жорсткай барацьбы працоўных за перамогу Вялікага Кастрычніка. Ад свайго бацькі, бальшавіка-чыгуначніка, Міколка ўпершыню пачуў усю праўду пра цара, буржуяў і бога. Пісьменнік паказвае, як пад уплывам рэвалюцыйных падзей загартоўваецца воля хлопчыка-падлетка, расце яго свядомасць. Калі быў паранены бацька, які вёў браняпоезд на дапамогу партызанам, яго замяніў Міколка, даставіўшы машыну да месца прызначэння. Бясспрэчнай удачай пісьменніка з'яўляецца вобраз Міколкі, смелага, адважнага, разумнага, кемлівага хлопчыка з абвостраным пачуццём грамадзянскага абавязку. У аповесці гераічнае і бытавое, будзённае і рамантычнае спалучаюцца надзвычай арганічна. Аўтар напоўніў твор прыгодніцкімі элементамі, вострымі драматычнымі і гумарыстычнымі сітуацыямі.

У 30-я гг. у нашай дзіцячай літаратуры была зроблена і першая спроба мастацкага ўвасаблення вобраза Леніна. Першым творам ленінскай тэматыкі было апавяданне З. Бядулі «У шалашы»

(1936), дзе Ленін паказаны як вялікі мысліцель, рэвалюцыянер і адначасова як звычайны, просты чалавек, добры і чулы.

Паэзія для дзяцей у гэты перыяд, як і проза, характарызуецца больш глыбокім псіхалагізмам, павышанай увагай да дум і перажыванняў юнага героя, які імкнецца пазнаць таямніцы сусвету, зразумець навакольнае жыццё, прыняць удзел у вялікіх справах свайго народа. Так, сямігадовы хлопчык з глыбока лірычнага верша Я. Купалы «Хлопчык і лётчык» хоча агледзець зямлю і людзей з вышыні, убачыць, «як блукае ў лесе мядзведзь», «як свецяцца ночкаю зоры», як па моры ходзяць караблі. Рамантычная мара юнага героя зусім натуральная, бо народжана яна новай эпохай. Гэты верш быў адразу ж перакладзены на рускую мову М. Ісакоўскім, ён сведчыў аб узросшым агульначалавечым змесце савецкай дзіцячай паэзіі. Пранікнёным лірызмам вызначаліся і іншыя вершы Купалы гэтага часу («Алеся», «Выпраўляла маці сына», «Як у госці сын прыехаў»), а таксама вершы Я. Коласа, асабліва «Піянерам», «Піянерская песня», у якіх гаворыцца аб пераемнасці рэвалюцыйных традыцый і неабходнасці абараняць свабоду, заваяваную ў «кастрычніцкай віхуры». У вершах гэтага часу Купалы, Коласа, Бядулі і іншых паэтаў, што пісалі для дзяцей, шмат аптымізму, рамантыкі, яны напоўнены святлом, дабрынёй, вялікай любоўю да чалавека.

У 30-я гг. пашыраюцца жанрава-тэматычныя межы дзіцячай паэмы, ля вытокаў якой стаіць створаная яшчэ ў дакастрычніцкі час паэма-казка М. Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Пра гэта сведчаць паэмы «Міхасёвы прыгоды» (1934) Я. Коласа, «Шчаслівая дарога» (1935) А. Александровіча, паэма-казка «Каваль Вернідуб» (1935) А. Якімовіча. Значным дасягненнем дзіцячай літаратуры стала паэма Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды». Хоць тут і няма вострага канфлікту (у аснове — знаёмства гарадскога хлопчыка ў час летніх канікул з вёскай), але паэма імпанавала юным чытачам, бо ў ёй выразна перадаецца прыгажосць роднай прыроды, яе гукі і фарбы, пераканаўча раскрываецца дзіцячая псіхалогія, малюецца шчаслівае жыццё савецкіх дзяцей. Твор вызначаецца сапраўднай паэтычнасцю, лірызмам — тымі якасцямі, што становяцца больш уладарнымі ў дзіцячай паэме наогул. Не выпадкова яе вельмі высока ацаніў С. Маршак.

Паспяхова развіваецца ў 30-я гг. казка, адметнай асаблівасцю якой у параўнанні з казкай 20-х гг. становіцца больш цесная сувязь з сучаснасцю. Характэрныя ў гэтым плане казкі «Мурашка Палашка» (1939) і «Сярэбраная табакерка» (1940) З. Бядулі. Першая з іх праз алегарычныя вобразы сцвярджала думку пра сілу калектыву ў стваральнай працы і неперапможнасць яго ў барацьбе з ворагам («Калі ў купе жывеш — і вятры не вятры, і бяда не бяда, і багна не багна»). У казцы выказана таксама вельмі важная думка аб бяссмерці гераічнага подзвігу ў імя свабоды і незалежнасці. Глыбокі ідэйны змест твора, дасканалая мастацкая форма абумовілі яго вялікую папулярнасць сярод дзяцей.

Высокімі ідэйна-мастацкімі якасцямі вызначаецца і казка «Сярэбраная табакерка». Ідэйны пафас твора заключаецца ў пастаноўцы

і выразэнні найважнейшай праблемы чалавечага грамадства — праблемы вайны і міру, у закліку да актыўнай барацьбы за мір ва ўсім свеце, што было надзвычай актуальна ў той час, бо фашысцкая Германія ўжо развязала другую сусветную вайну. Актуальна гучыць гэты твор і ў наш час, калі мільёнам людзей планеты пагражае агонь ядзернай вайны.

Шырокую вядомасць набыла і займальная, шчодра насычаная гумарам аповесць-казка М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1935), прысвечаная падзеям грамадзянскай вайны.

Да скарбаў народнага казачнага эпасу далучае юнага чытача і Алесь Якімовіч. Ён апрацоўвае народныя казкі, у якіх выяўляецца веліч спраў працоўнага чалавека і асуджаецца ўсё ганебнае, варожае народу («Пану навука», «Каток — залаты лабок» і інш.). Значная роля належыць Якімовічу і ў развіцці жанру літаратурнай казкі. На аснове народнай казкі «Каваль» са зборніка Сержпутоўскага пісьменнік стварае казку «Каваль Вернідуб», прысвечаную гістарычнаму мінуламу нашага народа. У ёй услаўляецца подзвіг казачнага народнага героя. Каваль Вернідуб надзелены якасцямі фальклорных волатаў — магутнай сілай, мудрасцю, глыбокай чалавечнасцю, ён уступае ў барацьбу з царом, каб здабыць свабоду народу, усім «гнаным, катаваным».

Пэўныя дасягненні мела ў той перыяд і беларуская драматургія. Аб гэтым яскрава сведчаць створаныя па фальклорных матывах казачныя п'есы В. Вольскага «Цудоўная дудка» і «Дзед і жораў», якія вызначаюцца мудрасцю, дасціпнасцю, нацыянальным каларытам; яны і цяпер карыстаюцца вялікім поспехам у юнага гледача.

Такім чынам, у 30-я гг. беларуская савецкая літаратура для дзяцей узнялася на новую ступень у сваім ідэйна-мастацкім развіцці, узбагацілася жанрава і тэматычна.

У час Вялікай Айчыннай вайны выданне кніг для дзяцей на роднай мове ва ўмовах часовай акупацыі Беларусі было спынена. Аднак пісьменнікі працягвалі працаваць. У сваіх творах яны паказвалі цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю савецкіх людзей, і гераізм народа ў барацьбе з ворагам. Янка Купала, напрыклад, напісаў верш «Хлопчык і лётчык на вайне», Э. Агняцвет выдала зборнік вершаў «Міхасёк» (на рускай мове), з'явіліся вершы, паэмы і апавяданні А. Куляшова, П. Броўкі, М. Лынькова, К. Чорнага.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе развіццё беларускай дзіцячай літаратуры ішло ў напрамку яе далейшага тэматычна-жанравага ўзбагачэння, павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню. Найбольшую ўвагу пісьменнікаў прыцягвала тэма Вялікай Айчыннай вайны. Шырокую папулярнасць атрымала кніга «Ніколі не забудзем» (1948) — зборнік пісьмаў-успамінаў дзяцей, якія перанеслі жахі вайны. Тут расказваецца пра злачынствы фашыстаў на беларускай зямлі, здзекі над дзецьмі ў канцэнтрацыйных лагерах («Страшны дзень», «У няволі», «У Нямеччыне» і інш.), пра мужнасць савецкага народа, у тым ліку і дзяцей («Мая дапамога», «Узрыў вышкі» і інш.). Кніга «Ніколі не забудзем», як адзначыў Я. Колас у

прадмове да яе, гучыць грозным абвінаваўчым актам фашызму і ўсім тым сілам, што імкнуцца развязаць новую вайну.

Вельмі папулярнай у пасляваенны час была паэма А. Астрэйкі «Прыгоды дзеда Міхеда», напісаная яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1942—1944). У 1959 г. яна выйшла ў новай, дапрацаванай рэдакцыі. Паэма створана на фальклорнай аснове, у ёй па-майстэрску выкарыстаны казачныя элементы, у простай, даходлівай форме апаэтызаваны савецкі чалавек, патрыёт сваёй Радзімы, які мужна змагаецца з фашысцкімі захопнікамі, выходзіць пераможцам у самых складаных сітуацыях.

Тэма апаленага вайной дзяцінства — адна з галоўных у беларускіх пісьменнікаў у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Я. Маўр у апавяданні «Максімка» расказвае аб тым, як добры, чулы савецкі воін прыязджае ў дзіцячы дом па свайго сына, а разам з ім забірае ў сваю сям'ю і сірату Максімку. Я. Брыль у апавяданні «Зялёная школа» расказвае аб створанай партызанамі школе для дзяцей франтавікоў. Там вучылася і дзяўчынка Ася, якую выратавалі ад смерці чужыя людзі. У гэтых творах, як і ў многіх іншых, пісьменнікі, паказваючы адносіны да дзяцей, паэтызавалі высакароднасць, глыбокую чалавечнасць, душэўную прыгажосць савецкіх людзей.

Ва ўмовах усеагульнага працоўнага ўздыму першых пасляваенных гадоў вельмі пашыранай тэмай дзіцячай літаратуры была тэма працы. Найбольш значны твор гэтай тэматыкі — апавяданне Я. Брыля «Лазунок». Пісьменнік радуецца і хвалюецца разам з Міхасём Лазунком, былым вучнем рамесніцкай школы паліграфістаў, якому даручана адказная справа — наглядаць за спраўнасцю друкавання кнігі Я. Коласа «Дрыгва». Захоплены патрыятычным пафасам гэтага твора, Лазунок падумаў аб тым, што і ён мае дачыненне да ўсенароднага подзвігу, і дапусціў тэхнічную памылку, якую палічылі даравальнай, бо зразумелі душэўны стан падлетка.

Асобнае месца ў дзіцячай літаратуры пасляваеннага часу занялі апавяданні Я. Брыля «Ліпа і клёнік», «Жыў-быў вожык», «Сняжок і Волечка»; яны захапляюць юнага чытача глыбокім лірызмам, эмацыянальнасцю, паэтычнасцю вобразаў.

Узбагацілі беларускую дзіцячую літаратуру пасляваеннага перыяду краязнаўчыя нарысы і апавяданні В. Вольскага, аб'яднаныя ў зборніках «Па лясных сцежках» (1948), «У лясах над Бярозай» (1955). Яны знаёмяць юнага чытача з запаведнымі куткамі Беларусі — Белавежскай пушчай, Бярэзінскім запаведнікам, вучаць разумець і любіць прыроду, родны край, садзейнічаюць выхаванню патрыятычных пачуццяў. В. Вольскі, як і Я. Маўр, паэтызуе родную зямлю, успрымае прыроду і навакольны свет так радасна і ўсхвалявана, як і вядомыя рускія пісьменнікі М. Прышвін, Б. Жыткоў, В. Біянкі.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе распрацоўвалася таксама тэма мінулага, пра што сведчаць аўтабіяграфічная аповесць Я. Маўра «Шлях з цемры» (1948) і аповесць А. Якімовіча. «Базылёў курган» (1954).

Паспяхова развіваецца ў пасляваенныя гады паэзія для самых

маленькіх чытачоў; адметнай якасцю яе, як і тагачаснай прозы, быў высокі грамадзянскі пафас. Выходзяць з друку зборнікі вершаў Э. Агняцвет «Васількі» (1947), «Ля піянерскага кастра» (1952), А. Вялюгіна «Галубы» (1949), А. Вольскага «Маленькім сябрам» (1955) і інш.

Выкарыстоўваючы традыцыі вуснай народнай творчасці, некаторыя пісьменнікі ствараюць для маленькага чытача займальныя казкі. З улікам спецыфікі дзіцячага ўспрымання напісаны казкі «Вавёрчына гора» (1947) В. Віткі, «Ехаў Бай» (1952), «Быль пра злога Сухавея» (1952), «Конь і леў» (1953), «Як вясна прыйшла» (1953) М. Танка. Сваімі творамі паэты выхоўваюць у дзяцей любоў да прыроды, вучаць разумець адвечныя праблемы дабра і зла, развіваюць эстэтычныя пачуцці.

Сучасны этап у развіцці дзіцячай літаратуры пачынаецца з другой палавіны 50-х гг. Пад уздзеяннем значных грамадска-сацыяльных падзей у краіне ў ёй, як і ў літаратуры ўвогуле, паглыбіўся гуманістычны пачатак, пашырыліся тэматычныя далягляды. Асноўнымі яе жанрамі сталі аповесць і апавяданне пра даўнюю і блізкую гісторыю.

Новымі творамі папоўнілася беларуская дзіцячая Ленініяна. У іх выяўляецца новы падыход да распрацоўкі ленінскай тэмы. Калі раней пісьменнікі паказвалі асобныя перыяды ў жыцці Леніна (як, напрыклад, З. Бядуля ў апавяданні «У шалашы»), то цяпер яны імкнуцца да ўсебаковага мастацкага ўвасаблення велічнай асобы Ільіча, паказваючы яго дзейнасць на шырокім гістарычным фоне. Напрыклад, з апавяданняў П. Ткачова (зборнікі «Вішнёвая квецень», 1965, «Самае галоўнае», 1977) перад юным чытачом паўстае вобраз Леніна як палымянага рэвалюцыянера, стваральніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, мудрага правадыра і самага чалавечнага чалавека, уважлівага, добразычлівага ў адносінах да людзей, асабліва да дзяцей.

Ленінскай тэме прысвечаны таксама аповесці І. Шамякіна «Браняпоезд «Таварыш Ленін» і «Першы генерал», апавяданні В. Хомчанкі («Дарагі падарунак», «Збанок малака», «Гульня ў снежкі», «Баравікі», «Чырвоны мак» і інш.), Я. Бяганскай («Пашына радасць», «Мінькаў заяц» і інш.).

Адным з лепшых твораў пра Леніна, адрасаваных дзецям, з'яўляецца паэма А. Вялюгіна «Вецер з Волгі», адзначаная Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы. Паэма выйшла ў 1963 г., а новы варыянт з дапаўненнямі і зменамі апублікаваны ў 1968 г. Паэт хацеў, па яго ўласных словах, выявіць у Леніне-юнаку рысы будучага «арганізатара Кастрычніцкага штурму». І гэта яму ўдалося. У творы праўдзіва перададзены каларыт эпохі (апошняе дзесяцігоддзе XIX ст.), у якую арганічна ўпісаны вобраз маладога Ільіча, глыбока раскрыты працэс фарміравання характару і светапогляду будучага правадыра. Паэма кранае юнага чытача лірычнай узнёсласцю, рамантычнай акрыленасцю. Яна нібы саткана з яркіх, дынамічных сцэн і эпізодаў.

Важнае значэнне ў выхаванні падрастаючага пакалення маюць творы гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі. Да такіх твораў належыць цыкл аповесцей А. Якімовіча «Адкуль ліха на свеце» (1962), «Канец

сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1975). У сваёй тэтралогіі пісьменнік узнавіў працяглы перыяд народнай гісторыі, паказаў доўгую і нялёгкую барацьбу заняволеных людзей за свабоду, супраць прыгнёту і эксплуатацыі. Аўтар засяродзіў увагу і на вельмі важнай для сучаснай літаратуры праблеме — пераемнасці лёсу пакаленняў.

Сярод твораў, у якіх раскрываецца працэс духоўнага ўзмужнення падрастаючага пакалення, асобае месца належыць тэтралогіі А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся...» (1972), адзначанай Дзяржаўнай прэміяй БССР у 1976 г. Пісьменніца праўдзіва паказала жыццёвы шлях сваёй гераіні Ганькі Гурновіч, лёс якой цесна звязаны з жыццём краіны перыяду індустрыялізацыі і калектывізацыі.

Творы А. Якімовіча і А. Васілевіч не толькі адкрываюць новую старонку ў развіцці жанру аўтабіяграфічнай аповесці, але і сведчаць пра паглыбленне псіхалагізму ў прозе для дзяцей на сучасным этапе, паспяховае авалоданне пісьменнікамі традыцыямі, якія былі закладзены ў дзіцячай літаратуры Я. Коласам і Я. Маўрам.

Высокія грамадзянскія, патрыятычныя пачуцці выхоўваюць у дзяцей творы пра Вялікую Айчынную вайну. На сучасным этапе пісьменнікі па-ранейшаму надаюць вялікую ўвагу паказу гераізму дзяцей у гады вайны. Юным героям-партызанам прысвечаны створаныя на дакументальным матэрыяле нарысы, што ўваходзяць у серыю «З арлінага племя»: «Коля Гойшык» (1971) В. Шымука, «Дзеці крэпасці» (1973) А. Махнача, «Я᾿вярнуся, мама» (1977) Д. Слаўковіча і інш. Напісаныя ў рознай творчай манеры, нарысы, аднак, маюць агульнае: іх аўтары імкнуцца раскрыць духоўную прыгажосць і веліч подзвігу юных герояў у зацятай барацьбе з фашызмам, каб тым самым садзейнічаць выхаванню сённяшняга падрастаючага пакалення ў духу самаахвярнай адданасці Радзіме, вернасці камуністычным ідэалам.

У сучаснай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну раскрываецца драматызм становішча, паказваюцца вытокі гераізму савецкіх людзей. Пры гэтым пісьменнікі пазбягаюць знешняй займальнасці, неверагоднасці ў развіцці падзей. На рэальнай жыццёвай аснове створаны аповесці Г. Васілеўскай «Маланка ўначы» (1963) і «Малюнак на снезе» (1969), Г. Бураўкіна «Тры старонкі з легенды» (1971) і інш. Балючыя ўспаміны дзяцінства, апаленага вайной, ляглі ў аснову дылогіі І. Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968) і «Мы — хлопцы жывучыя» (1970). У гэтых аповесцях пісьменніку ўдалося стварыць цікавыя вобразы няўрымслівых, жыццярадасных падлеткаў Івана і Санькі, якіх вайна прымусіла ўзяць у рукі зброю і бараніць свой родны дом, сваю Радзіму, змагацца з лютым ворагам. Выкарыстоўваючы лірычныя і гумарыстычныя фарбы, І. Сяркоў пераканальна паказаў сяброўскую вернасць, палымяны патрыятызм дзяцей, выхаваных на высокіх ідэалах нашага грамадства.

На сучасным этапе проза для дзяцей усё больш абапіраецца на публіцыстыку, што дае добры плён. Яскравае сведчанне — зборнікі нарысаў В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968) і «Палессе» (1971). Гэта — своеасаблівыя мастацкія экскурсы ў міну-

лае і сучаснае нашай краіны. Пісьменнік знаёміць дзяцей з дзейнасцю Сымона Буднага і Францыска Скарыны, М. В. Фрунзе і В. Г. Кнорына, расказвае пра прыроду Палесся, пра яго выдатных людзей.

Своеасаблівы эмацыянальна-ўзнёслы сказ пра Беларусь уяўляе сабой нарыс У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (1977), у якім аўтару хацелася, па яго ўласным прызнанні, даць юнаму чытачу «ключ ад нашага дома» — дапамагчы пазнаць Радзіму. Пісьменнік паказаў хараство роднай зямлі, веліч яе ратнай і працоўнай славы, багацце культурных традыцый народа, уславіў сённяшні дзень Беларусі.

Пазнавальнае і глыбока патрыятычнае значэнне маюць аповесці У. Дубоўкі «Жоўтая акацыя» (1967) і «Ганна Алелька» (1970), прасякнутыя глыбокім роздумам над высокім прызначэннем чалавека на зямлі. Яны вучаць падрастаючае пакаленне шанаваць бацькоўскую спадчыну, памнажаць багацці сваёй айчыны.

Значна паглыбіўся ў сучаснай дзіцячай літаратуры маральна-этычны пачатак. Асаблівую ўвагу пісьменнікі ўдзяляюць падлеткам, дзецям таго ўзросту, калі яны фарміруюцца як асоба. Героі аповесцей П. Кавалёва («Лёнька Гром», 1961), Я. Радкевіча («Пешшу праз Галактыку», 1984), апавядання А. Васілевіч («Шурка Рэмзікаў», 1957), напрыклад, пастаўлены ў складаныя жыццёвыя абставіны, якія вымушаюць іх задумацца над сэнсам жыцця, шукаць сваё месца ў ім. У гэтых творах вырашаецца праблема ўзаемаадносін дзяцей і дарослых, малююцца вобразы людзей, што сталі сапраўднымі настаўнікамі моладзі. Такім мудрым выхавацелем моладзі часта выступае і сам аўтар, які знаёміць яе з прынцыпамі народнай маралі і этыкі (зборнік апавяданняў У. Дубоўкі «Пялёсткі», 1973).

Выразна выяўляецца ў сучаснай прозе для дзяцей лірыка-эмацыянальная тэндэнцыя, увага да ўнутранага свету юнага героя. Такая тэндэнцыя стала прыкметнай ужо ў другой палавіне 50-х гг. Цікавыя ў гэтым плане творы І. Навуменкі (аповесць «Вайна каля Цітавай копанкі», 1959), П. Місько (аповесці «Навасёлы», 1972 і «Прыгоды Бульбобаў», 1977). Глыбінёй псіхалагічнага аналізу вызначаюцца апавяданні Янкі Брыля («Туга», «Вясёлая падсада» і інш.), У. Юрэвіча («Нястрашны страх», «Дзе начуе сонца»), Б. Сачанкі («Хлеб», «Кошык малін»), В. Гарбука («Горад без папугайчыкаў»).

Многія пісьменнікі звяртаюцца да тэмы працы, паказваюць дзяцей руплівымі гаспадарамі сваёй краіны (апавяданні А. Якімовіча, А. Васілевіч, В. Хомчанкі, П. Рунца, А. Пальчэўскага), праяўляюць цікавасць да жыцця школьнікаў, іх клопатаў, радасцей і трывог (А. Васілевіч, Т. Хадкевіч, Д. Слаўковіч).

Не абмінае сучасная літаратура і такую важную праблему, як чалавек і прырода. Матывы дабрыні, чуласці ў адносінах да прыроды гучаць у апавяданнях В. Хомчанкі («Салдацкая крыніца», «Венікі»), А. Васілевіч («Калінавая рукавічка», «Вожык», «Браты-артысты»), П. Кавалёва («Жыві сабе, зайчык»), А. Пальчэўскага («Ліпка»), І. Грамовіча («Жаваранак»), М. Даніленкі («Журка»), П. Рунца («Лёнева таполька»), М. Гамолкі («Васілёва бярозка») і інш. Літара-

тура, прысвечаная роднаму краю, яго прыродзе, вучыць маленькіх чытачоў не толькі пазнаваць прыгажосць навакольнага свету, але і берагчы, ахоўваць прыроду, клапаціцца аб гэтым народным багацці. Паказ адносін юных герояў да прыроды дае пісьменнікам магчымасць паўней раскрыць іх духоўны свет.

Сучасная дзіцячая паэзія параўнальна з паэзіяй даваеннага перыяду і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя вызначаецца большай тэматычнай разнастайнасцю, пазнавальнай змястоўнасцю. У чытанне дзяцей увайшлі вершы вядомых паэтаў П. Броўкі, П. Глебкі, П. Панчанкі, М. Танка, А. Пысіна. Для маленькага чытача пішуць В. Вітка, С. Шушкевіч, Э. Агняцвет, Н. Гілевіч, К. Кірэенка, С. Грахоўскі, Р. Барадулін, І. Муравейка, П. Прануза, А. Лойка, М. Чарняўскі, В. Лукша, А. Грачанікаў і іншыя паэты. Яны шукаюць новыя мастацкія сродкі для больш поўнага і глыбокага раскрыцця псіхалогіі юнага героя, вучаць свайго чытача вобразна, эмацыянальна ўспрымаць з'явы жыцця.

Для сучаснай дзіцячай паэзіі характэрна творчае развіццё фальклорных традыцый на якасна новай аснове. Фальклор, напрыклад, з'яўляецца той невычэрпнай крыніцай, якая жывіць паэзію В. Віткі. Ён піша казкі, вершы, калыханкі, загадкі, напаўняючы гэтыя традыцыйныя жанры дзіцячага фальклору новым, сучасным зместам (зборнікі «Чытанка-маляванка», 1971; «Ладачкі-ладкі», 1977; «Мы будуем метро», 1979). Творы яго надзвычай эмацыянальныя, вызначаюцца даверлівасцю інтанацый, высокай паэтычнай культурай. В. Вітка пазбягае рытарызму, напышлівасці, ніколі не збіваецца на маралізатарства.

Плённа працуе на ніве дзіцячай паэзіі старэйшая беларуская паэтэса Э. Агняцвет. Яна паказвае хараство прыроды («Водгулле»), знаёміць з гісторыяй роднага краю («Конка», «Запаветны домік»), распрацоўвае інтэрнацыянальную тэму («Край сяброў маіх»). Ёсць у яе паэзіі і гумарыстычныя вершы (зборнік «Доктар Смех», 1977).

Шмат піша для дзяцей С. Шушкевіч. Яго вершы і казкі апошняга часу склалі кнігі «Едзе страшная Яга» (1985) і «Казёл на верталёце» (1987). Як і іншыя паэты, С. Шушкевіч адкрывае юнаму чытачу таямніцы прыроды, выхоўвае павагу да чалавека працы, абуджае пачуццё прыгожага.

Паэтычныя творы Р. Барадуліна прымушаюць дзяцей прыслухоўвацца да мелодыкі роднага слова, да рытму верша, актывізуюць іх мысленне. Здольнасць паэта «гуляць словам і ў слове» асабліва ярка праявілася ў вершах і казках, што ўвайшлі ў зборнік «Ці пазяхае бегемот?» (1981).

Адметнымі жанравымі і тэматычнымі пошукамі вызначаецца паэзія А. Вольскага. Паэт вучыць дзяцей уважліваму, клапатліваму стаўленню да ўсяго жывога, вядзе з ім шчырую размову пра сумленнасць і сяброўства (зборнікі «Сонца блізка ўжо зусім», 1984; «Дабяруся да нябёс», 1985).

Праблемы патрыятычнага, інтэрнацыянальнага, маральна-этычнага выхавання дзяцей узнімаюцца ў вершах П. Броўкі, П. Панчанкі,

Н. Гілевіча, С. Грахоўскага, А. Грачанікава, І. Муравейкі, В. Лукшы, Д. Бічэль-Загнетавай і іншых паэтаў.

Беларускія паэты надаюць вялікае значэнне ў выхаванні дзяцей жанру загадкі. Бясспрэчныя эстэтычныя вартасці маюць загадкі В. Віткі, Э. Агняцвет, Е. Лось. У традыцыях фальклору створаны афарыстычныя загадкі Н. Гілевіча (зборнікі «Сіні домік, сіні дом», 1961; «Загадкі», 1971). Бачыць паэзію ў звычайных, знаёмых рэчах і з'явах вучаць пабудаваныя на каламбурах загадкі Р. Барадуліна («Незвычайны горад», 1981). Цікавыя загадкі пра раслін, звяроў, птушак у паэта В. Зуёнка (зборнік «Сонечны клубочак», 1972).

Сярод разнастайных жанраў сучаснай дзіцячай паэзіі значнае месца займае літаратурная казка. Сапраўдным майстрам гэтага жанру з'яўляецца У. Дубоўка. Героі казак У. Дубоўкі не фантастычныя істоты, а звычайныя людзі, птушкі, звяры, якія набываюць чарадзейную сілу дзякуючы працавітасці, розуму, дабрыні: «Айога» (1958), «Чые рукі прыгажэйшыя?» (1958), «Кветкі — Сонцавы дзеткі» (1959), «Хто дужэйшы?» (1959), «Як сінячок да сонца лётаў» (1959) і інш.

Шмат фантазіі, выдумкі ў казках В. Віткі «Буслінае лета» (1957), «Казка пра цара Зубра» (1959), «ППШ» (1962), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1963), М. Лужаніна «Хто робіць пагоду» (1960), Л. Прокшы «Незвычайныя прыгоды хлопчыка Бульбінкі» (1973), А. Лойкі «Як Тоня рэха шукала» (1962), А. Вольскага «Што такое мікра тое» (1971). З улікам асаблівасцей дзіцячага ўзросту напісаны казкі С. Шушкевіча «Хворы жораў» (1957), «Камар-брынкун і жаба-квакуха» (1959), «Пра Лісу-хітруху і добрых сяброў Мядзведзя, Зайца і Пеўня» (1960) і інш. У іх аўтар праз вобразы звяроў, птушак, удала створаныя камічныя сітуацыі выкрывае недахопы, уласцівыя асобным людзям,— самахвальства, сквапнасць, хітрасць. Казкі С. Шушкевіча прывіваюць дзецям павагу да чалавека працы, выхоўваюць таварыскасць. Займальную, дасціпную казку «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні» (1969) напісаў М. Танк.

Беларуская дзіцячая літаратура на сучасным этапе мае пэўныя набыткі ў жанры паэмы. Высокім гуманістычным пафасам вызначаюцца паэмы Э. Агняцвет «Васіль Сяргеевіч» (1978), «Будзем сябраваць» (1979), прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Услаўляючы подзвігі савецкіх людзей, паэтэса вучыць юнае пакаленне любіць сваю Радзіму, шанаваць слаўныя традыцыі народа, высока цаніць наша мірнае шчаслівае жыццё. Гераічная тэма знаходзіць увасабленне і ў паэмах К. Кірэенкі «Урачыстая песня» (1965), А. Пысіна «Кавылёк» (1966). Пра юных герояў-партызан расказаў М. Чарняўскі ў дакументальных паэмах «Навечна з сонцам», «Шчымлівая зорка», «Сын Паліка», што ўвайшлі ў зборнік «Навечна з сонцам» (1986). Аднак жанр паэмы для дзяцей усё ж развіваецца недастаткова інтэнсіўна.

Пэўнае месца ў сучаснай дзіцячай літаратуры займае драматургія. Некалькі гераічных п'ес напісалі А. Махнач («Шпачок», 1963; «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці», 1969), В. Зуб («Марат Казей», 1963; «Юнацтва рыцара», 1972). У тэатрах рэспублікі пастаўлены п'есы А. Вярцінскага («Дзякуй, вялікі дзякуй», «Скажы сваё імя, салдат»),

Г. Каржанеўскай («Іван Світаннік»), П. Макаля і А. Вольскага («Званы твайго лёсу») і іншых пісьменнікаў. Аднак у драматычных творах для дзяцей школьнае, піянерскае жыццё не знаходзіць яшчэ глыбокага мастацкага ўвасаблення; аўтарам п'ес не ўдалося стварыць цікавы вобраз школьніка-падлетка, раскрыць складаны працэс фарміравання яго характару.

Поспехі беларускай дзіцячай літаратуры ў адлюстраванні разнастайных жыццёвых з'яў сучаснай і мінулай рэчаіснасці відавочныя; яна стала дзейсным сродкам камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

# ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Першае знаёмства чалавека з народна-паэтычнай творчасцю адбываецца ў маленстве, калі ён чуе пяшчотную мацярынскую калыханку. Паступова песня маці ўводзіць дзяцей у навакольны свет, абуджае іх дрэмлючую фантазію, фарміруе элементарныя этычныя погляды. «Слухаючы такую песню,— зазначае Н. Гілевіч,— гэтую адвечную і неўміручую песню матчынай любві,— міжволі думаеш: можа быць, менавіта адсюль, вось з такой калыханкі, з яе самай простай і самай геніяльнай на зямлі мелодыі і пачынаецца Чалавек» *(Гілевіч Н.* Наша родная песня. Мн., 1968, с. 173). Першыя рухі дзяцей таксама суправаджаюць песні — пацешкі, забаўлянкі, пястушкі. Іх спяваюць пры гульні дзяцей з пальчыкамі («Сарока-варона»), з ручкамі («Ладушкі-лады»), з ножкамі («Кую-кую ножку»). Падрастаючы, дзеці самі пачынаюць спяваць, прыгаворваць лічылкі, якія нясуць ім весялосць, радасць у гульні. Каштоўны духоўны пажытак даюць малым народныя афарыстычныя жанры — загадкі, прыказкі, прымаўкі. Яны выхоўваюць назіральнасць, выпрацоўваюць кемлівасць, фарміруюць эстэтычны густ. Асабліва папулярнымі ў дзяцей усіх узростаў з'яўляюцца казкі, якія ўзніклі яшчэ ў глыбокай старажытнасці і перадаюцца з пакалення ў пакаленне, даносячы нашчадкам мудры жыццёвы вопыт народа. З глыбінь народных выйшла многа таленавітых майстроў-казачнікаў. Такімі даравітымі казачнікамі былі Рэдкі (каля 1795—каля 1910) з сяла Вялікі Рожан Слуцкага павета і Іван Азёмша (1851—1916) з вёскі Лучыцы Мазырскага павета Мінскай губерні, ад якіх вядомы фалькларыст і этнограф А. Сержпутоўскі запісаў 70 твораў. Вывучэнне і збіранне казачнага эпасу пачалося ў XIX ст. Асабліва плённай у гэтым кірунку была дзейнасць фалькларыстаў П. Шпілеўскага, П. Шэйна, Е. Раманава, М. Федароўскага, Я. Карскага; да іх запісаў вучоныя звяртаюцца і сёння. Каб дзецьмі лепш успрымаліся казкі, пісьменнікі іх літаратурна апрацоўваюць, беражліва, ашчадна абыходзячыся з гэтым каштоўным скарбам. Выйшлі зборнікі народных казак у апрацоўцы Якуба Коласа, А. Якімовіча. На аснове народных матываў, сюжэтаў стварылі літаратурныя казкі М. Багдановіч, З. Бядуля, Я. Колас, У. Дубоўка, М. Танк, А. Якімовіч, В. Вітка і іншыя пісьменнікі.

## *КАЛЫХАНКІ*

### СПІ, ДАЧУШКА, СПІ

Спі, дачушка, спі
Ды аб долі сні.
Маці будзе калыхаці,
Будзе песеньку спяваці.
Расце ў жыце кветка,
Кветка васілёчак.
Расце маё дзіцятка
Ў ясненькі дзянёчак.
Жыта зжалі, кветка звяла.
Па дзянёчку змрок.
Адыдзі ты, доля злая,
Ад майго дзіцяці ўбок.

### А ТЫ, КОЦІК, НЕ ХАДЗІ

А ты, коцік, не хадзі
Да малюльку не будзі.
Малюлька малая,
Няхай спіць, гуляе.

## ЛЮЛІ-ЛЮЛІ-ЛЮЛІ,

Люлі-люлі-люлі,
Пайшоў кот па дулі,
Адмарозіў лапку,
Прыйшоў грэцца ў хатку.
Недзе кату дзецца,
Лапачцы пагрэцца,
Ўзлез бы на палаткі,
Дык баіцца бабкі.
Палез бы ён вышкі,
Дык баіцца мышкі.
Там мышы дурэлі,
Кату хвост ад'елі.
Пайшоў каток у лясок,
Знайшоў каток паясок,
А котачка адняла
Ды дзіцяці аддала.
Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Ці самому з'есці,
Ці дзіцяці несці?
Думаў каток, думаў,
Думаў ды надумаў:
І сам разок укушу,
І дзіцяці занясу.

## ЛЮЛІ-ЛЮЛІ-ЛЮЛІ

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры,
Сталі сакатаці,
Трэба куркам даці.
Даці, даці грэчкі,
Каб няслі яечкі.
Куркі грэчкі не ядуць
Ды яечак не нясуць.
Даці, даці пшаніцы
Да з новенькай дайніцы.
Куркі пшаніцу паядуць
І яечак нанясуць.
Даці куркам жыта,
Будзе курка сыта.
Люлі-люлі, дзеткі,
Маленькія кветкі.
Люлі-люлі-люлі,
Ўсе дзеткі паснулі.
Люлі-люлі-люлі,
Ўсе дзеткі паснулі.

## БАЮ-БАЮ-БАЮ-БАЙ

Баю-баю-баю-бай,
Не лажыся ты на край.
Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Схопіць Нінку за бачок
І пацягне у лясок
Пад малінавы кусток.

# *ЗАБАЎЛЯНКІ*

## САРОКА-ВАРОНА

Сарока-варона
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку студзіла.
Гэтаму дала, гэтаму дала.
Гэтаму дала, гэтаму дала,
А гэтаму — не дала:
— А ты, мал, круп не драў,
Вады не насіў, дзяжы не мясіў.
Ідзі, малы, па вадзіцу,
Табе кашка на паліцы
У маленькай чарапіцы.

### ЛАДУ-ЛАДУ-ЛАДКІ

Ладу-ладу-ладкі,
Пабіліся бабкі
За камочак цеста
Ды пасярод места;
Селі ў запечку,
З'елі перапечку.
Засталіся крошкі,
Іх паелі кошкі.

### КУЮ-КУЮ НОЖКУ

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая,
На дарожцы слізка,
А дамоў няблізка.

### ГОП-ГОП, І-ГА-ГА

Гоп-гоп, і-га-га.
На буланцы едзе Янка,
Паўтараста рублей санкі,
Пяцьдзесят рублей дуга.
А кабылка паўрубля.
Гоп-гоп, і-га-га.

## *ПЕСНІ*

### ЗАЙЧЫК МАЛЕНЬКІ

— Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.
Пасадзіў капусту
Ні рэдка, ні густа.
Пайду я рана,
Капуста парвана,
Пайду я позна,
У капусце росна.

### ПЕРАПЁЛАЧКА ЛЕТАВАЯ

— Перапёлачка летавая,
Дзе ты зіму зімавала?
—У крыніцы зімавала,
А летавала ў пшаніцы,
Зімавала — воду піла,
А летавала — пшаніцу ела.

## *ЗАКЛІЧКІ*

### ІДЗІ, ІДЗІ, ДОЖДЖЫКУ

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку.
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю,
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.

### БОЖАЯ КАРОЎКА

Божая кароўка,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода,
Пень ці калода?
Пагода — ляці,
Дождж — сядзі.

## *ЛІЧЫЛКІ*

### РАЗ, ДВА, ТРЫ, ЧАТЫРЫ

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

### КАЦІЛАСЯ ТОРБА

Каціласся торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

### ЭНІКІ-БЭНІКІ

Энікі-бэнікі,
Елі варэнікі.
Энікі-бэнікі.
Клёц!

## *ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ*

Ленін навучыў, каб народ шчасліва жыў.
Па-ленінску жыць — Радзіме служыць.

Партыі слова — усіх поспехаў аснова.
Каб добра жыць, партыя вучыць шчыра рабіць.
Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
У сваім краі, як у раі.
Той бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць.
Птушцы — воля, чалавеку — мір.
Сам гінь, а таварыша выручай.
Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць.
Чалавек без працы, што птушка без крылаў.
Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш.
Узяўся за гуж — не кажы, што не дуж.
Рэшатам вады не наносіш.
Гультай за работу — мазоль за руку.
І шыла, і мыла, і ткала, і прала — і ўсё языком.
Шануй бацьку з маткаю: другіх не знойдзеш.
Пры сонейку цёпла, пры матцы добра.
Навука даражэй за ўсякае багацце.
Хто толькі сам сябе любіць, таго ніхто не любіць.
Умеў памыліцца, умей і паправіцца.
Колас, што зярнят не мае, угору лоб задзірае.
Праўда даражэй за грошы.
Чалавек без друга, што яда без солі.

### *ЗАГАДКІ*

Поле не змерана, авечкі не лічаны, пастух рагаты.
*(Неба, зоркі, месяц)*
Два браты глядзяць у ваду, а ніколі не сойдуцца.
*(Берагі)*
Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць.
*(Гром)*
Адзін лье, другі п'е, трэці расце.
*(Дождж, зямля, трава)*
Брат сястру даганяе, а сястра ад брата ўцякае.
*(Дзень і ноч)*
Зімой і летам адным цветам.
*(Елка, хвоя)*
Вясна прыгрэе, шубу надзене; зіма наступае, шубу скідае.
*(Лісцёвае дрэва)*
Што чалавеку самае дарагое?
*(Радзіма)*
Без языка жыве, не есць, не п'е, а гаворыць.
*(Радыё)*
Як тая рэч завецца, што цэлы год лічыць і ніколі не саб'ецца?
*(Каляндар)*

## *КАЗКІ*

### ДЗІВА[1]

Пайшоў адзін бедны чалавек у свет шукаць сабе якога-небудзь спосабу. Пакінуў сваю хату і жонку.

— Знайду які спосаб, вярнуся дадому; а не знайду — жыві як хочаш,— кажа ён жонцы, выходзячы з хаты.

Ідзе ён дзень, ідзе другі і прыходзіць у лес. Стаіць у лесе хатка. А ўжо быў надвячорак, у лесе пачынала цямнець.

«Дай,— думае чалавек,— зайду паначую тут». Пастукаў у акенца.

— Хто там? — пытае нехта з хаты.

— Падарожны.

— Што табе трэба?

— Будзьце ласкавы, пусціце паначаваць.

Адчыніліся дзверы. Увайшоў падарожны ў хату. Бачыць — у хатцы пуста, але чысценька. У куце стаіць толькі адзін стол і дзве лаўкі. А за сталом сядзіць дзядок старэнькі.

— Сядай,— кажа дзядок.

Сядзяць яны, гамоняць. Сядзяць гадзіну і другую. А нашаму падарожнаму есці хочацца, а на стале ні скарыначкі хлеба.

Вось дзядок і кажа:

— Ну, мый, брат, рукі ды за стол садзіся, бо бачу — ты есці хочаш.

Памылі яны рукі і за стол паселі.

Вось дзядок кажа:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва!

Увайшоў у хату індык.

— Сячыся, рубайся, у гаршчок накладайся, да агню прыстаўляйся і на стол падавайся!

Індык сам зарэзаўся, сам аскубся, да агню прыставіўся, зварыўся і на стол падаўся.

— Еш,— кажа дзядок,— толькі касцей не грызі.

З'елі яны ўсё мяса, косці палажылі на стол, а дзядок кажа:

— Дзіва, збірайся ды за парог выбірайся!

Дзіва сабралася, саскочыла са стала і пайшло за парог.

Пазірае падарожны і дзівіцца.

— Вось,— кажа,— каб мне такое Дзіва! Прадай ты мне яго, дзедка.

— Я не прадаю нікому за грошы, а добрым людзям і так аддаю.

І падарыў гэта Дзіва чалавеку. Узяў бедны чалавек індыка пад паху і пайшоў дадому.

Рада жонка, што яе чалавек вярнуўся, а ён кажа:

— Вось прынёс я Дзіва, ты толькі паглядзі, што тут будзе. Пакладзі дроў у печ, а сама за стол садзіся.

Наклала жонка ў печ дроў і села за стол, а гаспадар кажа:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва!

Уваходзіць індык.

---

[1] Казка даецца ў апрацоўцы Якуба Коласа.

— Сячыся, рубайся, у гаршчок накладайся, да агню прыстаўляйся, на стол падавайся!

Дзіва само зарэзалася, аскублася, палажылася ў гаршчок, прыставілася да агню, зварылася і на стол падалося.

З'елі яны ўсё мяса, а косці на стол палажылі.

— Дзіва, збірайся і за парог выбірайся!

Сабрала яно ўсе свае косці, саскочыла са стала і пайшло ў сенцы.

Пажыў так чалавек з жонкаю дзён колькі, а Дзіва карміла іх. Выйшлі дровы. Паехаў гаспадар у лес дровы секчы.

Прыходзіць поп да яго жонкі.

— Чуў я, што ў вас нейкае Дзіва ёсць. Ці не ад духа злога яно? — пытае жанчыну поп.— Пакажы мне яго.

— Сядайце, бацюшка, за стол, яно зараз увойдзе.

Селі.

— Дзіва, ідзі ў хату жыва!

А Дзіва не слухае.

Узяла жонка качаргу.

— Вось я ж табе! — ды па Дзіву качаргою! Прырасла качарга да Дзіва, а жанчына да качаргі.

Крычыць яна як можа:

— Ой, бацюшка! Памажы ад качаргі адарвацца!

Падышоў поп і гаворыць:

— Ды што гэта такое?

Узяўся бабу ратаваць і сам прырос.

Прыходзіць дзяк і кажа:

— Бацюшка! Што вы так доўга седзіцё! Абедню трэба служыць.

— Бачыш ты, бяда якая, ад качаргі не магу адарвацца.

— А бадай вам смешна было! — сказаў дзяк і хацеў папа адарваць, ды і сам да яго прырос.

Прыйшоў званар папа ратаваць і сам да яго прырос.

— Чаго вы паляпіліся тут? — спытаў, прыйшоўшы, царкоўны стараста і хацеў памагчы. Але як дакрануўся да папа, дык і сам прырос.

Прыйшла пападдзя, а поп крычыць:

— Не бярыся за качаргу, бо і ты прырасцеш! Бяжы пакліч шаптуху, каб памагла нам!

Пабегла матушка шаптуху клікаць. Прыйшла шаптуха. Шаптала, шаптала, узялася за качаргу і сама прырасла. Мітусяцца яны, як мухі каля гаршка. А тут Дзіва з месца зрушылася, усіх на двор пацягнула, з двара на вуліцу. Павыбягалі людзі на вуліцу, пазіраюць, адны смяюцца, другія ўздыхаюць. Кінуліся адны ў званы званіць, другія — харугвы браць, папа праваджаць. А Дзіва павалакло ўсіх, хто прырос, у лес. Ідуць цераз грэблю, да мастка падыходзяць. Выскаквае з-пад мастка чорт і кажа папу:

— Калі пусціш за царскія дзверы, то я цябе адарву.

Поп не толькі за царскія дзверы, а і на прастол абяцае пасадзіць чорта, абы ад качаргі адарвацца памог. Узяўся чорт адрываць папа ад качаргі, ды сам да яе прырос. І павяло іх Дзіва ў лес, туды, дзе гаспадар дровы сек.

Высек гаспадар шэсць дубін, самую тоўстую на чорта, і давай лупіць яго, прыгаворваючы: «А ты чаго тут? А ты чаго тут?» Біў, біў, а потым узяўся за качаргу, чорт і адстаў. Пусціўся ён у лес бегчы, ды так, што цэлую лінію і праламаў. Другую дубіну на папу пабіў. Пусціўся поп дадому бегчы, толькі валасы трасуцца і хламіда матаецца. Перабраў гаспадар усіх дубінамі, а сваё Дзіва на воз палажыў і прывёз дадому.

Перастаў тады поп Дзівам дзівіцца.

## ЗАЙКІНА ХАТКА[1]

Жылі-былі ў лесе лісічка і зайчык.

Жылі яны непадалёку адзін ад другога. Прыйшла восень. Холадна стала ў лесе. Надумаліся яны хаткі на зіму пабудаваць. Лісічка збудавала сабе хатку з труску-сняжку, а зайчык з труску-пяску. Перазімавалі яны ў новых хатках. Настала вясна, прыгрэла сонца. Лісічкіна хатка растала, а зайкіна стаіць, як стаяла. Прыйшла лісіца ў зайкіну хатку, выгнала зайку, а сама ў яго хатцы засталася. Пайшоў зайка з свайго двара, сеў пад бярозкаю ды плача. Ідзе воўк. Бачыць — зайка плача.

— Чаго ты, зайка, плачаш? — пытае воўк.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я з труску-пяску, а яна з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама ў ёй жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка. Пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з тваё хаты.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Воўк стаў на парозе зайкавай хаткі і крычыць на лісічку:

— Чаго залезла ў чужую хату? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае воўку:

— Ой, воўк, сцеражыся: мой хвост, як дубец,— як дам табе, дык будзе канец.

Перапалохаўся воўк ды наўцёкі, і зайку аднаго пакінуў. Сеў зноў зайка пад бярозкай ды горка плача. Ідзе праз лес мядзведзь. Бачыць — зайчык сядзіць пад бярозай і плача.

— Чаго, зайка, плачаш? — пытае мядзведзь.

— Як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Дык вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: пойдзем, я табе памагу, праганю лісічку з тваё хаты.

---

[1] Казка даецца ў апрацоўцы Якуба Коласа.

Пайшлі яны. Прыйшлі. Мядзведзь стаў на парозе зайкінай хаткі і крычыць на лісічку:

— Нашто адабрала ў зайкі хатку? Злазь, ліса, з печы, а то скіну, паб'ю табе плечы.

Не спалохалася лісічка, адказвае мядзведзю:

— Ой, мядзведзь, сцеражыся: мой хвост, як дубец,— як дам, дык будзе табе канец.

Спалохаўся мядзведзь ды наўцёкі, і зайку аднаго пакінуў. Зноў пайшоў зайка з свайго двара, сеў пад бярозкаю ды горка плача. Аж бачыць — ідзе праз лес пеўнік. Угледзеў зайчыка, падышоў і пытае:

— Чаго, зайка, плачаш?

— Ды як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адзін каля аднаго. Пабудавалі мы сабе хаты: я — з труску-пяску, а яна — з труску-сняжку. Настала вясна. Яе хатка растала, а мая стаіць, як стаяла. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з мае хаткі і сама там жыць засталася. Вось я сяджу ды плачу.

— Не плач, зайка: я выганю лісу з твае хаткі.

— Ой, Пеценька,— плача зайка,— дзе табе яе выгнаць? Воўк гнаў — не выгнаў. Мядзведзь гнаў — не выгнаў.

— А вось жа я выганю. Пойдзем,— кажа пеўнік.

Пайшлі. Увайшоў пеўнік у хатку, стаў на парозе, кукарэкнуў, а потым як закрычыць:

Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

А лісічка ляжыць ды кажа:

— Ой, певень, сцеражыся: мой хвост, як дубец,— як дам, дык будзе табе канец.

Скочыў пеўнік з парога ў хату ды зноў крычыць:

Я — пятух-чабятух,
Я — пявун-лапатун,
На кароткіх нагах,
На высокіх пятах.
Нясу касу на плячы,
Хачу ліску засячы.

І — скок на печ да ліскі. Дзюбануў лісу ў спіну. Як усхопіцца лісіца ды як пабяжыць вон з зайкінай хаткі, а зайка і дзверы зачыніў за ёю.

І застаўся ён жыць у сваёй хатцы разам з пеўнікам.

### РАЗУМНАЯ ДАЧКА[1]

Жыў адзін бедны чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка. Прыйшлося спраўляць радзіны. А ў чалавека таго ні хлеба, ні да хлеба. Чым гасцей частаваць?

---

[1] Казка даецца ў апрацоўцы А. Якімовіча.

Пайшоў бядняк на рэчку па ваду. Аж бачыць — ляжыць у кустах цялушачка. Ды такая слабая, лядашчая, што сама і не ўстане. Прынёс ён цялушачку дахаты і кажа жонцы:

— Давай зарэжам яе: будзе чым гасцей пачаставаць.

Спадабалася жонцы цялушачка — такая рыжанькая ды лысенькая.

— Не,— адказвае яна,— хай лепш гадуецца.

— Дык жа яна зусім кволенькая. Яе, відаць, нехта знарок выкінуў, каб у хляве не здохла.

— Нічога, можа, як і выгадуем. Падрасце дачка — будзе ёй малако.

Паслухаў чалавек жонку, і пачалі яны гадаваць цялушачку. Акрыяла тая, расце, як на дражджах. І дачка таксама расце, як на дражджах. Ды такая разумніца ўдалася, што і старыя ахвотна слухаюць яе.

Выгадавалася з лысенькай цялушачкі слаўная карова.

Падрасла дзяўчынка, стала ёй сем гадоў, пачала сама пасвіць карову.

Загледзеўся аднойчы багаты сусед на карову бедняка.

— Адкуль у цябе такая добрая карова? — пытаецца.

Бядняк і расказаў яму ўсё, як было.

— Эге,— кажа багацей,— дык гэта ж мая цялушка! Гэта я выкінуў яе — не падумаў, што яна на ногі ўстане. Не, тады я забяру сваю карову назад...

Зажурыўся бедны чалавек.

— Я ж яе гадаваў,— кажа.— І яна цяпер мая.

Не згаджаецца багаты:

— Не аддасі па-добраму,— пойдзем да пана на суд.

Што рабіць? Пайшлі да пана на суд.

Багаты падаў пану руку, прывітаўся: ведама, багаты з багатым свае людзі. Пан кажа яму:

— Садзіся ў мяне.

Багаты сеў у крэсла, а бедны стаіць ля парога, шапку зняўшы. Пан на яго і не глядзіць.

— Ну, што добрага скажаш? — пытаецца пан у багатага.

— Дык вось, пане, якая справа,— пачаў скардзіцца багаты.— Сем гадоў таму назад гэты чалавек забраў маю цялушку і цяпер не аддае...

Выслухаў пан і бедняка. А потым кажа ім:

— Добра. Суд мой будзе такі. Загадаю вам тры загадкі: што на свеце сыцей за ўсё? што на свеце саладзей за ўсё? што на свеце шпарчэй за ўсё? Хто адгадае, таму і карова застанецца. А цяпер ідзіце дахаты, падумайце. Заўтра прыйдзеце з адгадкамі.

Вярнуўся бедны чалавек дахаты, сеў і плача.

— Чаго ты, тата, плачаш? — пытаецца дачка.

— Ды так і так,— адказвае бацька,— хоча багаты сусед адабраць у нас карову. Пайшлі мы з ім да пана на суд. А той загадаў нам тры загадкі. Хто з нас адгадае, таму і карова застанецца. Дзе ж мне адгадаць тыя загадкі!

— А якія, тата, загадкі? — пытаецца дачка.

Бацька сказаў.

— Нічога, тата, не турбуйся,— кажа дачка.— Кладзіся спаць. Раніца за вечар мудрэйшая: заўтра што-небудзь прыдумаем.

А багаты прыйшоў дадому і радуецца:

— Ну, баба, карова будзе наша! Трэба нам з табою толькі адгадаць тры загадкі: што на свеце сыцей, што саладзей і што шпарчэй?

— Вось дзіва! — усміхнулася жонка.— Тут і адгадваць няма чаго. Сыцей за нашага рабога парсюка нікога на свеце няма. Саладзей за ліпавы мёд ад нашых пчол таксама няма нічога. А шпарчэй за нашага гнедага жарабца ніхто не зможа бегчы: ён жа як памчыцца, дык і вецер не дагоніць!

— Праўда,— згадзіўся мужык,— так я і скажу пану.

Назаўтра прыходзяць бедны з багатым да пана.

— Ну што: адгадалі мае загадкі? — пытаецца пан.

Багаты выйшаў наперад:

— Ды тут і адгадваць няма чаго: нікога і нічога на свеце няма сыцей за майго рабога парсюка, саладзей за ліпавы мёд ад маіх пчол і шпарчэй за майго гнедага жарабца.

— А ты,— пытаецца пан у бедняка,— адгадаў?

— Адгадаў, пане: няма нічога сыцей за зямлю, бо яна ўсіх корміць; няма нічога саладзей за сон, бо хоць якое гора, а заснеш, дык і забудзешся; і няма нічога шпарчэй за людскія думкі, бо сам ты яшчэ тут, а думкі ўжо далёка-далёка...

Правільна адгадаў бядняк! Прыйшлося пану прысудзіць яму карову.

— Хто гэта цябе навучыў так адказваць на мае загадкі? — пытаецца пан у бедняка.

— Мая дачка-сямігодка.

Здзівіўся пан: не можа таго быць, каб такая малая беднякова дачка адгадала яго загадкі! Захацелася яму паглядзець разумную дзяўчынку. Прыехаў ён аднойчы да бедняка, а той якраз з жонкаю ў полі быў. Сустрэла пана беднякова дачка-сямігодка.

— Дзяўчынка,— пытаецца пан,— да чаго мне коней прывязаць?

Паглядзела дзяўчынка на сані і калёсы, што стаялі на двары, і кажа:

— Можаш да зімы прывязаць, а можаш і да лета.

Пан і вочы вылупіў: як гэта можна коней прывязаць да зімы або да лета? Смяецца, відаць, з яго гэтае дзяўчо?

— Ну, хоць да саней прывяжы, а хоць да калёс,— растлумачыла дзяўчынка.

Бачыць пан: беднякова дачка сапраўды надта разумная. Не гонар гэта пану. Дачуюцца людзі, што яна разумнейшая за яго, тады хоць з маёнтка ўцякай.

Пагаварыў пан з дзяўчынкай і паехаў, а ёй сказаў, каб увечары бацька да яго прыйшоў. Прыйшоў увечары бядняк да пана.

— Нішто,— кажа пан,— разумная твая дачка. Але я ўсё ж разумнейшы.

Даў пан бедняку рэшата яек.

— На,— кажа,— занясі дачцы і скажы, каб яна пасадзіла на іх квактуху і вывела мне да заўтра куранят на снеданне. А не зробіць гэтага — загадаю бізуноў даць.

Прыйшоў бядняк дахаты засмучаны. Сеў на лаве і плача.

— Чаго ты, тата, плачаш? — пытаецца дачка.

— Ды вось, дачушка, бяда якая: загадаў табе пан новую загадку.

— Якую?

Бацька паказаў дачцы рэшата з яйкамі:

— Сказаў, каб на гэтыя яйкі квактуху пасадзіла і вывела куранят да заўтра яму на снеданне. Хіба ж гэта можна зрабіць?

Дачка падумала і кажа:

— Нічога, тата. Заўтра што-небудзь прыдумаем. А пакуль што бяры, мама, гэтыя яйкі, пячы яечню на вячэру.

Раніцай дачка кажа бацьку:

— На табе, тата, гаршчок, ідзі да пана. Скажы, каб ён за дзень ляда высек, выкарчаваў і ўзараў, проса пасеяў, зжаў і змалаціў ды ў гэты гаршчок насыпаў — куранят карміць.

Пайшоў бацька да пана, падаў яму пусты гаршчок і сказаў усё, як дачка загадала.

Пан падкруціў вусы, паморшчыўся і кажа:

— Разумная твая дачка, ды я ўсё ж разумнейшы!

Узяў ён тры сцяблінкі ільну, падаў бедняку:

— Скажы дачцы, каб яна да заўтра гэты лён сцерла, спрала, выткала і пашыла мне з яго кашулю.

Вярнуўся бацька дахаты засмучаны. Дачка пытаецца:

— Што сказаў табе пан?

Падаў бацька ёй тры сцяблінкі ільну і расказаў, што пан загадаў.

— Нічога,— адказвае дачка,— кладзіся, тата, спаць: заўтра што-небудзь прыдумаем.

Назаўтра дае дачка бацьку тры кляновыя дубчыкі і кажа:

— Занясі пану і папрасі, няхай ён іх пасадзіць, за адну ноч вырасціць і зробіць варштат для кросен, каб было на чым палатно яму для кашулі выткаць.

Пайшоў бядняк да пана, падаў тры дубчыкі і сказаў, як дачка навучала.

Пачырванеў пан і кажа:

— Разумная твая дачка — нічога не скажаш. Ды я ўсё ж разумнейшы! Перадай жа ты ёй, каб яна да мяне ні пехатою прыйшла, ні на кані прыехала, не голая і не адзетая, і каб падарунак мне прынесла, а я каб не мог яго прыняць. Калі зробіць усё гэта, то вазьму яе за дачку — вырасце, паняй будзе! А не зробіць — дрэнна ёй будзе...

Вярнуўся бацька дахаты яшчэ больш засмучаны

— Ну, што табе, тата, пан сказаў? — пытаецца дачка.

— Ды вось, дачушка, нарабіла ты сваімі адгадкамі бяды і нам і сабе...

Расказаў ёй бацька, што пан загадаў.

Дачка засмяялася:

— Нічога, тата. Як-небудзь абдурым пана і на гэты раз. Злаві ты мне толькі жывого зайца.

Пайшоў бацька ў лес, паставіў сіло і злавіў зайца.

Дачка закруцілася ў рыбацкую сетку замест сукенкі, села на кіёк і паехала з зайцам да пана.

Пан стаіць на ганку і дзівіцца: зноў перахітрыла яго беднякова дачка! Узлаваўся ён і нацкаваў на яе сабак — думаў, тыя разарвуць разумніцу. Дзяўчынка выпусціла з рук зайца — сабакі і памчаліся за ім.

Падышла яна да пана.

— Лаві,— кажа,— свой падарунак: вунь у лес пабег.

Прыйшлося пану ўзяць разумную дзяўчынку за дачку.

Паехаў неўзабаве пан за граніцу, а дзяўчынцы сказаў:

— Глядзі ж, каб ты тут без мяне не судзіла маіх людзей, бо дрэнна табе будзе.

Засталася дзяўчынка адна ў маёнтку.

Здарылася ў гэты час такая справа. Пайшлі два дзядзькі на кірмаш. Адзін купіў калёсы, другі — кабылу. Запрэглі кабылу ў калёсы і паехалі дамоў. Па дарозе спыніліся адпачыць. Ляглі і паснулі. А як прачнуліся, бачаць: бегае ля калёс малое жарабятка. Дзядзькі заспрачаліся. Той, чые калёсы былі, кажа: «Жарабя маё,— гэта мае калёсы ажарабіліся!» А той, чыя кабыла, сваё даводзіць: «Не, жарабя маё,— гэта мая кабыла ажарабілася!»

Спрачаліся, спрачаліся ды парашылі ехаць да пана на суд.

Прыехалі, а пана няма дома.

— Рассудзі хоць ты нас,— просяць дзядзькі прыёмную панскую дачку.

Даведалася дзяўчынка, што ў іх за справа, і кажа:

— Няхай той з вас, чыя кабыла, выпража яе з калёс ды вядзе ў руках, а той, чые калёсы, няхай цягне іх на сабе ў другі бок. За кім жарабя пабяжыць, той яго і гаспадар.

Дзядзькі так і зрабілі. Жарабя пабегла за кабылаю. На гэтым і спрэчка ў іх скончылася.

Вярнуўся пан з-за граніцы і дачуўся, што разумная дзяўчынка без яго суды судзіла. Узлаваўся ён, нарабіў крыку:

— Што ж ты не паслухала мяне? Бяры сабе з маёнтка, што пажадаеш, ды ідзі дахаты, каб я цябе больш не бачыў!

— Добра,— кажа дзяўчынка.— Але мне хочацца на адыход цябе віном пачаставаць.

— Частуй,— буркнуў пан.— Толькі хутчэй.

Напаіла яго дзяўчынка віном, пан і заснуў без памяці. Загадала тады яна слугам запрэгчы каня, палажыла пана ў карэту і павезла дахаты. Дома з бацькам зняла яго з карэты ды перанесла ў сенцы на салому.

— Вось табе,— кажа,— пасцель замест пярынаў. Ачухвайся тут.

Прачнуўся назаўтра пан, разглядаецца — дзе ж гэта ён? Убачыў сваю прыёмную дачку, якую прагнаў, і пытаецца:

— Чаму я тут, у бруднай мужыцкай хаце, ляжу?

— Ты сам так захацеў,— смяецца дзяўчынка.— Ты сказаў мне:

«Бяры сабе з маёнтка, што пажадаеш, ды ідзі дахаты». Я і ўзяла цябе. Уставай ды ідзі замест бацькі паншчыну адбываць. Ты мужык дужы, работнік з цябе будзе не дрэнны.

Пачуўшы гэта, пан усхапіўся на ногі і так драпануў, што толькі яго і бачылі. Нават ад коней з карэтаю адрокся.

## ПАНУ НАВУКА[1]

Ну, дык слухайце! Скажу вам не казку, а праўду.

Было гэта яшчэ за панамі. А ліхія ж былі паны! Не людзі, а звяр'ё. Трапіш да такога пана, то хоць кладзіся ды памірай: нічым яму не дагодзіш. Кажуць жа: зачыні чорту дзверы, дык ён у акно ўлезе. Гэтак і пан. Ты яму выстранчаеш, шчыра робіш, а ён усё крычыць: «Не так, шэльма, не так, галган, не так, пся крэў!» І есць цябе поедам, здзекуецца, зневажае. А чуть што не ўнаровіш — жыўцом скуру зніме.

Ой цяжка, вельмі цяжка было жыць за панамі!

Дык вось. Быў у адным маёнтку такі ліхі пан. Чаго ён толькі не вытвараў! Як толькі не здзекаваўся з людзей! Не аднаго насмерць засек. Прыгонных сваіх і за людзей не лічыў.

Загадаў аднойчы паганы пан, каб усе, хто мае валоў на продаж, прыводзілі іх толькі ў яго маёнтак. Паставіў па канцах сяла варту і не дазваляў праехаць туды ніводнаму купцу. Прывядзе хто вала ў маёнтак на продаж, а пан паглядзіць і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл!

І заплаціць, як за казла. А хто пярэчыць уздумае — пашле на стайню ды ўсыпле розаг.

Доўга мучыліся людзі з такім паганым панам, доўга цярпелі — бо што зробіш, каму паскардзішся? Паны ж тады ўсюды сядзелі — і ў маёнтках і ў судах.

Ды знайшоўся нарэшце адзін чалавек, што адплаціў пану за ўсе людскія слёзы і крыўды.

Гэта быў здатны і ўдалы дзяцюк. Звалі яго Рымша. Рана ён асірацеў, але і адзін неяк такі ўзбіўся на гаспадарку. Горды быў хлапец Рымша. Ніхто не адважваўся яго і пальцам крануць.

Прывёў Рымша ў маёнтак вала прадаваць. Выйшаў пан на ганак і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл!

Глянуў Рымша, што нікога блізка няма, паказаў пану папліску ды пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прывёў табе вала, а не казла!

І давай дубасіць пана папліскаю. Біў, біў, пакуль рука не забалела.

— Вось табе,— кажа,— за тое, што з людзей здзекуешся! Калі вычухаеш, чакай мяне ў госці.

Сказаў гэта Рымша, кінуў вала і ўцёк у лес.

---

[1] Казка даецца ў апрацоўцы А. Якімовіча.

Знайшлі дваровыя людзі пана без памяці — так змясіў яго Рымша. Толькі на трэці дзень апрытомнеў пан.

— Злавіць мне Рымшу! — загадаў ён слугам.

Ды дзе там! Таго і след ветрам замяло. Лясы даўней былі цёмныя, густыя. Жыві ў іх колькі хочаш, ніхто цябе і не ўбачыць.

Мінае дзень за днём, а пан ніяк ачуняць не можа. Якіх толькі дактароў ні клікалі — ніхто рады не дасць: мусіць, яму Рымша добра такі адсадзіў пячонкі.

Тым часам прыехаў у маёнтак новы доктар з поўным сундуком усялякіх лекаў. Паклікаў пан да сябе новага доктара, частуе і просіць, каб палячыў яго.

— Добра,— кажа доктар,— я пана вылечу. Трэба толькі нацяпліць лазню.

Нацяплілі слугі лазню. Павёў доктар пана ў лазню, пасадзіў на палок ды загадаў трымацца аберуч за жэрдку. А сам пачаў націраць яго ўсялякімі мазямі.

Сядзіць пан, трымаецца за жэрдку ды толькі крэхча.

Але нядоўга ён крахтаў. Дастаў неўзабаве доктар з кішэні сырамятны пасак, прывязаў ім да жэрдкі панавы рукі і заткнуў яму вехцем рот. Пасля ўзяў папліску і кажа:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла...

Бачыць пан, што гэта Рымша, а не доктар, хоча крычаць, ды не можа — вехаць у горле!

Круціцца пан, як уюн на гарачай патэльні, а Рымша лупіць яго пaпліскаю па чым папала. Траха не ўсю скуру садраў з пана. Потым сеў на каня і паехаў. Толькі яго і бачылі.

Доўга хварэў пан. Усе думалі, што капцы ўжо яму. Ды ліхога і смерць не бярэ: пад вясну акрыяў пан і надумаўся за граніцу, на воды, ехаць. Пачаў збірацца, а тут якраз грошай не хапае. Парашыў ён прадаць лес. Пусціў пагалоску, і пачалі прыязджаць купцы аглядаць лес. Таргаваліся, таргаваліся, ды ніяк не могуць у цане сысціся: пан, бач, скупы быў і надта даражыўся.

Аднаго дня прыехаў у маёнтак нейкі вельмі ж багаты з выгляду купец. Павёў яго пан аглядаць лес. Пан хваліць лес, хоча даражэй з купца злупіць, а купец усё падтаквае яму ды адводзіць далей у гушчарнік. Забраліся яны ў такую нетру, што і свету не відаць. Тут купец давай рукамі хвоі абнімаць, сажнем таўшчыню мераць. Абхапіў і пан адну хваіну.

— Вось,— кажа,— глядзі, якая калодзішча! Золата, а не лес.

А купец выхапіў з кішэні пасак ды прывязаў пана да хвоі. Потым дастаў з-пад крыса папліску, паказаў пану і пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла!

І пачаў пярэсціць пана...

Біў, біў колькі ўлезла ды так і пакінуў прывязаным да хвоі. Увесь дзень прастаяў пан каля дрэва, пакуль не знайшлі яго дваровыя людзі.

Можа, з год пасля таго пракачаўся пан, а ўсё няма ачунку.

Зноў раяць яму дактары ехаць на воды. Прадаў пан лес, збожжа, жывёлу. Набраў шмат грошай і сабраўся ехаць за граніцу, на воды. А Рымша ўсё цікуе за панам. Даведаўся ён, па якой дарозе будзе ехаць пан, і зрабіў на яго пастку: паставіў у лесе за ганок трое адзін ад аднаго двух конных хлапцоў з паплёскамі.

Пад'ехаў пан да першага хлапца, а той здалёк патрос паплёскаю і крычыць:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза?

— Хапай, хапай яго! — крычыць пан на фурмана.— Гэта ж Рымша!

Фурман шась нажом па пастронках, сеў на прыпражнога каня і пагнаўся за хлапцом.

Як толькі ён знік з вачэй, да панскага воза пад'ехаў другі такі ж хлапец. Замахнуўся паплёскаю і кажа:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза?

— Хапай, хапай яго, галгана! — закрычаў пан на лёкая.— Гэта ж Рымша!

Ускочыў лёкай на другога каня і памчаўся за хлапцом. Застаўся пан адзін у карэце. Тут ні адсюль ні адтуль перад ім апынуўся сам Рымша. Дастаў ён з-пад крыса паплёску, патрос ёю і пытаецца:

— Што гэта, пане: бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла!

Збіў Рымша пана на горкі яблык, забраў грошы і пайшоў у лес, у сваю зямлянку.

Шмат дабра потым рабіў Рымша бедным людзям: і грашыма памагаў, і ад ліхіх паноў бараніў.

Яшчэ і да гэтага часу ў цёмным лесе паміж Заполлем і Навасёлкамі стаіць гара. Завуць яе Рымшаваю гарою. Кажуць, там і жыў той горды і смелы дзяцюк Рымша.

## ЦУДОЎНАЯ ДУДКА[1]

Даўно яно было ці нядаўна, так ці не так,— цяпер ужо напэўна ніхто і не ведае.

Ну, дык раскажам мы тое, што дзяды расказвалі сваім унукам, а ўнукі — сваім унукам.

Жылі некалі ў адным краі людзі ў згодзе ды ў ладзе. Зямлі многа, усюды вольна — адзін аднаму не перашкаджалі, а прыйдзе да каго бяда — адзін аднаму дапамагалі, бяду перамагалі.

Але вось панадзіўся аднекуль лятаць у той край страшэнны змей. Пачаў ён лятаць, людское дабро хапаць, сабе ў змяінае логава цягаць.

Нацягаў дабра — дзяваць няма куды! Надумаўся ён тады сабе харомы будаваць. Ды сам рабіць і не ўмее, і лянуецца. Не прывык змей працаваць. Пачаў ён людзей лавіць, у сваё змяінае царства насіць.

Наловіць людзей і прымушае іх харомы будаваць, глыбокімі

[1] Казка даецца ў апрацоўцы А. Якімовіча.

канавамі абкопваць, высокімі насыпамі абсыпаць, густою агароджаю абстаўляць. А служкам сваім — цівунам ды гайдукам — загады дае: людзей не шкадаваць, біць іх, караць.

Робяць людзі на змея як дзень, так ноч, працуюць, гаруюць, горкую долю праклінаюць, без пары паміраюць.

А змей усё новых людзей хапае. Нарабіў ён сабе людскою працаю безліч харомаў, праклаў між імі дарогі, наставіў платоў-агароджаў.

Пухнуць людзі з голаду, мруць, як мухі. І чым далей, тым горай: няма ратунку ад змея.

Але вось пастарэў змей, знясілеў і ляжыць, як здыхата, не можа ўжо людзей і іхняе дабро хапаць.

Тым часам змеевы служкі — цівуны ды гайдукі — самі панамі parabіліся ды пачалі са змеевых харомаў распаўзацца, за людзьмі ганяцца. І стала людзям яшчэ горш ад паноў, як ад таго дохлага змея. Нідзе ад іх не схаваешся: запаланілі яны ўвесь край.

А каб не быць да людзей падобнымі, навыдумлялі сабе паны розных новых імён ды прозвішчаў. Хто назваў сябе Ваўком, хто Мядзведзем або іншым зверам, хто Каршуном, Варонай, а хто якім дрэвам.

Вось адкуль і ўзяліся паны Ваўкі, Свінскія, Асінскія... Простых жа людзей цяпер яны інačай, як быдлам, і не называлі.

Служаць людзі дохламу змею, служаць панам, апошняе ім аддаюць, а самі ў голадзе ды холадзе за працаю свету не бачаць.

Гэтак і жывуць. Адны паміраюць, другія нараджаюцца, а палёгкі няма ніякай. І ніхто не ведае, што зрабіць, каб жыццё змяніць.

Ды вось нарадзіўся ў тым краі хлопчык. Быў ён вельмі ж слабенькі: як заняпаў змалку, дык ніяк і паправіцца не можа. Такі ўдаўся кволы, што нават паны яго не чапаюць, на паншчыну не ганяюць: нікому ён не патрэбны.

Вырас ён ужо, у гады ўвайшоў, а ўсё толькі з дзецьмі гуляе, як маленькі. І празвалі яго людзі Іванкам Прастачком.

Сядзіць Іванка Прастачок узімку на печы, цацкі з лучынак складае, а ўлетку пясок на прызбе перасыпае.

Трапілі аднойчы ў тую вёску, дзе жыў Іванка Прастачок, тры старцы-падарожнікі. Куды ні зойдуць — усюды пуста, ні жывой душы: усіх паны на работу пагналі.

Убачылі старцы на прызбе Іванку і зайшлі на яго двор адпачыць.

Селі, адпачылі, люлькі тытунём набілі. Памацалі ў кішэнях — ды ні ў кога крэсіва няма, каб агню выкрасаць. Просяць старцы ў Іванкі агню. Пайшоў Іванка ў хату, набраў з прыпечку жару ды вынес старцам.

Закурылі старцы люлькі, падзякавалі Іванку і пытаюцца, што ён дома робіць.

— Пясок на прызбе перасыпаю,— адказвае Іванка.— Бо ўсё роўна, што ні рабі, то на паноў ідзе...

Паслухалі старцы Іванку, галовамі паківалі, потым леры ўзялі ды гучна зайгралі.

Першы раз зайгралі — вялікі розум Іванку далі.

Другі раз зайгралі — талент да слова і музыкі далі.

Трэці раз зайгралі — на паноў у сэрца гневу нагналі.

Пайшлі старцы, а Іванка чуе, як светла стала ў яго думках, як гнеў на паноў забушаваў у сэрцы... Пачаў ён за справу брацца, у свет збірацца.

Зрабіў дудку-весялушку ды так зайграў, што не толькі людзі — звяры і птушкі заслухаліся.

І стаў Іванка між людзей хадзіць, на цудоўнай дудцы іграць, праўду пра змея і яго слуг казаць.

Пачалі людзям вочы адкрывацца. Убачылі яны, што вялікая крыўда на свеце жыве: адны пануюць, а другія гаруюць, адны багаццю ліку не маюць, а другія з голаду паміраюць.

І дзе ні пройдзе Іванка,— людзі там розуму ад яго набіраюцца, за вілы і сякеры хапаюцца ды з ліхімі панамі змагаюцца.

Думаюць паны, гадаюць, як Іванку са свету звесці.

Пачалі яны войска збіраць, Іванку шукаць. Чуюць голас на ўсходзе — шусь туды. Шаблі звіняць, пікі, як лес, тырчаць, гарматы, як гром, грымяць, а Іванкі нідзе не відаць...

Спыняцца паны з войскам, слухаюць, стаяць. Аж раптам чуюць голас на захадзе — Іванкава дудка іграе, людзей навучае, на вялікую бітву ўзнімае. Толькі пошчак ідзе-гуляе ад сяла да сяла, ад краю да краю.

Кінуцца паны на захад. Коні як віхор ляцяць, шаблі звіняць, гарматы страляюць, а дзе Іванка — не знаюць.

І з таго часу змеевым слугам ні ўдзень, ні ўночы няма спакою. Як толькі дудку пачуюць, дык адразу мароз у іх па скуры пойдзе, бо чакаюць яны сабе бяды, як вол доўбні.

Дудка ж свішча, дудка іграе, пошчак далёка па свеце гуляе, людзей збірае. Яго ні злавіць, ні з гармат не забіць. Усюды ён шлях пракладае, ніякіх межаў не знае.

Іграе дудка, іграе, а прыйдзе час — усіх паноў пазнішчае.

## ПАЎЛЮК БАГРЫМ

Паўлюк Восіпавіч Багрым нарадзіўся ў 1813 г. у мястэчку Крошын каля Баранавіч. Першапачатковую адукацыю атрымаў у мясцовай сялянскай школе. За распаўсюджанне антыпрыгонніцкіх вершаў Багрыма здалі ў рэкруты. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў у Крошыне кавалём. Са следчых матэрыялаў вядома, што паліцыя канфіскавала некалькі сшыткаў рукапісных вершаў паэта. Захаваўся толькі адзіны яго верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы», які вылучаецца паэтычнасцю і грамадзянскім зместам.

Памёр Паўлюк Багрым каля 1890 г.

### ЗАЙГРАЙ, ЗАЙГРАЙ, ХЛОПЧА МАЛЫ...

Зайграй, зайграй, хлопча малы,
І ў скрыпачку і ў цымбалы,
А я зайграю ў дуду,
Бо ў Крошыне жыць не буду.

Бо ў Крошыне пан сярдзіты,
Бацька кіямі забіты,
Маці тужыць, сястра плача:
«Дзе ж ты пойдзеш, небарача?..»

Дзе ж я пайду? Мілы божа!
Пайду ў свет, у бездарожжа,
У ваўкалака абярнуся,
З шчасцем на вас азірнуся.

Будзь здарова, маці міла!
Каб ты мяне не радзіла,
Каб ты мяне не карміла,
Шчасліўшая ты бы была!

Каб я каршуном радзіўся,
Я бы без паноў абыўся:
У паншчыну б не пагналі,
У рэкруты б не забралі
І ў маскалі[1] не аддалі.

Мне пастушком век не быці,
А ў маскалях трудна жыці,
А я і расці баюся,
Дзе ж я, бедны, абярнуся?

Ой, кажа́не, кажане́!
Чаму ж не сеў ты на мяне?
Каб я больш не падрос
Ды ад бацькавых калёс.

## ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Францішак Казіміравіч Багушэвіч нарадзіўся 21 сакавіка 1840 г. у былым фальварку Свіраны, непадалёку ад Вільні. Маленства паэта прайшло ў Кушлянах на Ашмяншчыне. У 1861 г. Ф. Багушэвіч скончыў Віленскую гімназію і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, адкуль за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны. Вярнуўся на радзіму, працаваў настаўнікам у Доцішках (Воранаўскі раён).

Ф. Багушэвіч прымаў удзел у паўстанні 1863 г. Каб пазбегнуць за гэта пакарання, пераехаў на Украіну, дзе паступіў вучыцца ў Нежынскі юрыдычны ліцэй (1865—1868). Пасля заканчэння ліцэя працаваў у судовых установах на Украіне і ў Расіі. Пасля аб'яўленай паўстанцам амністыі ў 1864 г. вярнуўся на радзіму і працаваў адвакатам пры акруговым судзе ў Вільні, адначасова актыўна займаўся літаратурнай і публіцыстычнай дзейнасцю. У 1885—1891 гг. Багушэвіч супрацоўнічаў у дэмакратычным польскім часопісе «Край», што выдаваўся ў Пецярбургу. Першы зборнік вершаў «Дудка беларуская» быў надрукаваны ў 1891 г. у Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок. Асобным выданнем у 1892 г. у Кракаве выйшла апавяданне «Тралялёначка».

Другі зборнік «Смык беларускі» з'явіўся ў Познані ў 1894 г. пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава. У газеце «Наша ніва» ў 1907 г. былі надрукаваны апавяданні Ф. Багушэвіча «Сведка», «Палясоўшчык», «Дзядзіна».

Кніга вершаў «Беларуская скрыпачка» і зборнік апавяданняў «Беларускія расказы Бурачка», падрыхтаваныя Багушэвічам да друку, былі забаронены царскай цэнзурай і дагэтуль не адшуканы.

Памёр Ф. Багушэвіч 28 красавіка 1900 г.

Францішак Багушэвіч — першы нацыянальны паэт Беларусі, заснавальнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. Шмат якія творы паэта трывала ўвайшлі ў дзіцячае чытанне: прысвечаны тэме лёсу дзяцей верш «Калыханка», а таксама сацыяльна насычаныя вершы «Мая дудка», «Бог не роўна дзеле», «Чаго бяжыш, мужычок?», «Гора», паэма «Кепска будзе».

[1] М а с к а л ь — салдат царскай арміі.

## БОГ НЕ РОЎНА ДЗЕЛЕ

Бог сіроты любе,
але долі не дае.

*(Прыказка)*

Чым то дзеецца на свеце,
Што не роўна дзеле бог? —
Адзін ходзе у саеце,
У золаце з плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай — велькі труд;
Весь, як рэшата, свіціцца,
Адны латы, адзін бруд!
Адзін мае хатаў многа,
А вялікіх,— касцёл моў;
Увясці б туды хоць бога,
І той бы з іх не пайшоў.
У другога ў сцяне дзюры,
Вецер ходзе, дым і снег;
Тут карова, свінні, куры...
Тут пакута, тут і грэх!
Гэты едзе у вагоне,—
Цёпла, мякка, толькі жыць!
А ляціць, як віхар гоне,
А ён сабе толькі спіць!
Той ў мяцеліцу, ў марозе,
Што аж вон яму прэ дух,
Паўзе з клункам па дарозе,
У снягу увесь па брух!
Гэты хлеба і не знае,
Толькі мяса ды пірог,
І сабакам выкідае
Усё тое, што не змог.
А той хлеб жуе з мякінкай,
Хлёбча квас ды лебяду,
Разам жывець і есць
з свінкай,
З канём разам п'ець ваду!
Аднаму дзесяткі-служкі
Зарабляюць сотні сот;
Рукі ў яго, як падушкі,
Як кісель, дрыжыць жывот!
Другі ж сам аж на дзесятак
Працуючы, лье свой пот,
А высахшы, як аплатак,
Цянюсенькі, як той кнот.

## ВОЎК І АВЕЧКА

Злавіў воўк ягнятка
І панёс жывое!
Плачуць сын і матка,
Як бабры, абое.
Воўк над маткай злітаваўся,
Як які аконам,
У аўчынку перабраўся
Ды ідзець з паклонам.
«Прыйшоў, кажа, я здалёчку
Расказаць пані авечца
Добру вестку аб сыночку,—
Як яму цяпер жывецца.
Не пазнала б ты ніколі,
Такі стаў дасужы
І жывець сабе на волі,
Без бяды, без нужы.
Зубы выраслі з клыкамі,
І адпалі рожкі,
Ножкі цяпер з пазурамі,
Хвост даўжэйшы трошкі.
І ўжо воўка не баіцца,
Ў хлеў ніхто не гоне;
Мае чым абараніцца
І другіх бароне!
Прыйдзі, імасць, да нас ў госці,
Справім сабе вечарынку:
Будзе мяса, будуць косці,
Будзем есць без адпачынку!»
— «Дзякуй, дзякуй, ягамосці,
За весці такія!
Няхай прыйдзе сын у госці,
Пагляджу, ці вые?
Бо, кажуць, між вамі
Трэба выць ваўкамі.
Я ж па-воўчу не умею
Ні выць, ні есці, ні лгаць.
Ды скінь скурку, дабрадзею,
Бо зубкі відаць».
І авечка, хоць дурная,
А воўка ж пазнае!

## КАЛЫХАНКА

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі,
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці...
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачынькай...
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі!..
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А усякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Можа будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі,
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тагды матка прыйдзе ў госці,—
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць матку боску,
Каб забыцца ей аб сыне,
Каб не ведаць, гдзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі!
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі!..

# АДАМ ГУРЫНОВІЧ

Адам Гіляры Калікставіч Гурыновіч нарадзіўся 25 студзеня 1869 г. у былым фальварку Кавалькі Пастаўскага павета (цяпер Мядзельскі раён). Скончыў Віленскае рэальнае вучылішча (1887), вучыўся ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце (1887—1893). У гады вучобы ў Пецярбургу прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. З 1889 г. А. Гурыновіч становіцца членам, а затым і старшынёй падпольнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай», члены якога распаўсюджвалі сярод студэнтаў, рабочых, сялян марксісцкую літаратуру. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1893 г. быў арыштаваны і адпраўлены ў Петрапаўлаўскую крэпасць, але праз паўгода з-за цяжкай хваробы быў вызвалены і знаходзіўся пад наглядам паліцыі ў Крыстынопалі на Віленшчыне, дзе жылі яго бацькі. Тут ён захварэў на чорную воспу і 29 студзеня 1894 г. памёр.

Паэт-дэмакрат Адам Гурыновіч пісаў на беларускай, рускай і польскай мовах, многія яго вершы прасякнуты рэвалюцыйным пафасам. Ён збіраў фальклорныя творы і пры жыцці выдаў у Кракаве ў 1893 г. невялікі «Зборнік беларускіх твораў...» (165 песень і 37 загадак). Упершыню паэтычныя творы А. Гурыновіча апублікаваны толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у 1921 г. У яго спадчыне ёсць вершы і для маленькага чытача — «Каток», «Рыбак».

А. Гурыновіч вядомы і як перакладчык. На беларускую мову ён пераклаў асобныя творы А. Пушкіна, І. Крылова, М. Някрасава, А. К. Талстога, А. Міцкевіча, Я. Каспровіча, Э. Ажэшкі, І. Франко.

### КАТОК

Сядзіць над вадою маленькі каток,
Глядзіць ён на рыбкі, разінуў раток.
Хацеў бы дастаць іх — баіцца скакнуць,
Баіцца вадою ён ног абмакнуць.

А хлопчык маленькі над кніжкай сядзіць.
Яе ён раскрыўшы, на вершы глядзіць.
І рад бы вучыцца, хацеў бы ўсё знаць —
Ды шкода галоўкі сваёй бедаваць.

Ах, дарма, мой хлопчык, напрасна, дзіця,—
Пячоныя пташкі у рот не ляцяць.
Калі ты што-кольвек захочаш пазнаць,
То мусіш не мала над тым працаваць.

### РЫБАК

Стаіць рыбак над вадою
Ловіць рыбіну вудою:
Стаяў, стаяў ён дзень цэлы —
Ані рыбкі не прыспела.
Скора сонца за лес сядзіць,
Аж за вудку нехта цягніць.
Учапіўся карась нейкі,
Такі дрэнненькі, маленькі.
Рыбаку ён стаў казаці:
«Мяне варта адвязаці
І выпусціць, зняўшы з вуды,
Бо ці ж варта вастрыць зубы
На маленькую такую,
Як я, рыбіну худую?
Пусці ў раку — раздабрэю,
Год ці два — якраз прыспею;
Як вырасту — смачны буду,
Учаплюся сам на вуду».
«Добра, добра»,— рыбак скажа.
Ды той дурны, хто так кажа
І на заўтра адкладае,
І што мае, то кідае.
Па мне, розуму не мае,
Хто, злавіўшы,— з рук пускае.

## ЦЁТКА

Цётка (Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч) нарадзілася 15 ліпеня 1876 г. у фальварку Пешчына Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці). Першапачатковую адукацыю атрымала дома ў вандроўных настаўнікаў. У 1894 г. паступіла адразу ў IV клас Віленскай прыватнай жаночай гімназіі В. М. Прозаравай, але цяжкая хвароба лёгкіх прымусіла яе пакінуць вучобу. Некаторы час працавала ў вёсцы настаўніцай. У 1902 г. закончыла гімназію і атрымала пасведчанне на званне хатняй настаўніцы арыфметыкі. У 1903—1904 гг. вучылася ў Пецярбургу на курсах выхавальніц і кіраўніц фізічнай адукацыі П. Ф. Лесгафта, а пасля працавала фельчаркай у Нова-Вілейскай лячэбніцы. Тут у 1905 г. становіцца членам падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыі. Рэпрэсіі царскага ўрада прымусілі Цётку перайсці на нелегальнае становішча, а ў пачатку 1906 г. выехаць у Галіцыю (частка Заходняй Украіны), якая ў той час знаходзілася ў складзе Аўстра-Венгерскай імперыі. У хуткім часе становіцца вольнай слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага універсітэта. У 1908—1909 гг. жыве ў Закапанэ (лечыцца ад туберкулёзу лёгкіх), затым у Кракаве, дзе вучыцца на гуманітарным факультэце Ягелонскага універсітэта.

На пачатку 1910 г. Цётка нелегальна прыязджала ў Пецярбург і Вільню. У 1911 г. паэтэса выйшла замуж за інжынера С. Кейрыса, і змена прозвішча дала ёй магчымасць вярнуцца на радзіму і перайсці на легальнае становішча. Яна жыла ў Мінску і Вільні, актыўна ўключылася ў беларускі нацыянальна-вызваленчы рух,

грамадскую і літаратурную працу (супрацоўнічала ў газеце «Наша ніва», выступала з рэвалюцыйнымі прамовамі, дапамагала віленскім рэвалюцыянерам у арганізацыі рабочага клуба, рэдагавала першы беларускі часопіс для дзяцей і юнацтва «Лучынка»). Калі пачалася першая сусветная вайна, Цётка добраахвотна пайшла працаваць міласэрнаю сястрой у ваенны шпіталь. У студзені 1916 г. яна выехала ў вёску Стары Двор на пахаванне свайго бацькі, дзе ў той час была эпідэмія тыфу. Дапамагаючы хворым землякам, яна сама захварэла і 17 лютага 1916 г. памерла. Пахавалі яе ў Старым Двары.

Літаратурную дзейнасць Цётка пачала ў 1902 г. У пецярбургскіх зборніках-альманахах «Калядная пісанка» і «Велікодная пісанка» былі змешчаны яе першыя вершы. З пачаткам бурных падзей 1905 г. яе паэзія набывае адкрыта рэвалюцыйны характар. Некаторыя творы паэтэсы друкаваліся ў 1905 г. як рэвалюцыйныя лістоўкі («Хрэст на свабоду», «Пад штандарам», «Мора», «Прысяга над крывавымі разорамі»). У 1906 г. у Жоўкве (цяпер горад Несцераў, каля Львова) выходзяць з друку два зборнікі паэзіі Цёткі «Хрэст на свабоду» пад псеўданімам Гаўрыла і «Скрыпка беларуская» пад псеўданімам Гаўрыла з Полацка, а таксама зборнік «Гасцінец для малых дзяцей». У 1906 г. у Пецярбургу выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» выпускае ў свет яе падручнік-хрэстаматыю для дзяцей «Першае чытанне для дзетак беларусаў».

Цётка — адна з пачынальнікаў беларускага апавядання. Першае яе апавяданне — «Прысяга над крывавымі разорамі» (1906), затым выйшлі «Навагодні ліст» (1908), «Асеннія лісты» (1912), «Зялёнка» (1912), «Міхаська» (1914).

Цётка выступала і як публіцыст (артыкулы «Шануйце роднае слова!», «Аб душы моладзёжы», «Да вясковай беларускай моладзі», «Як нам вучыцца», «Наша народная беларуская песня», «Папараць-кветка»).

## СЫНОК МАЛЕНЬКІ

Татульку, я хачу чытаць;
Татульку, хачу свет пазнаць;
Татульку, ехаць хачу праз моры;
Татульку, пабачыць хачу горы.
Як я буду вучоным, татульку,
Куплю табе тытуну ў люльку,
Куплю яшчэ кажух белы
Дый армяк суконны цэлы;
Куплю сарочку нову
Дый сашонку клянову.
Пачнеш, татульку, араць
Дый сынку спамінаць.
Матульку тож люблю.
Чырвоную хустку куплю,
Хвартушок рабенькі,
Андарак палавенькі;
Пацерак на адзін шнурок
Купіць для цябе твой сынок.
Толькі чытаць навучыце
Дый у свет сынка пусціце.
Тагды, татулёчку,
Сівы галубочку,
Тагды і, матулька —
Рабенькая зязюлька,
Куплю абяцанкі.

## МОЙ САД

Стаіць мой сад пад белым цветам:
Нарцыс — стыдлівых поўны крас,
Звісае бэз ў акно букетам,
Тульпанаў куст расцвіў зараз.

Цвіце ляўкой, ў пуках рабіна;
Вішнёва дрэва ў малацэ;
А там парэчка, там маліна,
А там мой граб малы расце.

Люблю мой сад, як расцвітае,
Як салавей свой трэль вядзе,
Як цвет галінку прыгібае,
Як пчолка мёд адтуль нясе.

Люблю мой сад ў маёвым ранку,
Як тоне ён ў расістай мгле,
Як ліпа шэпчацца пры ганку
І як зязюлька «ку-ку» шле.

Люблю мой сад пад белым цветам,
Люблю, зялёным як стаіць;
Люблю, як грушы спеюць летам
І як работай ён кіпіць.

Люблю мой сад у позну
восень, —
Як плод звісае да зямлі,
Як голкі сыплюцца ад сосен,
Як залацяцца сліў лісткі.

Люблю мой сад у крэпку зіму, —
Як у крышталах ўвесь
дрыжыць,
Як дзяцел, сеўшы на галіну,
Зімову песню загудзіць.

**ЛЕС**

Высокі лес, шумі, скрыпі,
Расу хавай,
Ў раку ўлівай;
Грыбы расці,
Не дай цвісці
Жалобным кветкам.

Нясі палеткам
Свой доўгі дзень,
Кладзі на пень
Ў гірлянды мох, —
Сцялі пасцель,
Каб кожны мог
Прылегчы спаць.
Высокі лес, ці чуеш гром,
Як ён злуе са ўсіх старон?
Як па дуплах дрыжаць зязюлі?
Як хмара з хмарай пайшла ў
гулі?
Тарахнуў гром.
Маланка паліць
На вугаль чорны ўвесь гарэх.
А во і град па голлях смаліць,
А во на злосць, а во на смех
Пярун натрое дуб разбіў.

А во пяць елак зачапіў
Круцясты віхар,
Гне іх ўдвое.
А во ў гняздо якраз абое
Упалі буслы;
Пішчаць іх дзеці.
А во нямаш куды падзеці
Кустоў маліны перад бурай.
А во і зайчык дрыжыць скурай.
На кветках пчолак град пабіў.
Пазёмкі з купін дождж змыў.
Усё хаваецца, дрыжыць,
Усенек лес цямненькім стаў,
Па голлях шум;
У лесе штурм.
На землю сцелецца навал.

Высокі лес, гусценькі лес,
Іскрыцца бела шата.
Ў крышталях іва,
Бяроза сіва,
Ў мароз прыбрата,
Чакае свята.
Зялёна елка —
Быццам з пудэлка.
Стаіць ў дрымоце
Дубок пры плоце.
Кусток каліны
Абпёр галіны
На трухлай тоўстай борці.
Заціхлі песні
Ў лістах цярэсні.
У гнёздах пуста,
Дзе было густа
Птушак вясною.
Дзятва лясная
Да нас злятае
З цёплага краю,
Аж з-за Дунаю.
Сойка зімуе,
Цецер такуе,
Дзяцел такоча,
Сава рагоча,
Верабей ля хаты,
Смецюшок чубаты,
Ды сястра-сінічка —
Нашы вечны госці.

## СІРАЦІНКА

У кашульцы чорнай, зрэбнай.
Тварык сплаканы, мурзаты;
Ані бацькі, ані маткі;
Дзядзька выгнаў з роднай хаты.

На узмежку сядзіць, плача,—
Куды дзецца — знаць не знае;
Гадок шосты пайшоў толькі...
А тут ночка... страх... змяркае...

Не плач горка, сірацінка,
Беларуская дзяўчынка!
Спяць сном вечным бацька, матка,—

Не пачуюць ця, дзіцятка,
Не памогуць твайму плачу,
Не траць сілы дарагія:
Жыта сіва спаць ця прыме,
Дождж цёплы шчочкі змые,
Пасцель мякку трава ўсцеле,
Пырнік ножкі ўкрые босы;
Сном забудзешся спакойным,
Вецер вольны спляце косы.

Каласочак ця накорміць,
Сонка яснае прыгорніць,
Крыж расстайны будзе таткай,
Ралля чорна — роднай маткай.

Ўстань з узмежка, не плач горка,
Глянь у неба: зорка ясна,
Што найдалей свеціць міла,—
Твая гэта, твая ўласна.

Вер: не згінеш, сірацінка,
Беларуская дзяўчынка!
Ў нашым краю многа гэтак
Ў людзі выйшла сірат-дзетак...

Мы належым да народу,
Што ад свету да заходу
Кожны з гора ўтрое гнецца,
Аднак гору не даецца.

Крыжам ляжа ў крыві ўласнай,
А ўсё ж верыць зорцы яснай.
Наш народ наўздзіў трывалы!
Шмат прыдбаў чужынцам славы...

Аб сабе адно забыўся,
Толькі вось цяпер збудзіўся.
Хоць шмат латак, хоць без хлеба —
Жыць і крэпнуць і нам трэба.

Беларусы! Больш нікому
Не ўступайце вы загону
Свайго жніва, сваёй працы.

Сіраціна! страх дзіцячы
Зглушы ў сэрцы, расці жвава —
Цябе жджэ народна справа!

## СВАРБА

Пасварыліся вясна з зімою, ну і давай адна адной на злосць рабіць.

— Я,— кажа вясна на зіму,— не буду з табой шмат гаварыць! За каўнер і так шпургану, што аж за лясамі ты ў мяне апынешся!

— Маўчы, маўчы,— бурчала белая зіма.— Хіба я цябе ў барані рог заганю, як сцісну, то аж табе вылезуць вочы.

Ну і пачалі адна адной наперакор рабіць. Зіма паўзе з марозам — вясна лезе з адлігай, і зноў няма парадку. Цярпелі людзі, цярпелі, а после давай сход рабіць, давай радзіць, на чыёй тут старане ім стаць. Адны казалі:

— Мы яшчэ не вымалацілі збожжа, не навазілі дроў, не адпачылі после летняй працы, хай пабудзе зіма.

Другія зноў крычалі:

— Вон зіму! Яна нас памарозіць; мы і так лапці натапталі, кажухі абадралі. Досыць нам яе; хочам вясны.

І немаведама, як то яно прайшло б на тым сходзе, каб не ўвайшоў старэнькі жабрак і не пачаў жаліцца на зіму.

Праўда: вушы былі абмарожаны, рукі пакрэпшы, світка рвана, сам ён дрыжаў ад холаду. Увесь сход закрычаў у адзін голас:

— Не хочам зімы! Хай вясна ідзе да нас!

Бедная зіма заплакала горка на людзей, слёзкі яе цяклі са стрэх, білі па абалонках[1], разліваліся па зямлі, збягалі ў лужы, з лужаў у рэчкі, з рэчак у моры, з мораў у акіяны.

А вясна смяялася, строілася ў кветкі, гарцавала па палях, песцілася па садох, шчабятала з птушкамі, цалавалася з дзеткамі, аж пакуль не пасварылася з летам.

Хто цяпер абдалее, скажыце, дзеткі, самі.

## ЖУРАВЕЛЬ І ЧАПЛЯ

Жылі сабе па абодвух канцах балота Журавель і Чапля.

После стала ім надта маркотна жыць, і вот уздумаў Журавель да Чаплі ў сваты ісці. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Чапляў двор.

— Як маешся, Чапля?

— Здароў, Журавель.

— Ці не пойдзеш, Чапля, за мяне замуж?

— А твае ногі доўгі, пер'е каротка; дужа ты брыдкі... Ідзі сабе, дзе быў!

Журавель перабраўся ізноў цераз балота дый прыйшоў у свой двор.

Раздумалася Чапля, што за Жураўля замуж не пайшла. «Дай,— кажа,— пайду да яго і перапрашу».

Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху, цераз бор ды ў Жураўлёў двор.

— Здароў, Журавель!

— Як маешся, Чапля?

— Вазьмі мяне замуж за сябе.

— Твая шыя доўга, і сіня, і крывая, і сама ты гарбатая; такой мне не патрэбна.

Хаця было і стыдна, аднак Чапля папялялася цераз бор назад у свой двор.

Шкода стала Жураўлю, што не ўзяў Чаплю бедную, і зноў пайшоў ён тою самаю дарогаю. Ціпяху, ліпяху, сем вярстоў па маху...

Так цэлы век свой хадзілі яны адзін да аднаго ў сваты, і так па абодвух канцах балота асталіся іх хаты.

## МІХАСЬКА

Міхась вельмі неахвотна на гэты свет прыходзіў. Тры дні радзіўся. Людзі рукамі махнулі:

---

[1] Па шыбах *(заўвага аўтара)*.

— Нічога не будзе ні з мацеры, ні з дзіцяці,— казалі.

Толькі на чацвёрты дзень:

— Угай, угай! — загаласіў на ўсю хату народжаны хлопчык.

Матка глянула:

— Божа, які ж брыдкі! Хаця б шчаслівы быў,— зашаптала бедная кабета, хацела пацалаваць дзіця, адкрыла вусны, але не стала сілы... заціхла... Заціхла так, як песня часам ціхне на найжаласнейшым сваім слове...

У хлопчыка насок з добрую бульбачку; барада — брылем закручана, праз усенек левы тварычак чырвоная пляма радзімая. Адно вочка глядзіць у правы бок, другое — у левы.

— У імя айца і сына! Ось дзе божая кара! — ледзь здолела прабалбатаць бабуля, купаючы першы раз дзіця.

Міхася-сірату запхнулі ў запечак; так ён там і рос, не мяркуючы, як тое дзікае зеллечка пад абваліўшымся тынкам.

Адзін раз зімой парасяты, гуляючы, адкінулі качаргу, памяло і розны іншы гаспадынін рыштунак. Запечак разявіў чорны рот, а ў ім, як белы зуб, паказалася светла-русая галоўка Міхася. Сонейка на тую пару, праз акно ўлезшы, блудзіла па хаце і, убачыўшы Міхася, падумала: «Бедны хлопчык!» Улезла на прыпечак ды давай забаўляцца з Міхасём: лып, лып па галоўцы дзіцяці колкімі праменнямі. Хлопчык у кудлачках паскрабецца з дзіва. А сонейка лып, лып, дрэчыцца далей. Міхась пачаў лавіць сонейка за косы, а тое з прыпечка — гоц ды за дзверы. Міхалюк у адной сарочцы ўдагонку на падворак: пазаплоткамі ляціць, цешыцца, смяецца. Ажно скуль ні вырвецца воспа: ідзе, брыдзе, пад нос бармоча; спаткаўшы Міхася, аж заіржала з радасці, паганка.

— А мой ты сякі, а мой ты такі,— кінулася да Міхася цалаваць, абдымаць...

— Адхініся, лупатая! — чуць не ўдарыў яе Міхась, ды лататы ў хату.

Калі распаліць пасля хлопца, мурашкі па скуры гіжаць і ў падошвы смаляць.

— Гвалт! — крычыць мачыха,— гэта ж у Міхася воспа, ён і мае дзеткі заразіць.

Што тут рабіць? Параілася, ды яшчэ глыбей Міхася ў запечак засунула.

Сколькі хварэў Міхась, хіба сам час знае ды тыя прусакі, што з хлопчыкам разам грэліся ў запечку. Толькі пасля воспы, як паказаўся Міхась на хаце, дык ажно куры закудахталі з перапуду. Певень хоць куды смялейшы, аднак стуліў і ён у трубку хвост. «Р-а-б-ы, р-а-б-ю-ю-т-а-н-ь-к-і!» — закукарэкаў і схаваўся ў падпечак, хітры. Выдзерыкуст адразу як мае быць пазнаўся на пекнасці хлапца, бо аб Міхася твар хоць хрэн дзяры. Столькі вываратняў на ім воспа накачала.

Пачаў Міхась у поле скаціну ганяць. Чураўся ўсіх, хадзіў насупіўшыся, не верыў нікому. Як хто на яго глянуў, зараз Міхасю здавалася, што той аб ім думае: «У-у, які рабы, страшны хлопец». На тую пару якраз пасыпаліся прозвішчы ад пастухоў: «Рабы, Галдабыр,

Касня...» Куды — на валовай скуры тых прозвішчаў усіх не спішаш. Міхась маўчаў, зубы сцяўшы, а ўпатайне ўсіх ненавідзеў. Кожнаму мсціў колькі мог: дзе каторага пастуха птушку асочаную з гнязда выпара, то торбачку з хлебам у балота закіне і чужую скаціну ў шкоду нажане. Жывіна таксама не зазнала ад Міхася ласкі: бізуном рэзаў кожную скуру; Мацееваму бычку рог скруціў; падцёлцы Канцавога Лукаша збіў клуб. Нат сорамна расказваць,— такія ліхаты выкідваў.

— Пашто ты майму Рабчыку хвост адарваў, касавокі ты асмолак, гад! — сварыцца, на чым свет стаіць, старая Алена. А Міхась, не-не ды новую закавыку прыдумае. А як ужо няма да чаго прычапіцца, то хоць мухі ловіць і скрыдлы абрывае.

«Вірутны чорт»,— думалі аб Міхасю людзі. Пастухі збрыдзілі, не падпускалі хлопца да сябе, як вужаку, і Міхась асобна пасвіў сваю скаціну. Праўду сказаць, і сыпалі хлопцу не раз да жывога, але Міхась неяксьці заціснуўся ў сабе, што ні піскне, што ні войкне, хоць ты яго засячы да смерці.

— Божухна, што гэта за дзіця! Проста апускаюцца рукі, ахвота прападае біць,— скардзяцца тыя людзі, каму Міхась шкоду зробіць.

Ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць, такая, пэўна, вырасла б з Міхася цаца, каб не адно здарэнне.

Была ўжо позняя восень; халодна, туманна, і дробны дожджык сыпаў імглой, і пачарнелыя поле і луг ляжалі ў нейкім моташна-мёртвым сне...

Пастухі разлажылі агонь. Вялікае вогнішча рагатала, і пяклася бульба. Яська, па прозвішчу Даўгавязы, дуў з усёй сілы ў трубу: тру-тру-у-у-у... ішло рэхам па апусцелым полі, ды шчэ сумнейшай ставала восень. Міхась сядзеў адзінока пры мокрай дарозе, воддаль ад пастухоў. Галоўка яму нешта балела, палалі шчокі. Стуліўся ў клубок, быццам тая шэрая купінка, наточаная кротам. Думкі яго былі невясёлыя, поўныя слёз, бы тыя асеннія хмаркі, нявыплаканыя дажджом. Часам нават скардзіўся:

— Праўда,— казаў,— нягодны я хлопец, усім прыдумваю ліха, але хто для мяне добры? Усе як на ліхога сабаку: «А-ту... а-та-та!»

Горкія словы каціліся з дзіцячых губак, як цяжкія камені на мужыцкую ніву. Бычок чорны недалёка хадзіў. Міхась, натрапіўшы касымі вочкамі на бычка, яшчэ горай даўся ў жаль:

— Такі чорны гад, як гэты бычок, і той мяне не слухае! Нябось, іншых пастухоў баіцца: толькі крыкнуць — зараз адверне рыла ад шкоды, а мяне... каб з цябе скура! — не вытрываў хлопец, схапіўся і з усяго маху сцебануў па хрыбляціне чорнага бычка. Бычок падскочыў, адбег, аглянуўся. «Павеся!», здавалася, закляў ён сваім бычыным розумам і пайшоў да стада.

— А-а-а! — паскардзіся,— крыкнуў удагонку бычку Міхась і раптам заплакаў: — Агэ-гэ-гэ!..

Не вытрывала дзіцячае сэрца ў маркотны асенні дзень, каб не пажаліцца над сваёй сірочай доляй. Міхасю стала завідна, што нават бычок і той мае да сябе прыхільнае стада...

— Дзяржы! бяры!.. Янук! Ігнат!.. лаві, а-та-та! — загрукацелі цэлай грамадой хлопцы. Беглі, гналіся ўпапярок загонаў за пад-

стрэленым жоравам. Птушка ляцела, падала, уздымалася, бегла, з левага крыла капала кроў. Нага была перабіта. Хлопцы нямала што ўжо хваталі за пер'е акалечану птушку, але яна не давалася, уцякала, выбіваючыся з апошніх сіл. Угледзеўшы Міхася, мо падумала, што куст або што іншае... згадаеш птушку?! Але, толькі даляцеўшы да хлапца, ударылася ўсім целам у яго грудзі.

— Кр-р, кр-р! — жаласна запішчала.

Міхасю здалося, быццам птушка просіць:

— Ратуй!.. ратуй!..

Шасць — Міхась абхінуў жорава поламі рванай світкі і растапырыў рукі.

— Аддавай, рабы! — закрычалі хлопцы.

— Не дам!

— Аддавай!

— Не дам!

— Аддавай! — крычалі пастухі, абступіўшы цесным кругам, турзалі Міхасём, як высахшай галінай.

— Адыдзіце... ёй... не турзайце...— застагнаў Міхась,— пад сэрцам цісне... Пусціце! — Хлопец хапіўся за грудзі.— Ёй... ёй... што ж гэта...— не паспеў дагаварыць, збялеў, як палатно, і асунуўся ў разору.

Пастухі перапалохаліся.

— Вады! — скамандаваў найстаршы.

— Міхась, Міхаська, братка, мы табе жорава аддамо,— пачалі ўгаварваць, падымаць, качаць.

Хлопец ляжаў, бы надломаная саломінка. Задыханы, прыляцеў Янук з поўнай шапкай вады. Адчынілі козікам зубы, улілі колькі капляў вады.

— Міхась, братка, ці чуеш?

Цераз паўмінуты Міхась уздыхнуў, губы пачалі чырванець.

— Перанясём,— азваўся каторы з хлопцаў. Асцярожна ўзялі пастухі Міхася на рукі і перанеслі да вогнішча. Міхась, як адкрыў вочы, бачыць — вогнішча палае, пастухі каля яго кратаюцца, кажушок пад галаву падлажылі, галля ў агонь падкідаюць, каб цяплей было; жораву крылы падвязваюць, хлеб крышаць.

— На,— кажуць птушцы,— еш, пасля Міхась цябе накорміць ячменем.

Міхася сіротчае сэрца ўлёт дабрату хлопцаў зразумела. Хоча да іх загаварыць, падзякаваць, але галоўка цяжкая, векі ліпнуць, а нешта ўнутры шэпча: пасля, пасля.

Ледзь пастухі адвялі Міхася дахаты. Жорава забраў з сабой.

— А гэта што? — накінулася мачыха і хапіла жорава за крылы і выкінула ў сенцы.— Ты зноў хворы? Думаеш, буду з табой цацкацца, дармаедзе?!

Міхась прысланіўся ў качарэжніку, стаіць бы асінавы пеньчык. «Спаць, спаць!» — ласяцца думкі.

— А гыля... а гыля! — вылецела мачыха гусей адагнаць ад карыта.

Міхась азірнуўся сонна, зачэрпнуў жменю гароху з апалушак, падняў жорава і палез у запечак.

Цёмная чэлюсць скрыла дзве бяссільныя крыўды...

Пастухі ўраіліся Міхасёву скаціну пасвіць. Часам каторы з хлопцаў забягаў на птушку падзівіцца.

Птушка хутчэй папраўлялася ад Міхася; але сядзелі разам у запечку, не раз страшэнна галодныя, бо мачыха абодвух ненавідзела. Як выходзіў жораў, то зараз гналася з пожахам за ім.

— Бедны клыбачка, галодны! — літуецца Міхась над жоравам.

— Кр-р! — як бы адказвае птушка.

— Нудна табе, сірата ты мой: радня вылецела далёка, пакінула цябе аднаго. Не плач! бо і я таксама адзін, як той калочак у плоце; матулька ў пясочку ляжыць, не прыйдзе сынка хворанькага адведаць... Як выздаравееш,— узнімемся на крылах і паляцім далёка, далёка... аж пад сонейка яснае... Праўда, клыбачка?

— Кр-р!

— Эх ты, жораўка, братка ты мой родненькі! — цалуе па пер'і хворы Міхась птушку.

Жораў Міхася слухае, аднак свой розум мае. Хутка прыгледзеўся і зжыўся з хатнім парадкам. Гаспадыні пад ногі не лезе. Парасяты, як лішне прыстаюць да малога дзіцяці, так іх зараз дзюбай карае. Над курамі стаў праўдзівым ваяводам: да парадку прыводзіць, і ні адна не адважыцца ўзляцець на лаву.

— Каб ты здохла, якая ты разумная птушка! — падчас удабрухаецца мачыха і падсуча жораву свінога цеста.

Ужо былі добрыя прымаразкі, як Міхась пачаў выходзіць на хату. Белы, як сняжыначка, нічога не баліць, толькі часам закашляе. Зрабіўся паслухмяны, спакойны, задуманы. Бульбу мачысе скрабе і дзіця гадуе, хату падмятае. А жораў — быццам хвост хлопцаў: ззаду ходзіць — не адстае.

Адной лыжкай ядуць, разам спяць. Міхась, здаецца, сваю сарочку ўзлажыў бы на жорава, каб гэта выпадала.

— Жораўка, пацалуй! — Міхась падстаўляе шчокі. Птушка грымзае дзюбай па твару, а сіраце здаецца, што яго і сапраўды цалуе. Цешыцца — не нацешыцца хлопец.— Пачакай, клыбачка, прыйдзе вясна, пажанём кароўку ў поле і скруцім дудку, будзем іграць! — жупяць[1] — не нажупяцца сабе два хваравекі.

Час ім хутка ідзе, быццам вада плыве. Вечарам бывае, што прыйдуць вясковыя хлопцы паглядзець на жорава, казкі часам расказваюць...

Міхась пад вясну неякасць стае лянівейшым: усё яму хочацца больш паляжаць; з хлопцамі адпала ахвота кумпанства вадзіць. Работа, прызначаная мачыхай, часта ляжыць непачынанай,за гэта мачыха часцей куксае хлопца. Міхась з жоравам вытварылі сабе нейкае асобнае жыццё, без слоў разумеюць адзін другога; з сабой не растаюцца.

Хутка праляцела зіма; павеяў цяплейшы вецер; пачаў снег схо-

---

[1] Ж у п і ц ь *(дыялектнае)* — гаманіць, размаўляць.

дзіць, і мухі забарабанілі на вокнах. Але Міхась ужо не прывітаў вясны, не выбег на вуліцу. Ляжаў, як аплатачак сухенькі, таяў, як васковая свечачка. Усе ведалі, што Міхасёвы дні палічаны ўжо.

Мачысе сэрца падказвала:

— Хутчэй бы дайшоў...

Жораў не хадзіў, як калісь, па хаце, але стаяў у кутку, крылы апусціўшы, і думаў нейкую, людзям незгаданую, птушыную думу. Не было каму птушку накарміць, не было каму з птушкай пажупіць.

У чацвер раніцай сонейка цэлай галавой укацілася да хаты.

Куры закудахталі з вялікай курынай радасці. Кот Мацей, скочыўшы з печы, пачаў мыцца. Гудзелі на шыбах мухі.

Парсючок рабенькі, разваліўшыся ля парога: рох-рох-рох,— славіў свінскім абычаем прыйшоўшую вясну.

Мачыха набільніцамі — та-та-та-та — стукала, ажно рэха па вуліцы ёй адгуквала,— ткала шарак.

— Мама! — азваўся змененым голасам Міхась.

У мачыхі сціснулася горла ад страху. «Смерць!» — віхрам праляцела ў галаве кабеты, бо Міхась ніколі яе не зваў мамай: неяк без гэтага абыходзіўся ў гутарцы.

— Мама... мамачка! — клікаў прыспешаным голасам.

— Зараз бягу, Міхаська, чаго хочаш?

— Дай мне жорава.

— Міхаська, а мо хочаш малачка?

— Не, нічога не хачу, дай мне толькі жорава.

Мачыха паднесла жорава, паставіла на пасцелі, а сама бягом на вёску склікаць баб.

Пакуль сышліся кабеты, Міхась ужо ляжаў мёртвы. Жораў лапатаў крыламі, тоўкся з кута ў кут...

— Кр-р, кр-р! — жаласна пішчаў.

Куры кудахталі:

— Куда-куда! куд-куда!

— А-у-у-у!..— не вытрымаў пад сталом Лыска і жаласна завыў, і толькі падсвінак рабенькі ляжаў ля парога і радасна: рох-рох!..— хваліў свінскім абычаем вясну.

На хаўтуры сабраўся народ. Нават старая Алена, у каторай калісь Міхась Рабчыку хвост адкруціў, стаяла пры мачысе ды адчытвала аванэлю[1] па нябожчыку Міхасю.

— Бедная ты, суседачка, ато ж табе смутак, гэтакі хлопец удалы быў. Гэта ж жарты? каб ён каму грушачку зглуміў або агурочак вырваў...

Жораў, забіўшыся ў качарэжнік, прымкнуў вочы. Хто яго знае, ці ён спаў, ці яму было брыдка слухаць Аленіных слоў... а мо хацеў сабе запамятаць ноту хаўтурнай песні.

— Вечны пакой яго душачцы! — загула ўся хата.

Прыкрылі станом дамавіну і пачалі выносіць на могілкі. Жораў зварухнуўся, азірнуўся па ўсіх кутах і выйшаў за дамавінай. Людзі дзівам задзівіліся і далі дарогу птушцы. Сумна, важна, як сплаканая маці, жораў першы пайшоў за Міхасём.

[1] А в а н э л я *(польск.)* — малітва па нябожчыку.

— А-у-у-у!..— завылі бабы ад птушынай мудрасці. Пастухі цеснай грамадкай дзяржаліся ўсю дарогу паблізкасці жорава.

Прыйшлі на могілкі і апусцілі дамавіну з Міхасём у выкапаны дол. Пачалі засыпаць.

— В-е-е-чны па-а-кой...— застагнала песня над свежай магілай; жораў задрыжэў, колькі разоў пахіснуўся на нагах і лоп-лоп... узмахнуў шэрымі крыллямі і ўзняўся да палёту.

Паволі, цяжка птушка падымалася ў воблакі, бо несла з сабою вялікі жаль зоркам ясным, хмаркам белым...— Кр-р, кр-р!..— скардзілася гарачаму сонейку,— кр-р, кр-р!..— расказвала напатканым брацейкам-жоравам...

Цяпер могілкі параслі ўжо дзёрнам, і там зялёна кругом. Як вокам сцяць — густы лес шуміць. На магілцы Міхася крынічка стаіць, і завецца яна «Жураўліныя слёзы».

Асенні вецер гудзе, казку сумна нясе.

Жоўты ліст сцелецца зямлёю і ціха, ціха на задушкі ў цёмную ночку шэпчацца з крынічкі вадою. Я падслухала гоман той пажоўклага лісця з крынічкі з чыстай вадой і цяпер вяду сказ, як калісьці жыў Міхась у запечку нашых хат — беларус малы, брат.

## ЯНКА КУПАЛА

Народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся 7 ліпеня 1882 г. у фальварку Вязынка былога Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). Вучыўся ў Сенніцкім народным вучылішчы, у прыватнай падрыхтоўчай школе ў Мінску, у вандроўных настаўнікаў. У 1898 г. скончыў Бяларуцкае народнае вучылішча. Працаваў хатнім настаўнікам, перапісчыкам у судовага следчага ў мястэчку Радашковічы, малодшым прыказчыкам у маёнтку Беліца Магілёўскай губерні. Тры гады працаваў рабочым на броварах. Восенню 1908 г. Я. Купала пераехаў у Вільню, дзе працаваў у рэдакцыі «Нашай нівы» і ў прыватнай бібліятэцы «Знание» Б. Даніловіча. У 1909—1912 гг. вучыўся на агульнаадукацыйных курсах А. С. Чарняева ў Пецярбургу. З 1913 г. да жніўня 1915 г. працаваў у Вільні, спачатку ў «Беларускім выдавецкім таварыстве», а пасля ў «Нашай ніве», пэўны час быў яе рэдактарам (1914—1915). З Вільні пераехаў у Маскву, дзе некалькі месяцаў вучыўся ў Народным універсітэце А. Шаняўскага, а ў студзені 1916 г. быў мабілізаваны ў армію. Служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін.

28 мая 1905 г. у прагрэсіўнай мінскай газеце «Северо-Западный край» быў надрукаваны першы верш Купалы на беларускай мове «Мужык». Першая кніга яго паэзіі «Жалейка» выйшла з друку ў 1908 г., затым з'явіліся «Гусляр» (1910) і «Шляхам жыцця» (1913). У дакастрычніцкі час былі напісаны паэмы «Адвечная песня» (1908), «Сон на кургане» (1910), «Курган» (1910), «На папасе» (1913), «Бандароўна» (1913), «Магіла льва» (1913), «Яна і я» (1913), п'есы «Паўлінка» (1912), «Раскіданае гняздо» (1913).

Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю Купала сустрэў у Смаленску; некаторы час служыў там у наркампродаўскіх арганізацыях. У студзені 1919 г. пераехаў у Мінск, удзельнічаў у стварэнні БДУ імя У. І. Леніна, АН БССР, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў. У 1922 г. выходзіць зборнік яго вершаў «Спадчына», затым — «Безназоўнае» (1925), «Песня будаўніцтву» (1936), «Беларусі ардэнаноснай» (1937), «Ад сэрца» (1940), паэмы «Над ракой Арэсай» (1933), «Барысаў» (1934), «Тарасова доля» (1939). У 1925 г. Я. Купалу была нададзена годнасць народнага паэта БССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Я. Купала жыў у Маскве, а таксама ў пасёлку Пячышчы каля Казані. Творчасць паэта ваеннага часу (вершы, публі-

цыстычныя артыкулы) вызначаецца палымяным патрыятызмам і вялікай нянавісцю да фашысцкіх захопнікаў. Верш «Беларускім партызанам» распаўсюджваўся як лістоўка на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі Беларусі, друкаваўся на старонках падпольных выданняў.

Янка Купала вядомы і як перакладчык. Ён пераклаў на беларускую мову «Слова аб палку Ігаравым» (прозай і вершам), міжнародны пралетарскі гімн «Інтэрнацыянал», некаторыя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, А. Кальцова, Т. Шаўчэнкі, А. Міцкевіча і іншых славянскіх пісьменнікаў.

Нямала Я. Купала напісаў для дзяцей, пра што сведчаць зборнікі вершаў «Хлопчык і лётчык» (1937), «Арлянятам» (1945), «Алеся» (1946), «Славуты домік» (1948) і інш.

Многія вершы народнага паэта пакладзены на музыку: «Вечарынка» (С. Палонскім), «Як у лесе зацвіталі» (Ю. Семянякам), «У зялёным садочку» (А. Туранковым) і інш.

За зборнік «Ад сэрца» Я. Купалу ў 1941 г. была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. За заслугі ў развіцці беларускай літаратуры ўзнагароджаны ордэнам Леніна (1939). Шматгранную літаратурную дзейнасць Купала заўсёды спалучаў з навуковай, грамадскай і культурнай дзейнасцю: быў акадэмікам АН БССР (з 1928 г.) і АН УССР (з 1929 г.), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, членам праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Памёр Янка Купала 28 чэрвеня 1942 г. у Маскве.

## ПРАЗ ВАЙНУ

Зіма, на дварэ мяцеліца вее,
Халодныя песні заводзіць віхор,
Зоркі не свецяць, і сонца не грэе,
Аж вылезці страшна і глянуць на двор.

А снег усё сыпе болей і болей,
Страляе у сцены сцюдзёны мароз,
І вецер шалёны вые у полі,
Ўсе гурбамі снегу ён хаткі занёс.

Пад борам зялёным вёска стаяла,
А бедная надта, ах, надта была,
Мяцеліца стрэхі яе пазрывала
І дзіка па сценах дзіравых гула.

У хатцы старой у гэту завею
Лучыначка свеціць святлей, то цямней.
Там дзеткі малыя з маткай сваею
Льюць горкія слёзы з бядачых вачэй.

Памерзлі з марозу дзеткі у хатцы,
А шэсцера, бедных, там іх было,
Трасуцца і лезуць на грудзі к матцы,
Як птушкі да маткі сваёй пад крыло.

Ой, гэтых сіротак цяжкая доля,
Хоць маці і ёсць, але бацькі няма,
А тут яшчэ гэты холад-няволя,
Праклятая сцюжа, мароз і зіма.

Іх бацьку з японцам біцца забралі,
Бо ён запасны у цара быў салдат,
Вінтоўку і шаблю там яму далі
І стары салдацкі пацёрты халат.

Пакінуў ён дзетак бедных без хлеба
І хворую жонку без хлеба сваю,
А тут і падаткі яшчэ аддаць трэба,
Падаткі і чынш у казну за зямлю.

Кароўка раве не еўшы у сенцах,
Авечка у хаце з ягняткам бляе,
Не топлена печка, дроў ні паленца,
А ў коміне жудасна вецер пяе.

Ой, бедныя дзеткі, як па пажары,
Хто ж вас тут накорміць, дроў насячэ?
Хто печку падпаліць, хто есці навара?
Хто хлеба вам булку, праснак хто спячэ?

Нямашака бацькі, хворая матка,
Няма каму бедным тут вам памагаць,
Ад ветру трасецца старая хатка,
Ратунку для вас ніадкуль не відаць.

А там, на двару, мяцеліца вее,
Халодныя песні заводзіць віхор,
Зоркі не свецяць, і сонца не грэе,
Аж вылезці страшна і глянуць на двор.

## АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ

*(Урывак)*

Праява II

### На службе

Дворны папар, лагі. Недалёка лес. Дзень хмурны; слата. Пасецца скаціна; каля яе снуе маленькі пастушок. Апратка ў яго паабрываная. Босы. У зазябнутых руках трымае бяроставую трубу. З лесу дарогай паказваецца кабеціна — яго матка.

Пастушок

У сваёй хаце і пры матцы
Жыў не жыў,
Бяда выпхнула бадзяцца,
Ў свет пабрыў.

Кожны гоніць, папіхае,
Свой, не свой.
Ой ты, служба, ой, благая,
Божа мой!

Ой ты, доля пустасейна!
Рад не рад;
Далі кут, і той не пэўны —
Да каляд.

Нясуць хлеба ці да хлеба
І глядзяць:
Ведай, есці шмат не трэба...
Ўзяць?.. не ўзяць?..

Воўк, ваўчыха за гарою
Завядзе...
Ні прыстання, ні спакою —
Ой, нідзе.

Матка

*(падыходзячы)*

Што не весел так, сынулька
Мой жа, ты?
Табе кланяўся татулька
І браты.

Гавары ж ты мне, мой мілы,
Родны мой,
Як там служба, як там сілы,
Як з ядой?

Ці кусочак калі ласы
Паднясуць?
Ці не крыўдзяць калі часам,
Ці не б'юць?

Калі ж прыйдзе тое святка
З ласкай тэй,
Не расстанешся ты з хаткай
Са сваей?

Пастушок

Як у служкі сходзяць леты —
Ў пастуха,
Пытай, маці, птушкі гэтай —
Канюха.

Запытайся гэтай хмары —
Гэтых слёз;
Гэтай кветкі на папары —
Гэтых лоз;

Гэтай грушы сярод поля
І балот,—
Яны ўсе аб маёй долі
Вядуць шчот.

Матка

Не хачу я іх пытаці,
Мой сынок,
Не пацешаць яны маці,
Сакалок.

Калыхала, гадавала,
Як магла,
А цяпер што дачакала?
Што нашла?

Пастушок

Не плач, маці, і не злуйся
На жыццё,
Як я ў сілачку ўбяруся,
Змагу ўсё.

Вечарэе. Пастушок гоніць скаціну дамоў. Маці, пахліпваючы, ідзе ўслед за ім.

## ЗІМОЙ У ЛЕСЕ

І лягла ж цішына
У бары за гарой,—
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінах сасон,
І чарнобель, і мох
Атуліў сабой ён.

Сокат птушак замёр,
Як бы поўнач была,
Адно свісне тапор
Ды зазвоне піла.

Гэта сілу сваю
Так прабуе мужык;
Рухнуў дуб на зямлю,
Як магуч і вялік...

Далей — глуш, цішына
У бары, за гарой,—
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

## ПЕСНЯ І КАЗКА

Песня і казка
Ходзяць у пары,
Сеюць па свеце
Дзівы і чары,
Будзяць спрасоння
Думкі дзіцячы,
Як той уранні
Промень свяцячы.

Песня і казка,
Як у крышталі,
Свету пакажуць
Тайныя далі.

Шляхі намецяць
К сонцу і зорам
Для людской долі,
Скованай горам.

Песня і казка
Ў райскіх праявах
Шчасце збудуюць
З кветак яскравых.

Сэрца атуляць
Вечнаю ласкай...
Слухай жа, сэрца,
Песняў і казкаў.

### СЫН І МАЦІ

Сын

— Мамка, мамка, нам сягоння
Гаманілі ў школе
Аб якойсьці Беларусі,
Што жыве на волі.

Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Не люблю іначай),
Ды ніяк не мог уцяміць,
Што ўсё гэта знача.

Маці

— А вось тое, мае дзеткі,
Глянь-зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў;

Гэта поле — шнур ля шнура —
Ўзгоркі і лагчынкі,
На узмежку грушу-дзічку,
Крыж каля пуцінкі?

Бачыш логі, сенажаці,
А на іх — крыніцы,
Далей — бор зялёны, гонкі,
Што увысь глядзіцца?

А там далей, дзе ўжо вока
Дасягнуць не можа,
Тое самае пабачыш,—
А ўсё так прыгожа!

Сотні вёсак і мястэчак,
Гарадоў нямала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
З неапетай хвалай.

Там плывуць Дняпро, і Сожа,
Ды Дзвіна, і Нёман,
Белавежы, Налібокаў
Там чуваці гоман.

Гарады — Мінск, Віцебск, Вільня,
Магілёў, Гародня
І Смаленск з сцяной цаглянай —
Разляглі выгодне.

Аб вялікай нашай славе
Сведчаць на свет цэлы,—
Як жылі мы, панавалі
Ў родным краі смела.

Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
Й да цябе належа.

Сын

—А! Ўжо сцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаю не буду.

Ну, а йшчэ скажы мне, мамка,
Бо я не разважыў:
Што такое беларусы,
Як настаўнік кажа?

Маці

— Ах, які ты йшчэ дурненькі,
Каб не скеміць гэта!
Ну, паслухай: усе людзі,
Што ад лета ў лета,

Ад пакон вякоў жылі тут
І жывуць сягоння,
Носяць світкі, носяць лапці
Ды былі ў прыгоне,

Ўсе — і ты, і я, суседзі,
Хто, па-твойму, прусы?
Дык жа ўцям: на Беларусі
Жывуць беларусы!

Ды яшчэ, каб лепей ведаў,
Мушу табе ўспомніць:
Беларусы беларускай
Гутаркай гамоняць.

Сын

— Вось яно што! Праўда, мамка,
Ўжо сабе ўтлумачыў:
Беларус я! Ох, дам пытлю,
Хто скажа іначай.

Ну, але яшчэ не ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?

Маці

— Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?

Як жа мы з табой гуторым
Вось у гэту хвілю?
Як жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?

Ды паслухай, як на вёсцы
Кажа дзядзька, цётка;
Як пяюць улетку жнеі
За сваёй работкай;

Як бабуля баіць казкі
Аб нядолі-долі;
Як начлежнікі спяваюць
На начлезе ў полі?!

Сын

— Ну, ўжо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу,
Пакажу я ўсяму свету,
Хто я дый што значу!

**МАРОЗ**

Іду я, сняжысты, ўсясільны,
Па сцежках-пуцінах пустых,
І ночкай, і днём безупынна
Пільную абшараў сваіх.

Бязмежна, ўладарна паную
Пад сховаю пушчавых вех,
Каронаю бор мне зялёны,
А тронам-пасадам бел-снег.

Палац мой — лес буйны,
вяцвісты —
Ірдзіцца брыльянтамі скрозь,
Мне воўк і мядзведзь у
паслугах,
Мне служаць вавёрка і лось.

Як пухам, сняжком пасыпаю
І хвою, і ёлку, і клён;
Хто ў госці ка мне забярэцца,
Тулю тых, галублю іх сон.

І казкі шапчу ім аб шчасці,
І цемру зганяю з вачэй...
Хадзіце, хадзіце к Марозу!
Хадзіце у госці хутчэй!

**КАРОЛЬ**

Я кароль над каралямі,
Пан я над панамі!
Што мне значаць і цары ўсе,—
Пасудзіце самі.

Тругу-гугу! Тругу-гугу!
Дзьму я ў рог вайсковы:
Гэта знак даю падданым
З трубы берастовай.

Лясь-лясь! Лясь-лясь! —
зброяй лясну
Ўправа, ўлева громка:
Гэта страшу я падданых
Пугай доўгай, ёмкай.

І сабраў сваіх падданых
І павёў, павёў я
Цераз горы, цераз долы,
За гай, за дуброўе.

Тругу-гугу! Тругу-гугу!
Зноў трублю сярдзіта;
Лясь-лясь! Лясь-лясь! —
свішчу зброяй
Грозна, санавіта.

І усеўся я на троне —
На карчы яловым,
А падданыя падданяць,—
Не буркнуць ні слова.

Толькі — скуб-скуб! Скуб-скуб
траўку
Згодна ды пакорна,
Ажно рэха ад скубання
Коціцца прасторна.

Толькі часам мм-у, мм-у! —
Замычыць цялятка;
Бэ-э, мэ-э! Бэ-э, мэ-э! —
Забляе ягнятка.

Рох-рох, цох, цох! Кві, кві,
кві-кві! —
Пісне парасятка,
Ды гі-гі-гі! — адыржэцца
Недзе жарабятка.

А я важна, а я пышна
Сяджу на пасадзе,
На падданых пазіраю,
Як дзе на парадзе.

Сонца косы млоснай спёкай
Сцелюцца на полі,
А ў дуброве штось шапоча
Ліст з лістком паволі.

Куку-куку! Куку-куку! —
Кукуе зязюля;
Піць-піць! Піць-піць! — каня
кліча,
Як бы после гуляў.

Ву-ву! Ву-ву! — загудзеў жук
Каля вуха смела;
Ззынь-ззынь! Ззынь-ззынь! —
з мёдам з кветкі
Пчолка зазвінела.

Сэрца мне затрапятала.
І я без прынукі —
Шась трубу сваю на плечы
Ды жалейку ў рукі!

Туль-туль-лілі! Туль-туль-
лілі! —
Граю, не зважаю;
Туля-ляля! Туля-ляля! —
Птушкам падцінаю.

Гуля-ляля! Не кароль жа
Я над каралямі?
Я, мой статак, сонца, поле?..
Пасудзіце самі!

## АРЛЯНЯТАМ

### 1

Гэй, узвейце сваім крыллем,
Арляняты, буйна, бурна
На мінулых дзён магіле,
Над санлівасцю хаўтурнай!..

У маланках перуновых
З гулкім гоманам грымотаў
Для вякоў дыхтуйце новых
Нечувалыя ясноты.

Вам сярпы і косы ў рукі
Ды мячы, каваны з сталі,
Далі буры, завірухі,
Што тут вылі, бушавалі.

Цень мінуўшчыны праклятай,
Дзе бізун гуляў з нагайкай,
Змеціцё вы, арляняты,
Сваёй новай сілай, байкай.

Ужо выбіла часіна
На вялікую прыгоду
Выйсці з мутнай каляіны
Беларускаму народу.

Ў чарадзейным карагодзе,
Ў неабсяжнае свабодзе,
Без аковаў на прыволлі
Ўжо віхрыцца наша доля.

### 2

Вам на памяць Серп і Молат
Даравала доля,
Каб з вас кожны быў, як волат,
Не гнуў плеч ніколі.

Каб здабытую свабоду
Зналі, шанавалі,
І у цяжкую прыгоду
Ўсталі грознай хваляй.

Зашумелі, загудзелі,
Як віхор сусветны,
Не праспалі у пасцелі
Волі агняцветнай.

*

Вам дасталіся ад продкаў
Сохі і бароны,
Каб вы ў час, пасля паводкаў,
Выйшлі на загоны.

І з'аралі сваю ніву
Шырока, глыбока,

Зерне ўкінулі шчасліва,
Чыстае, як вока.

Каб рунела зерне тое
Весела, яскрава
Побач з вашай маладою
Сакалінай славай.

*

Вам пакінулі прадзеды
Гартаваны косы,
Каб вы з імі сонца следам
Выйшлі на пакосы;

Каб касілі да упаду
Пустацвет і зелле,
Што сваім пякучым ядам
Труцяць кроў у целе.

Каб звінелі вашы косы
Над зямлёю соннай
Ад начных да ранніх росаў
Звонка, векапомна.

*

Вам у спадчыну ад роду
Засталіся песні,
Каб быць вашай асалодай
У жыцця прадвесні.

Каб вы пелі, не сціхалі
Ў радасці і ў горы,
Гаманілі, нібы хвалі
У бурлівым моры.

Каб шоў гоман неспыняны
Ад поля да поля
І людзей яшчэ скаваных
Заклікаў на волю.

## ПІЯНЕРСКАЕ

### 1

### БУДЗЬ ГАТОЎ!

Будзь гатоў ты, ваяка малы,
Ці то рана, ці позна!
Лётна так як арлы, сакалы,
Не чакаючы слоў
Ад прынукі пагрознай,
Будзь гатоў!

Колькі сіл — сцяг дзяржы
ў кулачку!
Бо як здарыцца справа,—
Не драмаць, верна быць начаку!
На ўбарону бацькоў
Піянерскаю славай
Будзь гатоў!

Не драмі, рэвалюцыі сын,
У звяне, у атрадзе!
Ў бубен бі, песні пей, кліч на
чын!
А сястрыц і браткоў
Не даць крыўдзе і здрадзе
Будзь гатоў!

Нездарма, мой малы піянер,
Ты — чырвоная змена;
Думкі, сілу гартуй на манер
Сваіх старшых бацькоў;
Стаць за волю нязменна
Будзь гатоў!

Беларусь спадзяецца з цябе
Мець свайго абаронцу,
Будзь жа ім, і ў жыцця
барацьбе,
Ўжо даросшы гадкоў,
Яе весці да сонца —
Будзь гатоў!

### 2

Піянер я малады, хоць куды!
Не смучуся, смяюся, вясёлы;
Я не знаю ні бяды, ні нуды,
Бухну ў бубен — і пайшоў,
і пайшоў...
Пераскочыць і горы, і долы
Заўсёды гатоў!
За свабоду я пайду хоць у вір,
Бо я вольны, як вецер, як
птушка,—
Дзядзька Ленін мне адно —
правадыр.
За працоўны народ проць
акоў
Выйсці з песняй сваёй
весялушкай
Заўсёды гатоў!

Не баяліся браць барыкад,
Як няволі ішлі крышыць
сцены...
Я таксама разбураць стары лад,
Дзе застаўся ад мінулых вякоў,
Састарэўшым ваякам на змену
Заўсёды гатоў!

Хоць бабулі мне бурчаць,
не маўчаць,

Што з багамі ніяк не міруся...
Чым папала я гаціць буду гаць;
Я не толькі ваяваць проць
багоў,—
Нават чорта ганяць з Беларусі
Заўсёды гатоў!

Падрасці б мне, як мага
найбардзей,—
Паказаў бы сваю моц і сілу!
Сцеражыся ўжо тады, ліхадзей!
Бараніць ў кожны час без
адмоў,
Як быў, буду красу волі мілай
Заўсёды гатоў!

Вось які я піянер, хоць куды!
Не смучуся, смяюся, вясёлы;
Я не знаю ні бяды, ні нуды,
Бухну ў бубен — і пайшоў,
і пайшоў...
Пераскочыць і горы, і долы
Заўсёды гатоў!

**НАШАМУ СВЯТУ**

Расчыні шырока дзверы,
Мілая старонка,
Выйдзі стрэнуць свой Кастрычнік
Песняй гулкай, звонкай!

Свята нашай гадавіны,
Хоць і ўвосень свята,
Свеціць вечнаю вясною
Нашым гоням, хатам.

Гэй вы, хлопцы, гэй, дзяўчаты,
Камсамол шчаслівы,
Сыпце кветкі, сыпце радасць
Нашым сёлам, нівам!

Перад намі ў сонцы, ў зорах
Будучыня наша,
Кожны дзень сягоння лепшы,
Як быў учарайшы.

Наша праца не йдзе марна
Ў полі, на заводзе,—
Аб здабытках, дасягненнях
Слава ходам ходзіць.

Мы не марамі сягаем
Высака пад неба,—
Самалёты — нашы птахі —
Даль вышынь цярэбяць.

Мы не пекла дасягаем
У зямлі глыбінах,
А багацце здабываюць
Нашыя машыны.

Нашы межы не баяцца
Здрадніцкіх напасцяў;
Мы — сяўцы для чалавецтва
Яснай праўды, шчасця.

Нашых песень, светлых думак
Ніхто не зацемрыць —
Ні наганы, ні кайданы
Фашыстоўскай хеўры.

Мы ідзём у сонцы з сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам!..

**АЛЕСЯ**

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.

Гаманіў бор сасновы
Ўвечары і ранкі,
Над калыскай ліповай
Пела калыханкі.

— Спі, засні, мая дзетка,
Птушкі ўжо заснулі,
Спі, засні, мая кветка,
Люлі, люлі, люлі.

Спі, не ведай трывогі,
Надыдзе часінка,—
На свае ўстанеш ногі,
Мая ты дзяўчынка.

Будзеш кужаль ты прасці,
Будзеш ткаці кросны,
Выглядаці долі, шчасця
Ў маладыя вёсны.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.

Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчаслівай краінай,
Над роднай старонкай.

Адчыняе вароты
Нябесным маршрутам,
Ці, як ястраб, з высотаў
Скача з парашутам.

І да сонца праз хвілю,
А ўсё вышай, вышай!
Самалётавым крыллем
Воблакі калыша.

Стара маці днём, ночкай
Марыць ля аконца:
Ужо к прасніцы дочка
Не зляціць з-пад сонца.

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

### ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК

Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай — вялікі ўжо хлопчык,
І ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне мама сягоння казала,
Што стукнула мне ўжо сем год,
Табе гэта, можа, і мала,
А мне ляцець толькі ў палёт.

Мне ўжо надакучыла дома —
Ў дзіцячы хадзі адно сад,
А так паглядзеў бы, вядома,
На іншы парадак і лад.

Вазьмі ж мяне, лётчык, хачу я
Пабыць у людзях, паглядзець,
Як месяц на небе начуе,
Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,
А днём не відаць іх чаму,
Як рэчкі ў далёкія моры
Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі,
Ляцеці далёка, высока
Ды так пабываць і ў Крамлі.

Вось гэтак у добрым здароўі
Мы будзем ляцець і ляцець.
Вазьмі ж мяне, лётчык, з сабою,
Не будзеш ты клопату мець!

## ЯКУБ КОЛАС

Народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся 3 лістапада 1882 г. у засценку Акінчыцы Мінскага павета (цяпер Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Дзіцячыя гады будучага пісьменніка прайшлі ў Ластку і Альбуці. Вучыўся спачатку ў хатніх настаўнікаў, потым у Мікалаеўшчынскім народным вучылішчы. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1902) працаваў настаўнікам пачатковай школы ў вёсцы Люсіна (цяпер Ганцавіцкі раён Брэсцкай вобласці), з 1904 г.— у Пінкавічах (цяпер Пінскі раён Брэсцкай вобласці). У пачатку 1906 г. «у парадку пакарання» (за ўдзел у рэвалюцыйнай прапагандзе сярод

сялян) быў пераведзены ў Верхменскую школу (цяпер Смалявіцкі раён Мінскай вобласці). За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе ў Мікалаеўшчыне летам 1906 г. быў звольнены з пасады настаўніка. Зімой 1906—1907 гг. жыў у свайго брата ў Смалярні, вучыў вясковых дзяцей у нелегальна адкрытай ім прыватнай школе. Вясной 1907 г. пераехаў у Вільню, пэўны час працаваў у рэдакцыі газеты «Наша ніва» на пасадзе загадчыка літаратурнага аддзела, аднак хутка паліцыя загадала Коласу пакінуць горад.

На старонках газеты «Наша доля» 1 верасня 1906 г. быў надрукаваны першы верш Я. Коласа — «Наш родны край». У гэтым жа годзе Колас распачаў працу над падручнікам для беларускіх школ «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (Пецярбург, 1909).

У пачатку восені 1908 г. як удзельнік настаўніцкага з'езда Я. Колас быў прыгавораны да трох гадоў турэмнага зняволення (1908—1911, адбываў у Мінскім астрозе). Аднак рэпрэсіі царскіх улад не зламалі паэта-рэвалюцыянера, ён і ў астрозе працягвае пісаць вершы. У 1910 г. выйшаў яго першы зборнік вершаў «Песні жальбы» (у Вільні).

У верасні 1911 г. Я. Колас выйшаў з турмы, у 1912 г. атрымаў пасаду настаўніка ў в. Купяцічы (Пінскі раён), потым быў пераведзены ў Пінск, дзе настаўнічаў у прыхадскім вучылішчы (1912—1915). У гэты час у Вільні выдаюцца яго кнігі прозы «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914), у Пецярбургу ў 1913 г. асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Тоўстае палена», «Нёманаў дар», вершаваныя апавяданні «Прапаў чалавек», «Батрак».

У пачатку верасня 1915 г. у сувязі з набліжэннем фронту Я. Колас эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню. Хутка яго мабілізавалі ў армію і праз некаторы час накіравалі ў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча (Масква), пасля заканчэння якога ён служыў у г. Перм. Летам 1917 г. быў пасланы на Румынскі фронт. Там Я. Колас захварэў і быў эвакуіраваны ў г. Абаянь Курскай губерні, дзе жыла яго сям'я.

Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю Я. Колас сустрэў у дзеючай арміі, на Румынскім фронце. Па дэкрэту Савецкага ўрада быў вызвалены ад вайсковай службы як настаўнік. Спачатку працаваў вясковым настаўнікам у ваколіцах Абаяні, а пасля раз'язным школьным інструктарам павятовага аддзела народнай асветы. У 1921 г. паэт пераехаў у Мінск на пастаяннае жыхарства. Выкладаў методыку роднай мовы ў Белпедтэхнікуме, Беларускім дзяржаўным універсітэце, чытаў лекцыі на курсах настаўнікаў, займаўся навуковай дзейнасцю ў Інбелкульце. З дня ўтварэння АН БССР (1 студзеня 1929 г.) быў яе віцэ-прэзідэнтам. У 1926 г. удастоены звання народнага паэта БССР.

Першым паслярэвалюцыйным выданнем Я. Коласа былі «Казкі жыцця» (1921). Вершы, напісаныя ў гады грамадзянскай вайны, увайшлі ў зборнік «Водгулле» (1922). Талент пісьменніка праяўляецца ў разнастайных жанрах. Выходзяць яго паэмы «Новая зямля» (1923), «Сымон-музыка» (1925), аповесці «У палескай глушы» (1923), «У глыбі Палесся» (1927), «На прасторах жыцця» (1926), «Адшчапенец» (1932), «Дрыгва» (1934), п'есы «Вайна вайне» (1938), «У пушчах Палесся» (1938), зборнік вершаў «Нашы дні» (1937).

У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Ташкенце, потым у Клязьме, займаўся літаратурнай і грамадска-публіцыстычнай дзейнасцю, актыўны ўдзел прымаў у рабоце Антыфашысцкага і Усеславянскага камітэтаў. Напісаныя ў гэты час вершы склалі зборнікі «Адпомсцім» (1942), «Голас зямлі» (1943); у 1943 г. выйшла паэма «Суд у лесе». У снежні 1944 г. паэт вярнуўся ў Мінск.

Вялікую работу праводзіў Я. Колас як член ЦК КПБ, дэпутат Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, член праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, Старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру, акадэмік АН БССР (1928) і яе віцэ-прэзідэнт.

У пасляваенныя гады выйшлі зборнікі вершаў «Мой дом» (1946), «Жыве між нас геній» (1952), паэмы «Адплата» (1946), «Рыбакова хата» (1947), трылогія «На ростанях» (1955).

У 1946 г. за вершы, напісаныя ў вайну, Я. Коласу прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, у 1948 г.— Дзяржаўная прэмія СССР за паэму «Рыбакова хата».

Значнае месца ў творчасці Я. Коласа савецкага часу займаюць творы для дзяцей, пра што сведчаць зборнікі апавяданняў «Першыя крокі» (1925), «Крок за крокам» (1925), вершаваныя казкі «Рак-вусач» (1926), «Дзед і мядзведзь» (1926), паэма «Міхасёвы прыгоды» (1935), зборнікі апавяданняў і вершаў «На рэчцы зімою» (1941),

«У старых дубах» (1941), «Усход сонца» (1948), «Раніца жыцця» (1950). Творы Я. Коласа для дзяцей многа разоў перавыдаваліся. Вялікая заслуга пісьменніка і ў апрацоўцы народных казак.

Я. Колас вядомы як перакладчык твораў рускай, украінскай і польскай літаратуры на беларускую мову (А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, А. Міцкевіча).

Памёр Якуб Колас 13 жніўня 1956 г.

## ВЯСНА

*(Урывак)*

### I

Які пекны, слаўны дзянёк! Выйдзем, дзеткі, на вуліцу, на божы свет. Паглядзім, паслухаем. Можа чаго і навучыць нас гэты божы свет.

Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказывацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць. Выходзіць з хаты гаспадар. Бачыць: вада цікуе на яго хлевец. Не, галубка! Не чапай будовы. Там стаіць авечачка, кароўка. Ідзі сабе далей. І гаспадар бярэ рыдлёўку і пракопвае ёй дарогу. А воданька закаламуціцца яшчэ больш і пабяжыць далей. Па дарозе сустрачае яна другі гэтыкі самы равок. Сустрэнуцца, забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам. Іх сустрэне ізноў новы равок, а там, пазіраеш, прыстане і чацвёрты, і пяты. І ўсе яны зліваюцца: разам і весялей і лягчэй ваяваць з тымі парогамі, каторыя загараджаюць ім дарогу. І нікога яны не крыўдзяць. Сустрэнуць малюсенькі равочак, такі малюсенькі, што цячэ ён, як слёзка, па капельцы. Мардуецца, бедны, працуе над кусочкам лёду, што загарадзіў яму сцежачку. Збірае ўсе сілы і з вялікім трудом ледзьве-ледзьве скоціць нягодны кусочак лёду і з такою гэта радасцю зліваецца з пераваламі! А перавал ахвотне бярэ з сабою і яго працу. І вот пакрысе, памаленьку перавал пераходзіць ужо ў рэчку. Шуміць, раве ў полі. Ён так ужо акрэп, што можа пакаціць і камень.

Бачыце, дзеткі, як расце сіла вады.

### II

А сонца дзень ада дня ўсё вышэй і вышэй ходзіць па небе, усё цяплей і цяплей саграваe яно зямлю. Плача зіма, льюцца яе халодныя каламутныя слёзы. Растае́ снег, пакідае палі. Не хочацца яму ўступіць места цяплу і свету. З гор злазіць ён у лагчынкі, у балота, у лес. Не схаваешся, браце, ад сонца, усюды яно знайдзе цябе. А сонейка так ласкава, так хораша пазірае на зямлю, як матка на сваё дзіця. Заглядае яно ўсюды: і ў бедную мужыцкую хатку, дзе так непрыбрана, бедна, нявесела; і на пясчаную горку, і ў лагчынку, дзе думаў снег знайсці сабе прыпынак; і ў лес, і на луг. Усюды льецца яго шчыры свет і цяпло; нідзе не найдзе сабе пакою снег. Многа работы залатому

сонейку ў раннюю ве́сну. Доўга трэба ваяваць яму з зімою. Многа снегу з'есць яно за дзень, а там, пазіраеш, уночку падымуцца хмуркі, павее вецер з халоднага боку і закрые ізноў усю землю снегам, ізноў дасць работы для сонца. Але сонца не бядуе. Прыгрэе ўдзень, і снег прападае. І так яно працуе цэлы месяц, пакуль не згоніць з зямлі сляды халоднае зімы. І ваюе яно з цьмою і холадам, як ваюе і чалавек са злом і несправядлівасцю.

## ПРЫЛЁТ ПТУШАК

Ціхая раніца. Сонейка толькі што ўзышло. У полі яшчэ ляжыць снег. Толькі ўзгоркі чарнеюць. Лужынкі сцягнуліся за ноч лядком. Але ўжо чуваць вясна, і ўсё пазірае па-вясенняму.

Выйшаў маленькі Ясь на двор. Весела так яму, лёгка на сэрцы. Прыгрэе зараз сонца, добра будзе гуляць на дварэ.

Ся! Што-то звоніць у небе тоненькім срэбраным званочкам? Так хораша, так міла,—душа замірае! Ясь прыслухаўся. Не відаць нічога, а ў небе ціха разліваецца тоненькая песенька, як грае хто на срэбнай дудачцы. Гэта жаваранак! І так весела Ясю, здаецца, каб льга было, пацалаваў бы мілую птушачку. Галубка! Яна ўжо вярнулася з далёкае старонкі ў наш бедны край і ў ясным небе заліваецца дзіўнаю песняю.

— Тата! Тата! Чуеш жаваранка?

Бацька Яся прыслухаўся.

— Але, жаваранка. Ну, зараз, брат, і шпак прыляціць, а там і бусел, а за ім і ўсе птушкі.

Рад Ясь, што першы пачуў ён жа́варанка, і пабег хваліцца сваім сябрам. Дзеці выходзілі на двор слухаць першую песню вясны. І ім было весела.

— Эх, дзеці! Не скора яшчэ вясна,—казаў хто-небудзь старэйшы.

Дзеці не любілі слухаць такія рэчы. Яны любяць вясну, яны любяць, каб гаварылі ім аб вясне. А часам і праўда захаладае; дзеці кажуць: «Саўсім не холадна; не толькі не холадна — горача нават».

Кожную новую госцю-птушку дзеці сустракаюць з радасцю.

Чэраз некалькі часу прылятае шпак. Халадно́, туман, а ён мала дбае. Спявае на ўсё поле вясёлыя песні, седзючы дзе-небудзь на голай бярозе, як бы і холаду яму няма.

У канцы марца ўжо збіраецца шмат птушак. У лесе спяваюць дразды, лясныя жаваранкі, а па балоце важна праходжваецца бусел. На стрэхах бегаюць шустрыя бела-рудыя сытаўкі, трасуць сваімі доўгімі хвастамі.

А выйдзеш увечар на двор — крычаць качкі, жало́бна стогнуць кнігі; як у кадушку, грукае недзе на возеры бугай. Розныя галасы поўняць воздух, усё спявае і радуецца.

## ДУБ І ЧАРОЦІНА

Была вясна. Ціхі вечар. Месячык плыў у небе, свяціліся зоркі. Спакойна кацілася рака і блішчала на месяцы. На беразе стаялі тоўстыя, старыя дубы. У самым беразе, у вадзе, чуць-чуць шарасцеў

чарот. Каля самага берагу, воддаль ад другіх дубоў, рос самы тоўсты, самы магучы дуб.

Завяла чароціна з дубам гутарку.

— Скажы мне, дубе,— пачала чароціна,— чаму ты не гнешся прад бураю і бура цябе не можа здалець? Часта, стоячы тут, бачыла я, як самыя сярдзітыя буры ўпіраліся ў цябе, як у каменную сцену. На тваёй галаве бусел звіў агромнае гняздо, а ты нават не чуеш гэтае ценжэры. А я вот стаю тут ды гнуся, як жабрак. Маленькая птушачка сядзе на мяне, я не выдзержваю і гнуся да самае вады. Часам жук няўмысля вытнецца аб мяне, я ўся закалачуся, як у хваробе. Дык скажы ж мне, дубе, адкуль твая сіла? Скажы мне, чаму я такая слабая?

І кажа ёй дуб:

— Ты баішся жыцця, затым ты і слабая. Ты выбіраеш мяккі грунт, каб не так трудна было бараздзіць зямлю сваім карэннем. Усім ты хочаш унаровіць, ка ўсякаму ты падыходзіш з хітрасцю, і змалку прывыкла ты гнуцца. А калі хто гнецца, тым ён паказывае сваю слабасць і поўнае непаважэнне к сабе. А хто не паважае сябе, таго і другія не паважаюць, папіхаюць ім, як хочуць. Ты прывыкла да лёгкага жыцця і ўсю надзею кладзеш на другіх. А хто не надзеецца на сябе, той цягам бывае слабы. А я змалку надзееўся толькі на свае сілы і на сілы зямлі і сонца. Змалку навучыўся сам памагаць сабе. Нікому я не гнуўся. Лепей зламацца сусім, чым гнуцца ўсякай сіле. Мы, дубы, так і робім: або ломімся, або выжываем. Затое, як хто з нас захавае сваё жыццё, тады нікога не баімося. Праўда, і мяне можа зламаць бура і цяпер: няма на свеце такое сілы, над каторай не было б большае сілы.

## ВОСЕНЬ

«Прыйшоў Пятрок — апаў лісток; прыйшоў Ілья — апала два». Так кажуць людзі, бачачы чуць відны паварот ад лета к восені.

Луг ужо скошаны. Дзе яшчэ нядзельку таму назад калыхаліся высокія зялёныя травы, блішчалі кветкі, над каторымі з такімі вясёлымі песнямі лёталі работніцы-пчолкі, збіраючы мядок,— там цяпер пуста. Адны дзябёлыя стагі, як вежы, параскідаліся па грудочках то тут, то там. Маладзенькая травіца-атава, каторая вырасла на пакошы замеж старое травы, блішчыць на сонцы, як толькі ўзышоўшы ячмень або авёс, і сцелецца па зямлі, як павее вецер. Ёй ужо не вырасці да старое. Буслы даўно пазляталі з гнёздаў і ходзяць стадамі па лузе або кружацца высока-высока ў небе, усё роўна як радзяцца яны перад далёкай дарогай.

Жыта на полі зжата і звезена; авёс і ячмень сабраны. Толькі дзенідзе жаўцее чыя-небудзь палоска позняга аўса ці ячменю ды пачарнеўшыя лапінкі спелай грэчкі чакаюць серпа. Картафлянік на картофлях павяў, апусціў сухое лісце; адны толькі голыя цыбуры тырчаць, як палкі. Глуха і нудна на полі. Ужо не чутно спакойнае гаворкі ціхага ветру з каласкамі збожжа. Толькі ржышча — кароткія пянёчкі жыта, аўса, ячменю і пшаніцы — гаворыць, што тут яшчэ нядаўна

красаваліся пасевы. Ужо не трапечуцца ў небе над полем жаваранкі з мілымі песнямі. Прайшла вясёлая пара лета, усё адцвіло, адкрасавала. Усюды, куды ні глянь, накладае восень свой след, сваю руку. Толькі кароўкам і авечкам больш стала прастору на зжатым полі.

А глянеш на лес! Ці той гэта лес? Як адмяніўся ты, чорны, высокі, чуць-чуць засланы сінім туманам, далёкі лес! Яшчэ так нядаўна зваў і клікаў і цягнуў к сабе ты ў гарачы летні поўдзень пад свой цень, і так ахвотне хаваў ты чалавека і жывёлу ад пякучага сонца пад густою стрэхаю зялёных сваіх лістоў. Тысячы галасоў усякіх птушак, вясёлы іх шчэбет рассыпаліся ў тваім гушчары, і ціхі спакой навяваўся на душу тваю доўгаю, густою моваю, лепетам тваіх лістоў і галін. Эх, гутарлівы лес! Люблю я цябе, люблю твой шум, халадок тваіх лістоў і твой здаровы смаляны запах. А цяпер ціха і глуха і ў лесе. Птушкі перасталі спяваць, лісце пажоўкла і патроху асыпаецца на дол.

Сонца не грэе так ярка, як, бывала, улетку. Кожны дзень яно ўсё ніжэй і ніжэй ходзіць па небе. Неба часцей і часцей засцілаецца хмарамі. Невясёла пазірае яно, засланае смутнымі хмаркамі, як зааранае поле. Туманы закрываюць ад вачэй божы свет. Дробны дожджык сеецца, як скрозь сіта. Нудна і непрытульна выглядае ўсё ўвосень.

## ЗІМА

Эх ты, зімэнька-зіма!
Непагодная была:
Ні праехаць, ні прайсці,
Ні коніка правесці!

*(З народных песень)*

Крэпка скаваў мароз голую зямлю, зрабіў яе цвёрдай, як камень. Вымерзлі лужынкі, высахла гразь; халодная кара́ лёду легла на рэкі і азёры. Цвёрдую пасцельку прыгатаваў мароз для мяккага белага снегу. Чакае ўсё гэтага снегу, каб закрыцца хоць гэтай халоднай коўдрай ад пякучага марозу.

Вось падуў сівер, і папаўзлі па небе снегавыя хмары, сівыя, лёгкія, як дым, халодныя, непрыветныя, і завалаклі ўсё неба. Вось, ціха лётаючы па ветру, закружыўся белы, лёгкі пушок, камячок снегу, перавярнуўся некалькі разоў, памкнуўся з аднае стараны ў другую, як бы выглядаючы лепшае мейсца, і нячутна лёг на мёрзлую зямлю. За ім паказаўся другі, трэці, і ўсё часцей, усё гусцей залёталі гэтыя белыя, халодныя матылёчкі зімы і пасыпаліся на зямлю. І як жа многа іх закружылася ў небе! Аж пабялеў воздух, і белая сетка сплятаецца з іх. Валяць і валяць белыя сняжынкі; адзін аднаго пераганяюць гэтыя харошанькія камячкі, зляпліваюцца ў воздусі і кладуцца на зямлю. Борзда бялее зямля. Снег роўнаю пялёнкаю кладзецца на хаты, на гумны, на парканы, на плоты, на шулы, на ўсё, што ні сустрэне прад сабою.

Назаўтра, праз ноч, выходзіш на двор. І пазнаць трудна божы свет: так адмяніў яго снег! Гляньце на шулы! Дапраўды, аж смешна: стаяць усе ў рад і ў кожнай наверсе па белай шапцы-кучомцы; стаяць,

пазіраюць, усё роўна як у госці прыйшлі. На стрэхах ляжыць цэлы слой снегу, як хто палотны парассцілаў. Куды ні кінь вокам, усюды бела і бела, аж вочы адбірае. Вун стары лес. Адзеўся, прыбраўся, як у свята, і глядзіць, як немаведама хто. Проста дзіваў натварыў гэты снег-жартаўнік: цэлае войска прывёў за ноч старых баб і дзядоў!

Прыціхла рэчка, і закрыў яе зусім снег, так што і берагоў не відаць. Усюды, куды ні глянь, адна белая пялёнка снегу. І луг, і поле, і горкі — усё засыпана белым халодным пухам.

Весела выскачылі на вуліцу з хаты дзеці. Рады яны першаму снегу. Бегаюць, крычаць, пхаюць адзін аднаго ў гурбы, кідаюцца снегам. Але зімою малыя жарты: шчыпне яна і за нос, за вушы, і бягуць дзеці са двара ў хату.

— На печ лезьце! — крыкне на іх бацька ці маці.

### ЛЕТА

Прыйшло і лета. Куды ні глянь — усюды зе́лена, усё расце, усё наліваецца. Лісце на дрэвах вырасла ва ўвесь рост свой і весела трапечацца на сонцы. Весела пазірае стары лес, што разросся за сялом і цягнецца па краях поля, як разак, пастаўлены зубамі ўгору. Кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе і далёка параскідалі свае зялёныя галіны. Так зе́лена, так густа, што, здаецца, не пралезеш у лес! Птушкі аж глушаць сваімі галасамі, сваім шчэбетам. Некаторыя, раннія, ужо вывелі дзетак і клапатліва шчабечуць каля сваіх гняздзечак, як нянькі каля калыскі. Колькі кветак, колькі ўсялякіх матылёчкаў, мошак і пчолак! У воздусе стаіць бясконца шум і звон ад іх крылляў.

Поле пакрылася зеленню. Ужо выплыў авёс, ячмень; цягнуцца палоскі гароху з харошанькімі, чырвоненькімі і бледненькімі кветачкамі. Там відаць зялёненькія стужкі лёну з сіненькімі галоўкамі; бялее грэчка, наліваецца жыта і ціха шарасціць у полі сваімі сярэбранымі каласкамі. Як слаўна глядзець на гэтыя вузкія стужкі-палоскі крэсцьянскага збожжа, як свежы ветрык калыша, вядзе з імі невядомыя, спакойныя рэчы! Жаваранкі рассыпаюцца над імі песнямі, кружачыся ў небе.

Зялёнаю шырокаю паласою, зарослаю местамі лазою, круглымі зараслямі маладога дубняку, каторых завуць астраўцамі, раскінуўся луг паабапал рэчкі. Густая высокая трава, як мора, калышацца на ветру. А кветак, кветак! Якога толькі колеру не найдзеш тут кветак! Мільёны пчолак, чмялёў уюцца над імі са звонам і шумам. Так і цягне на прывольны луг, дзе так многа кветак, птушак, усякіх конікаў і матылёчкаў, песень, шуму і звону, дзе так прахладна патыхае чысты, свежы ветрык.

Шчыраю рукою ўбрала лета ўвесь божы свет.

### ВЯСКОВАЯ ДАРОГА

Вузкаю крывою стужкаю праходзіць меж палеткаў вясковая дарога. На кожным кроку разбілі яе калдабоіны; шчыра ўсыпаў пясок, багата на ёй камення. То ўзбяжыць яна на горку, то спусціцца ў лаг-

чынку, цёмнаю норкаю марскане ў лес, пад стрэху хмурных ялін, абагне курган, узгорак, роўнаю палоскаю ляжа на полі, перасячэ гай, прарэжа луг, ускочыць у вёску, згубіцца тут на мінутку і потым зноў выскачыць у поле і зноў пабяжыць калясіць грудзі зямлі.

Люблю я гэту вузкую, гэту трасучую мужыцкую дарогу. Ідзеш адзін у полі па гэтай дарозе. Яркае сонца аблівае твар зямлі мяккім цёплым светам. Бугаркамі параскідаліся па небе хмаркі, як крыгі вясною; то круглыя, то пляскатыя, плывуць яны дзе чародкамі, адна за адною, а дзе адзінока ў адну старану неба і прападаюць на краі зямлі, усё роўна як уваходзяць у зямлю. Над полем кружацца жаваранкі; крычыць дзесь-то ў небе коршун, трапечацца ястраб на адным мейсцу. А дарожка ўсё цягнецца і цягнецца, як разбэрсаны клубок ніцей, узбягае на горкі, абыходзіць балотцы. Ціха бывае часамі на гэтай дарозе! Рэдка праедзе тут панская брычка, запрэжаная параю або тройкаю добрых, сытых коней; калі-нікалі празвініць тут паштовы званок. Часцей сустрэнецца простая мужыцкая каламажка, каторую дробным трушком пранясе худзенькі мужыцкі конік, падымаючы пыл і пясок, насохшы на сонцы, доўгім слупам; пратарахцяць драбіны сваімі рассохшыміся лёсткамі і з скрыпучымі, даўно не еўшымі дзёгцю, калёсамі. Цэлы абоз фурманак праедзе ціхім крокам з бочкамі са смалою або вугаллем. Пройдзе мужык-працавік у лапцях з загарэлым тварам, на каторым відаць невясёлыя думкі; убогі, абвешаны торбамі, з расхлістанаю грудзінаю, у рванай адзежы...

А ўкруг, куды ні кінь вокам, параскідаліся нецікавыя абразы нашага роднага краю, чуць-чуць закрытыя туманам, як невясёлаю думкаю,—так знаёмыя, так поўныя ціхага, смутнага хараства. Там і сям чарнеюць бародкі і кудзеркі хваёвага лесу, раскіданага па краях поля; узгоркі, зарослыя маладым хвойнікам і купчастым ялаўцом. Цёмная ёлка, дзівам уцалеўшая ад рукі чалавека, нудна стаіць наводшыбе ад лесу і калыхае касматымі лапамі; кучка бярозак, лагчынкі, балотцы. А там — зялёная купа садовых дрэў панскіх садоў, багатая дваровая будова весела і горда выскачыць з-за горак, чорнаю плямаю кінецца ў вочы мужыцкая вёска, хораша абрысуецца белы яблык царкоўнай вежы...

Усё гэта так знаёма, так блізка сэрцу беларуса!

## ДВА МАРАЗЫ

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты: мароз Сіні-нос і мароз Чырвоны-нос.

Гуляюць-пагульваюць маразы, адзін аднаго пахвальваючы. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі. А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, палускваюць, з дрэва на дрэва пераскокваюць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па даху страляць.

— Эге,— кажа мароз Сіні-нос,— усе пахаваліся, баяцца на двор вылезці.

— Няхай толькі вылезе хто: задамо яму страху,— адказвае мароз Чырвоны-нос.

Пачало развідняцца. Паваліў з комінаў дым густы. Заскрыпелі калодзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.

— Стой жа, брат,— сказаў мароз Чырвоны-нос.— Пабяжым жа мы на дарогу ў поле.

І пабеглі яны зноў у поле; стаяць, прытуліўшыся, падарожных чакаюць.

Заскрыпелі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою. У санях селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зухаўскі вазок плыве. Званочак пазвоньвае.

— Ну чакайце ж вы,— кажа мароз Сіні-нос.— Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся.

І пабеглі яны падарожных марозіць. Доўга бег мароз Сіні-нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль. Паціскаецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А мароз Сіні-нос толькі пасмейваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў. А мароз Чырвоны-нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

— Эге, мароз не жартуе,— кажа селянін. Злез ён з саней, бяжыць, нагамі тупае, рукамі аб плечы б'е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.

— Ну пачакай ты, брат: прайму я цябе, як ты дровы сячы будзеш.

Заехаў чалавек у лес. А мароз Чырвоны-нос выперадзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў секчы — горача стала яму. Скінуў кажух. А мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць.

Зрабіўся кажух белы, як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.

— Эге, браток, дык ты тут!

Узяў пугаўё ды як стаў малаціць — ледзь жывы выскачыў мароз Чырвоны-нос ды драла ў лес.

Узлаваўся мароз Чырвоны-нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.

## МУЖЫК І ПАН

Паслаў пан свайго мужыка (за паншчынай было дзела) з пісьмом да другога пана.

Засунуў мужык пісьмо за пазуху і пайшоў. Якраз на дарозе сустрэў ён таго пана, да каторага ён ішоў з пісьмом. Вымае мужык з-за пазухі скамечанае пісьмо і падае яго пану, не скінуўшы шапкі. Гэта пану не спадабалася.

— Скажы ты мне, чалавеча, ці ў твайго пана няма лепшых людзей, што ён паслаў да мяне цябе, дурня?

Хацеў спагнаць сваю злосць на мужыку пан.

— Чаму няма?! — кажа мужык.— Ёсць, але лепшых людзей і разумнейшых ён паслаў да лепшых і разумнейшых паноў.

## ЦЯЖКАЯ ДОЛЯ

Страшна загневаўся рак і не хоча адпусціцца. Залез у сваю норку, выставіўшы доўгія вусы і шырокія плечы. Сядзіць, не зварухнецца. Ці скрыўдзіў яго хто так моцна, ці жыць на свеце абрыдла — не ведаю. Толькі ні з кім і гаварыць не хоча рак.

Падплыла да яго плотачка ды кажа:

— Рачэ, рачэ! Чаго ты так угневаўся? Ці кепска так жыць табе на свеце, што не хочаш ты і пазіраць на божы свет, вылезці на свежую воду? Усім не соладка жывецца. Вось хоць бы і мая доля. Што за доля? Пражыў дзянёк — і дзякуй богу. Жыві і бойся: то шчупак гоніць цябе, то хітры чалавек не дае табе тхнуць. Куды ні сунься — усюды яго хітрыя прыманкі. Зачэпіш — і будзь здарова, рэчачка!

І пайшла расказываць рыбка аб сваёй цяжкай долі.

А рак усё сядзіць, хмурны, як восень, і, здавалася, не слухаў нават таго, што казала плотка.

— Чаму ж ты не скажаш, рачэ, хоць слова? Чаму не хочаш вылезці на свежую, чыстую вадзічку?

— Скарэй памру, а не вылезу. Калі хто знойдзецца такі, каму горш жывецца на свеце, як мне, тады я вылезу.

І пачаў горка плакаць рак, скардзіцца на сваю долю. Проста заплакаць можна было, слухаючы ракаву скаргу.

Занудзілася ўся рэчка, аж вада закаламуцілася, так жаласна гаварыў рак. Усе грамадзяне вады прыйшлі ўцяшаць рака, і кожны хацеў расказаць раку пра сваю цяжкую долю. А рак толькі слухаў ды гаварыў: «Не! Мая горшая доля!»

І сядзеў у норцы.

Ніхто не можа ўцешыць рака.

Дачулася аб гэтым жытэйка. Шкода яму стала рака і прыйшло яно да рэчкі.

— Рачэ, рачэ! — начало жытэйка.— Паслухай, якая мая доля. Кінуць мяне ўвосень у сырую зямлю. Пуста ўкруг у полі, адно толькі я гібею там. Льюць на мяне дажджы і дзень, і ночку, вецер наносіць сухое лісце. Топчуць мяне авечкі, быдла і коні. А прыйдзе халодная зіма, укуе зямлю марозамі, засыпле мяне снегамі. Мерзну я ўсю зіму. Пазябнуць дазвання мае зялёныя лісточкі. Настане вясна, зноў па мне топчуцца з нагамі, пячэ мяне сонца, дратуюць зайцы і птушкі. А прыйдзе пара, вырастуць і выспеюць мае зерняткі, прыходзяць ка мне з серпамі людзі і рэжуць без міласэрдзя, вяжуць у снапы, кладуць на воз, кідаюць у гумны. Б'юць мяне, б'юць цэпамі, сушаць на печы, труць каменнямі ў муку. Насыплюць мукі ў дзяжу, месяць мяне, месяць і садзяць у гарачую печ. Адзін толькі і ёсць у маім жыцці прасвет — гэта як вымуць мяне з печы і абальюць халоднаю вадою. Тады толькі лягчэй мне стане. Дык вось якая мая доля, рачэ.

Заварушыў рак вусамі і вылез з нары.

## ПЕСНЯ ПТУШКІ

У цеснай, крэпкай турме аднаго вялікага горада сядзеў бедны засаджаны. Нягодныя людзі закавалі яго ў ланцугі і кінулі ў турму.

У турме было сыра, цёмна і холадна. Замеж пасцелі яму кінулі мокрую салому. Кармілі яго адным толькі хлебам і давалі адну ваду. Сядзеў ён там многа гадоў — змучаны, бледны, хворы і нудны. Рэдка свяціла сонца ў яго маленькае, вузкае аконца; свежы воздух не праходзіў у турму. Нудна думаў бедны астрожнік пра сваіх дарагіх родных, пра маленькіх сваіх дзетак; думаў, можа быць, даўно ўжо ўсе забыліся пра яго, счытаючы памёршым. Што робіцца там, у далёкім родным краі, на зямлі?

Ён падышоў пад аконца. Быў дзіўны летні вечар. Сонца апускалася ўжо к лесу, і ціха, і хараша свяціліся яго верхавіны ў залатым блеску апошніх лучоў. Па вуліцах ішлі і ехалі людзі. Турма была высокая, і людзі здаваліся маленькімі. Ён крыкнуў ім, але ніхто яго не пачуў. У сінім небе лёталі птушкі. Проціў акна ціха пралятаў арол.

— Арол, арол! — закрычаў яму астрожнік.— Сядзь ка мне на аконца, раскажы, што робіцца на зямлі, заспявай мне песню!

— Не,— сказаў арол,— акно тваё надта малое: мне негдзе сесці. Я не раскажу табе, што робіцца на зямлі, бо рэдка апускаюся на зямлю. Я ўю гняздо сваё на самых высокіх курганах у горах і на старых дубах, далей ад нягодных людзей, каб не развярнулі яны майго гнязда. Я не заспяваю табе песні, я ніколі не спяваю на зямлі. Я падымаюся высока-высока, і мае песні слухае толькі вечнае сонца.

І шырокімі ўзмахамі дужых крылаў арол горда падняўся да неба і схаваўся з вачэй.

— Лебедзь, лебедзь! Раскажы, што робіцца на зямлі, заспявай мне песню!

— Не,— кажа лебедзь,— я не раскажу табе, што робіцца на зямлі. Я плаваю заўсёды па вадзе — чыстай, светлай вадзе, між зялёнымі чаротамі. Як вада раніцаю, на ўсходзе сонца, пакрыецца чырванаватым светам, я моцна крычу сонцу: «Дзень добры!» Я не заспяваю табе песні,— я заспяваю песню, як стану ўміраць.— І лебедзь паплыў у воздусі, блішчучы белымі крыламі.

— Верабейчыкі, верабейчыкі! Сядзьце на аконца, раскажыце, што робіцца на зямлі. Заспявайце песеньку!

— Чылік-чылік! Нам некалі. Нам яшчэ трэба падзяўбці зернятак, што няўмысля рассыпаў мельнік!..

І нудна апусціў галаву бедны астрожнік, і востраю боллю заныла яго сэрца.

Раптам фуркнула шэранькая птушачка, павярцелася прад акенцам і села на жалезную крату.

— Здароў, салавейчык! Дзякуй табе, мілая птушачка, што даведалася мяне. Раскажы, што робіцца на зямлі, заспявай мне песню.

— Я раскажу табе, што робіцца на зямлі, я заспяваю табе песню,— пачаў салавейчык.

І паліліся такія трэлі, што бедны астрожнік заплакаў з радасці, упаў на салому,— і ўсё плакаў, усё слухаў.

— Учора ранкам на ўсходзе сонца,— спяваў салавей,— было так светла. Я прыляцеў да твайго доміка, сеў на зялёны арэхавы куст перад адчыненым аконцам і ўсё спяваў і спяваў. У калысачцы ляжаў твой сынок. Ён раскрыў свае светленькія вочкі і пытаў:

— Дзе тата? Дзе тата? — і слухаў мае песні...

Твае сваякі плачуць, успамінаючы цябе. Яны цябе любяць, надта любяць, і вельмі хочуць убачыць цябе. Не маркоцься! Бог бачыць, што ты невінаваты: злыя людзі выпусцяць цябе, і ты зноў выйдзеш на волю, на свет, на чысты воздух.

Дзеці твае будуць цябе шанаваць і любіць... Будзе ціхі летні вечар, доўгія цені пацягнуцца ад дрэў, на сонцы заблішчаць вокны. Ты будзеш, седзячы на ганку, расказываць сваім дзецям, як ты пакутаваў.

Будзеш іх вучыць, каб яны, як вырастуць, не давалі злым людзям рабіць злыя дзелы, каб не крыўдзілі другіх людзей. І дзеці твае паслухаюць цябе. Як яны вырастуць, ты ўбачыш іх добрымі, чэснымі і справядлівымі, убачыш, як яны будуць стаяць за бедных і памагаць ім. Ты будзеш жыць доўга, доўга. Валасы твае пасівеюць, але сэрца будзе радасна біцца.

І як ты памрэш, усе будуць плакаць па табе і маліцца, і панясуць цябе на зялёныя могілкі ў светлы сонечны дзень. Над тваёю магілаю пасадзяць рожавы куст, і я буду на ўсходзе сонца спяваць песні над тваёю магілаю...

## ЗІМА

Белым снегам замятае
Вецер чорныя палі,
Нібы вопратку ўздзявае
Шыр прасторная зямлі.

Мяккі снег лятае пухам,
І канца яму няма,
І нясе сярдзітым духам,
Дзікім сіверам зіма.

Зачыняйце шчыльна хату,
Каб не дзьмулі халады,
На акно пляціце мату,
Каб не клаў мароз сляды.

Даставайце з вышак сані —
Гайда сцежкі праціраць
І па белым акіяне
Ўздоўж і ўпоперак гуляць!

Ды кладзіце рукавіцы —
Дзе з марозам жартаваць!
Рады белай мы зіміцы,
Рады з ёю ваяваць.

Гэй вы, коні, гэй, малыя!
Што заснулі? Весялей!
Гэй, у скочку, залатыя!
Варушыцеся жывей!

## НА РЭЧЦЫ ЗІМОЮ

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому...

Хочацца Алесю
Выйсці на двор з хаты,
Ўзяць з сабой сякеру
Ды ў той лес кашлаты,

Стукнуць па дзярвяках
З-за пляча абухам
І глядзець, як сыпне
Снег халодным пухам,

Як стаяць над рэчкай
Хвоі і яліны,
Як ім снег халодны
Нахіліў галіны.

— Мамачка-галубка! —
Просіць ён так міла,—
Можа б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?

Я не буду доўга,
Зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы
Ў санках паважуся.

— Ну, ідзі пабегай,
Толькі апраніся
Ды глядзі ў палонку,
Сынку, не ўваліся.

Радасць і раздолле
Хлопчыку малому,
І не пазайздросціць
Ён цяпер нікому!

На плячо — сякерку,
Саначкі — у руку,
Хлеба ўзяў кусочак.
— Цюцік! — свіснуў Жуку.

Пад скарынкай лёду
Тут жа, каля хаты,
Працякала рэчка
Скрозь лясныя шаты.

Побач тэй рачулкі
Кучы буралому,
І застыла рэчка
Мёртва, нерухома.

Моцна яе грудзі
Маразамі скуты,
І аковы лёду
Сярод рэчкі ўздуты.

Ціснецца вадзіца,
Не знаходзіць ходу
І не мае сілы
Скінуць глызы лёду.

На рачулцы ў лесе
Меў Алесь забаву.
Ну ж і пацяшаўся
Хлопчык тут на славу!

— Эх ты, лёд-гвалтоўнік!
Што ты вытвараеш?
Ты нашто вадзіцу
Крыўдзіш і ўшчуваеш?

Бедненькай, ёй цёмна,
Цесна пад табою.
Хай жа пагамоніць,
Мілая, са мною!

Дам ёй ход, галубцы,
Каб на свет зірнула! —
І яго сякерка
Спрытна секанула.

Звякае тапорык,
Глуха стук нясецца.
Раптам клуб вадзіцы
З-пада дна ўзаўецца.

Коціць поўзверх лёду,
Іней падымае
Ды такую ж казку,
Байку хлопцу бае!

Слухае хлапчынка
Гэты сказ нязнаны,
Спеў, нікім ад веку
Ў лесе не чуваны.

То яму здаецца
Дудак хор далёкі,
То птушыны ў небе
Голас адзінокі.

На душы так ціха,
Ціха і нейк млосна,
І спявае ў сэрцы
Спеў той сугалосна.

Гэты спеў дзівосны
Чары навявае
І такія казкі
Слаўныя складае!

І ад гэтай песні
Вее дабратою,
Радасцю і шчасцем,
Мілаю вясною.

Ад тэй песні-казкі
Трудна адарвацца,
І ёй струны сэрца
Хочуць адклікацца.

## НА ЛУЗЕ

Добра ў лузе ў час палудны!
Лёгка там дыхнуць!
Хмаркі белыя марудна
За лясы плывуць,

Ветрык краскі чуць калыша,
Травы шалясцяць,
Луг зялёны жыццём дыша —
Конікі трашчаць.

Ў лозах шчэбет не сціхае,
Шум стаіць і свіст,
Ў яркім бляску спачывае
На ракіце ліст.

Спевам-гоманам і звонам
Поўніцца ўвесь луг,
І дрыжыць над ім, зялёным,
Жыватворчы дух.

## У СТАРЫХ ДУБАХ

Цэлы гай старасвецкіх дубоў раскінуўся па беразе Нёмана.

Такіх дубоў цяпер рэдка дзе ўбачыш. Іх не чапіла рука людская, толькі доўгія часы палажылі свой след — пячаць глыбокай старасці. І многа ўсякіх змен часу бачылі гэтыя нямыя сведкі прошласці! Жыццё многіх людскіх пакаленняў прайшло перад імі і праходзіць, бы тыя хвалі Нёмана, што пакручастым змеем абвівае тут іх сялібу, высокі, роўны груд, а яны ўсё стаяць, спакойныя, важныя, і жывуць сваім асобным жыццём. Праходзяць дні, ідуць сваёю чарадою зімы і леты з іх халадамі і спякотамі, з іх бурамі і навальніцамі, а яны спакойныя, як чалавек, які ўсё пераведаў на свеце, усё пераЖыў і ўжо нічога новага не чакае ад жыцця, апроч смерці. Зваленыя ж на дол тоўстыя камлі з абсмаленымі знізу жараламі іх таварышаў напаміналі жывым аб апошняй іх долі.

У леце пачыналася ўжо тая ледзь значная змена, той паварот часу, калі жыццё прыроды ідзе на спад. Скошаны луг і паскладаныя курганамі стагі, парыжэлыя ад дажджоў і сонца, ужо гаварылі аб гэтым паміранні. Буслы збіраліся ў чароды і доўга стаялі на грудах або лянiва аглядалі лагчыны. Але было прыметна, што не на пажытак пазбіраліся яны сюды, а для нейкай іншай справы. Пастаяўшы, павольна, адзін за адным, уздымаліся яны ўгару, кружыліся там, і кожны круг падымаў іх усё вышэй і вышэй. Там яны спляталіся ў адну фігуру, у адзін шырокі круг і, не махаючы крыллямі, плаўна і згодна, як па камандзе, насіліся ў неаглядным прасторы сініх нябёсаў... Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках бусліных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістам, і купалі ў сонцы свае адвечныя лапы.

На скошаным лузе, недалёка ад дубоў, пасвіліся статкі. Там і сям сядзелі пастушкі. У кожным іх гуртку былі свае інтарэсы, свае забаўкі і гутаркі. Сонца даўно ўжо звярнула з поўдня, але свяціла яшчэ

горача. У паветры было ціха, толькі звон летнікоў зліваўся ў адну доўгую-доўгую аднатонную песню, і, здавалася, прырода была закалыхана гэтым крыху сумным звонам. Маленькія камарыкі-таўкунчыкі кучкамі гулялі на сонцы, як бы чыясьці нявідная рука трэсла ў паветры маленькую сетачку.

— Чаго яны таўкуцца тут?—спытаў Грышка свайго таварыша Базыля і махнуў рукою па кучцы камарыкаў.

— Гуляюць,— кажа Базыль.— Ты думаеш, ім не хочацца пагуляць? Цяпер іх час, і гуляюць.

Базыль і Грышка — найлепшыя дружа́кі. Даўно ўжо цягнецца іх дружба — як запамятаюць. Дзве зімы ў школе сядзелі на адной лаўцы і трэцяе лета пасуць разам кароўкі.

Калі каторому маці дасць у торбачку сала, то гэтае сала разразалі напалам і пяклі яго на ражончыках. А смачнае сала, спечанае над агнём у полі! Прыгнаўшы з раніцы, хадзілі разам лавіць рыбу і купацца.

І ні з кім яны не злучаліся, і, апроч свае кампаніі, другой не хацелі. Раз толькі сварыліся хлопцы, і пасварыліся за глупства — за ножык-цыганчык, якому ўся цана — тры грошы. І толькі ў злосці назваў Грышка Базыля насалём — у Базыля быў даўгаваты нос,— а Базыль Грышку абазваў рабэйзаю.

Але рэдкія выпадкі лаянкі толькі на кароткі час раскідалі іх дружбу, і хлопцы скора зноў гадзіліся, пасля чаго Базыль, водзячы пальцамі па носе, гаварыў:

— Здаецца, мой нос, Грышка, не такі ўжо вялікі?

— Твой нос — мерны нос. Вось я, дык праўда рабы!

Гаворачы так, Грышка хацеў учуць пацверджанне Базыля, што ён не такі ўжо рабы, бо сам Грышка не лічыў сябе рабым.

— Што тваё за рабаціннe! — казаў Базыль.— Зімою зусім не знаць, а цяпер проста сонца трошкі асмаліла твар.

І хлопцы зноў былі дружакамі і пачыналі гульню або гаворку аб чым-небудзь. Гаворка ў іх бадай ніколі не зводзілася, а вакол было так многа ўсяго, што давала ім страву для гутарак... Палягуць часамі хлопцы пад дубам. Грышка ляжа на спіну і колькі хвілін моўчкі ўглядаецца на дуб, пад якім яны ляжаць.

— Як ты думаеш, Базыль: ці ёсць на свеце такі чалавек, які панёс бы гэты дуб?

Базыль акідаў вокам дуб і, крыху падумаўшы, казаў:

— А пэўна ёсць.

І тут жа расказваў свайму сябру здарэнне з якім-небудзь асілкам. Так, адзін селянін (Базыль нават назваў яго прозвішча) паехаў красці хвою ў княжацкі лес. Ссек ён такую тоўстую хвою, што і два чалавекі не абнялі б яе. Узваліў на воз і паганяе каня. Конь — ані з месца! А якраз насунуўся ляснік. «Стой жа,— думае ён,— нідзе ты не дзенешся: не ўцячэш з гэтай хвояй», і сам пазірае, што будзе далей. Чалавек гэты, нічога не гаворачы, выпраг каня, прывязаў яго да канца калоды і, сказаўшы: «няхай жа будзе брыдка каню», узяўся за аглоблі і пацягнуў калоду. Ляснік толькі галавою пакруціў — і слова не сказаў селяніну.

— Вось каб мы былі такія дужыя, усіх бы зарэчанцаў пабілі! — уздыхнуўшы, гаварыў Грышка.

— Вось дзіва! Што ж іх тады біць: дзьмухнуў бы, і ўсе б пакідаліся.

— А ці праўда, што наш Нічыпар Шулай дужаўся з чортам? — запытаўся зноў Грышка.

— Няўжо ж не: у яго самога чортава рабро — яго ніхто не пакоціць.

— Ну, ніхто! А калі ў каго два рабры?

— Ведама, паборае той, у каго два... Але, мусіць, той, хто мае чортава рабро, пойдзе ў пекла,— памаўчаўшы, зноў сказаў Базыль.

— Чаму ў пекла? Ён жа родзіцца з гэтым рабром.

Базыль на гэта нічога не адказаў і задумаўся.

— А каб табе, Базыль, сказалі: «Памірай цяперака і ты пойдзеш у рай». Ці згадзіўся б ты паміраць?

— Не! — адказаў ён.

— Чаму?

— Мне было б там маркотна аднаму; а тут усе: бацькі, хлопцы, ты. Каб з усімі, то пайшоў бы.

— А як памрэ чалавек, што з ім робіцца? — як бы сябе самога спытаў Грышка.

— Што ж? Душа выходзіць. Прыйдзе смерць — і памрэш. Зяхнеш разоў два — і няма!.. Я бачыў, як паміраў мой дзед Гаронім. У хаце мы былі адны з дзядзькам. Як дзед сканаў, дык дзядзька адчыніў комін.

— Навошта? — спытаў Грышка.

— Каб душа выходзіла... І страшна, брат, страшна стала!

— Я ў хаце не ўседзеў бы! — страпянуўшыся, сказаў Грышка і потым дадаў: — Вось каб яе перуны, гэтую смерць! Каб злавіў дзе, халеру, ды спаліў. Тады людзі жылі б і жылі.

— Калі ж бо для яе няма смерці.

— У смерці няма смерці.

Сказаўшы гэта, Грышка ўглыбіўся ў думкі.

— Што ж, брат, каб гэту смерць узяла другая смерць, дык зноў бы смерць засталася. Ніяк, брат, ад яе не выкіруешся.

— А што, Грышка, калі я памру і па смерці буду прыходзіць да цябе, ці будзеш ты баяцца?

— Кіньма гаварыць! Чорт яе бяры з смерцю,— сказаў Грышка, падняўся, азірнуўся і пачаў свістаць, каб адагнаць паганыя думкі.

Хлопцы сціхлі і задумаліся.

Было тут, у дубах, адно месца, дзе Базыль любіў сядзець, назіраць і думаць.

Там над абрывістым берагам Нёмана стаяў стары, прысадзісты, тоўсты дуб. Ад доўгіх часоў бераг падмываўся вадою, паволі асоўваўся і агаляў тоўстыя карэнні старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся набок, як падгуляўшы гаспадар, а аголены і працягнуты над вадою яго корань здаваўся нагою, і выходзіла здалёк так, што дуб збіраўся перабрысці Нёман. Сеўшы на гэтым корані, Базыль пазіраў, як бегалі дробныя хвалі, як звівалася ў вадзе доўгая раска; вада

то ўздымала яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ёю, як вецер дымам.

Каля самага берага стаяў у вадзе голы лазовы ражон. Ён тое і рабіў, што борздзенька ківаўся пад напорам вады. І ніколі не меў спачыну гэты ражон: і ўдзень і ўночы ківаўся ён. Хіба можа зімою, як марозы скуюць лёдам ваду, адпачыне гэты пахілак-ражон.

Базыль пазіраў і думаў. А.вакол было ціха. І Базылю здавалася, што ён чуе спевы гэтай цішыні. Доўга ён прыслухоўваўся, але спевы былі нейкія невясёлыя, і яму стала маркотна: усё ішло, здавалася яму, сваёю дарогаю і жыло сваім жыццём, сярод якога ён пачуў сябе чужым.

А Грышка тым часам бегаў каля ракі. Якраз па тым баку ішоў з вудамі рыбак. Пабегаўшы па беразе яшчэ колькі часу, Грышка пайшоў шукаць Базыля. Углыбіўшыся ў свае думкі, Базыль нічога не заўважаў і сядзеў усё на тым жа дубовым корані. Звесіўшы ногі над вадою, пазіраў ён уніз, як цёк Нёман. Тут было глыбока, і вада мела цёмны колер ад гэтай глыбіні. Аб чым жа думаў хлопчык? Відаць, аб чымсьці важным і сур'ёзным, бо губы яго былі шчыльна самкнуты, а вочы пазіралі кудысьці ўглыб. Схаваўшыся за куст, Грышка моўчкі наглядаў за сваім сябрам. І без усякай злой мыслі раптам вылецеў з-за куста і гукнуў на ўсю моц:

— Га-а!

Знячэўку Базыль так перапалохаўся, што ўвесь задрыжаў і падскочыў. Спужаўшыся, ён не мог ужо ўтрымацца і ссунуўся ўніз. На момант, зачапіўшыся лапцем за дубовы корань, павіс уніз галавою над гладдзю вады, а потым шугнуў... і прапаў з вачэй. Нёман злёгку здрыгануўся, вада расступілася і дала няшчаснаму хлопчыку месца ў халодных сваіх нетрах, ды колькі кругоў пабегла па вадзе ва ўсе бакі. Разы два ці тры паказалася яго галава; рука нязграбна і сударгава лавіла паветра; зрабіўшы паўкруг і захлёбваючыся, ён прапаў назусім...

Грышка не ведаў, што так можа скончыцца яго дурасць, ён падняў прарэзлівы крык і лямант:

— Ратуйце! Утапі-іўся! Гвалт, людзі, ратуйце!

Другія пастушкі збегліся на крык і далучылі свой лямант. Рыбак падбег першы. Скінуўшы адзежу, адважна рынуўся ён у ваду.

Збегліся людзі.

Заламаўшы рукі, маці разрываючым душу крыкам галасіла і прычытвала. Як непрытомная, кідалася яна ў ваду, яе трымалі мужчыны...

Сонца гэтак жа сама пазірала на гэтую з'яву; гэтак жа сама было ціха ў прыродзе, і ўсё жыло сваім жыццём. Старыя дубы стаялі спакойна, важна, як і заўсёды. Толькі галкі, спуджаныя людскім крыкам, пазляталі з дубоў, ды сіваваронкі з сярдзітым краканнем кружыліся над дуплістымі дзеравякамі, як бы злуючы на тое, што патрывожылі без усякай прычыны іх прывольны спакой, і ззялі на сонцы сваім зялёным пер'ем.

Базыля выцягнулі і адратавалі, але пасля такога здарэння ён стаў ціхім і яшчэ больш задуменным.

## «ДЗЕРАВЕНШЧЫНА»

Як яно будзе далей, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё, што кепска; і сам Міхалка так думае, стоячы на каленках па некалькі разоў на дзень.

Ён ужо кінуў і жаліцца сабе самому на сваю долю і пакорна згінаў калені ў куточку. І гэты куточак стаўся яму нават блізкі, як бы родны. Ды яно і не дзіва: тое месца, дзе ронім мы першыя слёзы і пакідаем частку сябе саміх, становіцца дарагое для нас. А ў гэтым кутку Міхалка многа чаго перадумаў. І адзін толькі ён, гэты куток, знаў усе яго думкі, бо пагаварыць тут няма з кім.

Ох, гэты горад! На пакуты сюды ўзялі малога Міхалку. А горш за ўсё, дык гэта тое, што ніхто тут яго не шкадуе, ніхто за яго не закіне слова. А часамі выскачыць ён на двор, куды забяжыць знячэўку які сабака, можа такі самы бяздомнік у горадзе, як і Міхалка, каб хоць з сабакам адвесці душу. І толькі пачне Міхалка заводзіць знаёмства з ім, кінуўшы яму перад гэтым кусочак хлеба (а хлеба іначай, як украдкам, не возьмеш), як ужо братавая барабаніць рукою ў шыбу.

Міхалка ўжо ведае, што яму рабіць: ідзе ў хату і займае свой куточак, становячыся на калені. Сам Міхалка, калі хто выпадкам запытае, чаго ён стаіць на каленях, тлумачыць так:

— Я яшчэ — «дзеравеншчына», не знаю гарадскіх парадкаў і кепска трымаю сябе. От з мяне і выбіваюць «дзеравеншчыну».

— А ты любіш вёску? Паехаў бы туды?

Раней чым адказаць, Міхалка баязліва азірнецца і ціхенька скажа:

— Паехаў бы.

Праўда, Міхалка нядаўна прыехаў з вёскі. Але гэта толькі гаворка адна — «прыехаў». Проста забралі яго сюды — і ўсё, бо дома не было дзе падзецца. Бацька памёр, маці памерла, от і забралі яго сюды. Цяпер ужо нічагутка — прывык, але спачатку дык было надта кепска. Сядуць, бывала, за стол. На маленькім століку каля дзвярэй стаіць самавар: скавыча ён на ўсе галасы або пішчыць, як тая свіння ў плоце, аж пара з яго верне. На стале стаіць масла; тут жа ў місцы ляжаць цэлыя кавалкі мяккай і белай булкі, і такая, на яе ліха, цікавая, што Міхалка не можа адарваць ад яе вачэй.

— Чаго ты ўтаропіўся, як воўк на парасё?

Міхалка спускае вочкі і бярэцца за гарачую шклянку і тут жа борздзенька адрывае ад яе апечаную руку. Шклянка са звонам куляецца на сподак. Чай, як бы яго чэрці таўханулі, разліваецца па стале і на порткі Міхалку. Міхалка ўсхопліваецца з крэсла і стаіць, расставіўшы рукі.

— Свінюк ты! — чуе ён сярдзіты голас брата.

— У карыце трэба цябе карміць,— дадае братавая.

Згарэў бы ты лепей, гэты чай і гэта булка, якая ўжо цяпер і ў рот не лезе Міхалку. А калі абыходзіцца без таго ліха, то, выпіўшы шклянку, Міхалка павінен быў падзякаваць. Тут зноў не заўсёды абыходзілася шчасліва. Замест «благодарю» ляпне Міхалка ні к сялу ні к гораду — «дзякую».

— Што за «дзякую»?!

Міхалка чуе, што вушы яго чырванеюць. Яму неяк сорамна сказаць «благодарю»,— здаецца, усе яго на смех падымуць.

Але ўсё гэта было раней. Цяпер ён навучыўся казаць «благодарю» і «благадарыць» і калі трэба і калі не трэба. Ды зноў жа, з адным «благодарю» на свеце не пражывеш — яшчэ знойдзецца якое-небудзь ліха. А што гэтае ліха не зводзілася, можна было бачыць хоць бы і з таго, што Міхалка па колькі разоў у дзень стаяў на каленках. То скажаш не так, то ступіш не гэтак, і за ўсё пападала то вушам, то каленям. Дайшло да таго, што Міхалка наракаў на вушы і калені. Няхай бы былі сабе дзірачкі ў галаве, але на ліха яшчэ гэтыя храсткі? Або ногі? Ці не лепш было б, каб яны не згіналіся? Тут Міхалка прабаваў хадзіць, не згінаючы ногі. Выходзіць, што можна.

Найгорай было яму вясною і летам, калі сіняе неба ласкава звесіцца над зямлёю, як маці над калыскаю, дзе ляжыць яе любае дзіцятка. А гэтыя хмурынкі! Хто іх ведае, адкуль яны выпаўзаюць і куды ідуць так згодненька, такія мілыя ды прыветныя. От бы ўзяў ды сеў на іх і паплыў бы разам з імі, каб толькі далей быць адгэтуль. Сонейка так хорашанька заглядае ў вокны. У садку шчабечуць птушкі. Верабейчыкі з вясёлым чырыканнем снуюць у паветры.

Міхалка доўга пазірае ў акно. Нарэшце ў яго не хапае сілы працівіцца закліку вясны, і ён, азірнуўшыся, каб не затрымаў хто, ціха выходзіць на двор.

Прытуліўшыся дзе-небудзь каля вугла, доўга стаіць Міхалка. У гэтыя хвіліны ён нічога не думае. Ён толькі чуе, як прыемнае цяпло песціць яго маленькае цельца. І добра так і радасна на сэрцы. А што робіцца на душы, то гэтага і не скажаш. Толькі часамі замігацяцца родныя з'явы далёкай вёскі, дзе Міхалку так вольна жылося, і сэрца неяк ападзе, калі ўспомніць ён сваё тут жыццё. Там, на вуліцы, чуваць, як тупаюць на тратуарах ногі, як грукаюць капытамі па бруку коні, як шуміць і гудзе многагалосы горад.

Доўга стаіць так Міхалка. Потым ні з таго ні з сяго захочацца прабегчыся, і ён, як куля, рванецца на двор, ганяецца за верабейчыкамі, покі братавая не крыкне, каб ішоў забаўляць Лідачку.

Усе чары прападаюць у яго душы, і, уздыхнуўшы, нехаця пляцецца ён у хату. А тут яшчэ горай апануюць думкі, яшчэ мацней пацягне яго на двор, яшчэ з большаю сілаю, яшчэ ярчэй устануць перад вачыма дзіўныя малюнкі роднай вёскі.

Дом, дзе жыў Міхалка, стаяў на краі горада. Глухаватая вуліца, паабапал якой ляпіліся драўляныя домікі, скора выходзіла за горад, у поле. Міхалка не адзін раз выбягаў на гэтую вуліцу і нюхам вясковага чалавека ўгадваў, што недалёка тут павінна быць поле. Раз ён, выбегшы на вуліцу, адышоўся ад дому. Тут ён ужо не мог стрымацца і пабег да таго ўзгорка, што весела пазіраў жоўтым скатам сваіх пяскоў. Міхалка ўзляцеў на гэты ўзгорак. Унізе рассцілаўся горад з блішчастымі вежамі цэркваў і касцёлаў. То там, то сям высока ў небе тырчэлі трубы фабрык і заводаў, распускаючы доўгія хвасты чорнага дыму. А з другога боку раскінулася поле, чарнеўся лес і вясёлыя пералескі, а там, яшчэ далей, ледзь-ледзь выступалі з сінаватай

смугі стрэхі сялянскіх хат. І так моцна пацягнула Міхалку туды, што аж душа яго млела. І так ярка прыпомнілася яму свая вёска, што, каб меў крыллі, то ўзняўся б і паляцеў бы. Міхалка ўсё цікаваў у адзін бок. Там, здавалася яму, павінна быць дарога да роднай вёскі. Ах, як там добра ў вёсцы! От Міхалка стаіць на гэтым узгорку, а яна вось-вось, здаецца, тут, перад самымі яго вачыма. І так ясна, як цяпер, не бачыў ён яе і тады, калі жыў там. Вось высокі касагор над самым Нёманам. Пад гэтым касагорам стаяць над вадою пахіленыя старыя вербы, там калісь так многа было ракаў. Там ляжыць зялёны луг, а за лугам цягнецца высокі і заўсёды пануры лес. Гэтага лесу Міхалка калісь баяўся. Асабліва нешта страшнае і непрыветнае прыдаваў яму густы алешнік, што зялёным доўгім валам цягнуўся каля самага лесу. Цяпер жа гэты лес быў такі мілы і жаданы, што каб прымеў, то абняў бы яго і цалаваў. Міхалка так задумаўся, што не чуў, як да яго падышоў брат.

— Чаго ты тут, шыбельнік? — спытаў брат і моцна пацягнуў за вуха.

Міхалка задрыжаў увесь, як злоўлены злачынец.

— Пайшоў дадому!

Хлопчык, прыклаўшы руку да вуха, якое быццам гарэла на агні, пабег дамоў, не смеючы зірнуць убок.

За самавольства забаранілі яму гуляць на двары. Але Міхалка не абразуміўся. Куды там! Ён задумаў такую рэч, што ўсе дзівіцца будуць. А покі што цішком ён рыхтаваўся споўніць тое, што задумаў. У самы глухі куток пад ложкам, куды нават венік служанкі Насты рэдка калі зазіраў, складаў Міхалка розныя прыпасы на дарогу, бо ён задумаў уцякаць адгэтуль. Тут ён назапасіў з восем кавалачкаў цукру, акрайчык хлеба з асушкам. Праўда, хлябок высахне, але Міхалка знойдзе ў дарозе крынічку і размочыць яго. Усе гэтыя прыпасы ляжалі на газеце, якую Міхалка цішком узяў са стала. Разам з гэтымі прыпасамі ляжаў мячык і чалавек з гумалястыкі, у якога трэба было толькі дзьмухануць, каб ён загукаў, як жывы. Усё гэта Міхалка адкраў ад Лідачкі. Мячык і чалавечка ён дасць сваім сябрам, бо хто ж ідзе з горада без гасцінца? Засталося толькі пашыць торбачку, каб забраць увесь скарб з-пад ложка. А там... Ад адной гэтай думкі лёгка рабілася на сэрцы.

А наўперад ён яшчэ па дарозе зойдзе ў тую вёску, дзе яго брат служыў летась. У гэтай вёсцы Міхалка згубіў многа грошай — капеек пятнаццаць медзякамі. А знайсці іх лёгка, бо Міхалка, як цяпер, бачыць тое месца, дзе згубіў іх; не знайшоў жа іх тады затым, што хутка перабіраліся ў горад і не было калі пашукаць як належыць быць.

Доўга не мог заснуць Міхалка ў суботу вечарам, перад сёмухай: заўтра рана, досвіту, выберацца ён у дарогу. У тых думках, што цяпер мітусіліся ў галаве, цяжка было разабрацца... Э, ды што! Устане і пойдзе: пойдзе перш да таго ўзгорка, адкуль ужо лёгка патрапіць на дарогу... Скарэй бы толькі заснуць ды ўстаць заўтра раней. Міхалка плюшчыў вочы, але сон, як сумыслу, не ішоў да яго, і толькі можа пад поўнач заснуў Міхалка. Нягледзячы на гэта, устаў ён ранютка, асця-

рожна падняў галоўку, агледзеўся, прыслухаўся. Брат і братавая спалі: нават гэтая жаба, Лідачка, і тая не варушылася. Ціхенька адзеўшыся, Міхалка павольненька выцягнуў торбачку, у якую яшчэ з вечара злажыў усе свае рэчы. Прыгатаваўшыся як мае быць, ён яшчэ раз азірнуўся і, трасучыся ўвесь, падкраўся да дзвярэй і ўзяўся за ключ. Павярнуў раз і абамлеў: ключ, на яго ліха, так загрымеў, што напэўна ўсе абудзіліся. Са страху Міхалка выпусціў з рук торбачку. Усё было ціха. Відаць, ніхто не чуў. Узяўшы торбачку, Міхалка ціха рыпнуў дзвярыма і выйшаў на двор.

Не ведаю, ці на дабро, ці на няшчасце Міхалкі, вароты на двары былі замкнёны; агароджа ж была такая высокая, дашчаная, што ўляпіцца было недзе. Колькі хвілін Міхалка хадзіў па дварэ, шукаючы пералаза. І не думаў ён ніколі, што гэтае здарэнне папсуе яму ўсю справу! Можа б і пералез як, але, на бяду, трэба было якраз выйсці на двор яго брату! Міхалка думаў, што ўжо яму цяпер будзе канец — так моцна лупіў яго брат.

І што ты зробіш, калі не шанцуе? Міхалка, як і наўперад, жыве ў горадзе і толькі тым і цешыць сябе, што тады, напэўна, будзе яму палёгка, як выб'юць з яго «дзеравеншчыну».

## ПЕСНЯ АБ ВЯСНЕ

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках булі-гулі! —
Песні чуюцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк.
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.

А ён, гучны і смяшлівы,
Так і ходзіць, аж дрыжыць,
І другі сябрук шчаслівы
Насустрэч яму бяжыць.

Ты паслухай, дзед сярдзіты,
Што там чуецца ўгары?
Што за спеў за самавіты
Ў небе правяць песняры?

А зіма аж пачарнела —
Годзе ёй тут кросны ткаць!..
Гэй, маленства, жыва, смела
Выйдзем вясну прывітаць!

А як слаўна каля хаткі
Нам пабегаць, пагуляць!
Ну, зіма, збірай манаткі,
Годзе нас табе ўшчуваць!

Маладая вясна,
Залатая пара!
Будзь красна і ясна,
Не шкадуй нам дабра!

Вокам маткі зірні,
Бледнасць з твару згані!
Дай уздужаць малым
Пад павевам тваім.
Мы вяночак спляцём,
Табе песню спяём.

## ПІЯНЕРСКАЯ ПЕСНЯ

Мы — дзятва зямлі шчаслівай,
Мы — народ вясёлы,
Гаманлівы,
Ды імклівы,
Нам расчынены зычліва
І прыветна школы.
А ты толькі ведай-знай:
Болей ведаў набывай!

Нам дарогі ўсе адкрыты,
Наш прастор бясконцы,
Апавіты
Ў аксаміты
Ды вясёлкамі умыты,
Разасланы ў сонцы.
А ты толькі ведай-знай:
З краю ў край па іх ступай!

Ўсюды нам даюць з ахвотай
У жыццё пуцёўкі:
Будзь пілотам,
З самалётам,
Як арол, у небе лётай,
Камандзір будзь лоўкі...
Адно толькі ведай-знай:
Сцеражы савецкі край!

Піянерскай клятвы словы
Мы не забываем:
За свет новы
Мы гатовы
І на бой пайсці суровы
Супраць чорнай зграі.
Піянер, ты будзь гатоў
Падтрымаць сваіх братоў!

## ДЗЕД-ГОСЦЬ

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам

Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай воўнаю-кажухам.

Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.

А ялінка!.. Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.

Тут лісічка, зайчык, мышкі,
Рыбкі, буслік даўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы!

Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая...
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.

Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

## САВОСЬ-РАСПУСНІК

### I

Вось што, дзеткі, мае краскі:
Што хадзіць за многа міль?
Можа лепей замест казкі
Расказаць вам адну быль?

Згодны?
Добра.
Ну дык вось:

Зваўся хлопчык наш Савось.
Ой, і быў жа ён дураслівы!
У сад лазіў па грушы, па слівы,
Дзіркі ў градах рабіў,—
Моркву сцібрыць любіў,
І маку ён скручваў галоўкі,—
Ну, на гэта быў страх які лоўкі!

А рукі ў яго не мыты,
Нос не абцёрты;
А сам ён сярдзіты,
Такі задзірака,
Такі забіяка,
Буян,
Грубіян.

Зачэпіць старога.
Пакрыўдзіць малога,—
Такі ўжо нягоднік
Ды гэтакі шкоднік!
Бегаў загуменнямі,
Кідаўся каменнямі,
Пападаў у шыбы —
Хоць гані з сялібы!
Меў на зло смякалку —
Зніме з вежы галку,
І такі гарачка,
Няхай яго качкі!

## II

У Савосева суседа
Быў пярэсценькі каток,
Выхаванец Паўла-дзеда,
Такі слаўны пестунок!
Нос чарнявы,
Хвост бялявы,
Задзірасценькі;
Кіпцік-шчыпчык
Заграбасценькі;
Лапкі-драпкі
Машастовыя.
А шарсціначкі
Шаўковыя;
Губкі, зубкі
Адмысловыя;
Вусы-русы
Патырчастыя;
Тая спінка,
Як націнка,
Выгінастая.
Вушкі-слушкі
Не мыляюцца,
Вочкі ў ночку
Запаляюцца.
Ну, такі каток харошы,
Як драпянка за тры грошы!
Хадзіў коцік пад масток,
Лавіў рыбку за хвасток,
Потым дзеду ён на печы
Казкі-байкі варкаваў,
Белым хвосцікам дарэчы
Тахты спевам адбіваў.
Коцік з дзедам жыў у згодзе,
Не сварыліся за неч.
Быў раз коцік на паходзе —
На мышэй падняў ён меч.
Шоў каток з паходу,
Разагнаўшы мышак,
І сеў на калоду
Пад страху ў зацішак.
Грэе сабе спінку,
Мордачку і лапкі.
Зірк — Савось з будынку
Выскачыў без шапкі!
За Савосем — Рудзька.
— Кусі ката, цюцька! —
Коцік бедны ўвесь жахнуўся,
Ды на шчасце быў тут плот,
А пры плоце дуб,— і кот
Толькі фыркнуў, мільгануўся
І на дубе апынуўся,
Сеў каток
На дубок,
Кажа забіякам:
— Эх, Савось, шалапай!
Ты мяне не чапай
І не цкуй сабакам! —
Не ўдалося Савосю
Катка падкусіць,
І прыйшлося Антося
На помач прасіць.

## III

Вось Савось
І Антось
Сталіся дружакі,
Каля клуні стаяць,
На ліхое таяць —
Закідаюць знакі,
Як злавіць ім катка
І аддаць з малатка
Рудзьку на расправу.
Падшывальцы ж яны,
І іх розум дурны
Выдумаў забаву!
А па тэй нарадзе
Саўка торбу крадзе,

Анцік — хлеб сабаку.
А каток на печы
Сеў, як той старэчы,—
Яму і не ў знаку.
Эх, пярэсценькі каток!
Сцеражыся ты, браток!
Не хадзі ты па надворку,
Не хадзі гуляць на горку —
Там бяда цябе чакае,
Сам не ведаеш, якая.
Асцярожненька хадзі,
За Савосем ты глядзі,
Бо Савось замысліў штось,
Нездарма з ім і Антось.
Затаіўся у кутку
Наш Савось і катку
Замаўляе зубы
Для кацінай згубы:
— Ах ты, коцічак мой!
Які файны ты, ой!
Што за спіначка!
Ну, карціначка!
Ідзі, коцік, да мяне,
Не пакрыўджу цябе, не!
А якія вочкі!
Бачаць сярод ночкі.
А якія лапкі!
Ды як яны цапкі!
Ах, ты, мой каточак,
Чорненькі насочак!
Ідзі ж, коцік, да мяне:
Не пакрыўджу цябе, не.
Яўкнуў коцік, выгнуў спінку,
Хвост падняў, як корбу,
Але ў тую ж хвілінку —
Шусь каток у торбу.

IV

І катка панеслі ў поле.
А там чыста — ні кусточка,
Ні хваінкі, ні дубочка,
Адны межачкі ды ролі.
Няма дзе катку схавацца:
Чуць сінее лес далёкі,
І сяло за тры валокі,—
Як катку там ратавацца?
Плача ў торбе коцік, плача:
— Мяў, мне душна! Мяў, мне цесна!
Б'ецца сэрцайка балесна,
Бо мне грозіць смерць, няйнача!
Кот бурчыць і гурчыць,
Лапамі дзярэцца,
А Савось хоць бы што —
Цешыцца, смяецца.
— Ну, спыніся, Антось,
Падзяржы сабаку:
Толькі выпушчу ката,
Цкуй тады ў атаку.
Адышоўся Савось,
Анцік прытаіўся,
І тут коціку астрог
Раптам адчыніўся.
З торбы выскачыў, прысеў —
Трэба ж разглядзецца.
Зірк — там Рудзька! Што рабіць!
Дзе яму падзецца?
— Цкуй! пускай! — крычыць Савось.
— Кусі ката, Рудзька!..—
Ша! чаго ж так закрычаў
Наш Савось нялюдска?
Глянуў Анцік — вось дзівота!
Вось дзе ліха, вось бяда!
Што зрабіла ім дурота
І што сталася з ката!
Вось папаліся дзе змоўцы —
Проста шкода малышоў:
На Савосевай галоўцы
Коцік схованку знайшоў!
Лемантуе бедны Саўка,
Ашалелы, чуць жывы,
Кот упіўся, ну, як п'яўка,
І не знімеш з галавы!
Запусціў кіпцюр у скуру
Аж да самае касці.
Скача Саўка з таго дуру
Ды крычыць: «Пусці! пусці!»
Рудзька круціцца навокал,
Брэша, цапае катка.
Ай, Савоська, ты мой сокал!
Справа дрэнна і брыдка!

Ой, нагараваліся,
Ой, бяды набраліся
Хлопцы з тым катом!
З поля як вярталіся,
Людзі з іх смяяліся,
Ды дружна, гуртом.
Шоў Антось уперадзе,
Рудзьку вёў на прывязі,
Пазіраў уніз,
А Савось наводшыбе,
На галоўцы з коцікам,
Шэпчучы: «кіс-кіс!»
І хоць ён не піянер,
А чырвоны меў каўнер.

### РАК-ВУСАЧ

### (Вершаваная казка)

#### I

Ну, пачнем мы казку так:
Жыў ды быў на свеце рак
З доўгімі вусішчамі,
З чорнымі вачышчамі,
Зыркімі, лупатымі,
З лапамі разгатымі,
Шырачэзны ў шыі,
Клешні — во якія!
А як вусам павядзе —
Страшна зробіцца ў вадзе!
Рыбкі хвосцікам мяльнуць
Ды галоўкамі кіўнуць.
І барзджэй наўцекача
Ад рачышчы-вусача.
А ён шыішчай трэп-трэп!
Жабка ў бераг — і ні шэп!
Страшны рак быў, грозны рак,
Як ушчэміць — будзе знак.
І баяліся яго,
Як няведама каго.

Пад карэннямі ракіты
Жыў той рак, вусач сярдзіты.
І ёсць загадка такая:
Ні смяецца, ні гукае,
Жыве ў бухце пад ракітай,
На ім світа,
Ды не сшыта,
Хоць кравец, ды не Мікіта,
Ідзе ў лазню камінарам,
А выходзіць — пыша жарам.

#### II

Ну ж і слаўна каля рэчкі!
І чаго на ёй няма!
Сітнякі стаяць, бы свечкі,
Тут маліна і парэчкі —
Розных ягад проста цьма;
Тут і лозы, і ракіты,
І чарот, і асака,—
Ну, як тыя аксаміты,
Вабяць вока рыбака.
А тых птушак і не злічыш:
Качкі, кнігаўкі, драчы,
І сам бусел-паляўнічы
Вас у госці тут закліча,
Жабу ў дзюбе несучы.
Тут жыве званар-камар,
Як балотны гаспадар,
Даўганосы, даўганогі,
Голас тонкі, а сам строгі.
У траве між чаратоў —
Колькі розных матылёў,
Бабак сініх і чырвоных:
Іх сукеначкі ў фальбонах,
Іх убор — іду ў заклад —
Закасуе ўсіх дзяўчат.
Весела на рэчцы
І траве, і кветцы,
І крылатым пташкам,
Мошкам і мурашкам,
І крыклівым дзеткам,
Асабліва леткам:
У рачулцы купаюцца,
У пясочку качаюцца.

## III

Ой, бяда, бяда!
Мутная вада —
Спахмурнела рэчка:
Засмуціўся рак,
Стаў ён, небарак,
Ціхі, як авечка.
Не варушыць вусам,
Лёг на дно ён брусам
І ляжыць дзён тры;
Растапырыў клешні
І не есць яешні,
Жабінай ікры.
Не вылазіць з норкі.
— Лёс мой,— кажа,— горкі —
Цяжка ў свеце жыць!
Вось падплыў акуньчык:
— Вылезь, рак-гарунчык,
Годзе табе ныць.
Не смуціся дужа,
Развяселься, дружа,
Пашкадуй ты нас!
Зойдзешся ад голаду,
Прападзеш ты змоладу
Ды ў вясновы час.
А як свеціць сонейка,
Грэе рэчкі лонейка,
Песціць лес і гай,
Грэе так гарачанька.
Развяселься, рачанька,
Нас не пакідай!
Ты сядзіш нахмураны,
Злосны і абураны
І не бачыш дня.
Апусціў рак вочы,
Нават і не хоча
Слухаць акуня.

Плотка падплывае,
З ракам размаўляе:
— Адпусціся, мілы!
Чым цябе ўлагодзіць?
Што табе абходзіць,
Поўніць сумам жылы?
І нам, рыбам, трудна,
Жыць часамі нудна,
Проста ох-ох-ох!
Гоняць нас усюды,
Ловяць нас на вуды,
Надзяць на гарох,
Ловяць невадамі,
Душаць венцярамі,
Брэднем, тапчаком.
Ох, жыццё — не свята,
Горачка багата,
Але ж мы жывём.
Адпусціся, рача!
Нават рэчка плача
Над сваім сынком...
Рак маўчыць зацята,
Вусам не пакратаў...

## IV

Грозны сом дае наказ:
— Склікаць сход у той жа час
І на ім абмеркаваць,
Як нам лепей рады даць,
Як усцешыць чорнага
Рака непакорнага?
Сом наказ канчае так:
— Будзь ты старастам, шчупак!
Каб хутчэй ва ўсе канцы
Рассылаліся ганцы!
Тут шчупак мяльнуў хвастом,
Плотак спудзіў пад кустом,
А маруднага ліна
Выгнаў з саменькага дна.
Усім холаду задаў
І нарэшце загадаў:
— Гэй вы, плоткі-верхаводкі!
Паслужыце справе, цёткі!
Заклікайце рыбу ўсю:
Накажыце карасю,
Няхай вылезе з гразі,
Хай плывуць сюды язі,
Мянтузы, яршы, кялбы
І акунь, той гад рабы.
Ды сказаць яму прытым
Словам старасты маім,
Каб, спаткаўшыся са мною,
Да мяне стаў галавою!

Плоткі старасце — паклон,
І ўсе рынулі ў разгон.

## V

У глыбознай бухце
Між карчоў дубовых
Пачыналі рыбы
Важныя размовы.
Сом адкрыў нараду,
Выступіў з дакладам,
А язь сакратарыў,
Сеўшы з сомам радам.
— Шаноўныя сябры,
Ляшчы і асятры,
Ліны і мянтузы,
Паслы ад драбязы
І іншыя асобы!
У нашай рэчцы — гора:
Смуткуе рак і ўчора
Ад гэтакай жалобы
Прыйшоў да заключэння:
Жыццё — адно мучэнне,
І згінуць хоча ў цвеце,
Бо кажа ён, дзівак:
Найбольш няшчасны — рак
Ва ўсім вакольным свеце.
І толькі з той пары
Ён вылезе з нары
І смутак свой пакіне,
Калі хто давядзе,
Што ёсць яшчэ ў вадзе
Ці проста абы-дзе
Пакутнік яшчэ большы,
Чый лёс за рачы горшы,—
Іначай рак загіне.
І вось цяпер, браткі,
Аблазьце ўсе куткі,
Знайдзіце кандыдата
І дайце мне адказ.
Я запэўняю вас,
Пакутнікаў такіх,
Сапраўдных і цяжкіх,
Налічыцца багата.
Зашумелі рыбы:
— Назавем без хібы!
Імі гаць гаці,
Лёгка іх знайсці.
— Цішэй, сябры, увага! —
Азваўся сакратар.—
Тут ёсць такая пляга,
Што кіне ўсіх у жар:
Калі хто сапраўды
Сябе няшчасным лічыць болей,
Чым наш пакутнік-рак,
Тады
Ён добрай воляй,
Без вагання
Аддасца раку на сняданне.
Так, так!
Іначай рак не дасць нам веры.—
Сказаў ды зноў сеў за паперы.
Вось сказаў, дык сказануў!
Як сякерай секануў!
Прыкусілі языкі
І мянькі, і акунькі,
А маруда той, лінок,
Віль хвастом — ды пад кусток!

Хвілін не меней пяць
«Пакутнікі» маўчаць.
— На свеце жыць не так ужо
і горка,—
Сказала краснапёрка.—
Плывеш сабе туды-сюды
Без гора, без бяды;
Пад кусцік зазірнеш,
Ну, часам і ўздыхнеш,
Ды больш ужо з прывычкі,
Чым з клопату якога,—
Ці так кажу, сястрычкі?
— А так! Жывецца нам —
нічога!
Хапае ўсім вадзічкі,
І плаваем па волі,
І жыру ёсць даволі.
А гэта нараканне
І ракава жалоба —
Пустое выдумлянне
Ці панская хвароба.

— Гум! — тады прамовіў
сом,—
Што ж мы раку паднясём?
Хай, выходзіць, гіне рак?
Ці ў няшчасных стаўся брак?

— Дайце слоўка мне сказаць!—
Ялец стаў хвастом віляць.—

Я скажу вам праўду ўсю:
Жыць найгорай карасю.
І ўсе грымнулі:
— Так, так!
Ён — няшчаснейшы бядак!
Ён жыве ў балоце,
У такой брудоце!
Ён непаваротны,
Ён такі гаротны,—
Збоку глянуць — жах бярэ,
Як ён з гора не памрэ!
— А дзе карась?
— Зашыўся ў гразь,
І сход яму не мілы,
Прыйсці не мае сілы!
І кажа сом: «Заклікаць гаруна!
Шчупак, пазавіхайся!»
— Умомант я спалю, як з
перуна!
А ты, карась, трымайся!

## VI

Прывялі карася пад канвоем,
Абступілі яго шчыльным роем.
Плотачка як глянула,
Ледзь на дно не канула:
Такі ж ён няшчасненькі,
Кругленькі, блішчасценькі.
Лін паплыў пад лозы
Выцерці там слёзы.
Нават сом крануўся,
Хвост яго сагнуўся,
Вусы задрыжалі
Ад такога жалю.
Пытае сом лагодна,
Быццам бацька родны:
— Ну, як жывеш, карась?
— А так сабе, нядрэнна:
Качаюся, як князь,
Прысмакі ем штодзенна.
Здзівілася тут грамада:
— Вось выпаліў, дык выпаліў,
брыда!
— Цікава,— кажа сом,—
цікава!
Здзівіў ты нас, карась,
яй-права!..
Ну, а скажы: ты смуцішся ці не?
— Чаго смуціцца мне?
Не ведаю такога пачуцця —
Цярпець я не магу ні смутку,
ні ныцця!
І часу не хачу на глупства
траціць:
За гэта мне ніхто нічога не
заплаціць.
Здзівіўся сом:
— Не хочаш траціць часу?
На што ж ты траціш час?
— А вось які мой сказ:
Люблю паэзію, жыцця майго
акрасу,
І з ёю я не ведаю згрызот:
Паэзіяй я смутак адганяю,
Зашыюся ў чарот
І вершы там складаю.
Здзівіўся сом, ускінуў вочы язь
І кажа карасю:
— Паэце наш, карась!
Гаворыш складна ты,
Паслухаць нават люба,
Мы слухалі, разявіўшы раты,
Хоць ты адказваў досыць груба.
Аднак хачу цябе спытаць:
Што будзеш ты спяваць,
Як часам кульганеш
Ды на патэльню пападзеш?
— Папаўся, брат-карась!
Паэзія тут — лясь!

— Не згодзен з вамі, грамадзяне!
Калі той час настане
І лягу я ў скавараду,
Дык вусам там не павяду:
Люблю я песціцца ў смятане!

Сом смяецца:
— Няхай ты згары!
Дзівакі, як відаць, песняры,
Мабыць розум у іх слабаваты.
Падавайся, карась, ты дахаты.
Пачакай! Ці не чуў ты, нябога,
Хто ж гаруе, пакутуе многа?
— Пра пакуты чарот мне шумеў,
Але слухаць я часу не меў.

## VII

Паслалі дэлегацыю:
— Плывіце вы ў чарот!
Пра гора хай раскажа нам, —
Паслухаць хоча сход.
Прыгожых пара плотачак,
Акуньчык і кялбок
Чароту пакланіліся
І кажуць:
— Галубок!
Паслалі нас, чароцейка,
Ад рыб'яй грамады
Прасіць цябе і кланяцца,
Каб вызваліў з бяды
Пакутніка няшчаснага,
Што ўздумаў паміраць —
На сонейка на яснае
Не хоча пазіраць!
Скажы яму па шчырасці,
Як цяжка табе жыць,
Што раку сорам скардзіцца,
Смуціцца і тужыць.
Дык будзь жа ласкаў, міленькі,
Паслухай, паслужы:
І мудрасць сваю ты яму
І гора пакажы.
— Ша-ша! шу-шу!
Упартасць я скрышу
Рачыную, зацятую:
Нягодамі багатую
Я долю раскажу —
Зражу!
Шу-шу!
Сшу-шу!
Ша-ша!
І-ша!

## VIII

Рак сядзіць у нары,
Высунуўшы клешні,
І не есць ні ікры,
Ні тае яешні.
Ну, чакай жа, брат рак:
Вунь ідзе чароцік!

Рыба валіць пад гак,
Расчыніўшы роцік.
Плёх стаіць на вадзе,
Няма месца нідзе.
Стаў чарот у позу
Супраць вербалозу:
— Ша-ша! шуш-шу!
Увагі, рача, я прашу...
Рача, рача! Ёсць на свеце
Многа нешчаслівых;
Вылезь з норкі, рача-квеце:
Смутак твой — не дзіва.
Я — гаротнік, якіх мала,
Ты паслухай толькі:
Я на грунце нетрывалым
Распускаю голькі.

Распускаю іх вясною:
Вее халадэча,
Выюць ветры нада мною,
Ломяць мае плечы.
Я адзін, няма заслоны,
Не затуляць лозы,
А мой ліпцік, мой зялёны,
Смокча тля, стракозы.

Я б хацеў стаць як калода, —
Быць магутным люба.
Не судзіла ж мне прырода
Стаць мацней ад дуба.

Рача, рача! Ой, кароткі
Век мой чараціны!
Як жыву я ў час паводкі —
Не відно чупрыны.

Прыйдзе восень, пажаўцею,
Быццам бы з жаўтачкі.
Вось увага, дабрадзею,
Долі той, лайдачкі!

І на лёдзе на падсцілку
Палажу я косці.
А хто прыйдзе на магілку,
Што на тым пагосце?

Рача, рача! Ёсць на свеце
    Многа нешчаслівых...
Вылезь з норкі, рача-квеце,—
    Смутак твой — не дзіва.

І заплакаў тут
Наш чароцік горды.
Рак-вусач — ані шэп!
Быццам камень, цвёрды!

## IX

Вось бяда, дык бяда!
Што ты скажаш, грамада?
Справіцца з бядою
Можна грамадою.
Трэба рукі прылажыць,
Каб наш рак застаўся жыць.

Каб не траціць лішніх слоў,
Зноў хацелі слаць паслоў,
Ды, на шчасцейка, якраз
Плыла качачка ў той час.
Выклікаецца яна
Абразуміць гаруна.

— Дзякуй табе, качанька!
Патурбуйся, мілая!
Памірае рачанька.
Клешня ён двухвілая,
Галава упартая,
Нікуды не вартая.

Разважалі яго мы —
Ён ні слова, як нямы!
Весяліў і акунёк,
Весяліў і чараток,
Весяліла плотачка,—
Паспрабуй ты, цётачка!

## X

Рак сядзіць у нары,
Высунуўшы клешні,
І не есць ні ікры,
Ні тае яешні.
Сцеражыся ж ты, рак:
Вунь ідзе, брат, качка!
Рыба валіць пад гак,
Там цяпер гарачка.
Плёх усцяж па вадзе,
Няма месца нідзе.
І залапатала
Крыллямі тут качка,
Ды вось так сказала
Гаруну бядачка:
— Рыбка непакоіцца
    З гэтакага суму,
Сэрца яе кроіцца,
    Бо што ты надумаў?
Ой, занадта многа ты
    Носішся з сабою!
Справа варта рогату,
    Параўнай з маёю.
Я хоць і жанатая,
    А жыву ўдавою.
Ой, жыццё праклятае
    Не дае развою!

Ранняю вясенькаю,
    Як сяляне ў поле
Выедуць з сявенькаю,
    Я адна-адненькая
    Шворуся па доле
І шукаю купінкі
    Зацішной і дзікай,
Аглядаю рупненька
    З боязню вялікай
Кожную мясціначку,
    Кожненькую гатку,
Дзе б мелі спачыначак
    Дзеткі-качаняткі.

Без мужчынскай помачы
    Я майструю хатку,
Галовачку ломячы
    І дзюбок-лапатку.
А мой качар шэранькі
    Знаць мяне не знае:
Б'е, скубе мне пераньні,
    Я ж цярплю — адна я!
А як дзетак выведу,
    Клікну іх на воду,
Дык сустрэну злыбеду,
    Гора-перашкоду,

На жыццё качынае
Робяцца замахі.
Век трасуся, гіну я!
Мучаць сэрца страхі...
Ой, ды няма ліку ім,
Горкім тым падзеям!
Ды не робім крыку мы,
Скардзіцца не ўмеем.

Дык уваж ты клопаты,
Рыбіны заходы.
Гэта расшалопай ты,
Кінь згрызоты-зводы!
Нарабіў грамадзе
Клопату па вушы.
Вусам рак не вядзе,
Хоць бы клешняй рушыў.

## XI

Ах, бадай жа ён скіс,
Гэты рак вусаты!
Па-над берагам звіс
Сум яго заціяты!

І няўжо ж, грамада,
Не дасі ты рады?
Проста смех і бяда
З гэтакае звады!
Слухаў бусел, маўчаў,
Думаў, а нарэшце
Чаплі штось прабурчаў,
Нібы зяць да цешчы.
Чапля крыллем лоп-лоп —
І ляціць да рыбы.
Мусіць, бусел на троп
Тут навёў без хібы.

Даюць чаплі слова,
Вось яе прамова:

— Сябры! Рэчка — наша
агульная справа.
Ды пайшла ўжо нядобрая слава,
Што рыбы, птушкі і травы
І матылі над гакам
Не справяцца з тым ракам.
Папрабуем заклікаць жыта,
Прываду яго сама і — квіта.
Калі рак і яго не паслухае,
Тады кія занюхае!

Рыба, збіўшыся пад мосцікам,
Папляскала чаплі хвосцікам.
— Дзякуй табе, чапленька!
Патурбуйся, родная!
Памірае рачанька,
Галава нягодная!

## XII

Рак панура сядзіць
І на свет не глядзіць.
Сцеражыся ж ты, рак:
Вунь ідзе, брат, жыта!
Рыба валіць пад гак,
Сом храпе сярдзіта.
Плёх усцяж па вадзе,
Няма месца нідзе.
Каліва ржаное,
Спелае, буйное
Стала над вадою
І сказала: «Рача!
Скрыўджан ты, няйначай,
Нейкаю бядою.
Але ты паслухай, дружа:

Ой, па свеце ходзіць сцюжа,
Ой, халодзіць яна дужа!
Ветрам дыша, снегам сцеле,
Ледзь душа трывае ў целе.
Надыходзіць старасць-восень,
З воч знікае неба просінь,
Віснуць ніці з хмарных кросен,
А мяне нясуць у поле,
Рассыпаюць ды на ролі
З саламянае сявенькі
У халодны дол пусценькі.
Усё чыста з поля знята —
Там адны мае зярняты.
А той вецер дзікім свістам
Дзьме па полі, полі чыстым,

Усцілае жоўтым лістам
Мае шоўкі, мае руні
Ды халодных хмар насуне.
Золкасць, зыркасць і плюхота,
Безлюдзь, смутак, адзінота.
Скубуць мае руні-шоўкі
І авечкі і кароўкі,
Бо няма ім больш спажывы,
Бо сабраны травы, нівы.

А там сівер дыхне злосна!
Ой, як страшна стане, млосна!
Ткуць марозы кужаль белы,
Засцілаюць ім свет цэлы,
Убіраюць дол змярцвелы.
Мае шоўкі, мае руні
Крышыць злы мароз-дзядуня.

Пад абрусам тым кужэльным,
Пад тым холадам пякельным
Я ляжу, сплю сном смяртэльным.
Ды надыдзе зноў вясенька,
Маладзічка весяленька,
Шумным спевам пройдуць воды,
Зноў павее ветрык згоды,
Маім шоўкам, маім руням
Дасць жыццё вясна-красуня.

Як зязюлька ж крыкне ў гаю,
Я на сонцы заіграю
І пучочкі выганяю.
Вецер бегам несупынным
Гоніць хвалі срэбрам
плынным,
Шоўкам сцеле на загоны,
А я толькі б'ю паклоны
На мяжы траве-кудзельцы,
Ветру, сонцу і зямельцы.
Ой, падыдзе ж тое лета —
Жоўтым шоўкам я адзета.
Прыйдуць жнейкі-маладзічкі
І дзяўчаты-чараўнічкі,
Зрэжуць колас мой буйненькі
Пад звон песень галасненькі:
«Пара зямлю адмыкаці,
Пара росу выпускаці».

Як мост, лягу я на просце.
Вязуць з поля, ды не ў госці,
Паб'юць цэпам мае косці,
Мае зе́рнеткі пасушаць,
Камянямі іх падушаць.
Ой, мае ж вы шоўкі-руні!
Ой, пабілі ж мяне ў клуні!
Пакрышылі, памалолі,
Не далі мне жыць на волі!
У той дзежачцы дубовай
З жоўтай клёпачкай альховай
Рашчыняюць хлябок новы,
Рашчыняюць на вадзіцы
З беленькай мае мучыцы.
Мяне ў дзежцы месяць-месяць,
Пераверну́ць разоў дзесяць
Ды настольнічкам завесяць.

А печ паляць дачырвона,
Гляджу ў страсе я здзіўлёна.
Ой, ды чым я вінавата?
Кіне ў печ мяне лапата,
Дзе агнём усё пранята.
Я ў агні тым абамлею,
Пажаўцею, учарнею.
І вось толькі як вадзіцай,
Не вадзіцай, а жывіцай
Мяне ўмые маладзіца,
Тады толькі свет пабачу...
Каму ж горай з нас, мой рача?»
І сказаў тут рак-вусач:
— Грамада! Ты мне прабач!
Мая журба ў прах пабіта —
Зваява́ла мяне жыта,
І ад гэтае пары
Прападай мой сум стары!

* * *

Рыба з радасці такой
Пайшла ў скокі талакой,
А за ёю пташкі,
Навары́ўшы кашкі
З спеленькіх пурышак
І з малінак — пышак;
А за птаствам — мошкі,
Падабраўшы крошкі;
За мошкамі — дрэвы,
Распачаўшы спевы;
За дрэвамі — травы
Ладзяць баль цікавы.

І прыйшлі музыкі
Чарадой вялікай.

Граў на скрыпачцы камар,
На дудачцы — чмель-дудар,
Хрушч узяў басэтлю,
Задае там пытлю.
Шэршань барабаніць,
Камарыка ганіць:
«Пайшоў вон! Пайшоў вон!
Ты не гэты бярэш тон!»
Муха на цымбалах
Струны калыхала,
Авадзень на леры
Выцінаў без меры,
А чырвоны конік
Жарыў у гармонік.
Сеў цвіркун
На чыгун
Ды тне на кларнеце,
А жучок-чарнячок
Пачаў песні пеці.
І так хораша спяваў,
Што зусім прычараваў
Тую бабку Гапку,
Што надзела шапку.
Выскачыў журавель,
Як Піліп з канапель,
Напалохаў жабку,
Адтаптаў ёй лапку.
Пайшлі ў скокі сотні пар,
А за імі і камар
Бусла спрытна падхапіў,
Буслу ногу зачапіў,
На мазоль наступіў.
Драчык песняй скончыў баль
І дашчэнту знішчыў жаль.
Тут дайшлі мы да канца,
Дайце ж чарачку вінца,
А не,—
Дык папляскайце хоць мне!

## СТРАШНАЕ СПАТКАННЕ

— Вось што, Тараска: годзе ўжо табе каля рэчкі бегаць, лепш занёс бы ты дзядзьку полудзень на Высокі Бераг. Не палянуйся, сынок,— сказала мне матка.

Я быў хлопец паслушны і любіў, калі мяне за гэта хвалілі. Мяне таксама цікавіў і рум на Высокім Беразе. Вы, напэўна, не ведаеце, што гэта за штука такая «рум». Румам у нас называецца тое месца, куды вывозяць зімою калоды з лесу, каб вясною збіць іх у плыты і сплаўляць па рэчцы.

Усю зіму возяць туды калоды і навязуць іх, бывала, столькі, што загрузяць увесь бераг. А калоды ўсе такія тоўстыя, такія гладкія, роўныя — паглядзець і то было люба. А колькі там народу, колькі гоману, крыку і смеху! Проста як на кірмашы.

Разумеецца, я з вялікаю ахвотаю згадзіўся занесці дзядзьку полудзень.

Яшчэ зранку, на досвітку, пайшоў наш дзядзька на рум біць калоды. У маім уяўленні яшчэ і цяпер жыва ўстае гэты Высокі Бераг над Нёманам, дзе так страшна бушуе веснавая вада. Яна не тоўпіцца ў берагах, імкнецца напрасткі, на ачосы, выліваецца з берагоў і шырокаю стужкаю, хвалюючыся, бяжыць па нізкіх лагчынах, як бы хоча хутчэй дабегчы ў нейкі далёкі-далёкі край, каб першаю прынесці туды якуюсь вельмі важную вестку адгэтуль. А самым цікавым для мяне было пабачыць, як з высокага яруса бярвення кацілі ў Нёман калоды. Высока над вадою ляжаць гэтыя ярусы. Ад ярусаў да самай вады падложаны тонкія, доўгія бярвенні, каб калоды каціліся лацвей і шпарчэй. На ярусах стаяць маладыя хлопцы і сталыя мужчыны з бомамі ў руках.

— Р-р-разам! р-р-разам!

Пагукваюць хлопцы і падважваюць бервяно. Узнялі, зрушылі. Бервяно коціцца штораз шпарчэй. На момант усё заціхае. З нястрыманаю сілаю і з громам бервяно падае ў ваду.

— Гу-у-у-у! — бухаецца яно ў Нёман, на момант знікае ў вадзе, і толькі цэлая сцяна срэбных пырскаў уздымаецца ў гэтым месцы.

Я жыва сабраўся, дастаў з пячуры сваю дубінку, бо ў лесе могналучыцца воўк, а, седзячы ў хаце, я ўжо колькі разоў лупцаваў у сваіх думках гэтаю дубінаю воўка, узяў дзядзькаў полудзень і выйшаў з хаты. На дварэ, каля хлява, на сухой кастрыцы ляжаў Галас, з якім я быў у вялікай дружбе. Убачыўшы мяне, Галас завіляў хвастом у знак прывітання.

Я свіснуў. Галас падняўся, пацягнуўся і пазяхнуў. Але, як відаць, ён не выспаўся або так штось заленаваўся, бо не кінуўся адразу да мяне, як рабіў гэта звычайна. Ён прысеў на кастрыцы і задняю нагою стаў чухаць каля вуха.

— Галаска, цюцік! На, цю, на! На, цю, на! — пазваў я яго.

Галас, схіліўшы набок галаву, падышоў да мяне бачком, панюхаў дзядзькаў полудзень і зірнуў мне ў вочы. Я заўважыў, што ён быў не галодны. Гэтым і тлумачылася яго гультайства.

— Шукай зайца! Шукай зайца! — крыкнуў я і пабег, каб гэтым самым надаць руху гультаю Галасу.

Галас неахвотна пабег за мною, правёў мяне за кладку; але як толькі ўвайшоў я ў лес, мой Галас пачаў адставаць: сядзе на дарозе і сядзіць. А калі я аглядаўся, ён махаў хвастом, як бы хацеў сказаць, што ў яго няма ніякай ахвоты ісці са мною.

Галас зрабіў мне яшчэ адну ці дзве ўступкі і сяк-так дайшоў да лесу. Але тут ён спыніўся каля першых хвой, доўга нюхаў зямлю і ўжо не падымаў на мяне галавы, як яго ні клікаў, і не зварочваў на мяне ўвагі. Панюхаўшы, Галас азірнуўся вакол, штось разважаючы, трушком пабег краем лесу і знік.

— Ну, я ж табе пакажу! — патрос я дубінкаю ў бок Галаса і пайшоў далей.

Гэтае здарэнне з Галасам крыху парушыла той добры настрой, у якім быў я, выходзячы з дому. Перш-наперш мне было крыўдна: тая асоба, якую я лічыў сваім прыхільным сябрам, якую не раз частаваў вялікімі кавалкамі аладак і хлеба, за што мне часта пападала ад старэйшых у доме, аказалася зусім не такою, як гэта я думаў. Але гэтае пачуццё крыўды скора прайшло, бо я меў натуру незлапомную, і яно змянілася пытаннем: чаму Галас не пабег за мною? У сваю чаргу гэтае пытанне выклікала цэлы рад другіх пытанняў і здагадак: ці не думае толькі Галас, што я яшчэ настолькі вузел і каратыш, з якім яму, Галасу, сабаку сталаму і дарасламу, быць запанібрата і станавіцца на адну дошку не пасуе? І далей, ці не лічыць ён мяне такім нікчэмным, што ісці са мною праз лес па глухой дарозе ён проста не адважваецца па той прычыне, што я не магу даць ніякай забяспекі, а свая кашуля, кажуць, бліжэй да цела? Гэтыя пытанні ўжо датыкаліся майго гонару, і я, прызнацца, крыху ўскіпеў. Я смела кінуў вачыма на лес, мацней сціснуў у руцэ сваю дубінку і яшчэ шпарчэй стаў пера-

біраць нагамі, падымаў дубінку і стукаў ёю шмат болей, чым вымагалася ўмовамі хады. Затое ж я чуўся смялей і гэтым дадаваў сабе той храбрасці, якой, на жаль, у меня бракавала.

А лес быў стары і глухі. Па адзін бок дарогі стаялі больш елкі, але такія цёмныя і панурыя, што нічога добрага не казалі майму сэрцу. То там, то сям, паміж зялёных, сакавітых галін, доўгімі кудламі звісалі пасмы сівага моху, якраз як тая барада жабрака Яноля, які заўсёды ўражаў мяне сваёй сіваю барадою і наогул здаваўся мне страшным. І ці не Яноль толькі выглядае гэта вунь там з-за елкі? «Э, глупства!» — сказаў я сам сабе і адвёў свае вочы з гэтай яліны, але ў мяне засталася нейкая непрыемнасць.

Чым далей падаваўся я ў гэты лес, тым усё болей глушэла. І галасы птушак, што так звонка далятаді з акраіны лесу, цяпер змоўклі. Або іх тут не было, або яны проста не адважваліся падаваць голасу? Скарэй усяго, баяліся, бо птушкі наогул тут пападаліся. А самы лес рабіўся больш і больш непрыхільным, чужым, незнаёмым і, што горш усяго, варожым. Калі я пазіраў у бок лугу, які прасвечваўся скрозь галіны лесу, мне было крыху весялей. Але як толькі я кідаў вочы ў процілеглы бок, асабліва на гэта Палешукова балота, я чуўся не па сабе. Там цягнуўся вялікі лес, густы і стары. І пазіраў ён на мяне зусім няласкава. Ён быў пахмуры і, як мне здавалася, не любіў, калі ў яго ўладарства асмельваўся заходзіць такі вузел, як я. Яго погляд ясна казаў:

— Ось пачакай — пакажу я табе, як аднаму хадзіць праз лес!

— А што ты мне пакажаш? — храбрыўся я.— Я цябе не баюся! — І тут жа ў думках зазначыў сам сабе, што я сказаў нядобра: не трэба быць такім грубіянам, бо ўсё ж такі гэты лес — мне не раўня, і ён гатоў яшчэ больш усердавацца і ўгневацца. І што яму абходзіць — узяць і сапраўды пакараць мяне, кінуўшы якому-небудзь страху. Хіба мала ў яго гэтых служак?! І толькі падумаў я так, мае вочы самі, як бы іх што прыцягнула, зірнулі ў падножжа старога лесу і затрымаліся на лясным страшылішчы — вывараце. Гэта была ўжо старая хвоя, вывернутая бураю. Яе доўгія жоўтыя карэнні, як вусы і лапы цёмнага страху, высока ўздымаліся над зялёным мохам. Гэтыя лапы, і вусы, і жоўтая зямля між імі мелі вельмі страшны выраз і свой яркі і пэўны вобраз. Гэтаму ж вобразу маё ўяўленне надавала розныя формы і змест, варта было толькі затрымацца на іх крыху даўжэй. Я добра ведаў, што гэты выварат — звычайная з'ява ў лесе. Мне даводзілася сустракаць іх вельмі часта, разглядаць зблізку ўсе схованыя каморкі, закарвашкі, і тым не меней я не мог вызваліцца ад пачуцця нейкага страху, якім пагражалі мне гэтыя вывараты. Мне здавалася, што пад вываратам ці ў самым вывараце штось тоіцца і адразу можа выявіцца, але з таго боку і ў тым вобразе, якіх я ніяк не спадзяюся.

Цяпер я адчуў, што гэта дарога не такая простая і лёгкая, якою здавалася мне дома. І мне зноў успомніўся Галас. Чаму ён не згадзіўся ісці са мною праз лес? Цяпер я зразумеў, што Галас, напэўна, счуў воўчыя сляды, калі так доўга затрымаўся каля першых хвой, адкуль і вярнуўся дадому. Мне стала маркотна і сцішна. А гэтая дубінка, з якою я так казырыўся на печы, здалася мне проста смяхотнаю.

А на палавіне мае дарогі, як сумысля, стаяў самы цёмны лес. Тут было найбольш страшнае месца дарогі, бо з гэтым лесам было звязана ў мяне многа апавяданняў аб страхах і розных выпадках, якія налучаліся тут з людзьмі. І гэтае месца было ўжо блізка.

Самае важнае — мінуць лінію. Прайшоўшы яе, можна лічыць, што палавіну дарогі я зрабіў, бо ўжо далей пойдзе вясёлая палянка. Яна заўсёды сустракала мяне прыветна, як бы спагадала мне. Там пачнецца яшчэ адна цёмная лагчына, праўда, невялікая; а там Доўгі Лужок, Бервянец, за імі Высокі Бераг.

Мне страшна, але іду.

Ну, вось і лінія. Якая яна роўненькая! Яна перасякае мне дарогу. Адзін канец яе бяжыць кудысь далёка на ўзгорак, у глыб лесу, а другі ідзе праз цёмны-цёмны ельнік і выходзіць на луг. Але цяпер луг аддаліўся, і я ўжо не бачу яго.

Я прайшоў яшчэ крокаў сто. Па правай руцэ цягнуўся ельнік ўперамешку з маладымі хвоямі, а з левага боку пачынаўся бярэзнік. Гэта той самы бярэзнік, дзе летась наш дзядзька, ходзячы па грыбах, напаў на неруш і набраў цэлую сявеньку выдатных баравікоў-бярозавікаў. Тут пачыналася дарога на Млыновішча.

І толькі зірнуў я ў кут між гэтых дарог, як адразу спыніўся і аслупянеў. Валасы на галаве сталі падымацца і расці, шапка насунулася на вочы, а ногі страцілі здольнасць руху. Скура на мне шорхнула, сэрца замлела, а па ўсім маім нутры пакацілася нейкая гарачая хваля. Сярод старых бярэзін, нагнутых тоўстымі камлямі над зямлёю і абросшых сівым мохам, стаяў звер!

Звер гэты быў незвычайнае велічыні. Асабліва вялікай была яго галава і наогул увесь перад. Масці ён быў шэрай, шэрсць меў кудлатую і доўгую.

Першы момант анямення і адзервянення прайшоў, і думкі мае пачалі крыху варушыцца. Я нават перастаў адчуваць уплыў страху, ціхенька, зусім без слоў, я заспяваў сам сабе песню:

Ходзіць свёкар па двару,
Расчасаўшы бараду.

Гэтаю песняю мяне часта дражнілі дома, бо калісь я яе спяваў, неміласэрна гаркаючы — я не мог тады вымавіць чыста «р», а казаў «рла»,— гэта і служыла прычынаю таго смеху, ад якога я часта аж на сцяну лез.

Чаму яна, гэта песня, прыйшла цяпер мне на памяць, я не магу растлумачыць.

А звер стаяў на адным месцы, загарадзіўшы мне дарогу. Ён стаяў нерухома, толькі зрэдку, і то ледзь прыметна, варушылася яго страшная галава і велізарныя вушы. Думкі аб тым, як размінуцца з гэтым зверам і як занесці дзядзьку полудзень, у меня не было, бо я быў цвёрда пэвен у тым, што далей таго месца, дзе стаю цяпер, не зрушуся ні на адзін крок. Разгледзеўшы звера, я пераканаўся, што гэта быў воўк. Я колькі разоў бачыў воўка, але такога вялікага і страшнага мне не прыходзілася ніколі сустракаць.

«Чаго ж ён так узіраецца на мяне? Чаму ён не кідаецца і не ха-

пае?.. Эх, Галас, Галас! Чаму ты не пабег са мною?» — Мяне ахапіў нейкі жаль, і я гатоў быў заплакаць. Мне так шкада стала свайго дому, мамы і таты, братоў і сясцёр! — «Эх, мілы мой братка Алесь! І за што толькі дражніўся і біўся я з табою! Ох, гад жа я, гад печаны! Як толькі хапала ў мяне дзёрзкасці сказаць табе кепскае слова і падняць на цябе руку! Як мог павярнуцца мой язык, каб сказаць на цябе «булавешка»?»

Я быў цяпер у становішчы той мухі, якая заблыталася ў павуціне, а павук ужо нарыхтаваўся, каб высмактаць з яе ўсе сокі.

«І што мне рабіць? Чаго стаіць гэты пракляты воўк? Чаму ён не душыць мяне? Чаго ён маўчыць?»

А воўк як бы насміхаецца з мяне, стаіць, пазірае, зачароўвае мяне сваім звярыным поглядам.

Мімаволі я пачаў памаленечку адступаць назад, не спускаючы вачэй з воўка. Воўк нічога — стаіць! Мне стала крыху лягчэй. Я ступіў назад — яшчэ, яшчэ. Ужо крокаў дваццаць адышоўся я такім парадкам. Воўк ледзь-ледзь ужо відаць, але не варушыцца.

Павярнуўся тады я — у адной руцэ палка, у другой збан з дзядзькавым полуднем — і як засмаліў, як налёг! Азірнуўся назад тады толькі, калі з лесу пачала выплываць наша хата. Тут я спыніўся, пайшоў ціха і важна, думаючы аб тым, як павесці дома апавяданне аб гэтым выпадку.

На дварэ мяне сустрэў Галас і кінуўся да мяне кулём.

— Ідзі, ідзі: я цябе пачастую!

І як толькі Галас хацеў падскочыць, каб лізнуць мяне ў твар, я злосна штурхануў яго нагою.

— А каб ты апруцянеў, нягоднік ты!

Я ўвайшоў у хату.

— Чаму ж ты вярнуўся? — спытала мяне мама. Я стаў расказваць, што было ў дарозе. Расказваў я далёка не так складна, як гэта было ўжо склалася ў маёй галаве.

Матка выслухала мяне ўважліва, але не сказала таго, што ўсё гэта спатканне — плод майго палахлівага ўяўлення.

А як вечарам прыйшоў з лесу мой тата і сказаў, што ў Пятровіцах (якраз недалёка ад месца, дзе быў гэты выпадак) воўк патрывожыў пастухоў і авечак, то ўсе ў нас дома пераканаліся, што я сапраўды спаткаўся з воўкам.

Тыдні праз два давялося мне зноў ісці па гэтай дарозе. Але цяпер я быў не адзін — я ішоў на крок ззаду за сваім бацькам. Прыйшоўшы на гэтае самае месца, я зірнуў туды, дзе стаяў воўк. І што ж вы думаеце? Гэты самы воўк стаяў і цяпер!

Нічога не сказаў я свайму бацьку, іду і пазіраю. Бадай жа ты спрахла: гэта была старая крывая бярэзіна, абросшая мохам і нахіленая над долам!

Я смеху баяўся і нікому не казаў аб гэтай памылцы, і толькі цяпер, мае дарагія, прызнаюся вам ва ўсёй гэтай праўдзе.

## МІХАСЁВЫ ПРЫГОДЫ

*(Урывак)*

### I

### НАПРАДВЕСНІ

Надакучыла дзецям зіма:
Ім разгону зімою няма.
Маркотна Міхасю,
Алесю і Ясю,
Валодзю, Андрэю
І ўсім, хто дурэе
І хоча разгону —
Ну, Юрку, Сымону,
Марынцы, Тацянцы,
Аленцы, Мар'янцы,
І Інцы, і Юльцы,
Натальцы, Ганульцы —
Ну, словам, дзяўчатам
І хлопцам,
Тым хватам.
Сагналі ахвоту на санках,
На лыжах, каньках і лядзянках.
Зімою забавы
Не дужа цікавы:
Марозы, завеі,
І нос пасінее,
Чуць выскачыш з хаты
На холад зацяты.
Хваробы зімою
Ідуць чарадою:
То свінка, ангіна,
Адзёр, шкарлатына
Ды біч жываглыт
Люты, злы дыфтэрыт...
Надакучыла дзецям зіма,
І чакае вясны іх гурма.

### II

Налучыла зімою Міхася бяда:
Захапіла Міхася хвароб чарада.
Прыстала ангіна,
А потым адзёр.
Чуць-чуць з дыфтэрыту
Міхась не памёр.
Забіла дыханне,
І горла, і нос.
Ой, колькі пакуты
Міхась перанёс!
Ды ўсё ж далі рады
Яму дактары.
Вакцыну ўлівалі
Не менш разоў тры.
Каб не вакцына,
Памёр бы хлапчына.
І дні і нядзелі
Ляжаў у пасцелі
Слабенькі,
Худзенькі,
Малы Міхасёк,
Як падкошаны той васілёк.
І высах жа, бедны!
А тварык стаў бледны,
Празрысты, бы з воску.
Доктар дзіцячы
Лячэнне прызначыў —
Адправіць Міхася на вёску.
Паветрам гаючым
І сонцам бліскучым
Міхасевы сілы ўзмацніць.
На ўлонні прыроды
Такія прыгоды,
Што ў горадзе нельга й сасніць.
Аб гэтых прыгодах якраз
І павядзецца тут сказ.

## III

### НА ЎЛОННІ ПРЫРОДЫ

Дзе ж Міхась знайшоў
прыпынак
У свой летні адпачынак?
Адкажу вам за Міхася:
У пасёлку пры калгасе.
І мясцінка самавіта:
Там шумела морам жыта,
А ячмень, густы, зялёны,
Адбіваў усім паклоны:
Ветру, сонцу, дробным
пташкам,
І кузуркам, і букашкам,
Мілым дзеткам — Насці, Стасю,
Ну, і нашаму Міхасю.
Для Міхася тут выгоды:
Тут сады і агароды,
Дзе цвітуць так пышна макі,
І дзіцячыя прысмакі:
Морква, рэпа спакусная,—
Рэдка хто іх абмінае,
І Міхась не раз украдкам
Завітае к гэтым градкам.
А якія тут пясочкі!
Проста цешаць яны вочкі:
І, здаецца, клічуць самі:
«Пагуляй, Міхаська, з намі!»
Ну, як тут не пагуляць,
Не пабегаць мінут пяць,
Ды чаму не разгарнуцца
Ды ў пяску не скачануцца?
Бегаў тут Міхась, гуляў
Ды з пясочкам размаўляў.
Не — цікавая мясцінка!
Што ні крок, то ўсё навінка
І для вока і для вуха.
Ты глядзі сабе ды слухай,
Прыглядайся ды гуляй,
А дзе трэба — памагай!
Унь ускрай сядзібы
Конь паўзе сталёвы,
Рэжа лусты-скібы,
Хлебу тчэ асновы,
Поўніць шумам долы,
Дужы ды імклівы.
Ногі яго — колы,
Дым заместа грывы.
Вось які ён воін,
Адгадайце ж, хто ён?
Дзесь у лесе звонка
Граюць-трубяць трубы...
Рух, жыццё, гамонка —
Падзівіцца люба!
Тут Міхасю воля,
Тут прастор шырокі,
Любіць жа ён болей
Рэчку і затокі.

## IV

Талька — слаўная рачушка,
Грунт яе пясчаны,
Бераг мяккі, як падушка,
Дзірваном засланы,
Луг квяцісты па ўзбярэжжы,
А трава, як лава.
Па грудах дубы, як вежы,
Паглядзець цікава.
А буслоў тых і не злічыш —
Цэлыя брыгады!
І такія іх аблічча,
Бы вядуць нарады.
Тут і чаплі, гусі, качкі
І сіваваронкі.
Колькі шуму і гарачкі,
Спеву і гамонкі!
А звярніце вашы вочы
Вось у гэту Тальку:
Зачаруе каго хочаш —
Лёню і Натальку.
Тут убачыце вы
Свет вялікі, жывы
І дзіўны таксама.
Асабліва вось тут,
Калі ўзыдзеш на груд
Ды зірнеш на яму.
Гэта яма — ой, глыб!
Ну, а рыб жа тут, рыб —

Процьма незлічона!
Гэту яму, сказаць,
Азярком лепш назваць
Па яе разгону.
А як выйдуць ляшчы,
Хоць у ладкі пляшчы:
Проста, ну, як плашкі!
Шчупакі, як ваўкі,
І звычай такі
І ўсе іх замашкі.
Нерухома ў траве
Па гадзіне, па дзве
Тояцца, пражоры.
Бойся, язь, шчупака!
Лешч, не дай зевака,
А то будзе гора!

У такой глыбіні
Ёсць язі, акуні,
Галаватні, плоткі.
А кялбоў і яршоў
І другіх малышоў
Не злічыць на соткі.
А як бухне тут сом —
Скаланецца кругом,
Ну, ўся азярына.
Вадзяныя кругі
Ліжуць, б'юць берагі —
Сом, відаць, махіна.
І страх забірае Міхася
І трошкі цікавасць, вядома:
Вось кінуць бы бомбаю ў сома,
Калі гэты сом на папасе!

## VII

### ЯГАДЫ

Пранеслася чутка
Па калгасных хатах,
Што суніц у лесе
Нарасло багата,
Што зямля ад ягад
У чырвоных плямах,
Што іх дужа многа
У Ласіных ямах.
«Што гэта за ямы?
І чаму Ласіны?» —
Сам сябе пытае
Розум той дзяціны.
А пра лес Міхась чуў
Проста дзіва-байкі,
Што там ёсць і белкі,
І ласі, і зайкі,
Нават ёсць мядзведзі,
І ваўкі, і вепры,
І што страх якія
Ёсць у лесе нетры,
Зараслі густыя,
Пасекі, балоты...
Хочацца Міхасю
Ў лес зрабіць залёты...
Апала раса. Гарачыня.
Хмаркі, як пух лебядзіны.
Адпачывае далечыня,
Песцяцца ў сонцы лядзіны,
Гудуць авадні й камары.
Прэюць між лесу балоты.
У лесе глухмень. Ціха ў бары.
Спяць над канавай чароты.
Пад навіссю дрэў, як баразна,
Легла далёка канава.
Дзівота, зірнеш, і навізна —
Дужа Міхасю цікава!
Унь выварат-корч. Страшны такі —
Вусы, і губы, і вочы,
А корань узнят замест рукі,
Нібы схапіць цябе хоча!
Звісаюць імхі з хвой тых, як шоўк.
Можа, чые то бароды?
Углядаецца — ша! Там ці не воўк?
Ці не мядзведзь за калодай?
Міхась не адзін, ён і смяляк:
Воўка біць палкай гатовы!
І палку бярэ хлопец няўзнак,
Кій сукаваты, здаровы.
Але іх шчасце — збеглі звяры,
Заяц не высунуў носа.
Схаваўся і ліс дзесь у нары —
Даў бы Міхась ім тут чосу!
Расступіўся лес

Ды ва ўсе бакі,
А на пасеках —
Ух, прастор які!
А трава, трава!
А кусты, кусты!
А навокал хмыз,
Ды густы-густы!
А па купінах,
Каля пнёў, лам'я
Чырвань спелая,
Тых суніц сям'я,
Нібы ўсыпана
Тут каралямі,
І глядзяць яны
Кралі-кралямі —
Сакавітыя,
Як налітыя,
Ды ўсе ладныя,
Ды панадныя.
У паветры пах
Ад іх носіцца,
Сама ягада
У рот просіцца.
Прыступілі да збору суніц-
Чараўніц,
Захапіліся зборам усе
Пакрысе:
Данік, і Юра,
І Жэня-панура,
Оля, і мама,
І Міхась наш таксама,—
Сунічку сашчыпле,
Зірне, паваро́жыць,
Але не ў кубак,
А ў роцік паложыць.
Кошык у мамы —
Тры чвэрці даўно,
А ў Міхася яшчэ
Не закрыта і дно.
Затое ж Міхасевы
Губы і шчокі
Раскрасілі ў чырвань
Сунічныя сокі.
Ён ходзіць мурзаты,
Навокал глядзіць.
Вось дзяцел стракаты
На дубе сядзіць.
А там, над балотам,
Сарокі трашчаць.
Прапала ахвота
Суніцы збіраць.
І хмыз надакучыў,
Трава і кусты,
І руку намучыў
Той кубак пусты.
На сонцы — спякота,
Ў цяні — камары.
Ну, што за ахвота
Хадзіць па жары?
Пасадзілі Міхася на пень
У цяні.
Нацягаўся Міхаська за дзень —
Аддыхні.
Падмацуйся хлябком, галубок,
Пасядзі!
Кошык ягад вось тут і збанок —
Паглядзі.
Набяром ягад кубачак твой
Мы няўзнак.
Міхась толькі кіўнуў галавой —
Няхай так.
Важна сеў Міхась на пні
Між бярозак у цяні,
А суніцы, як блазніцы,
Сталі хлопца спакушаць,
Араматамі дышаць.
А якія сакаўныя!
Проста капае з іх сок,
І цукеркі тут набок!
Хіба ўзяць папрабаваць?
Прысеў Міхась над кошыкам —
Суніц там аж за край,
А зборшчыкі за пошукам —
Збіраюць — ну, няхай.
Міхаська забаўляецца —
Па ягадцы ды ў рот.
Суніц не прыбаўляецца,
Хутчэй наадварот.
Такія ж, брат, салодкія —
Ну, проста не ўтрываць!
Размовы тут кароткія —
Яшчэ дай спрабаваць!
І ён зачэрпнуў жменяю.
Зачэрпнуў раз, другі.
Сунічак меней, меней —
Апалі берагі...
Эх, збіўся ты з капыціка,
Міхаська-галубок!

...Прыходзіць самакрытыка
Разблытваць той клубок,
І давай Міхась
Выходзіць з бяды —
Узмяшчаць прарыў
Ды хаваць сляды.
Узяў кошык ён
І пачаў трасці,
Каб суніц вяршок
Мог са дна ўзрасці.
Страсяне, зірне —
Вось праявіна:
Яшчэ большая
Ў кашы́ яміна!
Трос іх, трос Міхась —
Праца марная,
Ці работа ўся
...Не ўдарная?
Толькі сок пацёк
З таго кошыка,
А карысці той —
Ні паўгрошыка.
Ён ізноў трасе.
Строс іх, збіў няўзнак
У чырвоны сыр,
У густы камяк.
Паставіў ён кошык на пень,
Куды хочаш, яго туды дзень.
Вось бяда, дык бяда.
Нецікавая!
І чакае Міхаська суда
І расправы.
Невясёлы сядзіць,
Бы ў цямніцы.
Лепш было б не хадзіць
У суніцы.
І чуе Міхаська: «Го-го-о!»
Міхаська адгукнуўся:
«Чаго-о?»
А голас яго невясёлы,
А вочы апушчаны к долу.
Ідуць, маці, Данік, Юра...
Ну, пачнецца зараз бура!
Прыйшлі. Як зірнулі на кош —
Малюнак не дужа прыгож:
Ягады ў камяку,
Кош увесь у саку.
Сок расцёкся наўкруг,
Стаў прыманкаю мух.
А Міхась — мурзаты,
Выгляд вінаваты.
Напаў на Міхася Даніла:
— Сякі і такі ты, дурыла!
Ты — шкоднік,
Нягоднік!
Што ж ты нарабіў?
Чуць Міхася не біў!
І Юркавы словы:
— Сякі і такі, безгаловы.
Вушы яму адарваць!
У лес яго болей не браць!
Міхась апусціў вачаняты
І маўчыць — вінаваты!
Здорава бралі Міхася,
Покі злосць улеглася.
А маме дык стала
Міхаські шкада.
— Ну, годзе крычаць вам!
Такая бяда!
Утрэсваў іх трошкі,
Рабіў не назло —
Каб болей сунічак
У кошык вайшло...
Прызнайся, Міхаська, ты мне:
Так было гэта ці не?
Павесялеў наш бядак,
На запытанне адказвае: «Так!»
Дадому ішлі, жартавалі,
І ясны Міхасеў быў твар,
Хоць жартам яго і празвалі —
Ягадны спец-сыравар.

РАЗВІТАННЕ

Лецейка ты лета!
Гучна песня спета.
Весела было!
Бралі поўнай чарай
Шчодрасць тваю, дары —
Сонца і святло.
Цешыла ты дзетак
Ды ласкава гэтак —

Матчынай рукой:
Воляй маладою,
Цёплаю вадою,
Чыстаю ракою,
Полем і лясамі,
Спевам — галасамі
Ясных дзён тваіх.
Мыла іх расою,
Сонцавай касою
Уцірала іх...
...Чарай асалоду
Чэрпалі, як воду,
Поўнаю, за край.
Залатое лета!
Дык прымі ж за гэта
Шчырае «бывай»!

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Класік беларускай паэзіі Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся ў Мінску 9 снежня 1891 г. Маленства будучага паэта прайшло ў Гродне, куды бацька пераехаў у сувязі з пераходам на службу ў Сялянскі банк. У 1896 г. сям'я Багдановічаў пераязджае ў Ніжні Ноўгарад, жыццё ў якім пакінула глыбокі след у душы Максіма. У 1902 г. ён паступае ў Ніжагародскую мужчынскую гімназію, удзельнічае ў студэнцкім рэвалюцыйным руху. У гэты час пачынаюць праяўляцца паэтычныя здольнасці М. Багдановіча. Літаратурны дэбют М. Багдановіча адносіцца да 1907 г., калі ў газеце «Наша ніва» з'явілася яго рамантычнае апавяданне «Музыка».

З пераездам бацькі па службе ў Яраслаўль Максім Багдановіч перавёўся ў Яраслаўскую гімназію (1908—1911). Летнія канікулы ён праводзіць у Беларусі. Знаёмства з Вільняй, з «Нашай нівай», сустрэча з бацькаўшчынай духоўна ўзбагацілі паэта. Юнака цікавіла беларуская філалогія, і ён пачаў рыхтавацца да паступлення ў Пецярбургскі універсітэт па філалагічнаму профілю, але слабае здароўе (туберкулёз лёгкіх) перашкодзіла здзяйсненню гэтай задумы. Увосень 1911 г. Багадановіч паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй, дзе старанна вывучае класікаў рускай і зарубежнай літаратуры. Ліцэйскі перыяд быў самы плённы ў творчай біяграфіі паэта. Ён піша вершы, крытычныя артыкулы, друкуецца ў «Нашай ніве», рускіх часопісах і газетах, займаецца перакладамі на беларускую мову твораў Гарацыя, Авідзія, Ф. Шылера, Г. Гейнэ, А. Арвера, П. Верлена, Э. Верхарна, А. Пушкіна, А. Майкава, М. Розенгейма і іншых паэтаў, на рускую мову твораў Я. Купалы, Т. Шаўчэнкі, І. Франко, У. Самійленкі.

У 1913 г. у Вільні выйшаў першы і апошні прыжыццёвы зборнік вершаў М. Багдановіча «Вянок». У 1915 г. паэт напісаў паэму-казку для дзяцей «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык».

М. Багдановіч — мастак слова шырокага паэтычнага дыяпазону; яго паэзія вызначаецца тэматычнай разнастайнасцю, філасафічнасцю зместу, глыбокім пранікненнем у духоўны свет чалавека, высокімі эстэтычнымі вартасцямі. Многія вершы паэта пакладзены на музыку.

Плённай была праца Багдановіча і ў галіне беларускай крытыкі і літаратуразнаўства (артыкулы «Глыбы і слаі», «За тры гады», «Забыты шлях», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «Новы перыяд у гісторыі беларускай літаратуры»). Даследаваў ён таксама літаратуру і гісторыю братніх славянскіх народаў (артыкулы пра М. Ламаносава, А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнку, гісторыка-этнаграфічныя нарысы «Украінскае казацтва», «Галіцкая Русь», «Угорская Русь», «Браты-чэхі»).

У 1916 г. М. Багдановіч пасля заканчэння ліцэя прыязджае ў Мінск, дзе працуе ў губернскім харчовым камітэце і ў Мінскім камітэце Таварыства помачы ахвярам вайны. Працягвае займацца паэтычнай дзейнасцю, пачынае складаць хрэстаматыю для пачатковай школы. Аднак здароўе яго значна пагоршылася, і ён вымушаны быў у лютым 1917 г. ехаць у Крым на лячэнне. У апошнія дні свайго жыцця М. Багдановіч працуе над складаннем беларускага лемантара.

Памёр 25 мая 1917 г. у Ялце, дзе і пахаваны.

## МУЗЫКА

Жыў на свеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы. І плакала ў яго руках скрыпка, і такая была ў яго гранні нуда, што аж за сэрца хапала...

Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі...

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, звоніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і заве ён народ. І людзі падымалі апушчаныя галавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы.

Тады бляднелі і трасліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народу. Многа іх хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому. І хадзіў ён далей між бедным людам і граннем сваім будзіў ад цяжкага сну.

Але прыйшоў час, і музыкі не стала: злыя і сільныя людзі кінулі яго ў турму, і там скончылася яго жыццё... І тыя, што загубілі музыку, узялі яго скрыпку і пачалі самі граць на ёй народу.

Толькі іхняе гранне нічога людзям не сказала. «Добра граеце,— гаварылі ім,— ды ўсё не тое!» І ніхто не мог растлумачыць, чаму ад грання музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора.

Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам. І з-паміж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе...

## ЗІМОЙ

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

## ЗАВІРУХА

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе,
І спеў ліецца ўсё мацней,—
Гулянку справіў пан Падвей.

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Ўскіпела снежнае віно,
І белай пенай мкне яно.

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Па вулках вее дзікі хмель,
Гудзіць сп'янелая мяцель.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.

### СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна,—
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

### МУШКА-ЗЕЛЯНУШКА І КАМАРЫК — НАСАТЫ ТВАРЫК

*Вельмі жаласная гісторыя, выкладзеная згодна з праўдай беларускім вершам*

Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца,
І «таўкачыкі» спяваюць і у скокі тнуцца:
«Гэй, гоп, таўкачыкі,
Гэй, гоп, асінавы,
Ды работы Максімавы...»
А Максім ляжыць на траўцы, сонна пазірае,
Камарок за камарочкам да яго шыбае,
І пясняр з усіх найлепшы ўжо звініць ля вуха,
Як камарыка няўмысне загубіла муха.

#### I

Захісталася сасонка баравая,
Затужыла дзяўчынанька маладая,
Жартаўлівая пяюшка-сакатушка,
А па імені — мушка-зелянушка:
«Ой, чаму ж ды не судзілася мне долі,
Што мяне і не сваталі ніколі?
А пасагу прабагатага я маю:
Куст шыпшыны ад краю і да краю,
Шчэлка ў яблыні — пры ветры каб хавацца,
Лісць альховы — на ночку пакрывацца,
Ды да краю поўны мёдам кацялішча
З жалудзёвай вялізнай скарлупішчы.
Калі гэты мёд у місачку кладзецца,

Ажно сліна ў роце набярэцца».
Як пачуў тыя жаласці камарык —
Паскрабаў і насочак ён і тварык:
«А чаму бы мне ды з ёй не пажаніцца?
Пэўна, пойдзе, каб болей не журыцца.
Хоць насаценькі я, шэры, хударлявы,
Дык у скоках затое жа рухавы...»
І схапіўся камарочак прыбірацца,
Каб ля мушкі-пяюшкі увіхацца.

## II

Прыляцела мушка дахаты,—
Аж у яе камарык насаты.
Сватоўя-хрушчы уссядаюць,
З бацькам-маткай штось размаўляюць:
«Мы — стральцы, шукаем куніцу,
Не куніцу, але дзявіцу».
Гаманілі болей гадзіны
Ды гавораць так да дзяўчыны:
«Ці да смаку наш госць багаты?»
«Запытайце у мамы і таты».
Тут гарэлкай усё змацавалі,
А пасля і заручын даждалі.
Браў жаніх ад мушкі-дзяўчыны
Дарагі ручнік з павучыны,
Што яна на траўцы сцяліла
І на ясным сонцы бяліла.
У нядзелю будзе вяселле.
Захадзіў камар, як з пахмелля,—
І пяе, і скача паціху,
Ды як сыпне ураз «шырсцяніху»;
«Шырсцяніха, шырсцяніха мая,
Пакахала камара-гультая.
А камар не зважае на яе,
Толькі лётае ды песні пяе».

## III

Загудзела, расшумелася дубрава:
Аб вяселлі у дубраве стала слава.
Як вянок на муху свацейкі надзелі,
Ўсе навокала аж вочы праглядзелі.
А калі бацькам журылася дзяўчына,
Аж заплакала жаноцкая радзіна:
«Ускланяюся татачцы і мамачцы,
Калі ўжо апрыкрыла ім у хатачцы.
І чаму ж вы мяне гадавалі
Ды ў чужую сямейку аддалі?»
Ў каравайніцы вулітак запрасілі,

І яны дзяжу на продзіў замясілі.
Авадзень быў камаровым старшым дружкай
Й рассыпаўся дробным макам перад мушкай.
Матылькі — баяры, пчолачкі — баяркі —
Спрытны, шпаркі, асабліва як да чаркі.
А найстаршая баярачка-чмяліха
Так спявала, аж баяр пабрала ліха:
    «Ой, багаты баяры, багаты,
    Ды забыліся ўзяць грашаняты.
Хоць не шмат грашанят яны маюць,
    Дык затое свой гонар трымаюць:
Хто капейку дае — грыўняй ліча яе,
    А хто грыўню паклаў — што рубля дараваў».
А як сыпнулі-урэзалі музыкі,
Дык узняўся разам гоман там вялікі.
Чмель пузаты на басолі гучна грае,
А на скрыпцы ёмка пчолка падсякае.
І знайшоўся мушанёнак нейкі малы,
Што званіў-такі не кепска у цымбалы.
Лоўка конікі у скоках выцінаді,
Угару стрыбалі, звонка падпявалі:
    «Камары скакаць
    Выракаюцца:
    Ногі доўгія —
    Паламаюцца».

Гэтак скачуць — хто патроху, хто памногу.
Нейкі конік адтаптаў чмялісе ногу.
Госці спорна п'юць-ядуць ды размаўляюць.
А музыкі граюць, дыхту заўдаваюць.
Ўмела муха на вяселле запрашаці,
Ды над тое лепей ўмела частаваці.
Усяго стаяла досыць для гасціны:
Нават мёд быў і чмяліны і пчаліны.
Хрушч вялізны так гарэлкі насмактаўся,
Што зваліўся ды ў куточку высыпаўся.
Восы ў шатах чорных з жоўтымі стракамі
Проста елі мушку злоснымі вачамі.
А яна ля мужа скромненька сядзела
І зялёненькай спаднічкай зіхацела.
Мураўёўна нізка звесіла галоўку,
Бо занадта зацягнулася ў шнуроўку.
Ды як скрыкнула, як ахнула раптоўна:
Ў кроплі дожджыка танула мураўёўна.
Ўсё сцямнела, кроплі шпарка застукалі,
У дупло, дзе мушка жыла, пападалі.
Пахаваліся ўсе госці ў куточкі:
Так спынілася вяселле сярод ночкі.

А назаўтра ўсе, як толькі ўсталі зрання,
Дык пайшлі да камара на баляванне.
І былі яшчэ нарэшце перазовы,
Каб не стала аб радзіне кепскай мовы.

## IV

Абляцелі кветачкі
  Не ў пару.
Невясёла шэраму
  Камару.
Як пачаў ён параю
  З мушкай жыць —
Давялося беднаму
  Патужыць.
Не умее мушачка
  Працаваць,
Толькі ўмее з хлопцамі
  Жартаваць;
Ані выткаць кросенкі,
  Ані шыць,
Ані стравы хораша
  Наварыць.
Паштурхаў камарычак
  Галаву:
«Як я з гэтай жонкаю
  Пражыву?
Дзе я вочы, брацікі,
  Меў свае,
Як сабе за жоначку
  Праў яе?»
Паляцеў ён плакацца
  У лясок,
Сеў на дуб зялёненькі
  Пад лісток.
Пахіліў галовачку,
  Уздыхнуў,
Песню сумна, жудасна
  Зацягнуў:
«Выйду ў поле ды развяжу тое гора,
Гэй, гаротнае, маркотнае!
Ты шырока, маё полейка,
Ад кусточка да кусточка разлягаешся,
Ты глыбока, сэрца, краешся.
Дзе цяпер я смерць сваю спаткаю:
Ці у моры, ці у рэчцы, ці ў ставочку,
Што капытам пры дарозе быў прабіты
І да краю буйным дожджыкам наліты?»

## V

«Што за шум у бары учыніўся?»
«А камарык там з дуба зваліўся».
Грымнуў ён на зямлю з высакосці
І пабіў-паламаў сабе косці.
Цеслі дошкі з дубоў пілавалі,
Габлявалі, труну змайстравалі,
Ўсю чырвонай кітайкай аббілі,
Йстужкай чорнай з краёў адтачылі.
Гэй, кладуць камара ў дамавіну,
Сазываюць сяброў і радзіну.
Камары над труной затрубілі,
Светлячкі лепей зорак свяцілі.
«Вы паціху, музыкі, зайграйце,
Маё сэрца украй не ўражайце!»
Горка мушка-ўдава галасіла,
Скорай смерці у бога прасіла:
«Мой мужочак, а мой камарочак,
Ты падай мне з труны галасочак.
Ах, ніхто над табой не заплача,
Толькі хмарачка дробнымі дажджамі,
Толькі мушачка горкімі слязамі».
Палажылі дамоўку на мары,
Паняслі праз лугі ды папары.
Ля дарогі магілу капалі
І у ёй камара пахавалі,
У сырую зямельку зарылі,
Зверху насып вялікі зрабілі.
Людзі добрыя шляхам мінаюць,
Шапкі нізка здымаюць, пытаюць:
«Не іначай вяльможны вандроўнік,—
Генерал, ці маёр, ці палкоўнік?»
«Не, ляжыць тут камар-камарочак,
У каторага з локаць насочак».

# ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

Змітрок Бядуля (Самуіл Яфімавіч Плаўнік) нарадзіўся 23 красавіка 1886 г. у м. Пасадзец былога Вілейскага павета Віленскай губерні (цяпер Лагойскі раён Мінскай вобласці). Вучыўся ў пачатковай яўрэйскай школе — хедары, затым у школе рабінаў — ешыбоце. Працаваў хатнім настаўнікам, а з 1902 г. канторшчыкам на лесараспрацоўках.

Пісаць вершы пачаў на старажытнаяўрэйскай мове з трынаццаці год. Першы верш на рускай мове быў надрукаваны ў 1910 г. у часопісе для пачынаючых пісьменнікаў «На берегах Невы» (Пецярбург). Першым творам на беларускай мове было апавяданне «Пяюць начлежнікі», надрукаванае ў 1910 г. у «Нашай ніве». Праз два гады рэдакцыя гэтай газеты запрасіла маладога пісьменніка на сталую працу. Пераехаўшы ў Вільню, Бядуля асабіста пазнаёміўся з Цёткай і Я. Купалам. У 1912 г. выходзіць з друку першы зборнік лірычных апавяданняў Бядулі «Абразкі».

З 1915 г. З. Бядуля жыве ў Мінску, працуе ў Беларускім камітэце дапамогі ахвярам вайны. Многія апавяданні пісьменніка, створаныя ў дакастрычніцкі час, прысвечаны паказу гаротнага становішча прыгнечанага селяніна («Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі»», «Тулягі» і інш.).

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі З. Бядуля працаваў у газеце «Савецкая Беларусь», быў рэдактарам дзіцячага часопіса «Зоркі», краязнаўчага часопіса «Наш край». Уваходзіў у літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Маладняк», пасля — ва «Узвышша».

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся з Беларусі.

Памёр З. Бядуля 3 лістапада 1941 г. каля Уральска.

З. Бядуля — таленавіты мастак слова, аўтар зборнікаў вершаў і апавяданняў, а таксама буйных празаічных твораў. Выйшлі кнігі паэзіі «Пад родным небам» (1922), «Паэмы» (1927), зборнікі апавяданняў «На зачараваных гонях» (1923), «Апавяданні» (1926), «Незвычайныя гісторыі» (1931), «Па пройдзеных сцежках» (1940), аповесці «Салавей» (1928), «Набліжэнне» (1935), «У дрымучых лясах» (1939), двухтомны раман «Язэп Крушынскі» (1929—1933).

Значнае месца ў літаратурнай спадчыне З. Бядулі займаюць творы для юнага чытача, якія склалі кнігі «Качачка-цацачка» (1927, казка), «Вясной» (1928, вершы), «Гаспадарка» (1930, вершы), «Мурашка Палашка» (1939, вершаваная казка), «Люцік» (1940, верш), «Хлопчык з-пад Гродна» (1940, паэма), «Апавяданні» (1947), «Мае забавы» (1949, вершы), «Сярэбраная табакерка» (1958, казка і апавяданні), «Дзень добры!» (1979, вершы, казкі і апавяданні).

## МАЛЫЯ ДРЫВАСЕКІ

Зімовы дзень блішчыць тысяччу агнёў.

Люты мароз. Снег пад нагамі скрыпіць, як жывы.

Бор атулены ў белую пушыстую світку. Ён стаіць задуменны, як сівы дзед.

Грукат дрывасекаў разлягаецца водгаласкамі па ваколіцы.

Трах-трах! Трах-трах!

Яшчэ здалёку можна было прыкмеціць, як блішчыць пад сонцам піла, а абапал матулі-хвоі мітусяцца, як мурашкі, двое маленькіх хлапчукоў.

Яны махаюць рукамі гэтак шпарка, што іх падраныя лахманы расхрыстваюцца і адкрываюць голае цела... Піла ўсё глыбей ды глыбей уядаецца ў сэрца хвоі і... тра-а-ах! — плазам упала шурпатае дрэва. З-пад снежнага куродыму ўзняўся працяглы стогн паваленага дрэва-асілка.

Малыя дрывасекі — браты. Старшаму — Цішку — дзесяць гадоў, меншаму — Халімону — восем.

Іх бацька — кульгавы Цыпрук — сам працаваць не мог.

Выпраўляў кульгавы Цыпрук хлопчыкаў да купца ў лес на заработкі. Гэтым кармілася сям'я.

Трудна жылося малым дрывасекам.

— Добра, што хоць на полудзень маем па кавалку хлеба...

Паваліўшы некалькі хвой, хлопчыкі ўзяліся шчыра грызці сухі хлеб. Вочы іх заіскрыліся, шчокі расчырванеліся...

— Ого, есці, ого!.. Якая радасць!..

Яшчэ не скончылі яны палуднаваць, як узнялася завея, мяцеліца.

Застагнаў, закрактаў хвойнік. Пачаў кружыцца снег. Быццам белыя коні, уздыбіліся гурбы...

Усе дрывасекі разбегліся хутка дамоў, а Цішка з Халімонам

баяліся, каб бацька не наракаў, што зарана прыйшлі з лесу... Селі пад вялікай хвояй, прытуліліся адзін да аднаго і дрыжалі...

— Баюся! — усхліпваў меншы, Халімон.

— Во, дурань, чаго баяцца?! — супакойваў яго большы, Цішка.— Зараз дамоў пойдзем.

— Дамоў пойдзем! — шаптаў Халімон.

Яны пайшлі.

Стагнаў і палохаў бор, але хлопчыкі так-сяк ішлі, а на чыстым полі нічога не відаць было. Гурбы снегу, нібы белыя мядзведзі, качаліся на прасторы, дыхалі холадам ды сыпалі цвёрдым шротам у вочы...

Хадзілі-хадзілі, брылі-брылі, але куды — і самі не ведалі.

Змарыліся. Агарнула ноч. Снег дайшоў вышэй пояса.

— Ляжам! — сказаў меншы, Халімон.

— Ляжам! — сказаў большы, Цішка.

І ляглі. Моцна, моцна прытуліліся адзін да аднаго.

Зрабілася так цёпла...

І здаецца ім — сядзяць яны за сталом... Маці радуецца, што прыйшлі... Корміць іх цёплым праснаком... Бацька пазірае на іх добрымі вачыма і лагодна ківае галавой. Пад'елі і палеглі на палок каля печы... Котка лашчыцца да іх, і яны радасна заснулі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У поўнач усцішылася мяцеліца.

Вынырнуў з-за хмар чырвоны месяц. Вакол яго мігацеліся зоркі і пазіралі весела на белую зямлю.

Толькі на трэці дзень адкапалі замёрзлых малых дрывасекаў.

## ДЗЕ КАНЕЦ СВЕТУ?

Даль была туманна-празрыстая, абрызганая з берагоў пазалотаю сонейка. Месцамі край неба падпіралі шчарбатыя хвойкі. Месцамі ўзгорак у самае неба ўпіраўся. Дзе-нідзе палосы далі, істужка за істужкаю, кайма за каймою, сшывалі неба з зямлёю. Нібы тканіны былі раскіданы радамі паміж небам і зямлёю дзеля таго, каб яны бяліліся на сонейку. Пачынаючы ад бору, яны былі спачатку цёмныя, потым сівелі і лёгкім, ледзь прыкметным дымком зліваліся з блакітам...

Янка, малы сямігадовы хлопчык, пасвіў гусей на выгане ля рэчкі і пазіраў навокал здзіўленымі васільковымі вачыма. На кожным кроку бачыў ён дзівы-дзіўныя:

— ...З-з-м! З-з-м! Глядзі, Янка,— кажа залатая пчолка з кветкі канюшыны,— які велізарны абшар зямлі, канца-краю няма. А колькі гэтых кветак з салодкімі, зацукраванымі збаночкамі! Ой, вялік свет...

— ...С-с-с! Колькі каласоў, братоў родных, вакол мяне,— шэпча жытні колас Янку,— ліку няма...

— ...Чалом! Чалом! Чалом, Яначка,— пяе жаўранак над галавою пастушка.— Ой, як высока неба над намі, каб ты ведаў...

Янка шмат чаго бачыць, чуе і ведае. Равеснікі смяюцца з яго —

ён заўсёды адзін, як дзікі ваўчок. Ні з кім у коніки не гуляе. Хаваецца ад усіх... Гэта нядобра. Вочы ў яго часам смутныя... Ён сумуе тады, калі па шырокім гасцінцы едуць падарожнікі. Яны паказваюцца з аднаго краю нябёс чорнымі жучкамі, большаюць, большаюць, пакуль зробяцца вялікімі, як Янкаў бацька. Чуе Янка ляск пугі, бачыць успацелых коней.

Здалёку-здалёку едуць падарожнікі. Янка вельмі зацікаўлена ўглядаецца ў іх. Цікавіць гутарка, вопратка, коні, калымагі.

І дзівіцца маленькі Янка і надзівіцца не можа...

Уздоўж, у даль дарогі едуць падарожнікі. Скрыпяць і грукаюць калёсы. Цішэюць-цішэюць. Меншаюць-меншаюць. І коні і людзі робяцца тымі самымі маленькімі жучкамі, якімі былі спачатку. Вось-вось схаваюцца за пагорак на самым краі неба... Няма ўжо іх — згінулізніклі...

І зноў жоўтая дарога апусцела-анямела... Улёгся пыл залацістымі плямінамі... А ціш такая сярод летняга дня, што здаецца — увесь свет заснуў.

А Янка дзівіцца. Канца-мяжы няма дзівам яго неадступным:

— Скуль гэтыя падарожнікі, што прыехалі з «канца зямлі»?

— Куды яны паехалі, згінуўшы на другім «канцы зямлі»?

Пільна-пільна ўглядаецца Янка ў маўклівую істужку залацістай дарогі — нічога зразумець не можа.

Дарога мяккімі дыванамі залацістага пяску цягнецца ўздоўж, перарэзваецца ўпоперак, вузлавата пляцецца ў розныя стораны на паверхні зямлі, нібы маршчыны на твары бабулі.

«Старая-старэнькая зямля наша,— думае Янка,— а жывежыве...» Ды яшчэ якімі маладымі галасамі часта яго, Янку, дражніць.

Помніць ён, як аднаго разу з маткай у грыбы пайшоў. Загуляўся тады каля капца пры муравейніку і згубіў матку. Спужаўся і падняў крык на ўвесь лес:

— Матка, дзе ты?

— Матка, дзе ты? — дражніла яго зямля з усіх бакоў: з бярэзніку, з бору, з пусткі.

Ён у смех — зямля ў смех. Ён у плач — зямля ў плач.

Але больш за ўсё цікавіць яго дарога, бо па ёй людзі прыходзяць немаведама адкуль і ідуць немаведама куды...

То пакажацца сляпы жабрак-лірнік з хлопчыкам-павадыром. То на кірмаш едзе шмат народу.

І Янка бачыць і адчувае несупынны рух жыцця.

Гусі ідуць у шкоду, а Янка, разявіўшыся, пазірае на бязмежную дарогу, поўную незразумелых, цікавых рэчаў, абвеяную вабнымі з'явамі.

Шмат разоў меў Янка ад бацькі гарачую лупцоўку за тое, што гусей у шкоду пускае.

— Дзе канец свету?

Янка думае цэлымі днямі, тыднямі, месяцамі і даведацца не можа.

— Дзе канец свету?

І бабка Аўдоцця гэтага не ведае. А дзядзька Арцём робіць толькі тое, што смяецца з яго запытанняў.

Бацька-то пэўна знае, але ў яго боязна дапытвацца: яшчэ, чаго добрага, раззлуецца. Бацька вечна працуе, часу не мае.

«Сам, сам пазнаю. Розумам уласным даведаюся».

Прыслухоўваецца да страшных дзядоўскіх казак. Болей за ўсіх дрыжыць Янка ад страху, калі апавядаюць пра людаедаў і разбойнікаў. Слёзы самі коцяцца з яго вачэй пры жаласлівых песнях начлежнікаў. Сэрца маленькае выскачыць хоча з грудзей. Аднак тут жа набіраецца адвагі — як вырасце, усіх людаедаў і разбойнікаў знішчыць.

— Дзе канец свету?

«Пэўна, сонейка ведае»,— думае Янка. А сонейка — яго першы сябар.

І ўлетку, і ўзімку, і ўвосені, і на вясну Янка ад усходу да захаду любіць пазіраць на сонца.

Жмурыць вочы на сонейка і чуе, што вялікая радасць расце ў яго сэрцы.

Сонейка — добры, шчыры вартаўнік таго абшару зямлі, што ведае Янка. Сярод лета сонца ўзыходзіць вельмі рана з правага краю гары, залоціць вяршаліны альхоўніку пад гарою ля рэчкі, а заходзіць яно вельмі позна з левага краю гэтай самай гары і таксама залоціць вяршаліны дрэў. Сонца робіць тады ледзь не цэлы круг над тым абшарам зямлі, што ведае Янка.

Увосені сонца падымаецца ўжо з бярэзніку і заходзіць у цёмны бор. Яно дзеліць увесь круг толькі напалавіну.

Узімку сонца ўзыходзіць вельмі позна над дарогай на краі неба і заходзіць вельмі рана ў лагчыну. Яно ахоплівае зусім малы кавалак неба.

«Пэўна, узімку холадна сонейку»,— думае Янка.

А на вясну, як пачынае цяплець, сонца зноў даўжэй шпацыруе па небе. Яно часам вельмі хораша хмаркі фарбуе. Янка наглядзецца не можа. Чаго-чаго не бачыш тады ў небе — і розныя замчышчы з белага і ружовага мармуру, і цэлыя стады невядомых звяроў, і велізарныя вогнішчы, і чырвоныя рэчкі...

«Сонца ведае, дзе канец свету»,— пераканаўся Янка аднаго разу пад вечар. Маці строга сказала — нікуды далёка ад гусей не адыходзіць, але раз назаўсёды трэба дабрацца да канца свету. Трэба дабрацца вось туды, дзе сонейка начуе за лесам, вось туды, куды знікаюць з зямлі падарожнікі...

Хлопчык зірнуў на гусей, што гагаталі ў сухой канаве на выгане. Глянуў на вёску: мо хто з сваіх на вуліцу выйшаў. Усюды было ціха і пуста. Цішыня на захадзе сонейка.

А сонца чырвоным пажарышчам стаяла за гарой і вабіла і звала да сябе малога Янку.

Янка пусціўся бягом.

Бег, бег дарогай: насустрач бярозка, дзе сонца павінна было зайсці ўніз. Бач — аж сонца адскочыла далей ад сівой крушні. Яшчэ ніжэй спусцілася, апіраецца там круглым бокам аб зялёны дуб.

Нядоўга думаючы, хлопчык з усіх ног пусціўся далей. Надта хочацца зірнуць, дзе сонца заходзіць...

А яно ад яго далей уцякае...

Янка змарыўся, спацеў, але імкнецца ўперад супроць сонца, супроць таго вялікага пажарышча, якім яно запаліла неба...

Новыя далі адкрыліся вачам Янкі, новыя лагчыны, новыя ўзгоркі, новыя лясы, новыя дарогі, дарожкі і сцежачкі, простыя і крывыя, ва ўсе бакі...

— Стой! — крычыць ён сонцу, крыху ўстрывожаны, бо бацьку ўспомніў, успомніў тую кару, якую будзе ён мець ад бацькі, бо, пэўна, гусі ў жыце.

— Стой! — дражніць яго зямля з лесу, з-пад гары — з усіх бакоў.

— Стой!..

А Янка бяжыць з імпэтам уперад. Вочы гараць. Ён хоча ведаць:

— Дзе канец свету?

Сонца зайшло... Змрокі паплылі па лагчынах... Сівы туман узнімаецца над рэчкай. Паказаліся зоркі ў небе, заміргалі аганькі на зямлі.

— Дзе канец свету?

«Пэўна, у кнігах аб гэтым напісана,— падумаў Янка.— Увосені ў школу пайду, вучыцца буду і аб усім, аб усім даведаюся».

## ЮЛЬКА

У маленькай дзесяцімесячнай Юлькі «Ма» (мама) была самай найвялікшай апорай на цэлым свеце, бо свет без падтрымання — чужая і нічога нявартая рэч.

«Ма» вельмі падтрымлівала Юльку. Яна давала сваёй дачцэ «гам» (есці). «Гам», як кожнаму вядома, не абы-што: без есцікі і піці чалавек не можа жыці. І Юлька мела сваю хатку на грудзях у маткі.

Апрача яды, Юлька мела ад «Ма» і духоўныя харчы — вясёлыя і смутныя песні над калыскай. Гэтыя песні Юлька ніколі не забудзе...

Маці патроху тлумачыла Юльцы велізарную кнігу жыцця — гэту мудрую рэч, якую чытаеш-чытаеш і ніколі да канца не даходзіш.

Юлька не пакрыўджана. Маці толькі аб ёй і клапоціцца. Добрая «Ма» гатова ўсім жыццём ахвяраваць за сваю дачушку. У адплату за гэта некалі і Юлька будзе такой жа добрай маткай.

Усё акружаючае маленькую Юльку, як жывыя і нежывыя рэчы — дзеці, кіцька, цюця, стол, падушка і люля,— былі яе «лялі». Яна мела з імі частыя сутычкі: усё прабавала на «гам». У гэтым выяўлялася ўся яе зацікаўленасць і практычнасць у жыцці.

Есці, есці і яшчэ раз есці.

Калі было даспадобы — губкі яе складваліся ў жывую кветку-ўсмешку; калі не, дык яе незадаволенасць вызначалася плачам. Яна плакала шчыра і доўга, усім целам, усёй істотай. Боўтала пры гэтым ручкамі і ножкамі.

Кожны раз пры такіх драмах і трагедыях «Ма» супакойвала Юльку сваімі грудзьмі. «Ма» была найсмачнейшая за ўсе «лялі» на свеце. А смак Юлька мела добры.

Жывому чалавеку за печкай доўга не ўседзець, і Юлька таксама не раз рабіла «гайда»-вандроўкі з хаткі роднай на шырокі свет — на дзядзінец. Кожны раз яна пры гэтым жмурыла вочкі, хвалявалася,

лавіла ручкамі паветра і з'есці хацела будынкі, дрэвы, сонца — увесь свет, які і сталаму чалавеку лёгка ў рукі не даецца. Але тым болей хацелася Юльцы дастаць талерачку з неба. Мяцежныя жаданні напаўнялі яе сэрца. Цяжка прыходзілася тады маці. Без істэрый і плачу тут абыходзіцца не магло. Такія рэчы звычайна канчаліся выкупам, які павінен быў быць багаты: смачная сусолачка з цукрам, шкляная качалачка, бліскучая паперка, абручок. Наогул, самыя найцікавейшыя скарбы-цацы на свеце ляжалі пад ножкамі Юлькі. Цацкі рабілі «дзін-дзін-дзін, там-та-ра-рам!». Імі маці варажыла Юльчына сэрца.

Але Юлька без маці — чалавек не зусім незалежны. Яна ў гэтым магла пераканацца тады, як маці пры жніве пакінула яе ў кошыку на падушачцы адну на мяжы.

Быў цёплы сонечны дзянёк. Паўднёвае зацішша панавала ўсюды. «З-з-з-м!» — гудзелі мушкі над Юльчынай галоўкай. Часам мятлічка гладзіла скрыдлачкамі яе кволыя шчочкі. Часам птушачка вілася над яе кошыкам. Траўка шчыкатала... Юлька лавіла рукамі направа і налева. Гатова была з'есці ўсё, што не давалася «гам». Пры ёй сядзеў добры вартаўнік і таварыш з хаты роднай — кот. Гэта яе супакойвала тады, калі яна ўспамінала аб мамцы. Але вось кот пабег кудысь за птушкай цікаваць. Юлька адна-аднюсенька засталася...

Яна жмурыла вочы на сонца і пры гэтым успомніла, што «Ма», паказваючы агонь у печцы, кажа «зю-зю!». Хацела Юлька таксама сказаць «зю», але ад вялікай стараннасці і натугі пацягнулася ўсім целам у адзін бок ды — кульгіць з кошыкам у баразну.

Што было потым?

Цёмна ў вачах зрабілася, як бы ў бяздонную процьму паляцела. Яна першы раз у жыцці, у вялікім страху і роспачы, крыкнула: «Ма-ма!»

Маці пачула толькі тады, калі Юлька ўжо аж пасінела ад плачу, упэцканая ў пясок.

Гэта была яе першая спроба жыць у адзіноцтве без апоры.

Прайшло яшчэ некалькі месяцаў.

Юлька ўжо гаворыць: «та-та», «ма-ма», «кіць-ка», «цю-ця», «цаца», «ля-ля» і г. д. Веды яе павялічваюцца з кожным днём. Яе ручкі ўжо не хапаюцца за ўсё, што вочкі бачаць. Вугаль яна ўжо ні за якія хаханькі ў губкі не бярэ, а хлеб з цукрам — чаму не? Ого! Яна ўжо разумее, што — добра, а што — блага...

А прывычка, паганая прывычка, губіць чалавека.

Прывычка да матчынага малака каштавала Юльцы шмат слёз, шмат шчырага гора. Многа начэй недасыпала тады, як матка яе адвучала ад грудзей, пасыпаючы іх перцам. І бадай да дваццаці год яшчэ будзе Юлька спрасонку пальчык свой ссаць, а да самай смерці ў час пярэпалаху крычаць «мама».

Але ў жыцці нічога адвечнага няма, усё мяняецца. Юлька гэта, каб толькі хацела, дык даведалася б з сваёй практыкі: яна ўжо на руках і нагах поўзае па хаце, пад сталом, разам з курамі, катом. Яна ёрзае, вандруе па кутках,шукаючы працы. А працы гэтай хоць адбаўляй: гладыш з малаком дагары пераверне, лужыцу кашулькай выма-

жа, лыжкай аб падлогу забарабаніць. Што і гаварыць — працы шмат, дый досыць сур'ёзнай працы; каб, здаецца, дваццаць рук мела Юлька — і то было б мала.

Чалавек без руху і работы нудзіцца, марнее, кажуць філосафы,— гэта ёсць бясспрэчная праўда. Вось спытайцеся ў Юлькі, бо яна ўжо разумная досыць. Маці яе адукуе:

— Рабі аладачкі, Юлька.

Юлька пляскае ручкамі.

— Як кароўка мычыць?

— М-му-у-у!

— Як авечка кажа?

— М-м-э-э-э!

— Як тата злуецца?

Юлька сціскае кулачкі, робіць гнеўныя вочкі ды кажа з імпэтам: «Г-э-э!»

Пасля гэтага яна глядзіць на ўсіх вачыма Аляксандра Македонскага. Жартачкі — яна ўвесь свет перамагла.

У нагароду маці бярэ яе на рукі, туліць да сябе і цалуе. Цалуючы Юльку, маці раптам пачынае злавацца, кажучы: «Фэ, смаркатая!» — і пры гэтым бярэцца фартухом выціраць Юльчын носік. Юлька не даецца і пачынае горка плакаць.

Нос — гэта самае слабае месца ў Юлькі. Шмат горкіх мінут ён ёй каштуе. І такая, здаецца, драбніца — нос! Аж смешна, але ў гэтым і ўся трагедыя, што часам дробненькі камарык звальвае з ног магутнага льва.

У хаце — вялікая радасць.

Тата толькі што пехатой з кірмашу вярнуўся, дый то падышоў да стала, дзе бабка і мама паставілі Юльку і вучаць хадзіць.

Юлька стаіць на стале, разняўшы ручкі для раўнавагі. Вочкі спалоханыя. Добра бабцы смяяцца, а каб яе паставілі на канаце, нацягнутым на двух слупах,і сказалі б: «Танцуй». Нябось, тады не смяялася б.

— Ма-ма! — просіцца Юлька ў вялікім страху.

— Ка мне! Ка мне! — выстаўляючы рукі, энергічна кажа мама.

А Юльцы яе малюсенькія ножкі здаюцца стопудовымі нагамі. Адвагі няма і цяжка — ой, як цяжка рабіць першы, сталы крок у жыцці! Адважыцца трудна на гэта і сталаму чалавеку.

Але, бачачы, што шэсць зацікаўленых, уважных вачэй глядзяць на яе, дык у яе душы будзіцца разам і герой і артыстка. Яна адважылася і...

— Раз! Два! — лічаць трое сталых людзей крокі маленечкай.

Плясь! Юлька гоцнулася аб стол, вачыма ратунку просячы.

Не паспелі яе падтрымаць у цяжкую хвіліну шэсць моцных, сталых рук — эх, людзі!..

З гэтых двух першых крокаў маці з бабкай радуюцца і нацешыцца не могуць.

— Вось пацеха! — з дакорам кажа бацька.— Папрабавалі б злічыць, колькі крокаў я сягоння махануў на кірмаш ды з кірмашу,— вёрст сорак, а вы ані слова аб гэтым...

Упарты дух чалавечы, хоць ілбом, а сцяну праб'е: праз тры дні

Юлька ўжо хадзіла па падлозе, як муштраваны ваяка-пяхотнік, а праз тыдзень так круцілася матцы пад ногі, што той гэты фокус нават абрыд. Яна гнала ад сябе Юльку, як ката, кажучы: «Апсік!»

Юльцы гэта вельмі падабалася, і яна мамцы мяўкала, як кот: «Мяў! Мяў!»

Яшчэ трохі падрасла Юлька.

Яна ўжо ў сукенцы паркалёвай, не маленькая: тры гады! Як матылёк, круціцца, мітусіцца ў агародзе сярод чырвонага маку.

Ёй вельмі смачна рабіць тое, чаго няможна. Маці мае дзеля гэтага вялікія клопаты. Калі скажа Юльцы не пэцкаць спаднічкі, дык якраз прыйдзе запэцканая ў гразь з ног да галавы. Скажа ёй не чапаць макаў — наскубе поўныя жмені. Скажа ёй:

— Юлька, ідзі спаць!

— Не хацу!

— Не ідзі спаць!

— Пайду!

— Гуляй сабе!

— Не хацу!

— Не гуляй!

— Буду гуляць!

Аднак шайтан праціўнасці не заўсёды пануе над ёй. Часам яна бывае ласкавенькай, добранькай і міленькай — як бабка ёй казкі поначы апавядае.

Шчырым срэбным хохатам смяецца яна тады, як лютага ваўка забіваюць, калі людаедзіха-вядзьмарка памірае.

Горкімі слязамі плача, калі воўк шэры з'ядае Чырвоную Шапачку.

Пры гэтых казках блакітныя вочкі яе blішчаць, як зоркі або кветкі ў кроплях светлай расіцы.

А па начах сняцца ёй дзіўныя сны.

Ці разумее Юлька шчасце сваё? Хіба не. Хутчэй яна разумее сваё гора, калі які-колечы дзіцячы капрыз не выконваецца.

І хочацца ёй быць вялікай і разумнай, як бабка. Пачынае з лічбаў — з матэматыкі:

— Раз! Два! Тры! — лічыць яна па пальцах і задумваецца.

— Раз! Два! Тры! Пяць! Дваццаць! Сто! — ажно ў пот кідае. Далей не ідзе. Хоць матэматыка грунт усяму на свеце, але Юлька на гэтым «грунце» яшчэ слаба трымаецца.

Ці не можна жыць без нудных лічбаў? Юлька досыць весела жыве без іх. Назбірае кветак — васількоў. Разложыць іх на камені. Адна кветка — мамка, другая — бацька, трэцяя — бабка, чацвёртая — цюцька. А камень — хата. І пачынаецца будняя аповесць чалавечага жыцця: кветкі гаспадараць на камені, аж люба глянуць.

У печы топіцца. Маці аладкі пячэ. Бабка кароўку доіць. Тата хамут ладзіць. Цюцька брэша. Поўная дынаміка жыцця. Юлька мае работы па горла — за ўсіх гаварыць, за ўсіх работу рабіць, зухавацца. Маленькі малюначак жыцця звычайна канчаецца катастрофай — хатка-камень ляціць у рэчку, а людзі-кветкі стоптаны Юльчынымі нагамі.

Яна не плача над руінамі. Яна — як сам біблейны бог-гасподзь. Зруйнавала адзін свет і з хаосу творыць другі.

Яна, Юлька,— маці. Пры ёй дачушка — лялечка.

І няньчыць, і песціць, і галубіць Юлька дзіця сваё роднае. Часам, як строгая маці, розгай сцёбае дачушку-лялечку. Пры гэтым прыгаворвае:

— А не рві маку! А не пэцкай спадніцы! А слухай, што матка табе кажа, ты, такая і сякая!

Малюе жыццё, як мастак, як раманіст, як драматург, як акцёр.

— Хто пякней,— пытаюцца ў Юлькі,— ты ці мамка?

Юлька думае.

І мамку яна крыўдзіць не хоча, але ўжо сама маленькая кабета і мае свой форс і гонар:

— Я пякней!

— Ах ты нягодніца! — нібыта злуецца мама.

— Хто пякней ты ці лялька?

Доўга думае Юлька.

Змаганне расце ў яе маленькай душы. Але матчына сэрца гатова ўсім ахвяраваць дзеля любага дзіцяці свайго, а Юлька як-ніяк, хоць ёй усяго толькі пяць гадоў, а ўсё ж такі маці, бо дачку-ляльку мае.

— Лялька пякней!

Бачыце? Душа яе вялікая: пачуццё маткі ўзгадавана ў яе сэрцы крывёй і малаком ранейшай маткі.

У Юлькі матчына самаахвярнасць жыве поўным жыццём, хаця імя свайго яшчэ выгаворваць не можа. Замест «Юлька» кажа «Юйка». За гэта бацька на яе злуецца, часам гнеўна кажа:

— Юлька!

— Га!

— Хадзі ка мне!

Яна падыходзіць.

— Кажы — Юлька!

— Юйка!

— Кажы — Юль-ка!

— Юй-ка!

— Ах, ты, паганая! Вучыся па-людску гаварыць!

— Не хацу!

— Дык не вучыся!

— Хацу вуціцца!

— Ну, дык глядзі на мяне!

Юлька глядзіць.

— Добра глядзі.

Юлька добра глядзіць.

— Рабі губамі гэтак, як я, і кажы — Юль! Юль!

Юлька робіць губамі гэтак, як ён, і кажа:

— Юй! Юй! Юй!

— Го! Го! Го! — смяецца бацька.

— Гы! Гы! Гы! — плача дачушка.

І гэта пайшло ў забыццё.

Яна ўжо так чыста гаворыць, што і бацьку餘 пераваструла — зві-

ніць, як званочак. Малоціць языком, як цэпам усё роўна. І не дзіва, бо яна ўжо ходзіць у школу, у тую вялікую школу навукі, дзе ўсё пачынаецца з «А, Б».

Тут для Юлькі адчынены новы свет пазнання добрага і благога.

Пальцы ў Юлькі ў атраманце. Гэта адзнака стараннасці, цярплівасці, мудрасці і працы. Яна піша і малюе так многа, што аж паперы не хапае. І прыходзіцца ёй сваю вялікую здольнасць на ўласным твары паказваць — запэцканыя нос, шчочкі і нават вочы.

Гэта, разумеецца, вельмі кепска, але што зробіш? Калі Юлька яшчэ такая малюсенькая — ёй усяго шэсць гадоў. Яна яшчэ часта пальчык у губкі кладзе і моцна трымаецца за матчын фартух.

Як пойдзе яе далейшае жыццё?

Чытайце велізарныя кнігі, мудрыя раманы. Тады даведаецеся.

## ГАСПАДАРКА

У куце сядзіць мядзведзь,
Хустку вышывае,
А лісічка-невялічка
Хатку прыбірае.

А каток пячэ аладкі,
Маслам залівае,
На тапчане мышанятка
Есці памагае.

А сабачка ўе вяроўкі —
Пугу для хлапчыны,
Дзяцел-бондар на начоўкі
Длубае асіну.

Казёл лапці папраўляе,
Скуратом мацуе,
На акенцы павучочак
Кросенцы рыхтуе.

## СНЯЖЫНКІ

Сняжыначкі-пушыначкі
Ляцелі матылькамі,
Над хмызамі над шызымі
Дыміліся дымкамі.

Зіхцеліся, мігцеліся
У розныя калёры.
Драбнюткія, пякнюткія,
Як зараньі, як зоры.

Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Даліначкі сняжыначкі
Пакрылі дыванамі.

Над елкамі, над хвойкамі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі.

Маленькія, міленькія,
Дзіцяткі-птушаняткі,
Ляціце вы, скачыце вы
У светленькія хаткі!

Вушастыя, пушыстыя,
З драцінкамі-вусамі
Вы, зайчыкі-малойчыкі,—
У хаткі к нам таксама!»

Сняжыначкі-пушыначкі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі».

## КАЛЫХАНКА

Кукарэку, певунок!
Пашый Янку кажушок,
Шапачку бабровую,
Боцікі казловыя.

— Я пашыю, я зраблю,
Бо я хлопчыка люблю.

Мяў-мяў, рабенькі каток!
Схадзі, коцік, на таржок,
Купіш абараначкаў,
Будзе есці Яначка.

І пайшоў ён, і купіў,
І малога накарміў.

Му-му, трацячок-бычок!
Ты да пчол схадзі ў садок.
Ад пчалінай мамачкі
Нясі мёду Яначку.

І пайшоў у сад бычок,
І мядку прынёс збанок.

Го-го, жвавы гусачок!
Зрабі Янку ветрачок
З тваіх пер'яў точаных,
Сонцам пазалочаных.

І зрабіў сваяк-гусак
З пер'яў хлопчыку вятрак.

Піск-піск, мышка-мышанё!
Збегай зараз на гумно,
Зрабі Янку граечку,
З стружак балалаечку.

— Балалаек зраблю пяць,
Будзе Яначка іграць.

Ты, сыночку мой, засні.
А-ля-лю-лі, а-лю-лі.
Пад тваёй калыскаю
Кіска дрэмле з мышкаю.

Спяць бычок і певунок,
Спіць і жвавы гусачок.

Вось ідзе ён, вось і ён —
У кашульцы белай сон.
Казкі-байкі баюцца,
Вочанькі зліпаюцца.

Не шуміце... ну, ну, ну!
Хлопчык Яначка заснуў...

## СКАРБ

Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць. Праца ў яго заўсёды кіпела ўночы, калі, бадай, усе жывыя істоты спалі, калі спяваў адзін салоўка і месячык рэчку фарбаваў.

У кузні ў хохліка было некалькі памочнікаў. Светлячок раскладваў агонь на горне. Цвыркун працаваў малатком пры кавадле. Жаба дзьмухала кавальскімі мяхамі.

Пад карэннямі вольхі, ля рэчкі, крот выкапаў патаемныя падзямеллі, дзе хохлік хаваў свой багаты скарб — скрыні з золатам. Разнеслася вестка па ўсёй ваколіцы ля рэчкі, што хохлік вельмі багаты і мае незлічоныя скарбы пад вольхай.

— Сама сваімі вушамі чула,— казала маленькая плотачка ў рэчцы,— цэлымі начамі куе ды куе ў сваёй кузні, грукае і стукае і нам, рыбкам, проста спаць не дае.

— Сама сваімі вачыма бачыла,— казала варона,— усё там у яго ў кузні блішчыць і блішчыць. Свеціць як маланка, ажно вочы слепіць мне, старой. І я мусіла сабе купіць цёмныя акуляры, бо доктар драч напужаў мяне, што зусім аслепну пад старасць, калі не буду асцерагацца. Адно гора з гэтым хохлікам.

— Ку-ку! Ку-ку! Раз-два! Тры-чатыры! — кукавала зязюля на вольсе. Яна ў цёплыя раніцы сядзела на дрэве ды ўсё лічыла багацце

хохліка. Але зязюля ў лічбах надта не кемная: лічыць-лічыць, заблытаецца ды зноў спачатку пачынае, і гэтак штодня.

— З-з-з-м-м-м! З-з-з-м-м-м! — гудзеў авадзень над рэчкай.— Гэта ж проста бяда, аднаму ўсё, а другому нічога. Я лётаю-лётаю, б'юся як рыба аб лёд, і нічагуткі не маю, а хохлік увесь свет захапіў.

— Ш-ш-ш! — казаў чарот.— Не шуміце так, не грыміце ды не зайздросьце. Працуйце, дык і вы будзеце мець. Я вось сведка, як хохлік са сваёй сям'ёй працуе да поту.

— Дурань, дурань, дурань! — крыкнуў дзяцел чароту.— Не лезь, куды цябе не просяць. Маўчы ды годзе. А вось давайце, браткі, будзем дзяліць хохлікава дабро!

— Давайце! Давайце! — крыкнулі вераб'і.

— І мы, і мы да кампаніі! — загудзелі камары.

— Калі ўсім, дык і нам! — закудахталі куры.

Падняўся шум, гармідар, крыкі. Наляцелі з усіх бакоў звяры і птушкі, мухі і ўсе жывыя істоты, хто толькі даведаўся аб багацці хохліка. Усе рынуліся да хохліка ў кузню, каб яго абрабаваць.

Але хохліка таксама ўлегцы не возьмеш. Ён схаваў свае скарбы спрытна. Закопваў па ўсёй ваколіцы ў розных мясцінах — па лясах, па лугах, пад крушнямі, пад дрэвамі. Не было лапінкі зямлі, дзе не ляжалі б яго скарбы. Але ніхто іх знайсці не можа. Грабуцца куры на сметніках. Капаюцца птушкі на палях. Порацца звяр'ё пад карчамі, рыба ў вадзе. Шукаюць, шукаюць, але нічога з гэтага не выходзіць.

Наслухаўся малы Саўка ад свайго старога дзеда, каторы жыў у млыне ля рэчкі, шмат баек аб багатых скарбах. Яны захаваны ў зямлі, іх усе шукаюць пад карчамі і знайсці не могуць.

— Іх трэба шукаць апоўначы ў купальскую ноч, калі кветка папараці цвіце,— казаў дзед,— тады можна іх знайсці.

Вось у купальскую ноч, калі дзед ужо спаў, малы Саўка выйшаў ціхенька з хаты. Узяў з сабою рыдлёўку і пабрыў скарбаў шукаць. Убачыў ён здалёку агеньчык, які блішчаў на полі ля крушні і вабіў да сябе.

— Гэта, пэўна, скарб! — падумаў Саўка і пайшоў на гэты агонь. Ён да агню, а агонь ад яго далей і далей, і завёў агонь хлопчыка ў самы цёмны гушчар. Страшна і жудасна было ў гушчары. Дрэвы, як жывыя істоты, шапталіся паміж сабою і нібы дзівіліся, што такі малы хлопчык не баіцца адзін швэндацца ў лесе па начах. Тым часам агонь знік, а замест агню залаты пеўнічак заблішчаў на карчы.

— Вось дзе скарб! — узрадаваўся Саўка і трах рыдлёўкай пеўнічка па галаве. Пеўнічак запяяў і знік, а замест пеўнічка паказаўся залаты зайчык. Саўка зрабіў тое самае з зайчыкам. Паказалася залатая лісічка... Затым — залаты ваўчок... Залаты мядзведзь... Але ён дзіка раўнуў і глынуў Саўку.

Ачухаўся Саўка праз некалькі хвілін. Ажно стаіць ён пад зямлёй, а на яго глядзіць і ўсміхаецца хохлік, малюсенькі і тоненькі, як травінка, прыбраны ў шоўк і ядвабу. На галоўцы ў яго залатая карона з дарагімі каменнямі.

— Вось ты і папаўся, Саўка, у мае рукі! — сказаў хохлік.

— А я ж цябе не баюся,— загарачыўся Саўка.— Зачэпіш мяне,

дык я цябе вось адным пальцам задушу! — і паказвае хохліку свой палец. Але як глянуў сам на свой палец, дык адразу анямеў ад страху: палец цянюткі, як павуцінка. Тады давай Саўка аглядаць усяго сябе. Ажно ён сам такі ж маленькі, як хохлік. Тут Саўка спужаўся і заплакаў.

— Не плач,— сказаў хохлік.— Давай цяпер, калі ты ростам такі, як я, будзем аглядаць мае скарбы пад зямлёю.

— На волю хачу, да дзеда! — яшчэ галасней заплакаў Саўка, бо ў яго ўжо адпала ахвота скарбы глядзець.

— Вось табе і адважны,— пачаў кпіць з яго хохлік,— звяроў страшных не баяўся, а цяпер плачаш. Сорам, а яшчэ такі хлопец! Глянь, Саўка, налева і дзівіся!

Як глянуў Саўка налева, дык адразу плакаць перастаў, бо сярэбраныя палацы замігацелі пад зямлёй. Увёў хохлік Саўку ў палацы. Як заблішчалі залатыя сцены і дарагія каменні на сталах, дык Саўка аж засмяяўся з радасці і забыўся аб усім на свеце.

— Гэта мае палацы,— тлумачыў яму хохлік.— Я тут жыву з усёй маёй вялікай грамадой. Мы ўсе вельмі багатыя. Мая грамада разышлася па ўсіх кутках зямлі на працу. Кожны хохлік мае багатыя скарбы — куе і куе золата і дае багацце таму з людзей, хто шчыра працуе. Матка-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць. Без мазалёў і поту ніякіх скарбаў не знойдзеш.

Раптам пачуўся шум пад зямлёй. З усіх бакоў, з усіх шчылін пачалі сыпацца хохлікі, як залатыя сняжынкі, як брыльянтавы мак, як жывы каляровы дождж. Малюсенькія-малюсенькія, драбнюткія-драбнюткія і многа-многа, ажно ў вачах мігацела, гледзячы на іх. А ўсе, відаць, працаўнікі заядлыя, майстры адукаваныя: хто з сякерай, хто з рыдлёўкай, хто з малатком, хто з мяшочкам за плячыма, а хто з такім дзіўным інструментам, што Саўка і не ведаў, што гэта.

— Гэта мая сямейка на вячэру прыйшла... Гэй, ты! — паклікаў хохлік аднаго з кампаніі.— Як расце поле таго ратая, што раней за ўсіх у вёсцы на шнур свой выходзіць?

— Вельмі добра расце... Я сам даглядаю жытнія зярняткі, кармлю іх зямельным сокам і паю расіцай.

— А ты што сягоння зрабіў? — строга крыкнуў ён другому.

— Я глядзеў за тым, каб сад добра расцвітаў, каб вецер без пары кветак не зрываў.

— Ну, глядзі, бо гаспадар дзень і ноч у садзе капаўся, трэба, каб яблыкі былі, як гарбузы, а грушы — як кулакі.

— А ты, жэўжык, што рабіў? — звярнуўся ён да трэцяга.

— Я пільнаваў агарод з агуркамі. Лічыў і лічыў, бо трэба, каб сёлета было шмат агуркоў.— І хохлік пачаў лічыць па пальцах.— Пяць коп гаспадару; шаўцу, што яму боты шыў,— тры капы; кавалю за рыдлёўку — тры капы; хлопчыку, які ваду цягаў,— тры...

— Ах ты такі і сякі! — зазлаваўся стары хохлік.— Чаму ты гэтакі скупы? Глядзі, каб усім было не меней як па дзесяць коп!

— Буду старацца,— пужліва сказаў працаўнік.

Падышоў новы хохлік з кнігай і пачаў чытаць аб тым, як хлопчыкі

ў школах вучацца, хто стараецца і хто толькі мух ловіць. Доўга чытаў ён аб гэтым, пералічваючы ўсіх сяброў і знаёмых Саўкі.

— Рыхтаваць старанным хлопчыкам самыя найлепшыя гасцінцы, а гультаям і абібокам нічога не даваць! — загадаў старшы хохлік.

Пасля розных распытванняў працавітыя хохлікі селі вячэраць. Чаго-чаго там ні было на вячэру: самыя найлепшыя прысмакі, якія толькі ёсць на зямлі. Саўку, як госцю, вядомая рэч, пападаліся найсмачнейшыя кавалкі.

Павячэраўшы сытна, Саўка заснуў і не паспеў азірнуцца, як апынуўся на ложку сваім у дзедавай хаце.

З таго часу болей Саўка не шукаў скарбаў, бо ведаў, што матка-зямля мае іх у сабе вельмі шмат, але дае толькі тым, хто працуе. І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.

## МУЗЫ́КА

Пастушок Васілька з самых малых дзён любіў іграць на жалейцы. Іграючы, яму ніколі не было нудна са статкам сваім у самым дзікім гушчары, на самых глухіх палянах сярод балота.

Ён іграў і іграў. Так шчыра іграў, ад усёй душы, ажно сам цешыўся, і ўсё навокал яго цешылася. Васілька любіў усім сэрцам сваю жалейку. Моцна любіў. Ён мог забывацца палуднаваць, але іграць ён ніколі не забываўся. І таму ён навучыўся іграць вельмі прыгожа.

Гэта ўцяміла ўся ваколіца. Гэта ведаў яго статак. У гэтым перакаваліся лес, поле, рэчка, рыбкі, птушкі, звяры, казюлькі і ўсе самыя драбнюткія стварэнні на паляне.

Бывала, як зайграе Васілька вясёлую песеньку, дык неба весялілася, сонца смяялася, дрэўцы ківаліся ў такт. Зляталіся розныя птушкі, збягаліся розныя звяры, спаўзаліся розныя га́дзіны слухаць ігру пастушка. Рэхі каціліся ад дрэва да дрэва, ад горкі да горкі, ад лугу да лугу і склікалі ўсіх. Усім істотам было весела і добра ад яго песняў.

А калі пастушок іграў жаласлівую песню, дык сумна рабілася на полі. Краскі слязамі расістымі пакрываліся. Дрэўцы і кусты нямелі, а высока над полем хмаркі затулялі яснае неба. Усе жывыя істоты апускалі галовы і глыбока задумваліся. Але і смутак-жаль ад трэляў жалейкі быў усім прыемны, як свежы ранішні туман, і салодкі, як ліпавы мёд. Усім нечага надзвычайнага жадалася пры яго ігры. Усіх Васілька зачароўваў. Над усім ён панаваў са сваёй жалейкай, якая мела ў сабе вялікую сілу.

Прыходзілі на адукацыю да настаўніка ўсе, хто толькі меў сэрца жывое. Ён іх вучыў старанна, бо чым болей музы́каў было вакол, тым болей ён радаваўся. А вучыў ён не проста, але па нотах. Нотамі ў яго былі не такія нямыя і мёртвыя значкі і круцёлачкі на паперы, а ўся жывая зямелька са сваімі рознакаляровымі краскамі, траўкамі, дрэвамі і серабрыстымі крынічкамі. Блакітнае неба са сваімі свечкамі-зоркамі, размаітымі хмаркамі, пераліўнымі зарніцамі і фарбамі. Гэта ўсё было нотамі для пастушка, гутарлівымі, спяваючымі і рухлівымі. Па іх вельмі лёгка было вучыцца.

Першага навучыў пастушок сваёй музыцы салоўку. Салоўка быў яго найлепшым вучнем. Калі адукаваны салоўка спяваў апоўначы ў бярэзніку, дык не то што блізкія істоты, але і далёкія зоркі ў небе слухалі з прыемнасцю і пераміргваліся ад дзіва паміж сабой, кажучы: «Глядзіце, сястрычкі, такі малы шэры жэўжык, а якія слаўныя трэлі выводзіць».

Пасля салоўкі вучыўся ў пастушка жаваранак. Гэта была не такая здольная птушачка, як салоўка, але з грахом папалам і жаваранак патрапіў бы іграць вяселле лёгкім хмаркам пад вясновым небам над свежым, пуховым чарназёмам.

Пасля салоўкі і жаваранка вучыліся і іншыя птушкі. «Усе пяюць, усе іграюць,— падумаў хлопчык.— Увесь свет пад сонейкам мае сваю музыку». Вялікая пашана з'явілася ў хлопчыка да ўсяго свету.

«Давай,— падумаў хлопчык,— зайграю для сонейка, якое пануе над усім светам!»

І вось у адну пекную раніцу хлопчык яшчэ цямнютка выгнаў статак у поле. На прасторы ён зайграў на сваёй жалейцы. Зайграў прыгажэй, чым заўсёды. Уся пекната летняй зямлі адбілася ў яго песні.

Гэткай прыгожай музыкі яшчэ ніхто на свеце не чуў. Гэта была песня без слоў, бо хлопчык іграў для сонейка, а сонейка без слоў добра разумела. Дзівіўся статак. Дзівіліся дрэвы, птушкі, рэчка, неба. Дзіву давалася ўся зямля.

— Калі для сонейка, дык і мы да кампаніі! — сказалі ўсе істоты ў полі і ў лесе.

І вось на ўсходзе сонейка на лузе пачалася вялікая музыка: усе стварэнні на зямлі і сама зямля ігралі і спявалі, кожны на свой лад, на тысячы-тысячы галасоў.

Увесь свет выглядаў велізарнай скрыпкай з незлічона многімі струнамі. Гэта было так хораша, так цудоўна прыгожа, ажно само сонейка вельмі ўзрадавалася. Спусцілася сонейка з неба на сваіх лёгкіх прамяністых скрыдлах і пацалавала маленькага хлопчыка ў самыя вусны. Пацалунак быў такі лёгкі, што пастушку здалося, нібы кволы ветрык толькі крануўся яго твару. Пацалунак быў такі шчыры, што хлопчык да самай магілы аб ім не забудзе.

А сонейка было такое радае і добрае, што задумала апрануць зямлю ў багатыя вопраткі, у шаўковыя і залатыя колеры. І ззяць, ззяць і радаваць усіх.

З-пад аксамітнай і пурпуровай хмаркі ўзышло яно гарачае і бліскучае. Узышло ды ўсміхнулася. Усміхнулася ды яшчэ вышэй паднялося і абсыпала сваімі праменнямі зялёны ўзгорак, дзе стаяў пастушок. Пастушок выглядаў не то сярэбраным, не то залатым. Праменні красавалі, як агнёвыя васількі, на яго галаве. Праменні пырскалі яму ў твар дыяментавымі снапамі. Праменні сыпаліся бліскучымі іскрамі, каляровым макам з яго вачэй. Здавалася, што ў пастушковых вачах драбнюткія хохлікі крэсяць агонь бесперастанку.

Хлопчыку так добра зрабілася на душы, што яму захацелася глянуць на сябе. Ён падышоў да рэчкі, каб зірнуць у яе, як у люстэрка.

— Глядзі, глядзі ў мяне,— сказала рэчка,— бо твая душа чыстая і празрыстая, як мая вада!

Зірнуў хлопчык у ваду і сам сябе не пазнаў. Такі ён стаў прыгожы! Гэты цуд утварылі над ім летняе сонейка і надзвычайнае шчасце, якое азарыла яго ўсяго...

## У ШАЛАШЫ

Навакол густа-зялёнай нізіны паплавоў смуглелі далі. Яны былі ўбраны ў ружова-сонечныя хмызнякі, у змрочна-сінявыя лясы, а ў адным месцы яны плылі па возеры, нібы флатылія вузкіх перламутравых чаўноў. З недалёкага ўзмор'я брыло з вадапою блакітнае стада паўночных вятроў. Па дарозе гэтае стада таптала зялёную шчэць балотнай травы, скубла стагі і навальвалася грудзьмі на стары рыбацкі шалаш. Над шалашом дрыжалі тонкімі сцябламі некалькі вудаў. Ля куста, ветліва распасцёршага свае галіны, сядзеў на калодзе чалавек. Ён пісаў. Ліпеньскія паўночныя вятры рвалі ў яго паперу з рук, кучаравілі густую кучму валасоў і халадзілі яго голены твар. Чалавек быў глыбока задуменны, з лагоднай усмешкай жмурыў вочы на вецер. Часам, у хвіліну забыцця, гладзіў далонню густую шавялюру, нібы лысіну, і браўся за голены падбародак, быццам за бараду...

Недалёка ад яго растуць з зямлі агнёвыя языкі. Ад ветру яны выцягваюцца, уюцца вакол сухіх сучкоў галля чырвонымі абручамі. Ля вогнішча стаіць дванаццацігадовы хлапчук і пільна назірае за чалавекам. Бачачы, як чалавек гладзіць, нібы лысіну, валасатую галаву і стараецца намацаць бараду на голеным падбародку, хлопчык ледзь стрымліваецца ад смеху. Аднак хутка ён становіцца сур'ёзным, і трывога свеціцца ў яго вачах. Ён хоча нешта сказаць чалавеку, але баіцца перашкодзіць у рабоце.

«Няхай Ільіч піша...— думае ён.— Пры вячэры скажу яму, каб ён помніў, што на яго галаве парык, а барада голеная... Яшчэ не прывык...»

Імя хлопчыка — Коля. Ільіч у жарт называе яго «кашаварам». Час ад часу хто-небудзь з старэйшых братоў хлопчыка прыносіць сюды свежую рыбу, крупы, бульбу.

Коля нагінаецца над кацялком, знімае шумавінне, мяшае лыжкай страву, сыпле туды шчапотку солі, перцу і прабуе на смак, як сапраўдны кашавар. Пры гэтым ён таропіць вочы ўдаль і доўга прыслухоўваецца да смаку...

Ён гатуе вячэру для Ільіча...

Раптам твар хлопчыка скрывіўся ад болю: іскра папала на босую нагу. З лыжкай у руцэ ён адскаквае ад вогнішча і студзіць нагу ў вільготнай траве.

Крык болю хацеў вырвацца з губ хлопчыка, але няможна — перашкодзіш Ільічу... Ён з апаскай азіраецца на сагнутую над паперай фігуру чалавека. Ільіч трымае на каленях сшытак. Піша, піша... Руплівa і спрытна рухаецца рука на паперы туды і сюды. Чалавек тчэ незвычайную дарагую тканіну...

У вушах звініць тонкае, як волас, несупыннае дзынканне камароў...

Адна частка твару ў Ільіча ружовая ад заходзячага сонца, а другая частка ў сінім цені. Ён выглядае і маладым і старым.

Часам Ільіч на адно мігценне вока адвернецца ад паперы, ахоплівае ўвесь летні прастор паплавоў і зноў нагінаецца, і зноў лёгкі шурхат пісання... Хлопчыку здаецца, што і ўночы чуе гэты несупынны шурхат...

На паплавах пачынаюць усё больш і больш вызначацца цені.

Ледзь прыкметна сонца апускаецца на лес медным шчытам. І чым ніжэй коціцца яно, тым даўжэй рассцілаюцца на прасторы сінія абрусы ценяў.

Коля мерае цень сваім вакамерам, і каб ён, хлопчык, стаў цяпер босымі нагамі на зубчастыя вершаліны лесу, дык гарэзным ільняным чубам упіраўся б у самае сонца...

Возера ружовае, як віно... На шліфаваных зыбях вод пераміргваюцца цяпер разнастайныя колеры захаду. На яркай гладзі вады вырысоўваюцца дзе-нідзе чаўны з рыбаловамі. З клапатлівым крыкам узнімаецца стада чаек.

Больш спешна рухаецца на белым лістку паперы рука Ільіча. Ад напружанасці на ёй выступаюць жылкі. Ільіч крыху ўзрушаны. Адным вокам з пашкадаваннем зірнуў на сонца.

Цяпер хлопчык мог бы сядзець у лесе, а сонца было б яму на галаве, як шапка...

І незвычайныя думкі з'явіліся ў хлопчыка:

«Каб можна было затрымаць сонца, Ільіч сядзеў бы цяпер пры ясным надвор'і і пісаў бы, пісаў доўга, доўга... А то штодзень дажджы».

Нядаўна Ільіч перагледзеў кіпу газет і аддаў хлапцу, пры гэтым паглядзеў з цёплай усмешкай і з хітраватымі іскрачкамі ў прыжмураных вачах. Коля кідаў газеты ў агонь. Ён разумеў па-свойму выраз вачэй Ільіча:

— Мала што можа здарыцца. Юнкеры Керанскага могуць нахлынуць сюды. Пабачаць у нас газеты і здагадаюцца, што мы з табою, кашавар, людзі не простыя, пісьменныя. Дык што ж мы робім у гэтай глушы?

А што б ні здарылася, ён, Коля, маўчаў бы... Яму не патрэбны і словы бацькі, сівога і старога слесара, які колькі дзён таму назад папярэдзіў усіх сыноў:

— Амін. Нікому не гаварыць!

Сонца на адну далонь ад сіняга насупленага лесу. Ільіч не адрываецца ад паперы. Ён увесь у цені. На яго ілбе глыбеюць маршчыны. Вецер трэпле сшытак.

Коля з крыўдай глядзіць на захад.

Уводдалі блішчыць уткнутая ў зямлю каса.

Пахне гатаванай рыбай і свежаскошанай травой.

Зараз будзе гатова вячэра для Ільіча.

Цені растуць і растуць.

Ільіч кідае заклапочаны позірк на аколіцу.

— Прасторны кабінет, але электрычная лямпа гасне...

Макаў цвет — сонца — павольна апускаецца. Залаціцца хрыбет лесу. Апошнім позіркам прамень запальвае башлыкі стагоў. Пажарышча неба нізіцца ў возера. На далёкім небасхіле імчыцца сіні коннік з палаючай касой за плячыма.

Яшчэ больш спешна ходзіць па белым лістку рука Ільіча.

Палогі ценяў апускаюцца на абшар. З сумам пазірае малы кашавар на паміраючы дзень.

Ільіч пільней прыглядаецца да паперы. Пакутлівыя штрыхі моршчаць лоб і хаваюцца пад насунуты парык.

Апошняя чайка срэбранай кропкай узнялася высока ў неба. Знікла. На крыллях чайкі патух апошні блік дня.

Смялей задзынкалі камары. Іх вакол Ільіча цэлае племя. Не даюць пісаць. Ён адмахваецца сшыткам і глядзіць на хлопчыка:

— Абуйся, кашавар. Прастудзішся...

Ледзь не бацькоўскі голас.

Коля паслухмяна бяжыць к шалашу. Абуваецца. Вяртаецца назад.

— На, схавай.

Ільіч падае яму сшытак, трэ рукі адна аб адну і грэе іх над вогнішчам.

Коля нясе сшытак да стога. Там ёсць патаемнае месца. Ён кідае позірк на недапісаную старонку.

Ільіч напісаў сёння толькі пяць з паловай лістоў.

Перад вачыма Колі мітусяцца дробныя літары і густыя баразёнкі радкоў, што цягнуцца з краю да краю. На паперы аніводнага свабоднага месца. Блішчаць літары і жывуць асаблівым жыццём.

Удзень быў дождж. У цёмным шалашы нельга было пісаць. Ільіч ляжаў нічком на шуршавістым сене і праз мутную тканіну дажджу пазіраў у засмужаную даль. Барабаніў пальцам па сшытку. Спачатку яго лагодны твар быў крыху сумны, потым усмешка азарала яго. Здавалася, што праз густы дождж ён удалі бачыць сонца, набліжае будучыню і чуе гоман мільёнаў людзей...

Ад дажджу тады шуршаў шалаш, нібы мышы скраблі.

Коля яшчэ раз зірнуў на першую старонку сшытка — «Дзяржава і рэвалюцыя».

Ільіч сам аднойчы растлумачыў свайму кашавару, што піша кнігу аб тым, як зрабіць рэвалюцыю і будаваць новую дзяржаву... Ільіч такі зразумелы і просты...

Не раз у цёмныя ночы ў шалашы ён жыва і ярка апавядаў Колю, як рабочыя возьмуць уладу ў свае рукі і як зажыве пасля працоўны чалавек на вялізных прасторах зямлі...

Залатым вокам блішчыць у смуглявасці вечара невялікі агеньчык. Цяпер вочы Ільіча цямнеюць, як ніколі. Яны яскравяцца цёпла і ласкава. Ён хваліць кашавара за смачную вячэру і так жартуе, што кашавар ледзь стрымліваецца ад смеху. А стрымліваецца ён, каб не рабіць шуму... Ноч насоўвае на паплавы шаўковы балахон. Вогнішча дыміць і паволі патухае. Не спыняецца гул камароў. Недзе ў кустах крычыць балотная птушка. З вільготнай далі даносяцца гудкі паравозаў.

Перад тым як ісці спаць, Коля доўга ўглядаецца ў аколіцу, прыслухоўваецца да кожнага шолаху.

Калі ўдзень Ільіч даў хлопчыку запісачку ў горад для Крупскай, ён жартаваў:

— Ты, кашавар, галавой адказваеш за гэтую паперку.

Хлапец павінен быў аддаць запісачку свайму бацьку ці аднаму з старэйшых братоў. Коля зірнуў сам у паперку — лічбы і нейкія значкі.

Дома ён даведаўся, што Ільіча ўсюды шукаюць юнкеры і казакі. Шпікі Керанскага правяраюць дакументы ў пасажыраў чыгункі, робяць вобыскі па кватэрах рабочых. З фатаграфіяй Ільіча ў руках яны прымерваюцца да людзей, аглядаюць іх з усіх бакоў і звяраюць з партрэтам — а можа, гэта «ён»?

А «ён» у шалашы...

Спакойны, упэўнены, працавіты і добры, ён пранізвае вачыма далі і набліжае час. У шалашы цяпер галоўны штаб рэвалюцыі. Коля носіць запісачкі з галоўнага штаба. Коля — сувязіст Ільіча... Ды ён, Коля, яшчэ ў дні Лютаўскай рэвалюцыі вінтоўку падаваў бацьку, прышпільваў яму ленту з патронамі...

...І яшчэ нядаўна Коля бачыў, як юнкеры і казакі рабілі аблавы на людзей, што насілі пачкі «Правды». Дзіўныя сцягі былі ў юнкераў — чорныя з белым чэрапам і касцьмі накрыж. На вуліцах Петраграда яны перастрэльваліся з рабочым народам, над якім палыхаў чырвоны, як полымя, сцяг...

Па абшарах лугавін сцелецца малочны туман. Ён дыхае вільгаццю ў шалаш. Ільіч яшчэ не спіць — варочаецца на сене з боку на бок.

З-за возера са станцыі Разліў галосяць гудкі. Адчуваецца пыхценне паравозаў. Пэўна, там у пасажыраў правяраюць дакументы і прыглядаюцца да іх, каб параўнаць з партрэтам Ільіча.

Марудна насоўваецца ноч.

Па стагах шуршыць халодны, прарэзлівы вецер, прабірае да касцей. Ільіч прыглушана кашляе. Грозна шуміць лес. Яго роўны гоман, нібы гоман мільёнаў людзей, набліжаецца да шалаша і чакае загаду і пытаецца ў свайго камандзіра:

— Калі?

Гэтае «калі» пытае Коля, бо Ільіч не строгі і гаворыць з ім, як роўны з роўным.

— Калі? Мой бацька казаў, што рабочыя рвуцца ў бой.

У пацёмках Ільіч гладзіць пяшчотна галоўку малога кашавара і гаворыць ціхім голасам, нібы адказвае на свае ўласныя думкі:

— Яшчэ рана... Рабочы Петраграда гатоў... Фронт... Сялянства... Нам трэба раней растлумачыць... і тады... тады...

Вільгаць туману лезе ў цёмны шалаш.

— Колькі часу можа на гэта пайсці? — пытае хлопчык, як дарослы.

Хвіліна цішыні. Пасля, як даросламу, Ільіч адказвае:

— Месяцы тры. Думаю, што прыблізна ў кастрычніку дадзім гарачы бой буржуазіі. Перамога будзе на нашай старане...

Жухлая балоцістая ноч, як гнілая кераншчына, лезе ў шалаш.

— Накрыйся, кашавар,— кажа Ільіч бацькоўскім голасам,— а то прастудзішся...

— У кастрычніку...— шэпча Коля.

Ён нацягвае цёплы бацькаў кажух. Пад ім шуршыць балоцістае цвёрдае сена, і ён ціха паўтарае:

— У кастрычніку...

## АЛЕСЬ ГАРУН

Алесь Гарун (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі) нарадзіўся 11 сакавіка 1887 г. у Мінску ў сям'і рамесніка. Скончыўшы ў 1902 г. рамесніцкае вучылішча, працаваў у сталярных майстэрнях і на мэблевай фабрыцы ў Мінску. У 1907 г. за выступленні супраць царскага самадзяржаўя быў арыштаваны і сасланы на катаргу ў Іркуцкую губерню, дзе правёў 10 гадоў. У 1917 г. вярнуўся ў Мінск і стаў рэдагаваць газету «Беларускі шлях».

Друкавацца Алесь Гарун пачаў у 1908 г., а ў 1918 г. выйшаў яго паэтычны зборнік «Матчын дар». Галоўныя матывы яго паэзіі — служэнне роднаму краю, выкрыццё сацыяльнай няроўнасці, эксплуатацыі ў буржуазным грамадстве. А. Гарун — аўтар зборніка «Жывыя казкі для дзіцячага тэатру» (1920), куды ўвайшлі п'есы «Хлопчык у лесе», «Шчаслівы чырвонец» і «Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць, або Дзіўны лапаць». П'есы А. Гаруна былі першай спробай выкарыстання казачных фальклорных традыцый.

Памёр Алесь Гарун 20 ліпеня 1920 г.

### ДОБРЫЯ ДЗЕЦІ

Паставілі дзеці сіло. Вераб'я
Хацелі злавіць на пацеху.
Злавілі сінічку, крычаць: вой-я-я!
А радасці колькі, а смеху!

Імчацца да маткі: «Сінічка, глядзі!»
— А дзе ж вы ўзялі? — Злавілі,
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі.
— Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!

— Мы будзем яе і паіць і карміць,
Спявала б нам птушка прыгожа...
— Ах, дзеткі! Ў няволі яна замаўчыць,
Спяваць у няволі не можа...

Успомніце толькі, як нудна сядзець,
Як з хаты мароз не пушчае.
То ж дзень, вам здаецца, як тыдзень ідзець,
Хоць я і усяк разважаю.

А птушку вы хочаце з хаткі яе
Узяць, пасадзіць у чужую...
Не мучце, пусціце, рыбулькі мае,
На волю яе залатую.

І матчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласкавыя струны кранулі,
І добрыя дзеці — прыклад для людзей! —
Сініцы свабоду вярнулі.

### У ПРЫПАР

Прыпарыла,
Нахмарыла,
І ўдарыла!
— Святы Ілля...[1]
Маланка ўраз з'явілася,
Мільгнула і звалілася,
І дожджыкам аблілася
Гарачая зямля.
Кроплі разам, згодна, жвава,
Пояць ўсё, што хоча піць:
Збожжа, дрэвы, кветкі, травы,
Вулкі хочуць затапіць,
Б'юць у стрэхі, мыюць шыбы,
Мыюць хаты, мочуць сад,
У рэчцы спожыў маюць рыбы...
— Хто ў прыпар дажджу не
рад?

Сцішаецца,
Змяншаецца,
Унімаецца.
— Няма!
І слонка[2] паказалася,
Маўляў, само купалася;
Прыемна ўсміхаецца,
Бліпічыць, пераліваецца,
Яскрава адбіваецца
На траўцы, на лісточку,
У рэчцы, у раўчачочку,
На вулачцы, у садочку,
Зямля ўздыхае поўнымі,
Шчаслівымі, чароўнымі
Грудзямі ўсіма.

## ЯНКА ЖУРБА

Янка Журба (Іван Якаўлевіч Івашын) нарадзіўся 30 красавіка 1881 г. у вёсцы Купніна Лепельскага павета Віцебскай губерні (цяпер Чашніцкі раён Віцебскай вобласці). Пасля заканчэння Полацкай настаўніцкай семінарыі (1902) настаўнічаў на Віцебшчыне. У 1909 г. скончыў Глухаўскі настаўніцкі інстытут на Украіне. Працаваў настаўнікам на Палтаўшчыне, Віцебшчыне, Міншчыне, а таксама ў Сімбірскай губерні (цяпер Ульянаўская вобласць), куды эвакуіраваўся ў час першай сусветнай вайны.

У 1921 г. Янка Журба вярнуўся на радзіму, працаваў у навукова-педагагічнай камісіі Наркамасветы БССР, інспектарам Бабруйскага акруговага аддзела народнай асветы, настаўнічаў. У 1934 г. па стану здароўя (амаль поўная страта зроку) пакінуў педагагічную работу, выйшаў на пенсію. Апошнія гады жыцця правёў у вёсцы Слабада пад Полацкам і ў Полацку.

Пачаткам літаратурнай дзейнасці Я. Журбы лічыцца 1909 г., калі ў «Нашай ніве» быў апублікаваны яго верш «На берагах Дзвіны», які ўхваліў Янка Купала. Падтрымка вядомага паэта многа значыла для маладога аўтара. З гэтага часу ён пастаянна друкуецца ў «Нашай ніве», а таксама ў часопісах «Маладая Беларусь» і «Лучынка».

Свой першы зборнік вершаў «Заранкі» Я. Журба выдаў у 1924 г. Перад вайной ён падрыхтаваў да друку два зборнікі вершаў «Раніца» і «Шляхі перамогі», але ў час нямецкай акупацыі Беларусі яны загінулі. У пасляваенныя гады выйшлі зборнікі «Выбраныя творы» (1950), «Ясныя шляхі» (1959), «Вершы» (1970).

Добры знаўца дзіцячай душы і псіхалогіі, Я. Журба напісаў для дзяцей кнігі паэзіі «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959).

Памёр Янка Журба 7 студзеня 1964 г.

---

[1] Ілья — у беларускай міфалогіі і фальклоры распарадчык дажджоў і навальніц.

[2] Слонка — сонца.

## ДЗЕД МАРОЗ

У вопратцы белай,
Шырокай, даўгой
З вялікай пушыстай
Мятлой-барадой

Прыйшоў к нам здалёку
Дзядуля Мароз,
Завеі і холад
З сабою прынёс.

У бель апранае
Ён дрэвы, кусты,
На рэчках, азёрах
Будуе масты.

Па вуліцах ходзіць
Ды снегам хрушчыць,
Вятры з сабой водзіць,
У дрэвах трашчыць.

Ён грукае ў сцены
І хат і сяней
Ды голасам гулкім
Склікае дзяцей:

«Выходзьце, рабяты!
Час ладзіць каток.
Дык жыва ж за працу,
Шумлівы гурток!»

## КОЦІК

*(Паводле народнай песні)*

Хлопчык любіць коціка,
Лашчыць ён варкоціка,—
    Коцік міл яму.
З ім на двор гуляць ідзе,
Часта малачка дае
    Ён сябру свайму.
Ходзіць коцік беленькі,
Хвосцік яго шэранькі,
    А бяжыць — стралой.
К хлопцу прытуляецца,
Спінкай выгінаецца,
    Хвост яго — дугой.

Як убачыць птушачку,
Хутка шчабятушачку
    Хоча ён схапіць:
Вочкі разгараюцца,
Кіпці выпускаюцца,
    Ён за ёй бяжыць.
Поўсць яго пушыстая,
Беленькая, чыстая,
    Мяккая, як лён.
Мышкі, сцеражыцеся,
Ціха!.. беражыцеся!
    Ўміг вас зловіць ён.

## НАПРАДВЕСНІ

Годзе, сняжыначкі,
    Сыпацца з неба!
Цёплага сонца
    Чакае ўжо глеба.
Мы нагуляліся
    З вамі уволю,
Баб наляпілі
    Са снегу даволі.
Хутка растопяць вас
    Сонца праменні;
Рэк, ручаёў
    Мы пачуем бурленне.

Удосталь нап'ецца
    Матуля-зямліца
Свежай, сцюдзёнай
    Вясенняй вадзіцы.
Скора пальюцца
    Вясёлыя песні
Жаўранкаў звонкіх
    У нас напрадвесні.
Дружна пасадзім
    Там розныя дрэвы;
Ў садзе зазвоняць
    Вясёлыя спевы.

## ПАСТУШОК

Сонца толькі што ўзышло.
Шле наўкол сваё святло.
Над палямі птушак хор:
Спевам поўніцца прастор.
Абуджаецца калгас,
Каб паспець на працу ў час.
Выйшаў з хаты пастушок
І зайграў ён у ражок:
«Тру-гу-гу-гу, тру-гу-гу!..
Добра будзе на лугу
Сёння статку пагуляць,
Роснай траўкі пашчыпаць».
І кароўкі ўміг яму
Адказалі: «Му-му-му!..
Будзем цэлы дзень гуляць,
Траўку смачную шчыпаць.
Там рачулка ўдаль бяжыць;
Мы ваду ў ёй будзем піць.
А як скончыцца дзянёк,
Сонца сядзе за лясок,—
У калгас мы вечарком
Прыйдзем з смачным малаком».

## ШПАК

Зніклі завірухі,
К нам вясна прыйшла;
Веснавое сонца
Многа шле цяпла.
Сёння раніцою
Прыляцеў к нам шпак,
Сеў ён на бярозцы
І спявае так:
«Выхадзіце, дзеці,
Сустракаць вясну!
Ўстала ўжо прырода
З зімовага сну.
На лугу ўжо скора
Кветкі зацвітуць,
А над імі пчолкі
Звонка загудуць».
Шлюць шпаку рабяты
Дружна свой адказ:
«Шчыра мы вітаем
Твой зварот да нас!
На бярозе стройнай
Для цябе, дружок,
Мы даўно зрабілі
Новенькі дамок».

## ПЧОЛКА

Веснавое сонца
Росы падбірае.
Вылецела ў поле
Пчолка залатая.
Ёй за шчырай працай
Весела на полі:
Луг прыбраны ў кветкі,
І наўкол раздолле.
З рання да змяркання
Пчолка залатая
Лётае па кветках
Ды мядок збірае.
Шмат сабрала пчолка
Мёду з розных кветак,—
Дома ім пакорміць
Родных пчолак-дзетак.
У вуллі работа
Цэлы дзень кіпела.
Вечарам з дабычай
Пчолка прыляцела.

## ПЕРШЫЯ СНЯЖЫНКІ

Лётаюць, сыплюцца
Зоркі-сняжынкі —
Белыя, лёгкія,
Быццам пушынкі.
Роўна так сцелюцца
Ў вёсцы і ў полі,
Круцяцца, кружацца
Ціха, паволі.

Дзецям тут весела,
Хоць і марозна:
Цёпла за гульнямі,
Зімка не грозна.

Шумна забегаем
Тут удагонкі,
Гулка пакоціцца
Голас наш звонкі.

Жыва пpaложым тут
Новыя сцежкі,
Дружна наладзім мы
Гульні у снежкі.

Лётаюць, сыплюцца
Снежныя зоркі...
Будзем на саначках
Ездзіць мы з горкі.

### НАША ЁЛКА

У школьным клубе ёлка
Прыбраная стаіць:
Красою пышнай вабіць,
Уся аж зіхаціць.
Высока на галінцы
Вавёрачка сядзіць,
Трымае ў лапках шышку,
Што золатам бліщчыць.
Спыніўся каля ёлкі
Калматы звер-мядзведзь,
Нібы на сонцы хоча
Сваю спіну пагрэць.
Вунь заяц палахлівы
Пад ёлачку бяжыць,
А хітрая лісіца
Услед яму глядзіць.
Прыгожыя тут птушкі
І рыбкі мільгацяць,
І грушы, і цукеркі,
І яблыкі вісяць.
З галінак парашуты
Спускаюцца на дол,
А вунь і самалёты
Ўзляцелі аж пад столь.
Развесістая ёлка
Красою зіхаціць,
А ў самым версе зорка
Чырвоная гарыць.

## АЛЕСЬ ГУРЛО

Алесь (Аляксандр Кандратавіч) Гурло нарадзіўся 31 студзеня 1892 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці. У 1908 г. скончыў Капыльскае чатырохкласнае вучылішча. Некаторы час працаваў у Пецярбургу на ліцейным заводзе «Вулкан». З 1913 г. служыў на Балтыйскім флоце, удзельнічаў у штурме Зімняга палаца, ваяваў на розных франтах грамадзянскай вайны, быў цяжка паранены. У 1921 г. вярнуўся на Беларусь, працаваў у Інбелкульце, у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Полымя», «Пробліск».

Друкавацца А. Гурло пачаў у 1909 г. у газеце «Наша ніва». Першы зборнік вершаў «Барвёнак» выйшаў у 1924 г., затым выходзяць кнігі «Спатканні» (1925), «Сузор'і» (1926), «Зорнасць» (1927), «Межы» (1929), «Вершы» (1953, 1972).

У 1912 г. А. Гурло напісаў сямейна-бытавую драму «Любоў усё змагае».

А. Гурло — аўтар цікавых вершаў для дзяцей. Творы паэта для дзяцей склалі зборнік «Нашы птушкі» (1947), які некалькі разоў перавыдаваўся.

Памёр паэт 4 лютага 1938 г.

### МОЙ КРАЙ

Край мой там, дзе рэчак хвалі
І плюскочуць і плывуць,—
Што далей — да новых даляў
Мяне клічуць і завуць.

Край мой там, дзе шэпчуць сосны,
Шумяць волаты-дубы...
Гэты шэпт і шум галосны
Ўсяму свету кажуць быль.

Край мой там, дзе поўны колас
За паклонам б'е паклон,
І жняі шчаслівы голас
Заглушае сэрца звон.

Край мой там, дзе каля хаты
Аж да неба ўзняўся сад;
Там, дзе хлопцы і дзяўчаты
Апяваюць згоду, лад.

Край мой там, дзе Нёман льецца
Срэбраплыннай паласой,
Там, дзе ўсё, усё смяецца,
Шчасцем хваліцца, красой!

### НАШЫ ПТУШКІ

Ў нашым краі Беларусі
Качкі ёсць, буслы і гусі,
І сарокі, і саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі,
Каршуны, сіваваронкі,
І шчыглы, і жаваронкі,
Крумкачы, галкі, вароны,
Галубочкі нахахлёны,
Дзятлы, чыжыкі, зязюлі,
Кулікі, сяўцы, жаўнулі,
Зяблы, шпакі і цяцеры,
Курапаткі, пер'ем шэры,
Ластаўкі і верабейкі,
І сініцы, салавейкі,
І глушцы ёсць, і удоды,
Што лятаюць без ахвоты,
Над ракамі, ля вадзіцы
Чайкі, чыбісы, пігліцы,
І вядуцца на балотах
Жураўлі ў густых чаротах.
Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэсе спрытна скача,
Хто па кусціках ў садочку,
Хто на полі, хто ў лясочку...
Ці улетку, ці прадвесняй
Слухаць міла іхні песні,—
Пачнуць хорам — не здзівіцца —
Ёсць дзе пець і весяліцца...

## ЗОСЬКА ВЕРАС

Зоська Верас (Людвіка Антонаўна Сівіцкая, па мужу Война) нарадзілася 30 верасня 1892 г. у мястэчку Мяджыбаж Лятычаўскага павета Падольскай губерні (цяпер Ляцічаўскі раён Хмяльніцкай вобласці). Скончыла прыватную жаночую гімназію ў Гродне (1912), агародніцка-пчалярскія курсы ў Варшаве (1914). У 1909—1913 гг. была членам Гродзенскага гуртка беларускай моладзі (загадвала бібліятэкай). У 1916—1917 гг. жыла ў Мінску і разам з М. Багдановічам працавала ў Мінскім камітэце Таварыства помачы ахвярам вайны. З 1923 г. Зоська Верас жыве ў Вільні.

Друкавацца пачала ў 1907 г. у часопісе «Подснежник» (Кіеў). З творамі на беларускай мове выступіла ў часопісе «Наша ніва» ў 1911 г. пад псеўданімам Мірко. Творы З. Верас друкаваліся ў часопісе «Наш шлях» (1922), «Студэнцкая думка» (1924—1925), «Шлях моладзі» (1933—1934).

Зоська Верас — аўтар першага «Беларускага батанічнага слоўніка», які выйшаў у свет у 1924 г. У 1928 г. на свой кошт выдала першы зборнік вершаў М. Машары «Малюнкі», якія былі перададзены ёй з турмы. З 1928 г. была старшынёй Беларускага кааператыўнага таварыства «Пчала». Некаторы час працавала рэдактарам сельскагаспадарчага часопіса «Беларуская борць» (1934—1938).

Зоська Верас была рэдактарам і выдаўцом дзіцячага часопіса «Заранка», які выходзіў па яе ініцыятыве ў Заходняй Беларусі ў 1927—1931 гг.

У 1985 г. выйшла з друку кніга «Каласкі», у якой сабраны лепшыя вершы і апавяданні Зоські Верас.

## СОНЕЙКА ГРЭЕ

Сонейка ты, залатое!
Колькі цёмных, сумных дзён
Мы чакалі, дарагое,
У нашых хатках ля акон
Тваіх ясных цёплых косак,
Твае ласкі і пяшчот,
Што збудзілі б жыццё вёсак,
Поле, траўку, лес, чарот...
Разбудзілі б птушак хоры,
Жаб зялёных грамаду;
Растапілі б снегу горы,
Адагрэлі б і ваду...

*

І прыйшоў вось час жаданы:
Рады мы вясну сустрэць,
Просім сонца край каханы
Абудзіць і абагрэць.

## НА ІМЯНІНЫ

Што за з’ява? Што за дзіва?
Лес і поле, луг і ніва
Зазвінелі ціхім тонам,
Ні то песняй, ні то звонам.

Ціхі голас льецца
Ўверх па горах, ўніз па рэчцы...
Льецца песня — ідуць пары...
Што за дзіва?.. Хіба чары?

Йдзе валошка з шыпшынаю,
Там бяроза з калінаю,
Далей, узяўшыся за лісточкі,
Йдуць стакроткі, як вяночкі...

А за імі брат-сястрычка
І зязюлька невялічка,
Мак чырвоны, драсён белы
І званочкаў букет цэлы.

Йдуць дарогай, йдуць мяжою,
Ўсе спяваюць грамадою;
Усе пахнуць, усе прыбраны
Як у казцы зачараванай.

Аж сонейка ў небе стала.
— А куды ж вы? — запытала,—
На вяселле ці хрысціны?
— Не, на Толі імяніны...

## ПТУШЫНАЯ ЁЛКА

— Юрачка, устань, сынок, і паглядзі ў акно. Уначы снегу нападала.

Юрачка выскачыў з ложка ды хутчэй на зэдлік. Праз акно відаць вялікі кусок свету.

— О-ёй, як бела... Трэба спяшацца.— Нацягнуўшы на сябе чым хутчэй вопратку, не снедаўшы і нават не памыўшыся, Юрачка выскачыў на панадворак. Стаіць і разглядаецца, усё пакрыў белы, лёгкі, мякенькі пух. Ляжыць ён і на страсе, і на паветцы, і на студні, і на платах, і на зямлі. Але найпрыгажэй выглядаюць дрэвы. Кожная галінка мае белы кажушок.

Надакучыла Юрачку стаяць на адным месцы. Хацеў ісці далей, а тут нага глыбока ў снег запала. Адна, пасля другая.

— Во, якія сляды ад ботаў... А тут чый след? Пэўна, татаў, гэткі вялікі... А тут чыя лапка? Гэта коцька ішла... А там — лапа вялікая, гэта след Жучкі...

З хлевушка выйшаў бацька.

— Тата, а тут хто хадзіў?

— Курыца.

— А тут?

— Варона.

— Як на снезе добра ўсё відаць! Як міла кругом, як прыгожа! Татачка, а там на галінцы што сядзіць, нейкі шэранькі клубочак?

— Гэта птушачкі, Юрачка. Яны-то не рады, што снег усё засыпаў, бо не маюць чаго есці. Ні зярнятка нідзе не знойдуць. Ды і зімна ім, маленькім. Бачыш, як наставілі пёркі?..

Засумаваў Юрачка ды моцна задумаўся... Як шкода птушачак! Апусціўшы галоўку, пайшоў у хату, бо мама клікала снедаць. Але і п'ючы малачко і еўшы зацірку, усё думаў аб бедных, галодных птушках. Пад'еўшы, пабег да суседняга хлопчыка Вінцуся. Вінцусь быў большы, напэўна парадзіць, як памагчы птушкам.

— Што ж, Юрачка,— прывітаў Вінцусь таварыша,— на саначкі пойдзем?

— На саначкі пойдзем, але, ведаеш, Вінцусь, птушкі, бедныя, не маюць чаго есці.

— Ну дык што ж?

— Як што ж? Табе іх не шкада?

— Чаму не шкада? Шкада. Але адно шкадаванне не паможа. Трэба іх накарміць!..

— Накормім, накормім! — усцешыўся Юрачка.— А чым?

— Э, гэта не бяда. Знойдзецца чым. Назбіраем крошак хлеба, крыху рознага збожжа... Наш Юзік назбіраў розных ягад, зярнятак. Усё вісіць у каморы.

Пайсці ў камору, прынесці запасы было справай аднае хвіліны.

— А дзе мы ім пасыпем? У снег няможна, бо не знойдуць,— непакоіўся Юрачка.

— Не, не ў снег, на дошчачку, а дошчачку на дрэва павесім... Ведаеш, Юрачка, на гэтай ялінцы, што каля плота расце...

— Дык гэта будзе птушыная ёлка?

— Ну, ідзём...

Умоманцік знайшліся і дошчачка, і шнуркі, і дроцікі, ды ўсё, што было патрэбна, і пачалося прыбіранне «ёлкі». Добра такі хлопчыкі намучыліся, пакуль усё наладзілі. Але затое якая багатая была «ёлка» і колькі на ёй розных прысмакаў: на дошчачцы ляжалі крошкі хлеба, зярняты маку, жыта, ячменю, канопляў, сланечніку, лёну. На галінках віселі пучкі асоту, чырванелі букецікі рабіны, чарнелі пацеркі ягад белага бэзу... Нават пару кусочкаў саланіны знайшлося ды нейкая костка з жылкамі.

Рады былі хлопчыкі са сваёй работы і паспяшаліся схавацца,

каб чаканыя госцейкі не баяліся ды хутчэй браліся за ежу.

Птушкі даўно заўважылі, што каля ялінкі нешта цікавае робіцца, але не мелі адвагі падляцець бліжэй. Прысутнасць дзяцей іх палохала.

Ды толькі хлопчыкі ўвайшлі ў хату, паміж птушкамі пачаўся рух. Пералятаючы з галінкі на галінку, з дрэва на дрэва, памаленечку шэрая грамадка набліжалася да цудоўнай «ёлкі». Ужо зусім блізка. Адзін пералёт — і смачнае зярнятка было б у галоднай дзюбцы! А можа, смачнейшая была б тая бурая крошачка? Але як адважыцца? А можа, там прыгатавана сіло?.. Не, лепш не глядзець на гэтую спакусу... Ды як хочацца есці!..

Нарэшце адзін стары верабей пастанавіў для дабра ўсёй грамады адважыцца і падляцець блізка.

Пррр... І вось ён каля ялінкі.

Здаецца, усё ціха. Трэба паспрабаваць нешта з'есці... Падляцеў, ухапіў канаплянае зярнятка і хутчэй наўцёкі... Маленечкае сэрца моцна, моцна б'ецца... Ды дарма: ніхто не злавіла, не трымае. Значыцца, усё добра. Галасна зачырыкаў верабейка, і на яго кліч уся грамада зрушылася з месца. Падняўся гвалт, піск, чырыканне — усе апынуліся на ялінцы ды давай падмацоўвацца! Толькі зярняткі трашчалі...

За гадзіну на ялінцы не знаць было галінак. Каго, каго там не было! І сінічкі, шчыглікі, і чыжыкі, і вераб'і, нават сойкі, сарокі і вароны. Апошнім найбольш падабалася костка.

Але яна была толькі адна, а варон шмат, таму ўшчыналіся сваркі...

Праз акно, шчасліва ўсміхаючыся, паглядалі на сваіх госцейкаў Юрачка і Вінцусь.

Нарэшце Вінцусь адазваўся:

— Ведаеш, Юрка, трэба нам пайсці па ўсёй вёсцы і намаўляць дзяцей, каб і яны прыбіралі для птушак «ёлкі». Мы ўдвух гэтакай грамады не пракормім, да вясны далёка...

## КУЗЬМА ЧОРНЫ

Таленавіты мастак слова, празаік, драматург і публіцыст Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) нарадзіўся 24 чэрвеня 1900 г. у маёнтку Боркі на Случчыне. У 1908 г. бацькі яго вярнуліся на сваю радзіму — у мястэчка Цімкавічы (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці). Закончыўшы Цімкавіцкае народнае вучылішча, будучы пісьменнік паступіў у 1916 г. у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, але закончыць яе перашкодзіла белапольская акупацыя. Пасля выгнання інтэрвентаў у 1920 г. К. Чорны працаваў спачатку ў ваенным аддзеле Цімкавіцкага валаснога рэўкома, а пасля — у Слуцкім павятовым ваенкамаце. Некаторы час быў настаўнікам Цімкавіцкай школы. У 1923 г. паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, але пасля другога курса, захварэўшы на сухоты, пакінуў вучобу. На працягу 1924—1928 гг. працаваў у рэдакцыі газеты «Беларуская вёска». Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», потым «Узвышша».

Літаратурная дзейнасць К. Чорнага пачалася ў 1923 г., калі ў газеце «Савецкая Беларусь» былі змешчаны яго верш «Роднае поле», а потым апавяданне «На граніцы». У 20-я гг. выходзяць зборнікі твораў пісьменніка «Апавяданні» (1925), «Срэбра жыцця» (1925), «Па дарозе» (1926), «Пачуцці» (1926), «Хвоі гавораць»

(1926), «Вераснёвыя ночы» (1929). Акрамя апавяданняў, выйшлі аповесці і раманы «Сястра» (1927), «Зямля» (1928), «Лявон Бушмар» (1929), «Ідзі, ідзі» (1930), «Бацькаўшчына» (1931), «Трыццаць год» (1934), «Трэцяе пакаленне» (1935), «Люба Лук'янская» (1936). Пяру К. Чорнага належаць таксама п'есы «Бацькаўшчына» (1932, па аднайменнаму раману), «Лета» (1932, па аповесці «Вясна»), «Ірынка» (1940).

У гады Вялікай Айчыннай вайны К. Чорны працаваў у газеце «Савецкая Беларусь» і газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1942 г. выйшла кніга яго фельетонаў «Кат у белай манішцы», а ў 1945 г.— зборнік апавяданняў «Вялікае сэрца». Адначасова пісьменнік працаваў над раманамі «Пошукі будучыні» (закончыў у 1943 г.), «Вялікі дзень» і аповесцю «Скіп'ёўскі лес» (засталіся няскончанымі).

Для дзяцей К. Чорны пачаў пісаць у пачатку 20-х гг. Верш «К дзецям» і апавяданне «Гузік» былі надрукаваны ў першым нумары дзіцячага часопіса «Зоркі» за 1921 г. Юнаму чытачу адрасаваны яго творы «Як дзядзька Тамаш напалохаў ваўкоў» (1937), «Дарагуся» (1939), «Сцяпанавы дзеці» (1939), «Насцечка» (1940), «Маленькая жанчына» (1942).

К. Чорны вядомы і як перакладчык твораў А. Пушкіна, У. Караленкі, М. Гогаля, А. Астроўскага, М. Горкага і іншых пісьменнікаў. Творы Чорнага перакладзены на шмат якія мовы народаў СССР і некаторыя мовы зарубежных краін.

Памёр Кузьма Чорны 22 лістапада 1944 г.

## ЮЗІК І ЯГОРКА

За горадам на ўзгорку, абведзеная старымі платамі агародаў, стаіць вёска Агароднікі. Каля яе, пад горкаю, жаўцеюць ямы глінішча, дзе людзі бяруць гліну. У глінішчах многа і жоўтага пяску, у якім кожны дзень перасыпаюцца і купаюцца вясковыя дзеці.

А то ў іх яшчэ ёсць і другая забава. За платамі расце многа лопуху і чартапалоху, а на гэтым зеллі вельмі многа, як кажуць, ваўчкоў, якія вельмі добра чапляюцца за ўсё і за кожнага.

Вось тут і капошацца дзеці, рвуць ваўчкі ды кідаюць адзін на аднаго ці на якога-небудзь дзядзьку, які часам пройдзе каля платоў за гумнамі.

А то часам яшчэ пазавуць дзеці якога-небудзь спакойнага касматага сабаку з вуліцы ды ўвапхнуць яго ў лопух. Дык той небарак, як выскачыць адтуль, дык хоць ты яго тапіць вядзі — сам да сябе непадобен: увесь, як чорт, аблеплены ваўчкамі, уся шэрсць, як у гузах — і ў галаве, і на спіне, і ў хвасце. Кінецца ён, перапалоханы, з усіх чатырох уцякаць, хвост падтуліўшы, а дзецям радасць. Рагочуць яны — аж агароды за гумнамі звіняць.

* * *

Разам з усімі дзецьмі заўсёды гуляе і Юзік з Аленкаю — брат і сястра. Юзік трохі большы за Аленку — яму ўжо восьмы год, а Аленцы ўсяго пяць. Часам, перасыпаючыся ў пяску, Аленка пакоціцца ды, спалохаўшыся таго, што ўпала, пачне плакаць, а Юзік тады яе паднімае ды ўгаворвае, каб не плакала. Іншыя хлапчукі памагаюць Юзіку, а іншыя смяюцца з яго. Усяк бывае.

Жывуць Юзік з Аленкаю зусім у старой хаце. А тут жа побач, у другой хаце, жыве Юзікаў таварыш па гульні і сусед — Ягорка. Ягорка старэйшы за Юзіка на два гады — яму ўжо дзесяты год.

Ягорка яшчэ таксама разам з Юзікам купаецца ў пяску ды ўцягае сабаку ў лопух, але ўсё ж Ягорка ўжо часам уздумае паказаць, што ён ужо сталы чалавек.

Каля Ягоркавае хаты ляжыць куча дзерава, дык вось Ягорка часам раніцаю, важна ўзяўшыся ў бакі, выйдзе з хаты, сядзе на дзерава ды, як стары ўсё роўна, плюне праз зубы на зямлю і заспявае важна тую песню, якую часта спяваюць старыя.

Ягорка яшчэ не можа выгаварыць акуратна гук «ч», і ў яго песня выходзіць так:

Ой, у полі-полі
Карцомка стая-а-а-ла.
Трай-рай, ра-та-тай,
Карцомка стаяла!...

А Юзік стаіць збоку ды ад зайздрасці падражніваецца:

— Думаеш, вельмі ўжо на старога падобен. Яй-права, не. Смаркач малы!..

— Маўчы, Юзік-гузік,— адказвае Ягорка і заварочваецца ў другі бок. Бо хіба ж патрэбна сталаму чалавеку гаварыць з блазнотаю?!

* * *

Пасля зімы ішла вясна. На вуліцы падсыхала гразь, па гразі шпацыравалі свінні ды куры, а пеўні гарланілі на ўсю вуліцу, палохаючы вераб'ёў. А можа, вераб'і гэтага і не палохаліся, але так адляталі, з далікатнасці.

Старыя ўжо рыхтаваліся ехаць у поле — Юзікаў бацька і Ягоркаў майстравалі драбіны ў двары, аглядалі плугі ды кожны дзень давалі сваім конікам па гарцу аўса з сечкаю, каб моцныя сталі к рабоце.

Малым жа была адна любата на вуліцы!..

Тут табе і лужына — можна пабоўтацца, тут табе і з гусаком падражніцца; толькі бяда, што няма яшчэ лопуху — няма куды сабаку ўвапхнуць.

Сонца свеціць — усё роўна як бы смяецца зямлі. Загэтым і весна так.

І вось у такі дзень прыехалі з горада піянеры. Вясёлыя хлапчукі з чырвонымі гальштукамі. Яны зразу напоўнілі вуліцу песнямі, смехам. Цэлы атрад іх. А з імі павадыр, камсамолец.

Збіліся ўсе вясковыя дзеці, а Ягорка нават забыўся, што ён сталы чалавек, ды, падкасаўшыся, ва весь дух драпануў з дзерава к канцу вуліцы, дзе ўсе пачалі збірацца. Напрыходзілі і старыя.

Колькі было гаворак, колькі пытанняў! І нарэшце ў вёсцы арганізаваўся піянерскі атрад, і Ягорка стаў настаяшчым піянерам. Ужо ён зусім важна пазірае вакол сябе і спявае іншую песню:

Стала восем мне гадоў —
Піянерам быць гатоў...

Юзік яшчэ не папаў у піянеры, бо малым яшчэ яго зусім прызналі. Але затое ён зусім блізкім таварышам стаў Ягоркавым, такім, якім ніколі не быў.

Калі Ягорка, залажыўшы рукі ў кішэні, выйдзе на сонца каля хаты пастаяць ды падумаць аб сваіх піянерскіх справах, Юзік заўсёды па-

дыходзіць к яму, і пачынаюць яны гаварыць. Ягорка растлумачвае Юзіку, як гэта трэба маршыраваць, бо сам ён ужо маршыруе не горш чырвонаармейца.

А тым часам Юзік слухае, і яму весела.

— А калі мне ўжо можна будзе запісацца ў піянеры? — пытае ён у Ягоркі.

— А колькі табе год? — пытае Ягорка.

— Увосень скончыцца дзесяць.

— Ну дык налета ўвосень ужо ты будзеш у піянерах,— гаварыў Ягорка,— будзем тады разам у атрадзе.

І Юзік зусім рад.

— Вось толькі ці дазволіць тата,— гаворыць задумлёны Юзік.

— А-я-яй, вельмі ўжо татка гэтакі знаток,— важна, як стары чалавек, адказвае Ягорка і, пачакаўшы, дабаўляе: — Пусціць, я табе кажу.

І тады Юзік бяжыць, падскакваючы, дамоў. Дома ён, гуляючы з Аленкаю, спявае песню:

Зюра-зюра-зюравей!..

А як піянерскі атрад ідзе па вуліцы, Юзік выбягае з хаты, бяжыць услед і думае:

«Каб хаця скарэй тая восень, калі я стану піянерам».

## НАСЦЕЧКА

### Аповесць

*(Скарочана)*

### I

Нейк раптам усе пачалі заўважаць высокага старога чалавека. Ён часта відзён быў на тых вуліцах, што ляжаць каля гарадскога рынку. Гэты чалавек хадзіў павольна, быццам аб нечым раздумваючы, цвёрда апіраўся на выгнутую з маладога дубка палку, і заўсёды здавалася, што ён гэта не так сабе ходзіць, а мае нейкую справу. Раней яго не заўважалі. Вельмі можа быць, што ён толькі нядаўна стаў жыць тут.

Была восень. Надвор'е стаяла мокрае, і вецер найчасцей павяваў ужо холадам. Стары чалавек заўсёды хадзіў адзеты ў паношанае цёмнае паліто, на яго быццам караткаватае, з цёплым каўняром. У яго была зусім сівая, маленькая, нізка падстрыжаная бародка і такія сівыя выбіваліся з-пад суконнай шапкі валасы каля вушэй. Лоб яго быў высокі, нос арліны, і вочы, нягледзячы на старасць, ясныя. Відаць было, што ён ад старасці не вельмі ўжо моцны, але і ў паходцы яго, і ў выразе твару было нешта цвёрдае. Здавалася, што чалавек гэты нечым ганарыцца. Не то што ён быў горды перад людзьмі. Не. Наадварот. З выгляду ён быў ветлівы да ўсіх.

Адзін раз ён убачыў, як конь не мог зрушыць з месца цяжкі

воз з дровамі і фурманшчык біў каня пугаўём па шыі і жываце. Стары чалавек адразу падбег да фурманшчыка і моцна сказаў:

— Якое ж у цябе сэрца, калі ты не шкадуеш жывёлы?.. Ды і сам сабе ты гэтым горш зробіш, калі змарнуеш каня. Чаго стаіце? — Тут ён павярнуўся тварам да натоўпу.— Ты там, маладзейшы, падштурхні воз плячом, яго абы з месца зрушыць...

Маладзейшы падштурхнуў воз плячом, і конь лёгка пайшоў. Стары чалавек рушыў у сваю дарогу, і на твары яго доўга трымалася ўсмешка. Здавалася, што гэты чалавек добра ведае, што ён сам варт на свеце.

На вуліцы яго бачылі кожны дзень па некалькі разоў. Зранку ён ішоў з накрытым газетай кошыкам. Удзень ішоў з пустымі рукамі, але таксама, як і зранку, здавалася, што ён некуды спяшаецца. А перад вечарам, на змроку дня, ішоў вельмі павольна, пастукваў дубовай палкай на тратуары; часам спыняўся і стаяў на адным месцы, гледзячы на якое-небудзь дрэва або на гурт вясёлых дзяцей. Пасля, быццам адумаўшыся, ішоў далей, даходзіў да якога-небудзь завулка і варочаўся назад, робячы па тратуары сваю праходку.

Аднойчы на тым самым тратуары гулялі дзеці. Хоць, калі сказаць праўду,— гэта была не зусім гульня. Каля зялёнай брамы ў зарослым дрэвамі двары стаялі тры дзяўчынкі і каля іх пакручваўся, на галоў дзве вышэйшы за кожную з іх, хлапчук. Ён быў высокі ростам, яму ўжо магло быць год чатырнаццаць. Дзяўчаткам было год па трынаццаць кожнай.

Адзеты ён быў не то што лепш за тых дзяўчатак, з якімі бесперапынна зачэпаўся, але на ім усё ляжала нейк гладчэй, спрытней, дасціпней. Ён быў у высокіх боціках з бліскучымі мяккімі халяўкамі, на паліто каўнерык з нейкага шэранькага звярка. Ніводнай мінуты ён не мог устаяць на месцы. Ён усё круціўся на адной назе і за кожным паваротам даваў у галаву каторай-небудзь дзяўчынцы пстрычку. І кожны раз дзяўчаткі хорам крычалі яму:

— Серж, мы цябе не чапаем. Пусці, нам трэба ісці.

— Ідзіце,— гаварыў Серж, і калі дзяўчаткі, узяўшыся пад рукі, ішлі, ён зноў даваў каторай-небудзь з іх пстрычку ў галаву, і яны адступалі на ранейшае месца.

І ў гэты момант у вачах яго свяцілася гэтулькі самаздавальнення, гэтулькі ўцехі з самога сябе, што здавалася,— гэты маладзенькі францік зараз заплюе вочы ўсяму свету і скажа:

— Эй вы, бачыце, які я спрытны і харошы. А вы ўсе перада мной нейкія пачвары і больш нічога.

— Пусці, нам трэба ісці,— запішчалі дзяўчаткі.

— Ідзіце,— сказаў Серж.

Дзяўчаткі пайшлі, але Серж у момант вока перакруціўся на адной назе і даў самай меншай дзяўчынцы такую пстрычку ў лоб, што тая крыкнула і моцна заплакала.

— Ён жа адзін, а нас трое,— крыкнула самая большая,— чаго мы будзем яго баяцца?

Самая меншая не пакідала плакаць. Серж падбег да самай большай з гнеўным крыкам:

— Вы не будзеце мяне баяцца?

І намерыўся ўжо даць пстрычку ў галаву большай, але тая яго так пхнула ад сябе, што ён хіснуўся з тратуара і ўпаў на адно калена ў лужу. Дзяўчаткі зарагаталі, падхапіўшы пад рукі сваю меншую сяброўку, пабеглі наўцёкі. Серж усхапіўся на ногі і тут жа ўбачыў, што яго калена і прыгожая халяўка ўся ў гразі. Поўны злосці, ён дагнаў дзяўчатак і з усяго размаху пхнуў у плечы самую большую, а пасля і самую меншую. Яны абедзве ўпалі на тратуар, і меншая так далася тварам аб мокрую асфальтавую пліту, што з носа і дзяснаў у яе пацякла кроў. Убачыўшы гэта, Серж спалохаўся, але, каб не паказаць віду, закрычаў:

— Вось табе, цяпер будзеш памятаць.

І кінуўся ўцякаць дадому, але ў гэты час нечая моцная рука хапіла яго за плячо і над яго галавой прагучэў басавіты голас:

— Ах ты, хуліган, што гэта ты нарабіў?

Серж падняў угару вочы і ўбачыў, што яго трымае той самы стары і высокі чалавек, якога ён прывык кожны дзень бачыць на гэтай самай вуліцы.

— Пусці! — закрычаў Серж, рвануўшыся з усёй сілы.

— Не, ты раней скажаш, як ты завешся і з якой ты школы, тады я цябе пушчу,— адказаў стары чалавек.

— Ён завецца Серж, а вучыцца разам з намі: у дваццатай школе,— запішчалі дзяўчаткі.

— Ідзі, хуліган,— гнеўна сказаў стары чалавек, пускаючы Сержа.

Дзяўчаткі павялі сваю скрываўленую сяброўку да яе дома, а Серж, з паважным выглядам нявіннага пакутніка, паволі адышоўся ад старога чалавека на некалькі крокаў і засвістаў. Стары чалавек моўчкі паківаў галавой і хацеў ужо ісці, але Серж раптам крыкнуў яму:

— Стары чорт! Ты вечарам стаіш на вуліцы і на месяц глядзіш, як дурань. Ты думаеш, я цябе баюся?

І Серж пабег, азіраючыся, а стары чалавек доўга стаяў і ківаў галавой.

⟨...⟩

## II

Якраз каля таго часу, калі на вуліцах відзён стаў высокі стары чалавек, у дваццатай школе з'явілася новая вучаніца Насця Закрэўская. Ёй ішоў трынаццаты год, і вучылася яна ў пятым класе. Раней у гэтай школе яна ніколі не вучылася і калі прыйшла з пачатку восені запісацца ў пяты клас, то сказала, што толькі нядаўна пераехала жыць у гэты горад.

Насця, ці, як пасля ўсе ў школе яе пачалі зваць, Насцечка, была бойкая і рухавая дзяўчынка, белатварая, з густымі валасамі, якія роўна ляжалі на яе галаве пад грабянцом. Да самых халадоў яна прыходзіла ў школу ў шарсцяной кофтачцы, шэрай, у карычневыя палоскі, а калі стала халадней,— пачала адзяваць на кофтачку чорнае ватовае паліто з простым бобрыкавым каўнярком і вузенькім суконным паяском.

Яна не была чым-небудзь адметнейшая ад іншых дзяцей. Таксама, як і ўсе, любіла бегаць на дварэ на вялікім перапынку, любіла слухаць расказы, гуляла ва ўсе гульні, у якія толькі гулялі дзеці, і заўсёды ўносіла ў гэтыя гульні весялосць: яна любіла парагатаць. Яе звонкі голас і смех чуліся заўсёды,— ці то ў калідоры, ці то на дварэ. Яна мела прывычку часта гаварыць: «Ой, дзевачкі!» Часамі, бегучы, спатыкнецца і ўпадзе, і тады закрычыць:

— Ой, дзевачкі, я так далася каленам.

Вучылася яна вельмі добра. Яна старалася вучыцца. Нешта дні праз два пасля здарэння на вуліцы паміж Сержам і старым чалавекам у пятым класе вучні рабілі арыфметычныя прыклады. Адзін прыклад асабліва здаўся цяжкім бадай што ўсяму класу. Насця Закрэўская стаяла ля класнай дошкі, ціснула ў пальцах крэйду, глядзела на слупок выпісаных ёю на дошцы лічбаў і думала. Нешта ў яе тут не выходзіла. Дзеці глядзелі ў свае сшыткі. Настаўніца сказала да ўсяго класа:

— Хто зрабіў прыклад?

— Я,— абазвалася адразу некалькі галасоў. Абазваўся таксама і Серж.

— Правільна робіць прыклад Насця? — запытала настаўніца.

— Правільна,— пачуўся голас.

— Не, няправільна,— крыкнуў Серж.

— Адзін кажа: «правільна», а другі — «няправільна»,— сказала настаўніца.— А ты, Насця, рабі да канца так, як пачала.

— Яна няправільна робіць! — закрычаў Серж.— Я ўжо зрабіў і ведаю. Я выйду за яе зраблю, яна не зробіць.

— Цябе не выклікалі да дошкі, ты і сядзі,— пакрыўдзілася Насця.— Я сама без цябе зраблю.

— Ты не зробіш! — аж падскочыў Серж.

— Дзеці, ціха! — моцна сказала настаўніца.

— Яна толькі будзе час траціць і не зробіць, а я зраблю! — ужо зусім крыкнуў Серж.

Зняважаная Насця злосна глянула на Сержа і зачырванелася. Серж кпліва на яе глядзеў з гордым выглядам ад таго, што ён больш ведае за Насцю.

— Сядзі, Серж, на месцы і маўчы. Ты перашкаджаеш Насці і ўсім,— сказала настаўніца.

У Сержа была такая натура, што ён прывык лічыць сябе лепшым і разумнейшым за ўсіх на свеце. Ён з такой пагардай глянуў на настаўніцу і пасля на Насцю, што настаўніца адчула ў душы прыкрасць.

У Сержавым позірку было штосьці ўжо не дзіцячае. Здавалася, што на настаўніцу глядзіць дарослы чалавек, але па-дзіцячаму распешчаны і свавольны. Настаўніца на гэты раз змаўчала і перавяла вочы на Насцю, якая ў гэты час шпарка пісала на дошцы лічбы. У знак пратэсту супроць таго, што яму больш не аддаюць увагі, Серж скамячыў кавалачак паперы, пажаваў яе і пстрыкнуў пальцамі гэтыя мокрыя жовіны ў акно. Настаўніца ўстала са свайго месца і падышла да Сержа. Грозна яна сказала яму:

— Калі ты не пакінеш хуліганіць, я табе зараз загадаю выйсці з класа.

— Што, хіба я хуліганю? — сказаў Серж і зрабіў нявінныя, ягнячыя вочы.— Я зрабіў прыклад.

— Калі зрабіў, дык нашто сваволіць?

— Я зрабіла,— сказала Насця.

Настаўніца паглядзела на дошку і запытала ў класа:

— Правільна яна зрабіла?

— Правільна,— сказалі галасы.

— Няправільна,— сказалі другія галасы.

— Серж, правільна яна зрабіла? — запытала настаўніца.

— Не,— самаўпэўнена адказаў Серж.

— Ідзі, зрабі правільна.

З паважным выглядам Серж выйшаў да дошкі і пачаў пісаць лічбы па-свойму. Але неўзабаве ён заблытаўся, падбег да свайго месца і ўзяў свой сшытак.

— А ты цяпер нанава зрабі,— сказала настаўніца.

— Я ўжо зрабіў, нашто мне другі раз рабіць?

І ён перапісаў на дошку тое, што было ў яго сшытку. Настаўніца дала некалькі пытанняў, дзеці на іх адказалі і раптам зразумелі ўсё. Насця дагэтуль стаяла каля дошкі збянтэжаная, думаючы, што, можа, гэта ў яе няправільна, а ў Сержа правільна. А цяпер яна радасна паглядзела на Сержа.

— У Насці правільна,— крычаў увесь клас.

У гэты час зазвінеў званок, але настаўніца яшчэ паспела сказаць Сержу:

— Ты не прывыкаеш працаваць, а думаеш, што ты больш і лепш за ўсіх ведаеш. Ты няправільна зрабіў, а Насця правільна. А ты самаўпэўнена зневажаў яе. А калі я сказала табе, каб ты сядзеў ціха, ты і мяне пачаў зневажаць і ўвесь клас сваім хуліганствам. 〈...〉

Ён хацеў, каб кожнае яго слова было законам для ўсіх, а калі хто пярэчыў яму, ён аж кіпеў ад злосці і пагражаў, што паскардзіцца свайму бацьку. А бацька яго, як ён думаў, мае права і павінен зрабіць усё, што яму, Сержу, захочацца.

Серж доўга стаяў за вуглом, раздумваючы аб сваёй няшчаснай асобе. Усялякія смелыя планы складаліся ў яго галаве. Ён павінен паказаць сябе перад усімі імі. А ўсе яны — гэта былі: Насця і, перш за ўсё, той невядомы высокі стары чалавек, які, як здань, заўсёды з'яўляецца перад ім на вуліцы і ўмешваецца ў яго справы. Выбух злосці да гэтага старога апанаваў Сержа. І што такое гэтая нейкая Насця? Што яна варта перад ім, перад Сержам? Нейкая драбяза. Чым яна такая выдатная? Вось дык гераіня! Ён хацеў не так перад ёю, як перад усім класам, паказаць сябе, а выйшла так, што быццам гэта не ён разумнейшы і важнейшы перад усімі, а яна. Яна спакойна і вытрымана працавала каля дошкі і ўзяла верх над ім, а ён сваім крыкам і самаўпэўненасцю дайшоў да таго, што яго абсмяялі. Ён. пакажа ім усім — і старому, і Насці, і настаўніцы,— што яны нічога не варты перад ім, а ён мае права распараджацца ўсім светам.

Вось ад гэтага ўсяго і мучыўся Серж, стоячы за вуглом. Свет яму не быў мілы. Надыходзіў вечар, а ён усё стаяў. Выйшаўшы пасля на вуліцу, ён убачыў на тратуары свайго аднакласніка — белабрысага Мішку. Гэты Мішка вельмі ўзрадаваўся, калі апынуўся каля Сержа. Шырока расцягнуўшы ад усмешкі твар, ён сказаў:

— Я думаў, што ты дадому ўцёк, а ты тут быў. Што ты тут так доўга рабіў?

— А ты раней мяне бачыў?

— Дзіва што бачыў. Я унь там ішоў, як гэты стары трос цябе за плячо.

І Мішка пляснуў сябе па халяве тоўстым скруткам тэлефоннага шнура.

— Дзе ж ты гэты шнур узяў? — хрыплым голасам абазваўся Серж, каб абы перавесці гаворку на што-небудзь іншае. Гэта ж вельмі дрэнныя справы, што яго ганьбу бачылі і на вуліцы людзі.

— Гэты стары зноў тут ходзіць,— не пакідаў свае гаворкі белабрысы Мішка.— Толькі што ён у тым завулку ў краме купляў яблыкі...

— Адрэж мне палавіну гэтага шнура.

— Хітранькі. А што ты мне дасі за гэта?

Сержу ніякага шнура не трэба было. Яму абы што гаварыць. Яны паволі ўжо ішлі тратуарам. Мішка кпліва і хітра паглядаў на Сержа, і таму гэта было горш за ўсё. Ён ведаў, што назаўтра Мішка на ўсю школу разнясе навіну, што яго на вуліцы трэслі за плячо. Ды каб жа толькі трэслі. Гэты было б яшчэ нічога. Але Мішка не такі хлопец, каб сказаць так, як яно было сапраўды. Ён у дзесяць разоў яшчэ ад сябе дадасць таго, чаго зусім не было. Ён будзе расказваць, што гэты стары круціў яго за вушы, цягаў за валасы. І расказваць будзе са страшэнным рогатам, а гледзячы на яго, і ўсе будуць рагатаць. Такой ганьбы і няславы Серж не мог вытрымаць.

Яны дайшлі ўжо да самага чыгуначнага пераезду.

— Унь ён! — гукнуў белабрысы Мішка.

Серж азірнуўся. За крокаў трыста ад сябе, у святле вулічнай лямпы, ён убачыў высокага старога. Той паволі сабе ішоў і еў яблык.

— Хадзем хутчэй, каб ён нас не дагнаў,— прагаварыў Серж.

— Дык сыдзі ўбок, калі ты яго баішся,— кпліва сказаў Мішка і зарагатаў.

Сержа як падмыла кіпнем. Ён тузануў Мішку за руку і прашаптаў яму:

— Я ведаю, дзе ён жыве. Хадзем, ты толькі мне кавалак гэтага шнура дасі.

Серж ужо ведаў, што ён будзе рабіць. Мішка заўтра будзе расказваць пра яго, як пра героя, як пра смельчака, а не як пра баязліўца, якога трэслі за плячо. Белабрысы Мішка хоць і шкадаваў шнура, хоць і не ведаў, што будзе рабіць Серж, але вельмі ахвотна пайшоў са сваім паплечнікам, адчуваючы, што тут можа быць нешта для яго цікавае.

— Што ты будзеш рабіць? — запытаў Мішка.

— Я перапну шнурам у дзвярах, каб ён упаў,— растлумачыў Серж.— Ты адарвеш мне кавалак шнура.

Калі яны дайшлі да вядомага Сержу дома, Мішка сам узяўся наладжваць справу. З трухлявай дошкі ў плоце ён дастаў цвік і ўбіў яго ў вушак заўсёды адчыненых калідорных дзвярэй. Пасля іржавай бляшкай перапілаваў шнур. Серж вырваў кавалак шнура з Мішкавых рук: яму хацелася самому дзейнічаць, а то гэта ж будзе Мішкава геройства, а не яго. Ён завязаў за цвік адным канцом шнур, а другі канец ужо сам Мішка працягнуў за вугал дома. Удвух яны хаваліся там. Шнур ляжаў на зямлі, і хто ішоў у калідор ці з калідора, то або ступаў на яго, або пераступаў. Найбольш шпагат пераступалі, бо на ўваходзе ў калідор стаяла вада ад дажджоў. Лужа была неглыбокая, але кожны стараўся абысці яе бокам, паўз сцяну. Мінут дзесяць Серж з белабрысым Мішкам чакалі за вуглом, сутуліўшыся, як шчанюкі, і, нарэшце, убачылі, як стары чалавек варочаўся са свайго спацыра. Ён падышоў да адчыненых калідорных дзвярэй, паглядзеў на цёмнае акно ў сцяне побач з дзвярыма і прагуў сам сабе пад нос:

— У акне цёмна, малая недзе забавілася. Што ж такое, што яна яшчэ не прыйшла?

І ступіў цераз лужу ў калідор, але ў той жа момант Серж з Мішкам нацягнулі шнур. Чалавек усім размахам нагі вытнуўся аб яго і ўпаў у самых дзвярах. Ногі яго паехалі назад на двор, і нагамі і жыватом ён апынуўся ў вадзе. Пакуль ён устаў, прайшло, можа, мінуты дзве, і ў гэты момант Серж, не могучы стрымаць свае радасці, зарагатаў за вуглом. Стары ўзняўся на ногі, а Серж, забыўшыся на ўсё, не пакідаў рагатаць і пасля, следам за Мішкам, кінуўся бегчы. Але ў гэты момант з-за рога вуліцы ў завулак завярнуўся аўтамабіль і асвяціў двух хуліганаў фарамі. У яркім святле Серж перабег вуліцу, а стары чалавек глядзеў на яго і пазнаў яго. Пасля гэтага чалавек, стогнучы і ацепваючыся ад вады, увайшоў у калідор, дастаў з кішэні ключ і доўга бразгаў ім, пакуль адамкнуў дзверы ў свой пакой. Ён засвяціў над сталом электрычную лямпачку і пачаў скідаць з сябе мокрае паліто. І ўсё гуў сам сабе пад нос:

— Дзе ж гэта малая так загулялася, дзе ж гэта яна дагэтуль?

Пакуль ён пераадзеўся ў сухое, пакуль паставіў грэць чайнік, каб гарачым чаем сагрэцца пасля халоднай вады, у якую ён упаў праз Сержа, стары чалавек адчуў холад ва ўсім целе. Стаўшы плячом да печы, ён стараўся абагрэцца. Яго пачала хіліць дрымота, у касцях стала ламаць, ён прылёг на пасцель і нацягнуў на галаву коўдру. Праз некалькі мінут ён спаў, не прычакаўшы чаю.

## III

Усе ў школе пачалі заўважаць, што з Насцяй пачало рабіцца нешта нязвычнае, чаго з ёй раней ніколі не было. Яна заўсёды была самая ўзорная вучаніца, а гэта пачала пазніцца ў школу. Яна была заўсёды самая акуратная ва ўсім, а гэта стала прыходзіць у школу з растрапанымі валасамі і ў перапынку паміж урокамі канчала сваю

прычоску. А адзін раз на вялікім перапынку яна паспела некуды са школы збегаць і прынесці ў школу нечага поўную торбу і палажыла ў парту разам са сваімі кнігамі. Гэта было дзён праз чатыры пасля таго, калі Серж з белабрысым Мішкам перапінаді шнуром уваход у дом, дзе жыў стары высокі чалавек. У адзін з гэтых дзён, зранку, Серж папрасіў у бацькі пяць рублёў. Бацька збіраўся ісці на работу і спешна пераглядаў нейкія паперы і складваў іх у партфель.

— Нашто табе пяць рублёў? — мармытнуў сабе пад нос бацька, заняты сваімі справамі.

— Трэба.

— Не трэба табе так многа.

— Ай, трэба! — закрычаў Серж такім піскклівым і прарэзлівым голасам, што бацька заткнуў рукамі вушы, пасля выхапіў з кішэні пяць рублёў і кінуў Сержу, а сам зноў паглыбіўся ў свае паперы.

Узрадаваны поспехам, Серж зноў сказаў:

— Я сёння хачу паехаць у школу на машыне.

— Не свавольнічай, ідзі так, як усе дзеці,— мармытнуў сабе пад нос бацька.

— Ай! На машыне! — яўкнуў Серж мацней яшчэ, як першы раз, і з радасцю ўбачыў, што бацька зноў заткнуў вушы.

— Ай, ехаць на машыне! — запішчаў ён другі раз і яшчэ з большай радасцю ўбачыў, што бацька ўсхапіўся са свайго месца і выбег у другі пакой, дзе чакаў шафёр, каб неўзабаве везці Сержавага бацьку на працу.

— Завязіце яго ў школу, ён мне жыць не дае, гэты чарцюк,— сказаў бацька шафёру і пабег да сваіх папераў.

Падміргнуўшы некуды ў цёмны кут калідора, Серж пайшоў садзіцца ў машыну.

З вельмі паважным выглядам ён падкаціў на машыне да школы і вылез з яе. Ён аж млеў ад шчасця, бачачы, як машыну акружылі натоўпам яго аднакласнікі. Так, як робяць вялікія начальнікі (ён гэта некалькі разоў бачыў), ён махнуў шафёру рукой, хоць шафёр і без гэтага ўжо заварачваў машыну.

Да заняткаў было яшчэ мінут дзесяць. Серж падышоў да буфета і запатрабаваў у буфетчыцы яблык, цукерак і пернікаў на ўсе пяць рублёў.

— Нашто табе так многа? — сказала буфетчыца, выбіраючы з каша яблыкі.

— Колькі хачу, гэтулькі і купляю! — крыкнуў Серж, з арлінай гордасцю кідаючы вачыма і на буфетчыцу, і на дзяцей.

— Чаго ты крычыш? — абазвалася пакрыўджаная буфетчыца.— Я старая жанчына. Бач, які герой знайшоўся. Сам кату па пяту, а распараджаецца.

— Калі захачу, дык магу ўвесь гэты твой буфет купіць за адным разам! — гыркнуў Серж, распіхаючы па кішэнях ласункі.

У такіх выпадках заўсёды можа знайсціся які-небудзь падхалім, самы сапраўдны падлізнік. Падскочыў белабрысы Мішка, і палавіна

купленых Сержам цукерак апынулася ў яго кішэні. Па дарозе ў клас Серж убачыў Насцю. З якой вялікай гордасцю ён паглядзеў на яе, на гэтую нейкую Насцечку, якая мала што калі і купляе ў буфеце, а найчасцей прыносіць сабе з дому хлеб і кілбасу ці што-небудзь падобнае.

Пачуўся званок, і Серж горда ўвайшоў у клас, з усмешкай паглядаючы на ўсіх. Сержу пачало здавацца, што ён многа зрабіў ужо для таго, каб аднавіць тое, што было за апошнія дні страчана; каб на яго пачалі глядзець як на героя, які нікога і нічога не баіцца, які за ўсіх лепшы і выдатнейшы. Яму стала спакайней на душы, але тым большая злосць да Насці мучыла яго. Ён жа ёй нічога не зрабіў такога, каб яна адчувала яго сілу і перавагу над сабою. Яна ж і дагэтуль можа думаць, што ён нічога не варт: што ў арыфметычных задачах ён вельмі слабы, што на ім асталася тая пячаць, якую паставіла на яго настаўніца словам «хуліган», што ён ніякі не герой, што ён не выдатнейшы за ўсіх і што ён і астаўся такой нікчэмнасцю, якой быў тады, калі яго стары чалавек трос на вуліцы за плячо. Так прайшлі першыя ўрокі.

Серж бачыў, што Насця на вялікім перапынку нешта паклала ў парту. Калі яна адышлася некуды, ён развязаў пакладзеную ў парту Насцяй торбу і паглядзеў у яе. Торба была поўна гароху. Серж торбы не завязаў, а паставіў яе так, каб гарох не высыпаўся, і за торбу завязаў нітку, а канец ніткі працягнуў да парты белабрысага Мішкі (сам ён сядзеў на першай парце — усялякае свавольства яго лёгка заўважыць настаўніцы). Калі пачаўся ўрок, Мішка пацягнуў за нітку, і ўвесь гарох сыпануўся па ўсім класе.

— Што гэта? — крыкнула настаўніца.

— Гэта Насця Закрэўская цэлымі торбамі гарох у клас носіць! — закрычаў Серж.

— Насця, нашто ты гарох у клас носіш? — запытала настаўніца.

— Гэта я купіла суп варыць.

— Табе мама сказала купіць?

— Я сама. Мая мама жыве ў Маскве.

— І заўсёды ты так?

— Не, раней дзед усё купляў, а цяпер ён ляжыць хворы. Мне трэба і купіць, і суп зварыць, і ў аптэку пайсці, і яго дагледзець. А як я пасля заняткаў пайду купляць, калі тады мне адразу дадому бегчы,— можа, яму, хвораму, што трэба,— ён жа і так колькі гадзін, пакуль я тут, адзін ляжыць.

— А больш у цябе нікога няма тут?

— Нікога няма.

Гаворка з настаўніцай скончылася, але ў перапынку пачалася гаворка з дзецьмі. Усе пыталі Насцю:

— А чаму твая мама жыве не з вамі, а ў Маскве?

— Яна там давучваецца.

— Як гэта давучваецца?

— Бо яна вучылася дома, сама, у завочным інстытуце, а на ўсю гэтую восень і на пачатак зімы яна паехала трымаць апошнія іспыты

і працаваць над дыпломнай працай. А калі яна скончыць усё гэта, то тады прыедзе да нас і або будзем жыць тут, або паедзем з мамай туды, куды пашлюць маму.

— А дзе твой тата?

— Мой тата памёр, калі я яшчэ зусім малая была, і я яго не памятаю.

<...>

## IV

Сержаў бацька прыйшоў дадому са свае працы крыху пазней, як звычайна, і ўвечары зусім нікуды не выходзіў з дому. Ён нават і справамі сваімі не займаўся. Да самага вечара быў маўклівы, задуменны, а як толькі Серж апрануўся, каб ісці на вуліцу, ён сярдзіта крыкнуў яму:

— Не хадзі нікуды, сядзі дома.

Серж, ведама, не прывык слухаць таго, што гаворыць бацька, і пайшоў к дзвярам, але пачуў бацькаў голас:

— Каму я гавару,— табе ці гэтай сцяне?

— Сцяне,— весела хіхікнуў Серж і адчыніў дзверы, але бацькава рука хапіла яго за плячо і ўцягнула назад у пакой.

— Раздзявайся,— сказаў бацька.

— Чаму гэта, каб я раздзяваўся?

— Раздзявайся.

— Не хачу.

— Не, ты зараз захочаш.

— Не.

— Захочаш.

— А от і не.

Бацька сарваў з Сержа паліто і шпурнуў у кут.

— Трэба было раней думаць пра гэта, а то ты патураў усім яго капрызам, а цяпер агледзеўся, што з яго выйшаў хуліган,— сказала маці.

Гледзячы, як маці плача, Серж здагадаўся ўжо, што адбылося нешта непрыемнае, і ён устрывожыўся. Апусціўшы вочы ў падлогу, ён стаяў і маўчаў.

— Глядзі мне ў вочы,— сказаў бацька.

Серж утаропіў свае вочы на бацьку так, што той аж уздрыгнуўся.

— У цябе хапае смеласці глядзець мне ў вочы?

— Ты ж казаў, каб я табе глядзеў у вочы?

— Ты здзекуешся з бацькі?

— Я ж цябе слухаю.

Бацька аж пазелянеў ад злосці і хапіў сына за каўнер рубашкі. Ён яго хацеў біць, але маці не дала. Серж злосны і пакрыўджаны горда сказаў бацьку:

— Чаго ты мяне мучыш?

— Гэта ты папу мучыш,— сказала маці.

— Што я яму кепскае зрабіў?

— Ты старога чалавека ў ваду ўкінуў — ён цяпер хворы.

— І яшчэ раз укіну, калі будзе хапаць мяне на вуліцы за каўнер. Я яго не чапаў, ён першы.

— Ён бараніў ад цябе дзяўчатак.

— Цераз гэтых дзяўчатак я ў лужу ўпаў.

І раптам Сержа апанавала крыўда; ён успомніў, як ён запэцкаў у гразь новыя свае штаны. К таму ж ён адчуў, што над яго галавой збіраюцца вялікія непрыемнасці, і трэба было ратавацца.

І ён заплакаў. Ён ужо не слухаў, што крычаў бацька і што казала маці, і ўсё мацней і мацней плакаў. І чым больш ён плакаў, тым больш яму рабілася шкада самога сябе, і яму пачало, нарэшце, здавацца, што ён вялікі пакутнік, што яго ўсе крыўдзяць і ён ад усіх нявінна церпіць. Праз свае слёзы ён з нянавісцю глядзеў на бацьку і на маці, якія, замест таго, каб пашкадаваць яго, абыходзяцца з ім так нядобра, што спачуваюць таму старому, які першы яго зачапіў. Увесь свет вінаваты перад гэтым Сержам, і толькі ён адзін нявінны і цярплівы. Ён, нарэшце, кінуўся да пасцелі, упаў тварам у падушку і астаўся там ляжаць, пачмыхваючы і пахліпваючы носам.

— Можа, і праўда ён не вінават,— сказаў паціху бацька.

— Укінуць у ваду старога чалавека,— дык гэта не вінават,— не сцярпела маці.

— Можа, яго давялі да гэтага? Я яшчэ дазнаюся, як усё гэта было.

— Гэта мы яго давялі да гэтага. Я ж бачу,— ён нікога не паважае, апроч самога сябе.

— Паважаць сябе трэба.

— Паважае сябе толькі той, хто паважае другіх.

— Я гэта ведаю, што ты мяне вучыш?

— Калі ты ведаеш, дык трэба старацца, каб і Серж быў такі. Трэба старацца, каб з яго вырас такі чалавек, які ведаў бы, што, калі ты пакасціш другому чалавеку, то лепш табе не жыць на свеце. Я ведаю, што тут выходзіць: калі ён пад'язджае на машыне к школе, то ён адчувае гэта не так, што машына аблягчае чалавеку хаду, беражэ яго сілы, а бачыць у гэтым толькі сваю перавагу перад другімі дзецьмі. Ён прывыкае з пагардай глядзець на ўсіх. Калі ў дарослага чалавека такое чорствае самалюбства, то ён не паможа другому. Такога чалавека любіць ніхто не будзе, а кожны будзе яго баяцца, а значыцца, і ненавідзець. Я не хачу, каб мой сын быў такі. Я адзін раз бачыла, як жанчына на вуліцы паслізнулася і ўпала і як два рослыя франты, бачачы гэта, зарагаталі. Гэта ўсё адна і тая ж справа. Каб, скажам, хто-небудзь з дзяцей, з якімі Серж разам вучыцца, што-небудзь нёс цяжкае і абнямог ад цяжару, Сержу і ў галаву не прыйшло б памагчы гэтаму свайму таварышу.

— Адкуль ты ведаеш?

— Табе ж казалі ў школе, што ён прабіў цвіком пасуду, у якой дзяўчынка газу несла. Хіба можа быць большая пакасць? Няхай сабе яго першага зачапілі. Але ж гэта расправа гордага паніча. Тая дзяўчынка і вучыцца, і працуе, а ён не адчувае гэтага. Я сама пайду да таго старога чалавека і пагавару з ім. І калі трэба будзе, я прымушу Сержа папрасіць у яго прабачэння. Няхай папросіць, каб стары чалавек дараваў яму.

— Добра, ты ідзі да таго чалавека, а я пагавару з Сержам.

— Калі мой сын зрабіў таму чалавеку прыкрасць, то для мяне гэта тое, што я сама пакрыўдзіла чалавека. Мне самой брыдка і горка.

<...>

## VII

Гэта былі тыя самыя тры дзяўчынкі, пра якіх гаварылася ў пачатку гэтай аповесці. Гэта іх тады Насцін дзед бараніў ад Сержа Мілеўскага. Яшчэ да таго здарэння яны раз ці два былі на кватэры ў сваёй школьнай падругі Насцечкі. А пасля таго, як Насцін дзед абараніў іх на вуліцы, яны адчулі да яе большую яшчэ прыхільнасць. І калі настаўніца сказала даведацца пра Насцечку, як яна жыве са сваім хворым дзедам, Рая, Фаня і Надзя пачалі вельмі часта прыходзіць да сваёй падругі.

Рая здавалася самай сталай з іх траіх. У яе былі дзве зусім яшчэ малыя сястрыцы, і адна з іх была слабага здароўся і даволі часта хварэла. Раінай маме было многа клопату і працы, і Рая ўсё памагала ёй. Рая ўжо ўмела зварыць які хочаш суп, умела добра засмажыць мяса і прыгатаваць усё, што трэба. Яна вельмі добра вышывала і някепска шыла. Невядома, хто ад каго пераняў,— ці Рая ад Насцечкі, ці Насцечка ад Раі, але Рая таксама, як і Насцечка, мела прывычку часам запішчаць: «Ой, дзевачкі!» Апошнімі днямі Рая ганарылася тым, што яна сама сабе перашыла плацце. На твары яе было некалькі вяснушчатых крапінак, а валасы яе шчыльна ляжалі на галаве пад грабянцом. Яна была вельмі падобна да Насцечкі — і з голасу, і з постаці, і з усяго выгляду, і са свае сталасці.

Фаня не была падобна да Раі і Насцечкі. Перш за ўсё, яна была на год за іх маладзейшая і меншая ростам. Валасы на яе галаве густа кучаравіліся, гаварыла яна павольна, быццам спявала. І ўжо ніяк ад яе нельга было пачуць якога-небудзь раптоўнага выкрыку: «Ой, дзевачкі!» Перад тым, як сказаць слова, яна падумае і тады праспявае ўжо тое, што хоча сказаць.

А Надзя была вялікая рагатуха. Яна вельмі любіла рагатаць. Раптам скажа:

— Я піла ваду і аблілася.

І зарагоча. А то часам здарыцца ёй паслізнуцца на лёдзе і ўпасці, а вядома, калі толькі што ўпадзеш, то ў першы момант не баліць. Забаліць крыху пасля, калі моцна даўся. Дык у такіх выпадках Надзя раней зарагоча, а тады ўжо заплача.

Вось гэтыя тры дзяўчынкі і ўвайшлі цяпер у Насціну кватэру. Рая наступіла нагой на рассыпаны гарох і ледзьве не ўпала.

— Ой, дзевачкі! — крыкнула яна.

А Надзя, вядома, што зрабіла пасля гэтага,— яна адразу зарагатала. Затое Фаня падумала і паважна праспявала:

— Трэба гэты гарох пазбіраць, а то тут можна ўпасці.

— Ой, дзевачкі, давайце збіраць гарох! — крыкнула Рая, і яны ўсе ўчатырох прыгнуліся к падлозе.

— Як добра, што вы прыйшлі,— сказала Насцечка,— а то мне нудна было чакаць поезда.

— Якога поезда? — запытала Надзя.

— Мая мама прыязджае. І ведаеце, што? Яна ўжо раней пісала, што мае патэфон. Яна, значыцца, яго сёння прывязе.

— А якія пласцінкі? — заспявала Фаня.

— А якія пласцінкі-і-і,— перадражніла яе Рая.— Адкуль жа Насця можа ведаць?

— От, каб была лезгінка,— зарагатала Надзя.

— Ой, дзевачкі! — крыкнула Рая.— Патанцуем лезгінку.

— А музыка? — паважна сказала Насцечка.

— А мы самі сабе выспеўваць будзем.

— Так вы патоміцеся, гэта цяжка так,— сказаў дзед.

Але хто яго там слухаў, калі справа ішла аб лезгінцы. Дзяўчаткі пачалі танцаваць. Дзед глядзеў на іх, і слаўная ўсмешка запоўніла яго твар. Усё было на свеце добра. Ён паправіўся, Насцечка здаровая, вясёлая і вучыцца добра, а зараз будзе тут дарагі чалавек — Насціна мама. Дзед пачаў біць у далоні і ў такт танца прыгаварваў:

— Гоп-гоп, Насцечка, гоп-гоп, Надзечка.

Адчыніліся дзверы, і ў пакой увайшоў Сержаў бацька, а за ім Серж. Яны стукалі з калідора ў дзверы, але іх не чулі за танцамі, і яны адчынілі самі.

— Ой, дзевачкі! — прапішчалі ў адзін голас Насця і Рая.

Танец умомант спыніўся, і дзяўчаткі ўставіліся вачыма ў Сержа. Запанавала маўчанне. Але тут радасным і ўзбуджаным голасам абазваўся дзед:

— Нарэшце я цябе дачакаўся. Чаму ж ты дагэтуль не прыходзіў? А я чакаў, чакаў...

Дзед і Сержаў бацька абняліся і пацалаваліся. Слёзы радасці стаялі ў дзедавых вачах.

— Я расказаў свайму Сяргею пра тое колішняе здарэнне з бандытамі і пра вас,— гаварыў Сержаў бацька.— І ён так палюбіў вас і аж плакаў, так прасіў, каб я яго ўзяў з сабою да вас... Сяргей, хадзі сюды, трэба ж вам пазнаёміцца.

Серж і стары Закрэўскі ступілі адзін да аднаго крок і глянулі адзін на аднаго. Дагэтуль яны яшчэ не бачыліся. Закрэўскі быў заняты вітаннем з Сержавым бацькам, а Серж спадылба пазіраў на знаёмых яму дзяўчатак і ў душы сваёй праклінаў тую часіну, калі ён сюды прыйшоў. Цяпер Сержавы вочы спаткаліся з вачыма старога Закрэўскага. І — які жах! Замест таго чалавека, якога ён ужо любіў пасля бацькавых расказаў, Серж убачыў перад сабой ненавіснага яму старога, якому ён так многа зрабіў зла. Абодва яны, і Закрэўскі і Серж, збянтэжыліся. Серж густа пачырванеў і апусціў вочы ў падлогу, а ў Закрэўскага задрыжалі губы і пачырванелі вочы, але ён адразу ж справіўся з сабой і, каб не дапусціць да якіх бы там ні было непрыемнасцей, сказаў:

— Ну, от і добра, што мы пазнаёміліся.

— Ніколі з ім так не было, каб ён быў такі нясмелы, што апускаў вочы ў падлогу,— сказаў пра свайго сына Сержаў бацька.— Гэта, мусіць, ён пасля таго, што пачуў пра вас з майго расказа... Ну добра, Серж, ідзі гуляй з дзяўчаткамі.

— А мы тут сабе пасядзім і пагаворым,— сказаў Закрэўскі.— А ведаеш, хто да нас сёння прыязджае?..

І ён расказаў, каго яны чакаюць.

— Вельмі добра,— сказаў Сержаў бацька.— Я даўно яе не бачыў, будзе прыемнае і радаснае спатканне. Мы ж бачыліся яшчэ тады даўно, калі цяжка жылося. Як я рад, што мы ўсе будзем жыць у адным горадзе... Серж, гуляй з дзецьмі, чаго ж ты стаіш, як акамянелы?

Але ў тым была і бяда, што Серж не мог з чыстай душой падысці да дзяўчатак і зірнуць ім смела, па-таварыску, па-сяброўску ў вочы. Але ўсё ж гэтая прыкрасць была нішто ў параўнанні з тым, што рабілася ў яго душы з таго моманту, калі ён убачыў, да каго ён з бацькам прыйшоў і каго ён так моцна скрыўдзіў. Стары чалавек здаваўся яму цяпер нейкім магутным веліканам, перад якім ён, з усімі сваімі ганарыстымі капрызамі, нічога не варт. Ён так сябе адчуваў, быццам лепш было б яму ў гэтыя мінуты праваліцца скрозь зямлю.

— Насцечка,— сказаў дзед,— я адзін пайду на вакзал, а вы тут усе сядзіце і чакайце. Тры мінуты ходу да вакзала і тры мінуты назад. А поезд вось павінен ужо прыйсці.

Закрэўскі адзеў паліто і шпарка выйшаў. Сержаў бацька астаўся адзін з дзецьмі. Насцечка захвалявалася, яна раз-поразу заглядвала ў акно. Жартачкі! Зараз будзе тут яе мама, якой яна ўжо колькі часу не бачыла. Дзяўчаткі акружылі Насцечку і зашчабяталі, Серж пачаў шаптаць бацьку на вуха: «Хадзем дадому»,— але бацька і слухаць пра гэта не хацеў. Як жа ён мог пайсці дадому ў гэты момант, калі зараз ён убачыць свайго блізкага чалавека,— Насціну маму, з сям'ёй якой, калі яшчэ жыў быў Насцін бацька, ён так дружыў. Многа год яны ўжо не бачыліся, і ён радасна чакаў гэтага спаткання. І Сержа ён таксама нікуды адгэтуль не пусціць, ён пахваліцца блізкім людзям, які ў яго ўжо сын. У чаканні прайшло мінут дваццаць. І вось на дварэ каля дома пачулася гаворка, і Насцечка праз акно ўбачыла, як мама яе і дзед увайшлі ў сенцы. А іх даганяла нейкая жанчына і следам за імі таксама ўвайшла ў сенцы. Насцечка саскочыла з крэсла, на якім стаяла на каленях, каб лепш глядзець у акно, і падбегла да дзвярэй. З усяго размаху яна стукнула рукамі ў дзверы і адчыніла іх. Мама, захваляваўшыся, ледзьве ўвапхнула ў дзверы чамадан і кінулася да свае Насцечкі.

— Мама! — закрычала Насцечка і павісла на мамінай шыі. Рая, Фаня і Надзя стаялі каля стала, і на тварыках іх расплылася чыстая, як усход сонца ў ціхі веснавы дзень, усмешка шчаслівага маленства. Але дзверы ў сенцы нейкі час аставаліся адчыненыя, і незнаёмая жанчына гаварыла там дзеду:

— Гэта тут жыве стары чалавек са сваёй унучкай, які хварэў праз тое, што ўпаў у ваду?

— Тут, гэта я,— чула Насцечка голас свайго дзеда.— А чаму вы пытаеце?

— Вас кінуў у ваду малы хуліган, гэта мой сын, я прыйшла папрасіць у вас прабачэння.

— Э, што там, я паправіўся ўжо,— збянтэжыўся дзед.

— І вашай унучцы мой гэты хуліган...

Жанчына не скончыла, змоўкла, пачырванела тварам і адразу пасля гэтага збялела. Закрэўскі таксама глядзеў на яе, не могучы ад здзіўлення прагаварыць і слова. Нешта ён мармытнуў сабе пад нос і шпарка ўвайшоў у кватэру, пакінуўшы за сабой адчыненыя дзверы. Жанчына не смела ўвайсці і стаяла ў сенцах. Закрэўскі паставіў на падлогу патэфон, які ён нёс з вакзала, і павярнуўся да дзвярэй, ужо стараючыся паспакайнець:

— Ну, заходзь жа... (Канцы губ яго ўздрыгануліся.) А тут і Сяргей твой, і... Ну, заходзь жа, колькі год я цябе не бачыў... (Твар яго засвяціўся радасцю.) Ты ж як дачка мне... Ну, чаго там... А памятаеш, як ты выратавала нас ад бандытаў?..

Жанчына ціха плакала, Насцін дзед пагладзіў яе па галаве і пацалаваў у лоб. Серж стаяў, як акамянелы. Сержаў бацька ўстаў з крэсла так шпарка, быццам бы крэсла гарэла агнём. Ён стаяў, апусціўшы рукі і не ведаючы, дзе дзецца.

— Дык вось каго гэта ты так пакрыўдзіў...— павярнуўся бацька да Сержа і змоўк, а пасля цішэй сказаў: — Гэта я яго пакрыўдзіў, гэта я сам вінават...

Першая напружаная мінута прайшла. Насцечка стаяла на крэсле, абняўшыся з мамай так, што, здавалася, іх ніяк не адарвеш адну ад другой.

— А мама... Ой, дзевачкі, хадзіце сюды! — крыкнула Насцечка.— Мама, гэта мае падругі.

— О, у іх вялікае сяброўства,— сказаў дзед.— Такая ў іх дружба, што толькі цешыцца можна.

— Добры дзень вам, дзяўчаткі,— сказала мама.— Хоць я вас і першы раз бачу, але ўжо люблю вас за тое, што вы дружыце з маёй Насцечкай.

— О, Насцечка маладзец,— сказаў дзед.— Яна і вучыцца, і весяліцца, і чытае, і гуляе, і такая сталая, і такая гаспадыня была, калі... (Ён хацеў сказаць: «калі я быў хворы», але падумаў і сказаў: «калі трэба было».)

— Ну, цяпер я ўжо тут гаспадыня,— сказала Насціна мама,— калі ласка, усе за стол. Добра, што вы тут не забывалі іх,— гаварыла яна да Сержавага бацькі і маці.— І вам, дзяўчаткі, дзякую за дружбу з Насцечкай. Дружба — вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць, чуеце, дзяўчаткі? Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека. Растайце вялікія і берагайце праз усё жыццё дружбу. І ведайце — асабліва моцная павінна быць тая дружба, што ўстанаўліваецца ў маленстве і ў маладыя гады.

Серж раптам зарыдаў і кінуўся да дзвярэй. Дзеці кінуліся да акна і ўбачылі, што ён шпарка пабег завулкам. Маці яго акінула вачыма ўсіх, і ў позірку яе гэтульдкі было пакут за сваё дзіця.

— Што гэта за хлопчык? — сказала Насціна мама.— Я і не заўважыла яго адразу.

— Гэта... гэта... мой. Я пасля раскажу,— ціха прагаварыла Сержава маці.

— Ён цяпер пабяжыць дадому,— сказаў Насцін дзед.— Гэта і добра, няхай пабудзе сам з сабой, паспакайнее.

— Ён больш такім не будзе,— сказаў Сержаў бацька моцна і рашуча, і тон яго голасу настроіў усіх на весялейшы лад.

Усе сядзелі за сталом, на які Насціна мама ўсё больш і больш ставіла ўсялякіх пачастункаў. Сержава мама пачала памагаць ёй. Надзя выскачыла з-за стала і пачала пераглядаць патэфонныя пласцінкі.

— Лезгінка! — закрычала яна раптам.

— Ой, дзевачкі! — крыкнула Рая.

А Насцечка зусім страціла сваю ранейшую гаспадыньскую сталасць. Ёй хацелася песціцца і быць каля мамы. І калі мама падыходзіла да стала, Насцечка прыхілялася да яе галавой. Нарэшце мама села каля сваёй Насцечкі. Праз паўгадзіны, пасля першай шклянкі чаю, паміж вялікімі за сталом ішла жывая і вясёлая гаворка. А дзеці завялі патэфон і пачалі танцаваць асецінскую лезгінку. Дзед не вытрымаў. Ён адышоўся да сцяны, глядзеў на дзяцей, у такт танца ляскаў у далоні і прыгаворваў:

— Гоп-гоп, Насцечка. Гоп-гоп, Раечка. Гоп-гоп, Фанечка. Гоп-гоп, Надзечка.

І на твары яго ўвесь час ляжала пячаць радасці.

## МАЛЕНЬКАЯ ЖАНЧЫНА

Яны ішлі ляснымі сцежкамі і глухімі закуткамі. Ішлі з дзецьмі. Меншых неслі на руках. Яны былі маўклівыя. У гэтай маўклівасці было адзінае для ўсіх іх пачуццё — вялікае і наймацнейшае за ўсё, што асталося цяпер у іх жыцці. Гэта была нянавісць, і ёй не было ні канца, ні меры.

Найбольш гэта былі жанчыны. Былі маладыя, былі і сярэдніх год, былі і старыя. Але ішла сярод іх адна «жанчына» са «сваімі дзецьмі», у якой адной з'ядналася ўсё, што было напісана на многіх тварах, што жыло ў многіх душах. Гэтай «жанчыне» было год дванаццаць, і вяла яна з сабой двое дзяцей. Большаму хлопчыку было год сем, меншай дзяўчынцы — год пяць. Гэтую дзяўчынку яна нават разоў са два спрабавала падносіць на руках. Было гэта паблізу і раўналежна дарозе з Мінска на Маскву.

Бадай што кожны з гэтых людзей перажываў сваю асабістую крывавую драму. Адзін не ведаў, дзе ў страшную хвіліну дзеліся бацькі, другі не ведаў, дзе дзеліся дзеці. Дзеці, якія ішлі адны, не ведалі, дзе дзелася маці. Але ўсе ішлі на ўсход, ад ворага. І ўсё асабістае злілося ў кожнага ў адно з усімі...

Дванаццацігадовая жанчына, якая вяла сваіх дзяцей, не ведала, што гэта за дзеці. Яна іх спаткала на дарозе адных і ўзяла пад сваю апеку. Калі выйшлі на палявую дарогу і калі з'явіўся над галовамі нямецкі драпежнік, яна цвёрдым голасам загадала сваім дзецям упасці на зямлю і ўпала сама. Увесь натоўп жанчын і дзяцей ляжаў на зямлі, пакуль пералятаў ненаеднік. Здавалася, што ён ужо мінуў гэтае месца, але тут ён, напэўна, заўважыў некалькі белых хусцінак на

зялёнай зямлі. Праз гул матора сыпануўся дробны кулямётны стук і так жа дробна сыпануўся на распасцёрты ніц на зямлі натоўп град куль.

Што ж у гэтую хвіліну рабіла дванаццацігадовая жанчына? Упаўшы грудзьмі і тварам на зямлю, каб перачакаць бяду, яна заснула самым сапраўдным сном. Трэція суткі яна не спала ні часіны і ўсё ішла.

Высыпаўшы кулі, немец зрабіў круг і паляцеў далей. З нейкага інстынкту дванаццацігадовая жанчына адразу прачнулася, паднялася на ногі, падняла сваіх дзяцей і стала ў ланцуг усяго натоўпу. І неўзабаве яна ўжо ішла далей, прысутуленая, маўклівая, з завостраным ад нуды і нябыту носам, у стракатай хусціне на мілай дзіцячай галоўцы. Твар яе сабраўся ў адну рысу, непарушная ўпартасць паклала на яго сваю пячаць. Вочы накіраваны былі ў адзін-адзіны пункт — глядзелі туды, што ўжо было знойдзена і вядома.

Усё было вядома! Вядома стала, што прыйшла пара вялікага выпрабавання, смутку і ўпартасці, непахіснасці і непакорнасці. У душы — воля да жыцця, а над душою — крывавы забойца! І свавольная жыццярадаснасць дванаццацігадовай дзяўчынкі ператварылася ў сталасць спрактыкаванага чалавека, які многа ведае і да многага імкнецца. І ўсё гэта было на яе пакутным тварыку.

Раптам яе сямігадовы хлопчык сышоў убок і пайшоў з ёю побач.

— Ідзі за мной,— строга сказала яна яму,— мне мама казала, што трэба ісці роўна, адзін за адным, і спакойна, дык больш пройдзеш і менш стомішся.

— А дзе твая мама? — абазвалася жанчына, што ішла перад ёю.

— Маму забіла бомбай у Мінску, але яна яшчэ мне сказала, каб я ішла адразу ж і не аставалася.

На адзін найкарацейшы момант тварык яе зморшчыўся, сцягнуўся, рухавасць прабегла па ім, яна міргнула вачыма, сціснула вейкі, кулачком правяла па вачах, каб выцерці раптоўныя слёзы, глытнула сліну і загойдалася далей у роўнай, размеранай хадзе. І нейк адразу ўсе ўскінулі твары ўгару. Нямецкі драпежнік зноў ляцеў сюды. Няроўны рокат яго матора хлынуў раптоўна. Цяпер ён ішоў ніжэй, як першы раз, і кругі рабіў вузейшыя. Зноў натоўп жанчын і дзяцей ляжаў на зямлі, і зноў яна ў сваёй стракатай хусцінцы спала, уткнуўшыся тварам у здзірванелую абочыну дарогі. Побач з ёю ляжаў сямігадовы хлопчык, а пяцігадовую дзяўчынку яна праз сон адчувала працягненай рукой. Яе рука ляжала на руцэ той, якой яна стала замест маці.

І раптам увесь гэты гарачы і ясны дзень раскалоўся ад свісту. Усё ўскалыхнулася і рванулася ўгару. Свет страсянуўся, жудасны гук аглушыў яго, і стала цёмна. Але яна так моцна спала, што больш за хвіліну не магла апамятацца, калі ўскочыла на ногі з-пад зямлі, якая ўпала на яе балючым тупым ударам. Яе кінула далёка ад дарогі і засыпала зямлёй. Не паспела яна скінуць з сябе забыццё, як зноў, ужо з другога боку, і так жа блізка ад яе, рванулася трэскам і грукам зямля. А пасля далей і далей, і так многа разоў. Усё згінула і

знікла, і раптам заўладала светам цішыня. Чутно было, як аддаляўся гул, знікаў у вышыні, якой не відно было.

Яна стаяла адна ў гэтым жудасным пекле. Яснага дня ўжо не было. Ад дыму і пылу стаяла ноч. І вось у яе душу пачала сачыцца радасць, што стала ціха. Калені яе згіналіся, галава хілілася к грудзям. Усё яе цела ныла, балела і прагнула спакою. Дарэмна яна старалася што-небудзь разгледзець навокал сябе. З трывогай яна ўспомніла, што нават не ведае, як завуцца яе дзеці і як іх цяпер паклікаць, каб яны абазваліся. Яна апусцілася на калені, нейк бокам, і старчма галавой уткнулася ў зямлю, і ні з чым непараўнаная асалода сну ахапіла яе. Але разам з тым кожную хвіліну яе пранізвала пакута свядомасці, што яна не бачыць каля сябе сваіх дзяцей. Раз-поразу яна адрывала твар ад зямлі, шпарка адкрывала вочы, бачыла змрок пылу і дыму і зноў падала ў шчасце сну. І так было многа разоў. Пасля пачаўся ясны дзень, і яна з натугай, якая магла быць не пад сілу самаму моцнаму целам і духам мужчыну, адарвалася ад сну і затапталася назад і ўперад. Ужо не было дарогі, а замест яе ямы. Не было і зялёнай абочыны. Тут ляжала шэрая зямля. Яна працёрла кулачкамі вочы і ўбачыла адарваную галаву той жанчыны, якая ішла перад ёю. У трывозе яна пачала азірацца, дзе яе дзеці. Але бачыла толькі рукі і ногі, адарваныя ад цел, галовы і скрываўленыя косці. І тут вочы яе спыніліся на той малой дзяўчынцы. Дзіця было напалавіну прысыпана зямлёй, але твар быў наверсе. Ён быў чорны ад пылу і дыму. Яна падняла сваё дзіця на рукі. Яно вельмі цяжка дыхала і вачэй не расплюшчвала. І толькі цяпер яна заўважыла, што ў дзіцяці скрываўлены ногі. Густая ад зямлі кроў цякла бесперастанку. Дванаццацігадовая жанчына прыціснула да сябе сваю дзяўчынку і бездапаможна азірнулася. Хоць бы дзе жывы хто, хоць бы чалавечы голас! Ахопленая страхам і смуткам, яна, моцна трымаючы пры сабе дзіця, пабегла полем у той бок, дзе стаяла сонца. Два разы яна спатыкнулася і два разы падала, але кожны раз утрымоўвалася на каленях, каб зберагчы тую істоту, якую несла на руках. І кожны раз аставаліся на палявой зямлі знакі ад яе вострых каленак. Яна ўсхватвалася і бегла далей, трымаючы ў памяці толькі адно — туды, дзе стаіць сонца. Гэта яна цвёрда засвоіла: каб не збіцца з дарогі, трэба ісці туды, дзе ўсходзіць сонца, трэба ісці на ўсход, к Маскве. Так сказала ёй, уміраючы, маці. Але цяпер было пасля поўдня. Сонца стаяла высока. З галавы яе выйшла, што трэба праверыць свой кірунак на ўсходзе сонца. Яна ў гэтыя моманты не магла адумацца і бегла к паўднёваму сонцу, якое ва ўсім сваім бляску стаяла над гарачай зямлёй.

Ёй здавалася, што яна бяжыць вельмі доўга. Сэрца яе разрывала грудзі. Яна пайшла павальней. Ногі блыталіся ў траве, над якой гулі пчолы. Гарачыня сціснула яе. Яна азірнулася і села на зямлю. Сваё дзіця яна паклала на зямлю і, пакуль аддыхвалася, не адкрывала вачэй, а як адкрыла, убачыла, што дзіця не варушыцца і не дыхае. Смерць! Яна гэта адчула ўсім сваім інстынктам. Яна ўстала на ногі і доўга так стаяла. Цяпер яна з усёй яснотай думкі чакала, што хто-небудзь з'явіцца на гэтым пустым і гарачым полі. Раптам яна

прыгнулася, дакранулася рукой да нежывога дзіцяці і вельмі паволі пайшла ў той бок, куды ішла і дагэтуль,— к сонцу. Многа разоў яна чула за сабой далёкія ўзрывы, многа разоў чула дзесьці над сабой рокат нямецкіх ненаеднікаў, але яна нават не аглядалася, быццам нічога і не чула. Усё ішла і ішла. Вузкая палявая дарога была перад ёю. І якраз добра — дарога вяла проста туды, дзе стаяла сонца. Яна пайшла шпарчэй. Сонца плыло к захаду. Цяпер было лягчэй ісці, не такая была гарачыня. І яна падумала, што сонца спусціцца яшчэ ніжэй і тады стане яшчэ лягчэй, а пасля будзе адвячорак і яна напаткае людзей і зусім добра будзе. Яна ўскінула твар угару, каб паглядзець, ці высока сонца. Сонца стаяла ўжо даволі нізка, і тут яна адумалася і ўспомніла, што не туды ідзе, куды трэба. Трэба ісці туды, дзе сонца ўсходзіць, а яна ідзе туды, дзе сонца будзе заходзіць. Спалохана яна азірнулася і пачала думаць: дзе ж на небе тое месца, дзе ўсходзіць сонца. Ці там, дзе здалеку відны нейкія дрэвы, ці там, дзе той узгорак з ветраком? І ніяк яна ўгадаць не магла. Яе агарнула думка: перачакаць тут ноч да дня і тады рушыць на першыя сонечныя праменні. Яна зноў села на зямлю, пасля неспакойна ўстала. Непадалёку вызначаліся зараснікі нізкарослых дрэў і кустоў. Іх нядаўна мінула сонца. Яна пайшла туды і ўвайшла ў цень.

Аднак жа гэта быў сапраўдны лес і здаваўся ён здалёк нізкім таму, што рос у лагчыне. Тут раслі яліны і трапляліся бярозы. І ядловец гусціўся пад арэшнікам. Як тут было ціха і спакойна! Здавалася, усе грымучыя навальніцы смерці і пакут адышлі ў нябыт. З вельмі далёку даходзіў сюды грукат нейкіх узрываў, але гэта не было над галовамі, і ў гэтым было шчасце. У прагаліну паміж дрэў падала з самага нізкага свайго захаду сонца. Дзяўчынка стаяла ў сонцы быццам ужо ў бяздум'і. Стракатая хусцінка на яе галаве страціла ўжо ўсе свае колеры. Гэта была анучка, брудная і скамечаная. Сукенка вісела на гэтым дзіцяці кавалкамі трантаў, вываленых у зямлі. Ног не было відно з-пад пласта пылу. Там, дзе ногі былі прабіты і абадраны аб каменні і карчы гэтай нялюдскай дарогі, тырчэлі гузы закарэлай крыві. Завостраныя плечы яе тырчалі ўгару, адно плячо трымалася вышэй за другое і раз-поразу ўздрыгвала. А твар быў учарнелы і завостраны. Вялікі неспакой сушыў яго. Чым больш яна стаяла тут, тым выразней сыходзіла з яго пячаць ранейшай цягавітай упартасці, і замест яе ажываў адчай. З-пад залепленых зямлёй вейк відны былі вочы, у якіх смяртэльная стома змагалася з выбухам страшнага агню. Гэта быў позірк ні з чым непараўнанай прагі да радасці, здушанай найвялікшым смуткам. Неўзабаве пачало прасочвацца ў душу і пачуццё адзіноты, але яно не паспела пакласці сваю пячаць на вочы. Так, як птушка, чуючы свой час, шукае ціхага месца ўміраць, яна пачала шукаць вачыма чагосьці каля сябе. Ужо ў гэтыя моманты ногі яе пачалі згінацца ў каленях, худзенькая постаць яе яшчэ больш прысутулілася, яшчэ больш падняліся ўгару плечы, твар усімі рысамі і вачыма ўпаў уніз і ўсю яе павяло з месца. Нейк бокам падышла яна к дрэву і паехала ўніз. Гэта было жывое ўвасабленне самай закончанай супрацьлегласці ёй самой, якая яна была

яшчэ некалькі дзён таму назад. Каб увесь свет, як вялік ён ні ёсць, ад усіх сваіх пачаткаў і бязмежнасці сабраўся і ажыў, як вялікая істота, з вачыма, каб бачыць, з вушамі, каб чуць, з душой, каб адчуваць, з розумам і думкамі,— сумленне кінула б яго ніц перад гэтым дзіцем. Ён здрыгануўся б ад жаху, што так не ўдаўся ў ім сэнс шмат чаго, што ён церпіць на сабе.

Упаўшы на зямлю, яна, чорная, скурчаная, маленькая, здушаная, уткнулася галавой у дрэва, тварам уніз, і сцішылася. Праз паўхвіліны яна шпарка адарвала галаву ад зямлі, зірнула ўгару і зноў упала. І так было многа разоў. Душа яе не паддавалася зморанасці цела і кіпела, і рвалася. Раптам яна ўздрыганулася. Гэта быў плач не дзіцячым голасам, але гэта плакала дзіця, а не тая жанчына, што не так даўно апекавалася над меншымі за сябе. У яе ўжо і слёз не было і вочы аставаліся сухімі, калі яна плакала. Нарэшце, літасцівы сон наваліўся на яе, але ласкавасць яго не была доўгая. Пачаўся сонны кашмар, без выразнасці і якой бы там ні было формы. Бяздомнасць, выгнанне, смерць, сіроцтва, матчыны вочы перад смерцю, грукат нямецкіх бомб, бязлітаснасць, жорсткасць — усё палосамі агню і зямлі ішло ўгару і не давала шчасця быць у забыцці. І так цягнулася доўга. Можа, гэта была вечнасць. І вось яна паднялася і села. Зорнае неба было над ёю, і чорныя дрэвы маўчалі. Стаяла цішыня. Яна прытулілася к дрэву. І так, седзячы, адразу заснула і ўжо не чула сама, як галава яе і плечы паехалі па дрэве ўніз, і яна ляжала на зямлі.

Прайшло многа часу, бо калі яна прачнулася — сонца спускалася к захаду. Пабудзілі яе выстралы і крыкі. Стоячы пад дрэвам, яна бачыла, як беглі чырвонаармейцы, як навокал стралялі, як дзесьці на ўзлеску стукаў кулямёт, а ў другім баку ехалі грузавікі. Лес ажыў, і яна азіралася навокал сябе і пасля стулілася за дрэва. І раптам яна ўбачыла, што проста да яе бяжыць немец. Яна яго пазнала адразу, хоць ніколі раней яго не бачыла. Ён ужо быў крокаў за шэсць ад яе і раптам пачуў наперадзе, так як і за сабой чуў, крыкі і шум людзей. Ён закруціўся на месцы. Яна задрыжала і не спускала з яго вачэй. Ён упаў на зямлю, выцягнуўся на жываце і пачаў страляць перад сабою. Яна бачыла яго плечы і, адумаўшыся, пачала заўважаць, што ён цэліцца перад сабою. Рэшткі вячорнага кашмару ўладалі ёю. Яна перамагала самую сябе. Каб не стрывожыць яго, яна ціхом адышлася, пасля пабегла. І ўбачыла трох чырвонаармейцаў. Яны ляжалі на зямлі і, выцягнуўшы перад сабою вінтоўкі, не спускалі з чагосьці вачэй. Яна кранула аднаго рукой.

— Падай і ляжы! — грозна сказаў ён ёй.

— Там немец ляжыць і страляе.

Чырвонаармеец паглядзеў на яе, устаў і пайшоў прыгнуўшыся. Яна ішла поплеч яго, таксама гнучыся, і паказвала рукой. Калі ён упаў на зямлю, упала і яна. Чырвонаармеец прыцэліўся і стрэльнуў. Яна бачыла, як немец уздрыгануўся і ўткнуўся галавой у зямлю.

— Гатоў,— сказаў чырвонаармеец.— А ты ляжы.

І пайшоў назад. Яна ўпала на зямлю, і першая за гэтыя дні радасць страсянула яе душу. Яна ляжала, пакуль усё заціхла, і пасля пайшла да чырвонаармейцаў. Яны збіраліся разам і гаварылі

паміж сабою, што ўвесь нямецкі дэсант знішчан. Чырвонаармеец, якому яна паказала немца, падняў яе на рукі і пранёс крокаў тры, а пасля яна пайшла поплеч яго. Яны прайшлі паўз таго немца, і яна бачыла яго, доўгага, спруцянелага.

Момантам гэтай радасці скончылася яе адзінота, таксама як і яе маленства. Прыйшла сталасць на доўгі яе век.

## УЛАДЗІМІР ДУБОЎКА

Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся 15 ліпеня 1900 г. у вёсцы Агароднікі Вілейскага павета Віленскай губерні (зараз Пастаўскі раён Віцебскай вобласці). Скончыў пачатковую школу ў вёсцы Манькавічы (1912) і Мядзельскае двухкласнае вучылішча (1914). Затым вучыўся ў Нова-Вілейскай настаўніцкай семінарыі (1914—1918), пасля заканчэння якой паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, але вучыцца там амаль не давялося: з-за цяжкіх матэрыяльных умоў пакідае універсітэт і едзе настаўнічаць на Тульшчыну. У 1920 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію, у жніўні 1921 г. дэмабілізаваўся і пачаў працаваць у Народным камісарыяце асветы РСФСР і адначасова вучыцца на творчым аддзяленні ў Вышэйшым літаратурна-мастацкім інстытуце імя В. Я. Брусава, які скончыў у 1925 г. У. Дубоўка быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», першым рэдактарам часопіса для дзяцей «Беларускі піянер» (1924).

Ён працаваў адказным сакратаром пастпрэдства БССР пры ўрадзе СССР у Маскве (1923—1924), выкладчыкам Камуністычнага універсітэта народаў Захаду (1924—1927), рэдактарам беларускага тэксту «Збору законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду Саюза ССР» (1926—1930). У 1930—1957 гг. працаваў на розных работах у Кіраўскай вобласці, на Далёкім Усходзе, у Чувашыі, Грузіі, Краснаярскім краі. З канца 50-х гг. жыў у Маскве.

Першы верш «Сонца Беларусі» У. Дубоўка надрукаваў у 1921 г. у газеце «Савецкая Беларусь». Праз два гады выйшаў у свет першы яго зборнік «Строма» (у Вільні). Услед за ім з'явіліся зборнікі вершаў «Трысцё» (1925), «Credo» (1926), «Наля» (М., 1927), паэмы «Там, дзе кіпарысы» (1925), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929). У пасляваенны перыяд выдадзены зборнікі паэзіі «Палеская рапсодыя» (1961), «Вершы» (1970).

Значнае месца ў творчасці У. Дубоўкі займаюць адрасаваныя юнаму чытачу вершаваныя апрацоўкі народных казак, што склалі зборнікі «Цудоўная знаходка» (1960), «Мілавіца» (1962), «Кветкі — Сонцавы дзеткі» (1963), «Казкі» (1968), «Залатыя зярняты» (1975). Некаторыя казкі з гэтых зборнікаў выходзілі асобнымі выданнямі.

У. Дубоўка з'яўляецца аўтарам навукова-прыгодніцкіх аповесцей для дзяцей «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969), «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974), а таксама зборніка апавяданняў пераважна аўтабіяграфічнага зместу «Пялёсткі» (1970).

Вядомы У. Дубоўка і як перакладчык на беларускую мову санетаў У. Шэкспіра, паэм Д. Байрана, вершаў В. Брусава, А. Пракоф'ева, П. Тычыны і іншых паэтаў.

У 1962 г. за зборнік вершаў «Палеская рапсодыя» У. Дубоўку прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы.

Памёр паэт 20 сакавіка 1976 г.

### ЯК УНУК ДЗЕДУ ДАПАМОГ

1

Казачка гэта
вельмі старая,
ходзіць па свеце
з краю да краю.

Казачку гэту
ведаюць людзі,
ды нагадаць ім
лішнім не будзе.

Недзе далёка
ў вёсцы маленькай
век дажываў свой
дзедка старэнькі.

Старасць — не радасць:
сядзе ля міскі,
так і ліецца
з кожнае лыжкі...

Пазалівае
чысты абрус так
ён і зацїркай,
ён і капустай.

З гэтай прычыны
дзеда старога
есці саджалі
каля парога.

Дзеда старога
з міскі шчарбатай
так і кармілі
мама і тата.

2

Дзедаў унучак,
мамін сыночак,
ножык узяўшы,
сеў у куточак.

Нешта майструе,
нешта складае.
Будзе, напэўна,
цацка якая.

Маці пытае:
— Любы сыночак,
што ты майструеш,
сеўшы ў куточак?

Што ж гэта будзе —
скрыначка, быццам?
— Будзе, матуля,
гэта — карытца.

Вырасту я,
як вы дзеда старога,
вас пасаджаю
каля парога.

Маму і тату
буду карміць так
поснай зацїркай
проста з карытца.

Тата на маму,
мама на тату
глянулі моўчкі:
хто вінаваты?

3

З гэтага часу
дзеда старога
больш не саджалі
каля парога.

Разам з сям'ёю
ён і абедаў.
Гэта памог так
унучак дзеду.

Казачка гэта
вельмі старая,
ходзіць па свеце
з краю да краю.

Хто пра яе
і забудзецца, можа,
ўнучак маленькі
зноў дапаможа:

ён пачытае.
Хоць ведаюць людзі,
але напомніць
лішнім не будзе.

## ЯК СІНЯЧОК ДА СОНЦА ЛЁТАЎ

### 1

Быў час, калі агню нідзе
на свеце не было ў людзей.

І цеплыня ім, і святло —
усё ад сонейка ішло.

Зімой пакутаваў народ:
навокал сцюжа, снег і лёд.

Мароз гуляў, як гаспадар.
Амаль не грэла сонца з хмар.

Нагараваўшыся зімой,
прыйшлі да думкі ўсе такой:

— Ад сонца б іскрачку адну
прынесці ў нашу старану!

Тады б расклалі мы агонь
і грэліся каля яго.

А як бы гэта хто зрабіў,
калі не маюць людзі крыл?

Пасля надумаліся ўсе:
— Агонь нам птушка прынясе!

А птушкі дружна на зямлі
у часе тым з людзьмі жылі.

Пайшлі да птушак грамадой
з сваёй вялікаю бядой.

І вось гавораць птушкі ім:
— Далёка так не палядім!

Не дапрасіліся ніяк!..
Адзін маленечкі сіняк

ляцець да сонца згоду даў,
чаго ніхто і не чакаў.

Вароны ўсе адразу ў крык:
— Ты прыкусіў бы лепш язык!

Не даляцець табе да хмар!
Загінеш ты!
Кар-р!
Кар-р!

Шкадуюць птушачкі усе:
— Маленькі вельмі ты, сусед!

Не ашчасліваш ты людзей,
асіраціш сваіх дзяцей...

А сінячок дае адказ:
— Бясспрэчна, я слабей за вас!

Але ж агню няма бліжэй,
а ён патрэбен для людзей!

І паляцеў да сонца так
адзін маленечкі сіняк.

### 2

Ляцеў, ляцеў і прыляцеў,
Там заспяваў вясёлы спеў.

Сваім вясёлым спевам тым
здзівіў ён сонейка зусім.

— Ды як жа ты сюды? Адкуль?
Такіх здарэнняў на вяку

яшчэ ні разу не было!
— Ляту з палескіх я балот! —

І расказаў пра ўсё, як ёсць,
маленькі гэты сонцаў госць.

— Нялёгкі людзі маюць лёс.
Мяне прасілі, каб прынёс

адну хоць іскрынку для іх
з агнёў палаючых тваіх!

— Прыдумаць не магу ніяк,
што і сказаць табе, сіняк!

Калі агню табе я дам,
як занясеш яго людзям?

Пакуль пабачыш ты свой бор,
ці сам згарыш, ці твой убор!

— Ляцець памалу буду я.
Не спаліць іскрынка твая!

— Ну, што, сіняк, з табой рабіць?
Агонь, як бачыш, сам гарыць!

Вазьмі лучынку, прыпалі,
Нясі, як зможаш, да зямлі!

Лучынку ўзяў ад сонца ён,
заціснуў дзюбкаю цаўё,

пасля лучынку прыпаліў
і паляцеў з ёй да зямлі...

3

Ляцеў, ляцеў і прыляцеў
ён да сваіх палескіх дрэў.

Ляціць над Прыпяццю-ракой,
Палессе бачыць пад сабой.

Яго вітаюць птушкі ўсе:
— Сіняк ляціць!
Агонь нясе!

Вітаюць людзі ўсе яго:
— Сіняк ляціць!
Нясе агонь!

Пачуўшы спевы, гоман той,
сіняк пачаў ляцець стралой.

Агонь узняўся, абхапіў
яго ад галавы да крыл.

Увесь убор гарыць на ім,
закрыў яго адразу дым.

Але не выпусціў ніяк
лучыну з дзюбачкі сіняк:

прынёс агонь, аддаў людзям,
застаўся хоць без пер'я сам.

Пазагараліся кастры,
ад іскры полымя гарыць.

А сінячок хоць не памёр,
сядзіць галюткі ўвесь, без пёр.

Сумуюць птушкі навакол.
Адзін маленькі пасвісцёл

параду даў такую ўсім:
— Па пёрку мы яму дадзім!

Для нас не будзе страты ў тым,
а ўбор адновіцца на ім!

Адклад нідзе на лад не йдзе.
адразу ж памаглі ў бядзе.

Здаецца, што — адно пяро!
А колькі пёр з усіх сяброў!

Дапамагчы быў кожны рад,
па пёрку ўсе сабралі шмат.

І аднавіўся зноў убор
на сінячку з сяброўскіх пёр.

У кожнай птушкі колер свой
зімой бывае і вясной.

На той — чырвоны, сіні —
ў той,
зялёны, жоўты — на другой.

Ён сам калісьці сіні быў,
пакуль агонь не абпаліў.

Не называлі б людзі так,
каб іншы колер меў сіняк!

Цяпер, па памяці старой,
застаўся ўсё ж ён з назвай той,

хоць многа колераў на ім,
хоць стаў стракаты ён зусім.

Адзін пугач не даў пяра,
яшчэ пры гэтым дакараў:

— Яго я лётаць не прасіў!
Узняўся тут страшэнны сквіл.

На грубіянства і дакор
аж загудзеў зялёны бор.

Напалі ўсе на пугача.
Хто дзюбай б'е, хто з-за пляча.

Пачаў даводзіць нешта ён,
калі ж далі з усіх старон,

схаваўся ціхенька ў карчы,
ад злосці керкае, сычыць.

Сядзеў да цёмнай ночы там,
бо вінаваты быў ён сам.

Ад той пары яго нідзе
не ўбачыш ты у ясны дзень.

Калі у гнёздах птушкі спяць,
тады ён можа вылятаць.

Ад той далёкае пары
такі парадак у бары.

А сінячку нядрэнна ў ім.
Ён не баіцца нават зім:

пагрэцца у зімовы час
ляціць у вёску ён да нас.

Не страшны тут яму мароз:
агонь ад сонца ён прынёс.

Пагрэцца мае права ён!
Такі парадак з даўніх дзён

ідзе у нашай старане,
і ён ніколі не міне!

## ЧЫЕ РУКІ ПРЫГАЖЭЙШЫЯ

### 1

На беразе ракі індыйскай,
Джамны,
жылі даўней прыгожыя тры
дамы.

У кожнай муж быў, так сказаць,
вяльможа,
затым пра хлеб іх клопат не
трывожыў.

Не мелі клопату і пра уборы,
ім не хапала толькі з неба зораў.

Ніхто не прымушаў іх турбавацца
наконт якой бы ні было там
працы.

Паспаўшы ўдосыць і на мяккім
ложку,
яны і пачыналі дзень патрошку.
Спачатку падавалі ім сняданне,
пасля былі з суседкамі
спатканні.
Яшчэ пасля — ішлі яны на
Джамну,
вось гэтыя прыгожыя тры дамы.

### 2

З усмешкай на сваіх цудоўных
тварах
яны з сябе свае здымалі сары.

Пасля залазілі ў ваду па пояс,
а над вадой імклівіў звонкі
голас.

Яны сябе лічылі цудам свету,
і ўсе былі павінны ведаць гэта.

Гармідар той прыгожы
і прыемны
даходзіў нават і да шахт
падземных,
дзе людзі голыя крышылі
камень
сваімі збітымі у кроў рукамі,
каб збудаваць цяжкой
падземнай працай
надземным дамам добрыя
палацы...

3

На беразе ракі індыйскай,
Джамны,
не сумавалі гэтыя тры дамы.

Пра тое-сёе крыху размаўлялі,
а гутаркі і час плылі на хвалях.

Але дайшлі да рук сваіх,
урэшце.
Тут згода кончылася, хоць іх
рэжце!

— Мае,— адна сказала,— цуда
свету,—
і вы павінны ўсе згадзіцца
з гэтым!

— Ніякай згоды,— кажа ёй
другая,—
мае такія рукі, добра знаю! —

Такое самае пачулі і ад трэцяй:
— Мае найпрыгажэйшыя на
свеце! —

Няма ў іх згоды, бо яны і суддзі:
гарачых спрэчак і вада не
студзіць.

4

Якраз на тое каля іх кульгае
бабуля нейкая — галодная,
старая.

Яна сказала:
— Трэці дзень не ем я.
Гарачыня спустошыла нам
землі...

А можа, хоць скарыначку
дасцё вы? —
Бабуліны іх не кранулі словы.

Галодных сыты зразумець не
можа,
пакуль самога лёс не
патрывожыць.

Да гэтых дам, над Джамнаю
індыйскай,
наконт скарынкі не хадзі
і блізка.

А ўсё ж ткі трэба скарыстаць
старую!
Адна яе пытаннем і частуе:

— Дапамажы нам скончыць
нашы мукі:
ў якой з нас лепшыя красою
рукі?

— Чакайце крыху,— кажа ім
старая,—
прыйду, як толькі ежу
адшукаю...—

І пакульгала прэч ад іх
з кіёчкам
па чыста вымытым вадой
пясочку...

5

Праз гоні двое, ля ракі таксама,
жанчына простая сядзела пад
кустамі.

Усё жыццё яна працуе ў полі,
сваім гарбом сваю стварае долю.

Вятрамі біта і дажджамі мыта,
яна нічым ад сонца не закрыта.

Ад сонца яснага яна ўся чорна,
і лёсу горкаму яна пакорна.

Прыйшла, каб смагу
ўтаймаваць вадою,
перадыхнуць хоць крыху над
ракою.

6

З кійком старая да яе кульгае,
сардэчным словам і яе вітае.

— Даруй, дачушка, за маё
пытанне:
ці засталася крошка ад
снядання? —

Сказала у адказ ёй маладзіца:
— Сядай, бабуля, ў засень, на
травіцы.

Няхай збіраюць крошкі
ліхадзеі!

З табой снядание папалам
падзелім,

каб падужэла ты ў сваёй дарозе,
каб весялей было табе, нябозе.—

Паснедалі яны тады абедзве,
хоць сонца і стаяла на абедзе.

Старой была вялікая падмога.
Падзякавала. Стала зноў на ногі.

Пасля ўзяла яе руку сваёю
і павяла ля Джамны, над ракою.

7

Прыйшлі да дам. Яны былі ля
рэчкі,
свае ніяк не паканчалі спрэчкі.

Сказала ім старая, гэным
дамам:
— Цяпер адказ на запытанне
дам вам.

На рукі гэтай маладзіцы
гляньце:
яны і чорныя, яны аж з глянцам.

Яны парэпаны, яны пабіты,
яны салёным потам перамыты.

Яны мяне, якую лёс знясіліў,
да новага жыцця ўваскрасілі.

Няма на свеце ім красою
роўных,
а прыгажэй за вашы —
безумоўна!

Бо хараство усё ідзе ад працы,
пабудавала праца і палацы.

Хоць беленькія вашы,
як лілеі,—
дабра не твораць і тварыць не
ўмелі!

8

Сказала так і адышла старая.
Пайшла ў свой бок і маладзіца
тая.

На беразе ракі індыйскай,
Джамны,
пазналі ўсё ж ткі сорам тыя
дамы.

## ПРАЎДЗІВЫ ХЛОПЧЫК

У нас, а можа, і не ў нас,
у старадаўні, даўні час

жыў мудры чалавек, які
не меў ні сына, ні дачкі.

Было ў яго багацця шмат,
ды ён багаццю быў не рад.—

Адзін заўсёды, нібы цень,
хоць стане ноч, хоць прыйдзе
дзень.

Не чутна звонкіх галасоў
з яго разложыстых садоў.

Не прабяжыць малы ў пакой
з гульнёй вясёлаю сваёй.

Самота сумная адна
ад сонца ўсходу да цямна...

Аднойчы скрозь, з канца
ў канец,
прайшла вядомка, што мудрэц

узяць надумаў у сыны
хлапца з тутэйшай стараны.

А ў тым краі было ў людзей
па пяць, па шэсць і больш
дзяцей.

Вядомка ўзварушыла ўсіх:
бацькоў старых, дзяцей малых.

Як ні кажы, прываба ёсць
зайсці ў такую прыгажосць!

Няблага будзе для хлапца
прайсці навукі ў мудраца.

У дзень, прызначаны старым,
дзве сотні сталі перад ім.

Адзін другога прыгажэй,
для сэрца шчырага мілей.

Звіняць вясёла галасы.
Палац змяніўся ад красы.

Прыйшоў мудрэц. Зірнуў на іх.
Пасля сказаў, як гоман сціх.

— Вітаю ўсіх сардэчна я.
Падзяка вам усім мая

за тое, што на заклік мой
прыйшлі такою грамадой.

Каб не пакрыўдзіць вас нічым,
даю адзін іспыт усім.

Усім па зе́рнетку даю.
Іх пасадзіце вы ў зямлю

і даглядайце, каб праз час
па кветцы вырасла у вас.

Пасля прыходзьце зноў усе.
Вазон хто лепшы прынясе,

вазьму за сына я таго,
за бацьку буду для яго.—

Усе па зе́рнетку ўзялі,
пайшлі саджаць іх у зямлі.

Праз час, прызначанай парой,
ідуць вясёлай грамадой

да мудраца хлапцы усе,
і кожны свой вазон нясе.

Здаецца, што дзівосны сад
закрыў бязмежны далягляд.

Якія кветкі, цуд які
узгадавалі хлапчукі!

І толькі ў аднаго — зямля,
а ў ёй ні кветак, ні былля...

Мудрэц спыніўся перад ім:
— А што з вазончыкам тваім?!

Зямля ў ім ёсць. А кветкі дзе?!
Чаму не так, як у людзей? —

Здатанава́ўся і панік
маленькі гэны працаўнік.

Пасля сказаў ён у адказ:
— Насенне, што я ўзяў ад вас,

я пасадзіў у свой вазон
і паліваў не мала дзён.

Пушыў зямельку шмат разоў,
ды ўсё няма з яго расткоў...—

Сказаў тады хлапцу мудрэц:
— Ты, любы хлопча, маладзец!

Насенне — дрэннае было.
Ўзысці — ніколі б не магло.

Твае сябры схлусілі мне:
ўзраслі іх кветкі на мане,—

сваё насенне кожны ўзяў
замест таго, што я даваў...

Праўдзівы хлопчык — ты адзін.
Пры мне і будзеш жыць,
як сын...

. . . . . . . . . . . . . .

За сына ўзяў яго мудрэц.
На тым і казцы ўсёй канец.

## МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

Міхась Ціханавіч Лынькоў нарадзіўся 30 лістапада 1899 г. у вёсцы Зазыбы Віцебскага павета (цяпер Лёзненскі раён Віцебскай вобласці). Вучыўся ў Рагачоўскім двухкласным вучылішчы, затым у Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі (1913—1917), пасля заканчэння якой працаваў настаўнікам у Ліпініцкай пачатковай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён). На працягу 1919—1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у паходзе супраць белапольскіх акупантаў і ў разгроме банд Булак-Балаховіча.

Пасля дэмабілізацыі працаваў настаўнікам у Сверsuccessionжанскай школе Рагачоўскага раёна. З мая 1925 г.— сакратар рэдакцыі бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», а з 1927 г.— яе галоўны рэдактар. Тут пачаў друкаваць свае першыя вершы, фельетоны, нарысы, апавяданні. Быў членам літаратурнай арганізацыі «Маладняк».

З 1930 па 1932 г. М. Лынькоў працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, затым быў рэдактарам часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1933—1941), старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1938—1948). У 1939 г. пісьменнік удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны рэдагаваў франтавую газету «За Савецкую Беларусь». Пасля вайны працаваў у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, быў яе членам-карэспандэнтам (з 1936 г.), а потым — акадэмікам (з 1953 г.).

Першы зборнік М. Лынькова «Апавяданні» выйшаў у 1927 г. Затым выходзяць з друку зборнікі апавяданняў «Гой» (1929), «Андрэй Лятун» (1930), «Саўка агіцірнік» (1933), «На вялікай хвалі» (1934), «Баян» (1935), «Сустрэчы» (1940), аповесць «Апошні зверыядавец» (1930), раман «На чырвоных лядах» (1934).

У 1958 г. выходзіць яго чатырохтомны раман-эпапея «Векапомныя дні», за якія пісьменніку была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа (1968).

М. Лынькоў напісаў цікавыя арыгінальныя творы для дзяцей, якія з'явіліся значным укладам у развіццё беларускай дзіцячай літаратуры. Гэта апавяданне «Янка-парашутыст» (1935), аповесць-казка «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1935). Падзеям грамадзянскай вайны прысвечана аповесць «Міколка-паравоз» (1936, экранізавана ў 1957 г. кінастудыяй «Беларусьфільм»). Шмат якія апавяданні са зборнікаў «Сустрэчы» і «Астап» сталі любімымі творамі дзяцей («Пра хлопчыка Яську», «Ядвісін дуб», «Васількі»).

За вялікія заслугі ў развіцці савецкай літаратуры яму было прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка БССР (1962).

Памёр М. Лынькоў 21 верасня 1975 г.

### МІКОЛКА-ПАРАВОЗ

*(Урыўкі)*

#### ХАТА НА КАЛЁСАХ

Вы не бачылі Міколкавай хаты?

Яна вунь у самым тупіку, дзе канчаюцца станцыённыя лініі, дзе безліч стрэлак, дзе стаяць недалёка прыгожыя семафоры, дзе ў бязмежныя прасторы працягнуліся, пабеглі бліскучыя рэйкі.

Па рэйках тых бягуць цягнікі. Бягуць і днём і ноччу. І шэраю раніцой. Калі яшчэ сонца не ўсходзіць. Калі яшчэ Міколка спіць. Калі

спяць усе звычайныя людзі, якія ноччу не ў машыністах, не ў кандуктарах, не ў рабочых дэпо, не ў абходчыках пуцявых. А цягнікі бягуць. Зімой і летам, увосень і ўвесну. І чым халадней, тым гучней гудуць паравозы, углядаючыся сваімі пукатымі бліскучымі вачыма ў далёкія агеньчыкі семафораў. Агеньчыкі белыя, зялёныя, чырвоныя. І кожны паравоз крычыць па-свойму. Адзін так гудзіць, што шыбы трасуцца ў вокнах. У другога хрыпаты голас, нібы прастудзіўся паравоз, бегаючы ў зольных туманах і завеях. А трэці — якая-небудзь кукушка — не гудзіць, а проста пасвіствае галаском такім тонкім, пранізлівым. І па голасу пазнае Міколка кожны паравоз, ці то таварны, ці то пасажырскі. І часам ноччу, пачуўшы голас далёкага паравоза, Міколка будзіць матку:

— Уставай, мама, самавар стаў, бацька едзе з пасажырскім. Яго паравоз гудзіць.

— Сам ты паравоз! — дражніць матка Міколку.— Вось спаць не даеш толькі, пасажырскі яшчэ далёка...

Але матка ўставала, ставіла самавар, раздзьмухваючы яго старой халяўкай ад ботаў. Міколка прыслухоўваўся, як прабягаў з шумам і грукатам, пастукваючы па стрэлках, цягнік, як зацішаў ён хаду, а потым і зусім станавіўся на станцыі. Тут зменьваліся паравозы, зменьваліся і машыністы. І заўсёды акуратна, праз якія-небудзь хвілін дзесяць, дахаты з'яўляецца Міколкаў бацька.

— А ты прачнуўся ўжо, кур'ерскі? — гаварыў ён да Міколкі і заўсёды намерваўся ўхапіць яго за нос сваёй чорнай прамазучанай рукой. Міколка хаваўся пад коўдру і, паказваючы адтуль толькі кончык носа, пачынаў чохкаць, як сапраўдны паравоз.

— Чшы... чшы... чшы... чшы-чшы-чшы...

І важна гаварыў потым да бацькі:

— Ага! Не можаш мяне ўзяць... Забуксаваў!..

«Забуксаваў» — гэта значыць, што бацька далей не пасунецца ні на крок, ніяк не ўхапіць яму цяпер за Міколкаў нос. Не будзе ж ён бруднымі рукамі за коўдру брацца, павінен ён памыцца як след. І калі бацька зоймецца з умывальнікам, Міколка таропка злазіць з ложка і бяжыць да бацькавай дарожнай скрынкі. Ён спрабуе яе на вагу, а ці ёсць што ў ёй, ці варта ля яе турбавацца.

— Прывёз, татка, што-небудзь? — грозна пытае ён бацьку.

— А што будзе, калі не прывёз? — перапытвае бацька, смяецца.

— Што ж будзе? Нічога не будзе...— гатоў пакрыўдзіцца Міколка.

А бацька адчыняе скрынку, дастае шчарбаты чайнік, загорнутую ў паперыну шклянку, кавалкі «зайцавага» хлеба — так заве ён дарожныя недаедкі. Дужа ж смачныя гэтыя недаедкі. Не сказаць, каб вялікія ласункі былі з чорствага хлеба, але еў яго Міколка з вялікай ахвотай, толькі пугаўка-нос пабліскваў ад вялікага задаволення. Есць, і здаецца яму, нібы ён таксама памочнік машыніста, як бацька. Хлеб пахне троху вугалем і аддае крыху ад яго і мазутным пахам. Адным словам, не звычайны хлеб, а хлеб, які праехаў на паравозе сотні вёрстаў, падсушыўся, паабіваўся ў скрынцы, прапах. І не дзіва, што як змеле Міколка гарбушку, дык адразу і пайшоў:

— Чшы... чшы... чшы... Чшы... чшы... чшы...

Паімчаў паравоз!

Аж падлога дрыжыць ад Міколкавага бегу. Бяда толькі, што не разбяжышся як след: і цесна, і маці ўшчувае:

— Кінь ты дурыкамі займацца — узняўся ні свет ні зара. 'Шчэ брата разбудзіш...

Акрамя «зайцавага» хлеба, у бацькавай скрынцы бывае шмат якіх цікавых рэчаў. Не бывае ніводнага разу, каб бацька вярнуўся з пуці з пустой скрынкай. Заўсёды ў скрынцы знаходзяцца новыя цацкі. То незвычайную гайку медную прывязе бацька, то фарфоравы ізалятар, то трубку якую бліскучую, а то проста каменьчыкаў розных, каляровых. Часам прывязе звычайны кавалак каменнага вугалю, падае Міколку:

— Вось табе новая цацка!

Міколка гатоў і ў крыўду ўкінуцца: знайшоў бацька цацку! Ды іх, гэтакіх цацак, вунь цэлыя горы каля дэпо!

— А ты прыглядзься вось лепш, тады не будзеш і носа задзіраць...

І сапраўды цікавы камень. На адным баку малюнак, нібы выразаў нехта цэлую галінку, і сцяблінкі тут, і дробнае лісцейка разышлося веерам.

— Хто маляваў? — пытае Міколка.

— Ніхто... Сама маці-прырода...

— А ты не абманьвай... Яшчэ памочнікам называецца, жарты строіць...— ушчувае Міколка бацьку.

Тады расказвае бацька розныя цікавыя гісторыі пра гэты самы камень. Нібы быў ён тысячы год назад не каменем, а самым звычайным дрэвам, высокім, прыгожым, з гаманлівым лісцем зялёным. І вось найшла навальніца, паваліліся дрэвы, усю зямлю ўслалі векавыя гіганты. Іх засыпала зямлёй, зацягнула балотнаю тванню. Ляжаць дрэвы пад зямлёй, ляжаць — не гніюць. Год ляжаць, дзесяткі ляжаць, ляжаць сотні і тысячы гадоў. Ляжаць, пакуль не скамянеюць. І лісцейка як адціснулася тысячы год назад, так і захавала свой малюнак у акамянелым дрэве. А часам трапляецца адбітак-адпячатак тагачасных казюрак, жывёлінак. Вось якая гісторыя гэтага малюнка...

Слухае Міколка. Сапраўды ж цікава. Бацька яшчэ раскажа і пра нафту, якую таксама паляць на паравозе. Бацька раскажа і пра мазуту, дзе і як яе здабываюць. Ён раскажа і пра паравоз, і пра чыгунныя рэйкі, і пра розныя сігналы. Багата чаго ведае ён. І нездарма здзіўляецца заўсёды Міколка і кажа ў роздуме:

— Разумны ты, бацька!

Праўда, з гэтым не зусім каб пагаджалася матка. Тая трымаецца трохі іначшых думак пра бацьку, і пра гэтыя свае думкі кажа часам уголас, ды ў які яшчэ голас. Хоць вушы тады затыкай:

— І калі ты ўжо сур'ёзным чалавекам станеш? Другія ж, глядзі, у старшыя машыністы ўжо выбіліся... Другія, глядзі, на ўласныя хаткі з садамі ўзбіліся... А ты век тут карпей ды гібей у гэтым дзіравым вагоне... Галава непуцёвая...

На гэта бацька звычайна нічога не адказваў, маўчаў. Альбо важна пытаўся: «Што скажаш яшчэ цікавага?» Альбо запяваў канарэечку.

Канарэй, канарэй-пташачка,
Канарээ-е-чка жалабна пяець.

Ну што ты з яго возьмеш тады, з гэтай канарэечкай? Пабурчыць, пабурчыць маці ды сціхамірыцца.

А вагон сапраўды дзіравы. Вагон — хата Міколкава. Стары парахнявы вагон, з пашчапанымі коламі, са збітымі буферамі. З'ездзіўся вагон, пастарэў. Паставілі яго ў тупік пад жыллё. І колькі вунь гэтых вагонаў, цэлы пасёлак — жывуць у іх дэпоўцы: токары, слесары, машыністы з качагарамі. І цеснавата ў вагоне. Палову займае бацькаў ложак. Пасярэдзіне складзена невялікая цагляная печка. На другой палове месцяцца дзіцячыя тапчаны, тут жа спіць Міколкаў старэйшы брат, які ўжо сам зарабляе, ходзіць у змазчыках. Тут жа спіць дзед Астап. Тут жа невялічкі стол, за якім палуднуюць, вячэраюць, на якім маці бялізну качае. Цесна ўсё ж.

Адно што добра: выскачыш з вагона і тут табе воля-вольная. Бяжы куды хочаш: ці пад дэпо, ці на пуці, ці на недалёкае балота з лесам. Знадворку і вагон прыгожы. Яшчэ не сцёрлася назусім чырвоная фарба. З левага боку намаляваны чорным па беламу двухгаловы арол з царскай каронай. Пад арлом надпіс: «40 человек, 8 лошадей».

— Дзе ж тыя коні? — пытае бацьку Міколка, калі старэйшы брат чытае часам уголас гэты надпіс.

— А мы з табой чым не коні? — пасмейваецца бацька.

— А чаму ў арла дзве галавы?

— Таму што адной не хапае, дзіравая... Таму, бачыш, і каронай накрытая...

Дужа там разбіраўся ў тых царскіх каронах Міколка! Куды цікавей былі яму розныя цацкі: гайкі, каменьчыкі, шасцяронкі чыгунныя, розныя блішчастыя гузікі, якія знаходзіў часамі на пуцях. Ды яшчэ безліч розных малюнкаў, аж паўсцяны вагона было вылеплена імі. Кожны дзень папаўняў Міколка сваю калекцыю, ці, як называў бацька, карцінную галерэю. Шукаць доўга новыя малюнкі не прыходзілася. Даволі прайсціся раз у дзень па чыгунцы — вярсты дзве туды ды назад — вось і поўныя кішэні здабытку. Багата чаго застаецца на пуцях ад пасажырскіх цягнікоў — тут і паперкі ад цукерак, папяросныя карабкі, часам цэлыя кніжкі, газетныя лісты, цікавыя малюнкі на розных бутэльках.

— Смачна ядуць, чэрці! — думаў часам Міколка, збіраючы сваю калекцыю. Пад чарцямі ён разумеў усіх тых, што ехалі ў пасажырскіх цягніках, асабліва ў вагонах першага і другога класа. Гэтыя вагоны ён вызначаў па іх колеру. Звычайны вагон бура-зялёнага, прапыленага колеру, а другі і першы клас — цёмна-сіняга, блакітнага, а часам жоўтага.

— Паны...— у дадатак да чарцей называў ён пасажыраў гэтых вагонаў. І сапраўды, ездзілі ў іх багата апранутыя людзі, прыгожыя ўборы былі на дзецях, якія паказваліся ў вокнах.

— Самі цукеркі жаруць, салодкую гарэлку п'юць, а мне толькі пустыя паперкі ды пустыя бутэлькі... Вось бы ўзяў бацька ды звярнуў цягнік пад адкос, няхай бы тады гэтыя паняняты пехатой прайшліся...— так думаў часам Міколка, не на жарты сярдуючы на гэтых

людзей, якія, відаць, не разумелі смаку ў «зайцавым» хлебе і жылі на ўсім гатовым. І дзеці іх у прыгожых шапках з залатымі літарамі. Знайшоў раз на пуцях Міколка такую шапку, дахаты прынёс, на галаву прымераў. Паглядзеў на шапку бацька ды кажа:

— Дурань ты, Міколка! Хіба ў гэтай шапцы нам ды пры мазутнай справе?.. Не да твару, браце, нам такая шапка... У такіх шапках, браце, ходзяць толькі буржуйскія дзеці...

— А хто такія буржуі?

— Буржуі? — задумаўся бацька.— Гэта, бачыш, такія людзі, якія нічога не робяць і смачна ядуць... Такія, браце, пузатыя людзі, на чужым карку жывуць... на маім вось, на тваім...

Памацаў Міколка свой карак, здзівіўся.

— Няхай жа паспрабуе сесці каторы, я яго гайкай па ілбе.

— Дзіва што, гайкай...— пасмяяўся бацька.

Але думка пра буржуяў не пакідала Міколку. Часта ён чуў пра буржуяў у гутарках бацькі з другімі суседзямі, рабочымі. Буржуямі часамі лаяўся і старэйшы Міколкаў брат — змазчык. І ў хуткім часе адбылася сустрэча Міколкі з буржуем. Можа і не з сапраўдным буржуем, але ж вельмі да яго падобным. Зайшоў аднаго разу да іх нейкі начальнік дэпо. І такі ж тоўсты-тоўсты, а на пузе бліщчастыя гузікі, залатыя, няйначай. Зайшоў ён у вагон, абышоў кожны куток, усё поркаў нешта сваім бліскучым кіёчкам, поркаў, носам вадзіў з боку ў бок ды моршчыўся, як той грыб-смарчок, што расце пад штабелямі старых шпал. На матку накінуўся.

— Псуеце вы мне тут памяшканне, зусім не даглядаеце за падлогай... Смецце каля вагона... Выганю ў дваццаць чатыры гадзіны...

І зусім узлаваўся, аж пляміны белыя заскакалі на тлустым твары, ды кіёчкам сваім як дзеўбане ў сценку, у самую галерэю карцінную Міколкаву.

— Гэта што? Сцены паскудзіць? Казённае памяшканне псаваць? Ці мала смецця ўсюды, дык яны яшчэ на сцены вешаць... А ну, венік сюды, паздзіраць усё, памыць, паскрэбсці...

А сам палкай поркае, здзірае Міколкавы малюнкі. І калі дабраўся да прыгожай крышкі з папяроснага карабка,— быў то малюнак дзяўчынкі на срэбнай паперы,— не сцярпеў тут Міколка, да начальніка кінуўся.

— Ты хто? Ты сабіраў мне карцінкі, каб іх здзіраць?

Той зірнуў скоса на Міколку, паморшчыўся. А Міколка наступае:

— Буржуй ты.

Начальнік аж абамлеў, маці перапалохалася.

— Пузан ты! Ходзіць, як бочка ў штанах... Бач, раз'еўся на маім карку... Вон!

Начальнік, доўга не думаючы, даў ходу. Маці за ім.

— Даруйце. Дзіця зусім не разумее... Вярзе, не разабраўшы што...

А той не слухае, далей шпарыць. Толькі і кінуў:

— Хамы вы! Самі хамы і дзяцей робіце хамамі...

Дасталася добрая прачуханка Міколку ад маткі. Але бацька, прыехаўшы з работы і даведаўшыся аб «буржуі», толькі пасмейваўся.

— Так іх, Міколка, так. Калі дах вось прагніў, перакрыць трэба,

дык іх нямашака... А да цацак дзіцячых чапіцца надумаўся... Крый іх, Міколка, і ў хвост, і ў грыву...

Так жыў і гадаваўся Міколка-паравоз. Ён і сам добра не ведаў, чаму празвалі яго паравозам. Магчыма за тое, што вельмі ж упадабаў ён паравозы, асабліва ж пасажырскія. Стаіць такі прыгажун ля дэпо, калёсы высокія, чырвоныя, не раўнуючы, як ногі ў бусла балотнага. Альбо выязджае такі прыгажун з дэпо і так важна парай пыхкае:

— Пых... пых... пых...

Ну як тут уцерпець Міколку ды не падсесці ззаду на тэндэрную падножку ды не праехацца да паваротнага круга. Праўда, сцэпшчыкі лаюцца часам:

— Злазь, жаба, а то падмажаш калёсы!

Дзе ты там злезеш!

Цікава і ля паваротнага круга. Паравоз вялікі-вялікі, а на кругу стаіць, як дзіцё, не паварухнецца. І адзін рабочы, усяго толькі адзін, пfamaрочвае гэты самы круг з паравозам. Канешне, Міколка не праміне, каб не дапамагчы тут рабочаму. Стане поплеч, націсне рукамі на дышла круга, і здаецца Міколку, што пад яго рукой паварочваецца шпарчэй круг — гэткая аграмадзіна, і на ёй паравоз вялікі, стаіць і пыхкае. Вось павернуты круг, Міколка зноў на падножку, і паравоз зноў жывы. Загудзіць, заляскоча і так паімчыцца, што толькі пыл курыць ззаду аж да самых стрэлак, адтуль паравоз ідзе назад, на станцыю, пад пасажырскі поезд. На станцыі трэба пільнавацца, каб не трапіць на вока жандару. Той не любіць дзяцей. Толькі заўважыць і бяжыць услед, памахваючы шабляй-селядцом. З падножак зганяе.

Ведаў бацька пра Міколкавы практыкаванні на падножках, ушчуваў колькі разоў, але нічога не дапамагала.

— Ты памочнік машыніста? — пытаў Міколка ў такіх выпадках бацьку.

— Ну, а што?

— Вот табе і што. На паравозах ездзіш?

— Езджу. А што з таго?

— А нічога... Павінен і я ездзіць...

Што ты тут скажаш Міколку? Нічога. І, выязджаючы ў чарговую паездку на пуць, бацька толькі прасіў усіх знаёмых сцэпшчыкаў і стрэлачнікаў на станцыі:

— Вы, браткі, пільнуйце хаця, каб не трапіў мой басурман на рэйкі...

— Дзе ты яго ўпільнуеш, блыху? На жывое будзе жывы, нідзе дзенецца...

— Ды яно ж так...

Так гадаваўся Міколка на рэйках.

⟨...⟩

## МІКОЛКАЎ БРАНЯПОЕЗД

З далёкай Нямеччыны прыходзілі цьмяныя чуткі аб надыходзячай там рэвалюцыі. Урэшце прыйшлі чуткі, што гэтая рэвалюцыя адбылася. Але генералы, відаць, хавалі гэтыя чуткі ад салдат, жорстка ка-

ралі іх за малейшыя ўчынкі, расстрэльвалі за адно толькі слова аб волі, аб рэвалюцыі. І ўжо сцягваючы ад савецкіх граніц свае сілы, яны не пакідалі старых намераў: як мага спустошыць краіну, зруйнаваць яе, абяссіліць.

Велізарныя запасы хлеба былі звалены на станцыі, чакалі вагонаў. Стаяла некалькі дзесяткаў цягнікоў з хлебам, з жывёлай, з розным іншым дабром, нарабленым па гарадах і вёсках. Не хапала паравозаў. А тыя, якія былі, псаваліся рабочымі. Немцы шалелі, наладжвалі зверскія кары.

— Не даць вывозіць хлеб! — пастанавіў падпольны бальшавіцкі камітэт.

Ад рабочых была выбрана спецыяльная дэлегацыя з трох чалавек. У яе ўваходзіў і Міколкаў брат, змазчык Павел. Дэлегацыя наведала нямецкі штаб, перадала патрабаванні рабочых да нямецкай арміі: мірна пакінуць горад і ехаць у Нямеччыну... Рабочыя згодны даць цягнікі пад эшалоны... Пад хлеб, пад награбленае дабро рабочыя вагонаў не дадуць... Пад гэтыя цягнікі ніводзін паравоз не выйдзе з дэпо...

Такія былі мірныя патрабаванні рабочых.

Сівы, падцягнуты генерал моўчкі выслухаў гэтыя патрабаванні. Ён доўга маўчаў, калі дэлегацыя кончыла гаварыць. І цяжка было даведацца па сухім паголеным твары, аб чым думае гэты генерал, увешаны ордэнамі, звёздамі, рознымі шнуркамі і шнурочкамі. І толькі праз хвіліну важна падняўся ён з крэсла, важна падышоў да дэлегацыі, стаў бокам да старэйшага з дэлегацыі, да старога машыніста Арлова. Працадзіў праз зубы:

— Як вядома вам, я генерал арміі яго вялікасці імператара Вільгельма... Я прадстаўнік самай культурнай, самай перадавой у свеце нацыі... Вам павінна быць вядома, што з дзікунамі мы не размаўляем... Для дзікуноў у нас штык, кулямёты, вінтоўкі. Можаце дзякаваць мяне, што я не расстраляў вас за абразу нямецкай арміі такімі ганебнымі, такімі дзікімі, такімі нечуванымі яшчэ ў гісторыі патрабаваннямі... Можаце выбірацца вон!

Відаць было, як генерал ледзь-ледзь стрымліваў гнеў. Суха паблісквалі яго шэрыя вочы, шчаціліся сівыя бровы.

Дэлегацыя не пайшла. Загаварыў стары машыніст:

— Выгнаць вон — гэта справа няцяжкая... Але ж гэта не вырашае справы... А мы, пане генерал, прыйшлі не ў жарты з вамі гуляць і не аб дзікунстве спрачацца, дзе яно і ў каго... Аб гэтым пагаворым пасля. Мы яшчэ раз пытаем вас: згодны вы прыняць нашы ўмовы ці не... Калі не згодны, тады наракайце самі на сябе...

Што адбылося тут — цяжка апісаць. Куды дзеўся вонкавы спакой генерала, яго славутая вытрыманасць. Ён зверам кінуўся на старога машыніста і люта ўдарыў яго па твары. Стрымаўся стары машыніст. Але не сцярпеў Міколкаў брат, малады змазчык Павел. Як стаяў поплеч з генералам, так і ўссеў на яго і біў, біў, забыўшыся на ўсё на свеце. Падскочылі ад'ютанты, сілком адцягнулі яго ад генерала. Паўла выцягнулі на штабны двор і тут доўга каталі яго, пакуль ён не страціў прытомнасць. Усю рабочую дэлегацыю адвялі ў турму.

А Паўла загадалі судзіць ваенна-палявым судом за знявагу нямецкага генерала.

Суровая вестка аб лёсе рабочай дэлегацыі маланкай абляцела ўвесь горад, дэпо, станцыю. І праз якія дзесяць хвілін трывожна гудзелі гудкі над дэпо, над фабрыкамі, над паравозамі. Паравозы выпускалі пару, тушылі топкі. Разыходзіліся з дэпо рабочыя, заварушыліся рабочыя баявыя дружыны. І калі вечарам намагаліся немцы штыкамі загнаць машыніста на паравоз і пусцілі ў ход зброю, каб рушыць першы цягнік, з дэпо, з-за вадакачкі пачуліся дружныя стрэлы. То рабочыя абстрэльвалі немцаў, якія рыхтавалі цягнік. На станцыю падышоў моцны нямецкі атрад. Ён адцясніў крыху рабочых, паспрабаваў адправіць цягнік. Але перад самым носам паравоза ўзарваліся выхадныя стрэлкі, паравоз зарыў носам зямлю, зашыпеў, абяссілены, загарадзіў чыгуначны шлях. Пачалася моцная перастрэлка. Немцы абстрэльвалі дэпо, кулямётным агнём прайшліся па рабочым пасёлку. Не здаваліся рабочыя, хоць і падаліся назад. Адступаючы, падпалілі нямецкія вайсковыя склады ля станцыі. Гарэлі і рваліся патроны, снарады, моцныя выбухі патрасалі паветра. Нават немцы прымушаны былі крыху адступіць ад станцыі, далей ад страшэнных выбухаў, пажару.

Раніцою падаспелі да рабочых партызанскія атрады Сёмкі-матроса. З гікам, са свістам імчалі наўскач смелыя коннікі, адрэзалі на ляту нямецкую батарэю і ўраз павярнулі гарматы на немцаў, на штаб. Немцы спешна адступалі ад станцыі, падаваліся ў горад, акопваліся на ўскраінах.

Пачаўся зацяглы бой. Ён ішоў то заціхаючы, то зноў узрастаючы гарачымі перастукамі кулямётаў, залпамі карабінаў, цяжкімі выбухамі гармат. Цяжка даводзілася партызанам. Прызвычаеным да боек у лясах, у засадах, ім нязручна было весці бой з пахаваўшыміся ў акопах немцамі, з буйнымі нямецкімі атрадамі, узброенымі бамбамётамі і гарматамі. Але і гэта не магло стрымаць іх, і групы коннікаў-партызан рабілі адчайныя налёты на нямецкія акопы і кулямёты. Не вытрымлівалі немцы, вельмі баяліся партызанскай шаблі, і то тут, то там рабілі яны перабежкі, адыходзячы далей ад штаба.

У смелым налёце на немцаў загінуў Сёмка-матрос. Пагарачыўся ён крыху. Захапіўшы нямецкі кулямёт, кінуўся ён за ўцякаўшым афіцэрам, высока ўзнёсшы вострае джала шаблі. І вось-вось ужо апусціцца гэтае джала на бліскучы лак імператарскай каскі. Аж прыціх Міколка, назіраючы за паядынкам. Перастаў з кулямёта страляць, каб не параніць сваіх. Уздыбіўся Сёмкаў конь, вось-вось пераскочыць цераз афіцэра... І глуха войкнуў Міколка. Бачыў ён: абярнуўся на бягу афіцэр, стрэліў ва ўпор... Скочыў конь ашалелы. Нахіліўся Сёмка, апусціў галаву на пахучую конскую грыву, рукі апалі, і ўвесь ён стаў хіліцца набок, усё ніжэй і ніжэй... Бачыў Міколка, як узнесеная Сёмкава шабля ўпала ўніз на зямлю і ціха дзвынкнула, загойдалася, устроміўшыся астрыём у жоўты пясок. На гэты ж пясок упаў Сёмка-матрос, камандзір партызанскіх атрадаў, слаўны ваяка і бальшавік...

Прайшоўся далоняю па спацеламу твару Міколка і націснуў на

спуск кулямёта. Здрыганулася, загула зямля перад ім. Грымеў кулямёт. То Міколка спраўляў памінкі па старэйшаму таварышу, па любімаму партызану, прыяцелю. Не стала афіцэра. Але не ўстаць з зямлі і Сёмку-матросу, і далёка-далёка адкацілася запыленая яго бесказырка, што бачыла свету багата, бачыла сіняе мора, бачыла вольныя караблі, неразлучнай была з чалавекам, які жыццё любіў і ведаў цану чалавечай нянавісці і любві.

Так загінуў Сёмка-матрос.

Камандавацъ боем стаў дзед Астап. І дрэнна б прыйшлося немцам, ужо генерал гатовы быў ісці на перамаўленні з рабочымі, як адбыліся падзеі, адразу пагоршыўшыя для рабочых і партызан вынікі бою. Дзед Астап пачуў свісткі паравозаў. І, угледзеўшыся на захад, збялеў дзед, рукой безнадзейна махнуў.

— Дрэнна, братцы! — сказаў ён.— Памыліліся мы крыху... Трэба было з захаду чыгунку ўзарваць... Немцам ідуць падмацаванні, вунь іхнія эшалоны.

Павярнулі гарматы на эшалоны. Але было позна. Немцы акружылі горад, абыходзілі станцыю. Трэба было адступаць. Немцы пачалі насядаць з бакоў, захапілі ўжо некалькі дзесяткаў чалавек у палон.

Тады падышоў да Міколкі дзед, загадаў:

— З кулямётамі мы самі ўправімся... Пакуль будуць патроны, немцам не здамося... А ты, пакуль не позна, бяжы за станцыю... Там, у тупіку, на паравозных могілках схаваны намі пасажырскі паравоз. Ён стаіць пад парай... Дык гані на ім да чырвоных... Вёрст пяцьдзесят да іх будзе, яны павінны наступаць сёння на суседнюю станцыю... Прасі дапамогі... Не дамо немцам награбленага дабра...

Як ветрам падхоплены, імчаў Міколка. Вось і тупікі. Вось і паравозныя могілкі. Стаяць на іх старыя, паіржавелыя паравозы. Пасажырскія, таварныя, манеўровыя, «кукушкі». А вось і жывы паравоз. Прытаіўся, схаваўся за паравозным ламаччам. Аж дрыжыць, так чакае дарогі прыгажун пасажырскі. Паравозная каманда ў парадку. У кожнага карабіны.

Уздыхнуў паравоз парай і без гудкоў, без свісткоў выбраўся на галоўны пуць. Прастора перад ім, разгон бязмежны. Аж колы сакочуць, не ўгледзіш за дышлам, за размашыстым вобадам. Не ідзе, а ляціць паравоз, і толькі мільгаюць паабапал пераезды, слупы, паласатыя вёрсты. Нахіляюцца бярозы, і іх шэпт кучаравы зліваецца з гарачым дыханнем машыны.

А паравоз імчыць. Толькі і чуваць: ча-ча-ча-ча... ча-ча-ча...

Аж калышацца тэндэр, гойдаецца з боку ў бок, ды ўзвіваюцца клубы пылу ззаду — нічога не відаць там у дыме, у пыле.

Вось і суседняя станцыя. Тут могуць быць яшчэ немцы.

— Каб жа не затрымалі! — адна ва ўсіх думка.

Трывожна загудзеў паравоз і, не збаўляючы ходу, імчаў на закрыты семафор. Замітусіліся рабочыя там. Бачылі, здарылася нешта дужа важнае. Перакінулі стрэлкі на галоўны пуць, і паравоз маланкай прамільгнуў праз станцыю. Нямецкі патруль, выскачыўшы на перон, паслаў наўздагон некалькі стрэлаў. Але дзе ты вецер дагоніш!

Праз якое паўгадзіны былі на жаданай станцыі. Паравоз стаў,

як укопаны, ля браняпоезда. Бачыў Міколка, што гэта наш браняпоезд. Шырокі чырвоны сцяг калыхаўся над закутым у браню паравозам.

— Хутчэй да начальніка поезда! — кінуў Міколка падаспеўшым чырвонаармейцам. Вось ён і ў начальніка, у маладога камандзіра. Той слухае яго ўважліва.

— Адразу ж давайце нам дапамогу... Неадкладна, вось зараз жа...

— Добра! — заўважыў начальнік і загадаў падрыхтаваць да адпраўкі поезд ды, акрамя таго, быць напагатове запасному эшалону.— А цяпер можаш спакойна расказаць мне аб усім. І колькі немцаў... І ці ёсць гарматы ў іх... Ці цэлая пуць...

Аб усім расказаў Міколка — і аб немцах, і аб рабочай дэлегацыі, і аб сваім партызанстве...

— Ну, дык ты, выходзіць, не звычайны хлапчына, а слаўны герой!

Некалі было Міколку пра сваё геройства расказваць, ды і не любіў ён пахваляцца гэтымі справамі. Камандзіра прыспешваў.

— А ў нас ужо ўсё гатова... Садзіся вось да нас у вагон, паедзем...— сказаў яму камандзір.

— Не... мне ўжо дазвольце на ваш паравоз... Я з машыністам паеду!

— Ну, што ж, бяжы на паравоз, калі ахвота!

Пабег Міколка да паравоза, але дзе ты ўзбярэшся на яго, закутага ў браню. Пастукаў Міколка, загадаў:

— Адчыняйце! Загадана камандзірам ехаць з вамі!

Паволі адсунуліся сталёвыя дзверы. Зірнуў Міколка, і слёзы ўмомант твар укрылі: не ад страху, не ад перапалоху, ад вялікай радасці былі Міколкавы слёзы. Перад Міколкам стаяў яго бацька. Ён быў за машыніста на браняпоездзе. Падскочыў Міколка, павіс у бацькі на шыі, прынік шчакой да калючай шчаціны яго барады. Бацька націснуў адной рукой на паравозны рычаг, другой лашчыў сына, гладзіў яго, цалаваў валасы, шурпатую абветраную шчаку.

— Як жа гэта так, партызан мой малы? Як жа гэта так здарылася, што вас немцы ў крыўду бяруць! Ну, расказвай! — гаварыў бацька і пільным вокам углядаўся наперад, куды імчаў цяпер браняпоезд. Глуха гудзелі і перазваньвалі металам гарматныя вежы, бранявыя бакі вагонаў ашчаціліліся кулямётамі. Цяжка пастуквалі рэйкі пад паравозам. Паравоз бег, набіраючы імклівы разгон.

І калі сказаў Міколка, што немцы абстралялі дэпо, што яны білі з кулямётаў па рабочым пасёлку, што забралі ў турму рабочую дэлегацыю і па-зверску білі брата Паўла,— пасуровеў бацька, да болю сціснуў рычаг паравозны. Маўчаў з хвіліну. А браняпоезд імчаў. Неўзаметку ляцелі насустрач чыгунныя вёрсты. Гудзелі гарматныя вежы, паварочваліся паволі, рыхтаваліся да сустрэчы.

— Ну, што ж! Не падай духам, Міколка! — сказаў павесялеўшы бацька.— Хто, хто, а мы пераможам... Не можам іначай! Такі, сыне, закон у нас: не пераможам мы, сатруць нас з твару зямлі, змяшаюць з пылам, з крывёю... З нашай уласнай крывёю... Таму і павінны мы перамагчы!

Імчаў браняпоезд.

* * *

А рабочыя выбіваліся з апошніх сіл. Многа страт панеслі партызаны ў няроўным баі. Ужо выбілі са станцыі партызан і рабочых, ля самых штабеляў абараняліся яны ды займалі невялікую ўскраіну горада. Маўчалі партызанскія кулямёты. Шкадавалі апошніх патронаў. Каб выкурыць рабочых з ускраіны, немцы падпалілі некалькі дамоў, і вялікі пажар узняўся над горадам.

Рабочыя не здавалі апошніх сваіх пазіцый, ладзілі барыкады з дроў, забіраліся на дахі дамоў, каб зручней адбіваць налёты немцаў. Але відаць было, што перамогуць немцы, што гадзіну-другую пратрымаюцца яшчэ рабочыя і прымушаны будуць ці здавацца на нямецкую літасць, ці загінуць пад моцным кулямётным агнём. І быў ужо момант, калі дужа задумаўся дзед Астап над тым, як бы зручней вывесці людзей з небяспекі, жыццё адратаваць ім. Задумаўся на хвіліну і страпянуўся раптам. Гучнае і радаснае «ўра» страсянула паветра. Загрымелі замоўкшыя было партызанскія кулямёты, сціх на хвіліну нямецкі агонь.

Зірнуў дзед у бок ад станцыі і аж крыкнуў ад вялікае радасці. Вёрст за пяць-шэсць ад станцыі імчаў бранявоезд. Ясна відаць быў чырвоны сцяг над ім. Сцяг то разгараўся чырвоным полымем, то нік у клубах чорнага паравознага дыму.

— Трымайся, хлопцы, нашы імчаць!..

Акрыялі ад радасці рабочыя і партызаны.

Заварушыліся немцы. Павярнулі некалькі гармат на бранявоезд. Узвыла паветра пад гарачым свістам снарадаў. Крактануў у адказ бранявоезд, ды як крактануў — ураз сціхлі гарматы немцаў. А бранявоезд яшчэ і яшчэ — цяжка вухкала па лясах, па-над горадам. Бранявоезд біў з цяжкіх гармат.

Немцы кінуліся да пуцей, каб рэйкі ўзарваць, акапацца ля чыгункі. Але рабочыя і партызаны не пускалі іх да рэек, метка знімалі кожнага, хто намыкаўся ўскочыць на пуць.

А бранявоезд ішоў.

Крыху адчыніў Міколкаў бацька сталёвае акенца, каб пуці праверыць, ці цэлыя, ці пашкоджаныя. Глянуў туды і неяк раптам асеў, асунуўся, стаў хіліцца да падлогі. Навіс на рычаг усім цяжарам свайго цела. Павярнуўся рычаг, паравоз абарваў свой бег і ўсё цішэй, цішэй, вось і зусім становіцца паравоз. Здзіўленыя твары чырвонаармейцаў паказаліся ў шчылінах-акенцах вагонаў.

Узрадаваныя немцы беглі насустрач і шалёна крычалі, размахваючы ручнымі гранатамі. Прыціхлі рабочыя і партызаны, не разумеючы, што сталася з бранявоездам.

І не памятае Міколка, як адбылося ўсё гэта. Асцярожна адхіліў ён бацькаву руку ад рэгулятара, націснуў на рычаг абедзвюма рукамі — ірвануў паравоз, зашыпеў весела парай, паімчаў наперад. З бранявоезда ва ўсю загаварылі кулямёты, грымнулі яшчэ разы са два цяжкія гарматы. А Міколка ўжо крычаў двум чырвонаармейцам, што былі разам з ім на паравозе:

— Машыніста кладзіце на падлогу ды перавязку хутчэй!

Бачыў, як прамазучаны бацькаў пінжак набухаў чырвонай плямай. Яна рабілася ўсё шырэй і шырэй. Чырвонаармейцы таропка знімалі пінжак, разразалі нажом кашулю, бінтавалі бацькавы грудзі.

І хоць страшна горача было на паравозе, але адчуваў Міколка, як халадзее яго маленькае сэрца, як халадзеюць пальцы яго на гарачым рычагу. Гэта вялікі жаль да бацькі агарнуў усю яго малую істоту, і ён нібы сабраўся ўвесь у маленькі камок і, напружыўшы ўсе свае сілы, трымаў у руках паравозны рычаг. І бачыў ён, зірнуўшы ў шчыліну паравознага акенца, як уцякалі немцы ва ўсе бакі, як беглі рабочыя, імчалі да браняпоезда партызаны. Яны размахвалі карабінамі, падкідвалі шапкі, крычалі вясёлае «ўра», выкрыквалі словы:

— Няхай жыве слаўная наша Чырвоная Армія!

Вось і станцыя.

Спыніў паравоз Міколка. Кінуўся з шапкай пад паравозны кран, халоднай вады набраў, выплеснуў бацьку на грудзі, абняў яго.

І не вытрымаў тут, заплакаў гарачымі слязамі.

— Ці жыў ты, бацька? Устань жа, ну слова скажы!

Але маўчаў бацька. Глуха плакаў Міколка. Дзед Астап падышоў, паглядзеў, неяк пасуравеў адразу. Паслаў па доктара. Сабраліся рабочыя, партызаны, маўчалі ў вялікім суме. Хутка прыйшоў доктар. Агледзеў, рану прамыў. Зірнуў на Міколку, па плячы яго весела пахлопаў.

— Ну, Міколка, тваё шчасце! Будзе твой бацька жыць яшчэ доўгія гады... Хоць цяжкая рана, але праз месяц-другі мы загоім яе! Кроў у яго рабочая, здаровая...

І што тут пачалося толькі! У Міколкі ўраз вочы сталі сухімі. Усміхнуўся доктару:

— Глядзі ж, не падмані!

А тут падхапілі Міколку на рукі і ну качаць. Вышэй паравоза падкінулі яго, аж дым паравозны перасігнуў ён і ўпаў вясёлы і радасны на рукі рабочых, партызан, чырвонаармейцаў. Усе віталі Міколку, слаўнага машыніста браняпоезда, слаўнага партызана, смелага сына бальшавіка.

А назаўтра Міколка разам з другімі рабочымі і партызанамі дыктавалі ў нямецкім штабе сваю волю нямецкаму генералу. Той хадзіў маўклівы і пануры. Куды і гонар мінулы падзеўся. Пабілі яго рабочыя, а яшчэ болей пабіла рэвалюцыя ў Германіі. Весткі аб гэтай рэвалюцыі дайшлі нарэшце да нямецкіх салдат.

Генерал хадзіў па кабінеце і нехаця пазіраў у вокны. Ён бачыў, як гулялі па вуліцах яго салдаты. Салдаты старой імператарскай арміі. Салдаты-заваёўцы. Салдаты-пераможцы. Салдаты-рабы. Гэтыя салдаты гулялі сёння з рабочым народам. З чужым народам. Яны браталіся з гэтым народам. Яны называлі гэты народ сваімі лепшымі ў свеце прыяцелямі.

Для гэтых салдат не існуе больш ён, суровы і грозны генерал. Цяпер ён нішто. Дый ці можа ён быць цяпер чым-небудзь, калі даводзіцца выпрошваць у гэтых людзей вагоны для афіцэраў, каб ехаць у Германію. Рабочыя і партызаны жартуюць:

— Вы б, ваша правасхадзіцельства, можа б пехатой як-небудзь... Салдат-то мы давязём...

Але ўмешваецца ў гутарку дзед Астап. Той не любіць лішніх жартаў:

— Даць ім вагоны, няхай хутчэй адсюль вымятаюцца...

А дзесяткі цягнікоў, сотні і тысячы вагонаў з хлебам, з жывёлай, з награбленым дабром стаяць на станцыі, загрузіўшы ўсе пуці і тупікі. Не бачыць іх болей генералу, як не ўбачыць яму свайго генеральскага носа.

Не выйшлі генеральскія планы!

І як праў быў Міколкаў бацька, калі казаў яму на паравозе:

— Мы не можам не перамагчы!

Перамаглі!

Не можа іначай рабіць Міколкава слаўнае племя.

## ВАСІЛЬКІ

Стаяў той асабліва прыгожы дзень, якія бываюць звычайна ў канцы жніўня месяца, калі даўно скончана жніво, звезена жыта ў гумны і над апусцелым полем дружна ўзлятаюць стайкі шпакоў — прадвеснікаў блізкае восені. Зямля здаецца лёгкай, бязважкай, яна ўся дыхае цішай, спакоем. Усё відаць як на далоні: і кожнае дрэва на шляху, і калодзежны жураў у дальняй вёсцы, і зубчасты край лесу, і бялявы дымок далёка, далёка, дзе праходзіць чыгунка. Нават бачыш, як трапечацца зжаўцелы ліст на бліжняй бярозе, як высока, высока ў небе ляціць няведама куды самотная павуцінка.

Над купчастай імшарынай пацешна ўзнімаецца бусел, паважна ляціць над полем, выцягнуўшы ўперад сваю задуменную дзюбу.

— Наш бусел! — ганарыста гаворыць Міколка.

— Хваліся! — смяюцца хлапчукі. — Што ні бусел, дык твой!

— А вот жа наш. Глядзіце. Хочаце аб заклад, на ўсе баравікі...— І Міколка ўзмахвае сваім кошыкам. Поўная ліпаўка баравікоў — жаўцявых, чырванаватых, цёмных, нібы вылітых з медзі — самыя што ні на ёсць грыбы баравыя. Зверху лісты папараці, каб не трапіў пыл у кошык, ды некалькі запазнелых васількоў, якія сарваў Міколка на ўзмежку поля. Васількі — для сястрычкі. Яна хацела пайсці разам з ім у лес, але маці не пусціла: трохі прыхворвае малая.

— Ну, што ж, спужаліся, грыбоў шкада! — наступае Міколка на хлапчукоў, размахваючы перад імі ліпавым кошыкам.

Бусел ляціць проста на высокую грушу-дзічку, што стаіць на ўскраі сяла, высокая, разгалістая, з буславым гняздом на самай вяршыні. За грушай Міколкава хата.

— Ага! Я ж казаў вам...— задзірыста гаворыць Міколка і пераможна шмыгае кірпаўкай носа, якая аж залаціцца пад ранішнім зыркім сонцам. Прыжмурыўшы вока, Міколка ўглядаецца ў далёкую грушу, і лёгкая хмурынка прабягае па яго жывым твары.

— Ізноў нехта бусла пужае... Вот спаймаю каторага,— дам!

Усе бачаць, як бусел наважыўся быў ужо сесці на гняздо, але

раптам узляцеў угору і доўга лятаў, робячы ўсё большыя і большыя кругі, узнімаючыся вышэй і вышэй, пакуль не ператварыўся ў маленькую белую мецінку. І тая знікла,— відаць, паляцеў бусел на сіні лес, што за ракой.

Хлапчукі ўздыхнулі. Нехта задуменна сказаў:

— Вот бы самалёты такія пабудаваць, як буслы. Хочаш сесці на хвою, сеў на хвою, на дуба — на дуба, а то і на хату высокую можна сесці.

— Нашто табе такія самалёты?

— Немца каб біць зручней...

— То ж надумаўся... У нас, брат, яшчэ хітрэйшыя самалёты ёсць. Рр-а-аз — і няма сотні немцаў. Рр-а-а-з — і другой нямашака... Немцы, яны хітрушчыя, а мы яшчэ хітрэй...— рэзка абарваў Міколка хлапчука, марыўшага пра такія дзівосныя самалёты, якія махаюць крыламі і садзяцца, дзе хочуць, як буслы.

Усе задумаліся.

Немцы. Ніхто з хлапчукоў яшчэ не бачыў іх. Праўда, ужо колькі дзён, як ціхімі вечарамі глуха гудзе зямля, і гэты гул нарастае штодня. А ўчора былі частыя ўспышкі на захадзе. Старэйшыя, калі лезлі і чапляліся да іх з запытаннямі дзеці, проста адказвалі:

— Гэта ж пабліскваюць заранкі...

— А чаму грыміць?

— Чаму, чаму... Навальніца будзе. Кладзіцеся спаць...

Хлапчукі, аднак, добра ведаюць пра гэтыя заранкі. Самі ж яны, хлопцы, дапамагалі выганяць жывёлу, якую пагналі на ўсход, каб не дасталося часам дабро ворагу. Жывёлу пагнаў сам старшыня, Міколкаў бацька, ды яшчэ другія калгаснікі. Яны яшчэ не вярнуліся да хат. А перад гэтым прасачыў раз Міколка, як бацька яго разам з другімі дзядзькамі нешта ездзілі ў лес поначы і адтуль прыехалі з пустымі драбінамі. Вазьмі і запытайся тады Міколка:

— То вы гранаты і кулямёты вазілі ў лес хаваць, відаць, пад тыя старыя яліны... Ты ўсё прыглядаўся да іх, калі мы з табой былі ў лесе.

Бацька быў аж здрыгануўся неяк, пацямнеў тварам, але потым спакойна падышоў да Міколкі і, гледзячы яму проста ў вочы — сінія, хітрушчыя,— сурова прашаптаў некалькі слоў:

— Ты глядзі ў мяне, паганец... Калі дзе-небудзь і калі-небудзь ты ляпнеш якое слова, то я... я выцягну даўгі твой язык і павешу цябе на гэтай вось штуцы...— бацька выразна паказаў на крук. Гэта быў звычайны драўляны крук, убіты ў сцяну яшчэ нябожчыкам дзедам. Крук быў смаляны, жоўты, як воск, адпаліраваны, як костка. Харошы быў крук, моцны. Зірнуў на яго спадылба Міколка, моўчкі адышоў ад бацькі. Кепскія жарцікі з ім, з гэтым старым партызанам. А харошы ўсё ж бацька... Трошкі пабойваўся яго Міколка, а любіў яшчэ болей.

...Хлопчыкі падышлі ўжо блізка да агародаў, як учулі плач на ўскраі вёскі. Прыслухаліся — плач раздаваўся і ў другім месцы, і ў трэцім...

— Галосяць...— спуджана сказаў адзін, і хлапчукі разбегліся, раскідаліся, як спалоханыя вераб'і, па сваіх гародах і загуменнях, кожны да свайго двара.

Міколка бачыў ужо з-за плота старую грушу на сваім двары. Паасобныя лісткі трымцелі і свіціліся, як медзь. Уся груша пад сонцам была радаснай і святочнай, ля буславага гнязда не змаўкаў вясёлы птушыны шчэбет: у шчылінах буславага гнязда заўсёды знаходзіла прытулак дробнае птаства.

Заглядзеўся на грушу Міколка, спрытна пераскочыў праз плот. Некалькі баравікоў упала з кошыка. Ён падняў іх, старанна абцёр ад пылу, палажыў назад. Сінія васількі асцярожна схаваў за пазуху, то-та ж будзе радасці малой, калі іх выняць знянацку. Намагаючыся надаць свайму твару самы сур'ёзны выраз сталага працавітага чалавека,— хаця і крывіла вусны гэтая здрадніцкая дзіцячая ўсмешка,— Міколка ступіў крок, другі, і раптам затрымцеў, як ліст, збялеў увесь.

Ля ганка, непадалёку ад грушы, ляжала маці на сырой зямлі. Адна рука была падкурчана, другой яна прыхіліла і моцна прыціскала да сябе, нібы абараняючы ад каго, Міколкаву сястрычку. Твару сястрычкі не відаць. У мацеры ж такія дзіўныя вочы, нібы глядзяць і не бачаць яго, яе Міколку.

Ліпавы кошык ціха ўдарыўся аб зямлю, бязгучна рассыпаліся грыбы — колькі радасці было ў гэтых баравіках у лесе. Дзе ж падзелася, дзе памеркла гэтая радасць? І здаецца Міколку, нібы лес гудзіць, страшна, страшна. Нібы хістаюцца злосна дрэвы, нібы самая груша пахілілася раптам, хоча ўпасці на яго, прыціснуць да халоднага пяску. Страпянуўся Міколка, удыхнуў паветра глыбей і, упаўшы на калені, прынік да маці.

— Мам... а мам... ну чаго ж ты маўчыш?

Дакрануўся да матчынай рукі, яна была халоднай, як лёд, цяжкай.

Заплакаць бы Міколку, на ўвесь свет заплакаць. Ды чуе ён галасы ў хаце, чужыя словы. Хіба можна слёзы свае чужым людзям паказваць? Гулка бразнулі дзверы. З хаты выйшлі людзі. Яны груба адштурхнулі Міколку ад ганка. Яны нешта неслі, ці то матчыны коўдры, ці то новае бацькава паліто. Яны некуды спяшаліся, гэтыя людзі ў нязвыклым адзенні, у нязвыклым для Міколкі абутку. Нібы на конскіх капытах, паблісквалі цвікі на падэшвах іх ботаў.

— Немцы...— мільганула страшная думка.

І ён не глядзеў на іх, не хацеў глядзець, пакуль не зніклі іх цяжкія крокі. Ён убачыў кроў. У крыві была рука сястрычкі. Міколку стала вельмі горача, падкошваліся ногі. Але ён устаў, выцер успацелы лоб, стараючыся зразумець, што ж адбылося з ім, што адбылося з маці, з яго маленькай сястрычкай. Узрушана шалахцела дзедаўская груша-дзічка, самотныя пчолы ляталі, кружыліся вакол спелых груш-гнілушак. Трывожна шчабятала дробнае птаства, і толькі сонца спакойна ўгравала саламяную страху, чырвоныя вяргіні пад акном. А на сэрцы было пуста і чорна, нібы ўзяў хто маленькае Міколкава сэрца і выціснуў з яго ўсю гарачую

кроў. Ды каменем навісла над ім неадчэпная думка: нешта ж трэба зрабіць.

Нешта ж трэба зрабіць...

Ён перайшоў вуліцу, зайшоў на двор дзеда Нупрэя. То ж стары чалавек, яму год дзевяноста, ён дапаможа, параіць. Стары сядзеў на прызбе. Заўважыўшы Міколку, ён кінуўся завіхацца ля новага грабілна. Пачаў стругаць яго нажом і ўсё гэта рабіў з такім сярдзітым выглядам, што аж варушыліся, тапоршчыліся густыя сівыя бровы. Міколку стала нязручна. Ён маўчаў.

— Ну, чаго ты? — не гледзячы на яго, запытаўся дзед.

— Мамцы худа... Відаць, нежывая... Яна і сястрычка...

— А ты не пужайся... Мамку тваю немцы забілі... афіцэры... Ды не ў цябе аднаго...

— Што ж рабіць нам, дзеду?

Дзед Нупрэй так усхадзіўся з нажом, што нечакана аж перарэзаў грабілна і, плюнуўшы злосна, кінуў яго за плот, узрушаны чымсьці, прысеў на прызбу.

— Вот што, братачка...

А гаварыў ён «братачка» толькі сталым ды паважным людзям, а не якому-небудзь падшывальцу Міколку.

— Садзіся вот... Ну, што мы з табой — адно старое, другое малое... ці мы што зробім? Пачакай вот — прыйдзе бацька твой. Мы дамо тады рады... ім... Ды ты пастой! Не хадзі туды... у хату. Начуй у мяне.

Але Міколка пайшоў. Стары праводзіў яго доўгім позіркам, сказаў сам сабе:

— Ну што ж... Упартае хлапчанё, у бацьку пайшоў. Няхай ідзе, хоць выплачацца малое...

І Міколка плакаў. Зашыўшыся ў каноплі, ён праляжаў усю ноч, пакуль не выплакаў усіх слёз. Не на людзях жа слёзы пускаць Міколку, яму ж трынаццаць год, ён жа мужчына. А раніцай бачылі людзі, што ён хадзіў чагосьці ў лес. Потым доўга распытваў старых, па якой дарозе і куды пайшлі немцы.

Потым доўга корпаўся ў хаце, сабіраючыся ў дарогу. Цяжка было знайсці патрэбныя рэчы. Разбітыя талеркі, парваныя партрэты, адзенне, яго кніжкі, сшыткі — усё гэта ляжала параскіданым злой рукой на падлозе. Ён узяў сваю старую школьную торбачку, якую пашыла яму маці, калі быў ён яшчэ ў першым класе. Напакаваў яе, усунуў туды і стары абгрызены пенал, любімы сшытак. Пастаяў з хвіліну пад роднай грушай, клапатліва прыкрыў старэнькай, але чыстай скацеркай твары мацеры, сястрычкі і пайшоў, не азіраючыся, агароднай сцяжынкай.

* * *

Яго бачылі потым у мястэчку, праз якое праходзіў бальшак.

Ён стаяў, прыхіліўшыся да тэлефоннага слупа, усё ўглядаўся на дарогу. Нехта паспрабаваў пакпіць над ім: «Ці не ў школу ты, хлопча, сабраўся, дзе ж віданы цяпер тыя школы».

Міколка нічым не азваўся на гэты голас.

Перад ім праходзілі ўзброеныя людзі — купкамі, калонамі, у адзіночку. Узнімаючы слуп пылу, імчаліся грузавікі, грукацелі гарматы на каменным бруку. І ўсё — чужыя людзі, чужыя машыны, чужыя гарматы. Ён часам ажыўляўся на секунду, адрываўся ад слупа, але зноў гарэў запылены твар, бяссільна апускаліся рукі. І вось ён прыйшоў, гэты доўгачаканы час. Цяпер не можа быць ніякага сумнення: гэта яны, гэта тыя, што замучылі яго маці, яго сястрычку, адабралі ад яго светлае сонца.

Уперадзе коннікаў ціха пасоўваўся вялізны аўтобус. Яшчэ не выцвіў лак на ім, не пасцёрліся незразумелыя жоўтыя літары і знакі. Праз адкрытыя вокны бачыў ён чорныя мундзіры, чорныя шапкі з чырвонымі кантамі. І на шапках і на мундзірах людскія чарапы, скрыжаваныя косці. Нехта з гэтых людзей гучна гаварыў, нехта смяяўся. П'яную песню цягнулі ехаўшыя ззаду коннікі, і песня была шэрай, як пыл, цяжкай, як камень на сэрцы.

Міколка падцягнуўся ўвесь, сцяўся ў пругкі камяк і ў імгненне вока апынуўся ля самых вокан машыны.

—Наце ж вам... за маці, за сястрычку маю!

Ён проста перакінуў у акно нейкі скрутак, загорнуты ў газету. Асляпляючы слуп агню і жалеза адкінуў яго далёка на прыдарожны пыл. Выскаліўшы пеністыя храпы, уздыбіліся коні. Пазляталі шапкі з коннікаў, сёй-той бразнуўся вобзем. Чуліся разгубленыя каманды. З перакошанымі ад страху тварамі беглі салдаты з насілкамі, з лапатамі. Рэшткі машыны дагаралі на дарозе, дыміліся, тлелі на каменнях чорныя мундзіры. Да Міколкі падскочыў спешаны коннік, сівы нямецкі вахмістр. Ён выстраліў некалькі разоў у Міколку і потым, нібы спужаўшыся чагосьці, хутка схаваў у кабуру задымлены рэвальвер і, ссутуліўшыся, унікаючы зірнуць у Міколкавы вочы, падаўся прэч, да тых, што расчышчалі дарогу, сям-там пасыпаючы яе жоўтым пяском.

Міколка не чуў гэтых стрэлаў, яму было ўжо ўсё роўна. Нерухомым позіркам ён угледаўся ў блакітнае неба, нібы прыслухоўваўся да былых сваіх думак: аб нянавісці, аб помсце. Застыглы твар стаў калючым, суровым, нібы пражыў Міколка доўгія дзесяткі год, усё перажыў, усё пабачыў на свеце. І толькі на вуснах засталіся — ні агонь, ні жалеза не змаглі іх сцерці — сляды ўсмешкі, слаўнай, дзіцячай.

Побач ляжала яго торбачка з раструшчаным пад салдацкім ботам пеналам. Ды выпалі з-за пазухі і ляжалі ў пыле запазнелыя восеньскія васількі.

Сінімі васількамі адцвіталі і вочы хлопчыка.

## АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

Андрэй Іванавіч Александровіч нарадзіўся 22 студзеня 1906 г. у Мінску. Скончыў працоўную школу другой ступені (1921), потым Белпедтэхнікум (1925). У 1930 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Быў адным з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

У пачатку 30-х гг. А. Александровіч працаваў сакратаром рэдкалегіі часопіса «Бальшавік Беларусі», рэдактарам часопіса «Заклік». Быў абраны намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1934—1937), членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР (1936). Некаторы час жыў на Крайняй Поўначы (1938—1947), у Краснаярскім краі (1949—1955). З 1955 г. жыў у Мінску.

Першы верш А. Александровіча «Да моладзі» быў надрукаваны ў 1921 г. у газеце «Савецкая Беларусь». У 1924 г. выйшаў першы зборнік вершаў «Камсамольская нота» (у сааўтарстве з А. Вольным), у 1925 г.— зборнік вершаў «Па беларускім бруку», паэма «Паўстанцы», зборнік апавяданняў «Сутарэнне», а таксама раман «Ваўчаняты», напісаны ў сааўтарстве з А. Вольным і А. Дударом. А. Александровіч з'яўляецца аўтарам кніг паэзіі «Прозалаць» (1926), «Угрунь» (1927), «Фабрыка смерці» (1929), «Гудкі» (1930), «Установка» (1930), «Узброеныя песні» (1936), «Выбранае» (1958), «Вершы» (1970). Яго пяру належаць паэмы «Цені на сонцы» (1930), «Паэма імя Вызвалення» (1930), «Нараджэнне чалавека» (1931), «Напор» (1931).

Для дзяцей А. Александровіч пачаў пісаць у 20-я гг. Юнаму чытачу адрасаваныя яго зборнікі вершаў, казак, паэм «Рыбак» (1929), «Горад раніцою» (1930), «Калыханка» (1930), «Хлопчык і певень» (1930), «Як дзеці памагалі будаваць самалёт» (1931), «Шчаслівая дарога» (1935), «Падарунак дзеткам-малалеткам» (1936), «Галубінае крыло» (1976). Тэме народнай рэвалюцыі прысвяціў паэт «Казку пра пана Жываглота» (1935).

А. Александровіч вядомы і як перакладчык на беларускую мову «Інтэрнацыянала», паэмы А. Пушкіна «Руслан і Людміла».

Памёр А. Александровіч 6 студзеня 1963 г.

## НАШ ДЗЕНЬ

Люда,
Стась
І я — Мартын,
Мы раскажам вам аб тым,
Як жывём і дружым мы,
Як расцём мы дужымі,
Якія ў нас
        паводзіны,
Ці добра час
        праводзім мы.
Пачынаем дзень спачатку
Фізкультурнаю зарадкай.
Раз — налева,
Два — направа,
Крок наперад,
Крок назад.
Нават Стась маленькі жвава
Патрапляе з намі ў лад.
Ён стараецца, таму
І ўдаецца ўсё яму.

**Каб не быць слабым і хмурым,**
**Не цурайся фізкультуры!**

Эх, як весела бруіцца,
Льецца,
        булькае
                вадзіца.
Возьмем шчоткі — зубы тром
Беласнежным парашком.
З мылам мы пад кранам мыем
Рукі,
        вушы,
                твар
                        і шыю.

**Чыста мыцца — наша ўмова,**
**Той, хто чысты,— той здаровы.**

За сталом утрох сядзім.
Мы з ахвотаю ядзім.
Нам заўсёды ўсё па густу:
Каша, бульба ці капуста.
— Я не буду... не хачу я...—
Слоў такіх ты не пачуеш.

**За сталом у нас заўжды**
**Цішыня у час яды.**

Мы садоўніку старому
Пасабляем каля дому.
Сад у нас харошы:
На газонах
Мак чырвоны,
Ружы і гарошак.
Мы і дома пасабляем:
Я падлогу падмятаю,

Фартушок надзеўшы, Люда
Мые ў тазіку пасуду.
Стась сваю работу знае —
Ён вазоны палівае.

**Дзецям з працай трэба знацца,**
**Пасабляй бацькам у працы!**

Дом вялікі. На двары
Шмат гуляе дзетвары,—
Весела заўсёды.
Разам з імі, як сябры,
Мы гуляем на двары,
Водзім карагоды.

**Песня з намі неразлучна.**
**Падружыся з песняй гучнай!**

Кнігі мы не забываем,
Кнігі ўважліва чытаем.
Перад кнігаю раскрытай,
Хоць яшчэ не знае літар,
За сталом сядзіць і Стась.
Ён малюнкі ўслых чытае,
Без памылкі разбірае,
Дзе шчупак,
а дзе карась,
Дзе рабіна,
дзе лаза,
Дзе рагатая каза.

**Хочаш знаць усё і ўсіх —**
**Сябрам будзь цікавых кніг.**

Вечар блізіцца, якраз
І канчаецца расказ.
Абяцанне мы стрымалі,
Пра сябе вам расказалі.
А цяпер пачуць цікава
І пра вас,
пра вашы справы:
Гульні, дружбу і работу.
Спадзяёмся, вы з ахвотай
Нам, сябры, уважыце —
Пра сябе раскажаце.

## КАЛЫХАНКА

Ціха, кіска,
Ціха, братка,
У калысцы
Спіць дзіцятка.
Будзь жа добранькі, глядзі
Дзіцяня не разбудзі.

Коцік слухацца не хоча,
Скача ён з кутка ў куточак.

Ох ты, кіска,
Ох, паганы,
Скінуў міску
З кашкай маннай.
Галубкі лятуць, лятуць,
Кашку гэтую з'ядуць.

Баючыся кары цяжкай,
Коцік слёзы лье над кашкай.

Чуеш, кіска,
Ля калыскі
Ходзіць мышка-
Каратышка.
Не марудзь жа ані-ні,
Гэту мышку прагані.

Коцік часу не губляе,
Мышку ў норку заганяе.
Змогся кіска,
Прытаміўся,
Пад калыскай
Прымасціўся,
Хвост пад лапкі падгарнуў
І салодкім сном заснуў.

— Баю-баю...
Ціха ў хаце.
Захацела спаць і маці.

## ДАШЫН КАРАНДАШЫК

Толькі возьме наша Даша
Карандашык у руку,
Як адразу карандашык
Намалюе на лістку

І сасну, і дуб высокі,
І вярбу, і яварок,
І сароку-белабоку,
І грыбок-баравічок;

Намалюе — глянуць люба —
Матылькоў і пчолак рой;
А суніцы — хоць у кубак
Награбай сваёй рукой.
Вось які у нашай Дашы
Чарадзейны карандашык.

### ЛЯСНАЯ БАЙКА

Вырас пад асінаю
Грыб
Архіп.
На дзіва ўсім
На ім
Прыгожы капялюш:
Ружовы,
Адмысловы
На ўсю лясную глуш.
Стаіць і задаецца
Грыб
Архіп.
Не можа наглядзецца
Край зялёны
На капялюш ягоны.

Шэпча мошка-басаножка:
— Ах, які грыбок харошы!

Крыллем плясне матылёк:
— Ах, які капелюшок!
Зайка скача, плешча ў лапкі:
— Я такой не бачыў шапкі!
Нават жаба выхваляе:
— Ква-ква-ква, ква-ква-ква,
Раз такую шапку мае,
Дык якая ж галава!..

Раптам вецер тут з'явіўся,
Грыб
Архіп
Закалаціўся:
Капялюш яго на дол
Пакаціўся колам.
І глядзяць усе наўкол:
Грыб
Архіп
Стаіць, як кол,
Голы, безгаловы...

Ператапталі ўсю траву,
Шукалі, звалі галаву.
І зразумелі, што дарма
Шукаць таго, чаго няма.

### ПРА КАЧАК, ШЧУПАКА І МЯЧЫК ЯНУКА

Ішоў па мосціку Янук,
У рэчку мячык выпаў з рук.
— Патоне мячык! — крыкнуў хлопчык,
Ад страху аж заплюшчыў вочы.
Аднак дарэмны крык і плач:
На хвалях гушкаецца мяч.

Янук глядзіць туды, сюды —
Як мячык выручыць з бяды?
А тут ізноў бяда: на мячык
Напала трое шэрых качак,
І сталі мяч адна адной
На дзюбы кідаць над вадой.

З-пад хвалі вынырнуў шчупак
І носам ткнуў у мячык так,
Што мяч у неба ўзняўся свечкай,
Бліснуў ад сонейка над рэчкай
І на здзіўленне шчупаку
У рукі трапіў Януку.

## ЯНКА МАЎР

Старэйшы беларускі дзіцячы пісьменнік Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў) нарадзіўся 10 мая 1883 г. у г. Лібава (цяпер Ліепая Латвійскай ССР). Маленства прайшло ў вёсцы Лебянішкі былой Ковенскай губерні, на радзіме маці, куды сям'я пераехала пасля смерці бацькі. Закончыўшы пачатковую школу, вучыўся

ў Ковенскім рамесніцкім вучылішчы (1895—1899), затым паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю. Аднак за паўгода да сканчэння вучобы быў выключаны з семінарыі за рэвалюцыйныя настроі. У 1903 г. экстэрнам здаў экзамен за курс семінарыі і атрымаў званне настаўніка пачатковай школы. Працаваў настаўнікам пад Панявежам, адкуль быў высланы як палітычна ненадзейны ў вёску Бытча на Барысаўшчыне.

Я. Маўр удзельнічаў у нелегальным настаўніцкім з'ездзе ў вёсцы Мікалаеўшчына (1906), дзе ўпершыню сустрэўся з Якубам Коласам. За ўдзел у з'ездзе Маўра звольнілі з пасады настаўніка і ўзялі пад нагляд паліцыі. Толькі ў 1911 г. ён змог уладкавацца ў прыватнай гандлёвай школе Мінска настаўнікам геаграфіі.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі працаваў настаўнікам 25-й чыгуначнай школы Мінска, у Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамасветы БССР.

У час Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў спачатку ў Алма-Аце, а з 1943 г.— у Маскве. Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў вярнуўся ў Мінск.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1923 г. з фельетонаў, якія друкаваліся ў газеце «Савецкая Беларусь» і ленінградскім часопісе сатыры і гумару «Бегемот». Першы буйны твор — аповесць «Чалавек ідзе» быў змешчаны ў часопісе «Беларускі піянер» (1926, № 11).

Янку Маўра справядліва лічаць пачынальнікам прыгодніцкага жанру ў беларускай літаратуры. У першых творах гэтага жанру — аповесцях «У краіне райскай птушкі» (1928), «Сын вады» (1928), рамане «Амок» (1930) пісьменнік адлюстраваў жыццё прыгнечаных народаў каланіяльных і залежных краін, іх рэвалюцыйную барацьбу супраць імперыялістаў. Тэме абяздоленага дзяцінства ў гэтых краінах прысвечаны яго апавяданні 20-х гг. «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні», якія ўвайшлі ў зборнік «Апавяданні» (1930).

У 30-я гг. Я. Маўр адлюстроўвае жыццё нашай краіны. Пісьменнік стварае аповесці «Палескія рабінзоны» (1930), «ТВТ» (1934), актыўна працуе ў жанры апавядання («Шчасце», «Бярозавы конь», «Максімка» і інш.). Я. Маўр — аўтар фантастычнай аповесці «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» (1954—1955), аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» (першая частка, паводле сведчання аўтара, напісана ў 1920 г., другая — у 1956, трэцяя — у 1957), п'ес «Памылка» (1940), «Хата з краю» (1941), «Балбатун» (1946).

Я. Майр вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў М. Прышвіна, А. Чэхава, Р. Кіплінга, Х. Андэрсена, М. Твэна, Ж. Верна і іншых пісьменнікаў.

За аповесці «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «ТВТ», «Шлях з цемры», раман «Амок» пісьменнік удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР (1972).

Памёр Янка Маўр 3 жніўня 1971 г.

## ЧАЛАВЕК ІДЗЕ

*(Урывак)*

### I

**Старадаўнія часы.— Царства звяроў.— Ці людзі? — Няўдалае паляванне.— Падвячорак з пацука.— Начлег на дубе.**

Гэта было даўным-даўно... Можа, мільён гадоў назад. Дакладна сказаць нельга, але прыблізна навука ведае, калі і як гэта было. Ёсць сведкі з таго часу: розныя знакі, рэчы, расліны, косці, камені, нават самыя пласты зямлі, якія досыць праўдзіва могуць расказваць цікавыя гісторыі з таго часу. Трэба толькі навучыцца іх разумець... З такіх помнікаў і склалася гісторыя, аб якой тут гаворыцца.

У тыя часы наша Еўропа мела зусім не такі выгляд, як цяпер. Мора займала ўсю сучасную Паўднёвую Еўропу і даходзіла да Альпаў, а ў нас — да нізоўяў Дняпра і Волгі.

Каўказскія, Крымскія горы, Альпы, Апеніны тады толькі што пачыналі падымацца ад зямлі. Усюды дзейнічалі вулканы, нават у такіх месцах, дзе цяпер аб гэтым ніхто і не думае, напрыклад у сучаснай Германіі, Англіі. Казбек, Эльбрус выкідалі агонь, попел, лаву.

Паступова, павольна, на працягу соцень тысяч гадоў Еўропа прымала той выгляд, які мае ў нашы дні.

І клімат быў іншы, значна цяплейшы, напрыклад, як цяпер у Паўночнай Афрыцы.

Адпаведна гэтаму і расліннасць была больш разнастайная і багатая. Фігавыя і лаўравыя дрэвы раслі разам з хваёвымі. Разам з дубам, клёнам і вязам падымаліся пальмы, а нашы бярозы і вербы стаялі побач з міртамі, магноліямі і алеандрамі.

Уся гэтая расліннасць складала велізарныя лясы, якія займалі большую частку Еўропы. Насельнікамі гэтых лясоў былі ўсялякія звяры, з якіх адна частка дайшла да нашага часу бадай што такімі самымі, як былі, другая частка значна змянілася, а трэцяя зусім знікла, і іх цяпер называюць «дапатопнымі».

Былі і стэпавыя прасторы, дзе вольна бегалі стэпавыя звяры.

Нідзе толькі не відаць было слядоў чалавека. Ніводнага чалавечага жылля не было ва ўсёй краіне. Аніводнага чалавечага слова не чулася на ўсёй прасторы. Аніводнага паляўнічага не сустракалі звяры на сваёй дарозе.

Гэта было сапраўднае «царства звяроў». Яны былі гаспадарамі ўсяе зямлі...

Але вось на адной палянцы з'явіўся гурток нейкіх стварэнняў, якія ішлі на дзвюх нагах. Можа, гэта і ёсць людзі?

Не, здаецца, гэта малпы, бо ўсё цела іх пакрыта поўсцю. Галава доўгая, выцягнутая спераду назад, а зверху нібы прыплюснутая. Ілба бадай зусім няма, а які ёсць, дык не разбярэш, дзе ён пачынаецца. Нос таксама пляскаты, пераноссе ледзь прыкметнае. Вочы сядзяць надта глыбока, а косць над імі выступае наперад, як страха.

Падбародак ледзь вызначаецца, а вялізныя сківіцы высунуліся наперад, як і ў кожнага добрага звера.

Рост іх быў невялікі, плечы шырокія, а рукі занадта доўгія. Ногі ж, наадварот, вельмі кароткія.

Адным словам, зусім не такі выгляд, як у нас з вамі.

Але з другога боку, калі добра прыгледзецца, то і ад малпаў яны значна адрозніваліся. Перш за ўсё, яны ўвесь час хадзілі і стаялі толькі на дзвюх нагах і хадзілі цвёрда, амаль што прама, абапіраючыся на зямлю ўсёй падэшвай.

Малпы ж, як вядома, ніколі гэтак не ходзяць. Калі ім і здараецца прайсціся на дзвюх нагах, дык усяго некалькі крокаў, але і тады яны ступаюць на зямлю толькі бакамі падэшвы, як часам ходзяць дзеці з вельмі крывымі нагамі.

Адна толькі хада паказвала ўжо, што гэтыя істоты ні ў якім разе не могуць быць малпамі.

Ды і другія адзнакі таксама аб гэтым сведчылі. Напрыклад, рукі хоць былі і даўжэйшыя за нашы, але ж карацейшыя ад рук малпы. Апрача таго, відаць было, што і трымаюцца рукі вальней, як у малпаў.

Калі наша сучасная чалавекападобная малпа ідзе на дзвюх нагах, яна рукамі дастае да зямлі, нават абапіраецца імі перад сабой, закідваючы ногі за рукі. А тут зусім іншая справа. Відаць было, што гэтыя стварэнні прывыклі ўжо рабіць рукамі разнастайныя рухі.

Далей, калі галава і морда зусім не падобны былі да чалавечых,— затое таксама адрозніваліся і ад малпавых. Хоць лоб быў маленькі, але ўсё ж такі большы і, галоўнае, не такі пахілы, як у малпы.

І ўрэшце, самая галоўная адзнака — гэта велічыня чэрапа, альбо, праўдзівей сказаць, аб'ём мазгоў, што могуць у ім змясціцца. Самая разумная і вучоная сучасная малпа мае аб'ём мазгоў напалову меншы ад гэтага чалавека.

Такім чынам выходзіць, што перад намі не малпы, а нешта накшталт людзей. І сапраўды: гэта былі першыя істоты, якім больш-менш можна было ўжо даць назву чалавека.

Не адразу яны з'явіліся гэткімі. Мільёны гадоў прайшлі, пакуль яны зрабіліся такімі, якімі мы тут іх бачым. Таксама, як шмат соцень тысяч гадоў павінна было прайсці пасля іх, пакуль мы зрабіліся такімі, як цяпер ёсць.

Доўгі час людзі нічым не адрозніваліся ад малпаў, а яшчэ раней — наогул ад жывёл. Можа, выпадкова іх дзяды трапілі ў іншыя ўмовы жыцця, дзе давялося больш быць на зямлі, чымся на дрэвах, дзе рукі іх пачалі прывыкаць да другой працы, дзе ім трэба было больш папрацаваць мазгамі,— і патомкі іх ужо крыху пачалі адрознівацца ад іншых сваякоў.

Доўгі час гэтыя адзнакі былі вельмі нязначнымі. Але паступова яны рабіліся ўсё болей і болей выразнымі. І нарэшце прыйшоў такі час, калі ясна стала відаць, што гэтыя істоты — не звяры.

А калі прыпомнім, што на нашых вачах, на працягу малога часу, чалавек можа зусім змяніць пароду жывёл, паставіўшы іх у іншыя ўмовы жыцця, калі мы звернем увагу, што тая самая жывёла і нават сам чалавек і цяпер у розных месцах, пры розных умовах жыцця, набываюць інакшы выгляд,— тады ўсім нам будзе ясна, што на працягу мільёнаў год гэтыя змены павінны быць дужа значнымі. Гэта і даводзіць нам навука аб гісторыі чалавека.

* * *

Гурток складаўся з дваццаці пяці — трыццаці асоб. Тут былі і жанчыны з дзецьмі на руках і на карку, і падлеткі, і мужчыны рознага ўзросту, у тым ліку адзін стары.

У руках яны нічога не мелі, нічога не неслі. Яны жылі яшчэ таксама, як усе іншыя жывёлы: вандравалі з месца на месца, шукаючы корму.

Адны выграбалі рукамі нейкія карэнні, другія шукалі на дрэвах плады, трэція стараліся злавіць і знайсці што-небудзь жывое: чарвяка, жука і гэтак далей.

Нялёгка было напасвіцца такім чынам. Шмат часу трацілася на гэты падвячорак. І ніводным словам яны яшчэ не перакінуліся паміж сабой.

Пасля адзін за адным пачалі збірацца на палянку, каб адпачыць. Усеўшыся на карачкі, яны моўчкі глядзелі наперад і, здаецца, ні на што не звярачалі ўвагі. Ціха было каля іх. Толькі дзеці, гуляючы, часам вішчалі. Ад дарослых жа не чуваць было аніводнага слова.

Можа, яны нямыя?

Не, не нямыя яны, а проста не ўмеюць яшчэ гаварыць.

І нічога дзіўнага ў гэтым няма. Мы ведаем, што малыя дзеці не адразу пачынаюць гаварыць. А калі пачынаюць, дык толькі таму, што ўвесь час каля сябе чуюць гаворку. А каб яны ні ад каго не чулі ніводнага слова, тады і не ведалі б мовы.

Ад каго ж мог пачуць мову першы чалавек? Значыцца, ён і не мог навучыцца. Ды каб ён цяпер нават пачуў мову, то ўсё роўна навучыцца б не мог, бо язык яго яшчэ не прыстасаваны да таго, каб гаварыць. Праўда, некалькі слоў, калі можна так назваць некаторыя іхнія гукі, яны ведалі. Напрыклад, яны добра ведалі слова «га», якое звычайна вымаўляў важак, калі даваў знак ісці далей ці папярэджваў аб небяспецы, ці наогул хацеў звярнуць увагу сваіх сяброў на якую-небудзь з'яву.

Каб перакласці гэты гук на нашу мову, то ён азначаў бы разам шмат нашых слоў, напрыклад: «Увага! Сюды! Збірайцеся! Глядзі! Сцеражыцеся! Слухайце! Стой! Пачакайце! Цішэй!»

Сонца пяшчотна асвятляла палянку. Людзі спакойна адпачывалі і, здаецца, адчувалі сябе прыемна. Дзеці бегалі, гулялі. Маткі даглядалі сваіх маленькіх дзяцей, выбіралі з поўсці трэсачкі альбо яшчэ што.

Але дзіўная рэч: усе яны чамусьці былі нейкія сумныя. За ўвесь час ніхто з іх яшчэ ні разу не ўсміхнуўся. Нават маткі песцілі сваіх дзяцей неяк сурова. А хлопчыкі гулялі, бегалі, куляліся, нібы выконвалі якую сур'ёзную работу. А разам з тым відаць было, што яны адчуваюць сябе досыць добра.

Што такое з імі здарылася?

Нічога. Проста яны яшчэ не ўмелі смяяцца.

Умовы іхняга жыцця былі такія, што вельмі мала было прычын, якія б спрыялі развіццю гэтай здольнасці. Сярод лясных жыхароў нашы людзі былі самыя слабыя, самыя няшчасныя. Яны не маглі памерацца сіламі з вялікімі звярамі. Не мелі тых зубоў і кіпцюроў, што маюць драпежнікі. Нават бегаць не маглі так хутка, як бегаюць некаторыя жывёлы. Кожны звер, які цяпер і духу чалавечага баіцца, тады мог пакрыўдзіць чалавека. А як было пракарміцца, пражыць? Не да смеху тут...

А здольнасць смяяцца, як і ўсе іншыя здольнасці, не звалілася сама з неба. На гэта таксама патрэбны і доўгі час і адпаведныя ўмовы. Недарма ж да нашага часу ніводная жывёліна не навучылася яшчэ смяяцца.

Сярод гуртка вызначаўся адзін мужчына трохі вышэйшага росту, відаць, дужэйшы за іншых і нават, здавалася, нібы з твару разумнейшы. Гэта быў павадыр, важак гуртка.

Ніхто яго, вядома, не выбіраў, не прызначаў. Склалася яно само сабой, калі ён у бядзе першы кідаўся на ворага, калі ён першы

заўважаў небяспеку, папярэджваў аб ёй, калі ён клапаціўся аб усім гуртку. У такія мінуты кожны быў яму ўдзячны, слухаўся яго,— і такім чынам ён зрабіўся важаком.

Ён стаяў, абапёршыся аб дрэва, і, здаецца, нешта такое думаў. Але ці мог ён наогул думаць так, як мы гэта сабе ўяўляем?

Вядома, не. А калі мы прыслухаемся да сябе, то заўважым, што нашу думку выклікаюць словы. Мы думаем словамі, мы як быццам словамі ў думцы гаворым. А калі ён не ўмеў гаварыць, значыцца, не ўмеў і думаць. У яго галаве мільгалі нейкія няясныя вобразы, але звязаць іх у адну складаную думку ён не мог, як не мог выказаць яе словамі.

Вось каля яго пакруціўся дванаццацігадовы хлопчык, яго родны сын. Павадыр паглядзеў на яго, у вачах нешта засвяцілася, нібы ён хацеў нешта прыпомніць, але зараз жа гэта прайшло,— і бацька зноў забыўся, што гэта яго сын.

Раптам у лесе нешта шаснула — і на палянку выскачылі дзве казы. Угледзеўшы чужых, яны спыніліся ў здзіўленні, а ў гэты самы момант некалькі мужчын кінулася да іх. Але рукі толькі слізганулі па поўсці — і жывёлы зніклі. Нялёгка было нашым людзям паляваць з голымі рукамі.

Такая няўдача, відаць, засмуціла іх. Хоць твары і нельга было назваць свядомымі, але ж і на іх адбілася нейкае расчараванне.

Разам з тым прачнуўся голад, і яны зноў пайшлі шукаць спажывы. На гэты раз нейкія шчасліўцы знайшлі нават птушынае гняздо з яечкамі ды злавілі крата.

На адну жанчыну натрапіў звярок, падобны да нашага пацука. Угледзеўшы небяспеку, ён скруціўся ў вузел і прыкінуўся мёртвым. Але гэта не памагло. Жанчына ўсё роўна ўхапілася за яго, адразу разарвала і пачала есці. Зубамі яна адрывала кавалкі і давала свайму дзіцяці.

Звярок быў так званы «сумчаты» пацук, які яшчэ і цяпер жыве ў Паўднёвай Амерыцы, у Аўстраліі. Парода сумчатых з'яўляецца адной з самых старадаўніх. Яшчэ і цяпер захавалася некалькі відаў, да якіх належыць, напрыклад, вядомы аўстралійскі кенгуру. Усе яны маюць тую асаблівасць, што самкі даношваюць сваіх дзяцей у асобай сумцы, якая мае выгляд кішэні і знаходзіцца на грудзях самкі.

Тым часам надыходзіў вечар. Трэба было падумаць пра начлег. Не першы раз былі людзі ў такім становішчы, і яны добра ведалі, што самым бяспечным месцам у гэтым выпадку з'яўляецца дрэва.

Адзін за адным палезлі яны на шырокі дуб. У гушчыні яго знайшлося досыць зручных месцаў, нават для жанчын з дзецьмі.

Некаторы час чуўся трэск і шолах сярод галін, потым усё сцішылася. Людзі «паляглі» спаць.

Ішла ноч, цёмная, парная. У лесе пачалося другое, начное жыццё. Прарэзліва крыкнула нейкая птушка; зазвінелі камары і мошкі. Дзесьці забрахала гіена, і здалёку пачуўся рык ільва.

Потым пачаў набліжацца нейкі страшэнны шум, нібы землетрасенне якое. Усё бліжэй, бліжэй. Можна было сказаць, што гэта

ломяцца дрэвы і, відаць, дрэвы не малыя. Па лесе ішоў цяжкі тупат, ад якога ўздрыгвала зямля.

Людзі ўстрывожыліся, заварушыліся.

Вось грукнула бліжэйшае дрэва, і верхавіна яго проста павалілася на дуб. Узняўся крык, пісканіна — некалькі чалавек звалілася на зямлю.

Тыя, што зваліліся, толькі ўгледзелі, што каля іх прайшлі нейкія жывёлы, вялізныя, як горы...

Шум і трэск паступова сцішыліся. Жывёлы прайшлі. Людзі зноў палезлі на свае месцы. Добра яшчэ, што ніхто не пацярпеў. Супакоіліся.

Але на захадзе зноў пачало грукацець. Гэта ўжо набліжалася навальніца. Усё святлей бліскала маланка, усё мацней грымеў гром,— і ўрэшце ён так грукнуў над галавой, што ўсе людзі пасыпаліся на зямлю. А тады пайшоў заліўны дождж.

Можна сабе ўявіць, што павінны былі перажыць нашы людзі. Вядома, яны і да гэтага часу сустракаліся з такой з'явай, але зразумець яе, нават проста прывыкнуць яны, пэўна, не маглі і кожны раз палохаліся зноў.

Гэты бляск, гэты грукат, гэтая таемная сіла — там, дзесьці высока на небе,— кожны раз выклікалі ў іх той жах перад невядомай магутнай сілай, ад якога пазней нарадзіліся ў дзікуноў рэлігіі.

Дождж ішоў усю ноч. Людзі туліліся пад дрэвамі, дрыжалі ад холаду, і, здавалася, ніколі не будзе канца гэтай цемры...

Так пачынаў чалавек сваё жыццё. Той чалавек, які цяпер лётае ў паветры, плавае пад вадой, перагаворваецца праз усю зямлю з другімі людзьмі, кіруе прыродай.

Той, які сваім розумам і працай дайшоў да ўсяго, што мы маем...

## СЛЁЗЫ ТУБІ

Маленькі Тубі ўвесь свой маленькі век пражыў на беразе мора. Заўсёды перад яго вачыма была бязмежная прастора — то ціхая, ласкавая, то бурная, злосная. Сонца кожны дзень вылазіла з вады з правага боку, праходзіла над самай галавой і хавалася ў ваду з левага боку.

І ўсё сваё жыццё Тубі чуў, як хвалі набягалі на нізкі пясчаны бераг і спявалі сваю адвечную песню. З ёю ён уставаў, з ёю ён клаўся спаць, яе ён чуў, калі прачынаўся ўначы, не заціхала яна і ў пякучы поўдзень, калі ўсё жывое хавалася ў цень. Ён і ўявіць сабе не мог, што дзе-небудзь на свеце можа быць такое месца, дзе не чуваць гэтай песні. Часамі, калі ўздымалася бура, гэтая песня пераходзіла ў злоснае выццё, але маленькі Тубі зусім не баяўся гэтага выцця, як не баялася вунь тая чайка, што лётае над морам.

А ззаду, за спіной, за халупамі, пачынаўся лес, а што было за ім,— Тубі не ведаў. Чуў ён часам, як казалі пра нейкія землі, гарады, розныя дзіўныя краіны, але ўявіць сабе гэтага не мог. Ну, адкуль жа можа ўзяцца нешта другое, апрача яго берага і мора?

Праўда, ён часта бегаў туды, каб сцягнуць какосавы арэх,

банан ці яшчэ якую дробязь, але больш часу праводзіў у вадзе і адчуваў сябе ў ёй як рыба.

Яны жылі ўдваіх з маткай у халупцы з галля. Бацька памёр тры гады назад, калі Тубі было восем год.

Ён добра памятаў свайго бацьку. Чорны, худы, як шкілет, і ўсё харкае крывёю.

Кожны год у красавіку наязджалі сюды людзі з чорнымі барадамі, у белых халатах, на белых лодках. Яны мелі шмат лодак, набіралі шмат людзей. У тым ліку быў і бацька Тубі.

Лодкі ад'язджалі ў мора, станавіліся там у рад, і голыя чорныя людзі кідаліся ў мора, давалі нырца і праз мінуту-другую вылазілі. Кожны з іх меў пры сабе кошык, і ў гэты кошык яны збіралі на дне мора чарапашкі.

Людзі з чорнымі барадамі і ў белых халатах сядзелі на беразе ў шатры. Перад імі стаялі розныя стравы і пітво, яны ў біноклі глядзелі на мора, часам аддавалі загады.

У поўдзень рабілі перапынак. Лодкі пад'язджалі да берага, людзі зносілі ў шатры чарапашкі. Тут іх разбівалі і чагосьці шукалі ў сярэдзіне. Адны са злосцю адкідалі ў бок, у другіх знаходзілі нейкія бліскучыя, светлыя каменьчыкі. І тады дзядзькі ў белым пстрыкалі пальцамі, шчэрылі белыя зубы і казалі:

— О, гэта добра!

— Гэтая штукенцыя можа даць тысяч дваццаць!

А людзі, што лавілі гэтыя чарапашкі, ляжалі на беразе ледзь жывыя. І шмат у каго з рота ішла кроў. Асабліва ў бацькі Тубі.

Тубі падыходзіў да яго, плакаў, падносіў яму вады. Бацька ўсміхаўся, прабаваў жартаваць з сынам, але гэта неяк не ўдавалася.

Праз гадзіну давалі сігнал, і людзі зноў адпраўляліся ў мора. Зноў пачыналася тое самае ныранне.

Пад вечар бацька прыходзіў дахаты і, як камень, валіўся на пасцель. Маці клапацілася, даглядала яго, карміла, але яму нічога ў горла не ішло.

І так было кожны дзень, цэлы месяц, без ніякага перапынку.

У апошні дзень бацька прынёс маці трохі грошай. Выгляд яго быў ужо зусім дрэнны.

Матка засумавала.

А назаўтра бацька памёр.

Яшчэ памятае Тубі, як бацька аднаго разу ўзяў яго з сабою, і раніцою, да святла, яны адны выехалі ў мора. Там бацька пакінуў Тубі ў лодцы, а сам нырнуў у мора.

Але на беразе падняліся крыкі, шум; да іх выехалі дзве лодкі, бацьку схапілі, білі, пацягнулі кудысь. Ён вярнуўся толькі праз некалькі дзён. І доўга пасля таго бацька і маці былі сумныя і хмурыя.

Тубі зразумеў толькі, што бацьку білі за тое, што ён нырнуў сам адзін у чужое мора, што гэтае мора і чарапашкі належаць нейкаму пану.

Некаторы час пасля гэтага Тубі баяўся купацца ў чужым моры, але яго ніхто не ганяў, і ён тады супакоіўся.

* * *

І вось аднаго разу маці сказала Тубі, што яму трэба вучыцца, што яму прыйдзецца хадзіць за тры кіламетры ў «школу». А потым маці павяла яго і пакінула ў «настаўніка».

Гэты настаўнік, відаць, быў вельмі сярдзіты, бо заўсёды трымаў у руцэ бізун.

Вучняў набралася чалавек пятнаццаць.

Пачалося навучанне. Настаўнік узяў пяць белых досыць вялікіх каменьчыкаў, даў хлопцам, каб яны добра прыгледзеліся да іх, кінуў каменьчыкі ў мора і загадаў пяці хлопчыкам, каб кожны з іх дастаў па каменьчыку.

Хлопцы нырнулі, вынырнулі. Чатыры хлопчыкі прынеслі па каменьчыку, а пяты не знайшоў. Тады настаўнік сцебануў яго бізуном па голай шчуплай спіне... Дайшла чарга да Тубі. Ён плаваў і ныраў, можа, лепш за ўсіх хлопчыкаў, але пры думцы, што яму можа не пашанцаваць, што тады ён таксама атрымае бізуна,— пры гэтай думцы ў яго цямнела ўваччу.

Раз, два, тры! Каменьчыкі паляцелі ў ваду, хлопцы за імі. Тубі адразу заўважыў, што тутака зусім неглыбока і светла, і гэта супакоіла яго. Шырока раскрытымі вачыма стаў ён прыглядацца да дна. Зеленаваты колер вады, выгляд дна, мігценне святла — усё гэта яму было добра знаёмае. Бяда толькі, што на дне многа было другіх каменьчыкаў, сярод якіх цяжка было знайсці той, што кінуты.

Вось ён заўважыў свой каменьчык і кінуўся да яго, але разам з ім кінулася туды нейкае страшыдла. Тубі аж адхіснуўся, але зараз жа сцяміў, што гэта яго таварыш. Той ужо працягваў руку да каменьчыка.

У галаве Тубі агнём бліснула думка, што калі ён упусціць, дык атрымае бізуна.

Ён напружыўся, штурхануў таварыша і выхапіў каменьчык у яго з-пад носа.

Выйшлі на бераг, падалі настаўніку каменьчыкі. Падаў і той хлопчык, але...

— Не той! — зароў настаўнік.— Ты сляпы, ці што? Дык я цябе навучу добра глядзець.

І на цёмнай спіне хлопчыка з'явіўся спачатку белы, а потым чорны шрам.

Заліўся хлопчык слязьмі, а следам за ім і Тубі.

— Чаго ж ты, дурань, равеш? — кажа яму настаўнік.

Але не мог Тубі сказаць, што гэты ўдар яго таварыш атрымаў праз яго, Тубі.

Навука ішла шмат тыдняў, месяцаў.

Каменьчыкі кідаліся ўсё глыбей і глыбей. Потым яны рабіліся ўсё меншыя. Потым сталі кідаць чарапашкі, якія так цяжка было разгледзець у вадзе.

І чым цяжэйшымі рабіліся заданні, тым часцей сыпаліся бізуны...

* * *

Скончылі першы клас, перайшлі ў другі.

Трэба было навучыцца як мага болей трымацца пад вадой.

Выехалі на лодцы ў мора. Спусцілі якар, а да яго прывязалі кошык. Трэба было адным духам адвязаць пад вадой кошык і вынесці на паверхню. Вузлы спачатку былі простыя, а потым усё хітрэйшыя і хітрэйшыя...

І бізуны сталі ўсё часцейшыя і часцейшыя...

Нырнуў Тубі, пачаў адвязваць кошык. Спяшаецца, рукі дрыжаць, а духу ўжо не хапае. Яшчэ трымаецца секунду, другую; кошык вось-вось будзе адвязаны, але ўжо ў галаве памуцілася, у вушах звініць, ужо вада ў нос набіраецца.

«Не, не магу. Хай сабе б'е».

І ён кідае ў той момант, калі кошык быў, можна сказаць, ужо адвязаны. Але настаўнік яго не біў. Бо Тубі зваліўся на дно лодкі ў непрытомнасці, і з носа яго, як калісьці ў яго бацькі, паказалася кроў...

* * *

Вучэнне скончылася. Тубі мае дванаццаць год і ўжо можа падзарабляць. Праўда, не столькі, як дарослы, але яго больш ахвотна бяруць, бо навуку скончыў ён першым.

Працуе ён на меншай глыбіні, бліжэй да берага. Не толькі таму, што ён не можа ныраць там, далей, а яшчэ і таму, што небяспечна. Дарослыя, апрача кошыка, бяруць з сабою яшчэ вялікі нож, а хлопчыкі за іх спіною могуць і без зброі.

Прычапіў сабе Тубі кошык, узяў у рукі вялікі камень, каб хутчэй і лягчэй пайсці на дно, і нырнуў на дванаццаць метраў у глыбіню. (Дарослыя апускаюцца нават на дваццаць метраў.)

Вось ён на дне. Але не роўны пясочак там, а скалы, чорныя, кашлатыя, аброслыя слізкай раслiннасцю. Святла ўжо меней даходзіць сюды, паміж скал нейкія чорныя яміны, дзе варушыцца нешта скручанае, свеціцца нейкае вока.

Вось на адным камені ён заўважыў чарапашкі, борздзенька згроб іх, паклаў у кошык і ўжо быў накіраваўся ўверх, як заўважыў, што зрабілася цёмна, нібы нешта зверху заступіла святло.

Зірнуў — плыве на яго ўжо сапраўднае страшыдла, рыбіна метраў чатырох даўжыні з страшэнным ротам, пастаўленым неяк упоперак пад галавою, з вялікімі міргаючымі вачыма. У расчыненым роце відаць велізарныя зубы. Гэта і быў той самы страшны вораг — акула, супраць якой бралі людзі кінжалы.

Кінуўся Тубі ў адзін бок, кінуўся ў другі, паказаўся ўжо над вадой, але... Жудасны крык... хруснулі косці, а з імі разам і кошык... Тубі загінуў...

Людзі з усіх бакоў спяшаліся на падмогу. Акула досыць нязграбная і няспрытная, людзі могуць з ёй справіцца. Не паспела яна павярнуцца, як некалькі кінжалаў прабілі яе.

Затрапяталася звяруга, нават аглушыла хвастом аднаго чалавека. Запенілася мора, але белая пена была афарбавана крывёю акулы.

Не прайшло ёй дарма гэтае злачынства, загінула і яна.

Пацягнулі акулу да берага, разрэзалі ёй горла і бруха і там знайшлі беднага Тубі з яго кошыкам.

А ў кошыку некалькі чарапашак.

Лапы гаспадароў адразу ж пацягнуліся да чарапашак. Разбілі адну, раздушылі другую, а ў трэцяй знайшлі вялізную прыгожую жамчужыну.

Заблішчалі вочы ў гаспадароў, пстрыкнулі яны пальцамі:

— Во, гэта — рэч! Тысяч пяцьдзесят будзе.

Стаіць, галосіць матка над тым, што засталося ад яе сына. Кляне свой лёс, які ўзяў ад яе мужа і сына. Хмура глядзяць голыя людзі на бязвінную ахвяру, слаўнага, спрытнага маленькага Тубі.

Памякчэлі нават і сэрцы людзей у белых халатах. Нягледзячы на тое, што Тубі працаваў толькі сем дзён, яны заплацілі матцы за ўвесь месяц і, апрача гэтага, дадалі яшчэ 100 рупій (каля 15 рублёў).

* * *

Праз некалькі месяцаў у Лондане быў баль у міністра замежных спраў. Запрошаны былі такія паны, што на кожным з іх каштоўнасцей было не менш як на сто тысяч. Але ж і сярод такіх багацеяў агульную ўвагу звярнула на сябе жонка «нафтавага караля», лэдзі Сміт. Яна ўся ззяла золатам і брыльянтамі. А больш за ўсё вабіла да сябе вялізная дзіўная жамчужына. У залатой аправе, тонка адшліфаваная, яна вісела на грудзях, нібы жывая. Бледны колер, мяккія пераліві святла, аксамітны выгляд — усё гэта вабіла і цешыла вока. Не хацелася верыць, што гэта толькі камень.

— Пяцьдзесят тысяч каштуе! — шапталіся зайздрослівыя пані.

— Нездарма легенда кажа, што гэта скамянелыя божыя слёзы.

Не ведалі яны, што гэта не божыя слёзы, а слёзы маленькага голага чорнага Тубі з вострава Цэйлона.

## ТВТ

*(Урывак)*

### РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ,

**у якім дзеці нібы ўпершыню ўбачылі, што дзеецца вакол іх, а чытач нарэшце (таксама ўпершыню) убачыць, што такое ТВТ.**

Аднаго разу пасля заняткаў у пятым класе затрымалася піянерскае звяно. Тут былі нашы знаёмыя Толя і Ніна Бяспалавы, Андрэй Гуліс, Паўлік Рагатка і Клава Макейчык ды яшчэ Яша Кантаровіч, Стась Кавальскі, Соня Данілава, Лёня Саковіч і Цыбук Бора.

Затрымаліся яны таму, што Паўлік стаў падрабязна расказваць

аб сваіх прыгодах і пакутах, якія ён перацярпеў тады, калі спазніўся ў школу.

— Да чаго ж крыўдна робіцца,— казаў ён,— як успомню, што ўсё гэта здарылася праз такую дробязь, якую мы самі маглі выправіць.

—Ды і ў мяне падобная гісторыя была! — крыкнуў Яша.— У нас сапсаваўся электрычны прас. Спачатку ён доўга бунтаваў: то грэецца, то не, то грэецца, то не. А потым зусім перастаў награвацца. Агледзелі мы шнур — здаецца, цэлы. Прыйшлося мне несці прас да майстра. Той разабраў яго, паглядзеў і кажа: «Па-мойму, спраўны. Мусіць, шнур перарваўся. Трэба было прынесці і яго». Я пабег дахаты і прынёс шнур. Майстар разгледзеў яго — і таксама нічога не знайшоў. А потым памацаў вілку і кажа: «Глядзі, вось гэтая ножка адкруцілася». Узяў пальцамі і падкруціў яе. І больш нічога!

— А ведаеце што? — сказаў тады Андрэйка.— Мне таксама прыйшлося шмат перацярпець за тое, што я не здагадаўся разы са два шмаргануць напільнікам па ключу.

І пад агульны смех ён расказаў, як начаваў з парсючком і што з гэтага выйшла.

Тады Стась расказаў, як у яго паляцелі ў лужыну ўсе кнігі і сшыткі разам з партфелем, у якога адарвалася ручка.

— А прымацаваць ручку я мог бы і сам, не чакаючы, пакуль яна адарвецца,— прызнаўся Стась.

Адным словам, падобных выпадкаў знайшлося досыць у кожнага, і калі іх сабралі разам, то выйшла карціна, над якой дзеці сур'ёзна задумаліся. Яны нібы ўпершыню ўбачылі, што дзеецца вакол іх. Убачылі і самі здзівіліся.

— Выходзіць, што мы жывём у палоне ў рэчаў,— разважліва сказала Клава.— Выходзіць, што не мы імі кіруем, а яны намі. Якая-небудзь патэльня, што захоча, тое і робіць, а ты толькі глядзі на яе ці кліч на дапамогу людзей.

— Яно сапраўды выходзіць, што мы нібы залежым ад розных хатніх рэчаў,— дадаў Паўлік.— Яны нас падводзяць на кожным кроку, а мы толькі церпім ды чакаем ад кагосьці дапамогі. А каб захацелі, то самі маглі б справіцца з імі.

— Тады трэба абвясціць ім вайну,— са смехам сказаў Бора Цыбук.

— А што ты думаеш? — сур'ёзна адказаў яму Паўлік.— Зусім нядрэнна было б. Як толькі хто з іх пачне шкодзіць — зараз жа і пастаўіць яго на месца.

— Давайце тады складзём гурток,— прапанавала Клава,— і паабяцаем, што ўсе такія дробныя папраўкі будзем рабіць самі.

— Правільна! — падтрымаў яе Стась.— Гэта будзе зусім новы і цікавы гурток. Можна назваць яго гуртком «Хатніх тэхнікаў».

— Не, не! — пачуліся галасы.— Назва нецікавая!

— Калі ўжо мы збіраемся ваяваць,— сказаў Толя,— то лепш назваць гурток «Ваяўнічымі тэхнікамі».

— І не гурток,— крыкнуў Яша,— а таварыства. «Таварыства ваяўнічых тэхнікаў», або скарочана — «ТэВэТэ».

Гэтая назва спадабалася ўсім.

Нарэшце Толя ўнёс яшчэ адну прапанову:

— Кожнае таварыства мае правілы.

— Гэта называецца статутам,— паправіў Паўлік.

— Хай будзе статут,— згадзіўся Толя.— Трэба і нам скласці статут нашага таварыства.

Праз паўгадзіны на свет з'явіўся наступны дакумент:

*СТАТУТ*

*Таварыства ваяўнічых тэхнікаў*

*Таварыства ваяўнічых тэхнікаў абвяшчае барацьбу за незалежнасць ад хатніх рэчаў.*

*Дзеля гэтага члены ТВТ абавязваюцца:*

*1. Сачыць і выконваць усе дробныя хатнія рамонты сваімі ўласнымі рукамі.*

*2. Калі хто з членаў чаго-небудзь сам зрабіць не зможа, то звяртаецца за дапамогай да сваіх таварышаў.*

*3. І толькі тады, калі і таварышы не змогуць дапамагчы,— член таварыства мае права звяртацца да платных майстроў.*

Толя ўзлез на парту і зачытаў статут.

— Будзем галасаваць. Хто...

Але тут дошка пад яго нагамі асунулася (завеска не трымала), Толя пахіснуўся і ледзь паспеў саскочыць на падлогу.

— Ах, чорт! — вылаяўся ён, але зараз жа зноў звярнуўся да сваіх таварышаў: — Ну, дык хто за, прашу падняць рукі.

— Я! Я! Ды ўсе, няма чаго галасаваць! — адказалі рабяты, падняўшы рукі.

Адна толькі Клава не падняла рукі і неяк дзіўна пазірала на ўсіх.

— Ну, а ты што? — звярнуліся да яе.

— Слухайце, таварышы! Што ж гэта мы робім? — сказала яна нейкім строгім голасам.

— Не ведаеш, ці што? — засмяяліся таварышы.— Адкуль ты звалілася?

— А вось ці бачылі вы, як зваліўся Толя? — спыталася Клава.

— Вядома, бачылі. Але што з таго?

— А чаму ён зваліўся?

— Таму, што зямля прыцягнула,— пажартаваў Яша.

— Не, вы адкажыце сур'ёзна, чаму ён зваліўся? — настойвала Клава.

— Ну, дошка пасунулася,— адказаў Толя.

— А чаму яна пасунулася? — вяла сваю лінію Клава.

— Ды завеска адламалася,— сказала Ніна, якая стаяла ля гэтай парты.

— А мы самі маглі б яе прымацаваць? — насядала Клава.

— Дзіўная рэч,— прамовіў Андрэй.— Колькі часу я сам на гэтай парце сяджу і ніколі ў галаву не прыходзіла ўзяць ды замацаваць гэтую завеску. Бо не я зламаў.

— А я вось цяпер паляцеў, ды і то не здагадаўся, у чым справа,— прамовіў Толя, чухаючы патыліцу.— Вось да чаго не прывыклі мы думаць пра такія рэчы.

Паўлік некаторы час задумліва глядзеў на зламаную завеску, а потым павольна, нібы сам да сябе, сказаў:

— Цікавыя справы робяцца на свеце! Каб хто даў нам заданне прыбіць гэтую завеску, мы, пэўна, зрабілі б гэта ахвотна. А самім у галаву не прыходзіць, нават не бачым. І не толькі тут, але і дома мы не ўмеем бачыць. Я цяпер толькі прыпомніў, што ў нас у чамадане таксама адарвалася адна палова завескі. Мы яго адчыняем, зачыняем і нібы чакаем, пакуль адарвецца другая палавінка. Сёння, як толькі прыйду дахаты, зараза жа прымацую гэтую завеску.

А ў выніку ўсёй гэтай гісторыі з завескай у статуце з'явіўся новы і вельмі важны пункт:

*4. Дзейнасць ТВТ пашыраецца таксама і на школу.*

Ну, а завеску паправіць ім было зусім лёгка. У той час ішоў яшчэ міма дырэктар і, пачуўшы стук, зайшоў у клас. Убачыўшы, што робяць вучні, ён так узрадаваўся, нібы яму пабудавалі новую школу.

— Вось дзе сапраўдныя савецкія вучні! — сказаў ён.—Каб усе ды заўсёды гэтак рабілі!

Вучням нават сорамна зрабілася: за такую дробязь ды гэтак хваляць. А дырэктар пасля таго стаў хваліць іх і перад іншымі вучнямі. Папракаючы за нешта шосты клас, ён казаў:

— У пятым класе вучні па сваёй ініцыятыве паправілі парту, а вы толькі псаваць умееце.

Першы крок Таварыства ваяўнічых тэхнікаў выйшаў вельмі ўдалым, і арганізатары мелі ўсе падставы ганарыцца сваёй выдумкай. Але расказаць аб гэтым у школе яны не адважыліся. Калі яны зробяць добрую справу, кожны скажа, што гэта добра. А калі даведаюцца, што для такой простай справы яны выдумалі нейкае Таварыства, статут, параграфы, то пэўна смяяцца будуць з іх. Лепш аб гэтым не казаць. Яно нават цікавей будзе.

## МАКСІМКА

Дзіцячы дом стаяў у зацішным кутку, сярод узгоркаў, парослых самымі разнастайнымі дрэвамі — хвоямі, бярозамі, дубамі. Унізе — рачулка, лазнякі, паплавы. Воддаль была чыгуначная станцыя. Гудкі паравозаў сведчылі, што гэты зацішны куток усё ж такі звязаны з шумным светам. А асноўнае насельніцтва дзіцячага дома нават вельмі звяртала ўвагу на гэтыя гудкі: яны напаміналі, што да каго-небудзь з іх можа прыехаць татка або мамка. Але да каго?

Некаторая частка больш дарослых загадзя ведала, што да іх прыедзе хто-небудзь з бацькоў і возьме дадому. Але такіх было вельмі

мала; большасць ведала, што па іх ніхто ўжо не прыедзе... Ведалі яны гэта даўно, прымірыліся з лёсам і толькі з зайздрасцю пазіралі на тых, да каго прыязджалі бацькі.

І была яшчэ значная група грамадзян чатырох-, пяцігадовага ўзросту, якія ўсе былі ўпэўнены, што да іх заўтра прыедзе татка. Ні ў якім разе не мамка, а толькі татка, у пагонах, з медалямі, з рэвальверам.

Довадаў для такога пераканання было колькі хочаш. Па-першае, вайна скончылася, і ўсе таткі, пабіўшы і забраўшы ў палон фашыстаў, павінны вярнуцца дадому. Аб гэтым казалі ўсе — і цёця Каця, і старэйшыя дзеці, і самі малышы, працуючы ў пяску.

Знаходзіўся гэты пясок на сонечным баку ўзгорка, пакрытага хвоямі. Туды ахвотна ішлі на працу не толькі нашы малышы, але і больш дарослыя дзеці. Там заўсёды капашыўся народ, і ўся гэтая мясціна мела акурат такі самы выгляд, які маюць здалёк вялікія горныя распрацоўкі.

Тут кожны знаходзіў сабе працу па густу. Тут можна было і бліндажы будаваць, і супрацьтанкавыя равы, а пад карэннямі хвояў — нават сапраўдныя зямлянкі. Можна было і хлеб пячы, і лялькі рабіць, і гарады адбудоўваць, і купацца ў пяску — і ад усяго гэтага мець самае светлае дзіцячае шчасце.

Малышы займалі на гэтай пляцоўцы цэнтральнае месца. Іх участак быў найбольш насычаны рознымі механізмамі: лапаткамі, вядзёрцамі, тачкамі, скрыначкамі, дошчачкамі, аўтамашынамі, мячыкамі, драўлянымі яйкамі і матрошкамі. Тут адбываліся і дыскусіі па важнейшых пытаннях бягучага жыцця. Так, напрыклад, калі кончылася вайна, адразу ж на абгаварэнне было пастаўлена пытанне аб ролі татак у Айчыннай вайне. Спрэчкі распачаў Юра. Ён сказаў:

— Мой татка пабіў многа-многа фашыстаў.

— А мой татка пабіў столькі, і яшчэ столькі, і яшчэ столькі,— зараз жа адказаў Бора, паказваючы рукамі на лясы і ўзгоркі.

— А мой татка пабіў усіх фашыстаў і там, і там, і ўсюды,— абвясціў Сеня.

Было іх тут чалавек дзесяць, і кожны лічыў патрэбным выступіць з такой заявай незалежна ад таго, памятаў хто свайго татку ці не. Аднак усе яны мелі права выказвацца па ваенных пытаннях, бо ў кожнага з іх было ваеннае мінулае. Мінулае з тых часоў, калі ім было па годзіку ці два.

Ці захаваліся ў іх якія ўспаміны аб тых падзеях? Былі ўспаміны, і вельмі яркія, ды толькі несвядомыя, паміж сабой не звязаныя. Вось гэты самы Юра добра памятае, як гарэлі хаты, і зусім не ведае, што ў гэты час згарэлі яго маці, бабка, сястра і брат. А Бора памятае лес, памятае, як беглі людзі, крычалі, стралялі, а не ведае, што ён быў знойдзены ў лесе каля забітай мамкі. Сеня памятае толькі, як мамка везла яго на саначках, як было весела і цікава. Нават ветэран Алёша, у якога немец страляў з рэвальвера і ў якога да гэтага часу застаўся на шчацэ шрам ад раны, нават гэты сталы і разважлівы Алёша памятае толькі немцаву каску ды чорныя вусікі, а больш нічога.

Тут, у дзіцячым доме, іх веды значна папоўніліся. Перш за ўсё яны даведаліся, што іхнія мамы, існавання якіх адмаўляць ніхто не адважваўся, вельмі заняты рознымі важнымі справамі і ніяк не могуць наведаць сваіх дзяцей. Кожны дзень яны збіраюцца прыйсці, ды ўсё не выпадае: то не выраслі яшчэ яблыкі, якія адна мама хоча прынесці, то другая мама аніяк не можа знайсці самага лепшага пеўніка, без якога ехаць зусім немагчыма, а трэцяя мама ўсё шые нейкую цудоўную кашулю. У некаторых выпадках мамы не ехалі таму, што іхнія дзеткі былі тут нядобрыя: не слухаліся, не елі, не хацелі спаць і нават крыўдзілі таварышаў. Часам мама была ўжо тут недзе блізка, але не ішла, чакала, пакуль яе Уладзік зробіцца зусім добрым.

Так стаяла пытанне наконт мам. І хоць мамы могуць пакрыўдзіцца, мы адважымся сказаць, што пытанне гэтае не было надта вострым і актуальным. Вострым не было таму, што цёця Каця і няня Насця досыць паспяхова замяшчалі невядомых мам. А актуальным не было таму, што ў ваенны час, як ні кажы, а на першы план усё ж такі выступалі таты.

Усе дзеці ведалі, што іхнія таткі на вайне, б'юць фашыстаў. Нават Віця, у якога бацька памёр перад вайной, быў упэўнены, што яго татка цяпер ваюе не горш за другіх. Калі да іх даходзіла гаворка, што там ці там нашы пабілі немцаў і ўзялі горад, то кожны ўжо ведаў, што гэта зрабіў галоўным чынам яго татка.

І вось цяпер яны пачулі, што вайна скончана, кожны можа чакаць, што да яго прыедзе татка.

Першаму пашанцавала Сярожу. Ніхто нічога не бачыў, не ведаў, а раптам і цёця Каця і няня пачалі шукаць і клікаць яго:

— Сярожа! Ідзі сюды, да цябе татка прыехаў!

Той як усхопіцца, як пабяжыць! А за ім і Юра, і Бора, і Алёша, і Максімка. Сярожу зараз жа ўзяла за руку цёця Каця і павяла, а ўсе іншыя ішлі ззаду самі, і ніхто на іх не звяртаў увагі.

Цёця Каця прывяла Сярожу ў сталовую, падвяла да высокага ваеннага і сказала:

— Вось ён!

Ваенны схапіў Сярожу ў абдымкі, стаў цалаваць, гладзіць па галаве і ўсё гаварыў:

— Во які ты маладзец! І пазнаць нельга!

Сярожа саромеўся і нічога не казаў. Але адным вокам усё пазіраў на сваіх таварышаў, якія ціскаліся ў дзвярах, каб паглядзець на гэтую сустрэчу. Сярожа ведаў, што таварышы яму зайздросцяць, і вельмі задаваўся. Гэта відаць было па яго праваму воку, якое было хітрае-хітрае і выразна паказвала, што Сярожа надта хоча сказаць:

— Ага!

Але тут цёця Каця чамусьці стала адганяць дзяцей ад дзвярэй:

— Ну, чаго вы лезеце сюды? Не перашкаджайце. Ідзіце на свой пясочак, гуляйце. Калі будзеце добрымі, то і да вас татка прыедзе.

Ну як тут не быць добрым! На Максімку ніхто не скардзіўся; Максімку хваліла і цёця Каця і няня Насця; Максімка старанна еў тады, калі яму зусім не хацелася есці, і ціхенька ляжаў, калі

яму зусім не хацелася спаць. Аднак ён адразу адгукнуўся на словы цёці Каці:

— А я не запэцкаўся! — і паказаў свой сіні з белымі палоскамі халацік. З кішэні высоўвалася белая насавая хустачка, а з носа — белая кропелька. Сустрэцца ім усё неяк не шанцавала.

— Ведаю, што Максімка добры хлопчык! — сказала цёця Каця.— Затое татка да яго прыедзе і пахваліць. Толькі ты хустачкай нос выцірай, хустачку аб нос можна пэцкаць.

Максімка нязграбна, абедзвюма рукамі выцягнуў хустачку, ссунуў сваю кроплю на бок і сяк-так зноў запхнуў хусцінку ў кішэню. Цяпер ужо татка яго абавязкова пахваліць.

На другі дзень на пясчаных распрацоўках Сярожы ўжо не было,— ён паехаў са сваім таткам. Мусіць, кожны падумаў: як цікава яму цяпер!

— І мой татка ўчора прыедзе! — катэгарычна абвясціў Юра, нібы толькі што атрымаў тэлеграму.

Але яго зараз жа перакрыў Уладзік (яго татка загінуў пад Севастопалем):

— А мой татка прыедзе заўтра і прывязе мне стрэльбу!

— А мой татка прывязе мне самалёт! — крыкнуў Сеня.— І я буду на ім катацца.

Гэтыя словы пачуў васьмігадовы Толя, які працаваў на суседнім участку. Толя ўжо лічыў сябе сталым чалавекам. Ён памятаў і свайго татку і сваю мамку. А цёця Каця яшчэ казала, што яны шукаюць яго. Дзіцячыя, беспадстаўныя меркаванні Сені здаліся Толю зусім недарэчнымі, і ён насмешліва сказаў:

— На такім самалёце лятаць нельга — ён для гульні. А мне татка купіць веласіпед сапраўдны, на якім можна ездзіць.

Максімка адчуў, што маўчаць болей нельга, што трэба ратаваць свой гонар і гонар свайго таткі. Ён устаў на ўвесь рост і ўрачыста сказаў:

—А мой татка прывязе мне машыну!

Усе яго канкурэнты прыціхлі: што ні кажы, а супраць машыны выступаць цяжка.

Але раптам у Максімкі пацямнела ў вачах: хтосьці абхапіў яго галаву і вочы, пацалаваў і прамовіў:

— Гаротны ты мой!..

Гэта была няня. Яна ведала, што ў яго няма ні таткі, ні мамкі, і словы яго разанулі ёй сэрца... Але Максімка не звярнуў на гэта ўвагі: ён быў ахоплены пачуццём перамогі над таварышамі і, апрача таго, вельмі канкрэтна ўяўляў сабе татку і машыну.

Юра ўбачыў, што ён застаўся далёка ззаду, і крыкнуў дадаткова:

— А мой татка прывязе мне сто машын!

Тады выступіў Алёша з заявай, што яго татка прывязе яму тысячу машын. Нехта ўжыў нават слова «мільён», але ўсе гэтыя выступленні ўжо не зрабілі ніякага ўражання, бо выразна адчувалася, што прамоўцы самі не вераць сваім словам і гавораць так сабе, абы не саступіць другім.

Падобныя гутаркі паўтараліся не раз. Асабліва тады, калі які-небудзь татка сапраўды прыязджаў. А такіх выпадкаў за лета было тры. Было яшчэ некалькі выпадкаў, калі прыязджалі мамы або цёткі. Але іх прыезд зусім не рабіў такога шуму, як прыезд героя-таткі. Таму зусім не дзіва, што кожнаму хацелася пахваліцца іменна сваім таткам. Хацелася і Уладзіку, і Максімку, і яшчэ многім з тых, чые таткі ляжалі пад Сталінградам, Будапештам, Берлінам... Яны не ведалі гэтага і ведаць не жадалі, нават каб і знайшоўся такі чалавек, які адважыўся б ім растлумачыць.

Аднаго разу, у жніўні, па дарозе ад станцыі ішоў ваенны. На левай руцэ ў яго вісеў шынель, у правай ён нёс невялікі чамадан. Здалёк відаць было, як блішчалі на яго грудзях ордэны і медалі.

Максімка ў гэты час адзін у кутку саду паляваў на нейкага залатога жука. Але зараз жа пакінуў яго, калі ўбачыў, што ў гэты бок ідзе нечы ваенны татка.

А можа, гэта ўжо ягоны татка?..

Дарога ў дзіцячы дом ішла ля самага плота. Максімка, рызыкуючы апячыся аб крапіву, прасунуў скрозь плот галаву і прагна сачыў за падарожнікам. Той набліжаўся шпарка; ён рабіў такія крокі, што толькі боты паблісквалі.

Калі мужчына падышоў зусім блізка, Максімка ўбачыў, што ён плячысты і такі высокі, што адны боты былі б Максімку да падбародка. А твар у дзядзькі светлы і вельмі прыемны. Ды яшчэ медалі блішчаць. Магчыма, гэта і ёсць яго татка. Але як пазнаць яго? А можа, ён сам пазнае Максімку?

І хлопчык стараўся яшчэ болей высунуць галаву. Сярод крапівы ды лапухоў твар яго вызначаўся, як белая кветка, а вочкі гарэлі, як вугольчыкі. І столькі прагнага імкнення было ў гэтых вачах, што яны спынілі б вялікага дзядзьку нават і тады, каб былі накіраваны яму ў спіну.

Ваенны прыпыніўся.

— Ты куды, браток, ушчаміўся, га? — сказаў ён са смехам.— Назад не вылезеш? Можа, дапамагчы табе?

— А вось і вылезу! — адказаў Максімка і адсунуўся назад, каб паказаць, што ніякай бяды няма.

Ваеннаму нічога не заставалася, як ісці далей. А Максімка садам пайшоў за ім следам. Адзіная думка валодала ім: чый гэта татка? І тут жа разам цёплая надзея і мацнейшае жаданне штурхалі на другое пытанне: а можа, мой?..

Калі Максімка прыйшоў у дом, то ўбачыў, што ваенны сядзіць адзін у сталовай і нібы кагосьці чакае. Ці не яго, Максімку?.. Маленькае сэрца застукала моцна-моцна. Ён стаіўся ля дзвярэй і стаў наглядаць. Ваенны то ўставаў, падыходзіў да акна, то зноў садзіўся.

Чаму да яго ніхто не ідзе? І цёці Каці няма. А яна ж заўсёды ведае, чый татка прыехаў і каго трэба паклікаць.

Не, відаць, ён не чый татка, а Максімкаў. Максімка адразу пазнаў яго: акурат пра такога самага татку ён заўсёды і думаў —

і боты, і медалі, і дужы, і добры. І бачыў ён яго раней, калі быў малы. А татка цяпер не пазнаў Максімку таму, што ён ужо вырас....

Схіліўшы галаву і хвалюючыся, Максімка ўвайшоў у сталовую і бокам-бокам пасунуўся да ваеннага. Той сядзеў, абапёршыся локцямі аб калені, і штосьці такое думаў. У гэтую мінуту Максімка, сарамліва ўсміхаючыся, праціснуўся паміж каленяў і шчыра прытуліўся да яго грудзей.

Ваенны зараз жа абняў Максімку, прытуліў, стаў гладзіць па галаве, гаворачы:

— Гэта ты, мой пацан? Той, што ўшчаміўся ў плоце? Добры хлапец. А як цябе зваць?

— Максімка,— ціха адказаў хлопчык, кратаючы медалі.

— Максімка? Вельмі добрае імя. У нас на вайне Максімкі здорава білі фашыстаў. Як зададуць ім — та-та-та! Фашысты ходу, дагары нагамі ляцяць. Во якія ў нас былі Максімкі!

— А яны былі вялікія?

— Не, малыя, такія самыя, як ты,— смяецца татка,— і мы іх вазілі на калёсіках.

Максімка зараз жа ўявіў сабе, як хлопчыкі сядзяць на калясачках, а таткі шпарка-шпарка вязуць іх на немцаў. Максімкі страляюць — та-та-та! — а немцы ўцякаюць. Як шкада, што яго, Максімкі, там не было. І яго татка пакатаў бы, і яны разам фашыстаў білі б.

— А чаму ты мяне не ўзяў? — папікнуў Максімка татку.

— Не ведаў, братка ты мой, дзе ты жывеш,— зноў смяецца татка.

Ад гэтага смеху твар таткі робіцца яшчэ больш прыгожым і добрым. Максімка туліцца да яго бліжэй, перабірае рукою бліскучыя гузікі, рамяні. Ад кожнага руху таткі гэтыя рамяні рыпаюць, і ад іх ідзе нейкі прыемны пах. Ніколі не было Максімку так прыемна, так цёпла на сэрцы. Ён прытуліўся шчакой да таткавай рукі і спытаў:

— А машыну мне прывёз?

Раптам з таткам нешта здарылася: ён перастаў смяяцца, спахмурнеў, нават адсунуў руку ад Максімкавай шчакі, нібы чагосьці спалохаўся. Потым дзвюма рукамі моцна сціснуў Максімку за плечы, паглядзеў на яго сур'ёзна, нібы сурова, і ціха прамовіў:

— Бедны хлопчык!..

Затым устаў, заспяшаўся, схіліўся над сваім чамаданам...

У гэтую хвіліну ў сталовую ўвайшла цёця Каця, а з ёю Толя. Толя крыкнуў: «Тата!» — і пабег да ваеннага, а той пайшоў яму насустрач, схапіў пад пахі, падняў высока-высока, а потым прыціснуў да сябе, пацалаваў і сказаў:

— А які ж ты вялікі зрабіўся!

Павярнуўшыся, ён зноў убачыў Максімку. Той стаяў ля яго чамадана, апусціўшы рукі, і з вялікай пакутай глядзеў на бацьку з сынам. З вачэй яго збіраліся скаціцца дзве кропелькі.

Зноў у ваеннага знік смех, знікла весялосць.

— Хто гэты хлопчык? Ці ёсць у яго бацькі? — ціха спытаў ён цёцю Кацю.

— Гэта наш слаўны Максімка,— адказала цёця Каця.— Бацька яго загінуў пад Сталінградам, а маці закатавалі немцы. Больш у яго нікога няма.

— Калі ласка, прашу вас,— стаў прасіць ваенны,— суцешце яго як-небудзь. Ён жа палічыў мяне за свайго бацьку.

Ваенны паставіў свайго сына на зямлю, падбег да чамадана, адчыніў яго і хуценька пачаў вымаць з яго: дасканалую аўтамашыну, некалькі плітак шакаладу, размаляваную кніжку і яшчэ нейкія цікавыя рэчы. Усё гэта выклажыў ён каля ног Максімкі і сказаў:

— Бяры, Максімка, гэта табе прыслалі.

Тады пакрыўдзіўся Толя і плакучым голасам сказаў:

— А мне?.. Мне дык нічога...

— Табе, братка, крыўдзіцца ніяк нельга,— сказаў бацька, зачыняючы чамадан.—У цябе ёсць усё і будзе ўсё, што толькі захочаш.

А Максімка нават не паварушыўся. Ён глядзеў некуды ўбок, а дзве кропелькі ўжо каціліся ўніз... Але ён маўчаў. Ён разумеў, што ні ад каго не можа патрабаваць, каб гэты дзядзька стаў яго таткам.

Тут яго падхапіла на рукі цёця Каця, пачала цалаваць, мілаваць ды прыгаворваць:

— Паглядзі, Максімка, якую табе машыну прывезлі. Ніхто такой не мае... А кніжка якая!..

Пры гэтым яна старалася стаць так, каб засланіць ад яго бацьку з сынам.

А бацька абы-як зачыніў чамадан, узяў за руку Толю і ціха пайшоў за дзверы з такім выглядам і адчуваннем, нібы зрабіў нешта нядобрае, нібы ён нечым вінаваты.

...Цёпла, светла, утульна ў кватэры. Толя мае свой уласны кут, а ў ім усё, што хочаш,— і машыны, і кніжкі, і ўсялякія цацкі. За сталом — бацька і маці.

— Я і да гэтага часу не магу прывыкнуць, што мы зноў сабраліся разам,— кажа маці.— Ты — недзе на фронце, я — у палявым шпіталі, а Толя з бабуляй і зусім невядома дзе.

— Навошта ўсё гэта ўспамінаць? — кажа бацька.— Скончылася шчасліва для нас — і годзе.

— Так... для нас,— задумліва сказала маці.— А для іншых?.. Скажам, для таго Максімкі, пра якога ты расказваў...

Бацька зморшчыўся, нібы яму што забалела, і сказаў:

— Зноў ты напомніла мне пра гэтага хлопчыка! Ён і так заўсёды стаіць у маіх вачах.

— Ды і я не забываю яго, хоць сама і не бачыла,— мякка ўсміхаючыся, сказала маці.

— Яму там зусім нядрэнна: і сыты, і дагледжаны, і жыве нібы ў сям'і.

На другі дзень, калі бацька і маці сядзелі на канапе, да іх падбег Толя, вясёлы, шчаслівы. Ён праціснуўся паміж каленяў бацькі, прытуліўся да яго і сказаў:

— А веласіпед сапраўды мне купіш?

— Куплю, сынок, куплю. Толькі пакуль што няма дзе купіць,—

адказаў бацька, а потым звярнуўся да жонкі.— Акурат таксама той хлопчык прытуліўся да мяне і прасіў машыну. Ён так быў упэўнены, што перад ім яго татка...

Маці сказала:

— Ведаеш, што я думаю: ці мае права наш Толя быць такім шчаслівым, калі столькі дзяцей засталося без бацькоў?

— Чаму ж не? — адказаў бацька.— Ён нічыё месца не займае. А вось мы займаем месца забітых бацькоў, таму не маем права забываць пра іх дзяцей.

Так Максімка, сам таго не ведаючы, увайшоў у жыццё гэтай шчаслівай сям'і. Увайшоў і заняў пэўнае месца ў сэрцы не толькі бацькі, але і маткі, якой часам здавалася, нібы яна сама прысутнічала пры той сустрэчы: надта ўжо выразна перадаў ёй муж усю сцэну. І пры кожным выпадку яны з замілаваннем успаміналі незнаёмага, далёкага хлопчыка Максімку.

...Была ўжо восень. Дрэвы вакол дзіцячага дома пажоўклі. Апусцелі пясчаныя распрацоўкі. Пранізлівы вецер без перашкоды гуляў па пералесках і ўзгорках. З зачыненага дома ішоў гул, як з устрывожанага вулля.

Малышы перанеслі сваё будаўніцтва ў памяшканне. Замест пяску ў іх цяпер былі бярвенні, фермы, блокі, кубікі. Як і раней, яны чакалі, што заўтра ці ўчора прыедзе татка і прывязе нешта такое... такое...

— А мой татка прывязе мне сто кубікаў!

— А мой татка прывязе мне поўны дом кубікаў!..

Раптам падышла цёця Каця:

— Максімка, ідзі сюды! Да цябе татка прыехаў!

Нельга сказаць, каб Максімка вельмі здзівіўся: ён і без таго ведаў, што калі-небудзь ды татка прыедзе. Але ўсё ж такі ён захваляваўся і пачырванеў.

Цёця Каця ўзяла яго за руку і павяла. А ззаду самі ішлі Алёшка, Віцька, Сенька, Борка, і на іх ніхто не звяртаў увагі. Хутка Максімка ўбачыў высокага дзядзьку і адразу пазнаў, што гэта той самы татка, які прывёз яму машыну, але тады чамусьці не захацеў узяць яго з сабой. Затое цяпер ён сам падышоў да Максімкі, узяў яго на рукі і сказаў:

— Ну, Максімка, збірайся: едзем дадому, мама чакае.

І зноў Максімка ўбачыў той самы светлы, прыемны твар, зноў адчуў цеплыню на сэрцы і зноў шчыра прытуліўся да грудзей таткі.

Але адно вока яго глядзела на таварышаў хітра-хітра, ён не мог стрымаць сябе і сказаў ім:

— Ага!..

## ШЧАСЦЕ

### Эцюд

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ як мага, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і зараснікі аеру ды чароту, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зяляніна, што жыве навакол, дыхае, шамаціць і запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека. Не відаць людзей, не чуваць, але гоману досыць і без іх: адны конікі сваім цырканнем могуць заглушыць усіх людзей, а тут яшчэ кукуюць жаўтабрухія жабы, заліваюцца мітуслівыя птушкі ды гудуць мясістыя чмялі.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і мне. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскакваючы на адной назе ды махаючы белым дубцом.

Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць. Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. Я разумею яго. Калі і я гатоў усіх абняць у гэты жыватворны дзень, дык што ж павінна адбывацца ў яго маленькім чыстым сэрцы? Я лагодна ўсміхаюся яму, ківаю галавой і кажу:

— Добра жыць на свеце, браток, га?

Тварык хлопчыка засвяціўся яшчэ больш, але ён нічога не сказаў. Ды і што ён мог сказаць? Мы і без слоў разумелі адзін аднаго.

Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык. І з выразу вачэй яго таксама пырскала шчасце, і таксама здавалася, што ён вось-вось нешта скажа. Скажа, што надта прыемна ў такі дзень басаногж скакаць па мосце ды махаць свежым дубцом, што ў грудзях яго цяпер вельмі цесна і адтуль нешта выпірае, што ўвесь свет вельмі прыгожы, што дзядзька, якога ён сустрэў на мосце, таксама прыгожы і добры, ды і наогул усе дзядзькі і цёткі прыгожыя і добрыя... Ён нічога не казаў толькі таму, што не ўмеў выказаць такіх думак і пачуццяў. Ды яно і не трэба было — я і так усё разумеў. Хіба я сам калісьці не быў такім, як ён? Хіба я сам не адчуваў радасці жыцця? Асабліва ў такі цудоўны дзень.

Я яго разумеў. Але ён, відаць, гэтага не ведаў, бо ўсё глядзеў мне ў вочы, нібы чагосьці чакаючы ад мяне. Ён заліваў мяне сваім шчасцем, а я ў адказ нічога не мог яму даць. Для яго маёй шчырай і ветлівай усмешкі было мала. Мне трэба яму нешта сказаць. Але што? Што яму сказаць, каб перадаць усю тую цеплыню, якую я да яго адчуваю? А мне засталося ступіць толькі адзін крок — і мы размінёмся. Размінёмся, можа, навекі.

—Як цябе зваць? — сказаў я нарэшце, каб толькі не маўчаць.

Сказаў — і зараз жа пачырванеў ад сораму: хлопчык нічога мне не адказаў. Сваім дзіцячым інстынктам ён, відаць, зразумеў, што словы гэтыя сказаны так сабе, абы сказаць. Мала таго: твар яго перастаў свяціцца, нават неяк балюча скрывіўся. А потым... потым з грудзей яго вырваўся крык!..

Не адзін год прайшоў з таго часу, а голас хлопчыка і цяпер гучыць у маіх вушах.

Гэта быў шчыры, мімавольны крык дзіцячай душы. У ім былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок да нас, дарослых і разумных людзей.

Два словы толькі было ў гэтым крыку:

— Дзядзька! Шапка!..

Але гэтага было досыць, каб зразумець, хоць і са спазненнем, усю тую трагедыю, якая адбылася тут, на мосце, у гэты радасны летні дзень.

У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў, відаць, першы раз. Добрая шапка, шэрая, каляная. Яна ахапіла не толькі галаву хлопчыка, але ўсё цела і душу. Гэта ж праз яе сёння такі цудоўны дзень, а я гэтага не ведаў. І сонца так шчодра свеціць толькі дзеля таго, каб усе здалёк маглі бачыць шапку, а я не заўважыў яе і зблізку. Адзін, усяго толькі адзін крок заставалася зрабіць — і ўся сустрэча пайшла б прахам. Ці магла чулая дзіцячая душа сцярпець такую несправядлівасць, такое халоднае бяздушша?

І яна не сцярпела...

Я адчуў сябе вельмі вінаватым і кінуўся выпраўляць сваю віну.

— Ах, якая цудоўная ў цябе шапка! — крыкнуў я.— Пакажы, пакажы!

Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю.

Я зняў з яго галавы шапку. Яна сапраўды хрусцела, як бляшаная.

Хлопчык глядзеў на мяне ўдзячнымі вачыма, бы на свайго збаўцу.

— Які казырок! І шнурок! І гузікі два! — стараўся я.— А падкладка якая цудоўная! Хто купіў?

— Мамка! — з гордасцю адказаў хлопчык.

Несправядлівасць была выпраўлена.

І мы абодва, зноў шчаслівыя, разышліся кожны сваім шляхам.

## АЛЕСЬ ЯКІМОВІЧ

Вядомы дзіцячы пісьменнік Алесь (Аляксандр Іванавіч) Якімовіч нарадзіўся 17 студзеня 1904 г. у вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Будучы мастак слова паспяхова скончыў Вышэйшае пачатковае вучылішча ў мястэчку Узда і двухмесячныя настаўніцкія курсы, пасля чаго вучыўся ў Белпедтэхнікуме (1921—1926). Ужо ў студэнцкія гады пачаў пісаць вершы; адзін з іх — «Вясна» трапіў у першы нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Маладняк» за 1923 г. Неўзабаве А. Якімовіча прымаюць у члены літаратурнай арганізацыі «Маладняк»; прызначаюць адказным сакратаром рэдакцыі новага часопіса для школьнікаў «Беларускі піянер» (1924). З 1927 г. займаўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, якое скончыў у 1930 г. Вучобу ва універсітэце сумяшчаў з працай рэдактара часопіса «Іскры Ільіча». Некаторы час працаваў сакратаром педагагічнага часопіса «Асвета» і выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў вячэрнім тэхнікуме вогнетрывалага будаўніцтва.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны настаўнічаў у адной з сярэдніх школ Татарскай АССР, працаваў адказным сакратаром раённай газеты Казахскай ССР. Адтуль у 1942 г. быў накіраваны на курсы малодшых лейтэнантаў у г. Андыжан, затым — на фронт. Пад Харкавам быў паранены; пасля выхаду са шпіталя пэўны

час жыў у Маскве, займаўся рэдактарскай працай. Пасля вайны рэдагаваў часопіс «Бярозка», працаваў у рэдакцыі педагагічнай і дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР, літкансультантам у Саюзе пісьменнікаў рэспублікі.

Пачатак творчасці А. Якімовіча прыпадае на 20-я гг.— перыяд станаўлення беларускай савецкай дзіцячай літаратуры. У 1925 г. выйшаў з друку яго першы зборнік «Вершы». З цягам часу пісьменнік аддае перавагу прозе, галоўным чынам такому яе жанру, як апавяданне, пра што сведчаць зборнікі «Гул бубна» (1925), «Залаты зуб» (1937), «Помста» (1946), «Сябры» (1948), «Я — юны піянер» (1952), «Залатыя рукі» (1975).

Плённа працаваў А. Якімовіч і ў жанры аповесці. У 1930 г. выйшла з друку яго першая аповесць «Перамога», у 1935 г.— «Незвычайны мядзведзь». Затым з'явіліся аповесці «Гаворыць Масква» (1950), «Базылёў курган» (1954), «Смелыя людзі» (1960). Тэме далёкага мінулага беларускага народа прысвечана тэтралогія, якая складаецца з аповесцей «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Канец сервітуту» (1968), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1976).

А. Якімовіч — аўтар вершаваных і празаічных казак «Каваль Вернідуб», «Вераб'ёвы госці», «Байка пра казла», «Першае яечка», «Казка пра смелага Вожыка», «Браты Лазоўскія», «Лянота». Шырокую папулярнасць набылі апрацаваныя пісьменнікам народныя казкі, што склалі зборнікі «Каток — залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар», «З рога ўсяго многа» (1959), «Людзей слухай, а свой розум май» (1980), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983).

Нямала зроблена А. Якімовічам і ў галіне перакладу. У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі асобныя творы М. Някрасава, П. Яршова, А. Пушкіна, І. Крылова, І. Тургенева, М. Горкага, У. Маякоўскага, А. Гайдара, К. Чукоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова і іншых пісьменнікаў.

За аповесці «Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту», «Кастусь Каліноўскі» Алесю Якімовічу прысуджана ў 1974 г. Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа.

Памёр пісьменнік 15 студзеня 1979 г.

## КАВАЛЬ ВЕРНІДУБ

### Казка

*(Скарочана)*

### I

Не далёка і не блізка,
Там, дзе сонца ходзіць нізка
Ды гамоняць між сабой
Неба сіняе з зямлёй,—
Адным словам, за марамі,
За лясамі, за гарамі
Жыў ды быў найлюты цар,
Той краіны уладар.
Ў залатой сваёй кароне
Ён сядзеў сабе на троне,
Ад зары і да зары
Люльку срэбную курыў
І другой не ведаў працы.
А навокала палацаў,
Страшны церпячы прыгнёт,
Знемагаў яго народ:
Дні і ночы без спачыну
У няволі гнуў ён спіну,
Пад крывавым бізуном,
На цара
І на паноў.

Так жылі ды пажывалі,—
Гаравалі ды ўміралі...
Прамінаў за годам год.
Але вось —
Настаў няўрод...
Як агнём, шугае сонца,
Жарам дыхае бясконца,
Перасохла ўся зямля,—
Пуста, гола, дзе ні глянь:
Ні збажынкі,
Ані кветкі —
Зачарнеліся палеткі,
З дрэў апалі ўсе лісты,
Агаліліся кусты.

І ад лютай галадухі
Гінуць людзі, нібы мухі.
Напужаўся люты цар,
Выклікае ён баяр.
І такую рэч вядзе ён:
«Што рабіць нам, дабрадзеі...
Ўсіх нявольнікаў ад нас
Забірае смерць не ў час.
Страшна мне, баяры-слугі:
Каб праз гэту галадуху
Не прыйшлося нам самім
Працаваць гарбом сваім?..
Чуць хачу ад вас параду:
Што рабіць, якую раду,
Мае другі і браты,
Прыгадаць нам ад бяды?»
Апусіўшы ў землю твары,
Доўга думалі баяры,
Барадамі трасучы,
Як бядзе дапамагчы
Так, как царскія каморы
Былі поўнымі, як горы,
І сваіх засекаў збожжа
Каб ніхто не патрывожыў...
«Што ж рабіць?» — пытае цар.
І ў адказ адзін з баяр
Бараду ўверх задзірае
Ды спаважна пачынае:
«Ты паслухай мяне, цар,
Найслаўнейшы гасудар,
Знаю спосаб я нядрэнны,
Самы просты, але верны:
Загадай знішчаць дзяцей
Ды карміць тваіх людзей!
І яды будзе даволі...»

«Дзякуй, дзякуй, лепш ніколі
Не прыдумаў з вас ніхто б!»
Стукнуў пальцам цар у лоб.
Пасля гэтакіх парадаў
Ён склікае сваіх катаў.
І для дзетак-малышоў
Час жахлівы надышоў...

## II

А жыла-была ў тым краі,
Нібы ў лузе кветка-краска,
Прыгажуня маладая
Чарнабровая Параска,
Што, як смерці страшнай цень,
Катаў царскіх з дня на дзень
Засмучоная чакала,
Як жа быць ёй? — разважала.
Аддаць катам на пацеху
Сваю радасць і уцеху —
Сына слаўнага свайго
І не бачыць больш яго?..
Ці ж змагло бы сэрца маці
Смерць любімага дзіцяці
Перанесці, пеpажыць?
Што ж парадзіць?
Як жа быць?
<...>
І наважыла Параска
Не здавацца катам царскім,
А, пакуль яшчэ ільга,
Ратавацца як мага.

Пазбіраўшы ўсе манаткі,
Яна ў пушчу без аглядкі
Паляцела, як страла,
З свайго роднага сяла.
Тут гадзіну і другую
Завіхаецца, будуе
Так, на скорую руку,
Хатку з моху, лазняку,
Збудавала,
Паглядзела —
Ўся ад шчасця пасвятлела:
Згінуў сум і згінуў страх,—
Радасць свеціцца ў вачах.
І бяглянка маладая
Ружай-кветкай расцвітае:
Стала пушча ёй мілей
За сяло і за людзей.

Недалёка, ля дупла,
Тут мядзведзіца жыла.
Вось назаўтра, на світанні,
Звер сышоў на паляванне,
Каб дзе ежы раздабыць,
Медзвянятак накарміць.
А Параска-маладзіца
Гэтым часам да крыніцы
Па студзёную ваду

Падалася. На хаду
Песні голасна спявае,
Ўся ад шчасця сонцам ззяе.
Раптам чуе — хтось вурчыць,
Дзікім голасам крычыць.
Азірнулася — што б гэта? —
Бачыць воўка-дармаеда.
Хвост прыціснуўшы да ног,
Разбурае ён бярлог;
Натапыраны, надзьмуты,
Вые люта,
Ходзіць крута
І намерыўся, відаць,
Медзвянятак пазнішчаць.
<...>
Тут Параска з-за лаўжка
Нечакана на ваўка
Калі крыкне,
Калі гукне,
Ды нагамі калі тупне —
Воўк драпежны аж умлеў,
З перапуду скамянеў...
А тым часам поўным ходам
Мчыць мядзведзіца з паходу
Па імхах, па верасах
З зайцам шэрым у зубах.
Як убачыла Параску,
Прывітала яе ласкай
І падзякавала ёй,
Як сяброўцы дарагой,
«Што дзяцей адратавала
Ад ваўка таго, нахала,
Не забуду век цябе,
Памагу ў бядзе й табе,
Калі толькі давядзецца
Ў час такі з табою стрэцца».
«Калі ласка,
Калі ласка!..» —
Адказала ёй Параска
Ды хутчэй да шалаша,
Да хлапчыны-малыша
Па сцяжынцы лесавой
Мчыцца подбегам з вадой.
Доўга песціць, забаўляе
І цалуе й абнімае
Там сынка яна свайго,
Не нацешыцца з яго.

### III

І на славу рос хлапчына,
Не па днях,
А па гадзінах,
Ды такі стаў удалец,
Ды такі стаў маладзец,
Што ні ў казцы расказаць,
Ні пяром не апісаць.
Ўвесь праменіцца, іскрыцца, —
На яго не надзівіцца!
На чале бялявым хлопца
Зіхаціцца само сонца.
Ну, а сіла, сіла тая,
Што ні дзень, то прыбывае.
Цераз месяц, як грыбы,
Выварочваў ён дубы.

І Параска з той часіны
Вернідубам свайго сына
Стала клікаць-называць,
Яшчэ болей шанаваць.
Проста воч не зводзіць маці
З дарагога ёй дзіцяці.

Дружна, ў згодзе з той пары
Зажылі ўсе, як сябры, —
І мядзведзіца старая,
І Параска маладая.
Медзвяняткі з Вернідубам, —
Проста глянуць на іх люба!
З дуплаў, з пасечных калод
Залацісты свежы мёд
Ім мядзведзіца прыносіць,
Да стала ўсіх шчыра просіць.
Суравежкі і суніцы
Зарадзілі ля крыніцы.
Іх Параска падбірала,
Ўсю сямейку частавала.
Аж аблізавалі рот,
Калі елі з грыбам мёд,
Такі свежы і душысты,
Такі чысты,

Залацісты;
Сам у роце раставаў,
Без віна ўсіх ап'яняў.
Не хапала толькі хлеба,
Круп ды солі на патрэбу,
Але ж гэта паўбяды
Для дружацкае яды.

## IV

Гэтак лета пражылося,
А за ім, глядзіш, і восень
Ўсё хутчэй
Ды ўсё хутчэй
Павуцінне сваё тчэ.
Памярцвела ўся прырода,
Гразь і холад,
Непагода...
Дождж ліецца, як з вядра,—
Невясёлая пара...
У заморскія краіны
Гаманлівы рой птушыны
Адляцеў, і лес густы
Стаў маўклівы і пусты.
<...>
А Параску з Вернідубам
Восень мачыхай нялюбай
Сустракае ў шалашы.
Сумна стала на душы.
Пушча хмурая, пустая
Жалем сэрца працінае.
Холад, голад гоніць іх
Прэч адгэтуль, як чужых.

І рашылі ўсёй нарадай,
Што не знойдзеш іншай рады —
Хоць бы што там ні было —
Як вярнуцца у сяло.
Тут Параска-маладзіца
На мядзведзіцу садзіцца,
А сынок медзведзянят
Строем выстраіў у рад,
Ды за маткай наўздагон
Паімчаўся з імі ён.

Вось і вёска.
Што за жахі?
Людзі валяцца ад страху.
Праўда гэта, а ці сны
Сняць у ясны дзень яны:
На мядзведзіцы жанчына?!
Што за дзіва, за прычына?
І ад страху ды бяды
Уцякаюць —
Хто куды...
Ледзь Параска іх спыніла,—
Ледзьве іх угаманіла,
Ды, падзякаваўшы ўсім
Дружбакам сваім лясным,
Адпраўляецца яна
Ў хатку родную адна.
На канцы на самым вёскі,
Побач з белаю бярозкай,
Побач з кузняю старой,
Спарахнелай і гнілой,—
Там стаяла гэта хатка,
А ля хаткі —
Плоцік, градкі.
Трохі ўбок відаць здалёк
І палетак, і лясок.

Тут Параска прала пражу,
А сынок у кузні пляжыў.
І магутны той каваль
Як ніхто каваў.
Калі зробіць далато —
Не паломіш нізашто.
А як выкуе тапор
Ці нарог альбо сахор —
Не нацешацца дзядзькі:
Вось каваль у нас які!
Свет прайдзі —
Няма другога
Каваля такога!
Пагалоска бегла ўдаль:
Цуда-дзіва — не каваль!

Ды аднойчы, на прадвесні,
Чуе ён благія весці:
Пра яго дазнаўся цар,
Той краіны уладар,
І на цэлую сталіцу
Ён ад гневу кіпяціцца

І раве на ўсіх, як звер...
Зажадаў ён хоць цяпер
Учыніці згубу —
Знішчыць Вернідуба.
Бо куды ж той варт закон,
Што не выкананы ён?
Цар збірае сваё войска,
Каб паслаць яго у вёску
Каваля таго знайсці,
У сталіцу прывясці
І ля царскага двара
Як злачынцу пакараць,
А Параску-маладзіцу
Кінуць ў цёмную цямніцу.

Чарней хмар
І цяжэй гор
Стала маці з гэтых пор;
Жальбай горкаю заныла —
Жыць нявесела, няміла,
Слёзы рэчкамі цякуць
На завяўшую шчаку.
І яна загаласіла:
«Родны сынку,
Сынку мілы,
Чуе сэрцайка магілу,
Чуе чорную тугу...
Ой, куды ж я пабягу,
Каму выплачу душу
І пра гора раскажу,
Як не стануць твае вочы
Мне свяціць і ўдзень і ўночы?..»
Вернідуб нахмурыў бровы
Ды адказвае сурова:
«Няма сілы такой,
Каб скарыўся я ёй!
А жыццё ў барацьбе
Я здабуду сабе.
Лепш у чэсным баю
Галаву я сваю,
Ведай, маці, складу,
Чым на ганьбу пайду!»

Так сказаў і паляцеў
Ён, разгневаны, як леў,
Проста ў кузню
У старую,
Спарахнелую, гнілую.
На царову галаву
Стаў каваць ён булаву.

Як маланкі з перунамі,
Несціхана дні за днямі
Гром ваколіцу трасе,
Іскры скачуць па страсе;
І за мілі чутна — глуха
Свішча мех, як завіруха.
Так каваў каваль, пакуль
Не скаваў жалезны куль
Сарака пудоў вагою,
З ручкай гладкаю, прамою.
А зрабіўшы ўсё як трэба,
Ён шпурнуў яго у неба...

Нібы водгулле гарматы,
Загудзела булава так,
Загрымела, быццам гром,
Скаланула ўсё кругом —
Ў небе хмары,
Ў лузе кветкі,
Пушчу цёмную,
Палеткі;
Вышай лесу,
Вышай гор
Прашумела, як віхор.

Вось назад яна нясецца.
Ў каваля заныла сэрца,
Бо рашыў каваль напэўна
Сустракаць яе каленам,
Каб дазнацца, што за гарт
І чаго мацунак варт.

Не пярун з-пад цёмных хмараў
У магутны дуб ударыў,—
То цяжкая, як зямля,
На калена каваля
Булава яго упала.
«Добра зроблена, удала! —
Пахваліў яе каваль.—
Загартованая сталь,
Не пагнулася нідзе.
Паслужы ты мне ў бядзе!»
А як скончыў гэту працу,
Стаў да коней прыглядацца,—
Не ісці ж яму пяшком,
Нібы старцу з хатулём!

Але колькі бачыў коней,
Усе гнуцца пад далоняй,
Пад магутнаю рукой
Выгінаюцца дугой.
Ці то коні слабаваты,
Ці то рукі вінаваты?
І задумаўся хлапчына,
Зажурыўся малайчына.
Як развеяць тут яму
Сваю сумную думу?

Вось аднойчы бачыць гэта:
На кабылцы цёмна-гнедай,
Без паўшораў, без атос,
Перакупшчык цэлы воз
Па сяле ануч правёз.
Пра кабылку скажам проста:
Як той бубен, ад каросты
Паліняў худы жывот;
Тры валоссі—яе хвост.
Як ражон, ўзнялася спіна,
Уваліліся пахвіны.
І без жадных без надзей
Да яе каваль ідзе.
На рабрыны, як драбіны,
На ражоністую спіну
Жартам ён далонь кладзе.
А кабылка—ані з месца.
«Ці то праўда, ці здаецца?
Гэта ж проста дзіва з дзіў!» —
Вернідуб загаманіў.

І асілак ледзь не скача:
«Гэта шчасце мне, няйначай:
Я такой яшчэ не бачыў!
Ды, відаць, тут не памылка...»
Заплаціўшы за кабылку,
На яе каваль садзіцца
І ў дарогу едзе-мчыцца —
За плячыма з булавой
Ды з чароўнаю мятлой
Над бялявай галавой.
⟨...⟩

## VII

Раптам чуе—недзе збоку,
Ад дарогі недалёка,
Голас жаласны звініць.
Адвярнуўся ён — глядзіць:
Хто там? Што за дзіўны гук?
Бачыць — пчолку ссе павук:
Крыжавік, драпежнік люты,
Крывапіўца разадзьмуты,
Быццам шар,
Ад крыві сваіх ахвяр.

«Эх, пузаты ты страшыдла! —
Закрычаў каваль штосілы.—
Проста бі па галаве! —
Загадаў ён булаве.—
Ў пух і прах яго рассей,
Не шкадуючы касцей,
Каб не ўбачыў болей сонца
Гэты злодзей і забойца».

І паслушная загаду,
Загудзела булава тут,
Загрымела, быццам гром,
Скаланула ўсё кругом —
Ў небе хмары,
Ў лузе кветкі,
Пушчу цёмную,
Палеткі
І ад злога павука
Не пакінула й шматка.

«За ратунак, чалавеча,
Буду помніць цябе вечна.
Дзум-дзум-дзум! — Пчала
запела.—
Што ты хочаш — кажы смела:
Паслужыць, браток, табе
Я гатова, як сабе».

«Пчолка, родная сястрыца,
Мне жывая трэ вадзіца.
Там, за лесам, пры мяжы,
Воўк кабылку задушыў.
Без кабылкі ж мне, нябога,
Невясёлая дарога.
Ты ж па свеце, моў, нямала,
Дарагая, палятала,
Многа бачыла краін,

Многа ведаеш навін:
Ці не чула ты, сястрыца,
Дзе жывая ёсць вадзіца?
Калі гэта ў тваёй сіле,—
Памажы мне смерць асіліць».

«Добра! Знаю я такую
Ад смярцей ваду жывую,—
У адказ яму пчала
Зажужжала, загула.—
На мае сядай ты крыллі,
І адсюль за сотні міляў
Паляцім у хмарны круг
На высокую гару.
Там б'е шумная крыніца
Ажыўляючай вадзіцы».

«Згодзен, пчолка, я. Ляці!
Ды глядзі не падвядзі!»
Пчолка крылямі ўзмахнула,
Раптам вырасла з арліцу
І у неба шуганула,
Як маланка-бліскавіца.
Дзень ляціць, і два, і тры,—
Даляцелі да гары,
Да крутой гары высокай,
Што ўзнялася за аблокі.
Там, начэрпаўшы вадзіцы
З ажыўляючай крыніцы,
Пчолка крылямі ўзмахнула
І на землю шуганула.
Дзень ляціць, і два, і тры,—
Апусцілася з гары,
Села-пала без памылкі
Ля задушанай кабылкі.

«Ух, бяды набраўся колькі!» —
Праказаў каваль да пчолкі,
І на той шкілет худы
Узлівае ён вады.
Раптам: праўда то ці сніцца?
Паднялася кабыліца...
Мігам мясам абрасла
І—такая ж, як была:
Ржэ, хвастом цярэбіць мух.
Акрыяў кабыльчын дух!
⟨...⟩

Па расправе ж з лютым панам —
Людаедам тым паганым —
Зноў пускаецца каваль
У нязведаную даль.

Ехаў шмат ён дзён ці мала,
Ды бяда яго спаткала:
Як раптоўны з неба гром,
Войска царскае кругом
Незлічонай грознай сілай
Вернідуба акружыла,
Крумкачамі аблягло,
Шлях-дарогу заняло.
Уся зброя іх стальная,
Ўся адзежа блешаная,
Ўсе вяльможныя паны —
Проста рыцары адны.
А наперадзе сам цар,
Той краіны уладар,
З барадою па калені,
Росту з сажань ён — не меней.
Ўсе ваякі хоць куды,
Нібы родныя браты.
Стаў каваль. Арліным вокам
Аглядае іх навокал:
Як тут справіцца яму
З гэткім войскам аднаму?
«Ай куды ты, ай куды ты? —
Раскрычаўся цар сярдзіты.—
Мы ўсе едзем па цябе —
Галаву знімаць табе!»
І ад злосці барадою
Ён трасе, нібы мятлою,
Ды грыміць на ўсе лады:
«Гэй, падаць яго сюды!»

Тут па царскаму загаду
Ўсе ваякі рад за радам —
Ўсе стральцы
І ўсе баяры
Грозна рушылі, як хмары,
Шаблі ўгору узнялі,
Загукалі, зараўлі
І ляцяць да каваля.
Аж гудом гудзе зямля...

«Будзь што будзе!» — вырашае
Сам сабе каваль.
Булаву з плячэй знімае,
Аглядае даль.

Развітаўся з светам белым,
З буйнай галавой,
І віхром імчыцца смела
На смяртэльны бой.
Як махнуў ён булавою
Раз і два разы —
Галава за галавою,
Быццам гарбузы,
З плеч баярскіх паляцелі
На усе бакі,
Па каменнях затрупцелі,
Проста, як гаршкі.

Вось ізноў, ізноў заносіць
Булаву каваль...
Ды — рука спачынку просіць,
Звісла булава...
Больш не хоча узнімацца,
Стала, як гара,
Адмаўляецца змагацца
З войскамі цара.
⟨...⟩
Ускіпеў каваль ад злосці,
Грозна глянуў на цара.
«Паміраць мне, ягамосцю,
Не прыйшла яшчэ пара!

Яшчэ рана, цар-страшыдла,
Смерць суліць мне ці палон!»
І, сабраўшы рэшту сілы,
За мятлу ўхапіўся ён.

Цар, і войкнуць не паспеўшы,
З ног зваліўся самы першы.
Паслухмяная мятла
Чыста-гладка памяла.
Нібы востраю касою,
Стаў касіць каваль мятлою.
І баяры, як клубкі,
Котам
коцяцца
ў бакі,
Крок за крокам так патроху
Ачышчаючы дарогу,
Дзе кавальская мятла
Прашумела, прагула.
І налева і направа
Косіць наш каваль на славу,
Так да вечара мяла
Паслухмяная мятла,
Незлічоную ўсю сілу
Войска царскага злажыла.
Спяць ваяк на ваяку,
Як снапы на таку.
Ўзмах мятлы каваль спыняе,
Поле бітвы агледае.
Вочы радасцю іскрацца:
Скончыў цяжкую ён працу,
І на царскіх на касцях
Пралажыў да волі шлях.

## XI

А размяўшы косці
Шчырай весялосцю,
Разам з сілачамі —
Вольнымі арламі —
Па гасцінцы бітым,
Па бялюткім свеце
На кабылцы гнедай
Едзе каваль, едзе,
Ўсюды праязджае,
Перашкод не знае,
Нібы вольны вецер,
Нібы птушка тая.

І паны-баяры,
І стральцы-гусары —
Царская ўся сіла —
Дрыжыць, як асіна,
Ад аднаго слова
Пра яго суровы
Гнеў на людаедаў
За бацькоў і дзедаў,
Імі рабаваных,
Гнаных, катаваных.
Па шляху-дарозе
Не было слупоў,
На якіх не вешаў
Панскіх ён галоў;
На шляху-дарозе
Не мінаў нідзе
Гнаных, катаваных,
Скрыўджаных людзей.
Скрыўджаным, нявольным,

Як братам сваім,
Вернідуб гатоў быў
Памагаць усім.
Дзень за днём ён едзе,
Ноч за ноччу едзе,
Сонца яго грэе,
Месяц яму свеціць,
А вадою пояць
Чыстыя крыніцы.
Гэтак даязджае
Да самой сталіцы.
А ля той сталіцы
Мора мітусіцца
Ад галоў народу —
Цэлага паходу.
Спераду манахі
Ў чорных апранахах,
Як жукі, з папамі
Цягнуцца радамі,—
Па цару, баярах
Памінкі спраўляюць,
Тысячы кадзілаў
Хмарамі ўздыхаюць.
А за імі следам
У паходзе гэтым
Нехаця, павольна,
Люд брыдзе нявольны,
Абшарпаны, голы,
Ды такі вясёлы,
Сэрцы шчасцем поўны,
Сэрцы ўсіх гавораць:
«Хто такі ваяка,
Хто такі сіляка,
Што забіў іх гора,—
Цара-людаеда.
Жалю хто не ведаў
Спакон веку-роду
Да свайго народу».
<...>

І каваль ім па парадку
Расказаў усё спачатку —
Хто ён сам,
Адкуль ён едзе,
Як пазбавіўся ад смерці,
Як спаткаў цара й баяр,
Як загінуў люты цар,—
Словам, як яго мятла
Войска царскае змяла
Са шляху, бы смецце тое
Непатрэбнае, благое.
«А цяпер ўсяму народу
Абвяшчаю я свабоду!
Будзем самі,
Будзем самі
Над сабой
Гаспадарамі!»

Пасля гэтакай навіны
Усе людзі той краіны
Пазляталіся, як птушкі,
Вернідуба сталі гушкаць,
За геройскі яго ўчынак
Велічаюць малайчынам.
Гонар, слава кавалю
На ўсё вольную зямлю!
І, паклікаўшы музыкаў,
Баль наладзілі вялікі.
Пілі, елі, што хацелі,
І скакалі, як умелі.
Вернідуба частавалі,
Весяліліся, спявалі.
Як ніколі, ўсе уволю,
Аж грымелі лес і поле,
Ды палацаў камяніцы
Калаціліся ў сталіцы.
Аднагодна сюды з ласкай
Запрасілі і Параску,
Мышку шуструю,
Кабылку,
Пчолку слаўную, двухкрылку,
І мядзведзіцу з бярлогу,—
Весяліцца хай памогуць!

Ну, вядома, быў і я там,
«Казака» скакаў заўзята,
Мёд, віно і піва піў,
Толькі вусы памачыў.

### ВЕРАБ'ЁВЫ ГОСЦІ

Збудаваў верабей
На сметніку хатку.
Палажыў у дзвярах
Дубовую кладку.

Учыніў верабей
Каля хаткі жніва,
Навары́ў бочак пяць
Пшанічнага піва.

Ўсё, што трэба, зрабіў
Дома і за домам
Ды лісты разаслаў
Родным і знаёмым:

— Нізка б'ю вам чалом,
Мае ягамосці,
Прыязджайце хутчэй
Да мяне у госці!

Апрануўся як след
Ды стаў ля парога.
Бачыць: едзе гасцей
Многа, многа, многа!..

Едзе сам журавель
З жонкай жураўліхай,
Едзе бусел-клекатун
З жонкаю буслііхай.
Едзе і чачотка —
Вераб'ёва цётка,
Едзе і сініца —
Родная сястрыца.

Гуска з гусянятамі,
Качка з качанятамі,
І сарокі, і дзятлы,
І вароны, і шчыглы...

Прыляцеў і удод
Ды усеўся на плот.
Рады шэры верабей —
Шмат наехала гасцей!

Сабраліся госці.
Чым жа частаваць?
Узяліся разам
Абед гатаваць.

Журавель з чачоткай
Грэчку малацілі,
Курапатка з гускай
Да млына насілі.

Бусел жорны круціць,
Качка засыпае,
А сінічка-невялічка
Муку абірае.

Намалолі мукі
На бліны, праснакі.
Напяклі пірагоў
Цэлых сем карабоў.

Ды зладзілі камара
Каля падваротні,
Нарабілі каўбас
Пэўна аж паўсотні.

Сталі есці, сталі піць,
Вераб'я таго хваліць.

Елі мяса, каўбасу,
Елі верашчаку.
Як пад'елі, вераб'ю
Ўсе сказалі: «Дзякуй!»

Тут музыкі, як адзін,
Весела зайгралі,
Госці ўпрысядкі пайшлі,
Песні заспявалі.

Вось сарока-белабока
Скача, глянуць люба.
А удод навокал ходзіць,
Патрасае чубам:

— Я стракаты удод,
Я — чубаты Фядот.
Дзюба ў мяне — спіца,
Мяне сам майскі жук
Як агню баіцца!

Дзяцел голас падаў:
— Знайшоў чым хваліцца!
Ты б жука з-пад кары
Выдзеўб гэтай спіцай!

— Глупства! — бусел сказаў.—
Глупства, ды і толькі:
Паспрабуйце сыграць
Дзюбаю вы польку!

І пайшоў танцаваць,
Сам сабе падпяваць:
— Скача жаба па балоце,
Скача па чароце.
Ты скачы ці не скачы —
Ад мяне не уцячы!

Усміхнуўся журавель:
— А я што — калека?
Паглядзіце на мяне,
Які я умека!

— Ух-ух! Ух-ха-ха! —
Распусціў ён крыллі,
Жураўліху падхапіў
Ды ўрэзаў кадрылю.

Тупнуў сам верабей,
Узяўшыся ў бокі.
А за ім і дзятлы
Пусціліся ў скокі.

За дзятламі — шчыглы,
Гуска, курапатка...
Дружна скачуць, пяюць,
Аж трасецца хатка:
— Дылі-дылі, гуль-гуль!
— Дылі-дылі, буль-буль!

Так ішла тут гульня
Аж да белага дня.
Ўсе стаміліся,
Замарыліся.

Наступіў журавель
На нагу сініцы.
А сініца — у крык:
— Ёлупень, дурніца!

І давай жураўля
Біць па чым папала.
Жураўліха мужыка
Ледзьве ўратавала.

— Б'юць сястру!
Б'юць сястру! —
Закрычала сойка.
І вароны, і дзятлы
Кінуліся ў бойку.

Хто напаў на каго —
Цяжка разабрацца.
Толькі пер'е ды пух
Сцелюцца па хатцы.

Бусел дзюбай даўгой
Б'е ўсіх па парадку.
На бяду вераб'ю
Развалілі хатку...

І цяпер верабей
З гэтае прычыны
На задворках жыве
Без сваёй хаціны.

Я ў гасцях таксама быў,
Вераб'ёва піва піў.
Хоць па вусах і цякло,
А у роце не было.

**ПЕРШАЕ ЯЕЧКА**

Хадзіў дзед на паляванне. Паляваў ад ранку да змяркання. Зморыцца, аж слова не прамовіць, а звярыны не зловіць. Ідзе дахаты, ледзьве не плача.

Вось дык няўдача!

Баба дзеда лае, што дарма гуляе, топча лапці, рве аборы.

Ну і гора!

Слухаць дзеду горка бабіну гаворку.

— Ты, баба, мяне не лай. Злаўлю табе звера: чакай!

Цэлы дзень дзед хадзіў, курку рабку злавіў.

Рада баба, скача, а курка кудахча: «Куд-куды, куд-куды! Дайце грэчкі і вады!»

Баба курку накарміла, вадою напаіла. Села курка на вечка ды знесла яечка.

Бегла мышка пад скрынку, цягнула скарынку, хвастом вільнула, яечка скранула.

Яечка скацілася, трах! — і разбілася...

Убачыла баба, загаласіла ды з жалю ўсе гаршкі пабіла. Паламала і вечка, што не даглядзела яечка. Сама сярод хаты села і — абамлела...

Тут дзед стрэльбу схапіў, порахам набіў. Кінуўся да мышкі, а мышка — на вышкі.

Дзед за ёю:

— Лжэш! Ад мяне не ўцячэш!

За парог зачапіўся, плясь! — і паваліўся.

Набіў дзед гузак з добры кулак. Ляжыць, уздыхае, мышку лае.

Ішлі бабы па ваду, пабачылі тую бяду, пачалі рукамі махаць, людзей на дапамогу склікаць.

Прыбеглі старыя, за старымі — малыя. Дзеда паднялі, бабу вадой адлілі. Крычаць, бядуюць, яечка шкадуюць. Ну, вядома, і дзеда з бабай шкада.

Вось дык бяда!

А пакуль там крычалі ды бедавалі, курка села ў падпечку ды знесла другое яечка. Круглае, белае, моцнае, спелае. Яшчэ лепшае за першае!

Рада баба, рад і дзед: будзе яечня на абед!

Баба патэльню ўзяла, яечню спякла. Паклікала гасцей — старых і дзяцей.

Усе елі, колькі хацелі. З-за стала ўсталі, песні заспявалі. Узяліся ў бокі, пусціліся ў скокі.

Скакалі, скакалі ды годзе сказалі.

Вось вам і казка. Чытайце, калі ласка!

## АПОРКІ

*(З мінулага Заходняй Беларусі)*

Лаўрэн з сям'ёй жыў наводшыбе, у канцы вёскі. Ніхто яго не лічыў за гаспадара, а яго хату — за гаспадарку. «Куткавы» Лаўрэн, «бабыль»,— такім ведалі і так звалі яго ў ваколіцы. Нават прозвішча сапраўднага яго ніхто бадай не ведаў. Ды, папраўдзе, і не патрэбна яно было нікому. Зямлі ў Лаўрэна не было, жывёла не вадзілася, на сходы грамадскія ён не запрашаўся,— і ніхто ім вельмі не цікавіўся.

А жыў Лаўрэн з мазаля: хадзіў па багатых шляхецкіх хутарах, рабіў што траплялася, і зарабляў што ўдавалася. Зімою мёрз, улетку пёкся. Так і жыў.

Адзінаю ўцехаю ў жыцці куткавога Лаўрэна быў сынок Міхаська. Двое меншых дзяцей ён пахаваў,— не ўзняліся яны на ногі ў голадзе ды холадзе. А Міхаська сяк-так выкідаўся, акрыяў.

Усё жыццё змагаючыся за кавалак хлеба, Лаўрэн марыў цяпер

аб лепшай долі для сына. Хаця б не давялося ісці яму бацькавым следам... І як толькі споўнілася Міхаську восем гадоў, бацька паслаў яго ў школу. Сам Лаўрэн граматы не ведаў, і праз гэта, думаў ён, такая яго горкая доля. Міхаська ж павінен ведаць грамату, і тады мо святлейшая дарога адкрыецца яму ў жыцці.

Цешыўся гэткаю прывабнаю думкаю куткавы Лаўрэн і марыў употай дачакацца лепшых дзён хоць на старасць, калі сын стане яму апорай. А калі Міхаська пачаў бегаць у школу ды пакрысе чытаць буквар, бацька павесялеў яшчэ больш. Доўгімі асеннімі вечарамі любіў сядзець ён з сынам за газнічкаю, слухаючы яго расказы аб школе або чытанне з буквара. Школа, праўда, была польская і буквар польскі, і цяжка было Міхаську разабрацца ў такой грамаце: не так гаварылі ў іх сям'і і на вёсцы, і таму большай палавіны з прачытанага ён не разумеў. Праз гэтае ж з першых дзён пазнаўся ён з пякучаю лапаю і з калючаю жарствою... Ды цярпеў пакорліва Міхаська, нават бацьку не скардзіўся, баючыся, каб не забралі яго са школы. Ён толькі часцей і часцей звяртаўся да бацькі за дапамогай: бродзячы ўсё жыццё па шляхецкіх засценках і хутарах, бацька збольшага прывык да тых слоў чужое мовы, якія для Міхаські былі пустымі гукамі. Непісьменны Лаўрэн такім чынам стаў першым настаўнікам сына. Гэта таксама скрашвала яго нуднае беспрасветнае жыццё.

Так ішлі дні за днямі.

* * *

Міхаська прачнуўся ад непрыемнага холаду. На дварэ яшчэ толькі развіднівалася. Туманна-змрочнае святло перадкаляднай пары ледзь прабівалася ў хату. У хаце было, як у лядоўні. Сям'я спала на палацях на саламянай падсцілцы. Міхаська спаў між бацькамі, і яму было цяплей. Але, калі бацькі паўставалі, ён адзін не мог сагрэцца, хутка азяб і прачнуўся.

Ён хацеў павярнуцца на другі бок і глыбей зашыцца ў салому, як пачуў гаворку бацькоў:

— Няхай мо пабудзе сёння дома? — гаварыла маці.

— А заўтра? — відаць, не згаджаўся бацька.

— Заўтра відней будзе...

Голас у маткі ціхі і плаксівы. Яна заўсёды так гаворыць. Міхаська не памятае, калі маці была весялейшай. Яна або думае аб нечым, або пацíху плача. Яна скардзіцца на гора. Міхаська, вядома, разумее, што такое гора. Ён не маленькі. Гора — гэта тое, што ў хаце няма палена дроў, а на стале скарынкі хлеба. Гора — гэта тое, што і сама хатка спарахнела і ледзь ліпіць. Мароз раскашуецца ў такой хатцы, як гаспадар. Такое гора кожны зразумее. Міхаську хочацца зрабіць нешта такое, каб не было ў іх гора. Ён часта аб гэтым марыць. І ў марах заўсёды лёгка перамагае гэтае праклятае гора.

Зараз Міхаську няцяжка было здагадацца, што размова ідзе аб ім. «Чаму б гэта пабыць дома!» — падумаў ён. Але тут жа ўспомніў: учора ён вярнуўся са школы амаль босы — ад лапцей засталіся адны аборы і некалькі вушак. Анучы таксама ўшчэнт распаўзліся.

Міхаська прыўзняў галаву. Бацька стаіць, як здань, каля нізкага акенца. Высокі, худы, з упалымі грудзямі, праз меру згорблены. На ім падраны суконны халат і апоркі. Доўгія валасы ўскудлачаны, абсыпаны саламянаю пацярухаю. Ён нейкі час маўчыць, насупіўшыся, потым адварочваецца на хату.

— Параіла,— злосна сплюнуў ён у качарэжнік.

— Дык мо і зусім няхай сядзіць дома? — зноў загаварыла маці.

Бацька нічога не адказаў.

Але тут Міхась не вытрымаў. Ён і чуць не хоча, каб пакінуць школу. Гэтага не можа быць.

Нарэшце выхад быў знойдзены. Канечне, Міхаська павінен вучыцца. Аб гэтым даўно перадумана і перагаворана ў сям'і. А сёння ён пойдзе ў школу ў бацькавых апорках! Такую раду прыдумаў бацька. Міхаську завядзе ў школу маці — балазе ў яе ліпяць яшчэ лапці,— апоркі на дзень яна забярэ назад, каб бацька мог пайсці ў іх на работу. А ўвечары, калі вернецца бацька, маці сходзіць па Міхаську. У школе ён перабудзе босы. Там цёпла, не так, як дома. Хоць босы, абы вучыцца.

Пасля такой рады ў хаце пасвятлела: і ад таго, што стала відней на дварэ, і ад таго, што Міхаська ўсё ж пойдзе ў школу.

Апоркі, аб якіх ішла размова, былі бязлітасна разбітыя і зношаныя. Але бацька шанаваў іх і клапаціўся аб іх не менш, чым аб хлебе. Гэта было ўсё з абутку, у чым ён мог выйсці з хаты, каб пашукаць якой выпадковай работы.

* * *

Школа была на хутары, у доме заможнага шляхціца. У яго былі два новыя прасторныя дамы, і адзін з іх ён ахвотна аддаваў у арэнду пад школу, бо, апрача арэнднай платы, меў і шмат выгад: зімою вучні рэзалі яму дровы, сечку, насілі ваду, вясной ураблялі агароды...

Маці прывяла Міхаську ў школу, зняла з яго ног апоркі.

— Хаця каб не прастудзіўся ты, сынок? — сказала яна трывожным голасам.

— Не прастуджуся, мама,— абнадзеіў яе Міхаська.— Толькі не пазніся глядзі. Як пачне змяркацца, дык і прыходзь.

Міхаська быў весялейшым, чым звычайна. Ён больш за бацькоў радаваўся знойдзенаму выхаду. Вучыўся ён з ахвотаю і стараўся як мог. Ды і весялей усё ж у цёплай школе. Тут нават голад не так адчуваеш, як дома.

Вучні, якія былі ўжо ў школе, здзіўлена паглядалі то на Міхаську, то на яго маці. Але вось маці выйшла, і ў тую ж хвіліну раздаўся піскліві рогат другакласніка Юзэфа.

— Басяк! Басяк! Хлопцы, пашчыкатаць пяткі. Гэй!

Юзэф, як каршун, накінуўся на Міхаську, за ім і ўся яго хеўра. Школа напоўнілася шумам і крыкам.

Юзэф у школе быў галоўным заправілам. Ён меў нямала сваіх прыхільнікаў, сяброўства якіх падтрымлівалася больш страхам перад ім, чым шчырай да яго прыязню. Юзэф першая асоба пасля

настаўніка: ён — сын мясцовага хутаранца, апрача таго — загадвае жарствой... Словам, ад яго шмат чаго залежыць у школьным жыцці.

Міхаська страшэнна не цярпеў шчыкоткі. Спачатку ён спрабаваў адбрыквацца, потым крычаць нема, пасля, сціснуты з усіх бакоў, мог толькі пішчаць нешта невыразнае. Нарэшце, ён стаў адчуваць, як некуды правальваецца, галава закружылася, і ён страціў прытомнасць.

Калі, нацешыўшыся, Юзэф выпусціў Міхаську, ён не падняўся з падлогі. Бледна-сіні, з выразам пакуты, твар яго быў падобны на твар мерцвяка. Губы сутаргава сціснуліся. Худое, шчуплае цельца было нерухомым.

Юзэф спалохана заміргаў вачыма. Яго прыяцелі адскочылі далей, нібы іх тут і не было.

— Вады! — крыкнуў хтосьці з гурту дзяцей.— Зашчыкаталі.

Дзеці, якія спачувалі Міхаську, тут жа сілай разнялі яму рот і ўлілі вады. Міхаська апрытомнеў. Усё яшчэ лежачы на падлозе, ён здзіўлена глядзеў на акружыўшых яго дзяцей, нібы штосьці сілячыся ўспомніць. Але ў клас увайшоў настаўнік, і ўсе кулём кінуліся да сваіх парт.

— Добры дзень, пан настаўнік! — хорам зазвінелі з усіх куткоў галасы.

Настаўнік строгай хадою важна шагае да стала. Гладка выгаленая лысая галава яго блішчыць, як вычышчаны медны самавар. Вусы старанна закручаны. Пад пахай у яго тоўсты класны журнал.

Міхаська ўсхапіўся з-пад ног настаўніка. Настаўнік, які дагэтуль не заўважаў Міхаську, раптам спыніўся. Яго мышастыя вочы, глыбока запалыя пад светлымі бровамі, злосна заміргалі, вусы заторгаліся, рот павольна пачаў разяўляцца:

— Гэта што яшчэ?

Перапалоханы Міхаська подбегам падаўся да сваёй парты. Але настаўнік спыніў яго:

— Што за фокусы?

Міхаська маўчыць. Ён зусім не ведае, што адказаць. Сагнуўшыся, ён пільна ўглядаецца ў падлогу, нібы шукае там згублены адказ.

— Будзеш адказваць? — павышае голас настаўнік.

— Не... не... ведаю...

Міхаська хацеў быў сказаць, што яго сілай павалілі і шчыкаталі. А можа, гэта яму толькі здаецца? Штосьці ўсё, як у тумане. Толькі галава вельмі трашчыць ад болю і нешта нібы малаткамі стукае ў скронях...

Настаўнік не адстае. Ён бярэ лінейку і калючым поглядам абводзіць сваю ахвяру з ног да галавы, быццам хоча праверыць, колькі лап можа вытрымаць гэты свавольнік, які проста падымае яго на смех перад усёй школай — адмаўляецца адказваць на яго пытанні.

Але тут ён убачыў такое, ад чаго рука з лінейкай-лапай у яго адразу апусцілася.

— Хто дазволіў разувацца? Распуста! Зараз жа абуйся і — на каленкі. Юзэф, жарствы, самай адборнай! — загадаў настаўнік. Ён па-

лічыў, што Міхаська проста так сабе разуўся з дураслівасці, каб зручней было бегаць па класе.

— Пан настаўнік! — захіхікаў з дзвярэй Юзэф.— У яго няма чаго абуць...

Пры гэтым ён выскаліўся на клас і, здаволены сваёй заўвагай, падскокваючы, пабег у кладоўку па жарству.

Вучэбны дзень пачаўся.

* * *

Ужо даўно разышліся вучні. Школа апусцела. Ад незвычайнай цішыні ў класе непрытульна і сумна. Міхаська адзін сядзіць ля акна і нецярпліва ўглядаецца ў даль, на дарогу. На двары змяркаецца, падымаецца завіруха. Вецер узнімае лёгкі снег з гурбаў і рассявае яго вакол. Ён стукае ў аканіцы, вые за вугламі. Аднаму ў класе робіцца вусцішна. Дзе ж маці? Чаму не нясе яна апоркаў?

Галава баліць нясцерпна і ад перажытага за дзень і яшчэ больш ад голаду.

Яму становіцца ўсё няміла — і гэтая пустая непрыветная школа, і сярдзіты настаўнік, і ганарысты задзіра Юзэф. Ніхто не зразумее яго. Нікому ён не патрэбен. Адна толькі маці зразумее, і ён усё, усё раскажа ёй. Але дзе ж яна? Чаму так позніцца? Мусіць, бацька не вярнуўся яшчэ дахаты...

Міхаськавы думкі перапыніў скрып дзвярэй.

— Чаго сядзіш? З-за цябе аднаго школа будзе адчынена?

Гэта быў Юзэф, той зненавідны Юзэф, які зашчыкатаў яго сёння да страты прытомнасці. Ён прыйшоў зачыняць школу. Крыўда і пакуты перапоўнілі Міхаськаву цярплівасць. Ён безнадзейна глянуў яшчэ раз у акно. Недалёка, кіламетраў за два, бялеліся аснежаныя стрэхі іхняй вёскі...

— Зачыняй! — горда сказаў Міхаська, выходзячы за дзверы.

Першыя некалькі шагоў ён не адчуваў асаблівага холаду. Проста было непрыемна, і толькі. Потым у падэшвы ног пачало калоць, і ён адчуў, як дубянеюць пальцы. Міхаська прыпусціўся тады на ўсю сілу. Варочацца назад было позна. Школа закрыта, а ісці да Юзэфа, прасіцца — не! Гэтага ён, Міхаська, не зробіць.

Бегчы становіцца цяжэй і цяжэй. Міхаська расшпіліў халацік. Але і гэта не дапамагае. Ногі як нежывыя. Усё ў сярэдзіне млее. Грудзі разрываюцца.

Вось ужо і ўзгорак такі знаёмы. За ім — палавіна дарогі. Эх, сілы б яшчэ крыху. Ён сам яшчэ не заўважае, што сіла даўно ўся страчана, і ён ужо не бяжыць, а толькі ідзе подбегам і цяжка адсопваецца.

Вецер, які дзьмуў у бок, павярнуў у твар. Ён падхоплівае на полі снег і сярдзіта абсыпае ім бегляка, злуецца, трымае яго, перагароджвае дарогу. Ногі Міхаськавы правальваюцца ў завеяныя каляіны. Ён спатыкаецца і падае. Некалькі разоў ён яшчэ ўсхопліваўся, а потым адолела раптоўная слабасць. У снезе ж было так лёгка і прыемна, і ног зусім нават не чуваць. Толькі невыразныя туманныя малюнкі-вобразы мільгаюць у вачах, перад вачыма...

Моцны вецер ірвануў з поля і абсыпаў яго халодным снегам. Але — няхай сабе. Яму ж так добра. Яшчэ хоць чутачку адпачыць бы. Вочы самі зліпаюцца, іх немагчыма разняць.

Ды навошта! Куды спяшацца! У школу? Не, ён болей туды не пойдзе...

## ЧАРНАВОЧКА

З настаўнікаў свайго класа дзеці найбольш любілі Івана Рыгоравіча. Мусіць, таму і далі яму другое простае і ласкавае імя — дзядзя Ваня. Іван Рыгоравіч быў класным кіраўніком, а дзядзя Ваня — лепшым сябрам. Іван Рыгоравіч выкладаў родную мову, а дзядзя Ваня часта, як роўны з роўнымі, любіў «зрэзацца» з заўзятымі класнымі шахматыстамі, наладжваў гульні, вадзіў на экскурсіі і, апрача ўсяго, цікава апавядаў розныя гісторыі. Але найбольш любілі дзеці слухаць яго апавяданні з партызанскага жыцця.

Аднойчы на ўроку англійскай мовы Коля, якога за круглыя пяцёркі па арыфметыцы сябры называлі «матэматыкам», узняў бунт супраць замежных моў. «Навошта,—кажа,—дарэмна толькі галаву ламаць. Хопіць мне і сваёй мовы. Я не збіраюся стаць настаўнікам замежных моў...»

Праўда, Коля меў падставы так абурацца: у той дзень ён схапіў двойку ў выкладчыцы англійскай мовы Ларысы Аляксееўны, да таго ж не першую ў годзе...

Даведаўшыся пра Колеў бунт, Іван Рыгоравіч затрымаў клас пасля ўрокаў.

— А кім ты сам хочаш быць? — запытаўся ён у Колі.

Гэтае пытанне не было для Колі нечаканым. Ён даўно ўжо марыць стаць настаўнікам і абавязкова такім, як Іван Рыгоравіч, гэта значыць, ён будзе выкладаць родную мову і расказваць дзецям цікавыя гісторыі. Ён так шчыра і адказаў на пытанне настаўніка.

Іван Рыгоравіч усміхнуўся, задаволены адказам, потым зноў запытаўся:

— Дык навошта будучаму настаўніку роднай мовы вучыць арыфметыку?

Коля запнуўся. Аб гэтым ён ніколі не думаў. Таму, замест адказу, ён толькі падняў вышэй плечы і ніжэй апусціў галаву. Дзеці зашумелі, а Іван Рыгоравіч сказаў з ноткай строгасці ў голасе:

— Усе гэтыя пытанні даўно вырашаны. Ты, Коля, не праў. Папрасі выбачэння ў Ларысы Аляксееўны і больш так не рабі. Усё, што мы вучым у школе, патрэбна і настаўніку будучаму, і інжынеру, і афіцэру. А што гэта так, раскажу пра адзін выпадак. Сядай.

Коля сеў, надзьмуўшыся. У класе настала цішыня. Дзесяткі вачэй глядзелі на настаўніка, з цікаўнасцю чакаючы яго новага апавядання.

— Была ў нас сувязная Валя,— пачаў Іван Рыгоравіч.— Да вайны скончыла чацвёрты клас. Праўда, вучылася не ў маёй школе. І мне, прызнацца, шкада, што не ў маёй, бо я і цяпер зайздрошчу тым настаўнікам, якія вучылі яе... Была яна невысокая, танклявая,

з чорнымі, як смоль, косамі і такімі ж чорнымі вачыма. І заўсёды прыходзіла да нас з кошыкам у руках. Немцы, вядома, і не здагадваліся, што не па ягады ці грыбы хадзіла ў лес гэтая маленькая дзяўчынка, а што на дне яе кошыка, у патайных сховах, ляжала шыфраваная запіска або нават рэвальвер ці тол... Усё гэта перасылала нам праз Валю гарадская падпольная арганізацыя. Валя маскіравала кошык зверху markрознымі шпількамі, іголкамі і іншай драбязой. «На хлеб мяняць іду ў вёску»,— выстаўляла напаказ яна сваю «краму», калі хто з цікаўных пытаўся, куды ідзе. А памяць мела такую, што мы толькі дзіву даваліся: усё да макулінкі раскажа, дзе і што бачыла. І шчабятуха была, што і сарока не дакажа.

У атрадзе ўсе яе ведалі і любілі. «Чарнавочка» — так празвалі мы Валю, і гэтае імя ёй падыходзіла нават больш, чым уласнае. Жыла яна дома з маткай, а бацька быў у нас у атрадзе.

Іван Рыгоравіч зрабіў перапынак, паглядзеў на гадзіннік.

— Не буду доўга затрымліваць вас, раскажу аб галоўным,— працягваў ён апавяданне.— Аднойчы прыйшла ў атрад сумная вестка: Чарнавочка трапіла ў гестапа...

Як потым высветлілася, здарылася гэта зусім нечакана. Раніцай яна збіралася ў атрад з чарговым кошыкам падарункаў для нас. І калі кошык быў ужо спакаваны і ўсё зроблена, як належала быць, у дзверы раптам пастукалі. Чарнавочка падумала, што гэта маці вярнулася з рынку. Але з асцярожнасці аклікнула: «Хто?» У адказ пачула нямецкі вокліч...

Ці то былі шпікі, накіраваныя здраднікамі, ці выпадковы абход — невядома. Чарнавочка, аднак, не вельмі напужалася. Яна заўсёды любіла гадаць аб розных планах на выпадак небяспекі, і таму пачала адразу рабіць так, як і належала рабіць па яе плану. Яна адчыніла акно і ўхапілася за вадасцёкавую трубу. Па гэтай трубе можна было спусціцца проста ў сад. Але ці то ад спешкі, ці то кошык перашкодзіў,— яна не ўтрымалася на гладкай трубе і ўпала з вышыні другога паверха... А калі ўстала, дык адчула пякучы боль у ступні правай нагі. З гарачкі яна яшчэ прабегла некалькі крокаў. Потым пачала паўзці праз сад да суседніх будынкаў. А тым часам немцы паспелі зламаць дзверы і заўважылі яе праз адчыненае акно...

Даведаўшыся аб бядзе, у якую трапіла Чарнавочка, мы ўсе дужа засмуткавалі. Цяжка было на сэрцы і ў камандзіра, і ў байцоў. Лішне і казаць, як перажываў такое гора родны бацька. Ён неяк раптам пастарэў, асунуўся. А праз нейкі час прыйшла ў атрад і маці. Ёй цяпер заставацца дома нельга было. І, гледзячы на пакуты бацькоў, мы яшчэ больш балюча адчувалі ўдар, які нанесла нам гестапа.

«Што рабіць?» — было ў кожнага ў думках. Мы будавалі розныя планы, як выратаваць нашу любіміцу, і ўсе яны здаваліся нам ненадзейнымі. Заставалася толькі зрабіць налёт на гарнізон ворага. Але сілы ў нас былі няроўныя, і пры няўдачы мы рызыкавалі шмат чым.

І колькі ні меркавалі, мы зноў і зноў варочаліся да першага пытання: што рабіць? Кожнаму з нас здавалася, што гэта яго родная дачка ў такой страшнай бядзе.

Нарэшце, я падышоў да камандзіра.

— Дазволь,— кажу,— паспрабаваць шчасця...

Камандзір недаверліва глянуў мне ў вочы. А калі я расказаў яму, што прыдумаў, згадзіўся.

— Добра,— кажа.— Хоць і адчайны, і небяспечны твой план, ды мы — салдаты. Без рызыкі на вайне не бывае. А калі табе будзе цяжка, памятай — гэта ты робіш дзеля Чарнавочкі, нашай партызанскай дачкі!

* * *

Праз некалькі дзён, у форме нямецкага палкоўніка, я апынуўся ў канцылярыі каменданта гестапа. Камендант быў у чыне капітана і дрыжаў перада мною, як трусік. Ён нават не адважыўся праверыць мае дакументы, хоць яны былі ў поўнай спраўнасці. Наконт гэтага ў нас у атрадзе недахопаў не было. Як і належала быць, са мной знаходзіўся мой ад'ютант — лепшы ў атрадзе стралок — Саша, які таксама сёе-тое кумекаў у нямецкай мове. І прыкацілі мы ў гарадок на самай лепшай трафейнай машыне.

Камендант аддаў мне рапарт, а я ў сваю чаргу задаў яму некалькі звычайных пытанняў: які настрой у салдат, ці няма дэзерціраў і гэтак далей. Нарэшце, я запытаўся аб арыштаваных — ці ёсць сярод іх асабліва небяспечныя для германскай арміі. Гестапавец паслужліва паказаў мне спіс арыштаваных і пачаў даваць свае тлумачэнні.

У спісе значылася і прозвішча Чарнавочкі. Дрыжыкі прабеглі па маім твары, калі я вычытаў гэтае прозвішча. Я задушыў у сабе хваляванне і, паказваючы на год нараджэння, запытаў сур'ёзна:

— А гэта блазнота па якой справе?

Гестапавец ветліва растлумачыў. Пры гэтым ён са злосцю дадаў, што ад арыштаванай за ўвесь час не вырвалі ніводнага слова. Слухаючы, я ўнутрана хваляваўся, а знешне стараўся рабіць выгляд, што абураны нахабствам малой злачынцы, і нават выказаў жаданне самому асабіста застрэліць гэтую... гэтую мілую Чарнавочку!

Камендант ахвотна дазволіў мне выканаць жаданне.

Прывялі дзяўчынку. Як яна змянілася! Збітая, скалечаная, уся ў сіняках, твар апух... Я ледзь стрымаў слёзы, убачыўшы яе. Беднае дзіця! А яна нават і не зірнула ў мой бок. Чорныя вачаняты былі апушчаны ўніз, і я не мог бачыць, што цяпер з імі сталася.

Я ўсхапіўся з крэсла, выняў з кабуры рэвальвер. Калі б гестапавец убачыў, як задрыжала мая рука, ён мог бы здагадацца, што нешта няладнае творыцца з панам палкоўнікам. Але ён у гэты час глядзеў на Чарнавочку, як каршун, чакаючы свежай крыві.

Чарнавочка раптам падняла свае вачаняты ды з такой агідай зірнула на мяне, што я ледзь не самлеў. Канешне, яна не пазнавала мяне, ды каб і пазнала, не паверыла б вачам сваім, бо ў такім выглядзе і ў такім месцы сустрэцца са мной, вядома, не спадзявалася.

Я раптам апусціў рэвальвер.

— Ведаеце што,— кажу гестапаўцу.— Мне прыйшла ў галаву забаўная думка: навошта пляміць падлогу? Я ж магу зрабіць гэта на лоне прыроды, з дальняга прыцэлу. Тады атрымаю поўнае задавальненне.

— Гэта можна, пан палкоўнік,— адказаў гестапавец.— Толькі дазвольце ўзяць узвод аховы.

— Навошта?

— Небяспечна без аховы за горадам...

Бачу, справа дрэнь. Згадзіцца на ахову, гэта значыць рызыкаваць і Чарнавочкай, і сваім жыццём. Праўда, мой прыезд ужо быў рызыкай. Аднак пакуль што я сяк-так спраўляўся з сваёй роляй. І тут я парашыў: лепш рызыкаваць у кабінеце каменданта, дзе, апрача нас, нікога няма, чым пры ўзводзе салдат.

Я глянуў на свайго ад'ютанта Сашу. Гэта быў умоўны сігнал.

— Добра,— адказаў я каменданту.— Возьмем ахову.

Гестапавец павесялеў.

— Калі загадаеце адправіцца?

— Праз пяць хвілін.

Ён казырнуў і адвярнуўся да тэлефоннай трубкі.

У гэты ж час камендант і асунуўся, як мяшок. Сашаў кінжал промаху не даў: трапіў якраз у такое месца, што абышлося без крыку...

— Пайшлі, Чарнавочка! — сказаў я сваім звычайным голасам.

Якое было яе здзіўленне ў той міг, я не заўважыў, бо мы тут жа пакінулі кабінет.

Патруль, што стаяў на двары, узяў на каравул, прапускаючы важнага госця.

Машына наша была напагатове. Мы селі ў яе, і шафёр уключыў поўную скорасць.

На гэтым Іван Рыгоравіч спыніў апавяданне. Абвёў вачыма клас: слухачы сядзелі не зварухнуўшыся.

Але тут раптам усе дружна загаманілі:

— Расказвайце, расказвайце далей, Іван Рыгоравіч!

Настаўнік махнуў рукою, сцішыў шум.

— Далей было тое, аб чым вы ўжо здагадваецеся. Толькі можа крыху не зусім так, як вам здаецца. За горадам мы зноў трапілі ў небяспеку: патруль даў сігнал спыніць машыну... «Можа, паспелі аддаць загады на каравульныя пасты аб нашым арышце?» — мільганула ў мяне думка. Звычайнай праверкі я не баяўся — з маімі дакументамі можна было ездзіць, дзе хочаш. «Поўны ход!» — загадаў я шафёру. Не лёгка было мне аддаць такі загад. Гэта значыла, што мы трапляем з агню ды ў полымя: у такім разе патруль мае права страляць. Ваяваць з ім не хацелася: наробіш лішняга шуму, а перад намі яшчэ вялікая дарога.

І калі мы праскочылі міма патруля, ён сапраўды адкрыў агонь. Потым я шкадаваў, што не ўбралі патруля адразу. А так... ад'ютанта майго Сашу мы дамчалі ў атрад з куляй у плячы... Але ўсё ж мы выратавалі любіміцу атрада. А чаму гэта мне ўдалося? На гэта пытанне адкажа нам Коля ў наступны раз.

# ПАЎЛЮК ТРУС

Паўлюк (Павел Адамавіч) Трус нарадзіўся 6 мая 1904 г. у вёсцы Нізок Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Уздзенскі раён Мінскай вобласці). У 1915 г. скончыў пачатковую школу, а ў 1923 г.— Уздзенскую сямігодку. Вучыўся ў Белпедтэхнікуме (1923—1927), пасля заканчэння якога працаваў у рэдакцыі гомельскай газеты «Палеская праўда». У 1928 г. П. Трус паступіў на літаратурнае аддзяленне педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Захварэў брушным тыфам і 30 жніўня 1929 г. памёр.

Першыя вершы маладога паэта друкаваліся на старонках газет «Беларуская вёска», «Звязда», «Савецкая Беларусь», у часопісе «Маладняк» у 1923 г. У 1925 г. выйшаў першы зборнік яго паэзіі «Вершы», у 1927 г. другі — «Ветры буйныя». Некаторыя вершы паэта змяшчаліся ў часопісе «Беларускі піянер», паэма «Юны змаганец» таксама друкавалася ў гэтым часопісе (1925, № 2).

Пасля смерці паэта Акадэмія навук БССР выдала поўны збор яго твораў (1934). Кнігі выбраных твораў П. Труса неаднаразова перавыдаваліся.

Паўлюк Трус — паэт-лірык. Многія яго вершы і паэмы адрасаваны юнаму чытачу.

## ЖУРАВЕЛЬ

*(Піянерская песня)*

Піянерская сям'я
Распявае жураўля:

П р ы п е ў:

Жура́-жура, журавель,
Журавелька малады.

Калі ён у СССР,
Значыць, хлопец — піянер.

(П р ы п е ў)

Чырвань-гальштук, як я рад,
Што запісаны ў атрад.

(П р ы п е ў)

Маршырую і пяю
Песню звонкую сваю.

(П р ы п е ў)

Я адзін з тых юнакоў —
Йсці на ворага гатоў.

(П р ы п е ў)

Мільёны дзетвары,
Камуністам мы сябры.

(П р ы п е ў)

Гэй, рабочыя краін,
Гэй, да нас вы, як адзін!

(П р ы п е ў)

Мне рабочы сябар — брат,
Я ў агонь за брата рад.

(П р ы п е ў)

Піянер наш — маладзец,
Вось і песеньцыканец.

(П р ы п е ў)

## БУДЗЬ ГАТОВЫ, ПІЯНЕР!

Зашумі галлём, сасоннік,
Заспявай, быльнёг-лаза,
Што мы вольныя сягоння,—
Воля вырасціла нас.

Загудзі паўстаннем, вецер,
Звонам, крыгамі вясны.
Што не паншчыны мы дзеці,—
Рэвалюцыі сыны.

Хоць нас гора гадавала,
Гора гушкала калыбель,
Але сёння нас нямала,
Нас — магутная арцель.

Мы прасторы арляняты,
З намі волі штандары,
Грудзі Леніным узняты,
Сэрца помстаю гарыць.

Нас вучыў пакойны Ленін
(Словы помняцца й цяпер):
За працоўных вызваленне
Будзь гатовы, піянер!..

Хай не стыне пена-кроў
На жалезных кратах.
Ў бой астатні будзь гатоў
За свабоду брата!

### ОЙ, З-ЗА ГОРКІ...

*(На матыў «Ой, пры лужку, пры лужку»)*

Ой, з-за горкі,
З-за гары
Сонца мые хаты.
Выплываюць штандары
Юных арлянятаў.

Гэй, наперад, на прыволле...
Дзе віхрыцца наша воля!

Мы ідзём,
Мы ідзём,
Піянерскі сцяг нясём!..
Піянерскі сцяг нясём
З ленінскім заветам,
Наша песня —
Песня-гром,
Кліч па-над сусветам...

Грудзі поўныя вясны...
З воклічам вясёлым,
Рэвалюцыі сыны,
Мы за камсамолам...

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Пятрусь (Пётр Усцінавіч) Броўка нарадзіўся 25 чэрвеня 1905 г. у вёсцы Пуцілкавічы Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Працоўны шлях яго пачаўся ў 1918 г. у Вялікадалецкім валасным ваенным камісарыяце. П. Броўка быў справаводам у валвыканкоме, рахункаводам у саўгасе, старшынёй сельсавета. У 1927—1929 гг. працаваў адказным сакратаром акруговай газеты «Чырвоная Полаччына». У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1940 г. быў прызначаны галоўным рэдактарам часопіса «Полымя рэвалюцыі». У Вялікую Айчынную вайну працаваў у франтавым і партызанскім друку. Пасля вайны стаў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя», з 1948 г. быў абраны старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1967—1980 гг. працаваў галоўным рэдактарам Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Пачаткам творчай дзейнасці П. Броўкі лічыцца 1926 г., калі ў газеце «Чырвоная Полаччына» былі надрукаваны першыя яго вершы. Выйшлі кнігі паэзіі: «Гады як шторм», «Прамова фактамі» (1930), «Цэхавыя будні» (1931), «Паэзія» (1932), «Так начыналася маладосць» (1934), «Прыход героя» (1935), «Вясна радзімы» (1937), «Кацярына» (1938, паэма), «Вершы і паэмы» (1940), «Шляхамі баравымі» (1940), «Насустрач сонцу» (1943, Масква), «У роднай хаце» (1946), «Вершы і паэмы» (1946), «Сонечнымі днямі» (1950), «Цвёрдымі крокамі» (1954), «Пахне чабор» (1959), «Далёка ад дому» (1960), «Па сакрэту» (1961, сатыра і гумар), «А дні ідуць...», «Высокія хвалі» (1962), «Вершы і паэмы» (1966), «Заўсёды з Леніным» (1967, паэма), «Між чырвоных рабін» (1969), «Калі ласка» (1972), «Ты — мая пчолка» (1972), «І ўдзень і ўночы» (1974), «Што сэрца праспявала» (1979), «І маладосць і сталасць» (1980), «Савецкі чалавек» (1982).

П. Броўка — таксама аўтар празаічных твораў (аповесць «Каландры» — 1931 г., раман «Калі зліваюцца рэкі» — 1957 г.) і лібрэта першых беларускіх опер «Міхась Падгорны» (паст. у 1939 г.) і «Алеся» (разам з Я. Рамановічам; паст. у 1944 г.). Выступаў і як перакладчык на беларускую мову твораў Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага і іншых паэтаў.

П. Броўка вядомы і юнаму чытачу як аўтар зборнікаў вершаў «Маладым сябрам» (1961), «Мая Радзіма» (1985), паэм «Наш музей» (1962), «Лясы наддзвінскія» (1973). Для вучняў старэйшага школьнага ўзросту напісаў аповесць «Донька-Даніэль» (1982).

Плённая праца паэта высока ацэнена Камуністычнай партыяй і ўрадам. П. Броўку прысвоена ганаровае званне народнага паэта (1962), званне Героя Сацыялістычнай Працы (1972). Ён лаўрэат Ленінскай прэміі (1962), двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1947, 1951), лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1970), Дзяржаўнай прэміі БССР за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі (1976).

Памёр паэт 24 сакавіка 1980 г.

## МАЯ АЙЧЫНА

Мая айчына —
Поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы —
Ўся Беларусь ад краю ў край.

Люблю яе бары, азёры...
Ды, як бы іх ні шанаваў,
Калі б не знаў другіх прастораў,—
Напэўна б я засумаваў.

Я палюбіў навечна,
Шчыра
Алтай, Палтаўшчыну і Крым...
Ад Ленінграда да Паміра,
Радзіма, ў сэрцы ты маім!

## РОДНЫЯ СЛОВЫ

Яны даспадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест,
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск,
          Пінск,
                    Брэст.

Калі паразважыш, няцяжка дазнацца,
Бо сведчаць на ўсю неабсяжную шыр,
Што продкі любілі спакойную працу,—
Шклоў,
          Клецк,
                    Мір.

А вораг находзіў,— бязлітасна білі,
Трываць не хацелі абразы і слёз,
І разам з Бярозаю катаў тапілі —

Пціч,
    Друць,
        Сож.

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была як агонь,
У сёлаў імёны, як гукі цымбалаў,—
Блонь,
    Струнь,
        Звонь!

## А ХІБА ЁСЦЬ, ШТО ЗАБЫВАЮЦЬ?

Ляжыць салдат ля пераправы,
Каля маленькае ракі.
Ляжыць салдат
Вялікай славы,
Крывёй здабытай на вякі.

Шуміць над ім гушчар зялёны,
Плывуць аблокаў караблі.
Ён паў,
Пазбавіўшы палону
Вось гэты кут сваёй зямлі:

І лес ва ўзорах журавінных,
І луг з расянаю травой,
І тыя светлыя хаціны,
Што сталі дружна над вадой,
І сад шумлівы напрадвесні,
І піянерскія кастры...

Ляжыць салдат
І чуе песні,
Што не сціхаюць да зары.

Ляжыць і сніць ён аб народзе,
Якому шчасце — вольна жыць!
І рады ён, калі прыходзяць
Хоць зрэдку з ім пагаварыць,
Калі сцяжыначка малая
Не зарастае да яго...

А хіба ёсць, што забываюць
Выратавальніка свайго?

## А ТЫ ХОЦЬ ДРЭВА ПАСАДЗІЎ?..

Дзе дваццаць год таму назад
Ляжаў дзірван акамянелы —
Расцвіў прыгожы, буйны сад,
Паплыў удаль, як ветразь белы...

Нямала тут вясновых дзён
Папрацавалі слаўна людзі,
Каб кожнай яблыняю ён
Усхваляваў нам сёння грудзі.

Ён так святло сваё разліў,
Глядзіш, нацешыцца няможна...
... А ты хоць дрэва пасадзіў? —
Няхай сябе спытае кожны.

## РАНІЦУ ЛЮБЛЮ...

Дзень і ноч красою
Славяцца сваёй,
Ды за ўсё мілейшы
Час мне раніцой.

Час, калі паволі
Набірае сіл —
Раскрывае вочы
Сіні небасхіл.

Сонейка з-за бору
Гляне ад крыніц —
Сыпануць праменні,
Як мільён расніц,

На палі, на рэкі,
На малы ручай!
У птушыных песнях
Забушуе гай.

І здаецца, ў кветках
Загамоніць дол,
Зашыбуе праца,
Праца навакол!

Мурашок нястомны
Ведае адно —
Цягне ён іглiцу,
Быццам бервяно.

Бусел мчыць галінку
Да гнязда здалёк,
Ластаўка пад дахам
Лепіць свой куток.

Певень правярае
Даўжыню крыла,
Быццам і не спала,
Загула пчала.

Кожны пачынае
Дзень на ўласны лад,
У мяне і працы,
І надзеі шмат.

Пра штодзённы клопат
Думы чарадой...
Гэта ж дзень вялікі
Ўвесь перада мной!

## НАДЫХОД ВОСЕНІ

Вось і лета сышло,
Адспявалі калоссі,
Цяжка нам заўважаць,
Як з'яўляецца восень.

Непрыкметна зусім —
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
Над рачулкаю соннай,
Устрывожыць дымком
З пахам бульбы пячонай.

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае буслiным.

А пасля,
А пасля
Ліст апошні сарвецца...
Ды не знаю, чаму
Ты мне, восень, па сэрцу.

# ПЯТРО ГЛЕБКА

Вядомы беларускі паэт Пятро (Пётр Фёдаравіч) Глебка нарадзіўся 6 ліпеня 1905 г. у вёсцы Вялікая Уса Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Скончыўшы Уздзенскую сямігодку (1923), працаваў сакратаром сельсавета. У 1924 г. паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум, з другога курса перавёўся на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ імя У. І. Леніна (скончыў у 1930 г.).

Першыя яго вершы былі надрукаваны ў 1925 г. П. Глебка ўступае ў літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», затым становіцца членам літаб'яднання «Узвышша» і працуе сакратаром рэдакцыі часопіса «Узвышша» (1928—1930). У 1927 г. выйшаў першы зборнік вершаў П. Глебкі «Шыпшына». Некаторы час працаваў у газеце «Калгаснік Беларусі», часопісе «Полымя рэвалюцыі», кансультантам пры Саюзе пісьменнікаў БССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны П. Глебка супрацоўнічаў у рэдакцыях франтавых газет «За Савецкую Беларусь» і «За свабодную Беларусь», у Дзяржаўным выдавецтве БССР (Масква). У пасляваенныя гады займаўся навуковай працай у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа, узначальваў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (1957—1969). П. Глебка — акадэмік АН БССР (1957), з 1969 г.— акадэмік-сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР.

Выдадзены зборнікі паэзіі П. Глебкі «Урачыстыя дні» (1930), «Арка над акіянам» (1932), «Арлянка» (1932), «Хада падзей» (1932), «Чатыры вятры» (1935), «Мужнасць» (1938), «Пад небам бацькаўшчыны» (1947), «Нашай славы зара» (1947), «Размова аб шчасці» (1948).

Значным укладам у беларускую Ленініяну з'явіліся паэмы «Мужнасць» (1934) і «У тыя дні» (1937).

П. Глебка — аўтар драматычнай паэмы «Над Бярозай-ракой» (1940), лібрэта оперы «Андрэй Касценя» (1947), вершаванай п'есы «Святло з Усходу» (1957), літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў.

Нямала П. Глебка напісаў і для дзяцей. Гэтыя яго творы склалі зборнікі паэзіі «Пад сцягам перамог» (1952), «Прывітанне Радзіме» (1961), «Вобразы роднай краіны» (1964), «Наш сцяг» (1972), «Наш лес» (1966, 1973, 1980), «Шчаслівы май» (1985).

П. Глебка вядомы і як перакладчык — перакладаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, польскіх, французскіх паэтаў.

Памёр П. Глебка 18 снежня 1969 г.

## БЕЛАРУСЬ

О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка
Схіляюся перад табой.

Зямны паклон табе, радзіма,
Тваім палям, тваім лясам,
Тваім заводам з белым дымам,
Тваім гасцінцам і шляхам!

На спелых нівах ураджайных,
Ад краю ў край, ва ўсе канцы,
Махаюць крыламі камбайны,
Спяваюць жнеі і касцы.

Уся убрана ты квяціста,
Пад колер слуцкіх паясоў,
У строі нівы залацістай,
У шаты грэчак і аўсоў.

А надвячоркам над палямі,
У змроку, быццам маякі,
Гараць чырвонымі радамі
Фабрычных вышак аганькі.

Асветлен імі шлях твой зорны,
І ты паміж сваіх сясцёр
Ідзеш упарта і напорна
Да новай славы на прастор.

## НАШ СЦЯГ

Гарачы, як сонца,
Крылаты, як вецер,
Наш сцяг пурпуровы,
Адзіны на свеце.

Ён кроўю байцоў
За свабоду абмыты,
Ён кулямі ў бітвах,
Як сэрца, прабіты.

Але прамінулі
Нягоды ліхія,
Загоены раны
Яго баявыя.

І ў знак перамогі
Над цемраю горкай
На ім пяцікутная
Свеціцца зорка.

А ў знак, што народы
Пад ім згуртаваны,
У золаце молат
І серп вышываны.

Гарыць ён, над вежай
Крамлёўскай узняты,
Пад ім у паход
Выступаюць салдаты.

Пад ім піянеры
Прыходзяць на зборы,
Пры ім, на бязмежным
Савецкім прасторы,

Заўсёды стаіць
Каравул ганаровы.
А ён развяваецца,
Сцяг пурпуровы,

Гарачы, як сонца,
Крылаты, як вецер,
Свяшчэнны, любімы,
Адзіны на свеце.

**НА РЭЧЦЫ**

На небе ані хмары...
Такой часінай дня
Густая, быццам пара,
Стаіць гарачыня.

Замерлі дрэў макушкі,
Не зварухнецца ліст;
Пявучай самай птушкі
Замоўк апошні свіст.

Адно пярэстым роем
Ля самае зямлі
У каляровых строях
Лятаюць матылі.

Ды трапяткія хвалі
Вясёлай чарадой
Спяваюць, як спявалі,
Гамоняць з асакой.

І вее прахалодай
Ад чыстае ракі,
І на жывыя воды
Спяшаюць хлапчукі.

Ад праменяў пякучых
У глыб вады рачной
Яны з высокай кручы
Ныраюць з галавой.

Ляцяць навокал пырскі,
І жвавыя кругі
Бягуць і мыюць блізкі
І дальні берагі.

І ў дружны хор шчаслівы
Зліваюцца шчыльней
І гоман хваль шумлівых,
І звонкі смех дзяцей.

**ЯГАДЫ**

Які сяголета шчаслівы
І ураджайны выпаў год:
Ва ўсіх садах агрэст і слівы,
Клубнікі повен агарод.

Пустыр, закінуты калішні,
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.

А за аселіцай, над рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набракла дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.

А што за ягады лясныя
У нас адразу зацвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разнеслі па зямлі!

Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясах,
За імі следам і чарніцы
Закрасавалі ў верасах.

Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завяззю брусніц.

І ўсе балотныя палянкі
Цвітуць агнямі журавін,
І неўзабаве ўспыхнуць гранкі
Чырвоных, яркіх арабін.

Які сяголета шчаслівы
І незвычайны выпаў год,
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод!

## МАКСІМ ЛУЖАНІН

Максім Лужанін (Аляксандр Амвросьевіч Каратай) нарадзіўся 2 лістапада 1909 г. у вёсцы Прусы Салігорскага раёна Мінскай вобласці. У 1928 г. скончыў Белпедтэхнікум і вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1928—1930). Некаторы час працаваў у рэдакцыі часопіса «Узвышша», потым на Беларускім радыё. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Дэмабілізаваўшыся з арміі ў 1944 г., працаваў у рэдакцыях газеты «Звязда», часопіса «Вожык». У 1967—1971 гг. быў галоўным рэдактарам сцэнарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм».

Першы верш М. Лужаніна быў надрукаваны ў 1925 г. у газеце «Савецкая Беларусь». Вершы і паэмы, створаныя М. Лужаніным, склалі зборнікі «Крокі» (1928), «Неаплочаны рахунак» (1930), «Новая ростань» (1930), «Галасуе вясна за вясну» (1931), «Кастрычнікам! Ліпенем! Маем!» (1931), «Аднагалосна» (1931), «Першамайская вуліца» (1932), «Галасы гарадоў» (1932), «Шырокае поле вайны» (1945), «Поступ» (1950), «Святло Радзімы» (1952), «Моваю сэрца» (1955), «Прасторы» (1958), «Росы на коласе» (1973), «Прага крыла» (1974), «Лявоніха» (1977), «Галасы над выраем» (1980), «Паразмаўляй са мной, зямля» (1983), «Вярнуся ветрам» (1987).

М. Лужанін шмат працуе і ў галіне прозы. Выйшлі кнігі «Колас расказвае пра сябе» (1964), «Вачыма часу» (1964), «Дванаццаць вячорных вогнішчаў» (1968), «Рэпартаж з рубцом на сэрцы» (1973), «Людзі, птушкі, прастор» (1976), «З ранку да вечара» (1978). У 1958 г. выдаў зборнік сатыры і гумару «Сілівон на дачы». Пісьменніку належаць некалькі сцэнарыяў мастацкіх і дакументальных фільмаў. Выступае ён і як перакладчык.

У 1964 г. за кнігу «Колас расказвае пра сябе» М. Лужаніну прысуджана Літаратурная прэмія імя Якуба Коласа.

Юнаму чытачу М. Лужанін адрасаваў кнігі «Вершы для дзяцей» (1948), паэму-казку «Хто робіць пагоду» (1960), а таксама кнігу «Песня з лесьнічоўкі» (1982), у якой змешчаны апавяданні пра маленства Якуба Коласа.

### ХТО РОБІЦЬ ПАГОДУ

*(Урыўкі)*

#### Што запісаў Міхалка пра Маразы

Калі зрывае лістапад
Лісты пажоўклыя з прысад,
Блукае па нізінах
Малы мароз — Падзімак.
Ён вельмі лёгкі на бягу,
Амаль не шчыпле за нагу,
Кладзе румянец на шчаку
І мае лёгкую руку:
Цярусіць нам парошу.
Падзімачак — харошы.

У снежні, трактам кругавым,
Прыходзіць майстар снегавы,
Адчыніць кузню ён сваю
І без кавадла, малатка,
Без меха, нават без агню,

Што хочаш робіць на заказ:
Закоўвае азёры ў сталь,
І лёдам скутая рака
Не гоніць хваль, не льецца
ў даль.
На тое ён — мароз Каваль!
З лядовага жалеза
Змайструе ён падрэзы,
Прыварыць іх на палазы —
І ў сані сядуць Маразы.

Прыедзе студзеньскі мароз,
Які завуць Чырвоны Нос.
Вось гэты — злосны не на жарт,
Ён то за вушы, то за твар
Хапае ледзяною
Даўжэразнай рукою.

Затым прыбудзе Сіні Нос,
Сіберны лютаўскі мароз,
Ён ходзіць з кіем ля бяроз
І замарозіць можа:
Шануйся, падарожны!

Пасля прыводзіць сакавік
Мароз лагодны — Веснавік:
Звініць лядок на лужынах,
Усе вясною ўзбуджаны,
Вясёлыя дзянькі,
Але — бывай, канькі!

Вясна бяжыць да нас угрунь,
І раптам выскачыць на рунь
Наш непрыяцель даўнішні,
Мароз шкадлівы — Ранішнік.
Няпрошаны і ў маі
Часамі дапінае.
Тады палі кастры ў садах,
Перасякай злачынцу шлях:
Уп'ецца дымам сінім,
Пакруціцца і згіне.

І ёсць яшчэ стары мароз,
Ён сівым інеем аброс,
Ён мае вельмі важны пост,
Ён — над маразамі мароз.
А з выгляду — румяны дзед
І хоць халаднаваты сам,
Але гарачы шле прывет
І падарункі носіць нам
Па хатах і па школах
Да навагодніх ёлак.
Нашто імя яго казаць,
Вы так павінны адгадаць.

Кранёмся далей пакрысе,
Бо Маразы, здаецца, ўсе.

## Што даведаўся Міхалка
## пра Снягі

Спачатку валіць на шляхі
То мокры снег, то снег сухі.
Адзін завецца Ха́лепа,
Другога клічуць Ша́лепа,
Ідуць на гразь і робяць гразь,
Хоць проста з хаты не вылазь!

Азябне, вымакне прасцяг
І ўзмоліцца...
І паляцяць
Сняжынкі роем на палі,
На пожні, на пакошы,
І стане бела на зямлі —
Ляці, ляці, Пароша!

А працавіты ж гэты снег!
Пабеліць сад, укрые двор
І санкі выцягне з-пад стрэх:
Пара пачаць катанне з гор!
Бяжыць на ўзлёце самалёт,
Надзеўшы лыжы ўпершыню,
Бяжыць суворавцаў узвод
Пракладваць звонкую лыжню.

Вялікі мае кошык
Вясёлы снег Пароша!
Засыпле кожнае сцябло,
Каб цёпла спаць яму было
Да самае прадвесні,
Да жаўруковай песні.

Пасля надзьмуцца халады,
Папрачынаюцца тады
Калючы, дробны Венічнік
І тонкі, сыпкі Сенечнік.
У тых снягоў сяброўкі ёсць —
Завея і Мяцеліца.
Калі агорне цётак злосць —
Закруцяцца, узвеюцца.
Схапіўшы ў рукі дзеркачы,
Пачнуць адна адну таўчы,
Параспускаюць косы
Пад самыя нябёсы,
Пасварацца з мужамі.
І тымі дзеркачамі
На тракце зробяць снежны вал,
Каб самазвал забуксаваў,
На сцежкі вывернуць сумёт,
Каб не прабіўся пешаход,
Дамы па вокны занясуць
І ў сенцы поўна намятуць.
Злуюць ліхія цёткі,
Ды век у іх кароткі!

Мінуць яны. На пастаўнік
Пагоніць статкі красавік,
Тады змятае неба
Апошні снег — Паскрэбак:
Ляцяць да долу крупкі,
Нібыта соль са ступкі.

Які б ні падаў снег з аблок:
Ці то сняжыска, ці сняжок —
Ён ад марозу ні на крок,
Бо вельмі ж нетрывалы,
Жыве надзвычай мала.
Як толькі сонейка зірне,
Праменнем на яго міргне —
Заплача, загалосіць снег
І перака́паецца ў дождж,
І пойдзе хлюпаць без галёш.

Ужо Снягі, здаецца, ўсе.
Дык пойдзем далей пакрысе.

**Якія бываюць Дажджы**
**і што яны робяць**

Са стрэх звісаюць капяжы,
На полі — снежны малахай,
А ўжо вясновыя дажджы:
Дождж Раставай і Палівай —
Наўсцяж бягуць лугамі
І гоняць снег дубцамі.
— Гэй, Раставай! Займай з бакоў!
— Гэй, Палівай! Прышпар з лясоў! —
Услед гукаюць дзеці,
І рэха носіць вецер.

Гудзе гамонка ручаін,
Трава паблісквае з нізін,
Гучыць падпаскава труба,
І апранаецца вярба
Пушыстымі каткамі...
Ты з гэтымі дажджамі
Сябруй, ад сэрца паважай —
Яны гадуюць ураджай.

Калі прыпарным летнім днём
Разрэжа пасак агнявы
Клубкі аблокаў кучавых,—

У сто гармат бабахне гром,
Прыгнуцца ў страху дрэвы
І рыне дождж Залева.
Стальныя вострыя цуркі
Б'юць зверху проста, як штыкі,
Праніжуць за хвіліну,
Як кажуць, да рубіны,
Пялёсткі з яблынь атрасуць,
На жыце абаб'юць красу
І цэляць, каб упокат
Злажыць усё навокал:
Парваць на тракце правады,
А ў рэчку столькі даць вады,
Каб поймы затапіла,
Праезджы шлях размыла.

Калі не радуеш людзей,
А шкоду робіш найчасцей,
Цана табе — гарэлы грош,
Хоць ты і моцны, буйны дождж!
Сказаць папраўдзе, да таго ж
Залева — ашуканец!
Калі яго чакаюць,
Нагоніць хмар
На ўвесь абшар,
Пастрашыць, пырсне раз ці два,
Што не здаволіцца трава,
Што не прыб'ецца нават пыл,
І — пакаціў за небасхіл!
Вядома ўсім з прыкмет былых:
З вялікай хмары — дождж малы.
Залева чуў пра гэта,
Ён ціхенька, сакрэтна
Схаваецца за хмаркай,
На ёй пад'едзе шпарка,
Саскочыць, схопіць, пракурат,
Свой дажджавальны апарат
І — як з вядра!
І — як з вядра!

Багата робяць хлюпаты
Дажджы, стрыечныя браты,
Касіла і Сушыла
І трэці дождж — Мачыла.
Касіла не дае касіць,
Сушыла не дае сушыць,
Мачыла ў копах мочыць
Ад раніцы да ночы.
Яны і восенню ідуць,

Тады іначай іх завуць:
Дажыначнік — ліе ў снапы,
Бульбянік — цэдзіць на бурты,
А Канаплянік цёплы —
На лён і на каноплі.
Усяк, бывае, клічуць іх,
Але звычайна лічаць іх,
Усіх шасцёх, дажджом адным,
Заядлым, спорным і густым,
Якога знае кожны
Пад іменем Аблoжны.

Затое дожджык Грыбасей —
Адна уцеха для дзяцей!
Прыпусціць ён — зямля цвіце,
І грыб, і ягада расце:
Цягні гэту супoлку
За вуха і ў кашолку!

Над малайцамі маладзец
Дождж Ворыўнік.
І дождж Сявец —
Выдатны памагаты
Калгаснікам-аратым.
Мацуй з дажджамі дружбу,
Павывучай іх звычкі,
Яны саслужаць службу,
Хоць ростам невялічкі:
Разуюць чаравічкі,
Падвяжуць світкі лычкам
І папрацуюць для цябе
На ворыве і на сяўбе.

Вось і Дажджы, здаецца, ўсе.
Кранёмся далей пакрысе.

### Хто робіць пагоду

На станцыі дзяўчына
З блакітнымі вачыма,
З даўжэзнаю касою,
Харошая сабою
Камандуе дажджамі,
Сябруе са снягамі,
А на вятры наводзіць страх —
У Насці тэхніка ў руках!

У неба пусціць шар-пілот
І вызначае ветру ход,
Барометра бліскучы дыск
Пакажа ёй паветра ціск,
Тэмпературу добра
Запісвае тэрмограф.
Дзяўчыне служыць вельмі шмат
Прыбораў дзіўных і прылад.

Яна прасочыць рух аблок.
У глебе змерае цяпло,
Увечары і ўранні
Запіша назіранні,

Дзе ўсхватваюцца хмары,
Адкуль чакаць прыпару
З агністай небяспекай
Для працы чалавека.

Чакаюць вестак:
Аграном,
Пілот, вадзіцель за рулём,
У белым кіцелі марак,
Вучоны, школьнік і рыбак:
—Давайце неадкладна,
Ды каб было дакладна!
Бо трэба знаць і трэба ўмець,
Каго, калі і як сустрэць.

Пасты хлапцоў, пасты дзяўчат
Абнялі вартай далягляд:
У Насці шмат сябровак,
Бялявых, чарнабровых,
А ў тых сяброўак ёсць сябры,
Усе — бывалыя майстры,
Яны-то зладзіць здужаюць
З вятроў шкадлівых ружаю,
Патайныя іх плыні
Прыкмецяць і запыняць.

Пасты хлапцоў, пасты дзяўчат
Абнялі вартай далягляд,
Яны працуюць без акрас
На наш магутны, добры час:
Пагоду ўдзень і ўночы
І робяць, і прарочаць.
Яны сягоння ўсёй зямлі
Шырока вестку падалі:
— Ідзе Вясна! Ідзе Вясна!
Усе ўставайце давідна!

### СНЕГ

Вось заладзілі дажджы,
Сеў і з хаты не бяжы.

Толькі вечарам учора
Падмярзаць стаў панадворак,

Хмары некуды сплылі,
Зоры ў небе зацвілі...

А пасля ўсхадзіўся вецер,
Выў у коміне ўвесь вечар.

Так я з гэтым і заснуў,
А на ранне, як зірнуў,—
Вось, здаецца б, і пабег:
Белы,
Белы,
Белы
Снег.

Ветру нудна не было,
Накруціла, намяло:

А далёка,
А глыбока,
А высока,
Аж да вокан!
І на полі,
І на голлі,
Дзе ні глянеш,
Дзе ні станеш,—
А-я-яй! Які сняжок:
Што ні ступіш, дык слядок.

## ВАСІЛЬ ВІТКА

Васіль Вітка (Цімох Васільевіч Крысько) нарадзіўся 16 мая 1911 г. у вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння Слуцкай прафтэхшколы металістаў (1928) працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1928 г. у штомесячным літаратурным дадатку да акруговай бабруйскай газеты «Камуніст» былі надрукаваны першыя вершы паэта, а першы зборнік вершаў «Гартаванне» выйшаў у 1944 г. у Маскве.

Да Вялікай Айчыннай вайны В. Вітка супрацоўнічаў у рэдакцыях рэспубліканскіх часопісаў і газет. У 1939 г. удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Быў сакратаром аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР у Беластоку і адначасова карэспандэнтам «Литературной газеты» па заходніх аблас-

цях БССР. У пачатку вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», потым супрацоўнічаў у сатырычным лістку «Партызанская дубінка» і сатырычнай газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну», у газеце «Комсомольская правда». У 1944—1947 гг. працаваў адказным сакратаром часопіса «Беларусь», потым — намеснікам рэдактара, галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва» (1948—1957). З дня ўтварэння дзіцячага часопіса «Вясёлка» (1957) на працягу семнаццаці гадоў быў яго галоўным рэдактарам.

Творчасць В. Віткі для дзяцей пачалася з казачнага эпасу — у 1947 г. ён напісаў вершаваную казку «Вавёрчына гора». Затым выдаў кнігі для дзяцей «Буслінае лета» (1958), «Казка пра цара Зубра» (1960), «Зайчык-вадалаз» (1962), «Дударык» (1964), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1965), «Казкі» (1968, 1976), «Чытанка-маляванка» (1971), «Хто памагае сонцу» (1975), «Ладачкі-ладкі» (1977), «Мы будуем метро» (1979), «Мінскія балады» (1981), «Госці» (1984), «Загадка пра зярнятка» (1984), «Казкі і краскі» (1984), «Свята дружбы» (1987). Для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту В. Вітка напісаў паэму «Беларуская калыханка» (1968).

Педагагічныя роздумы, эсэ, літаратурныя партрэты вядомых педагогаў і выхавацеляў склалі кнігі «Дзеці і мы» (1977), «Урокі» (1982). Пісьменнік з'яўляецца адным з аўтараў чытанак «Роднае слова» для 1-га (1969) і 2-га (1970) класаў (яны сістэматычна перавыдаваліся), а таксама чытанак, складзеных па новай праграме для 2-га (1987) і 3-га (1988) класаў.

Нямала твораў у В. Віткі для дарослых. Ён — аўтар п'ес «Прамень будучыні» (1947), «Шчасце паэта» (1950), а таксама зборнікаў лірыкі «Поўдзень» (1946), «Вернасць» (1953), «Ружа і штык» (1958), «Паверка» (1961), «Лірыка» (1968), «Праводзіны лета» (1972), «Вышыні святла» (1977), «Случчына» (1981), «Для дома, для альбома і трохі для эпохі» (1983), «Трэція пеўні» (1987). Шмат зроблена ім і ў галіне мастацкага перакладу з іншых моў на беларускую (пераклаў творы Л. Талстога, А. Чэхава, М. Салтыкова-Шчадрына, М. Ісакоўскага, М. Рыльскага, М. Стэльмаха, М. Прыгары, М. Вайнілайціса, Я. Райніса, В. Лукса, Уолтэра Мэя і інш.).

У 1972 г. за кнігі «Беларуская калыханка», «Казкі», «Чытанка-маляванка» В. Вітку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы. У 1978 г. ён узнагароджаны міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х. Андэрсена за зборнік «Казкі».

## ЛЕНІН

Першы раз убачыў на партрэце
Я яго ў далёкія гады.
Мы, вясковыя малыя дзеці,
Яшчэ ў школу бегалі тады.

Не забуду радаснай хвіліны,
Як пераступіў парог у клас:
Са сцяны сялянскае хаціны
Ён глядзеў з надзеяю на нас.

Подлеткамі пад яго рукою
Мы адчулі крыл сваіх размах.
З той пары не ведае спакою
Мой імклівы, мой крылаты сцяг.

Ён заўжды з грудзей гарачых рвецца
Ў радасці, у шчасці і ў бядзе,
А жывое ленінскае сэрца
Праз усё жыццё мяне вядзе.

Ад забытае, далёкай хаты
Ён ідзе па свеце праз вякі.
Новыя ўзлятаюць арляняты
З-пад яго узнятае рукі.

## МЫ БУДУЕМ МЕТРО

Скажу я вам папраўдзе,
І ўвесь засведчыць двор:
У нашым у дзетсадзе
Народ — як на падбор,
Старанны і ахвочы.
Нам скора ўсім па сем.
Дайшлі мы ў падрыхтоўчай
Да літары ўжо эм.

Эм — гэта мамы нашы,
Мір, і Масква, і мы...
— І Мінск,— сказала
Маша,—
І нашыя дамы.

— Маторы і машыны,—
Дадаў дружок мой Рэм.
— Музей,— сказала Зіна,—
І магазін на эм...

— Яшчэ якія словы
Вы знаеце на эм,
Хто адказаць гатовы? —
Раз, два... чатыры... сем...

— Метро! — сказала Мая.
— Метро,— сказаў Змітро,—
Масква дапамагае
Нам будаваць метро.

— І нам,— сказала Ада,—
З Маскоўскае, ад нас,
З нашага дзетсада
Пачаць бы ў самы раз!

— З нашага дзетсада,—
Выгукнула Іра,—
Была б якраз брыгада,
А я — за брыгадзіра!

—Ты, Іра, не спяшайся!—
І ўсе сказалі: — Не.
Вясёлкінага Васю! —
І выбралі мяне.

— Вясёлкін, ты скажы ўсім,
Што толькі тых бярэм,
Хто добра падружыўся
З літараю эм!

Час за работу брацца!
І я сказаў: — Ага.
І аж да Валгаградскай
Загула чарга.

Гудзе магутны пошчак,
Як летам у бары.
На Ленінскай мы плошчы
Спынімся, сябры.

На адно імгненне
Прыпынімся мы тут.
— Дзень добры! — скажам
Леніну
І аддадзім салют.

Пасля падземнай трасаю —
Да Свіслачы-ракі.
Цяпер мы першакласныя
Ужо будаўнікі.

Вось пад ракой прасек я
Тунель, далей пайшоў
Па Ленінскім праспекце,
Маскоўскаю шашой.

Мой дзед пад Валгаградам
Змагаўся як герой,
І я сваю брыгаду
Вяду ў гарачы бой.

Назад не аглядацца
І не лавіць варон!
Поезд адпраўляецца,
Просім у вагон!

За дзесяць, за дванаццаць
Лічаных мінут
І ты на Валгаградскай,
І ўсе сябры ўжо тут.

Усіх не пералічыш,
А кожнаму я рад.
Атрад мой будаўнічы,
Мой родны, мілы сад!

Як зналі нарадзіцца
Мы ўсе ў шчаслівы час.
Хочаш пракаціцца —
Давай хутчэй да нас!

Вось вам эскалатар
Угору і з гары.
Будаўнікам — бясплатна,
Катайцеся, сябры!

З вуліцы Маскоўскай
Людзям на дабро
З'яднала ў гурт сяброўскі
Нас Мінскае метро.

На горад родны гляньце,
Як хутка мы расцем —
Над кожнай нашай станцыяй
Знак вернай дружбы: М.

## КАЛЫХАНКІ, ПАЦЕШКІ, СКОРАГАВОРКІ, ЛІЧЫЛКІ, ЗАГАДКІ

### ІВАНКА

Баю, бай, Іванка.
Прыйшла калыханка.
Павярніся на бачок
І засні, мой хлапчучок.

— Мама, мне ўжо два гады —
Пайду ў лес па ягады,
Буду рваць ігрушы
На калакалушы.

На ляшчыне — шчаўе,
На шыпшыне — траўе,
На алешыне — чарэшні,
На крушыне — песні,
На явары — звон, звон,
На ясені — сон, сон...

А дзе ж калыханка?
— Я з табой, Іванка.

### КОЦЯ І КАЦЯ

Плача коця на кухні,
Ад слёз вочкі папухлі.

— Што з табою, мой каток,
Забалеў мо жываток?

— М-мяў,— сказаў варкоцік,—
Не баліць жывоцік.

У мяне душа баліць —
Як цяпер на свеце жыць.

Як мне жыць у хаце,
Калі хлусіць Каця,

Смятану злізала —
На мяне сказала.

### ПІЛА

Наша вострая піла —
Не піла,
А пчала.

Не піла,
Не ела,
Ні разу не прысела.

А ўсё пела
І гула —
Вясёлая піла.

Папілавала дровы —
Будзьце здаровы!

### КАПЯЛЮШ

Лепш не кратай, лепш не руш
Мой дзіравы капялюш.
Падабаецца — надзень,
Але толькі на дзень.
Раз надзень, два надзень,
Куды хочаш, туды дзень.

## ЦЯЛЯТКАМ

Вам, цяляткам, мала кавы,
Вельмі мала чаю —
Выпіце лепш малака вы,
З'ешце малачаю.

А траву пакашу —
Дам вам сена па кашу.

## ПОПЕЛ, ПОПЕЛ...

Попел, попел, папяльніца,
Ты — мой брацік, ты — сястрыца.
Ты — дружочак, ты — падружка.
Ты — козачка, а ты — птушка.
Табе крыльцам накрывацца,
Нам усім — хутчэй хавацца.

## ЗА ТРЫ ВАЗЫ

За тры вазы дзеразы
Купіў тата тры казы.
А ці кожнаму вядома —
Па чым козы йшлі дадому?

*(Па дарозе)*

## ВАДАВОЗ

Заліхвацкі вадавоз
Воз вады па небе вёз,
Гэтак грукацеў вядром,
І мы ўсе пазналі...

*(Гром)*

## МАЯ СЯМ'Я

Задам табе задачу я.
Паслухай, вось мая сям'я:
Дзядуля, бабка, брат.

У нас парадак, лад,
Заўсёды чыста ў хаце,
Бо ў хаце ў нас дзве маці,

Два бацькі, два сыны,
Дачка, унучка і сястра,
А самы меншы — я.

Цяпер табе злічыць пара —
Якая ў нас сям'я?

*(Бацька, маці, сын, нявестка, унук і ўнучка)*

**ДУДАРЫК**

Сеў у полі на каменьчыку,
Узяў дудку на раменьчыку.

Ду, ду, ду — дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

Надакучыла іграць,
Каля дуба лёг паспаць.

Вісіць дудка на суку,
Спіць дударык на баку.

Павярнуўся дагары
І так моцна ён захроп —

Скалануўся дуб стары,
Дудка — бух у самы лоб.

Тут яму і сон не ў сон,
На ілбе гудзе ўжо гуз.

Не сабраў і трэсак ён,
Бо ад дудкі — толькі друз.

Падняў хлопец паясок,
Пайшоў з плачам у лясок:

— Куды дзецца мне цяпер?
Цікаваць буду цяцер.

Спадцішка пад куст падпоўз
І цяцёрку — хоп за хвост.

З пёрка выразаў дуду:
— Ой, зайграю, загуду.

Што было, тое сплыло,
Пайду з дудкаю ў сяло.

Я пад першы парог,
А мне з хаты — пірог.

Я на дудцы: ту-гу-гу —
Ўсе нясуць па пірагу:

Мне і матка — пірог,
Мне і татка — пірог,

Мне і дзядзька — пірог,
Мне і цётка — пірог,

Мне і дзедка — пірог,
І суседка — пірог,

І браценік — пірог,
І пляменнік — пірог.

Назбіраў я пірагоў
Сорак восем карабоў.

Каб яшчэ адзін пірог,
Я зусім бы абнямог.

Перастань, дуда, дудзець!
Дзе мне пірагі падзець?

Сабралася ўся радня,
Памагчы ўсе рады мне.

Запрагаюць каня —
Ён і воза не скране.

Падагналі грузавік,
Для яго — груз вялік.

Папрасілі самазвала,
Ў самазвала сілы мала.

Залучыў я камара,
Магутнага званара.

Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Ай камар-маладзец!
Тут і казцы канец.

### ВАВЁРЧЫНА ГОРА

#### Казка

*Пра Веру-Вавёрачку,*
*Пра яе гора-горачка,*
*Пра яе маленькіх дочак,*
*Пра вавёрчын малаточак,*
*Пра птушынага пасла —*
*Даўганосага Бусла,*
*Пра жыццё-быццё лясное*
*І яшчэ пра тое-сёе.*

Забалелі ў Вавёрачкі зубкі —
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі.
Плача Вера-Вавёрачка:
— Ой, гора маё,
Горачка...—
Сабралася ўся вавёрчына радня.
Думаюць, гадаюць усё ноч да дня:
Як тут быць,
Што рабіць?
Прыкладаюць дочкі
Мамачцы прымочкі,
Грэюць унучкі
Бабульцы анучкі.
Яшчэ болей баляць вавёрчыны зубкі —
Не можа крануць арэхавай шкарлупкі.

Вестку паслалі старэйшаму сыну,
Той адразу ўсе справы пакінуў
І праведаць хворую маці прыехаў
І прывёз поўны мех ёй арэхаў.
Ён не знаў, што баляць у Вавёрачкі зубкі,
Што не можа крануць яна імі шкарлупкі.

Госцю маці гаворыць:
— Сыночак,
Ты прывёз бы мне малаточак.
Не трудзіла б я зубкі,
Не верадзіла,
Малатком бы шкарлупкі
Біла.
— Што ж,— кажа сын,—
У маёй старане

Ёсць каваль — лепшы мой друг,
Ён можа скаваць для мяне,
Што я захачу,— нават плуг.
— Мне плуг не патрэбен,
сыночак,
Хай зробіць ён мне малаточак.

— Мама,—
Гаворыць ёй сын у адказ,—
Я дам тэлеграму.
Ён зробіць ураз.—
Сарваў сынок
Дубовы лісток —
Тэлеграма гатова:
«Я жывы і здаровы.
Толькі баляць у мамачкі зубкі —
Не можа кусаць арэхавай шкарлупкі.
Прашу, дружок,
Зрабі малаток».

Сказалі сёстры брату:
— Навошта
Табе самому хадзіць
На пошту?
Мы самі знаем, дзе стары граб.

Даўно мы хацелі
Збегаць на тэле...
Даўно мы хацелі
На тэле-
Граф.
— Ну, што ж, імчыце,—
Сказаў браток,—
Занясіце лісток,
Вазьміце квіток.

— Нясіце,— сказала мама,—
Каб сёння ж
Дайшла тэлеграма,
Няхай сам начальнік на бланку
Пастравіць пячатку,
Што гэта «маланка»...

Імчацца шустрыя сёстры,
Мільгаюць дрэвы
І вёрсты.
Прымчаліся
У самы гушчар.
Што тут такое?
Пажар!

Усё у агні — і лісцё і галіны,
Але здагадаліся сёстры,
Што гэта
Прыбеглі
На самы разгар лета,
І палаюць агнём
Не галіны,
А спеюць
Чырвоныя арабіны.

Імчацца далей сёстры няспынна,
Мінаюць гушчар
І пажар арабінны.
І вось перад імі
Новая пацеха:
Дрэва,
А на дрэве — арэхаў, арэхаў!
А спеленеча-ча-ча-чкія,
А жоўценеча-ча-ча-чкія,
А поўненеча-ча-ча-чкія,
А на вяршэча-ча-ча-чку,—
Шкада,
Не ўзялі з сабою
Мяшэчачка.

І тут яны ўспомнілі,
Што баляць у матулі зубкі,
Што не можа яна раскусіць арэхавай
Шкарлупкі.
Хутчэй жа,
Хутчэй,
Хутчэй туды,
Туды,
Дзе растуць
Старыя дубы!

Лістамі сцежку
Сцеле
Граб,
Прыбеглі сёстры
На тэле-
Граф.

Шматпаверхавы дом —
Высознае дрэва
З акном-дуплом,
Уваход налева.
Калі ўмееш — чытай сам,
Што напісана над аконцам:

«Прыём тэлеграм
Да захаду сонца».

Вавёркі ў дупло
Лапкамі: стук-стук,
А ім у адказ:
— Хто тут?
Хто тут?
Не лезьце ў дупло —
Ужо сонца зайшло!

Сталі сёстры прасіць:
— Дзядзюхна начальнік,
Тэлеграму трэ адбіць,
Гэтак мы імчалі,
Гэтак беглі
Праз гушчар,
Праз агонь,
Праз пажар...
Хворая ў нас маці,
Дзядзюхна Дзяцел...

Падабрэў начальнік,
Непрыступны маўчальнік,
Акуляры надзеў,
На лісток паглядзеў.
— Добра,— кажа,— пашлю
Заўтра ўранку кавалю.

— Як гэта заўтра ўранку?
Нам загадала мама,
Каб вы паслалі з Маланкай
Нашу тэлеграму.

— З Маланкай? — здзівіўся Дзяцел.—
А дзе ж яе ўзяці?
Не працуе бесперастанку
У мяне на пасылках Маланка.
Бывае
І яна выхадная.

— Хай тады кавалю на дом
Заімчыць тэлеграму Гром.
— Гром? — усміхнуўся начальнік.—
Гром?
Ён толькі з работы
І спіць
Непрабудным сном.

— Хто ж перадасць тэлеграму,
Хто ж?
— Дождж,— сказаў ім начальнік,—
Дождж!

І застукаў
Начальнік,
Непрыступны
Маўчальнік,
Дзюбаю: тук-тук,
Тоўстаю: ток-ток —
І з лістка
На лісток
Пацёк
Ручаёк...

Бягуць вавёркі дадому
І чуюць,
Як іх тэлеграму
Кроплі друкуюць:
«Тук-ток,
Кавалёк,
Прышлі маме
Малаток.
Разбалеліся ў мамачкі зубкі,
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі».

Паплыў паток,
Пагнаў лісток,
Панёс удаль,
Дзе жыве каваль —
Стары воран,
Як вугаль, чоран.

Прыйшла тэлеграма якраз у час,
Кавалю не дае спакою заказ.
Сон яго не бярэ,
Яда не лезе:
Як зрабіць малаток —
Няма жалеза.

— Знайсці жалеза я бяруся,—
Сказаў кавалю даўганосы бусел.
Ён абуў чырвоныя боты
І палез
У балота.

А праз гадзіну ўжо бусел
Вярнуўся:

— Так і так.
Ляжыць у канаве «тыгра» —
Нямецкі танк.

Пайшоў каваль
З прыладамі,—
Чоран воран,—
Паставіў кавадла,
Распаліў горан,
Скінуў кажух,

Надзеў хвартух,
Узяў абцугі,
Прайшоў раз-другі.
Жалеза не відаць —
Гара іржы.
— З чаго мне каваць
Малаток —
Скажы?

Падумаў бусел:
«Прыйдзецца, мусіць,
Самых дужых звяроў склікаць,
Каб забітага «тыгра»
Па костачках разабраць».

Прыйшоў мядзведзь,
Злуецца, равець,
Прыйшоў воўк —
Зубамі шчоўк, шчоўк,
Прыйшоў бабёр —
Хвастом пацёр.
Доўга так раўлі і вылі
І нічога
Не зрабілі.

Беглі ў гэты самы час
Маленькія зайкі,
Узяліся і — ураз
Развінцілі гайкі.

Тады гусі і сініцы
Знялі вежу,
Гусеніцы.
Наскублі яны сяк-так
З паганага «тыгра» шэрсці шматок.
Вось табе і хвалёны танк —
Ледзь хапіла вавёрцы
На малаток.

Добра сказаць —
Заказ гатовы,
А як паслаць
Яго ў бор сасновы?
Другі дзень Вавёрка малатка чакае,
Можа, яна, бедная, з голаду канае.
Гэтак моцна баляць у Вавёрачкі зубкі,
Што не можа кpануць арэхавай шкарлупкі.
Апусціліся галовы ніц
І ў зайцоў
І ў сініц,
Сядзяць у скрусе
Бусел
І гусі.
Стаў ад гора
Воран
Яшчэ болей
Чоран.

Паўзе Крот,
Зямлі повен рот:
— Ду-ду-ду, ду-ду-ду,
Я вашу бяду
Адной лапай
Развяду.
Сталі ўсе яго прасіць:
— Краточак,
Крот,
Браточак
Фядот,
Ты можаш зрабіць
Самалёт?

— Угу.
Я магу.

— Нам трэба, браточак,
Паслаць малаточак...

— Добра,— кажа ім Крот,—
Я зраблю самалёт.
Скідай, каваль,
Свой чорны хвартух,
Прынясі мне
Шырокі лапух,
А вы, зайкі, травы нарвіце,
Вяровачкі звіце,
Малаток
У вузялок

Завяжыце.
— А цяпер, —
Кажа Крот,—
Я буду галоўны пілот.
Мяне вы прасілі.
Падымай, бусел, крыллі,
Бяры ў дзюбу лапух —
Павязём малаток мы
Удвух:
Верхам сяду ў цябе я на шыі,
Паляцім мы пад хмары густыя,
Будзеш ты
Крыламі махаць,
А я
Буду табой кіраваць.

— Дзякуй,— бусел яму у адказ.—
Гэта раз.
Памагла нам твая галава,—
Гэта два.
Ну, а болей не гавары,—
Гэта тры.
Памагатых такіх мне
Не трэба.
Калі ж хочаш
Пабачыць ты неба
І зайздросціш адно нам,
Буслам,—
Паспрабуй
Узніміся
Сам!

Цвёрдае слова —
Слова буслова.

Ўзяў лапух у дзюбу ён.
Варухнуў крыламі —
І ляціць наш паштальён
Лугамі,
Лясамі.
А куды ён ляціць —
Можа, боты шыць,
Можа, ніткі віць? —
Адкажыце
Самі.

Ну, вядома,
Ляціць да Вавёркі-галубкі,
Вельмі ж моцна баляць яе зубачкі-зубкі.

Ён нясе ёй вузялок,
Там завязан малаток,
Каб Вавёрка зубоў не трудзіла,
Каб арэхі малаточкам біла...

У вавёрчынай жа хаце
Поўна шуму, весялосці,
Перадаў ім вестку Дзяцел,
Што ляціць сам Бусел ў госці.

Вось унучкі
Сталы засцілаюць,
А дачушкі
Пачостку стаўляюць,
Сын
Пясочкам ля самага дома
Высыпае пляцоўку
Аэрадрома,
Каб птушыны пасол мог спусціцца,
Паміж соснаў густых
Прызямліцца.
Гасця сустракаці
Выходзіць маці:
— Што на белым свеце чуваці —
На балоце,
На сенажаці?

— Ат, якія ў нас навіны,—
Ёй адказвае Бусел,—
Вы ж самі ведаць павінны,
Што ўсе мы ў самоце і скрусе.
Як прыйшла тэлеграма, што баляць у вас зубкі,
Не спалі мы цэлыя суткі,
Не знала шчаслівай мінуткі.
Цяпер я спакойны
За ваш раток,—
Вось вам бранябойны
Малаток.

— Ай-яй-яй! — дзівяцца сёстры.—
Які ён цяжкі,
Які ён востры...
Мы хацелі другую адбіць
Тэлеграму,
Што даўно не баліць
Раток у мамы...
І няхай будзе сказана толькі між намі —
Лепей грызці арэхі сваімі зубамі.
Мы хацелі,

Мы вельмі хацелі,
Зноў збегаць
На тэле...
На тэле...
— Перастаньце! — на дочак
Прытупнула маці.
— Малаточак
Спатрэбіцца ў хаце...

Доўга ў іх ішла бяседа-
Гаворка.
Ўсе суседзі
Былі
У вавёркі.

Стары дзяцел
З сваім зяцем,
Тры сініцы-сястрыцы,
Цётка Ганулявя —
Шэрая зязюля,
Пяць зайцоў-малайцоў,
Удод-удавец —
Слаўны на дудзе ігрэц,
Два глухія глухары
Білі ў бубен
Да зары.

І я там быў
За тым сталом
І еў і піў
Разам з Буслом.
Што там было весялосці
І смеху,
Папаелі госці
Грыбоў і арэхаў.
Былі мёд і квас там,
Бульба, селядзец.
Хто праслухаў казку —
Той маладзец.

## ДЫЯЛОГІ З УНУЧКАМІ

### Сапраўдная казка

Я расказваю казку не з кнігі, а са сваіх слоў.

### Рука

— Дзядуля, колькі год маёй руцэ?
— Пяць.
— Колькі і мне?
— Ну але.
— А чаму ж яна вышэйшая за мяне?

### Слон і мурашка

— Дзядуля, калі б цябе праглынула мурашка — ведаеш, якая б яна была?

— Якая?

— Як слон.

### Сон

— Чаму так рана прачнулася?

— Кончыўся сон.

### За сталом

— Я адчуваю сябе не ў сваёй талерцы,— сказаў госць.

— Калі ласка, вазьміце маю місачку.

## ТРЫВОГА Ў ЕЛЬНІЧАХ

Бываюць от жа ж рызыканты: ты яму кол на галаве чашы, а ён адно выскаляецца. З такім гаварыць — што на вей-вецер.

Якраз пра гэтакага джыгуна расказалі мне сёлета ў Ельнічах, адкуль я родам.

Яўстрата Скачыляса, чалавека ціхманага, мала хто калі ўдзень і бачыць. Мужчына немаладога веку, ён працуе ўжо каторы год калгасным вартаўніком. Нават у цёплыя летнія ночы Яўстрат надзяе кажух і зімовую шапку, адно вуха якой звісае на каўнер, а другое вытыркае наперад, быццам насцярожана ўслухоўваецца ў цішыню, і са стрэльбаю на рамяні прыцемкам выходзіць з хаты. Хоць і негаваркі чалавек, а пачуўшы гурт, ён заўсёды падыдзе, пастаіць, паслухае, а то, бывае, і слова ўставіць і знікне ў цемры гэтак жа непрыкметна, як і паявіўся.

Пра Яўстрата ў Ельнічах ніхто слова благога не скажа. І пра самога, і пра трох яго сыноў. Праўда, толькі пра трох, бо чацвёрты, самы меншы, Юзік — такі ж крутасвет, што проста дзіва, у каго ён і ўдаўся. Можа, таму, што меншых заўсёды болей песцяць і пялегуюць, Юзік з самага малку ўзяў над усімі такую патолю, што нікога не прызнаваў.

Колькі там было таго Юзіка, а як пайшоў у школу, дык дзецям жыцця не стала ад яго. То грымакоў у плечы надае, то выхапіць з чужога партфеліка кніжку і пашматае, то якога кепства ў школе наробіць. Ну, проста вока не спускай з гэтага вісуса! І ні просьбы, ні грозьбы не памагаюць. Пачаў настаўнік бацьку скардзіцца, а Яўстрат усё далікаціцца. Колькі разоў хадзіў перапрошваць за сына, а ўшчуваць шкадаваў, абыходзіўся гаворкаю. А той нібыта і слухае, а выскачыў за парог — і зноў за сваё.

Немаведама, дакуль бы гэта ішлося, каб не здарэнне, якое ўзрушыла ўсю вёску.

Дзяцей якраз распусцілі на лета. Пачыналася самая радасная

пара, калі ўсё наўкола аж кіпіць жыццём. Дрэвы так раскупчасціліся атожылкамі з шырокімі лапушнымі лістамі, што цяжка было знізу разгледзець, што робіцца на верхавіне. А якраз на верхавіне таполі, што расла цераз вуліцу, напроці Яўстратавай хаты, адбываліся важныя падзеі.

Яшчэ напрадвесні Яўстратаў сусед Адам Патрубейка з сынам Толікам усцяглі на таполю старое кола. Вельмі ж Толіку хацелася, каб на таполі пасяліліся буслы. І яны не падвялі хлопца. Прыляцелі, зрабілі сабе дамоўку і атайбаваліся жыць. Даверлівыя да людзей, яны кружылі зусім нізка над хатай, а часам спускаліся і на падворак. З вуліцы можна было бачыць, як спаважна яны пахаджаюць сабе між курэй, скоса пазіраючы на задзірыстага рыжага пеўня, які чамусьці не любіў буслінага панібрацтва.

Калі разумныя, добрыя навасельцы рабілі гняздо, калі выседжвалі малых, а потым, занятыя клопатам з ранку да позняга змяркання, нястомна насілі ім спажыву — у тыя дні якраз паміж Юзікам і Толікам пачалося сяброўства. На першы пагляд, гэта было неспадзяванкай, бо яшчэ зусім нядаўна Юзік не раз хапаўся з Толем загрудкі. Не раз качаліся яны на пераменках сярод школьнага дзядзінца і ўваходзілі пасля званка ў клас з павырыванымі гузікамі, а то і з расквашанымі насамі. І от жа цяпер яны не маглі ўжо адзін без аднаго і дня перабыць. А здружылі іх буслы. Хлопцы вельмі ж упадабалі цікавых і дасціпных птушак і дзень у дзень наглядалі за імі.

Спярша, калі птушаняты былі яшчэ малыя, бусел з бусліхай па адным выляталі з дому, а як дзеці падраслі, адлучаліся ўжо разам і то ледзьве ўпраўляліся, каб удосталь накарміць сямейку.

Хлопцы аж заліваліся ад смеху, як чацвёра цыбатых буслянят прабавалі станавіцца на край гнязда і, спалохаўшыся высачыні, туліліся да маці. А тая сярдзіта клекатала, відаць, сварылася на малых гарэзнікаў.

Аднаго разу Юзік сказаў:

— Ведаеш, Толік, давай узлезем на гняздо і возьмем па бусляняці: я — сабе, і ты.

Толік не згадзіўся.

— Што ты! Яны ж з голаду памруць.

— А мы будзем карміць.

— Як гэта ты будзеш карміць? — пачаў рагатаць Толік.— Хіба будзеш на балоце жаб лавіць ды ім насіць?

Юзік не мог трываць, калі з яго хто смяяўся. Тады ён нахмурваў бровы і адно кідаў злосныя позіркі.

— Ведаю, чаму ты не хочаш!..— ускіпеў ён.— Ты думаеш, што гэта твае буслы? Твае, га?.. А я от вазьму і скіну к чорту ўсё гэтае кола!..— і Юзік, ухапіўшыся аберуч за ніжні сук, спрытна падцягнуўся і палез па шурпатым камлі ўгару.

— Не дам! — закрычаў Толік.

Ён падбег і з усяе сілы тузануў Юзіка за кашулю. Той шарганўўся тварам аб кару і аб'ехаў уніз. Усхапіўшыся на ногі і адчуўшы, як балюча шчыміць падрапаны твар, Юзік гатоў быў рынуцца з кулакамі на свайго нядаўняга сябра. Але Толік паспеў ужо ўскочыць

у сенцы. Юзік пачуў, як бразнула клямка, а перад самым яго носам шчоўкнула і засаўка.

— Папомніш ты мяне, Патрубейчык! — памахаў кулаком перад дзвярыма раз'ятраны Юзік.

— Юзік — адарваны гузік! — смела абазваўся з-за дзвярэй Толік і палез на вышкі. А там, стаўшы ля круглага акенца, якое з-пад лабка выходзіла на вуліцу, пачаў цікаваць, што ж будзе рабіць Юзік.

Чакаць доўга не прыйшлося. З Патрубейкавага двара Юзік кінуўся ў свой. З малога акенца Толю добра было відно, як ён ускочыў у свае сенцы і, не бавячыся там, выбег назад. У руках у Юзіка была стрэльба. Не самаробная, не выструганая з палена, з якімі яны яшчэ нядаўна гулялі ў партызан, а сапраўдная, тая, з якой Яўстрат Скачыляс хадзіў на начную варту.

Толік ад нечаканасці аж сумеўся: што ён надумаў, гэты шаленец? А Юзік, выйшаўшы з варот, стаў, падняў стрэльбу і навёў яе... Куды б, вы думалі? У самы лабок Патрубейкавай хаты, у самае акенца, за якім стаіўся Толік.

— А-а-а! — немым голасам закрычаў Толік і грэйма кінуўся з вышак у хату.— Татачка, міленькі! Юзік хоча мяне застрэліць! — ледзь паспеў вымавіць ён.

І ў гэты час грымнуў стрэл. Пачуўся спалоханы крык Яўстрацяхі, Юзікавай маці:

— А за што ж ты яго, Юзічак? А ці ж ён табе замінаў? А ці ж ён табе свет заступіў? Гэта ж такое няшчасце на маю галаву-у-у!..

Толеў бацька, не цямячы, што здарылася, здзіўлена ўтаропіўся ў сына. А Толік, з палёгкай уздыхнуўшы, весела закрычаў:

— Ён у мяне не пацэліў! — і кінуўся з хаты на двор.— Ён мяне не забіў, цётка Настуся! — крыкнуў Толік Юзікавай маці і ў гэтую ж хвіліну ўбачыў самога Юзіка. Той, увесь спалатнелы, з апушчанай галавой стаяў каля свайго агародчыка. Стрэльба ляжала каля яго ног. Толіку так шкада зрабілася свайго сябра, што ён не вытрымаў.

— Юзік...— паціху паклікаў ён.

Юзік нават не паварушыўся.

— А-а, дык ты яшчэ і шкадуеш гада такога!— пачуў Толя дакор сваёй другой суседкі і толькі цяпер убачыў, што каля вулічных акон іх хаты сабраўся цэлы натоўп. Паміж людскіх галасоў Толік чуў устрывожаныя пытанні і гнеўныя адказы:

— Хто гэта яго?

— Яўстратаў, хто ж яшчэ можа.

— А родненькія мае! І як у яго рука паднялася?

— У яго спытай. Бачыш, вунянё стаіць ля падваротні і зыркае спадылба, як ваўчаня...

Услухоўваючыся ў людскую гаману, Толік яшчэ раз паглядзеў на Юзіка. Сэрца яго сціснулася ад жалю. Ён ніяк не мог уцяміць, чаму людзі з такім гневам гавораць пра хлопца. «Ну, можа, у злосці ён і падумаў быў, каб забіць мяне. Але ж як ён, небарака, цяпер мучыцца, як ён перажывае...»

І Толік павярнуўся да натоўпу. Ён хацеў закрычаць людзям: «Глядзіце, вось жа я! Жывы!», але словы так і захлынуліся ў горле.

Тое, што ўбачыў ён у гэтую кароткую хвіліну, было самым страшным. Страшнейшым за тое, што ён думаў.

Людзі расступіліся. Пасярод вуліцы ляжаў бусел. Падкурчыўшы пад сябе пасінелыя ногі і выцягнуўшы доўгую дзюбу, ён шырока распластаў свае крылы, быццам намагаўся яшчэ падняцца. Але падняцца не мог. Ён быў мёртвы.

Толік адчуў, як хістанулася вуліца. Вялізныя цёмныя абручы паплылі перад ім. Каб не ўпасці, ён стуліўся ўвесь і здаўся сабе зусім маленькім і бездапаможным. Але з усяго цяжару, які зваліўся на яго, Толік выразна адчуў толькі, што ў гэты спякотлівы дзень раптам зрабілася холадна, як зімою.

Ён не памятаў, як бацька завёў яго ў хату, не чуў, як гаварылі, што Юзік, выскачыўшы са стрэльбаю, сам яшчэ не ведаў, што будзе рабіць. Ён ірваўся адпомсціць сябру. І, убачыўшы бусла, які ляцеў над самай хатай Патрубейкавых, злажыўся і ўсадзіў у яго цэлы набой шроту.

Вуліца гула, як устрывожаны вулей. Калгаснікі сарамацілі і дакаралі Яўстрата і Настусю Скачылясаў, а каторыя дык адкрыта казалі, што такому шыбеніку, як іх сын, не можа быць месца ў Ельнічах, што ад такога немаладу якой можна бяды дачакацца. І каб Юзік не ўцёк, то невядома, як бы ўся гэта гаворка і павярнулася.

За сваімі трывогамі людзі і не заўважылі адразу, якая трывога ахапіла чыстае летняе неба. Над вуліцаю, над старою таполяю Патрубейкавых у адчаі і роспачы клекатала ўжо не адна асірацелая бусліха, а цэлая чарада буслоў, што дазналася пра няшчасце. Малыя бусляняты стаялі галодныя ў гняздзе і палахліва туліліся адно да аднаго. Растрывожаныя буслы лёталі ўжо траха не над самымі галовамі людзей. Пэўна, з усіх паселішчаў, з усіх вёсак зляталіся яны сюды. І як толькі людзі разышліся, буслы адразу ж апусціліся на вуліцу. Яны абступілі нябожчыка, і доўга не сціхаў іх журботны клёкат.

Людзі, прыпаўшы да шыбаў, глядзелі на вуліцу. Патрубейчыха, пад вокнамі якой адбывалася гэтае сумнае развітанне, не вытрывала, выбегла і загаласіла:

— А людцы, а суседзейкі, а нешта ж трэба рабіць...

Яўстрат Скачыляс выйшаў са свайго двара з рыдлёўкаю. А за ім на тым жа часе высыпалі з хат і старыя і малыя. Буслы залапаталі крыламі, падняліся і зноў пачалі кружыць у паветры.

Скачыляс падышоў да забітае птушкі, уткнуў рыдлёўку ў задзірванелую вулічную абочыну і стаў капаць яму. Усе бачылі, што маўклівы Яўстрат пакутліва перажываў няшчасце і невыказную крыўду на сына. І гатоў быў хоць гэтым цяжкім абавязкам павініцца перад людзьмі і перад горкім сумленнем.

— А Яўстратачка ж ты мой! — пляснула рукамі Патрубейчыха.— А што ж ты надумаў... А не па-суседску ж ты, галубок, робіш...

Скачыляс кінуў капаць. Ён не разумеў, чым яшчэ мог пакрыўдзіць суседку.

— Гэта ж на век вечны перад самымі нашымі вокнамі такі цяжкі дакор будзе. А за што? Хіба ж мы вінаватыя? — заплакала Патрубейчыха.

І ўсе згадзіліся: сапраўды, гэта было б чорнай несправядлівасцю.

Яўстрат пастаяў, падумаў, абвёў вачыма натоўп, нагнуўся над буслам, падняў яго, прыхапіў рыдлёўку і выправіўся ў самы канец свайго агарода. Людзі цераз Скачылясаў двор рушылі ўслед за гаспадаром. Каля густога вішняку, дзе толькі што пачыналі на пробу капаць маладую бульбу, Яўстрат пахаваў бусла. Доўга маркотныя, прыціхлыя птушкі сноўдаліся на Яўстратавым агародзе, не баючыся людзей, і ў роспачы лапамі граблі свежае бульбянішча.

Надвечар з гнязда скінулася двое буслянят. Яны яшчэ не паспелі ўвабрацца ў пер'е. Цяжка было сказаць, ці то не вытрымалі яны вялікага гора, ці то зацякліся за цэлы дзень з голаду. Хутчэй за ўсё бусліха, ведаючы, што цяпер адна не выкарміць сям'ю, сама асудзіла іх на пагібель. Але бусляняты былі жывыя. Калі Толік, узрушаны гэтым новым няшчасцем, унёс малых у хату і накарміў пшоннаю кашаю, а потым пасадзіў у запечку і накрыў кажушком, яны павесялелі і дзюблікамі пачалі скубці яго за рукавы...

Пасярод ночы, калі ў Патрубейкавых спалі, у акно пастукалася Юзікава маці.

— Толік! — трывожна паклікала яна.

Толік усхапіўся з ложка і выбег на двор.

— А мой жа ты Толічак, мой залаценькі. Няма ж нашага Юзічка, і не ведаем, дзе шукаць. Бацька з ног збіўся...

І хоць на вуліцы было не так і цёмна, Толік вярнуўся ў хату і запаліў ліхтар «лятучая мыш». А Яўстраціха, як апантаная, зноў кінулася да свае хаты. Не знаходзячы прыстанку, яна тупала босымі нагамі вакол круглага каменя, што ляжаў ля сенечных дзвярэй, і, плачучы, прычытвала сама сабе.

— А як жа ж таго дня дачакацца... А я ж ужо ўсіх сваіх абабегала... А хлопчык жа ты мой, а любенечкі,— заплакала яна яшчэ галасней, убачыўшы Толіка з ліхтаром.— А каб жа ж ён хаця чаго не надумаў... А прабягу ж я яшчэ па людзях, а мо што прачую...— і вуліцаю падалася ў цемру ночы.

Толік завярнуў у Яўстратаў двор. Не на жарт устрывожаны, куды мог знікнуць Юзік, ён успомніў, з якім вінаватым выглядам стаяў яго бяздумны сябрук удзень перад людзьмі. Абавязак сяброўства, няхай сабе нялёгкага і крыўднага, вымушаў Толіка зараз жа, не бавячыся ні хвіліны, ісці на гэтыя начныя пошукі.

Перш за ўсё Толік палез на гарышча Яўстратавай хаты. Каля акенца ў лабку ён пераканаўся, што Юзік доўга стаяў тут. Абярэмак леташняй саломы быў нашчэнт перацёрты нагамі. Значыць, Юзік да самых прыцемкаў чуў і бачыў адгэтуль усё, што адбывалася на вуліцы і на двары.

Спусціўшыся па лесках з вышак і высвечваючы перад сабою ліхтаром дарогу, Толік выйшаў на падворак. У палахлівай нерашучасці ён спыніўся ля калодзежа, пастаяў можа з хвіліну, потым, так і не зазірнуўшы ў яго цёмную прорву, адкінуў лёгкія плеценыя веснічкі і разораю падаўся ў канец агарода. Збіваючы каленьмі халодную расу з бульбяніка, ён неўзабаве дайшоў да таго месца, дзе Яўстрат пахаваў бусла.

Зыркі круг ліхтара ўпаў на невялікі прагалак каля вішняку. Так, Юзік быў тут. Угнуўшы плечы, ён сядзеў на вытаптаным, учарнелым грудку, а непадалёк ад яго ў разоры на адной назе стаяла бусліха. З высокага бульбяніку выткнулася яе галава. І Толік убачыў, як ад рэзкага святла бусліха на момант заплюшчыла вочы і адразу ж зноў адкрыла іх — самотныя і дакорлівыя.

Юзік не паварухнуўся. Нахіліўшыся з ліхтаром, Толік убачыў, што хлопец як бы застыў у знямеппі. А можа, ён спаў? Праўда, Толя яшчэ ніколі не бачыў, каб спалі з адкрытымі вачыма. Гэта была тая цяжкая гадзіна ў жыцці яго сябра, калі ён упершыню сам зазірнуў у сваю яшчэ незразумелую, збітую з тропу душу, якая цяпер ужо не магла так лёгка супакоіцца і бесклапотна знябыцца.

Толік крануў сябра за плячо. Юзік маўчаў. Тады Толік схапіў яго за локаць і з усяе сілы пацягнуў за сабою.

Юзік падняўся. Як малое дзіця, што толькі-толькі намагаецца рабіць першыя крокі, няўпэўнена перастаўляючы ногі, ён паслухмяна пайшоў за Толікам. Так ішлі яны моўчкі адзін за адным разораю, потым дваром аж да самае хаты Скачылясаў. Ля сенечнага парога Юзік ледзь чутна вымавіў:

— Што ж цяпер будзе, Толік?

— Не ведаю.

Яны абодва змоўклі і доўга не абзываліся. Потым Толік падняў шкляны каўпак ліхтара і патушыў святло. З вішнёвага зарасніку выбіваўся ранні досвітак.

— Так яна там і прастаяла ўсю ноч?

— Усю ноч,— вінавата ўнурыўся Юзік.

— А двое малых сядзяць у мяне ў запечку. Упалі з гнязда,— сказаў Толік.— Прыйдзецца гадаваць.

— Прыйдзецца,— згадзіўся Юзік.

## ЛІДАЧКА І ХМАРА

— Мамка, я цябе парадую,
Ёсць усім загад такі:
Брыгадзір сказаў па радыё
Нам ісці на буракі!

— Лідачка,— спытала мама,—
А хіба ж табе таксама?
— Ён сказаў: — Усе ідзеце —
І дарослыя, і дзеці.

Пойдзем грамадой вялікай
Ратаваць наш агарод.
Кожны хай бярэ матыку —
Там такі парос асот,
Малачай і лебяда —
Проста гора і бяда.

На праполку, на праполку!
Не спазніцца нам бы хоць.
Нездарма ж і перапёлка
Звала звечара: — палоць!

— Ты, дачушка, і падняць
Не адолееш матыкі.
— Мамачка, я буду рваць
Той асот і пырнік дзікі.

Добра знаю я свірэпку,
Жоўтую яе бярэтку,
Крапіву, іванаў чай,
І драсён, і малачай.

Бач, ужо выходзяць людзі.
Мамка, і мяне вазьмі.

Табе сорамна не будзе
За дачку перад людзьмі.

Узяла матуля дочку,
Полудзень, вады біклажку...
— Вось вам вашыя радочкі
На дваіх — не будзе цяжка? —

Глянуў добрымі вачыма
Брыгадзір, не строгі з віду,—
Колькі ж год табе, дзяўчынка?
— Пяты,— адказала Ліда.

Заняла радок, пагнала.
Паляцелі ў завірусе
Сівыя з асота вусы
І бярэткі
Са свірэпкі,
Нават вушы з малачая...
Лідка ажно заспявала:
— Мама, я радок канчаю!

Толькі што гэта за ліха —
На другім радку прыціхла.
Здаўся ён такі бясконцы,
Што прыцьмела нават сонца.

— Мусіць, мамка, канчаць трэба.
Бач, замурзваецца неба?
Расце хмара — будзе дождж!
Глянуў брыгадзір: — Ну што ж,

І на хмару ёсць управа.
Тут такая, Лідка, справа,
Каб знайшоўся ў нас ахвотнік,
Добры, кемлівы работнік —
Завярнуў бы хмару тую,
Хай у іншы бок прастуе...

— Я пайду і завярну! —
Падахвоцілася Лідка,—
А ў якую старану?
— Лідка, як табе не брыдка,—
Дзядзька брыгадзір жартуе...

Брыгадзір нібы не чуе:
— Куды хочаш завярні,
Абы нас яна мінула.
Бачыш, як хвастом крутнула,
Быццам джгаюць авадні?

Паглядзі — зусім жа нізка,
Як дастаць рукою — блізка.
Не паспееш носа ўцерці,
Зможаш граблямі падперці.

Пакуль ногі не паслаблі,
Ухапіла Лідка граблі,
Пайшла хмару падпіраць,
Брыгадзіру памагаць.
А назад — узлескам, лугам
Выбегла на сенажаць.
Тут касцы насустрач — цугам,
Косы вострыя звіняць.
— Куды, Лідачка, хадзіла?
— Па загаду брыгадзіра
Вунь на самы край зямлі,
Дзе дугой гарыць вясёлка.
Нашы сённячы змаглі
Ўправіцца-такі з праполкай!
Брыгадзір наш будзе рады,
Я дала ўсё ж хмары рады:
Граблямі яе прыгнула
І на захад павярнула...

Што было, тое было,
Не было, дык быць магло.
Па душэўным абавязку
Стаўлю я дзяўчынку ў казку,
Бо дазнаўся кагадзе:
Наша Ліда ўсім на дзіва
Зарабіла ў брыгадзіра
Аж дзве нормы за той дзень!

## СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ

**Станіслаў Пятровіч Шушкевіч нарадзіўся 19 лютага 1908 г. у вёсцы Бакінава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Вучыўся ў Сенніцкай пачатковай школе, у 11-й працоўнай Мінскай сямігодцы, пасля заканчэння якой у 1926 г. паступіў у Белпедтэхнікум. У гэтым жа годзе стаў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Правучыўшыся два гады, будучы паэт уладкаваўся на працу спачатку ў Кніжнай**

палаце і Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, а потым стаў загадчыкам бібліятэкі Навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі (1928—1931). У 1934 г. скончыў крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Беларускага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага інстытута (цяпер Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага), вучобу ў якім сумяшчаў з працай у газеце «Літаратура і мастацтва». Пасля заканчэння інстытута быў накіраваны ў рэдакцыю газеты «Калгаснік Беларусі» (1934—1935), потым працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда» (1935—1936). З канца 1936 г. жыў у Сібіры, працаваў у розных геалагічных экспедыцыях. У 1956 г. пераехаў у Мінск, працаваў у рэдакцыях газет «Мінская праўда» (1956—1958), «Літаратура і мастацтва» (1958—1970).

Першыя вершы С. Шушкевіча ўбачылі свет на старонках часопіса «Маладняк» ў 1924 г. З гэтага часу творы маладога паэта пачалі часта з'яўляцца ў рэспубліканскіх часопісах і газетах. У 1934 г. выйшла яго першая кніга «Вершы», потым — «Дарогаю вясны» (1959), «Услед за ма́рамі» (1961), «Навальніца» (1966), «Сябрам» (1972), «Сонца над маім асеннім садам» (1987). У 1968 г. выйшла кніга артыкулаў і ўспамінаў С. Шушкевіча «Вяртанне ў маладосць», у якой змешчаны каштоўныя звесткі пра жыццё і творчасць М. Чарота, З. Бандарынай, М. Гарэцкага, Ю. Таўбіна, А. Бабарэкі, З. Астапенкі, У. Жылкі, Я. Пушчы і іншых пісьменнікаў. Пяру Шушкевіча належыць зборнік сатыры і гумару «Грушы на вярбе» (1969).

Для юных чытачоў С. Шушкевіч пачаў пісаць у канцы 20-х гг. У 1929 г. на старонках часопіса «Беларускі піянер» была змешчана яго казка «Звярыны баль», асобнай кніжкай выдадзеная ў 1936 г. Дзецям паэт прысвяціў свае кнігі вершаў і казак «Лясная калыханка» (1958), «Сарочы церамок» (1959), «Мы на змену ідзём» (1961), «Гара Марата Казея» (1963), «Будзільнік» (1966), «Вясёлыя дзятлікі» (1970), «Колькі кіпцікаў у кошкі» (1972), «Дванаццаць пасланцоў» (1973), «Красавік» (1977), «Барадаты камар» (1977), «Ліса з магнітафонам» (1979), «Казачны церам» (1983), «Едзе страшная Яга» (1985), «Казёл на верталёце» (1987).

С. Шушкевіч расказаў дзецям пра подзвіг Героя Савецкага Саюза піянера Марата Казея ў кнізе «Апавяданні пра Марата Казея» (1968; 2-е, дапоўненае выданне — 1988).

## ЛЯСНАЯ КАЛЫХАНКА

На бярозцы пры гасцінцы
Птушаняткі на галінцы.
Ну а ветрык, як знарок,
Хіліць голлейка набок.
Ах ты, ветрыку мой,
Птушаняткам дай спакой!
Люлі-люлі! Люлі-люлі!
Невялікія заснулі.
Лісце, збожжа, кветкі, травы
Кропіць дожджык неласкавы.
Сыпле, сыпле ад паўдня,
Мочыць бедных птушанят.
Ах ты, дожджыку мой,
Птушанятам дай спакой!
Невялікія заснулі.
Люлі-люлі! Люлі-люлі!
І кляночкі, і асіны,
І сосонкі, і яліны,
І рабіна, і дубок —
Зашумеў увесь лясок.
Ах, лясочак ты мой,
Птушанятам дай спакой!
Люлі-люлі! Люлі-люлі!
Невялікія заснулі.

## КУЗНЯ

Звон ад кузні на ўсю даль —
Тут каваль гартуе сталь.
Вылятаюць з горна іскры,
Мех кавальскі дыша быстра.
Ці-ку, ці-ку! Ці-ку-так! —
Малаточак б'е у такт.
Ля старога неадлучна
Завіхаецца падручны.
Дзінь-бух-ах! Дзінь-бух-ах! —
Ходзіць молат у руках.
Малаточак па кавадле
Звоніць дружна і заядла.

Паглядзі — і ўжо гатовы
Коням новыя падковы.
Толькі коней прывялі —
Падкавалі кавалі.
І гатова для вуздэчкі
Серабрыстая насечка.
Тут завеса, тут замок,
Тут акованы вазок,
Тут матыка, плуг, тапор —
Навалілі поўны двор...
Вылятаюць з горна іскры,
Мех кавальскі дыша быстра.
Ці-ку, ці-ку! Ці-ку-так!
Малаточак б'е у такт.

## КАЗКА-БЫЛЬ ПРА РЭПКУ

Бабку не прасілі,
Не прасілі дзедку,
Самі пасадзілі
Ў чыстым полі рэпку.

Ды на гэтым полі
Болей не бывалі,
Рэпку не палолі
І не палівалі.

Надыходзіць восень,
Як там з ураджаем?..
Гуртам бабку просім,
Дзеда запрашаем.

На пустым прагале,
Між хвашчу, асоту
Ураджай шукалі
Да сёмага поту.

Ураджай сабралі
У крысо паспешна.
Доўга рагаталі,
Хоць было не смешна.

Рагатала бабка,
Рагатала ўнучка,
Нават курка рабка
Сакатала гучна.

Сучка забрахала
Каля сваёй будкі.
Рэпы было мала,
Ўся была танюткай.

Смешна было мышцы,
Хвосцікам круціла,
Рэпка з вішню ў лыжцы,
Корань, нібы шыла!

Бабку не прасілі,
Не пазвалі дзедку,
Самі ж пасадзілі
Ў чыстым полі рэпку!

## ЖУРАВЫ

Як пачулі журавы
Шум асенні баравы,
Паляцелі на імшары,
Пазбіраліся па пары,
Сталі дружна ў карагод,
Цешаць танцамі народ.
— Гэй, цыбатыя танцоры,
Вам ляцець у вырай скора!
Не таміце лёгкіх ног,
Не тапчыце мох, быльнёг.
Не тапчыце, журавы,
На балоце журавін.

## КОЛЬКІ КІПЦІКАЎ У КОШКІ

Я хацела падлічыць,
Колькі кіпцікаў у кошкі.
Мурка рвецца і мурчыць,
Пад сябе хавае ножкі.
Раз, два, тры, чатыры, пяць...
Пяты кіпцік не відаць.
Нельга Мурку утрымаць,
Я кладу яе на спінку.

Пяты кіпцік не відаць.
Лапку круціць без упынку.
  Раптам чую моцны боль,
  Нібы ў рану сыплюць соль.
Я бягу пад умывальнік
Мыць руку і кроў суняць.
Мама выбегла са спальні,
Пачынае дакараць.
  Пяць драпінь драпінь відаць...
  Раз, два, тры, чатыры, пяць...

## ХРЫПАТЫ ПЕЎНІК

Захварэў пявун, ахрып,
Пэўна, ў пеўня страшны грып.
Маці — курыцу-квактуху —
Не любіў, крыклівы, слухаць.

Ён хадзіў па садзе босы,
Абтрасаў на траўцы росы,
Пасля гульняў, прапацеўшы.
Ён крычаў, на плоце сеўшы.

Па халодных лазіў лужах,
Вось таму і занядужаў.
Мо ангіна, можа грып?
Захварэў пявун, ахрып.

## ЛІСА З МАГНІТАФОНАМ

Купіла Ліса дарагі магнітафон, збіралася не толькі слухаць прыемную музыку, а — і пэўную карысць мець. Але... Але не збыліся мары Лісы.

Ідзе яна праз гай. Чуе салаўіную песеньку. Здымае магнітафон, ставіць пад дрэвам і запісвае цудоўныя спевы. Убачыў гэта Салавей, узмахнуў крыльцамі і ўзляцеў на самую верхавінку дрэва. Ліса просіць Салаўя спусціцца ўніз і сесці ля мікрафона. І што ж вы думаеце? Салавей адказаў ёй проста і нават грубавата:

— Няма дурных, шаноўная Лісачка!

— Мілы Салоўка,— схіліўшы галаву, праз зубы працадзіла Ліса,— ды я ж хачу ўвекавечыць непаўторны талент. Запішу твой голас на стужку і аддам яе на вечнае захаванне Крату. Праз сотні год пачуюць нашчадкі твой голас.

— Мне векавечная слава не патрэбна,— кажа Салавей.— Ідзі прэч са сваёй катрынкай!..

Пайшла Ліса ў бярэзнічак і з такой жа просьбай звярнулася да вясёлай Берасцяначкі. А тая махнула хвосцікам, ціўкнула і паляцела ў гушчар.

— Які з гэтых птушак наедак? — буркнула сама сабе Ліса і пайшла ў глухі лог. Знайшла там знаёмую сцежку і падалася да старога Ваўка. Ліса была ў яго на тым тыдні, прасіла, каб ён дапамог выселіць старога Барсука з яго новай кватэры, але Воўк не згадзіўся, сказаў, што за грубасць яго могуць сурова пакараць. А цяпер Ліса цешыла сябе думкаю, што ашукае Ваўка, зробіць так, што ён ні аб чым не здагадаецца.

Стукаецца ціха ў Воўчыя дзверы Ліса, пытае, ці можна зайсці.

— Калі ласка, заходзь, кума! — кажа Воўк.— Якія навіны прынесла, што добрае чуваць?

— Вось бачыш, дружа, з магнітафонам завітала да цябе, хачу твой голас запісаць на стужку, а пасля аддаць яе на вечнае захаванне

Крату. Праз сотні год пачуюць нашчадкі твае слова, ацэняць твой талент.

— Дык што ж мне зрабіць? — пытае Воўк.

— Ты, паважаны, спачатку моцна-моцна завый! Я чула калісьці, як ты склікаў сваякоў. О, які ў цябе быў магутны голас!

Воўк завыў, ды так, што ажно магнітафон затросся.

— А цяпер, мой міленькі,— шэпча Ліса Воўку на вуха,— скажу па сакрэту. Я пасварылася са сваім мужам і сказала, што не буду з ім размаўляць. Хачу неспадзяванку зрабіць. Загаворыць да мяне муж, а я да яго ні слова. Загаворыць другі раз, а я магнітафон уключу, і пачуе ён твой грозны голас:

Надакучыў ты без меры,
Уцякай з маёй кватэры!..

— Дык што ж мне зрабіць? — зноў пытае Воўк.

— А ты, мой даражэнькі, разоў дзесяць паўтары тое, што я табе ўжо сказала:

Надакучыў ты без меры,
Уцякай з маёй кватэры!..

Вые Воўк перад мікрафонам, паўтарае слова ў слова тое, што яму Ліса сказала. Хітруха сочыць за ім і аж трымціць ад радасці.

Скончыла Ліса запіс Воўчага голасу, закінула магнітафон за плечы і пабегла наўпросткі ў дубнячок да Барсуковай хаты. Пачуў Барсук, як Ліса цяжка сапе, падымаецца на пагорак. Глянуў праз шчылінку ў дзвярах на нязваную госцю і гадае, што яна рабіць будзе.

Прабралася Ліса ў хмызнячок ля Барсуковай хаты, паставіла там магнітафон і завяла яго, а сама шмыгнула ў лес.

Пачуў Барсук спачатку прыгожы салаўіны голас, пасля ціўкнула некалькі разоў Берасцяначка, а ўрэшце пачулася пагрозлівая Воўчая песенька:

Надакучыў ты без меры,
Уцякай з маёй кватэры!..

Смешна стала Барсуку. Паклікаў ён жонку, расказаў пра Лісіныя хітрыкі, і яны скемілі, што трэба зрабіць. Прынеслі магнітафон у хату і зрабілі на магнітафоннай стужцы кароценькі адказ Лісе. Магнітафон зноў вынеслі на старое месца, а самі селі за стол каву піць і свежую газету чытаць.

Ліса думала, што яна напалохае Барсука Воўчым голасам, што Барсук збярэ свае рэчы і ўцячэ з новай кватэры. Вярнулася да Барсуковай хаты, чуе праз дзверы вясёлыя галасы і дзівіцца:

— Няўжо я яго не напалохала?.. А можа, ён нічога не чуў?..

Прывалакла Ліса магнітафон пад дзверы, схавала ў зеляніне, завяла, а сама недалёка за кусцікам прысела.

Чуе Ліса з магнітафона голас Салаўя і Берасцяначкі, пасля выццё Ваўка, а ўрэшце пачула насмешлівую Барсукову песеньку:

Бяры хутчэй магнітафон,
Бяжы ты з хаты маёй вон.

Зразумела Ліса, што і Барсук ужо ў магнітафоннай тэхніцы разбіраецца, што яго не так лёгка ашукаць і напалохаць. Ускінула Ліса магнітафон на плечы і паплялася дадому.

Прыйшла стомленая, галодная. У пярэднім пакоі паставіла на стале магнітафон, а сама легла ў спальні спаць. Нават дзверы забылася зачыніць.

Тым часам праходзіў каля Лісінай хаты Мядзведзь. Парашыў ён зайсці да суседкі. Глянуў у расчыненыя дзверы, бачыць, магнітафон на стале стаіць, а гаспадыня ў спальні спіць і нічога не чуе. Надумаў Мядзведзь пажартаваць з Лісы, завёў магнітафон, а сам у мяккай канапе расселўся.

Чуе Мядзведзь прыемны голас Салаўя і Берасцяначкі, а пасля Воўчы голас, а нарэшце і Барсук загаварыў:

Бяры хутчэй магнітафон.
Бяжы ты з хаты маёй вон!

— Ну, калі просяць, дык і зробім гэтак,— сказаў Мядзведзь. Узяў магнітафон і пайшоў з ім у свой дом-бярлогу.

Аж пад раніцу прачнулася Ліса, глянула на стол, а магнітафона няма. Горкімі слязамі заплакала яна, пачала прыгаворваць:

— Гэтулькі грошай аддала, а карысці аніякай. Цяпер свет такі стаў, што звяры і птушкі парабіліся мудрэйшыя за мяне.

Воддаль у лесе спяваў Салавей, ціўкала Берасцяначка, а Барсук клікаў сваіх дзетак на снеданне.

## ДВАНАЦЦАЦЬ ПАСЛАНЦОЎ

Аж дванаццаць пасланцоў
Новы год прывёў да нас
І для гэтых малайцоў
Даў наказ.

Студзень ёлку каб прынёс,
Падарункаў поўны мех,
І сказаў, каб Дзед Мароз
Не спазніўшыся прыбег.

І прыбыў бялюткі дзед
З серабрыстай барадой,
Сыпле срэбра на ўвесь свет,
Дыяментаў сыпле рой.

Цацак з тысячу на ёлку
Нам развесіў чараўнік,
Заіскрыліся іголкі
Ў дзіўным казачным агні.

З-за гары прыходзіць люты
Цераз поле, нацянькі,
І спытаў, ці мы абуты
І ці ёсць у нас канькі.

Сакавік вясёлы крочыць,
Гоніць прэч завеі, снег.
І ручай ужо ракоча,
І чуваць дзіцячы смех.

Красавік раскрыў пупышкі
На галінах ціхіх дрэў,
У лясным глухім зацішку
Зазвінеў птушыны спеў.

Завітаў зялёны май,
Песні працы паліліся.
Брату брат руку падай,
Вышай сцяг чырвоны ўзвіся.

Пышны чэрвень скалыхнуў
Нівы жытам і пшаніцай,
І касцам тут не да сну —
Травы аж да паясніцы.

Ліпень спеліць збажыну,
Пасланец гарачы, дбайны,
Жнівень кажа: — Я сажну
Збожжа усё сваім камбайнам.

Вось і верасень прыбыў,
Прывалок дажджы аднекуль,
Хоць касой касі грыбы,
Так бывае век ад веку.

А кастрычнік сцеле лён,
Бульбе робіць ён дакопкі,
У садах збірае плён —
Горы яблыкаў салодкіх.

Надышоў і лістапад
З найвялікшым нашым святам,
Ён атрос ад лісцяў сад,
Іней вывесіў, як вату.

Снежань снежны тут як тут,
Гурбы белыя наўкола,
Пабяліў ён кожны кут,
Кожны дом, узвышшы, долы.

Кожны раз нам Новы год
Шле сыноў сваіх багатых,
І заўжды яго прыход
Лічым мы вялікім святам.

Кожны раз у гэты час
На ялінах ззяюць зоры,
Пасланцы яго бягуць
На шчаслівыя прасторы.

**СМУТКУЮЧЫ, ЦВІЛІ КВЕТКІ...**

Гэтую кветку называюць сном. Кветка-сон... Яна цвіце разам з пралескамі, расце на беднай пясчанай зямлі, любіць бор. Сыдзе снег, і адразу ж выскачыць з зямлі, гляне ў неба і схіліць сваю сінюю або цёмна-фіялетавую аксамітную галоўку. Здаецца, слухае, як ціха шумяць сосны, як спяваюць берасцянкі, як у сонечнай воддалі ў першай рэдкай зеляніне адрывіста кукуе зязюля.

І цяпер кукуе яна, седзячы на гнуткай вербалозіне, кукуе неспакойна, трывожна. Яе няхітры спеў перабіваецца гучным іржаннем. Вольныя коні, без вуздэчак, з потнымі палосамі ад сядзельных папруг, імчацца па лясной сцяжыне хутка і шумна, нібы яны збіраюцца перагнаць далёкае рэха заляснымі абшарамі. Яны трушчаць бліскучымі капытамі шыгалле, топчуць леташняе перапрэлае лісце, месцамі выбіваюць з лужын залацістыя пырскі, стройна задзіраюць уверх галовы і раскаціста ржуць. Куды ж бягуць яны, каго шукаюць, кагоклічуць?

Гучнае ржанне палохае птушак, перарывае голас зязюлі. Здаецца, уздрыгваюць дробненькія зялёныя лісточкі на бярозах, ападаюць пушыстыя коцікі на лозах, толькі кветка-сон спакойна ўглядаецца ў маладыя парасткі травы. А коні бягуць па лесе. На далёкім Харомінскім полі чуваць адзіночныя вінтовачныя стрэлы, татахкаюць з перарывамі аўтаматы, некалькі разоў грымнулі выбухі гранат.

Ці не гэтыя выбухі напалохалі коней, ці не ад іх уцякаюць яны і гучна ржуць?

Не раз чулі коні стрэлы, не раз пад градам куль імчаліся на іх смелыя партызаны. Былі бясстрашнымі лясныя салдаты, былі шалёна шпаркімі коні. Не баяліся ні стрэлаў, ні выбухаў.

Вусцішна ржуць хутканогія ў лесе. Іх голас далёка аддаецца рэхам. Не гукамі вайны напалоханы коні. Ім страшна стала, што не адклікаецца на іх зычны покліч вараны сябар Орлік, які, нібы пушынку, насіў юнага разведчыка Марата Казея, не адклікаецца грузны

буланы стаеннік, які, здавалася, аж угінаўся пад камандзірам разведкі брыгады Уладзімірам Ларыным.

Палі Орлік і буланы, пранізаныя дзесяткам гарачых куль, на Харомінскім узгорку. Перадсмяротны іх стогн пачулі хутканогія ў лесе. Коні здалёк чуюць небяспеку. Як рана рассядлалі іх партызаны, як не ў пару пусцілі гуляць па лясных палянах. Ой, як патрэбна цяпер дапамога Марату Казею і Уладзіміру Ларыну!..

— Бяжыце, родныя, бяжыце! Можа, вас убачаць, можа, пачуюць, можа, дазнаюцца ў лесе сябры пра небяспеку.

Упаў верны Орлік, упаў грузны буланы прыгажун стаеннік. Ды не кранулі кулі разведчыкаў.

Кінуліся Марат Казей і Уладзімір Ларын у баразну з напагатове выстаўленымі аўтаматамі і ўбачылі, як з усіх бакоў на іх пруць азвярэлыя фашысты, як замыкаюць і звужваюць кола. Вось і яны ўжо блізка за кустамі, вунь ужо выразна відаць сталёвыя каскі і расхрыстаныя плямістыя плашч-палаткі. А там, унізе, лагчына аж кішыць варожымі салдатамі. Адкуль іх столькі набралася?

— Валодзя! — усклікнуў Марат.— Будзем прарывацца да лесу!

Да лясных зараснікаў, здавалася, зусім блізка. Але кожны метр тоіць небяспеку, кожны метр трэба прапаўзці на вачах у ворага.

Прыглушана залапатаў аўтамат Марата, кароткімі чэргамі біў аўтамат Уладзіміра. Нямецкія салдаты ў адным месцы падаліся назад. Двое з іх упалі і ляжаць, раскінуўшы рукі... Можа, яны прытварыліся? Можа, жывыя? Не... яны выпусцілі з рук зброю.

Марат чуе, як над галавою свішчуць кулі. Чаму ж ні адна куля не кранулася зямлі? Марат і Уладзімір падбіраюцца да каржакаватай бярозкі, трошкі далей ад яе на пясчаным пагорку — кусты ядлоўцу. Зразаюць варожыя кулі дробныя галінкі, маладыя шыпулькі.

— Уладзімір!.. Валодзечка!.. Валодзя!.. Яны нас хочуць узяць жывымі! Жывымі нас хочуць узяць! — крычыць Марат.— Паверсе страляюць! Не траць патронаў!.. Страляй радзей!..

Ужо каля самага лесу адзін за адным перасеклі пагорак нямецкія аўтаматчыкі. Прарвацца ў лес можна толькі цераз пагорак. Марат перабягае да кустоў ядлоўцу. За ім бяжыць Уладзімір. Значыць, і Уладзімір зразумеў, што фашысты страляюць, не цэлячыся, у разведчыкаў. Уладзімір стары салдат, ён умее ваяваць, не раз над ім свісталі кулі. А можа, проста ён захацеў памерці? Можа, захацеў падставіць сэрца пад варожыя кулі, сказаць ворагу ў твар: «Глядзі, нікчэмны, як памірае беларускі партызан!» Не, Уладзімір не памрэ так марна. Ён будзе да апошняй кулі адбівацца ад ворага.

— Так вам, так вам, гады! — крыкнуў Марат, калі ўбачыў, як Уладзімір скасіў з аўтамата трох пярэдніх фашыстаў, што перагарадзілі дарогу да лесу.

Марат то страляў па фашыстах, якія ішлі з лагчыны справа, то біў па тых, што паўзлі да разведчыкаў па адкрытым полі.

Уладзімір на хвіліну прыпаў да зямлі і асіплым, нібы не сваім голасам крыкнуў:

— Марацік, Марат! Прабірайся ў лес! Я прыкрыю цябе. Паўзі наперад!..

Вось ужо выразна чуваць за кустамі каманда нямецкага афіцэра. На момант спынілася страляніна. Марат прапоўз з паўсотні метраў. Лес зусім блізка. І раптам часты кулямётны клёкат заглушыў усё. Марат азірнуўся назад. Ва Уладзіміра сачылася са шчакі кроў, рука нерухома ляжала на прыкладзе аўтамата.

— Валодзечка, дарагі мой! Я ж ім, нягоднікам!..

Марат падняўся на ўвесь рост. Зляцела з галавы шапка. Ён не нагнуўся, каб падняць яе. З усіх бакоў перлі фашысты. Яны ішлі, наставіўшы штыкі вінтовак, накіраваўшы на Марата ствалы аўтаматаў. Апошні раз агрызнуўся Маратаў аўтамат і змоўк. А кола фашыстаў звужаецца і звужаецца. Марат шпурнуў гранату.

Фашысты пападалі на зямлю, каб уратавацца ад асколкаў. Некаторыя ўпалі навечна. Марат шпурнуў другую гранату і, як толькі прагрымеў выбух, кінуўся ўперад у надзеі прарвацца ў лес. Але перад ім зноў сталёвыя каскі.

Марат укленчыў на адно калена, падняў апошнюю гранату высока над галавою і нібы застыў. Салдаты падаліся назад, а потым зноў рынуліся да яго.

У гэты момант пачулася, як у лесе заржалі коні. Высока ў небе заліўся веснавой песняй жаваранак. Марат зірнуў на шчэць зялёнай травіцы, у сінія вочкі блакітных пралесак.

Грымнуў выбух. Пачуліся стогны і енкі. А на самым узгорку застаўся ляжаць Марат Казей. Струменіла з патыліцы кроў. Вялікія сінія вочы, здаецца, глядзелі на блізкі лес, дзе ржалі коні, дзе сумна цвіла лясная кветка-сон, дзе спявалі свае простыя песенькі берасцянкі.

З-за кустоў выскачыў высокі няўклюдны салдат з разадраным крысом шыняля. Да спацелай левай шчакі яго прыліпла некалькі драбінак зямлі, над правым брывом тырчала гнілая саломіна. Салдат здаваўся і смешным і страшным. Ён намерыўся штыком-цесаком пракалоць нерухомае цела Марата Казея.

— Вэк! Вэк! — пачуўся голас нямецкага маёра.

Салдат прыставіў вінтоўку да нагі. Маёр аддаў загад выстраіцца ля цела Марата Казея. Скамянелыя твары салдат скоса пазіралі на худзенькае цела падлетка-разведчыка.

— Салдаты! — сіпла гукнуў нямецкі маёр.— Пяцьсот чалавек ішлі лавіць савецкага разведчыка. Мы яго не злавілі. Ён не здаўся жывым. Ён заслужыў, каб мы аддалі яму чэсць.

З лясной дарогі пачалі абстрэл партызанскія мінамёты.

Камандзір брыгады Мікалай Баранаў атрымаў кароткае данясенне. Ён выцер горкую слязу і загадаў камандзірам атрадаў перарэзаць шляхі адступлення фашыстам.

Неўзабаве каля ляснога імшарышча пачулася магутнае партызанскае «ўра!».

— За Савецкую Радзіму, таварышы! Адпомсцім за нашых слаўных разведчыкаў! Смерць фашысцкім вылюдкам!

Таямніча шумеў лес. Кукавала зязюля. Цвіла кветка-сон, тужліва схіліўшы вялікія аксамітныя галоўкі.

# СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

Сяргей Іванавіч Грахоўскі нарадзіўся ў мястэчку Нобель Пінскага павета Мінскай губерні (цяпер Зарэчненскі раён Ровенскай вобласці УССР). Дзяцінства і першыя гады юнацтва прайшлі на матчынай радзіме ў мястэчку Глуск (Магілёўская вобласць), дзе будучы паэт закончыў сямігодку. Свой працоўны шлях С. Грахоўскі пачаў на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце (1930—1931). Некаторы час працаваў у Дзяржвыдавецтве Беларусі, потым — у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1935 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і стаў працаваць у радыёкамітэце, адначасова выкладаў літаратуру на рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна (1935—1936). Пэўны час працаваў на лесанарыхтоўках у Горкаўскай вобласці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны настаўнічаў на Случчыне (1946—1949) і ў Новасібірскай вобласці (1950—1956). У 1956 г. пераехаў у Мінск, спачатку працаваў на Беларускім радыё, потым загадваў аддзелам у рэдакцыі часопіса «Бярозка» (1957—1959). Некаторы час быў літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР, затым — рэдактарам часопіса «Вясёлка» (1960—1973), адказным сакратаром Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1973—1974).

Першыя вершы С. Грахоўскага былі надрукаваны ў 1926 г. у часопісе «Беларускі піянер», потым змяшчаліся на старонках штомесячнага літаратурнага дадатку «Вясна» да бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», а таксама ў часопісе «Чырвоная Беларусь». У 1958 г. выйшаў першы зборнік вершаў паэта «Дзень нараджэння». Затым з'явіліся кнігі паэзіі «Чаканне» (1960), «Табе зайздросціць сонца» (1963), «Памяць» (1965), «Тры вымярэнні» (1967), «Вершы» (1968), «Паэма дарог» (1970), «Зазімак» (1976), «Лірыка» (1978), «Зачараванасць» (1978), «Кругі надзеі» (1985), «Верую» (1987). С. Грахоўскі — аўтар дакументальных аповесцей «Рудабельская рэспубліка» (1968, твор экранізаваны) і «Ранні снег» (1975).

Для дзяцей С. Грахоўскі пачаў пісаць у канцы 50-х гг. Выйшлі зборнікі вершаў, казак, паэм «Ад вясны да вясны» (1959), «Сёння і заўтра» (1961), «Гарыць касцёр» (1966), «Сонечная сцежка» (1980), «Знаходка» (1985). Шырокай папулярнасцю ў юнага чытача карыстаюцца апавяданні пісьменніка пра У. І. Леніна, што ўвайшлі ў зборнік «Агеньчык у акне» (1972). У 1974 г. С. Грахоўскі напісаў аповесць «Гарачае лета». Яго пяру належыць дакументальная аповесць пра Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа «Суровая дабрата» (1977), а таксама кнігі «Бацькі і дзеці» (1972, артыкулы на маральна-этычныя тэмы) і «Так і было» (1986, артыкулы, успаміны). У 1988 г. выйшла кніга лірычнай прозы «Сустрэча з самім сабой».

С. Грахоўскі вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў А. Пушкіна, А. Блока, У. Маякоўскага, Р. Гамзатава, Ж. Верна і іншых пісьменнікаў.

Кніга вершаў «Асеннія гнёзды» (1982) адзначана ў 1983 г. Літаратурнай прэміяй імя А. Куляшова.

## АГЕНЬЧЫК У АКНЕ

За ноч пад кожным акном завея намяла вялізныя сумёты, а на слупы, платы і вароты надзела высокія снежныя шапкі.

Яшчэ не зусім развіднела, і снег здаваўся сіняваты і пульхны.

Знадворку нехта паскробся ў дзверы, але, відаць, ніяк не мог іх адчыніць. Надзежда Канстанцінаўна выйшла ў сенцы і ледзьве адсунула дзверы: увесь ганак быў занесены снегам.

На ганку стаяў маленькі хлопчык у доўгім матчыным каптане, на нагах былі апоркі ад старых стаптаных валёнак, на галаве — вялікая аўчынная шапка. Яна спаўзла на вочы — відзён быў толькі пасінелы кірпаты носік і востры падбародак.

— Калі ласка, заходзь, Мінька! — сказала Надзежда Канстанцінаўна.

Хлопчык убег у цёплую хату, стаў у парозе і хуценька сказаў:

— Вось і я.

Твар Уладзіміра Ільіча засвяціўся ўсмешкай. Здалося, што ў гэтую сцюжу ў хату заляцела і пачало ціўкаць вясёлае птушаня. Гаспадар пайшоў насустрач гэтаму кволаму, ласкаваму і разумнаму хлопчыку. Але Мінька чамусьці стаяў, не распранаўся.

Ён прыходзіў сюды кожную раніцу, скідаў каптан, бацькаву шапку і станавіўся яшчэ меншы, нейкі сухенькі і надта рухавы. Ленін саджаў яго да стала, наліваў у сподачак чаю, клаў вялікі драбок іскрыстага сіняватага цукру. Мінька спрытна сёрбаў чай і зусім як дарослы расказваў пра вясковыя навіны і пра шушанскіх хлапчукоў. Пасля ён маляваў усё, што прыходзіла ў галаву, гартаў тоўстыя кніжкі з карцінкамі і гаварыў з гэтым добрым дзядзькам, як з роўным. А Ленін смяяўся, паглядаючы на Мінькавы малюнкі, паказваў іх Надзеждзе Канстанцінаўне і гладзіў хлопчыка па галоўцы.

Цяпер Мінька стаяў у парозе і толькі шморгаў пасінелым кірпатым носікам.

— Праходзь, Міняй, распранайся. Якраз і чай закіпеў,— запрасіў Ленін.

Мінька ссунуў на патыліцу вялікую шапку, паглядзеў на ўсе бакі, кіўнуў Уладзіміру Ільічу, каб ён нахіліўся ніжэй, а сам стаў на дыбачкі ў вялізных, як чоўны, апорках і зашаптаў у самае вуха:

— Да засядацеля жандары прыехалі. Татка яму ранічкай валёнкі аднасіў і сам бачыў.

Ленін сур'ёзна выслухаў Міньку і ласкава паглядзеў яму ў вочы. Хлопчык засаромеўся і ўзяўся за клямку:

— Я пайду... А заўтра прыбягу яшчэ.

— Дзякуй, Міняй, і тату падзякуй. А заўтра прыходзь абавязкова. Чуеш? Абавязкова.— Ільіч хітра яму падміргнуў і ўсміхнуўся.

Мінька выскачыў з хаты.

Праз вузенькую праталінку на замёрзлым акне Ленін бачыў, як хлопчык перапаўзае цераз вялізныя сумёты, як праціскаецца паміж шулам і замеценаю снегам брамкай, як у апоркі яму набіваецца снег.

Ленін сказаў Надзеждзе Канстанцінаўне, чаго прыбягаў Мінька. Праз некалькі хвілін пісьмы сяброў, забароненыя газеты і дробна спісаныя рукою Ільіча старонкі зніклі са стала і з шафы.

Як добра выбіднела, з шумам расчыніліся дзверы, па хаце пакаціліся белыя клубы пары. З іх вынырнула постаць тоўстага жандарскага афіцэра. Следам увайшлі тутэйшы засядацель і два стражнікі ў вялізных заінелых кажухах.

Афіцэр сказаў, што яны павінны зрабіць вобыск у палітычнага ссыльнага Ульянава.

— Калі ласка, калі ласка,— далікатна азваўся Ільіч.

Ён адышоў убок, стаў побач з Надзеждай Канстанцінаўнай.

Жандар падставіў крэсла да высокай шафы і пачаў перабіраць тоўстыя кнігі на верхніх паліцах. Ён выцягваў тамы з незразумелымі назвамі, круціў іх так і гэтак і зноў ставіў на месца.

— І навошта вам у такую далеч цягнуць столькі грузу? — не вытрымаў афіцэр.

— Клапачуся, каб вам была работа,— пажартаваў Уладзімір Ільіч.

Жандар, відаць, упарыўся. Злез з крэсла, дастаў хустачку і выцер узмакрэлы чырвоны карак.

— А што вы, уласна кажучы, шукаеце? — спытаў далікатны гаспадар.— Скажыце, можа я вам памагу.

Тоўсты афіцэр аж кіпеў ад злосці, што гэты невысокі, спакойны і вельмі далікатны чалавек пасміхаецца і зусім не баіцца яго.

Стражнікі падпіралі вушакі, а засядацель сядзеў на лаве і забаўляўся з маленькім пушыстым кацянём.

Так яны нічога не знайшлі. Моцна ляпнулі дзвярамі і выйшлі з хаты.

А Ленін сеў на крэсла, абхапіў рукамі калена і заліўся вясёлым смехам.

— Дзівакі... Трэба не на паліцах шукаць, а тут шукаць,— і ён пастукаў сябе па лбе. Пасля падняўся і паглядзеў праз тую самую праталіну на акне. На двары круціла мяцеліца. Яна замятала шырокую сцежку, пратаптаную да ганка вялікімі валёнкамі жандараў.

А праз шчыліну ў брамцы з-пад калматай бацькавай шапкі пазіраў Мінька. Ён ведаў, што сёння зноў будзе позна гарэць лямпа ў заінелым акне насупраць. А заўтра ранічкаю ён зноў прыбяжыць да Ільіча, стане ў парозе і скажа: «А вось і я».

## ЛЕНІНЦАМІ ВЫРАСЦЕМ

Былі піянерамі мама і тата,
Бабуля мая звеннявою была,
Значок піянерскі да нашага свята
І гальштук чырвоны яна зберагла.

Калі ад пажараў зямля запалала
І сонца закрыла, як хмара, вайна,
Свой гальштук
З партыйным білетам схавала
Ля самага сэрца яна.

Над лесам і полем гула кананада,
Варожыя кулі свісталі, як град,
І маці з былым піянерскім атрадам
Дарогу знайшлі ў партызанскі атрад...

А сёння ідуць піянераў калоны,
Іграюць гарністы, палае касцёр.
Бабуля завязвае гальштук чырвоны,
Збіраюцца тата і мама на збор.

Над вуліцай сцягі разгортвае вецер,
На плошчы за строем змыкаецца строй,

Спяваюць, смяюцца шчаслівыя дзеці
І ўсе салютуюць радзіме сваёй.

За зорачкай зорка — ідуць акцябраты,
Ідуць піянеры — звяно за звяном,
Праходзяць дружыны, праходзяць атрады —
Дружынам і сцягам канца не відно.

Змаўкаюць гарністы, прыціхлі калоны,
Здаецца, і вецер лістоў не кране,
Бо гальштук агністы, крылаты, чырвоны
Важатая сёння завязвае мне.

І я перад строем клянуся ўрачыста
Радзіму, як родную маці, любіць,
Расці камсамольцам, расці камуністам,
Надзейнаю зменаю ленінцам быць.

### ЗЕМЛЯКІ

Яшчэ нядаўна хлапчукамі
Былі салдацкія сыны,
А ўжо маленькімі рукамі
Да зор цягнуліся яны...

Давалі ім заўсёды сілы
Прасторы роднае зямлі,
І вось прарэзаліся крылы
І над сусветам паднялі.

У космас, у камандзіроўку,
Яны лятаюць і пяюць.
І Белае, і Камароўку
З касмічных даляў пазнаюць.

І, пралятаючы над светам
У самым хуткім караблі,
Здалёк падміргваюць планетам
Сыны шчаслівае зямлі.

У кожным з нас жыве з пялёнак
Пятро Клімук і Кавалёнак.
На віражах касмічных трас
Даўно чакаюць зоры нас.

### ЖМУРКІ

Захацелі куркі
Пагуляць у жмуркі.
Раніцай за хатаю
Бегаюць стракатыя,
Чорныя і белыя,
Пудкія і смелыя.

Кажа Курка-рабка:
«Я ж усім вам бабка.
Не грабіце смецця,
Не лавіце мух.
Падыходзьце, дзеці,
І пастаньце ў круг.
Вунь яшчэ адна імчыцца...
Сталі ўсе?
Пачнём лічыцца:
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
Каршуны не хочуць спаць,
Хочуць есці, хочуць піць,
Хочуць пеўніка ўхапіць,
Але курачка адна
Праглынула каршуна.
Раз, два, тры, чатыры, пяць.
А табе ісці шукаць».
Завязалі пеўню вочы
Шоўкавай травою,
Стала цёмна, як уночы,
Круціць галавою.

Ходзіць певень каля хаты
І ўздыхае горка:
Зніклі нават кураняты
Некуды з падворка.
Бегаў певень да змяркання,
І расла трывога,
Што не выканаў задання —
Не знайшоў нікога.
Слепнуць куры, як сцямнее,
Кожная гукае,
І ніяк не зразумее,
Хто каго шукае.
Дзе куратнік — невядома,
Хто прыціснуў лапку...
І нарэшце ўсіх дадому
Пазбірала бабка.

Зноў яна старанна лічыць,
Бабка добрай ночы зычыць:
— Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Каршуны палеглі спаць.
Спіце, пеўнікі і куркі...
Заўтра ў што гуляць?
— У жмур-кі!

## ДЗЯЦЕЛ

Я на елку палячу —
І галінкі палячу:
Дзюба ў мяне доўгая,
Буду стукаць доўга я.
Назіраю я гады,
Як буяюць ягады:
З журавін зрабіў каралі —
Журавы мяне каралі,
А суніцы ледзь паспелі,
Іх дразды скляваць паспелі.
Я спалохаў іх як след,
Прахаплюся я са сну
І на елку ці сасну
Зноў на досвітку лячу —
Дрэва хворае лячу.

## У ЛЕСЕ

Хто, гуляючы па лесе,
На высокі дуб палезе?
Хто, прыйшоўшы у лясы,
Не заўважыць след лісы?

Я на пень усеўся лысы,
Бачу — тут гулялі лісы,
Я на дуб узлезці б мог,
Каб пад ім быў мяккі мох.
Пад бярозаю ляжу
І бярозавік ліжу:
Смага паліць, а вады
Не знайсці, бо авады,
Быццам хмара, наляцелі —
Пухіры гараць на целе,
Я другі адзену ўбор
І пайду гуляць у бор.

## СОНЕЧНАЯ СЦЕЖКА

Жоўты лісцік тапаліны
Ціха падае з галіны,
І лісты, лісты наўкол
Апускаюцца на дол:
Высцілае лістапад
Сцежку ў наш дзіцячы сад.
Спрытна ходзяць ножкі
Сонечнай дарожкай.
Кожнай раніцай з ахвотай
Мы прыходзім на работу:
Ляльку трэба расчасаць
І кружочкі напісаць,
Збудаваць пясчаны дом,
З'есці кашу з малаком
І кату пачысціць боты.
Ой, як многа ў нас работы!

## ЛЕТА

Прыходзіць лета звонкае
Птушынаю гамонкаю,
Над сінімі азёрамі
Яно ўзыходзіць зорамі,
А пахне медуніцамі
І спелымі суніцамі.
Прыходзіць лета сцежкамі
З малінай, сыраежкамі,
Частуе на пагорку
Арэхамі вавёрку,
На возеры, ля берага,
Гукае зайца шэрага.

Прыходзіць лета звонкае,
Шуміць бярозкай тонкаю,
Гамоніць лес густы,
Дык не праспі і ты:
У спёку або ў дождж
Імчыся басанож...
Куды ні глянь — усюды
Цябе чакаюць цуды,
Цябе чакаюць сцежкі
І радасныя ўсмешкі,
Лугі, лясы, палі
І шчасце на зямлі.

## ЛАСЯНЯ

Горка плача ласяня.
З лесу збеглася радня:
Тата,
Мама,
Бабка,
Дзед,
Брат,
Сястрычка
І сусед.
Плача, енчыць ласяня:
— Не дажыць, відаць, да дня:
Паліць, торгае, скубе
За вушамі і на лбе,
З боку ў бок мяне вядзе,
Галава, як звон, гудзе,
Боль свідруе галаву.
Не, да дня не дажыву.
Плача мама, плача татка —
Ўсе шкадуюць ласянятка,
Плачуць брат, сястра, сусед,
Але ўсіх суцешыў дзед:
— Пацярпі, дзіцятка, трошкі —
Бо ў цябе вылазяць рожкі.

## КАЛЫХАНКА

Носіць зорны парасон
І нячутна ходзіць сон,
Ціха, голасам бабулі
Ён спявае: «Люлі-люлі,

Люлі-люлі, люлі-люлі,
Дзеткі ўсе даўно заснулі.
Зоркі спяць у вышыні,
Дык і ты хутчэй засні.

Залаты маладзічок
Лёг у небе на бачок,
На канапе дрэмле мішка,
Пад сталом заснула мышка.

Люлі-люлі, а-а-а,—
Шэпча росная трава.

Баю-бай,— спявае слон
І вядзе ў дзівосны сон —
На пуховыя падушкі
І ў краіну райскай птушкі.

Ўсё заснула ў цішыні,
Дык і ты хутчэй засні,

Люлі-люлі, баю-бай,
Спі, дзіцятка, засынай,
Дарам вочкі не сляпі,
Спі спакойна, спі, спі.
А-а-а... А-а-а...»

# АЛЕСЬ ПАЛЬЧЭЎСКІ

Алесь (Аляксандр Восіпавіч) Пальчэўскі нарадзіўся 16 студзеня 1905 г. у вёсцы Прусінава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педфака Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна (1931) працаваў у рэдакцыі дзіцячага часопіса «Іскры Ільіча». Некаторы час жыў у Гор-

каўскай вобласці (1936—1946) і Краснаярскім краі (1948—1955). У 1946—1948 гг. працаваў выкладчыкам мовы і літаратуры ў Пухавіцкай і Рудзенскай сярэдніх школах. З 1955 г. супрацоўнічаў у газеце «Зорька», пазней стаў рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР. У 1957 г. перайшоў на працу ў дзіцячы часопіс «Вясёлка», дзе спачатку быў літаратурным супрацоўнікам, а затым — адказным сакратаром.

Першае апавяданне «Ахвяра» было надрукавана ў часопісе «Малады араты» ў 1926 г. У 1932 г. з'явілася ў друку п'еса для дзяцей «З чырвоным сцягам», а ў 1934 г.— «Зламаная іголка». А. Пальчэўскі з'яўляецца таксама аўтарам п'есы «Суседка» (1956), зборнікаў апавяданняў «Родныя берагі» (1958), «Разбітае люстэрка» (1965), «Былі ў маці сыны» (1968), кніг аповесцей і апавяданняў «Жнівеньская раніца» (1963), «Запознены пасаг» (1973), «Ноч на вахце» (1979).

Для дзяцей пачаў пісаць у 20-я гг. Першае апавяданне «Акурак», прысвечанае школьнай тэме, было надрукавана ў «Беларускім піянеры» ў 1926 г. Юнаму чытачу адрасаваны кнігі апавяданняў «Беражанкі» (1958), «Аля і Галя» (1961), «Дым над лесам» (1964), «Таемная крушня» (1969), «Аднавокі сом» (1974), аповесці «Ты не адзін» (1960), «Данеўцы — нашы знаёмыя» (1965), «Тайна аднаго звяна» (1971), «Сцежкі» (1977).

Памёр А. Пальчэўскі 26 красавіка 1979 г.

## АКРАЙЧЫК ХЛЕБА

### (Апавяданне Інінай мамы)

Да чаго ж радасная прыбегла ўчора со школы мая Іначка! Не паспела дзвярэй зачыніць, як адразу ж кінулася да мяне, моцна абняла і выпаліла:

— Мамачка, мне далі білет на ёлку ў Крэмль!

— За што ж табе гонар такі? — пытаю.

— За тое, што вучуся на «выдатна»,— аж танцуе дзяўчынка.

— Дык жа не адна ты выдатніца ў класе,— кажу.

— А я яшчэ і ў вышывальным гуртку лепш за ўсіх вышываю.

— Ну, цяпер,— кажу,— разумею, чаму табе далі білет на такую ёлку.

Кожнай маці, вядома, прыемна, калі яе дзеці і вучацца добра, і ў працы не апошнія. А Іначка радасная, вясёлая, месца сабе не знаходзіць, усё глядзіць на залатыя літары запрашальнага білета.

Вечарам, усёю сям'ёю за чаем, мы раіліся, якую сукенку пашыць Іначцы, прыдумлялі фасон, каб лепей выглядала дзяўчынка на такім святце. Кожны раіў сваё.

І пад гэты вясёлы гоман дзяцей прыгадвалася мне сваё маленства, калі я была такая ж, як Іначка.

...Жылі мы тады ў Петраградзе. Зіма 1918 года была вельмі галодная. Сядзім мы чацвёра каля «буржуйкі» (так называлі тады невялікія чыгунныя печкі) і глядзім, як мама гатуе вячэру. Яна ўдзень хадзіла мыць бялізну да суседзяў і прынесла за сваю працу бульбяных шалупінняў.

Мама чысценька перамыла іх, зварыла, потым перамяшала з цыкорыяй і цяпер на гарачай «буржуйцы» пячэ праснакі. Пах разносіцца па ўсім пакоі і аж казыча ў носе. Нам страшэнна хочацца пакаштаваць тыя праснакі! Мама ведае гэта і знарок расказвае казку, каб забавіць нас, пакуль прыйдзе наша старэйшая сястра з работы.

Нарэшце з'явілася Ліда. Яна ўвайшла ў пакой расчырванелая ад марозу. Мы кінуліся насустрач, радуючыся, што зараз будзем вячэраць: сястра кожны дзень прыносіла з сабою маленькі кавалачак хлеба, які выдавалі ёй на заводзе, і мама дзяліла яго ўсім пароўну. На гэты раз Ліда палажыла на стол хлеб, а пасля глянула на мяне і кажа:

— Ну, Жэнечка, а табе я сёння да хлеба яшчэ нештачка прынесла.

— Што? Што?

— Білет. Наш «Праметэй» (так называўся завод, дзе працавала сястра) наладжвае для вас навагоднюю ёлку.

Білет на ёлку! Я аж заскакала ад радасці, бо ніколі не была на ёлцы.

— Ну-ну, патанцуй, патанцуй,— засмяялася сястра.— Вучыся: я ўжо сказала, што ты будзеш выступаць са сваім «Яблычкам».

За вячэрай мама ўздыхнула і кажа Лідзе:

— Білет, дачушка, ты прынесла, а ў чым жа наша Жэнька пойдзе на тую ёлку: ні адзець, ні абуць няма ў яе нічога.

— Пераніцуем, мама, маю старую квяцістую сукенку, аблямуем яе каляровымі стужкамі — і добра будзе,— адказала сястра.— А буркі пашыем са старога татавага шыняля.

Так і зрабілі. Я дык нават згодна была ісці ў сваёй старой сукенцы. А з Лідзінай выйшла такая прыгожая — вачэй не адвядзеш. Мае меншыя сястрычкі аж зайздросцілі, як убачылі мяне ў новым убранні і новых бурках.

Раніцай на Новы 1919 год я прыбралася, і мы з сястрой пайшлі на ёлку. Яе наладзілі рабочыя ў вялікім пакоі былога гаспадара завода. Сам гаспадар уцёк пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі за мяжу.

Мы прыйшлі на ёлку амаль першыя, бо я ад самай раніцы падганяла сястру дома, а пасля і на вуліцы, каб не спазніцца.

Хутка сабралася шмат дзяцей. Нейкая цётка завесіла цёмнымі фіранкамі вокны і ўключыла святло.

Ой, якое гэта было дзіва для нас! Мы доўга стаялі і моўчкі глядзелі, як зачараваныя, на цацкі, на рознакаляровыя лямпачкі! Ды і не толькі мы былі рады. Дарослыя цешыліся не менш за нас. Усе нават неяк нібы забыліся ад такога харaства пра голад, пра тое, што недалёка ад Петраграда вораг.

Потым з суседняга пакою выйшлі без хустак дзве жанчыны, адна маладая, з кучаравымі валасамі, а другая — пажылая, з закручанымі ў клубок косамі на галаве. Яны прывіталіся з намі, і маладзейшая сказала:

— Мяне завуць Таццяна Іванаўна, а гэтую цёцю — Клаўдзія Аляксееўна. Спачатку мы паспяваем з вамі, а пасля патанцуем.

Пабраўшыся за рукі, мы хадзілі вакол ёлкі разам з Таццянай Іванаўнай і спявалі, а Клаўдзія Аляксееўна іграла на раялі. Мы не ведалі той песні, і спачатку Таццяна Іванаўна спявала адна, а затым усе разам.

— А цяпер патанцуем,— сказала Таццяна Іванаўна.— Бачыце, на раялі ляжаць падарункі? Іх атрымаюць лепшыя танцоры.

Клаўдзія Аляксееўна зайграла «Камарынскую». Таццяна Іванаўна пачала падахвочваць нас на танец, але ніхто не выходзіў, бо не ўмелі.

— Сыграйце, Клаўдзія Аляксееўна, што-небудзь другое,— папрасіла Таццяна Іванаўна піяністку.

І раптам загучала «Яблычка». Я не ўтрымалася і выбегла на сярэдзіну. У бурках нязручна было танцаваць, я скінула іх і шпурнула сястры.

Следам за мной выбег і закружыўся ў танцы хлопчык, за ім — дзяўчынка. Потым яшчэ і яшчэ дзеці. Напэўна, ніколі гэты пакой не бачыў такой весялосці, якая запанавала на ёлцы. Усе стаялі і пляскалі ў далоні, а мы танцавалі доўга-доўга, аж пакуль Клаўдзія Аляксееўна не перастала іграць.

Пасля пайшлі «Гапак», «Барыня», а за імі зноў «Яблычка».

За тое, што я выйшла першая танцаваць, мне дазволілі выбраць падарунак па свайму жаданню. Падвяла мяне Таццяна Іванаўна да раяля, зняла абрус і кажа:

— Выбірай, Жэня, што хочаш.

А я стаю і не ведаю, што ўзяць. На мяне глядзіць і ўсміхаецца сваімі блакітнымі вачыма лялька з ружовымі шчокамі, а побач з ёю ляжыць акрайчык хлеба, а далей пакуначкі з цукеркамі ў блішчастых паперках.

Так стаяла я хвіліну, другую. Вочы разбягаюцца — не ведаю, што рабіць, на чым спыніць свой выбар. Перамагла лялька. Мне здалося нават тады, што яна падміргнула, каб я ўзяла яе.

З радасцю падбегла я да сястры. А яна ўшчыпнула мяне за локаць і шэпча:

— Патрэбна табе гэтая лялька... Не магла хлеба ўзяць.

Мне і самой стала шкада: чаму я не ўзяла таго акрайчыка. Як рады былі б дома мама і меншыя сястрычкі. Таццяна Іванаўна аддала хлеб таму хлопчыку, што пайшоў танцаваць услед за мною.

Сястра стаяла моўчкі і нават не глядзела на мяне. У гэты час да нас падышоў матрос, падпяразаны папругай па кажушку. Ён дастаў з-за пазухі пайку хлеба, працягнуў мне і кажа:

— Вазьмі, за тое, што добра танцавала «Яблычка».

Ліда замахала рукамі:

— Што вы! Што вы! Сваю пайку аддаяце...

— Няхай возьме. Я глядзеў, як ёй хацелася ўзяць хлеб і як шкада было расставацца з лялькай,— адказаў матрос сястры. А потым падняў за падбародак маю галаву і, пазіраючы ў вочы, не сказаў, а проста загадаў: — Бяры! А як вырасцеш, прыгадаеш, у які цяжкі для Савецкай улады час спраўлялі мы першую ёлку...

І я ўспомніла сёння і той цяжкі час і таго невядомага матроса, што мне, дзяўчынцы, аддаў сваю пайку хлеба, а сам, можа, пасля суткі не еў нічога. Успомніла цяпер, калі ўсёю сям'ёю прыдумлялі, як лепей прыбраць нашу Іначку на баль-маскарад у Крэмль.

## ЛІПКА

Іх прывезлі з далёкага лесу. Сваё ўбранне дрэўцы пакінулі там, дзе нарадзіліся, і цяпер без лісцця ляжалі перад нашым домам. Вечарам людзі прыйшлі з работы і адзін перад адным пачалі выбіраць лепшыя: большыя, раўнейшыя, купчастыя. Кожнаму хацелася пасадзіць перад сваім акном прыгажэйшае дрэўца.

Засталася адна танклявая ліпка з трошкі выгнутым ствалом, і ніхто не хацеў яе браць. Што сказала б яна, каб магла гаварыць?

«Тут было шмат маіх аднагодкаў, іх забралі ўжо. А мяне, крывенькую, колькі разоў падымалі, разглядалі з усіх бакоў і зноў клалі на зямлю. А хіба ж я вінавата, што вырасла такая?»

Ліпцы сапраўды не пашчасліліла. Калі яна была яшчэ маленькая, бура паблізу вывернула тоўстую елку. Ліпка расла і хутка ўперлася вяршалінкай у выварацень. Яна схіліла свой стан, хацела зірнуць, ці тоўстая елка, ды так і не ўбачыла. А як дацягнулася даверху, выпрастацца ўжо не змагла.

Потым прыйшлі маладыя хлопцы спілоўваць выварацень, і адзін з іх нават пашкадаваў дрэўца.

— Глядзі, як пакалечыла елка бедную ліпку,— сказаў ён свайму сябру.

— Нічога, сонца выпрастае,— адказаў той.— Трэба толькі асцярожна спілаваць выварацень, каб не зламаць яе, кволенькую.

І людзі з добрым сэрцам не загубілі маладзенькае дрэўца.

Цяпер ліпцы было прасторна, і яна расла, дужэла.

Потым зноў прыйшлі людзі. На гэты раз з песнямі, з гоманам. Гэта былі школьнікі. Ліпка ніколі не здагадалася б, чаго яны прыйшлі, каб адзін з вучняў не сказаў:

— Выкапаем і гэтую. Няхай едзе ў горад.

— Крывадатая трошкі,— пакруціў галавою другі.— Там, знаеш, як упрыгожваюць вуліцы!

— А чым яна вінавата? Хіба там людзі не ведаюць, што не ўвесь лес роўны? Выкапаем.— І першы хлапчук усадзіў рыдлёўку ў зямлю.

Ліпка злёгку зашапацела апошнімі пажоўклымі лісточкамі. Гэта яна шапнула школьніку: «Дзякуй за спагаду». Але той, заняты працай, не пачуў шэпту.

І вось ліпка ў горадзе. Яе суседак людзі разабралі і пасадзілі, а яна — адна-адзінюткая — ляжыць на зямлі.

Туга апанавала дрэўца: «Няўжо людзям цяжка выкапаць ямку і пасадзіць мяне ў зямлю. Абы-дзе, калі лепшыя месцы аддалі лепшым».

Вярнуўся Віця са школы, убачыў пакінутую ліпку, падняў, пакруціў у руках, уздыхнуў і сказаў:

— Далі ганьбу табе, не хочуць у рад з роўнымі дрэўцамі садзіць. Я знайду табе месца.

Ён выкапаў ямку далей ад дома, дзе ўвесь дзень не бывае ценю, пасадзіў дрэўца ўвагнутым бокам да сонца, каб лепей заплывала крывізна, і пажадаў:

— Расці купчастая ды вялікая!

І ўвесну ліпка першая зазелянела і першая напомніла людзям аб прыгожай пары года — вясне.

## АЛЯ І ГАЛЯ

Пра што шапталіся Аля з Галяй — у хаце ніхто не ведаў. Дзяўчынкі ўмелі захоўваць свае сакрэты. Ды яшчэ і як захоўваць! Нічога па твары не адгадаеш, а самі не вельмі пахваляцца. Глянуць адна на адну — усміхнуцца і маўчаць. На гэты раз падвяла іх новая сяброўка Соня. Пяць дзён мінула, як маці купіла дзяўчынкам ляльку, а яны ўсё ніяк не маглі нацешыцца ёю.

Прыгожа падрумянены тварык лялькі прыветна ўсміхаўся, а блакітныя вочкі сачылі за кожным рухам дзяўчынак. Як ні пасадзяць яны ляльку, у які бок ні адыдуцца, яна глядзіць толькі на іх. Весела і радасна дзяўчынкам ад матчынага падарунка. Лягуць спаць — і Соню паложаць з сабою, мыцца ідуць — і ляльку нясуць.

Кожная сястрычка старалася паказаць сваю найбольшую любоў да Соні. Але трэба сказаць праўду, Галя лепей за Алю любіла новую сяброўку. І не таму, што яна на паўтара года старэйшая, а такое ўжо добрае ў Галі сэрца. Пойдуць яны з Соняй умывацца — Аля халоднай вадой абмые ружовыя шчочкі лялькі, а Галя ніколі гэтак не зробіць. Яна нальe з чайніка цёплай вады, намочыць кончык ручніка і асцярожненька абатрэ твар. Абцірае і прыгаворвае:

— Аля цябе халоднай вадой умывала? Ух, якая яна нядобрая!..

Аля стаіць тут жа і апраўдваецца:

— Ёй усё роўна, якая вада...

— Чаму гэта ўсё роўна? Соня ўсё-ўсё разумее, толькі не можа гаварыць і хадзіць, як мы,— даводзіць Галя.

А вось чаму Соня не можа хадзіць і размаўляць, Галя не ведае і сама. А ў такіх выпадках, калі дзяўчынкі чаго-небудзь не ведаюць, іх заўсёды выручае мама. Аж дзівяцца іншы раз яны з мамы: што ні спытаюць — усё яна ведае. І на гэты раз мама расказала, чаму Соня не можа хадзіць гэтак, як яны.

— У яе ж няма сэрца, як у вас. Аля, прытулі сваё вуха да Галіных грудзей, паслухай, як яно стукае. Ну, прытулі!

Аля прытулілася правым вухам да грудзей сястры і здзіўлена паглядзела на маму:

— Ой, мамачка, Галіна сэрца стукае, як татаў гадзіннік.

— А цяпер дай я паслухаю,— папрасіла Галя.

Яна нахіліла галаву, прыціснулася да Алінай сукенкі вухам і доўга ўслухоўвалася.

— Ты як дакторка слухаеш, толькі без трубачкі,— засмяялася мама, гледзячы на сур'ёзны твар дачкі.

— І тваё таксама стукае, як татаў гадзіннік,— выпрасталася Галя і паказала пальчыкам: — тук-тук, тук-тук...

Дзіўна дзяўчынкам, што маленькае сэрца, схаванае недзе далёка ў грудзях, дае чалавеку жыццё.

— Ну, ведаеце цяпер, чаму не ходзіць ваша Соня? — спытала маці.

— Ведаем,— уздыхнулі дзяўчынкі. І шкада ім стала, што ў Соні няма такога сэрца, як у іх. А то пабеглі б яны цяпер утрох гуляць.

Маці пайшла на кухню, а Галя і Аля пачалі гуляць у дакторак. Прыложаць то адна, то другая галаву да Соніных грудзей і так пільна слухаюць, што аж вочы заплюшчваюць. Толькі нічога не чуваць: Соня спакойна ляжыць на сваёй пасцелі.

Пасля таго як маці расказала пра сэрца і назвала Галю дакторкай, і з'явіўся ў дзяўчынак вялікі сакрэт. Пра яго Аля і Галя не сказалі нават тады, калі бацька назаўтра раніцай шукаў свой гадзіннік. Яны абедзве ляжалі пад адной коўдрай на пасцелі і знарок моцна саплі, каб усе думалі, што яны спяць. А самі прыжмуранымі вачыма трывожна пазіралі адна на адну.

Шукаць прапажу памагала бацьку і маці. Перамацалі пасцель, лазілі пад сталом, пад ложкам — гадзінніка нідзе не было.

— Гэта ж не іголка, што між дошак у шчыліну закоціцца і не відаць,— раззлавалася нарэшце маці.— Успомні, дзе згубіў, ды ідзі пашукай там.

— Кажу табе, што прынёс дахаты. Яшчэ на двары сусед нават пытаў, каторая гадзіна. Я паглядзеў ды зноў у кішэньку паклаў,— даводзіў бацька.

Так ён і пайшоў на работу, не разумеючы, куды падзеўся гадзіннік.

Як толькі бацька выйшаў за дзверы, дзяўчынкі адразу ж усталі, зашыліся ў куточак і пачалі забаўляцца са сваёй лялькай. Галя расшпіліла на плячах у Соні сукенку і прышыла да яе нешта загорнутае ў чысценькую стужачку. Потым дзяўчынкі доўга не выпускалі з рук сваю сяброўку. То адна, то другая прыкладвала да яе грудзей вуха і ўслухоўвалася, як сапраўдны доктар. Галя нават трубачку зрабіла з паперы, каб лепш было слухаць.

Калі ж Аля доўга не адымала галавы ад Соніных грудзей, дык Галя напамінала ёй:

— Хопіць, а то ёй дыхаць цяжка.

Цяпер ім здавалася, што Соня сапраўды жывая, толькі спіць.

— Чым гэта вы займаецеся тут? — зацікавілася нарэшце маці і падышла да дзяўчынак.

— Мамачка, мы ў дакторак гуляем! Паслухай, як у Соні стукае сэрца: тук-тук, тук-тук,— адказала Аля.

— Якое ж у яе сэрца,— засмяялася маці і хацела ўжо ісці, але Галя ўчапілася за руку і пацягнула яе назад.

— А ты паслухай, мамачка, сама. Ну паслухай. Хіба табе цяжка?

Маці вярнулася і таксама прыклала вуха да грудзей лялькі. «Што за дзіва? Сапраўды стукае. Толькі... што ж гэта такое? Бацькаў гадзіннік?!» — здзівілася маці і сур'ёзна спытала ў Галі як у старэйшай:

— Гэта твая работа, школьніца?

Дзяўчынка маўчала.

— Мамачка, не сварыся,— заступілася за сястру Аля.— Мы хацелі ў сапраўдных дакторак гуляць.

— А хіба вы не чулі, як мы цэлую раніцу шукалі гадзіннік?

Аля і Галя глянулі адна на адну і нічога не адказалі. Ды і што было гаварыць? Мама і сама ведала, што яны чулі.

...Вечарам маці пра ўсё расказала бацьку, як той вярнуўся з работы. Аля і Галя ў гэты час ціхенька сядзелі ў суседнім пакоі і думалі: дарує ім бацька ці не. А бацька слухаў і ад душы рагатаў з Галінай выдумкі. Потым паклікаў дзяўчынак і сказаў:

— Будзеш, відаць, Галечка, доктарам, як вырасцеш, а ты, Алечка, памочніцай у яе. Толькі другі раз не бярыце гадзінніка на гульню, а то...— і ён пагразіў пальцам.

Дзяўчынкі зразумелі, што азначаў падняты ўгору бацькаў палец, і былі вельмі рады, што ўсё так добра скончылася.

А бацька і сам быў рад не менш за дачок, што знайшлася прапажа.

## ТАРАС ХАДКЕВІЧ

Тарас Канстанцінавіч Хадкевіч нарадзіўся 7 сакавіка 1921 г. у вёсцы Шайцерава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Вучыўся ў Полацкім педагагічным тэхнікуме (1927—1929), Беларускім дзяржаўным вышэйшым педагагічным інстытуце (1931—1933). Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная Полаччына» (1929—1931), «Чырвоная змена» (1933—1934), «Звязда» (1936—1941, 1945—1950), «Літаратура і мастацтва» (1950—1952). Быў літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (1953—1972). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Т. Хадкевіч пачаў друкавацца ў 1926 г. На старонках газеты «Чырвоная Полаччына» і часопісаў «Малады араты» і «Маладняк» былі надрукаваны першыя вершы, якія затым склалі зборнік «Смялей, таварыш!» (1932).

У пасляваенны час Т. Хадкевіч перавагу аддае прозе. Выйшлі яго кнігі «Братэрства» (1948, аповесць і апавяданні), «Вяснянка» (1949, аповесць), «Рэха ў гарах» (1951, аповесць), «Даль палявая» (1959, раман), «Сяброўства» (1952, аповесці і апавяданні), «Сад у квецені» (1966, апавяданні і нарысы), «Песня Дзвіны (1975, раман). Пісьменнік вядомы як аўтар нарысаў «Шлях да першынства» (1939), «Мая Беларусь» (1961), «Нафтагігант на Дзвіне» (1963), сааўтар кнігі «Мы раскажам пра Мінск» (1964).

Для юнага чытача Т. Хадкевіч пісаў апавяданні, якія ўвайшлі ў зборнікі «За сінім лесам» (1951), «На новым месцы» (1954), «Спеюць яблыкі» (1959), «Жылабыла казка» (1967), «Дзвіна пайшла» (1968), «Як вырас абеліск» (1972), «Крынічка» (1983).

Памёр Т. Хадкевіч 14 жніўня 1975 г.

### ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА

Мне ішоў восьмы год, а брату Антосю дванаццаты, калі мы ўпершыню ўбачылі чырвонаармейцаў. Канчалася зіма дваццатага года. Ішла вайна з белапалякамі. У нашай мясцовасці, праўда, значных баёў не было — лясная глухамань тут, далёкая ад важных дарог.

Мы ведалі, што за некалькі вёрст на захад ад нашай вёскі, у павятовым гарадку, стаяць белапалякі, а на ўсходзе, у мястэчку,— чырвоныя. Наша ж вёска знаходзілася на нічыйнай зямлі, у нейтральнай паласе. Ні тых, ні другіх мы не бачылі, адно чулі, што недзе там адбылася сутычка, а там польскія легіянеры зрабілі напад на вёску; у лесе нібыта паявіліся ўзброеныя нашы людзі, што называюць сябе партызанамі.

Нямала розных чутак хадзіла тады — час быў вельмі неспакойны, трывожны.

Але вось неяк у ясны перадвясенні дзень у наша невялікае, глухое Залессе завітаў чырвонаармейскі атрад. Увайшла не сказаць каб надта вялікая калона, а за ёй абоз — фурманак дзесяць. Вёска запоўнілася людской гамонкай, іржаннем коней, бразгатам зброі.

Чырвонаармейцы былі і зусім маладыя, бязвусыя, і пажылыя, з барадамі, апранутыя як хто: хто ў доўгім шынялі, хто ў скуранцы; у аднаго на нагах стаптаныя боты, у другога чаравікі з абмоткамі, у трэцяга латаныя валёнкі. І ў той жа час выгляд ва ўсіх што ні ёсць баявіты: скрыжаваныя на грудзях патранташы, вінтоўкі за плячыма, роўная, цвёрдая хада ў страі.

Здаліся яны нам людзьмі вясёлымі, добрымі, сустрэлі іх у вёсцы як сваіх блізкіх.

У нашай хаце, хоць яна не была лепшая сярод іншых, спыніўся камандзір атрада. Немалады, вастраносы, вусаты чалавек у вастраверхім шэрым шлеме з пяцікутнай зоркай, увесь у рамянях, з нашытымі на грудзях кароткай чорнай скуранкі чырвонымі палоскамі. Чырвонаармейцы называлі яго «таварыш камбат» або «таварыш Казлоў», а мы з Антосем неўзабаве сталі зваць па-свойму — «дзядзька Міхал». Для нас ён быў чалавек незвычайны, які нібы з'явіўся з казкі пра ваякаў-волатаў.

Я крышку саромеўся дзядзькі Міхала і чырвонаармейцаў, што бясконца заходзілі да яго, туліўся больш у закутках і ўпотайкі назіраў за імі, а Антось так і круціўся каля іх. Антось ужо быў пісьменны хлопец, ён тры гады хадзіў у школу, і дзядзька Міхал даручаў яму чытаць нашым аднавяскоўцам газеты і лістоўкі, што знайшліся ў атрадзе. Ды і да зброі Антось меў нястрымную цягу, ён ухітраўся разабраць і пачысціць вялізны рэвальвер, які звычайна боўтаўся ў драўлянай кабуры пры баку ў дзядзькі Міхала.

— Маўзер,— з захапленнем тлумачыў мне Антось.— Б'е далёка і трапна. От штучка!..

— Баявы ты хлопец,— казаў часам, ласкава пазіраючы на Антося, дзядзька Міхал.— Было б табе крыху больш год, узяў бы да сябе ў атрад, разам абаранялі б рэвалюцыю.

— А вы вазьміце, дзядзечка,— прасіўся Антось.— Я ўсё магу, не пашкадуеце.

— Не, рана яшчэ.

Атрад прастаяў у нас нешта з тыдзень — ці то гэта быў адпачынак, ці то чырвонаармейцы вялі разведку ў кірунку павятовага гарадка — і сабраўся ў паход. Праводзіла яго ўся вёска — адны са шкадаваннем, а другія, мабыць, з радасцю ад таго, што ў вёсцы стане цішэй. Дзядзька Міхал на развітанне запэўніў вяскоўцаў, што белапалякаў хутка прагоняць і надыдзе спакойнае, мірнае жыццё.

Заўважыўшы потым у натоўпе Антося, ён паклікаў яго да сябе, паляпаў па плечуку і, выняўшы з кішэні нейкую маленькую рэч, сунуў яму ў руку.

— Вось табе на ўспамін... Расці вялікі, дужы і будзь бальшавіком.

То была чырвоная зорка, такая ж, якая ўпрыгожвала вастраверхі шлем дзядзькі Міхала. Антось зацiснуў яе ў жмені і руку засунуў глыбока ў кішэню картовых штаноў. Калі мы пасля провадаў чырвонаармейцаў прыбеглі дадому, ён адшукаў у запечку старую бацькаву шапку. У той шапцы бацька некалі вярнуўся, паранены, з вайны з немцамі. Яна была зашмальцаваная, з аколышам невыразнага, бляклага колеру, але яшчэ з кукардай — значком царскай арміі.

Антось выкалупаў кукарду і на яе месца прыладзіў чырвоную зорку. Шапка як быццам стала навейшая. Якраз у гэты момант у хату ўвайшоў бацька. Паглядзеў, усміхнуўся скрозь рудыя вусы, махнуў рукой.

— Правільна зрабіў, сынку. Насі.

— Пайшлі, Юзік, на вуліцу,— насунуўшы шапку на самыя вушы, прапанаваў мне Антось.

— Пайшлі.

Па вуліцы мы крочылі поруч, стараючыся ступаць нага ў нагу, як чырвонаармейцы, і настрой у нас быў баявы, нават зацягнулі пачутую ад чырвонаармейцаў песню:

Смело мы в бой пойдем
За власть Советов...

Наша ўрачыстае шэсце, аднак, было нядоўгае. Адкуль ён браўся насустрач, Васька Курчонак, з якім Антось здаўна не ладзіў. Васькаў бацька быў у свой час валасным старастам, хата ў іх была вялікая, новая, крытая гонтамі, жылі Курчонкі багата. Васька заўсёды хадзіў з задзёртым носам, на ўсіх пазіраў звысоку — «не раўня вы мне, маўляў» — і не прапускаў зручнага выпадку, каб пакрыўдзіць каго з нас.

Ён загарадзіў нам дарогу. Вяснушкаваты круглы твар скрывіўся:

— Што, у бальшавікі запісаліся?

— Н-ну,— смела адказаў Антось.

Нічога не сказаўшы далей, Васька сарваў з Антося шапку і са злосцю шпурнуў пад плот.

— Вось вам!

Хоць ён быў плячысты, рослы хлопец, амаль на галаву вышэйшы за Антося, Антось не завагаўся ні на міг. Падскочыў і з усяго размаху пляснуў Ваську ў вуха. Той каршуном накінуўся на Антося. А тут падбегла яшчэ колькі хлапчукоў. Адны з іх адразу ж сталі на наш бок, другія — на Васькаў. Завязалася такая валтузня пасярод вуліцы, што падталы снег, змешаны з граззю, распырскваўся вакол; чародка курэй непадалёк з кудахтаннем разляцелася ва ўсе бакі.

Я атрымаў ад некага моцную аплявуху, гатоў быў заплакаць і нават пабегчы дадому паскардзіцца маці, але пачуў з хлапечай кучы Антосеў голас: «Юзік, трымайся!» — і рынуўся ў кучу, не разбіраючыся, што і як там.

Доўга ці не працягвалася б наша бойка, каб на шум не выйшла з хаты Курчонкаў Васькава бабка Агата. Жанчына яна была злая, хадзіла з бярозавым кіем, які быў ёй па плечы, ад гэтага кія не раз пера-

падала нам па прычыне і без прычыны. Сапраўдная баба-яга.

— Ах вы, падшывальцы!.. Ах вы, нягоднікі! — Бабка Агата пачала лупцаваць кіем па нашых плячах і галовах.

Куча ўмомант рассыпалася.

Засталіся перад бабкай мы з Антосем ды Васька — ён заціскаў пальцамі разбіты нос. Бабка падступіла да Антося, кашчавы падбародак яе дробна ўздрыгваў.

— Гэта ўсё ты, галапузы завадатар...

— Не я, а ваш Васька-задзіра,— паспрабаваў апраўдацца Антось, але бабка зноў пагрозліва падняла кій.

— Скажы яшчэ слова, атрымаеш дабаўку...

Мы кінуліся да плота, адшукалі шапку, з-за якой узгарэлася бойка, і пашыбавалі дадому. Маці, сустрэўшы нас у сенцах, усплеснула рукамі.

— Дзе гэта вы так перамазаліся?.. І сіняк у цябе, Антось, пад вокам...

— Ай, дурэлі, мама, вось і перапала крыху...

Мы з Антосем старанна вымылі шапку, вычысцілі зорку, каб яна блішчала, як новая. Паклалі шапку на пяколак — няхай сохне, заўтра зноў мы выйдзем на вуліцу на злосць Ваську Курчонку і яго прыхільнікам.

Але назаўтра здарылася нечаканае. Каля паўдня ў вёску ўляцелі белапольскія коннікі. Відаць, гэта была разведка — чалавек дваццаць. Вестку аб гэтым прынёс у хату бацька. Ён быў вельмі ўстрывожаны, сказаў маці:

— Трэба схаваць што паспеем у яму за хатай, а то яшчэ пачнуць шныпарыць тут.

— Ат, што яны ў нас возьмуць. Лахманы адны. Няхай Курчонкаў патрасуць...

— Ну-у, Курчонкаў...— няпэўна прабубніў бацька.

Убачыўшы на пяколку шапку з чырвонай зоркай, ён загадаў Антосю:

— Зорку з шапкі здымі.

— Не здыму, татка,— заўпарціўся Антось.

— Ого, які храбрэц! — Аднак, на дзіва нам, бацька не раззлаваўся, а лагодна сказаў: — Тады схавай шапку.

— Схаваць схаваю,— згадзіўся Антось.

Тым часам нехта з вуліцы пастукаў у аконную раму і зычна прамовіў:

— Загадана ўсім з'явіцца на сход. Да хаты Курчонкаў.

— Не высоўвайся там асабліва на вочы,— параіла маці бацьку, калі ён выходзіў з хаты.— А вы куды, пустадомы? — заўважыўшы, што і мы з Антосем гатовы шмыгнуць следам за бацькам, крыкнула яна.— Сядзіце ў хаце.

Але як толькі маці выйшла некуды, мы вопрамеццю выкаціліся з хаты, і праз якіх дзве хвіліны Антось ужо сядзеў на слупку Курчонкавага плота, я стаяў, падпёршы плот плечуком. Каля ганка Курчонкаў тоўпіліся мужчыны, жанчыны, моладзь і такія падшывальцы, як мы. Гаманы ў натоўпе не чулася, твары ў людзей былі

панурыя, насцярожаныя; калі хто з малых падаваў голас, яго тут жа сярдзіта абрывалі.

Па вуліцы раз'язджалі на конях польскія салдаты. Коні гладкія, укормленыя, адной масці. На салдатах — дзіўныя вугластыя шапкі, жаўтлявыя шынялі, блішчастыя боты са шпорамі. Апранутыя ў аднолькавую форму, легіянеры выглядалі лепш, чым чырвонаармейцы, што тыдзень стаялі ў нас, але гэта былі прышлыя, чужыя людзі. І гналі іх на вайну, як казалі нам старэйшыя, за чужую справу.

З хаты Курчонкаў выйшаў на ганак афіцэр пры шаблі, з бізуном у руцэ, за ім — сівабароды Курчонак без шапкі, але ў кажусе, падпяразаным шырокім поясам з кутасамі.

Афіцэр акінуў позіркам натоўп, спытаўся:

— Чырвоныя ў вас былі?

Паколькі натоўп маўчаў, адказаў стары Курчонак:

— Я ж казаў вам, пане паручнік, што былі.

— Куды паехалі адсюль?

— Хто іх ведае, нам яны не казалі.

— А партызаны ёсць? — зноў спытаўся афіцэр.

— Якія тут партызаны,— адказаў на гэты раз нехта з натоўпу.— Вёска наша ціхая, глухая...

— Бальшавікі?

Ля самага ганка стаяла бабка Агата. У чорным паліто, сагнутая, вуглаватая, са зморшчаным цёмным тварам, з кіем у руцэ, яна такі нагадвала мне бабу-ягу. Бабка раптам падняла свой кій і паказала ім на Антося.

— Вунь ён, бальшавік,— прагучаў у цішыні яе глухаваты, надтрэснуты голас.

Прагучаў так знянацку і недарэчы, што нават стары Курчонак зморшчыўся, скалануўшыся.

Антось сядзеў на плоце, боўтаючы нагамі ў падраных атопках. Ён быў без шапкі, рудаватыя валасы раскудлаціліся, на кірпатым твары застыла ўсмешка. Я сустрэўся з ім позіркам і ўсярэдзіне ў мяне быццам усё перавярнулася. Вось-вось, думаю, афіцэр крыкне Антосю: «Рукі ўгору!» І павядуць майго Антося немаведама куды, а то возьмуць яшчэ і застрэляць тут жа. Дзе наш татка? Чаму ён маўчыць?

Атрымалася, аднак, зусім інакш. Афіцэр паглядзеў на Антося, пагардліва скрывіў вусны і — замахнуўся бізуном на бабку Агату.

— Ах ты, старая качарга! Насміхацца з мяне?

— Што вы, што вы, паночку! — залямантавала бабка Агата, загароджваючыся далоняй ад удару.

У натоўпе пачуўся прыглушаны смех. Антось саскочыў з плота. Нам з ім рабіць тут больш не было чаго. Мы паціху ўцёрліся ў гушчу натоўпу, а затым неўпрыкметку выбраліся і штосілы пабеглі дадому.

— Спалохаўся? — спытаўся я ў Антося.

— Аніколечкі!

Праўду ён казаў ці не, толькі я глядзеў на яго з яшчэ большай, чым раней, павагай.

Потым мы даведаліся ад бацькі, што афіцэр загадаў вяскоўцам накарміць салдат, сабраць пару кошыкаў яек і на гэтым сход рас-

пусціў. Пад вечар палякі пакінулі вёску. «Добра абышлося, дзякаваць богу,— казаў бацька.— А ты, Антось, глядзі ў мяне, скруціш галаву нізавошта».

Праз некалькі дзён да нас дайшлі чуткі, што чырвоныя пачалі наступленне і пагналі белапалякаў з нашай зямлі. Баі ішлі недзе далёка, да нас нават водгулле страляніны не даходзіла. Антось зноў надзеў шапку з чырвонай зоркай. Па вуліцы мы цяпер крочылі не ўдвух, а з цэлай гурмой хлапчукоў. Усе стараліся ісці ў нагу. Як чырвонаармейцы. І спявалі — хоць не вельмі зладжана, але на ўвесь голас:

Смело мы в бой пойдем
За власть Советов...

Васька Курчонак больш нас не чапаў.

...Антось загінуў на фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ да вайны ён скончыў ваеннае вучылішча, у вайну камандаваў батальёнам, як колішні наш знаёмы таварыш Казлоў. Я быў на вайне таксама, яна пакінула ў мяне некалькі ран. Сярод узнагарод, атрыманых мной, ёсць ордэн Чырвонай Зоркі. Калі я гляджу на яго, заўсёды ўспамінаю тую першую чырвоную зорку, якую мы з Антосем у дзяцінстве так заўзята абаранялі.

Напэўна, мы і тады ўжо адчувалі яе нязгаснае, жыватворнае святло.

## НА ЛЫЖАХ

Што можна параўнаць з той прыемнасцю, якую адчуваеш, калі ў студзеньскі марозны дзень імчышся на лыжах з крутога ўзгорка! Здаецца, цябе нясуць наперад нябачныя крылы, і вецер, што нядаўна дзьмуў у спіну, раптам павярнуўся табе насустрач — б'е снегавым пылком у разгарачаны твар, тонкім посвістам аддаецца ў вушах. Сэрца заходзіцца ад хуткасці і адчування неабдымнага прастору — быццам ты, не кранаючыся зямлі, ляціш у гэтым прасторы, вольны і лёгкі, як птушка. Шпарчэй струменіць у целе кроў, і кожны твой мускул спружыніць, наліваецца новай сілай.

У аколіцах вёскі Селішча, куды прыехаў Рыгорка на зімовыя канікулы да дзеда Хведара, вельмі многа такіх зручных для лыжнікаў узгоркаў. Поле за вёскай нагадвае хвалістае мора, якое нібыта застыла ў час вялікага шторму,— круталобыя і пакатыя ўзгоркі ўздымаюцца адзін за адным і цягнуцца аж да лесу, што цёмнай сцяной закрывае далягляд. Улетку, калі зямля квітнее ў пышнай зеляніне, яны не так кідаюцца ў вочы, а цяпер, у аднастайным белым убранні, і сапраўды падобны на замерзлыя ў шторм і зацярушаныя снегам высокія марскія хвалі.

Рыгорка не ўпершыню ў Селішчы. Ён бываў тут разы са тры ўлетку, то з бацькам, то з маці, меў сяброў, неаднойчы гойсаў з імі па аколіцах вёскі, нават ездзіў на камбайне ў час жніва, купаўся,

лавіў рыбу ў быстрай рэчцы Гарынцы, хадзіў у далёкі лес у грыбы і ягады. Бадай, нічога незнаёмага для яго тут не было. Ён любіў Селішча і сваіх селішчанскіх сяброў і ехаў сюды заўсёды з ахвотай. Але аднаго яго, ды яшчэ ў зімовую пару, адпусцілі з дому ў першы раз. Выпраўляючы ў дарогу, маці клапатліва і строга наказвала Рыгорку:

— Хлопчык ты сталы і разумны, глядзі ж, будзь асцярожны... нікуды далёка не адлучайся адзін — мала што можа здарыцца.

— Нічога не здарыцца,— сказаў на гэта бацька.— Канькі і лыжы — вось твой гарт, Рыгорка! Запомні і дзейнічай.

Канькі як канькі — на іх не вельмі разгонішся ў вёсцы па заснежаных лужынах і рэчцы. А вось лыжы — іншая рэч. Яны ў Рыгоркі новыя, іх купіў бацька ў пачатку зімы, і такія гонкія, што трэба мець вялікі спрыт, каб утрымацца на іх. Па самым непрыкметным схіле яны слізгацяць на поўны ход. І хоць Рыгорка ў горадзе хадзіў на іх толькі па двары свайго дома, ён лічыў, што дастаткова авалодаў імі. Каб маці дазволіла, ён мог бы пусціцца ўжо ў далёкае падарожжа — у гарадскі парк, а то і зусім за горад.

— Слаўная штука,— пахваліў Рыгоркавы лыжы дзед Хведар. Ён быў вопытны калгасны сталяр, майстраваў з дрэва ўсякія цудоўныя рэчы, іншы раз і лыжы для суседскіх хлопчыкаў, калі тыя настойліва прасілі яго, а тут прызнаўся: — Такіх, бадай, і я не зраблю... Фабрычныя — адна любата-а!

— Не вельмі толькі звязвайся з нашымі свавольнікамі, унучак,— папярэдзіла Рыгорку бабка Наста, узрадаваная яго прыездам гэтак жа, як і дзед.— Яны ў нас такія, што, калі хочаш, немаведама куды зацягнуць...

— Ай, кінь ты пра гэта,— з дакорам глянуўшы на бабку, перапыніў яе дзед Хведар; дружба з дзецьмі ў яго была даўняя, і ён не любіў, калі іх дарэмна абвінавачвалі ў чым-небудзь ці перашкаджалі іх звычайным забавам.— Якія яны там свавольнікі! Дзеці як дзеці. Хіба Рыгорка не такі, як яны ўсе?

Свавольнікі, як іх называла бабка Наста, а ў сапраўднасці дружныя і вясёлыя селішчанскія хлапчукі, не замарудзілі прыбегчы, як толькі даведаліся, што прыехаў Рыгорка. Чалавек восем іх на чале з Валодзем — рослым, віхрастым хлапчуком, адным з завадатараў селішчанскай дзетвары — уваліліся апоўдні ў хату дзеда Хведара. Былі тут і Міша, па мянушцы Каваль (бацька яго быў кавалём у калгасе), і камбайнераў сын Геня, і шустравокі Саўка-рыбалоў, і знаўца ягаднікаў і грыбных мясцін у лясных нетрах маленькі Косця.

Усіх іх ведаў Рыгорка і з усімі шчыра сябраваў. З многімі з іх у яго былі звязаны ўспаміны пра тыя ці іншыя летнія прыгоды. Вось толькі адзін Валодзя выклікаў насцярожанасць. Валодзя вучыўся ў шостым класе, на чатырох- і пяцікласнікаў пазіраў звысоку і не супраць быў пакпіць і пасмяяцца з іх.

Бабка Наста незадаволена паківала сівой галавой і забурчала, калі ўся гэтая шумлівая гурба затупала ля парога валёнкамі і ботамі, страсаючы снег:

— Угамону на вас няма... От жа нецярплівыя! Хлопец здарожыўся, адпачыць бы яму, а яны...

— Мы на хвіліну, бабка,— супакоіў яе Валодзя.— Здароў, Рыгор! — Ён чамусьці заўсёды называў Рыгорку па-даросламу Рыгорам.— Прыехаў, значыць?

— Прыехаў. Сёння раніцай. Аўтобусам.

— Вось і добра... А як вучышся? Ты, здаецца, у чацвёртым класе? — Валодзя прыжмурыў вочы, і ў яго голасе можна было заўважыць спагадлівую нотку.

— Троек не маю,— выразна адказаў Рыгорка, знарок прапусціўшы міма вушэй другое пытанне.

— Ты спытай, Рыгорка, Валодзю, колькі ў яго троек,— ціха азваўся маленькі Косця.

— Ды ў яго і двойкі водзяцца,— дадаў нехта другі.

— Што? — грозна азірнуўся Валодзя.— Хто гэта сказаў?

Усе змоўклі, а Валодзя стаяў, вышэйшы на цэлую галаву за астатніх, пільна ўглядаўся ў іх твары, і позірк яго як бы гаварыў: «А ну, паспрабуй, скажы яшчэ раз!» Невядома, у якім кірунку пайшла б далейшая размова, каб Міша Каваль не прыкмеціў у кутку пакоя Рыгоркавы лыжы.

— Ого-о! — усклікнуў Міша.— Гляньце, хлопцы, у нас яшчэ адзін лыжнік прыбавіўся... А якія адмысловыя лыжы! Новенькія... Ты хоць раз хадзіў на іх, Рыгорка?

— А як жа! Яны ў мяне з самай восені,— не без гонару адказаў Рыгорка.

Лыжы пайшлі па руках. Іх аглядалі з усёй уважлівасцю, мацалі, пагладжвалі. Валодзя і той забыўся на сваю нядаўнюю злосць і ўжо разблытваў раменьчыкі, каб прыстасаваць іх да сваіх валёнак. Рыгорка быў задаволены — ніхто ў лыжах не знайшоў ніякай заганы. «У мяне такія ж самыя,— хацеў пахваліцца Геня, але адразу адступіў.— Праўда, яны не новыя, старой ўжо».

— Што ж, хлопцы,— сказаў Валодзя. Мацаванне ў Рыгоркавых лыжах было якраз яму па назе.— Забірайма кожны свае лыжы і гайда на Валатоўкі! Га?

Хлопцы ў адзін голас ухвалілі прапанову:

— Пайшлі!

— Мы зойдзем па цябе, Рыгор,— ужо з сенцаў кінуў Валодзя.

Праз якую гадзіну Рыгорка з сябрамі быў за Селішчам, на полі. Надвор'е стаяла пахмурнае, у паветры ледзь-ледзь церушыў снег, але снегавы шарпак на зямлі быў трывалы і моцны. Амаль усе прыйшлі на самаробных лыжах, зробленых дзедам Хведарам, якія адрозніваліся ад Рыгоркавых хіба што менш зграбным выглядам. Тым не менш, як толькі хлопчыкі ўзышлі на першы палявы ўзгорак, кожны захацеў з'ехаць уніз па адхону на лыжах Рыгоркі.

Рыгорку ажно не верылася, калі ённазіраў, якія выкрутасы выробляў на яго лыжах Валодзя. Ён то прысядаў на хаду, вухкаючы ад задавальнення, то спыняўся на ўсім разгоне, уздымаючы слупы снегу, то рабіў нечаканы круты паварот, і снегавая замець курэла

за ім следам. Не, што ні кажы, гэта быў сапраўдны майстар, куды там Рыгорку да яго! Рыгорка, з'язджаючы па адхону, убіраў галаву ў плечы, сутуліўся і моцна сціскаў кійкі, трымаючы іх напагатове, каб паспець, калі трэба будзе, затармазіць. Ён некалькі разоў упаў, выхаляўся ў снезе; крыўда і злосць на самога сябе даймалі яго.

На шчасце, сябры як быццам не заўважалі гэтага. Яны разбрыліся па полі, ганяліся адзін за адным, і вясёлы гоман абуджаў наваколле. Калі пачало змяркацца, Валодзя сабраў усіх у адзін гурт і голасна абвясціў:

— Заўтра, хлопцы,— у кар'ер!.. Вось там раздолле. Пойдзем?

— Абавязкова,— адказаў за ўсіх Міша Каваль.

Ідучы дахаты, Валодзя ўвесь час трымаўся каля Рыгоркі і, застаўшыся адзін на адзін, лагодна загаварыў:

— Слухай, Рыгорка, што я табе скажу.

— Што?

— Давай памяняемся лыжамі. Мае, можа, крыху і горшыя на выгляд, але па хуткасці не ўступяць тваім.

— Назусім?

— Але.

— Не-е,— адмоўна пакруціў галавой Рыгорка.

— Хочаш, дам табе ў прыдачу складаны ножык. Мішаў бацька зрабіў у кузні. Цуд, а не ножык.

— Не-е.

— А то дам яшчэ белых трусянят, завязеш дахаты — жывы куток будзе ў доме. Праз год развядзеш цэлы статак.

— Не! — рашуча адказаў Рыгорка, хоць прыдача, якую дакляраваў Валодзя, і падабалася яму.

— У-у-у, жмут...— скрозь зубы прамовіў Валодзя і, са злосцю адпіхнуўшыся кіямі, памчаўся наперад.

Кар'ер, да якога назаўтра накіраваліся юныя лыжнікі, знаходзіўся кіламетры за тры-чатыры ад вёскі, за ўзлессем. Гады два назад у гэтым месцы выбіралі гравій і пясок для будаўніцтва дарогі — экскаватары выкапалі катлавіну радыусам метраў трыста. Месцамі берагі катлавіны былі стромкія, амаль як сцяна, месцамі ж — пакатыя, як водмель на рэчцы, дно няроўнае — з пагоркамі і выемкамі. Снег пакрыў тоўстым пластом берагі і адхоны, павіс вялізнымі белымі шапкамі на абрывах, заслаў пуховай коўдрай дно.

Як і казаў Валодзя, тут было раздолле для лыжніка: хочаш — ляці з абрыву, каб аж дыханне заняло, а хочаш — разганяйся паволі і потым гойсай, куляйся па ўзгорках. Селішчанскія хлопчыкі добра ведалі падыходы да кар'ера і, абмінуўшы ўзлессе, з галёканнем рассыпаліся па паляне і памчаліся кожны сваім маршрутам. Валодзя першы з разгону нібы нырнуў у бяздонне і праз хвіліну быў ужо на другім канцы катлавіны. Следам за ім з'ехалі Міша Каваль, Геня і Косця.

Рыгорка ж, які ішоў следам за Валодзем, спыніўся на абрыве ў нерашучасці. Яму здалося, што ён стаіць на краі пяціпавярховага дома. Ад вышыні заплюшчваліся вочы. А знізу яму наперабой крычалі:

— Э-ге-эй, Рыгорка!.. Давай!..

— Э-э,— пачуў ён насмешлівы голас Валодзі.— Ён жа жмут ды яшчэ і баязлівец.

Як ні крыўдна было Рыгорку ад такіх слоў, усё ж з'ехаць уніз ён не рашаўся — тупаў на месцы, пазіраў у бакі, шукаючы пакатага схілу, пакуль лыжы неяк самі не саслізнулі і панеслі яго з абрыву. Паўдарогі Рыгорка яшчэ трымаўся на нагах, нахіліўшыся наперад усім тулавам, а потым пахіснуўся, упаў і пакаціўся кулём, пасоўваючы перад сабой грузны вал снегу. Ён не чуў, як рагаталі сябры, не адчуваў болю, а адно толькі непакоіўся за лыжы — хоць бы не зламаць.

— Ударыўся? — дапамагаючы яму падняцца, спытаўся маленькі Косця.

— Не,— разгублена адказаў Рыгорка і, зірнуўшы на абрыў, прашаптаў: «У-ух і высока ж!»

Паўтарыць свой «палёт» ён не адважваўся. Але, назіраючы, як гэта робяць другія, і перш за ўсё той жа неўгамонны і спрытны Валодзя, ад усёй душы зайздросціў хлопцам. «Няўжо я і на самай справе баязлівец і няўмека? — запытваў ён у самога сябе ў думках, прыгадваючы папрок Валодзі, і тут жа ўпэўніваў: — Не, не можа быць!»

Надыходзіў адвячорак. Налётаўшыся ўволю і парадкам замарыўшыся, хлопчыкі сабраліся дахаты. Рыгорка, выбраўшыся з кар'ера, прыпыніўся на тым самым месцы абрыву, з якога нядаўна так неспадзявана зляцеў. Сябры пайшлі ўжо ў абход узлесся, нехта з іх паклікаў Рыгорку, і ён крыкнуў у адказ: «Раменьчыкі папраўлю і даганю». А сам, пераканаўшыся, што ніхто за ім не назірае, сабраўся ўвесь у камок, напружыніўся і — гахнуў па знаёмаму следу. Цяпер ён не ўпаў, а прамчаў цераз увесь кар'ер, гойдаючыся на пагорках.

— Ох і хораша! — радасна ўсклікнуў Рыгорка. Сэрца яго білася часта-часта, ён з прагнасцю ўдыхаў паветра, але стомленасці як не было — усё цела, кожны мускул напаўняла бадзёрасць. Ён гатоў быў застацца тут і яшчэ разоў пару з'ехаць, але ўжо вечарэла.

Сяброў не было відаць, іх галасы даляталі здалёку, з-за лесу. «А я пабягу напрасткі, праз лес, і ўмомант даганю іх»,— вырашыў Рыгорка. Тым больш, што гэты лес быў знаёмы яму з лета і не палохаў.

Лес сустрэў Рыгорку густым пахам хвоі, снегавымі купінамі, гурбамі і ціхім шумам ад ветру, што гуляў недзе ў верхавінні. Як прыгожа і велічна было тут! Магутныя дрэвы спляла заснежаныя вецці, стварыўшы дзівосныя снегавыя аркі, вароты, застрэшшы. Як намаляваныя ў кніжцы, стаялі маладыя ялінкі, трымаючы на пругкіх зялёных лапах вялізныя шапкі снегу. От бы адну з такіх стройных пушыстых ялінак перанесці ў хату ды асвятліць і прыбраць па-навагодняму — якое хараство было б!

Куды варты былі тыя ялінкі, што маці купляла і прыбірала для Рыгоркі пад Новы год, у параўнанні з гэтымі. Тыя былі рэдкія і кволыя, не падобныя і блізка на гэтыя... Рыгорка задумаўся, успомніў дамоўку. Як там, што цяпер дома? Маці, напэўна, думае аб ім і,

як звычайна, непакоіцца. Яна і не здагадваецца, якую перамогу атрымаў ён сёння тут, у кар'еры, і вось цяпер ідзе адзін па лесе, як адважны паляўнічы, і нічога яму не страшна. А гэты Валодзя пасмеў яшчэ пагардліва папракаць: « Баязлівец». Пачакай, Валодзя, ты яшчэ пераканаешся ў сваёй памылцы!

Рыгорка асцярожна абыходзіў купіны, кусты, вываратні, пятляў паміж іх, да ўсяго прыглядаўся і прыслухоўваўся. Вось нечыя сляды — дзве лапкі побач і адна наперадзе — абабеглі вакол куста і павялі ў гушчар. А вось нехта ішоў грузны, праклаўшы ў лесе след глыбокі і роўны, лапа за лапай. З верхавіны высокай яліны ўпала жоўтая шышка, пасыпаўся снег — можа, там скача вавёрка? Ах, каб убачыць яе! Недзе ўбаку прарэзліва піскнула птушка, ёй адгукнулася другая. Не такі ўжо зімою маўклівы лес, як здаецца, калі да яго падыходзіш з поля. Ён і зараз жыве сваім жыццём.

Мінула, мабыць, з паўгадзіны, як Рыгорка ўвайшоў у лес, а прасвету ўперадзе ён усё не бачыў. «Не інакш, як узяў убок,— падумаў ён нарэшце-і затрывожыўся: — Гэтак і заблудзіцца лёгка!» Адзіны выхад быў — вярнуцца, прайсці па сваім жа следзе. Рыгорка і зрабіў бы так, але раптам, не ўтрымаўшыся на гурбіне, ён імкліва з'ехаў у яловы гушчар і моцна ўдарыў правай лыжай у нейкі корч. Лыжа трэснула — Рыгорку здалося, што аж водгулле пайшло па лесе. Ён адвязаў лыжу і агледзеў — яна была надламана, і ісці на ёй нельга было. Рыгорка ў роспачы апусціўся на снег.

Ціха шумеў вецер у верхавінні ялін і сосnaў, то тут, то там рыпелі разлапістыя сукі пад снегавым цяжарам, час ад часу з глухім шастаннем спаўзалі, падалі з іх камякі снегу, а хлопчык сядзеў і плакаў. Ён быў адзін у гэтым гушчары, а тут набліжаўся вечар і шэрань ужо ахутвала лес.

— Рыго-о-рка!.. Эге-гэ-эй!.. Дзе ты там? — уварваўся ў лясную цішыню зычны, танклявы голас. Яго падтрымала яшчэ некалькі галасоў: — Эге-эй!.. Рыго-о-рка-а!

«Валодзя? Хлопцы?» — Рыгорка ўскочыў, хуценька выбраўся з гушчару і, зняўшы рукавічкі, выцер снегам твар.

—Тут я... Сюды, хлопцы! — крыкнуў ён на ўсю сілу.

Аднекуль з-за прысадзістых ялін вынырнула трое лыжнікаў. Яны ішлі ланцужком — гэта былі Валодзя, Міша Каваль і Косця. Заснежаныя, задыханыя, з разгарачанымі, ружовымі тварамі, яны акружылі Рыгорку і, убачыўшы на снезе зламаную лыжу, адразу зразумелі, у чым справа. Лыжа пераходзіла з рук у рукі, яе круцілі так і гэтак, аглядаючы, і твары хлопчыкаў выказвалі і жаль, і шчырае спачуванне Рыгорку. «Ай-яй-яй...» — журботна прыгаворваў Валодзя, потым падумаў і махнуў рукой:

— Дармо, не бядуй, Рыгор... Дзед Хведар змайструе такую ж самую, можаш не сумнявацца. А цяпер бяры мае лыжы і пайшлі — бач, ужо цямнее. Бяры, бяры! Я пешкі дабяруся.

— А мы глядзім,— казаў па дарозе Рыгорку Косця,— няма цябе. Куды ж, думаем, ён мог падзецца? Вярнуліся ў кар'ер — няма. Бачым — лыжны след пацягнуўся да лесу. Рашыў скараціць шлях, думаем, вось дзівак! Цяпер і на лыжах праз лес не проста прабрац-

ца... Ну, мы і махнулі следам. А прызнайся, боязна было аднаму ў лесе?

— Ані-ні,— запэўніў Рыгорка, хоць і разумеў, што наўрад ці паверыць яму.

Калі выйшлі з лесу на поле — прыкметна пасвятлела. Ад узлесся, на ўзгорку, пачынаўся доўгі і разам з тым даволі круты спуск. Ледзь не да самага Селішча, якое ляжала цяпер перад вачамі, як на далоні: два роўныя рады хат у нізіне паабапал бальшака. З комінаў хат плылі, завіваліся блакітныя вячэрнія дымкі.

— Можа, з'едзем разам,— прапанаваў Рыгорка Валодзю, заўважыўшы, як таму цяжка ісці па снегавой цаліне.

— Паспрабуем,— ахвотна згадзіўся той і, з усіх сіл падпіхнуўшы Рыгорку, сам стаў на лыжы за ім ззаду.

Лыжы памчалі, усё больш і больш набіраючы разгон. І ўжо снегавы пылок прыемна ўдарыў у твар, і сустрэчны ветрык засвістаў у вушах, намагаючыся сарваць шапку з галавы. Міша Каваль і Косця, голасна галёкаючы, імчаліся побач. І так хораша было Рыгорку і ад гэтага шпаркага руху, і ад Валодзевых дужых рук, якія ён адчуваў на сабе, і ад цёплай прыязнасці да Валодзі, для якога ён не пашкадаваў бы цяпер ні лыжаў, ні чаго-небудзь іншага, самага дарагога, што было ў яго, Рыгоркі.

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

Эдзі Агняцвет (Эдзі Сямёнаўна Каган) нарадзілася 11 кастрычніка 1913 г. у Мінску. У 1934 г. скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Беларускага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага інстытута (цяпер Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага).

Працавала рэдактарам дзіцячага радыёвяшчання (1934—1938), кансультантам у Саюзе пісьменнікаў БССР (1939), супрацоўнічала ў аддзеле паэзіі часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1940—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася ў эвакуацыі ў Ташкенце. Вярнуўшыся ў вызвалены Мінск, працавала рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1945—1946).

Вершы Э. Агняцвет пачалі друкавацца ў 1931 г. на старонках газет «Піянер Беларусі» і «Чырвоная змена». Першы зборнік вершаў «Маё пакаленне» з'явіўся ў друку ў 1935 г., затым выйшла кніга «Вершы» (1938), паэма «На беразе Волгі» (1940). Творы ваенных гадоў склалі зборнікі вершаў «Другу на фронт» (1942, на рускай мове), «Простые песни» (1946, на рускай мове). За пасляваенны час выйшлі паэтычныя кнігі «Край мой родны» (1945), «Дарога ў будучыню» (1949), «Беларуская рабіна» (1959), «Лірыка» (1965), «Круглы год» (1966), «Жаданне» (1971), «Спадзяванне калыханак» (1983), «Закаханым» (1986).

Асабліва плённа працуе Э. Агняцвет у галіне дзіцячай літаратуры. Вершы, напісаныя ў гады вайны, склалі зборнік «Михасек» (1944, у перакладзе на рускую мову). У пасляваенныя гады і апошнім часам выдадзены зборнікі «Васількі» (1947), «Ля піянерскага кастра» (1952), «Твае таварышы» (1957), «Госць з далёкай зямлі» (1958), «Першы ліст» (1966), «Падарожнік» (1969), «Піянерская гама» (1970), «Краіна маленства» (1975), «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977),«Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984). Пяру Э. Агняцвет належаць паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Навальніца над Сожам» (1958), «Незвычайныя канікулы» (1962), «Васіль Сяргеевіч» (1978). Паэма «Будзем сябраваць» у першай рэдакцыі выйшла ў 1959 г., новы варыянт з некаторымі дапаўненнямі — у 1979 г.

Вершы Э. Агняцвет мілагучныя, многія з іх пакладзены на музыку. Паэтэса з'яўляецца аўтарам лібрэта опер «Джанат» (1944), «Марынка» (1956). Ёю складзена «Роднае слова» для 3-га класа (у сааўтарстве з Я. Івашуціч, А. Шышонак).

Значную частку паэтычнай творчасці Э. Агняцвет складаюць пераклады. Юны чытач можа пазнаёміцца на беларускай мове з вершамі Пушкіна, Някрасава, Маякоўскага, Беранжэ, Гюго, Элюара, Арагона, Байрана, Апалінэра. Паэтэса пераклала кнігу вершаў французскіх паэтаў для дзяцей «Краіна Паэмія» (1962).

У 1986 г. Эдзі Агняцвет узнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х. Андэрсена за кнігу «На двары алімпіяда».

## ВОЧЫ МАЙГО ДЗЕДА

Усе дзяды былі калісьці дзецьмі.
І мой дзядуля быў такі, як я:
Па лузе гойсаў, і свістаў, як вецер,
І пераймаў у пушчы салаўя.

Але яму заўсёды я зайздрошчу.
Убачыў Леніна ён даўняю зімой —
Не ў Маўзалеі, не на Краснай плошчы,
А ў ціхім лесе ў Горках, пад Масквой.

Ішоў Ільіч.
І вузкія сцяжынкі
Збіраліся ў адзін шырокі шлях.
На шапцы ззялі зорныя сняжынкі,
Усмешка прытаілася ў вачах...

На дзеда я цяпер гляджу шчаслівы.
Я прытуліўся да яго пляча.
У дзеда вочы — ясныя надзіва —
Пабачылі самога Ільіча.

## ХТО ПАЧЫНАЕ ДЗЕНЬ?

Раней за ўсіх устаў шафёр,
Пабег да гаража.
Не любіць соннай цішыні,
Гарачая душа!

Ён — неспакойны чалавек —
Хацеў бы сто гадоў
Цагліны цёплыя вазіць
Для новых гарадоў.

Устане рана хлебапёк,
Адчуе смачны пах,
І пойдзе жытні свежы хлеб
З румянцам на шчаках.

Па-свойму радуе маляр
Прыроду і людзей:
Прыносіць колеры вясны
Вясёлы чарадзей.

Спытайся ў сонца і зямлі,
Спытайся ў чыстых рэк:
— Хто пачынае новы дзень?
— Рабочы чалавек!

## КРАЙ СЯБРОЎ МАІХ

*Прысвячаю вучням 6-й школы горада Рыгі*

Я сябрую з краем бурштыновым,
Ёсць тут і бяроза і сасна.

Я знаходжу блізкія мне словы:
Даўгава — па-нашаму Дзвіна.

Вэвэрэ — па-нашаму вавёрка,
Ветра — быццам чуюцца вятры.
Палыном улетку пахне горка,
Росны луг свіціцца на зары.

Я іду. І многае знаёма:
Ясені, асіны, пошум траў.
На паляне, ўжо зусім як дома,
Хтосьці нашу «Бульбу» заспяваў.

Па сцяжынках, у лясным зацішку,
«Бульба» скача ўсё далей, далей.
Слухаю маленькую латышку
І сама спяваю весялей.

## ПЕРШАЕ СЛОВА

Першы голас, які я пачула на свеце,
Быў голасам маці.
Калыханку пад месяцам
І на дасвецці
Спявала мне маці.

Гэта — першая песня
І першае слова
Зямлі маёй весняй.
Гэта — ціхая ласка
І міру ахова.
Дзякуй, маці, за песню!

Запаветныя, родныя фарбы і гукі —
Усё застаецца.
Дзякуй, мама, за рукі,
бяссонныя рукі,
За аддане сэрца!

Рукі цёплай пяшчоты,
турботы і працы —
Ад ляноты лячылі.
Аніякай работы ў жыцці не цурацца
І мяне навучылі.

Не пакрыўджу цябе,
З тваіх сцежак не збочу,
Засланю ад нягоды.
Я хачу, каб свяціліся радасцю вочы
І жыла ты заўсёды!

## ПАРАСКА І ПАДКАЗКА

— Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якую ты чытала казку?

Параска думае: «Ой, ой,
Я ж не чытала ні адной!»
Хтось шэпча ў класе:
— Курка раба...
Параска кажа:
— Мурка-жаба.
Хтось шэпча:
— Журавель і чапля...
— Я помню! —Муравей і шабля.

—Скажы, Параска,
Калі ласка,
Якіх ты ведаеш звяроў?

Тут чхнуў яе сусед Пятроў,
Яму шапнулі: — Будзь здароў...
Параска, не дачуўшы слоў,
Сказала: — Ведаю кароў.

— Вось дык цікава, звер —
карова!
Скажы нам, без якога слова
Пражыць не можаш ані дня? —
Маўчыць Параска... Цішыня...

Глядзіць яна ва ўсе бакі,
Глядзіць на столь і на падлогу,
Хто прыйдзе ёй на дапамогу?

Знайшоўся жартаўнік такі,
Што гучна прашаптаў:
—Падказка.
— Падказка! — крыкнула
Параска.

А я не ведаю, браткі,
Ці гэта быль, ці гэта казка?

## СКОРАГАВОРКІ

Я гуляў адзін ля горкі
І збіраў скорагаворкі.

**Ці не лепшая — першая?**

Рагатун Рыгорка родам
З Рагачова горада.
Як захоча,
Зарагоча
Рагатлівым рогатам.

**Следам бяжыць другая,**
**і другая — не благая!**

Пісклянятьі просяць проса,
Скачуць, босыя, па росах.
Фрося проса ім прыносіць,
Ажно косы Фросі ў просе.

**Як да рэчкі падышоў —**
**раптам трэцюю знайшоў.**

На гародзе рос гарох,
А за рэчкай — грэчка.
Ох, ох, ох
ды ох, ох, ох,

Наш стары казёл Цімох
На гародзе рваў гарох,
Грэчку рваў за рэчкай.

**Вось табе, Рыгорка,**
**чацвёртая скорагаворка:**

Ліна з Нілам ловяць лівень,
Але лівень —
Не лянівы:
То лятае па алеі,
То люляе ён лілеі.
Ліна кінулася ўлева,
Ніл за Лінай,
Лівень згінуў
За калінай,
Каля млына.

### ВАСІЛЬ СЯРГЕЕВІЧ

## Паэма

### ТРЫВОГА

Захварэў дзіцячы
Доктар,
Цяжка захварэў.
Праз акно не бачыць
Доктар
Ні людзей, ні дрэў.
І не чуе на світанні
Ластавак, шпакоў,
І не чуе крыкаў ранніх
Бойкіх хлапчукоў.

Пад запалымі вачамі —
Чорныя кругі.
І адкуль такое з вамі,
Доктар дарагі?

Вы ж і лекамі, і словам
Ратавалі ўсіх.
Мамы ўдзячны за здаровых
Птушанят сваіх.

Вашы ўсмешкі і пацешкі,
Добры чарадзей,
Быццам сонечныя сцежкі,
Клікалі дзяцей.

На аснежныя прасторы
Ці ў зялёны бор...
А цяпер вы самі хворы,
І ў трывозе двор:
— Дайце Доктару спакою,
Кіньце свой футбол.—

Як салдат на полі бою,
Ўпалі вы на дол...

Аб вайне даўно мінулай
Трызнілі ўначы...
На двары не чутна гулу,
Змоўклі трубачы.

Нават жэўжыкі ў калясках
Нешта цямяць:
«Дзед!»
Пазіраюць з яснай ласкай
На другі пад'езд...
Не выходзіць,
не смяецца,
Дзетак не глядзіць
І на плач не адгукнецца.
Ціха!
Доктар спіць.

Бачыць ён поле,
Дзе свет пачынаецца.
Гэта — маленства куток.
Першая птушка яго заліваецца,
Вабіць звысоку,
здалёк.
Першае дзіва!
І ён углядаецца
Ў весні, вясёлы званок...
Звон!
І карціна на полі змяняецца:
Душны, спякотны дзянёк.

Колас гарачы —
сузор'е даспелае
Мама паднесла сынку,
Цягнецца ён —
немаўлятка няўмелае,
Дзівіцца ён каласку.
Матчыны рукі —
з ласкаваю сілаю,
Лепшыя рукі чые?
Самыя шчырыя, самыя мілыя
Жніўныя песні яе.
— Маладзіца маладая
Каля бору жыта жала,
Мала дзіця калыхала:
— Спі, галоўка ільняная,
Спіце, вочкі-васілёчкі,
Дайце жыта мне дажаць!..—

Матчына хустка,
як белае полымя,
Ўспыхвае дзесьці ізноў.
Мама!
Іржышча пад пяткамі
голымі
Колецца.
Хлопчык пайшоў.
Як яму цяжка
маленькімі крокамі
Крочыць па колкай зямлі!
Сцежкі здаюцца
такімі шырокімі...
Мама, пачуеш калі?
Толькі чамусьці яна аддаляецца,
Бачыць ён кропку адну...

Ён і пакутуе,
ён і здзіўляецца —
Ўсё ўпершыню, ў навіну:
Конік стракоча —
бразготка зялёная,
Чмель загудзеў на дудзе.
Хлопчык пад жнівеньскай
спёкай шалёнаю
Плача, смяецца,
ідзе...

ДРУГІ СОН

— З-зум-з-зум —
з-зум-з-зум!..
Гэта не чмель турботны
З першага сну.
Дзеці трымцяць за дротам.
Страшна ўначы ў вайну.

Белыя, чорныя хмары,
Снежная кругаверць.
Шэрыя, чорныя твары
Пільнуе
белая смерць.

За дротам дранцвеюць дзеці,
Не ўзняць збалелых рук...
Раптам
прарваўся праз вецер
Рэзкай сірэны гук.

— Стой! — Афіцэр спыняе
З будаю грузавік.
Чаго толькі не бывае?
Грузяць дзіцячы крык!

Грузяцца горкія слёзы,
Шэрыя лахманы.
З-пад Мазыра, з-пад Лёзна —
Дзеці вайны!

Кідаюць канваіры
Маленечкіх старых.
У кузаве, быццам у віры,
Месца хапае для ўсіх.

— Шнэль! — У кабіну ўскочыў
Даўжэзны гэр афіцэр.
— Выдраць такому б вочы!
Вязеш на расстрэл, звер? —

Бабка кляне зацята
Салдат-вартаўнікоў.
Пакуль маўчаць аўтаматы —
Пільнуюць з усіх бакоў.

Завея лютуе, вые.
Замяло шляхі і гаць.
Застылыя паставыя
Услед машыне глядзяць.

І невядомы нікому
Іхнія думкі і сны.
У Нямеччыне — іхнім доме
Ёсць жа і ў іх сыны!..

Афіцэр усё гоніць, гоніць!
Выбіваецца з сіл шафёр.
Далёка ўжо недзе гоні,
Наперадзе — цёмны бор.

Самы малы як заплача:
«Мама!» —
і слёз не стае...
Сказаў адзін аўтаматчык:
— Дзеці,
ды мы — свае! —

Што там было —
ніколі
Не апісаць пяром!
Нават завея на волі
Была і цяплом, і дабром.

Сосны, дубы, рабіны
Шапталі:
«Вы дома цяпер...»
Выйшаў ціха з кабіны
У форме чужой
афіцэр.

— Доктар!
Васіль Сяргеевіч! —
Па лесе людзі бягуць.
Маленькіх,
снегам завеяных,
Людзі на рукі бяруць.
Зморшчаныя павекі,
Худзенькія кулачкі.
Родныя чалавекі —
Дачушкі, хлапчукі!

Жанчыны ад радасці шчырай
Гамоняць наперабой:
— Як ашукаў канваіраў?
— Доктар,
ды вы — герой!
— Дзякуйце, людзі, шафёру,
Салдатам,
сабе самім.
— Доктар,
а вы ад зморы
Сталі за ноч сівым...
Счарнелі вы ад трывогі!
— Што пра мяне гаварыць?
Трэба хутчэй з дарогі
Дзяцей адмыць, накарміць! —
На плечы яго, як на прыстань,
Сеў карантыш:
—Я — Мацей.
Доктал,
чаму фашысты
Забіваюць дзяцей? —
Вязень былы трохгадовы,
Вочы —
ясны давер.
Не вымаўляе словы
З гулкай літарай «р».
Гарматы, руіны, расправы —
Не ўсё зразумела яму.
Мама недзе ў пяску крывавым —
Чаму,
чаму,
чаму?

Адкажыце на запытанне —
Людзі,
чакае дзіця!
Доктар нясе ў світанне
Хлопчыка —
скарб жыцця.

Кліча агеньчык зямлянкі,
Сосны вартуюць шлях.
Цётачкі партызанкі
Грэюць ваду ў чыгунах.

Снег растоплены, чысты,
На ўцеху малым, пяе.
А ручнікі ўрачыста
Раскінулі крылы свае.

Ад пары набраклі начоўкі,
Плешчуцца дзеці ў вадзе.
Святлеюць спінкі, галоўкі.
— Доктал,
а лыбка дзе?

Доктар і сам іх купае,
Хоць ледзьве стаіць на нагах.
Боль за сэрца хапае:
«Рэбры якія,
страх!..
Маленькіх маіх
для Міру —
Любіць,
гадаваць,
лячыць!»
Быццам птушыны вырай
Шчабеча ў зямлянцы,
крычыць...

Пасля нядолі горкай —
Лясная цішыня.
Агеньчыкам
вавёрка
Ляціць у далеч дня.

Мацей не мае моцы,
А ўсё ж услед пабег:
Ў валёнках і кучомцы
Куляецца ў снег.

А той агеньчык спрытны
То ўспыхне на сасне,
То зблізку,
вочкам хітрым,
На хлопчыка зірне.
— Кінь,
кінь,
перакінь,
Давай далей пабяжым,
Цераз воду
і агонь,
Не дагоніць нас
і конь! —
З зямлянкі выйшлі дзеці,
Хто толькі мог хадзіць —
У белы дзень,
у вецер,
Дзе бор звініць,
звініць;

Дзе добрыя жанчыны
Іх пояць малаком,
Дзе снежная краіна
З вавёркай-аганьком.

Па голлях і па ўзгорках
Імчыцца ўсё смялей
Гарэзніца вавёрка —
Вясёлы друг дзяцей.

## ТРЭЦІ СОН

Руіны, як цені трывогі,
Як чорнае рэха вайны.
Над імі —
салют Перамогі —
Вясёлкавы гоман вясны.
Зямля закружылася ў гудзе,
Успыхваюць фарбы,
плывуць.
Зусім незнаёмыя людзі
Цалуюцца.
Плачуць.
Пяюць.

І дзеці,
і дзеці,
і дзеці
Імчацца усе як адзін!
Сцяжкоў самаробных суквецце
Палае над жахам руін.
Падрос з сорак трэцяга года
Сынок партызанскі Мацей.
У ботах сваіх — скараходах
Бяжыць, абганяе людзей.
Чупрынка яго залаціцца,
Як сонечны, цёплы снапок.
Нясе над зямлёю-зямліцай
Чырвонае дзіва —
сцяжок.

І дзеці,
і дзеці,
і дзеці
З усіх кантынентаў і хат —
Праз веснія ліўні, праз вецер
Бягуць да савецкіх салдат.

Салдаты ў запыленых касках,
У шэрых, цяжкіх шынялях.
І краскі — дзіцячая ласка —
Цяпер асвятляюць ім шлях.

О, ранак Дзевятага Мая,
Ты самы шчаслівы ў жыцці!
Салдат невядомы ўзнімае
Мацея да сонца: —
Расці!

## БАЦЬКА

«Хоць на хвілю сустрэцца
з другам!
Мне... Ужо не сцярпець пакут...
Сын! А ты за Палярным
кругам...»
— Васіль Сяргеіч,
бацька, я — тут! —
І расплюшчвае Доктар вочы,
Сэрца б'ецца часцей, часцей.
Прыляцеў ён з ільдоў
паўночных,
Наш знаёмы з маленства Мацей.
Пад сцюдзёнай Палярнай
зоркай

Пазыўныя пачуў здалёк...
Ложак белы, як белая горка.
І сасмяглыя вусны:
— Сынок...

Гэтым словам малога ў лесе
Ён калісьці сагрэў, назваў.
За жыццё сваё
колькі балесных
Сам ён выняньчыў, адратаваў!

Колькі цяжкіх гадзін бяссонных
Выпадала яму ўначы!
А цяпер ён хавае стогны
І ратуюць яго
ўрачы.

Вось ляжыць ён, белагаловы,
Губы скусаны да крыві.
— Бацька, бацька,
жыцця палову
Ты вазьмі ў мяне,
толькі жыві! —
Быццам бліснула ў хмарах
просінь,
Ён пачуў гэты крык душы.
На хвіліну яму здалося,
Ўсе прачнуліся малышы.

І шумяць:
— І ў мяне вазьміце
Хоць гадок,
хоць некалькі дзён! —
— Што за глупства?
Не гаманіце! —
Ўпершыню раззлаваўся ён
На дзяцей,
на свайго Мацея,
На ўсіх пацыентаў былых.
Вось шчака яго ружавее
І вяртаюцца зрок і слых.
Ён убачыў у вокнах неба,
І вясна пачалася зноў.
— Не!
Мне вашых гадоў не трэба.
Неабходна ваша любоў! —
Мабыць, лепшы памочнік лекаў
І надзейнейшы чарадзей —
Голас блізкага чалавека
І спагада родных людзей.

Ачуняла хворае сэрца.
Будзе жыць!
Адвялі бяду!
І не мроіцца, не здаецца:
— Адпусціў, сынок, бараду!

Што на Полюсе для навукі
Ты адкрыў?
Ну, кажы хутчэй! —
Ціха гладзіць бацькавы рукі,
Прыпадае да іх Мацей:

«Гэта чулыя пальцы ўмельца,
Пальцы тонкія скрыпача.
Ажыўлялі хворае цельца
Залатыя рукі ўрача.
Падымалі яны для свету,
Для наступных, светлых
гадоў —
І настаўнікаў, і паэтаў,
Хлебаробаў,
будаўнікоў.
Толькі не для бомбы нейтроннай
Падымалі яны дзіця!
А для любай зямлі зялёнай —
Для жыцця,
для жыцця,
жыцця!»

— Што задумаўся, мой асілак?
Сны палярныя ў галаве?
Я ўжо быццам не трызню, мілы,
Але чую — хтосьці раве? —
Адчыніліся раптам дзверы,
І, як гром сярод яснага дня,
Як затупала (хто б тут
паверыў?)
Беласнежнае медзведзяня.

Доктар дзіву даецца:
— Наце!
Што ён — з цырка,
не ўцямлю ані! —
Мішка важны,
нібы ў халаце
Самай першае чысціні.

Толькі рукі лізнуў Мацею
І на задніх лапах прыціх.
Быццам кажа:

«Усё разумею.
Зразумейце й гасцей сваіх!»
— Ха-ха-ха! — ўпершыню
за тыдзень
Засмяяўся дзіцячы ўрач.
І рагоча Мацей:
— Гэты ж злыдзень
Не хацеў там застацца,
хоць плач!

Самалёт на старце, а Мішку
Не адгоніць ніхто аніяк!
І шкада яго стала крышку,
Ах, прыручаны мой дзівак!
Вось і ўзяў я яго з сабою —
Нельга ж крыўдзіць
малых
дзяцей!

Мы здароўя вам зычым абое.
— Ну і выдумшчык ты, Мацей!
— Ну і вы-дум-шчык! —
радасны вецер
Падхапіў,
закружыў над дваром,
Узлятае вішнёвая квецень
І праз вокны ўрываецца ў дом.

Свецяць колеры майскага
рання,
Рэха смеху гучыць там і тут.
Нібы ў гонар палярнага ззяння,
Мішка лапу ўзнімае:
— Салют!

## МАКСІМ ТАНК

Народны паэт Беларусі Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко) нарадзіўся 17 верасня 1912 г. у вёсцы Пількаўшчына Вілейскага павета Мінскай губерні (зараз Мядзельскі раён Мінскай вобласці). У час першай сусветнай вайны бацьку мабілізавалі ў армію, а маці разам з сынам выехала ў бежанства і апынулася ў Маскве. На радзіму сям'я вярнулася ў 1922 г. Скончыўшы польскую пачатковую школу ў вёсцы Шкленікова, з 1926 па 1932 г. вучыўся: спачатку ў рускай гімназіі ў Вілейцы, а калі яна была закрыта польскімі ўладамі—у беларускай у Радашковічах, з якой за ўдзел у адной з рэвалюцыйных забастовак быў выключаны. Праз некаторы час паступіў у беларускую гімназію ў Вільні, аднак праз два месяцы і там адбыліся вучнёўскія хваляванні, за ўдзел у якіх ён зноў быў выключаны. Восенню 1929 г. паступіў на аднагадовыя тэхніка-меліярацыйныя курсы ў Вільні, а потым перавёўся ў Віленскую рускую гімназію, якую скончыў у 1932 г. За супрацоўніцтва ў камуністычных часопісах і газетах быў у час вучобы ў гэтай гімназіі арыштаваны і некалькі месяцаў адседзеў у Лукішскай турме.

Першы верш паэта «Там, дзе стаяў безрабочы» быў змешчаны пад псеўданімам Граніт у другім нумары падпольнага рэвалюцыйнага часопіса «Пралом» за 1932 г., выпуск якога ён наладзіў у канцы 1931 г. разам са сваім старэйшым сябрам паэтам Янкам Гарохам. У 1932 г. у львоўскай газеце-аднадзёнцы «Беларускае жыццё» быў надрукаваны верш «Заштрайкавалі гіганты-каміны», падпісаны ўпершыню псеўданімам Максім Танк.

У 1932—1933 гг. М. Танк працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі. З мая 1933 г. да снежня 1934 г. зноў сядзеў у Лукішскай турме, дзе ў канцы 1933 г. наладзіў выпуск рукапіснага рэвалюцыйнага часопіса «Кра́ты». У гэты час ім было напісана нямала вершаў, якія затым увайшлі ў зборнік «На этапах», што быў выдадзены ў 1936 г. пры дапамозе КПЗБ. Кніга адразу была канфіскавана польскай паліцыяй, а аўтара суд прыгаварыў да шасці месяцаў зняволення. У 1937 г. КПЗБ дапамагла паэту выдаць новы зборнік вершаў «Журавінавы цвет» і паэму «Нарач», а праз год — кнігу паэзіі «Пад мачтай». Сваім мастацкім словам паэт змагаўся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

М. Танк пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў літаратурным супрацоўнікам абласной газеты «Віленская праўда» (1939—1940). У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў у рэдакцыях газеты «За Савецкую Беларусь», агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1943 г. выйшла паэма «Янук Сяліба», прысвечаная паказу партызанскага руху на Беларусі. Творы, напісаныя М. Танкам у ваенныя гады, склалі

кнігі «Вастрыце зброю» (1945) і «Праз вогненны небасхіл» (1945). У 1945—1948 гг. паэт працаваў літаратурным рэдактарам часопіса «Вожык», у 1948—1966 гг.— галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». З 1966 г. ён першы сакратар, а з 1971 г.— старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Максім Танк — аўтар паэтычных зборнікаў «Каб ведалі» (1948), «На камні, жалезе і золаце» (1951), «У дарозе» (1954), «След бліскавіцы» (1957), «Мой хлеб надзённы» (1962), «Лірыка» (1963), «Глыток вады» (1964), «Селядцы з вершамі» (1966), «Ключ жураўліны» (1972), «Хай будзе святло» (1972), «Дарога, закалыханая жытам» (1976), «Прайсці праз вернасць» (1979), «За маім сталом» (1984).

У 1970 г. з'явілася кніга-дзённік «Лісткі календара».

Для дзяцей М. Танк пачаў пісаць у 1937 г. Яго казкі і вершы друкаваліся яшчэ ў заходнебеларускіх выданнях — «Беларускім летапісе» і дзіцячым часопісе «Снапок». Юнаму чытачу паэт адрасаваў кнігі вершаў і казак «Галінка і верабей» (1946), «Казка пра Мядзведзя» (1947), «Вершы» (1948), «Казкі лірніка» (1948), «Урачыстае абяцанне» (1949), «Сярод лясоў наднёманскіх» (1951), «Конь і леў» (1955), «Ехаў казачнік Бай» (1955; 2-е, дапоўненае выданне — 1983), «Казкі. Легенды» (1960), «Светлячок» (1970), «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні» (1979).

Шырока вядома перакладчыцкая дзейнасць М. Танка. У яго высокамастацкіх перакладах на беларускую мову былі выдадзены асобныя творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, П. Тычыны, М. Рыльскага, У. Бранеўскага, А. Венцлавы, Я. Судрабкална і іншых паэтаў.

Заслугі М. Танка ў галіне развіцця роднай літаратуры адзначаны многімі ўрадавымі ўзнагародамі. У 1948 г. за зборнік паэзіі «Каб ведалі» яму прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР, у 1959 г. за зборнік «След бліскавіцы» — Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы, у 1966 г. за зборнік «Мой хлеб надзённы» — Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы, у 1978 г. за зборнік «Нарачанскія сосны» — Ленінская прэмія. У 1968 г. М. Танку прысвоена ганаровае званне народнага паэта Беларусі. Ён абраны акадэмікам АН БССР (1972). У 1974 г. паэту прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

## БЫЛІНА

Гэта было даўно,
Як казка баіць,
Недзе над Дняпром ці над Беразіной,
Адным словам,
Было гэта ў нашым краі.

Прыйшоў Ленін
Ад Крыўды народ бараніць.
А да Крыўды той не падступіць:
І шлях да яе круты,
І палац у яе залаты.
Ды абнесен палац той высокай сцяной,
Ды абкружан глыбокай вадой,
Ды абстаўлен вартай ліхой,—
Ледзь да Крыўды дапытацца,
Ледзь да яе дабрацца.

Выйшлі вартавыя насустрэчу
І ў Леніна пытаюць:
— Чаго прыйшоў, чалавеча?
— Можа, ў ласку ўпрасіцца?
— Не!
— Можа, грошай пазычыць?

— Не!
— Перад Крыўдай скарыцца?
— Не!

Далажылі пра дзіўнага госця Крыўдзе.
Чакае Ленін, калі яна выйдзе.
Доўга Крыўда ў ложку адпачывала,
Доўга Крыўду слугі прыбіралі.
Высака паднялося сонца над борам,
Даўно ўжо мінуў ранак,
І толькі пад поўдзень
У залатым уборы
Выйшла Крыўда на ганак.
Выйшла — усе пахіліліся да зямлі.
Толькі не схіліўся Ленін
І так гаворыць:
— Калі
Ішоў я, Крыўда, да цябе
Праз рэкі і горы,
Праз землі, дзе ты збіраеш аброк
З малых і старых,
З сірот гаротных,
Звяроў лясных,
Нават з птушак пералётных,—
Усюды бачыў гора.
— Дык чаго ж ты хочаш? —
Крыўда спытала.
— Каб ты пакінула зямлі прасторы.
І так ужо досыць папанавала.
Здзівілася Крыўда: гэтак, як Ленін,
З ёй ніхто не адважыўся гаварыць.
Перш хацела загадаць яго пасадзіць
За астрожныя сцены,
Скруціўшы яго ланцугамі...
Ды адумалася: лепш народ не гнявіць,
Лепш другімі шляхамі
Небяспеку ад сябе адхіліць.
— Што ж, я не супраць,—
Крыўда кажыць.—
Толькі перш паглядзім,
Чыя сіла — твая ці мая — пераважыць...
І кінула на вагу золата жменю.
Ніякіх скарбаў не меў Ленін.
— Што палажыць? — задумаўся ён гаротна.
І, як дума цяжкая,
Кропля поту апала з чала.
Кропля такая,
Што пад ёй і вага
Ападаць пачала.

Узлавалася Крыўда, загадала
Несці ўсе свае скарбы з падвалаў.
Прынеслі слугі бочкі срэбра.
Мала.
Прынеслі скрыні перлаў.
Мала.
Прынеслі крушні дарагога камення.
Мала.
І толькі калі навалілася Крыўда сама —
Грузная, цяжкая —
Памалу вага ападаць пачала.
А вага ападаць пачала,—
Ноч на нівы лягла.
А ноч на нівы лягла,—
Сцюжа лютая загула.
Ніякіх скарбаў не меў Ленін.
Была толькі торба, з якой
Дастаў і палажыў на вагу
Хлеба акраец.
І неспадзявана, бы глыба якая,
Хлеб, здабыты мазольнай рукой,
Усё пераважыў,
Вышэй і вышэй уздымаючы Крыўду за хмары,
Дзе сонца яе спапяліла навекі,
А прах яе вецер развеяў
За высокія горы,
За сінія рэкі.

## ПІЯНЕРСКІ ГАЛЬШТУК

Мой гальштук чырвоны,
Бо ў шоўку яго
Зары незгасальнай
Палае агонь.
Зары той, што Ленін
На шчасце нам даў,
У слаўны Кастрычнік
Над светам узняў.

Мой гальштук чырвоны,
Бо ззяюць на ім
Крамлёўскія зоры
Праменнем сваім.
І сонцам кладзецца
Святло на яго
Ад сэрца Радзімы,
Ад сцяга майго.

Мой гальштук чырвоны,
І вытканы ён
Для славы юнацкай,
Для радасных дзён,
Для дружбы і песень,
Прастораў і хваль.
Для смелых палётаў
Да сонца, удаль.

## ХЛЕБ

Аднойчы на кірмаш здалёк
Вандроўнік плёўся ў горад
І наракаў на свой мяшок,
Набіты лустай спорай.
Аж Хлеб не вытрымаў і так
Азваўся: — Што бядуеш?
Зусім не ты мяне, дзівак,
Але цябе нясу я.

— Ну што ж, пабачым хто —
каго! —
Той запярэчыў строга
І з цяжкага мяшка свайго
Хлеб вытрас на дарогу.

І сам пашкандыбаў далей.
Нішто не муліць плечы.
Дзень прамінуў. Ужо ў імгле
Стаў набліжацца вечар.

Настаў і час перакусіць.
Успомніў Хлеб Вандроўнік,
Што недзе, кінуты, ляжыць,
Духмяны і цудоўны!

Прылёг на нейкім дзірване,
Каб адпачыць хоць трошкі.
Але галоднаму і ў сне,
Знаць, сняцца хлеба крошкі.

Цяпер і сам сабе не рад.
Не спіцца, не ляжыцца.
Ці не вярнуцца лепш назад
Ды з другам памірыцца?

Устаў Вандроўнік і брыдзе —
Ідзе пад зорным небам
На месца памятнае, дзе
Ён пасварыўся з Хлебам.

Ой, як ён рад быў зноў, калі
Сваю пабачыў страту!
І Хлебу нізкі, да зямлі,
Аддаў паклон, як брату.

## СНЯЖЫНКІ

— Мая сняжынка!
—Мая сняжынка! —
Крычаць-спрачаюцца дзве Ірынкі,
Сняжынкі ловячы, якія
Лятуць, як матылькі жывыя.
Пайшлі да зайчыка дзве Ірынкі,
Каб рассудзіў ён: чые сняжынкі?
А зайчык кажа: — Ну, пакажыце,
Хутчэй далонькі свае раскрыйце!
Раскрылі. Дзівяцца дзве Ірынкі:
Куды падзеліся іх сняжынкі?

## А-А, А-А!..

— Дзядуля,
Хто ў нас за мяне
Старэйшы?
— Ну, твае мама і тата.
— А хто старэйшы за іх?
— Мы з бабуляй.
— А хто самы, самы,
Самы старэйшы на свеце?
— Хіба, ўнучачка,
Хлеб і калыханка,
Што пяе твая мама:
«А-а, а-а, а-а...»

## ГАЛІНКА І ВЕРАБЕЙ

— Галінка-вярбінка,—
Прасіў верабей,—
Мо' пакалыхала б
Маіх ты дзяцей?
Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.
—Ідзіце, казулі.
Галінку ламаць!

Казулі не хочуць.
—Ідзіце, ваўкі,
Лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія не хочуць
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць.

Ваўкі не схацелі.
—Прыходзьце, стральцы,
Каб непаслухмяных
Ваўкоў правучыць,
Якія не хочуць
Казуляў караць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,
Якая не хоча
Дзяцей калыхаць...

Пайшлі паляўнічыя
Ў лес па ваўкоў:
Спалохана зверы
Пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў
Лавіць і караць;
Казулі пабеглі
Галінку ламаць.
Галінка ж вярбінка
Са страху хутчэй
Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.
З тых дзён без спачынку,
Каб кожны быў рад,
Калыша галінка
Малых птушанят.

## ЖУК І СЛІМАК

Прыгожым летнім ранкам
На лузе за сялом
Сустрэўся жук аднойчы
З рагатым слімаком.

— Здарова! — жук вітае.—
Куды, браток, ідзеш
І з ракавіны хатку
Нашто з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,
Гаворыць так жуку:
— Нямала перажыць мне
Прыйшлося на вяку.

То сцюжа, то марозы,
То навальніца, дождж.
То, часам, у дарозе
Захопіць змрок і ноч,—

Шукай тады начлегу
Пад нейкім пад кустом...—
Гавораць яны гэтак
І раптам чуюць — гром.

Ударыў дождж краплісты,
І жук пабег шукаць
Дзе ў засені цяністай
Шырокага лістка.

Але на цэлым лузе
Няма страхі нідзе,
І мокры, ледзь жывы ён
Да слімака ідзе.

— Пусці, браток, пагрэцца.
Змок дужа на лугу,
Насіць за гэта хатку
Табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай
Вандроўнікі сядзяць.
І нават дождж краплісты
Не зможа іх дастаць.

Але мінулі хмары,
І сонца ўстала зноў,
Жук хату слімакову
Пакінуў і пайшоў.

Забыўся пра нягоды
І не на ўме жуку,
Што абяцаў паднесці
Ён хату слімаку.

## БЫЛІНА ПРА КАСМІЧНАЕ ПАДАРОЖЖА МУРАША БАДЗІНІ

Прыгнаў аднойчы вецер
Газету, што згубілі
Ля пералеску дзеці,
Калі ў грыбы хадзілі.

Знайшоў яе пад елкай
Неспадзявана вожык.
Адна бяда: газеты
Сам прачытаць не можа.

Паклікаў ён лісіцу
З мядзведзем-дабрадзеем,
Ды і яны не вельмі
Ў чытанні разумеюць.

Звярнуліся да бусла,
Што гнездаваў на школе,
Які, чуваць, кумекаў
У грамаце найболей.

І той праклекатаў ім,
Што з Байканура скора
Ў ракеце касманаўты
Адправяцца да зораў.

І вось па цёмнай пушчы,
Па пералесках хутка
Пайшла, загаманіла
Пра гэта дзіва чутка.

Шмат хто ў яе не верыў,
Але было нямала
Адважных, што да зораў
Ляцець паспрабавала б.

І сярод іх — хто б думаў! —
Быў і Мураш Бадзіня,
Які любіў залазіць
На стромкія хваіны.

І з вышыні паднебнай
Глядзець на сонца, зоры
Ды марыць пра вандроўку
Ў захмарныя прасторы.

І хоць ніхто не раіў
З дарадцаў мурашыных
Рызыкаваць дарэмна
За свет ляцець Бадзіні —

Нікога ён не слухаў
І праз лясы, разлогі.
Узяўшы кій ды компас,
Падаўся у дарогу.

Блукаў — ішоў ён доўга
Па нетрах невядомых,
Пакуль не апынуўся
Каля аэрадрома.

Ды тут ён схамянуўся:
— А як ляцець адгэтуль,
Калі няма ў Бадзіні
Ніякага білета?

Аж чуе, каля касы
Гавораць пасажыры:
— Лячу ў Арджанікідзе.
— А я — ў тайгу Сібіры...

— А я — да Байканура,
Там — мой сыночак мілы...
І тут ідэя раптам
Бадзіню асяніла:

А што, калі забрацца
У кошык да бабулі?
І вось ужо сядзіць ён,
Схаваўшыся пад дуляй,

Сярод гасцінцаў розных,
Што везла маці сыну.
— Хаця б хто не заўважыў, —
Хвалюецца Бадзіня.

Але прайшла пасадка,
І адлягло на сэрцы.
І самалёт узняўся,
Як легкакрылы вецер.

Хацеў зірнуць Бадзіня,
Ці карабель харошы,
Ды ўбачыў сцюардэсу
І зноў схаваўся ў кошык.

А там і не заўважыў,
Як ахінула стома.
І ён заснуў, нібыта
У роднай пушчы дома.

Ці доўга спаў, ці мала —
Таго і сам не знае.
Прачнуўся толькі, помніць,
За новым небакраем,

Калі матораў змоўкла
Грымець грымуча рэха,
Калі да самалёта
Высокі трап пад'ехаў.

Гурмою пасажыры
Пайшлі ў вясёлым гуле,
За імі падалася
З гасцінцамі бабуля.

І трапіла адразу
Ў абдымкі свайго сына:
— Ну, як здарова, мама?
Ідзем хутчэй ў машыну!

— Вось бачыш, сынку, жыва,
Хаця і пастарэла...
— Як добра, што ты ў госці
Нарэшце прыляцела...

Пакуль ішла гамонка,
Вандроўнік наш Бадзіня
Паспеў прыхарашыцца,
Прад тым як кош пакіне.

Ён выйшаў і падаўся
Туды, дзе ззяла сонца
І нейкі слуп вялізны
Гарэў на гарызонце.

Такое ўпершыню ён
Убачыў. Няўжо гэта,
Здзівіўшыся, падумаў,
Касмічная ракета?

І ўпершыню страх нейкі
Ў сабе адчуў Бадзіня:
Малюсенькі які ён
Прад гэткаю махінай!

Мо лепш сядзеў бы дома,
А то аж нешк млосна
Ад думкі, што сабраўся
Ляцець у сцюжны космас.

Але ж і адступаць як,
Калі ўсе ў родным краі
Пра гэта падарожжа
На кожнай сцежцы знаюць.

Ды і карціць самому
Пабачыць дзівы свету...
Памалу абышоў ён
Касмічную ракету,

Якую да палёту,
Знаць, людзі рыхтавалі
І правяралі ўважна
Ўсе часткі і дэталі.

Таму мо не звярнулі
І ўвагі на Бадзіню.
А той, па мачтах скрытна,
Дабраўся да кабіны.

Нырнуў у глыб ракеты,
Дзе між дратоў, утулак,
Дзівосных апаратаў
Знайшоў сабе прытулак.

Прылёг. Але не спіцца
Яму ад хвалявання.
Прыйшлі два касманаўты
Ў кабіну на світанні.

Праверылі прыборы.
— Гатова ўсё як трэба!..
І гул маланкагромны
Узняў ракету ў неба.

І тут адчуў Бадзіня
Груз перагрузкі цяжкі,
А потым наступіла
Дзівосная бязважкасць.

Каб не ўчапіўся добра
За нейкую там скрыню,
Напэўна, стаў бы плаваць
Ці лётаць па кабіне.

Праз нейкі час абвыкся.
Гучалі тэлехвалі.
Ён чуў, як касманаўты
Зямлі рапартавалі,

Што ў іх усё ў парадку,
Да працы прыступілі,
Салют касмічна-зорны
Ўсім перадаць прасілі.

Калі ж іх сном глыбокім,
Стамлёных, агарнула,
Бадзіня асцярожна
Пакінуў свой прытулак.

Знайшоў запасы ежы,
Падсілкаваўся, потым
Праз люк палюбаваўся
Нябёсаў пазалотай.

А ў тэлескоп як глянуў
Ён на зямлі прасторы,
Убачыў акіяны,
Даліны, рэкі, горы,

Знаёмыя мясціны —
Баравіковы ельнік,
Сярод густой ажыны
Свой родны муравейнік.

Ад радасці, здзіўлення
Пра ўсё забыў Бадзіня.
— Глядзіце, як лячу я! —
Гукнуў ён у кабіне,

Нібыта яго голас
Мог даляцець да дому,
Да нарачанскіх нетраў,
Да блізкіх і знаёмых.

Ён толькі касманаўтаў
Збудзіў, якія, дужа
Здзівіўшыся, спыталі:
— Адкуль ты ўзяўся, дружа?

Ды ты ўжо не хавайся.
Цяпер нас будзе трое.
Работу падшукаем
І для цябе, героя.

Пра тое, што ты з намі,
У рапарце адзначым.
Нат можаш інтэрв'ю даць
Па тэлеперадачы...

Цяпер як паўнапраўны
Ўжо касманаўт Бадзіня
Даследаваў з усімі
Падзорныя глыбіні.

Шырот паўночных ззянне,
Камет агністых грывы,
Дзівосных, серабрыстых
Аблокаў пералівы.

Нагледзеўся ён столькі
Ў палёце дзіўным гэтым,
Што нат сябрам не змог бы
Ўсё расказаць за лета.

Таму, калі палёт іх
Праграмны завяршыўся,
І карабель касмічны
Дзе трэба прызямліўся,

І касманаўтаў гучна
Віталі ўсе,— Бадзіня
Кабіну непрыкметна
Ў той мітусні пакінуў.

Калі ж яго адсутнасць
Заўважылі, далёка
Ужо ішоў ён стэпам
Квітнеючым, шырокім,

Ішоў і ехаў доўга
Ў дажджы і сухавеі...
Ды хто ўсю прыгадае
Бадзіні адысею!

Адно, калі вярнуўся
У свой стажок жывічны,
Ўсе жыхары лясныя
Яго сустрэлі зычна,

Сустрэлі як героя.
І расказаў усім ён
Пра ўсе свае прыгоды
У падарожжы дзіўным.

І сёння, калі часам
Заглыбіцеся ў нетры,
Дзе векавыя хвоі
Шумяць пад веснім ветрам,

Дзе Нарач хвалі сініць
І звон стаіць птушыны,
Пачуеце вы гэту
Пра Мураша быліну.

## МІХАСЬ КАЛАЧЫНСКІ

Міхась (Міхаіл Іванавіч) Калачынскі нарадзіўся 12 студзеня 1917 г. у гарадскім пасёлку Крупкі Мінскай вобласці. У 1936 г. скончыў курсы пры Камуністычным інстытуце журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. Некаторы час працаваў адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва».

М. Калачынскі — удзельнік савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг. і Вялікай Айчыннай вайны (быў армейскім журналістам). З 1945 г. працаваў у рэдакцыях газет «Защитник Родины» (Адэса, 1945—1947), «Во славу Родины» (Мінск, 1947—1953). Некаторы час быў галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна», з 1954 г.— адказны сакратар, а з 1958 г.— намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1960—1978 гг. працаваў галоўным рэдактарам часопіса «Беларусь».

Друкавацца пачаў у 1932 г. у часопісе «Іскры Ільіча» і газеце «Піянер Беларусі». Для юнага чытача выйшлі зборнікі вершаў, казак, паэм «Насустрач жыццю» (1951), «На лясным паўстанку» (1955), «Прыгоды Патапкі» (1958), «Лясныя казкі» (1967), «Мая мазаіка» (1971), «Рэха зямлі» (1978), «Снежная казка» (1986).

Нямала паэтычных твораў М. Калачынскі напісаў для дарослых. Гэтыя вершы склалі зборнікі паэзіі «Сонца ў блакіце» (1949), «У вялікім паходзе» (1952), «Прыпар» (1956), «Сосны і дзюны» (1960), «Гронка рабіны» (1964), «Паясы» (1968), «За палямі, за лясамі» (1969), «Докшыцкі каравай» (1974), «Кніга дружбы» (1975), «Суквецце» (1977), «Да берагоў запаветных» (1983).

### ПРАМЕНЬ СА СМОЛЬНАГА

*(Успаміны петраградца)*

Мы не забудзем гэту ноч
На петраградскім рубяжы...
Дыміў смалой пакрыты корч
У нашым цесным бліндажы.

Заціх у поўнач гул гармат.
Але не спаў ніхто ані:
Стаяў бяссонны Петраград,
Свае зашторыўшы агні.

Хадзіла Балтыкай вайна,
Салёны вецер з мора дзьмуў.
У Смольным з вышняга акна
На міг ён штору адхінуў.

Раптоўна хлынула святло
У ноч, прастыглую нашчэнт,
Ад неўскіх згібаў паплыло
На ўвесь сусвет, на ўвесь сусвет.

І мы запомнілі той міг,
Бо сэрцам верылі ў адно —
У новы век для нас усіх
Сам Ленін адчыніў акно.

Яшчэ, як чорны парасон,
Вісела цемра над зямлёй,
А мы, падняўшы батальён,
Ішлі, натхнёныя, у бой.

Ішлі, бяссонныя, ўначы,
Ільды ламаючы, як шкло,
Каб пакаленням зберагчы
Жывое Леніна святло.

## РАЗМОВА З ЖУРАЎЛЁМ

— Жораў шэры, журавель,
Ты з якіх ляціш зямель?

— Я пакінуў край заморскі
І лячу ў свой прыдняпроўскі.

— Добры жораў, раскажы,
Што ж там бачыў, як там жыў?

— Бачыў розныя я дзівы,
Пальмы, тыграў, кракадзілаў.

— Можа, свой сабраўшы род,
Бавіў час ля цёплых вод?

— Быў на водах, ды не вельмі
Палюбіў пяскі пустэльні.

— Ад чужых зямель, нябёс
З чым ляцеў ты, што ж ты нёс?

— Ад Сахары і ад Ніла
Смутак нёс я ў шлях на крылах.

— Там жа сонца, сінява,
Дык чаго ж ты сумаваў?

— Сумаваў я па айчынных
Поймах, рэках, балацінах.

— Дзе ж ты спынішся? Куды
Вабіць шлях цябе заўжды?

— Шлях у родны край
бацькоўскі,
Ён мілей зямель заморскіх.

— Праўда?
— Праўду гавару.
Кр-р-ру! Кр-р-ру!

## ХАЧУ ПАДРАСЦІ

Ходзяць чуткі між дзяцей,
Што з даждком усё расце.

Пойдзе ён —
На паплавах
Густа выскачыць трава.

Лес палье —
Глядзі, й дубок
Новы выкіне сучок.

Пусціць воды
Долу ўглыб,
І палезе ўгору грыб.

Дождж, я верыў, дабрадзей,
І чакаў яго штодзень.

Дачакаўся
І — на двор,
З галавы здымаю ўбор.

Дожджык капае —
Стаю,
Шапку зняў хутчэй сваю.

Дождж мацнее,
Дождж сячэ,
Я ж на месцы ўсё яшчэ.

Тата выскачыў:
— Сынок,
Марш у хату! Ты ж прамок.

Я ў адказ:
— Ды не бяда,
Льецца ж цёплая вада...

Я стаю,
Бы на пасту,
Ды не бачу, як расту.

**РАНІЦА Ў ЛЕСЕ**

Квітнее лес,
Дыміцца,
Варушачы галлём.
Расінак завушніцы
Мігаюць серабром.

Стаіць вясёлы пошум
Зялёнага галля.
Жаўтляваю парошай
Засыпана зямля.

Прыгрэтая зарою,
Чысцей расы і шкла,
Цячэ на дол па хвоях
Цягучая смала.

Бярозы-маладухі
Выглядваюць з-за хвой.
Таполі белым пухам
Пакрыты з галавой.

Сівым лісцём махае —
Ляцець бы ёй! — лаза.
Паўзе, нібы жывая,
Па мшышчу дзераза.

Вяршалін вострых пікі
Падняты сасняком.
Гарыць гарошак дзікі
Блакітным аганьком.

А кветкі —
Люба глянуць!
Стракатаю сям'ёй
Сышліся на паляну,
На летні мітынг свой.

Адна стаіць, цыбатая,
Падняўшы парасон.
Лісцём другая кратае,
Б'е ўсёй зямлі паклон.

А трэцяя, чацвёртая
Глядзяцца ў глыб нябёс,
А пятая разгортвае
Пялёсткі ў ззянні рос.

Льюць кветкі пах духмяны
На ўвесь лясны гушчар.
Ірдзее на палянах
Паземкаў ранні жар.

## ПЯТРО РУНЕЦ

Пятро (Пётр Мікалаевіч) Рунец нарадзіўся 4 мая 1911 г. у вёсцы Азярычына Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. У 1940 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у рэдакцыях газеты «Піянер Беларусі» і часопіса «Бярозка», у 1963—1971 гг.— на Беларускім радыё.

П. Рунец піша пераважна для дзяцей. Друкуецца з 1932 г. Першы зборнік апавяданняў «Юныя змагары» выйшаў у 1940 г., затым з'яўляюцца кнігі апавяданняў «У веснавыя дні» (1954), «Бярозавы конь» (1956), «Гіпсавая маска» (1958), «Канец казкі» (1960), «Заламаны ражок» (1961), «Вясёлыя здарэнні» (1962), «Важнае заданне» (1968), «Белы васілёк» (1971), «Добрая душа» (1977), «Апошняе шчасце» (1984), «Незвычайны наведвальнік» (1985) і аповесці «Алёшка-верхалаз» (1963), «Аб чым шэпчацца аер» (1966). Абедзве аповесці ў 1971 г. выдадзены асобнай кнігай «Алёшка і яго сябры».

П. Рунец — аўтар кнігі ўспамінаў пра Янку Маўра «Чалавек з крылатай фантазіяй» (1979).

Разам з Я. Маўрам пісьменнік склаў зборнік успамінаў дзяцей пра вайну «Ніколі не забудзем» (1948).

Працуе П. Рунец і ў галіне мастацкага перакладу.

## ЛЁНЕВА ТАПОЛЬКА

Цёплым веснавым надвячоркам Лёня з мамай ішлі з дзіцячага сада дахаты. Каля тратуара раслі маладыя гонкія таполі. Пажылы дзядзька ў сіняй спяцоўцы вялізнымі нажніцамі абразаў верхавіны галінак. Лёня спыніўся і трывожна спытаў:

— Дзядзя, нашто вы іх так калечыце?..

— Каб дрэвы раслі не ўгару, а ў бакі. Так прыгажэй,— адказаў той.

Лёня са смуткам пазіраў на галінкі, што ляжалі на тратуары. Потым падняў адну, досыць доўгую і роўную, і ціха сказаў:

— Мама, я вазьму яе дамоў.

— Што ты будзеш з ёю рабіць?

— Пасаджу ў бутэльку... На ёй вырастуць лісцікі.

— Хто табе гаварыў?

— Святлана Сямёнаўна.

— Вазьмі.

Дома маці дала Лёню бутэльку з-пад кефіру. Ён наліў у яе вады, усунуў галінку і паставіў на акно, на сонца. Потым падумаў і сказаў:

— Мама, я ўсыплю ў бутэльку крышку цукру.

— Навошта?

— Калі табе даць пусты чай, ты будзеш яго піць? Не, таму што ён нясмачны. Так і галінцы. Піць голую ваду нікому не хочацца. Так казала выхавальніца.

— Ну што ж, усып,— усміхнулася маці.

Хлопчык дастаў крышку цукру і ўсыпаў у бутэльку.

Стаіць галінка на акне. Грэецца на сонейку. П'е салодкую ваду. Набухаюць яе пупышкі. Павольна, непрыкметна для вока. Пільнуе яе Лёня, хоча паглядзець, як яны будуць распускацца.

Пільнаваў-пільнаваў Лёня і не ўпільнаваў. Аднойчы раніцай падышоў да галінкі і радасна здзівіўся. Самыя верхнія пупышкі лопнулі, і з іх паказаліся вострыя зялёныя лісцікі.

— Мама, распусціліся! — закрычаў ён, любуючыся чыстай яркай зелянінай.

А яшчэ праз некалькі дзён на канцы галінкі, што ў вадзе, паказаліся белыя тонкія нітачкі...

— Мама, што гэта? — спытаў узрушаны Лёня.

— Карэньчыкі.

У дзіцячым садзе Лёня расказаў пра гэта дзіва Святлане Сямёнаўне. Тая выслухала яго і спытала:

— А што ты будзеш рабіць са сваёй галінкай?

— Не ведаю,— прызнаўся Лёня.

— Давай пасадзім на той вунь градцы,— паказала выхавальніца на свежаўскапаную клумбу.

— Там жа кветкі будзем садзіць!

— Ну і што? Месца хопіць і для кветак, і для тваёй галінкі.

— Добра,— згадзіўся Лёня.

Назаўтра Лёня прынёс галінку ў дзіцячы сад. Дзеці абступілі яго і пачалі дапытвацца, што ён будзе з ёю рабіць.

— Пасадзім на двары,— адказала за яго Святлана Сямёнаўна і загадала збірацца. Дзеці апрануліся і гуртам выйшлі на двор. Выхавальніца падвяла іх да градкі і пачала прымервацца.

— Пасадзім вось тут,— сказала яна і дала Лёню шуфлік.— На, капай.

— І я хачу капаць! — папрасіў Лёнеў сябар Валодзя.

— І я!

— Калі ўсім капаць, вялікая яма атрымаецца,— заўважыла Святлана Сямёнаўна.— А наша галінка малая. Дык я думаю так: Лёня нёс, няхай ён і ямку капае. Згодны?

— Згодны! Добра! — загулі дзеці.

Лёня капануў раз, другі — ямка і гатова.

— А цяпер будзем садзіць,— сказала выхавальніца.— Лёня, падай бутэльку.

Лёня падаў. Святлана Сямёнаўна выняла галінку, расправіла карэньчыкі, акуратна ўставіла ў ямку і засыпала зямлёй. Прытаптала і паліла вадой з бутэлькі — каб было чым напіцца. Дзеці з цікавасцю глядзелі на пасаджаную галінку.

— Ці прымецца яна? — спытаўся нехта.

— Прымецца,— упэўнена адказала Святлана Сямёнаўна і дадала: — Толькі яе трэба даглядаць. Паліваць, размякчаць зямлю, не кратаць рукамі...

— Мы будзем глядзець,— паабяцалі дзеці...

— Але не ўсе разам,— растлумачыла выхавальніца.— Па чарзе. Заўтра яе палье Валодзя, паслязаўтра — Зіна...

Дзеці задаволены: усе яны будуць даглядаць таполевую галінку.

Мінула некалькі дзён. Галінка прынялася, выпусціла новы лісцік. Першы яго заўважыў, вядома, Лёня. Калі ён сказаў пра гэта, усе дзеці пабеглі паглядзець. Прыйшла і Святлана Сямёнаўна. Зірнула — праўда, на самым версе зелянее новы лісцік.

— Лёнева таполька будзе жыць,— радасна сказала яна.

Пачулі гэта дзеці. Спадабалася ім. З таго часу так і завуць яе: Лёнева таполька.

### СУР'ЁЗНАЯ РАЗМОВА

Грышка Сапун вучыцца не дужа старанна, таму і адзнакі ў дзённіку розныя.

Аднаго дня ён прыйшоў са школы, кінуў на канапу ранец і рашуча заявіў:

— Мама, у школу я больш не пайду!

— Чаму? — здзівілася маці.

— Я... не ўмею вучыцца. Пяцёрак мне не ставяць, а двоек сам не хачу. Навошта каб з мяне смяяліся, двоечнікам называлі...

Маці спахмурнела і задумалася: што сказаць сыну? Потым прысела на канапу, абняла Грышку і лагодна загаварыла:

— Ну што ж, дзіцятка, сядзі дома. Толькі чым жа ты будзеш займацца, калі мы з татам пойдзем на работу?

Грышка падумаў і адказаў:

— Пагуляю на вуліцы адзін. А калі прыйдуць са школы сябры, пабягу да іх...

Маці не дала яму дагаварыць:

— Ты думаеш, хлопцы будуць бегаць з табою па вуліцы? Ім жа трэба рыхтаваць урокі. А даведаюцца, чым заняты, пачнуць пальцам на цябе паказваць: «Во які! Замест таго, каб вучыцца, у цацкі гуляе».

Грышку непрыемна было слухаць горкія словы, і ён аж закруціўся на канапе.

— Падумай сам,— працягвала маці,— усе дзеці ходзяць у школу, адзін ты сядзіш дома. Хто на доктара потым вывучыцца, хто на настаўніка, хто на камбайнера... А ты кім будзеш?

Грышка задумаўся. Сапраўды, кім ён будзе, калі вырасце? Як будзе жыць? Але тут яму ўспомнілася бабуля, і ён адразу павесялеў:

— Мама, а бабуля наша не вучылася, ніводнай літаркі не ведае, а жыве.

— Эх, сынок, гаворыш ты абы-што,— уздыхнула маці і з жалем дадала: — Бабуля, калі хочаш ведаць, вельмі хацела вучыцца, ды школ тады для бедных не было. Таму і засталася непісьменнай. Затое пазней, пры Савецкай уладзе, вывучыла свайго сына, твайго бацьку, і ён цяпер корміць яе. А ці зможаш ты, невук, карміць нас, тату і мяне, калі састарымся?

Грышка скасавурыўся і глядзеў на маці так, быццам бачыў яе ўпершыню. Гэтак сур'ёзна з ім яшчэ не размаўлялі.

— Дык што мне рабіць, мама? — разгубіўся ён.— Двоек я не хачу.

— У цябе, сынок, ёсць адна паганая хвароба — гультайства. Таму і атрымліваеш дрэнныя адзнакі. Вазьміся за вучобу, як Толя, твой сябрук, і ў тваім дзённіку таксама з'явяцца чацвёркі і пяцёркі!

Матчыны словы кранулі за жывое. Няўжо ён, Грышка Сапун, горшы за Толю? І, не сказаўшы ні слова, ён узяў ранец і пайшоў у другі пакой — рабіць урокі.

## СЛАНЕЧНІК

Ранняй вясной Паўлік прастудзіўся і доўга хварэў. Калі папраўіўся, доктар параіў адвезці яго ў вёску. «Там,— сказаў ён,— хлопчык хутчэй сіл набярэцца». Бацька паслухаўся парады і адвёз Паўліка да бабулі.

Вёска, у якой жыве бабуля, невялікая. Каля кожнай хаты — сад, грады. І бабуля з раніцы завіхалася ў агародзе, садзіла цыбулю, агуркі, моркву.

Неяк Паўлік падышоў да бабулі і здзівіўся:

— Ты садзіш чорныя семкі?

— Ага, семкі,— адказала бабуля і падала некалькі зярнятак.— На, пасадзі сам. Вырастуць твае сланечнікі.

Паўлік узяў лапатку, ускапаў пад акном градку і пасадзіў зярняткі. Кожны дзень паліваў, чакаў, калі яны ўзыдуць. І вось на-

рэшце з зямлі паказаліся тры тоненькія зялёныя сцяблінкі. Паўлік доўга глядзеў на іх, а затым спытаўся:

— Бабуля, ці вырастуць яны, такія маленькія?

— За лета вырастуць.

— Вялікія?

— Большыя за цябе.

А дні ішлі. Цёплыя, сонечныя. Паўлік паліваў свае сланечнікі, і яны хутка раслі. Асабліва адзін — рос як на дражджах, на цэлую галаву абагнаў Паўліка. «Цікава, як выглядае ён зверху?» — падумаў хлопчык. Асцярожна нахіліў сцябло і ўбачыў радочкі жоўтых кветачак. Сонечныя промні раптам асвяцілі сланечнік, і ён успыхнуў, як сонца.

Паўлік прыбег у хату з навіной:

— Бабуля, глянь, сонейка ў акне!

Бабуля падышла да акна, залюбавалася:

— Праўда, сланечнік падобен на маленькае сонца.

Паўлік не выцерпеў:

— А дзе ж семкі?

— Пачакай, кветачкі адцвітуць, асыплюцца і ты ўбачыш чорныя семкі.

Аднак Паўлік не дачакаўся, калі паспеюць сланечнікі. Прыехаў бацька, каб забраць яго дадому: трэба было ісці ў школу.

— Не бядуй, унучак,—сказала бабуля,— я прывязу табе семак.

Прыехала яна недзе праз месяц. Дастала з сумкі невялікую торбачку, падала Паўліку. Той хуценька развязаў яе і аж заскакаў ад радасці:

— Семкі! Ды якія вялікія!

— І смачныя! — запэўніла бабуля.— Еш сам, пачастуй маму з татам, сяброў. Гэта — твае семкі.

## ПІМЕН ПАНЧАНКА

Народны паэт Беларусі Пімен Емяльянавіч Панчанка нарадзіўся 23 жніўня 1917 г. у горадзе Таліне, куды яшчэ ў дарэвалюцыйны час яго бацькі, бедныя сяляне, выехалі дзеля заробку. У 1920 г. сям'я вярнулася на радзіму, у мястэчка Бягомль Віцебскай вобласці. Паспяхова закончыўшы ў 1934 г. педагагічныя курсы ў Бабруйску, П. Панчанка пяць гадоў настаўнічаў у Кіраўскім раёне на Магілёўшчыне, адначасова вучыўся завочна на філалагічным факультэце Мінскага настаўніцкага інстытута, які скончыў у 1939 г. У гэтым жа годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. П. Панчанка — удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., Вялікай Айчыннай вайны. У 1944—1945 гг. знаходзіўся ў якасці ваеннага журналіста ў Іране.

З 1946 г. працаваў у рэдакцыях часопіса «Вожык», газеты «Літаратура і мастацтва», быў галоўным рэдактарам часопісаў «Советская Отчизна» (цяпер «Неман», 1954—1958), «Маладосць» (1958—1966), сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1966—1971).

Першыя вершы П. Панчанкі з'явіліся ў 1934 г. у раённай газеце «Кіравец». У 1938 г. выходзіць першы зборнік яго вершаў «Упэўненасць», а ў 1940 г.— «Вераснёвыя сцягі». Творы ваеннага часу ўвайшлі ў зборнікі «Тебе, Беларусь» (на рускай мове, 1942), «Дарогай вайны» (1943), «Далёкія станцыі» (1945). Знаходжанне ў Іране дало багаты матэрыял для стварэння «Іранскага дзённіка» (1944—1947). П. Панчанка — аўтар зборнікаў паэзіі «Гарачыя вятры» (1947), «Вершы» (1948), «Прысяга» (1949), «За шчасце, за мір!» (1950), «Вершы і паэмы» (1952),

«Шырокі свет» (1955), «Гарачы лівень» (1957, гумар і сатыра), «Кніга вандраванняў і любові» (1959), «Нью-Йоркскія малюнкі» (1960), «Тысяча небасхілаў» (1962), «Чатыры кантыненты» (1964), «Размова з наследнікамі» (1967).

Лірычныя зборнікі 70-х гг.— «Снежань» (1972), «Крык сойкі» (1976), «Вячэрні цягнік» (1977), а таксама зборнік «Пры святле маланак» і новыя па часе вершы ўвайшлі ў паэтычныя кнігі «Млечны шлях» (1980) і «Лясныя воблакі» (1985).

Паэзія П. Панчанкі трывала ўвайшла ў чытанне падрастаючага пакалення, якому і адрасаваны зборнік вершаў паэта «Сіні ранак» (1984).

Пяру П. Панчанкі належыць зборнік публіцыстычна-крытычных артыкулаў «На паэтычным небасхіле» (1977).

У 1959 г. за паэму «Патрыятычная песня» П. Панчанку прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы, у 1967 г. за кнігу вершаў «Пры святле маланак» (1966) — Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы. За лірычныя творы 70-х гг., што склалі кнігу «Дзе начуе жаваранак» (1979), П. Панчанку прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР (1981).

У 1973 г. П. Панчанку прысвоена ганаровае званне народнага паэта БССР.

## ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ!

На гранітнай трыбуне — бяссмертны Ільіч,
Так стаяў у дваццатым ён перад байцамі...
Сэрца, сёння мінулыя годы пакліч,
Што прайшлі пад яго баявымі сцягамі.

Родны Ленін! Як дораг мне воблік яго,
За усіх ён бліжэй...
Я з таго пакалення,
Над калыскай чыёй з першых дзён, з першых год
Клапатліва схіляўся з усмешкаю Ленін.

У той дзень, калі я ўпершыню павязаў
Гальштук юнага ленінца, яркі, барвовы,
Я на плошчу прыйшоў, і, здалося, сказаў
Мне Ільіч: будзь гатоў!
— Я заўсёды гатовы!

Камсамольцам на фронт ў сорак першым ішоў,
Зняў пілотку ля помніка з думай суровай.
І пытаўся Ільіч: бараніць ты гатоў
Дарагую Радзіму?
— Заўсёды гатовы!

Камуністам вярнуўся з вайны я дамоў,
Мінск убачыў, разбіты ушчэнт, да асновы.
Пакланіцца прыйшоў Ільічу.
— Ты гатоў
Будаваць родны горад?
— Заўсёды гатовы!

Камуністы ўпустую прысяг не даюць —
Ты і я, мы усе.

Паглядзі, правадыр наш,
На узнятую к сонцу сталіцу маю,
На шчаслівы народ наш, адважны і мірны.

Мы са шляху твайго не сышлі ні на крок,
Нас на подзвіг працоўны вяло твае слова.
І не страшна, што недзе згушчаецца змрок,
Наш дэвіз і сягоння:
— Заўсёды гатовы!

### ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

Ім не спявалі маткі калыханкі,
Яны не чулі казак ад дзядоў,
Палохаў іх ахрыплы голас танкаў,
Трывожыў іх журботны енк удоў.

Яны не плакалі бяссоннымі начамі,
Калі ад бомбаў неслі іх у склеп.
І словы першыя, якім іх навучалі,
Былі пра немцаў, пра вайну і хлеб.

Заціхнуць бітвы. Вораг будзе знішчан.
І дзеці прычакаюць таго дня,
Калі з-пад воблака ўпадзе на папялішчы,
Як цёплы дождж, густая цішыня.

Нясмела з хат яны у поле выйдуць,
Каб першы раз спакойна у жыцці
Палюбавацца родным краявідам,
Паслухаць звон рачулкі у трысці.

Пі пах лугоў, красой гаёў любуйся!
І ўсё ж іх сэрцы задрыжаць не раз:
Ім здасца самалётам першы бусел,
Пажарам здасца першая зара.

Лагодны гром за дальняю дубровай
Напомніць ім пра жах бамбардыровак.
І часта, часта ў чыстыя іх сны
Ўрывацца будуць галасы вайны.

### ПЕСНЯ ПРА МІНСК

У дні бяды і ў ранак Перамогі,
У дні, калі ты харашэў і рос,
Усе твае надзеі і трывогі
Я ў сэрцы нёс.

Я да цябе з усіх дарог вярнуся:
Вярнуся ў партызанскую радню.
Ты мне прабач, калі я зажуруся
Ля Вечнага агню.

Спакойнае дзяцей тваіх дыханне,
Шумі над іх калыскамі ліствой.
Маё ты ранне, і маё каханне,
І вечар сіні мой.

Мой родны Мінск,
Пад небам жураўліным
Жыві, квітней пад зоркай залатой.
Ты для мяне на ўсёй зямлі — адзіны,
Цябе люблю я ўсёй душой.

### ГАЛЬШТУК

Ён крыху запэцканы чарнілам,
Не святочны — змяты і стары.
Мне яго дзяўчынка падарыла
У спякотнай шчодрай Бухары.

Там ішло усё па рытуалу,
Ну а плошча шчырасцю гула.
Ты ўбаку маленькая стаяла,
Ростам ты па сэрца мне была.

Не ўзялі цябе у строй парадны,
Можа, з-за адзнак ці нейкіх бед.
Толькі бачыў: сапраўды ты рада,
Госці падабаюцца табе.

Я знарок з галоўнай сцежкі збочыў
Непрыкметна і не напаказ.
Божа мой, якім прызнаннем вочы
У малой заззялі мне ў адказ...

Успаміны я перабіраю,
Свецяць вачаняты мне здалёк.
І часцей цяпер я пазіраю
На дзяцей, адціснутых убок.

### УНУЧКАМ

#### 1

У Каці добры вожык,
А з ёй гуляць не хоча.
У вожыка сто ножак,

Так ноччу ён тупоча.
І Каця вожыку крычыць,
Што хоча ножкі палічыць.

2

Ксюшачка, Ксюшачка,
Вось табе падушачка.
Дарагой маёй дзяўчынцы
Пазбіралі па пярынцы
Тыя гусі белыя,
Што па лузе бегалі.
Ты заснеш, ты заснеш
На сваёй падушачцы.
І не думай у сне
З гусаком падужацца.

### САЛОДКАЯ ЛЯЧЭБНІЦА

Як толькі за Оршай
Направа павернеш —
Прыедзеш у вёску
Пад назвай Цукерня.

Бабулі ласкавыя
Добра там лечаць
Дзяцей, што цукеркамі
Зубы калечаць.

Тут мыюцца толькі
Салодкай вадою,
І весела ўсім
За салодкай ядою.

З вішнёвым варэннем
Тут вараць ірыскі,
Густы мармелад
Наліваюць у міскі.

На сонечным мёдзе
Піражныя смажаць.
Гузы, сінякі
Тут марожаным мажуць.

З лугоў навакольных
Злятаюцца пчолы
І робяць ласунчыкам
Дзесяць уколаў...

Ды хутка ўсе дзеці
Пытаюць трывожна:
— Ізноўку цукеркі?
— Не хочам піражных!

Ні хлеба, ні мяса,
Ні кроплі гарчыцы.
Як цяжка лячыцца —
Цяжэй, чым вучыцца.

І плачуць, і просяць
Ласкавых бабулек:
— Ах, дайце, бабулі,
Хутчэй нам цыбулі!

Нам хочацца хлеба,
І супу, і кашы:
Прайшла ўжо хвароба
Салодкая наша.

## ІВАН ГРАМОВІЧ

Іван Іванавіч Грамовіч нарадзіўся 26 ліпеня 1918 г. у вёсцы Закружка Мінскага раёна Мінскай вобласці. У 1939 г. скончыў літаратурна-лінгвістычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. У гэтым жа годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. У пасляваенныя гады працаваў у часопісах «Беларусь», «Мала-

досць». Пасля заканчэння Вышэйшых літаратурных курсаў у Маскве (1956) быў начальнікам сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм» (1956—1957), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» (1957—1958), літкансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (1958—1970), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Вожык» (1970—1976).

Першае апавяданне І. Грамовіча «Ружовіўся ўсход» з'явілася ў 1935 г. у калектыўным зборніку «Аднагодкі», а ў 1939 г. была апублікавана аповесць «Чужы грунт» у часопісе «Полымя рэвалюцыі».

У 1947 г. выходзіць першы зборнік пісьменніка «Апавяданні», а потым адна за адной з'яўляюцца кнігі апавяданняў і аповесцей «Шырокія азёры» (1951), «Да ясных вышыняў» (1952), «У лесе на палянцы...» (1952), «Рына-Марына» (1958), «Далі сабе слова» (1970), «Чатыры сантыметры надзеі» (1987).

І. Грамовіч — аўтар зборнікаў гумарыстычных апавяданняў «Нарасць» (1961), «Вадалей-гэтакдалей» (1975), «Залатая бранзалетка» (1977), а таксама кнігі нарысаў «Агні пяцігодкі» (1949). Успаміны пра вядомых пісьменнікаў Я. Купалу, Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова склалі кнігу «У сховах памяці і сэрца» (1983).

Плённа працаваў І. Грамовіч і ў галіне дзіцячай літаратуры. Для юнага чытача ён выдаў зборнікі апавяданняў «Першага верасня» (1949), «Сонца скрозь воблакі» (1964), «Як вясну рабілі» (1985).

Памёр пісьменнік 2 ліпеня 1986 г.

## КАВАЛАЧАК ХЛЕБА

Дзед шмат ведаў казак. Мне іх расказваў. І расказваў не тады, калі я яго прасіў, а тады, калі была нейкая прычына.

А прычына знаходзілася заўсёды.

Вось калі мы выганялі статак у поле, мне, як падпасавічу, ён даручаў насіць торбу з хлебам. У торбе, апроч акрайчыка хлеба, часам ляжала скварка сала ці яйка, зваранае крута, соль, кіслы агурок, бутэлька малака ці хлебнага квасу. Словам, харч на цэлы дзень сухім пайком, як цяпер кажуць. Увесь гэты правіянт быў завязаны вузлом у торбе, якую мне даводзілася цягаць. Я кажу не насіць, а цягаць, бо перад абедам рука стамлялася, ноша надакучвала і я ставіў яе дзе-небудзь пад куст або вешаў на сучок бярозы. Сам ішоў адганяць памаўзлівых кароў ад шкоды, а потым вяртаўся да бярозы і падцягваў торбу на новае месца.

Неяк я згубіў гэтае месца. Забыўся, пад якім кустом паклаў торбу. І доўга яе шукаў. Мае пошукі дзед прыкмеціў, дачакаўся, калі падыду, і пачаў пытацца: чаму я з сабой не нашу торбу. А што ж было б, каб не адшукаў ношу ці сабака яе ўкраў? Мы засталіся б без абеду, галодныя...

Гэта справядліва, але я таксама адказаў пераканаўча і шчыра:

— Абрыдла яе цягаць.

— Эх, блазнота! — усміхнуўся дзед.— Прысядзь на купіну, паслухай, што я табе раскажу...

Вось і прычына трапілася.

Дзед, помню, расказаў пра аднаго дзівака, які нёс у мяшку хлеб за плячыма. Дарога была далёкая. Ішоў-ішоў дзівак, нёс-нёс у мяшку хлеб за плячыма, замарыўся. Спыніўся. Перакідае ношу з пляча на плячо і лаецца:

— Ох, каб на цябе ліха! Яшчэ гэты цяжар насі на сабе!

А хлеб у мяшку за плячыма адгукаецца:

— Не, чалавеча, не ты мяне нясеш, а я цябе нясу.

— Што? — абурыўся дзівак.— Каму гэта не відно, што я цябе ўсю дарогу на сабе валаку!..

А хлеб з мяшка зноў падае голас:

— Памыляешся, чалавеча. Не ты мяне нясеш, а я цябе нясу.

— Пабурчы ў мяне! — узлаваўся дзівак.— От зараз вазьму дый скіну з плеч... Пабачым, хто каго панясе.

— Кідай,— кажа хлеб,— але потым не кайся.

— Ах, ты будзеш у мяне аскірзацца! — разгневаўся дзівак і кінуў мяшок на ўзбочыну пры дарозе.

Пайшоў сабе з вольнымі рукамі. Ідзе, без цяжару лёгка ісці... Ішоў-ішоў, а тут і ноч настае. Есці захацелася. Прысеў ды і думае: «Далей ісці трэба, але падсілкавацца не шкодзіла б... А чым? Хлеба няма...»

Так і атрымалася, што хлеб аказаўся разумнейшы за чалавека. Адумаўся дзівак, пакаяўся, ды было позна.

Калі дзед апавядаў, мне было пацешна, што дзівак па сваёй дурноце хлеб выкінуў вон.

— Чаго ты смяешся? — сказаў дзед.— Глядзі, каб не ўпадобіўся гэтаму падарожніку... І табе ж абрыдла цягаць торбу.

Берагчы хлеб, шанаваць самы маленькі кавалачак, кожную скарыначку прывучалі дзед і бацька.

— З'еш усё! Не пакідай агрызак! — сварылася маці.— Не можна!

— Чаму?

— Голад можа настаць...

Я не разумеў іх. Якая сувязь паміж голадам, якога ніколі я не бачыў, і палоханнем, строгасцю, з якімі дарослыя прывучалі мяне шанаваць хлеб? Ну, што будзе, калі я скамячу з мякіша галачку і шпурну яе ў ночвы, дзе сястра будзе мыць бялізну?.. Паляцяць пырскі — мне будзе смешна... Што можа здарыцца, калі недаедзеную скібку я выкіну на сметнік?.. Падумаеш, вялікая страта!

Аднак пасля падобных жартаў у мяне счарнела рука і пальцы з месяц не згіналіся,— так даў бацька па руцэ, якой я кідаў хлеб. Ударыў і аблаяў такімі словамі, якія не магу паўтарыць. Бо, як казалі дарослыя, у роце папухне...

Дзед не лаяўся, не караў мяне. У яго было шмат угавораў, шмат казак, як пра таго дзівака.

Помню пра хлеб яшчэ адно яго паданне ці легенду.

— Пацалуй недаедзены кавалачак і пакладзі ў торбу,— сказаў ён аднойчы мне.— Эх, які ж ты неакуратны! Колькі цябе ні вучы, усё роўна расцеш беспамятны... Відаць, як паспытаеш свой горкі кавалачак хлеба, тады зразумееш, чаго ён варты.

Мы абедалі каля крыніцы, пад вярбой. Каровы пасвіліся ў лагчыне... І дзед пачаў гэту легенду, якую тады я не мог запісаць і цяпер перадам сваімі словамі.

— Людзі вельмі доўга харчаваліся травой, ягадамі, грыбамі. Елі ўсё, жылі ўпрогаладзь, бедна, аж пакуль не выдумалі хлеб. Хлеб яны выдумалі не адны. Былі ў іх памагатыя. І хто ты думаеш? Сонца, Вецер і Вада!..

Даўно-даўно гэта было. Вецер і Вада хадзілі па зямлі, як людзі і жывёла. А Сонца, як і цяпер, плавала над зямлёй, у вышыні. І магло размаўляць чалавечай мовай.

Сонца, Вецер і Вада бачылі, як цяжка жывецца людзям. От, адзін раз сабраліся яны і пачалі між сабой меркаваць. Як памагчы людзям жыць багацей і шчаслівей на зямлі? Разважалі-разважалі. І Сонца тады прапанавала новы харч для людзей.

— Толькі няхай яны вынаходзяць і здабываюць самі,— сказала Ветру і Вадзе Сонца.— А мы ім паможам. Будуць любіць гэту працу, зажывуць шчасліва...

Дало Сонца Ветру некалькі зерняў жыта. Вецер пасеяў. Вада дожджыкам паліла. Цяпло прыгрэла. Зерні ўзышлі. Сонца ўсміхнулася. Жыта пачало расці ўгору.

Глядзяць людзі і дзівяцца: што гэта такое расце?

А жыта вырасла. Паспелі буйныя каласы. Людзі сабе думаюць: ну, што з гэтых каласоў можна зрабіць? Нашто яны могуць спатрэбіцца?

Адзін чалавек сарваў каласок, расцёр яго. Узяў на зуб зерне. Пакаштаваў...

Другі чалавек прыдумаў зварыць зерні ў вадзе. Пакаштаваў...

Трэці чалавек прыдумаў таўчы зерні. Стоўк — атрымалася мука. З мукі жонка зварыла зацірку. Пакаштавалі...

Адна дасціпная цётка з мукі замясіла цеста. Камяк цеста паспрабавалі спячы. Спяклі. Атрымаўся румяны бохан...

Так чалавек вынайшаў хлеб.

З тае даўняй пары людзі ўсё больш і больш удасканальвалі свае вынаходства. Выдумалі белы хлеб. Сітны хлеб. З чарнушкай. З кменам. З разынкамі... Выдумалі пірог. Святочны пірог. Вясельны каравай... Выдумалі булкі, абаранкі, розныя піражкі... З мёдам, з макам, з капустай...

Але знайшліся ў аднае мясцовасці людзі, якія пачалі глуміць хлеб, не берагчы яго. Забыліся, што самае надзённае ў хлебе: сабраць яго ўраджай, сабраць насенне, каб налета пасеяць зноў. Каб на новы год быў ураджай. Яны занядбалі ўсё. Пачалі раскідацца хлебам. Дзе ні ступіш, валяюцца аб'едкі, кавалкі, скарынкі... Па дарогах рассыпана зерне. У засеках псуецца насенне.

Гэта здарылася таксама даўно-даўно.

Ішоў па дарозе Вецер. Ён ішоў ціха, павольна. Ідзе і чуе, што калоссе жыта шэпчацца між сабой. Прыслухаўся, аб чым гамоніць яно, нізка кланяючыся. І пачуў Вецер скаргу жыта на занядбаную сваю долю. Што яго топчуць людзі. Здзекуюцца з яго. І малыя, і старыя.

Зайшоў Вецер у вёску, дзе жылі гэтыя людзі. Бачыць — праўда! На вуліцы, на дварах, пад вокнамі валяюцца кавалкі хлеба. Нават боханы. Ніхто не беражэ ані крошкі.

Раззлаваўся Вецер ды як закруціцца віхурай. Толькі чорны слуп густога пылу ўзняўся над вуліцай. Круціць Вецер, змятае ўсе скарынкі, недаедкі і віхурай узнімае ўгору. Слуп расце, расце аж

да неба. Усё сабраў віхурай Вецер: і зерне рассыпанае, і сухары цвілыя... Узняў аж да Сонца і кажа:

— Паглядзі, Сонца, што ж гэта робіцца?! Мы клапоцімся аб людзях, памагаем, колькі сіл ёсць, моцы. Ты на мяне сварышся, калі хмары быстра ганю, павольна крылы ў млынах кручу і хлеб мялю... А што яны робяць з гэтага хлеба? Бачыш, як глумяць?! Хлеб скардзіцца, што яны здзекуюцца з яго.

Нахмурылася Сонца, закрыўшыся хмараю. Можа яно быць гнеўным!.. Праз нейкі час толькі мутная, шэрая дымка распаўзлася па небе. Сонца пажаўцела. Навокал яго ўтварыўся круг. Гледзячы праз гэты круг на зямлю, Сонца сказала Ветру:

— Пашлі на іх сухавея. А я спёкі паддам...

І пачалася ў той мясцовасці неміласэрная гарачыня. Усё на полі, на агародах пасмягла. З рэк уся вада збегла ў мора. Азёры і крыніцы павысыхалі. Дрэвы без пары пажоўклі. Жыта — пабялела. Спёкай высушанае, яно дзівілася: чаму з такімі лёгкімі каласкамі расце? Дзе дождж, каму хацелася б з удзякай важка пакланіцца? Бясхмарна. Сухавей гойсае па полі. Звоніць пустымі каласамі...

Людзі пачалі хвалявацца, наракаць:

— Што ж гэта настала? Калі ж пойдзе дождж!..

Усе запасы харчу яны паелі. У полі ўсё пагарэла. Не то што ўраджай, насенне людзі вярнуць не змаглі... І пачалі яны шукаць выкінутыя на вуліцу кавалкі хлеба. Рады былі зацвіламу сухару і чорнай скарыначцы. Людзі каяліся, што так неабдумана жылі. З болем успаміналі тую пару, калі не ашчаджалі хлеб, глумілі яго... Дзеці хварэлі, паміралі з голаду. Маткі плакалі горкімі слязьмі.

Аднойчы ўранку, калі Вецер-сухавей яшчэ драмаў за кустамі, слёзы людскія разам з расою ўзняліся да Сонца. І яно адчула гаркату гэтых слёз...

Тут Сонца паклікала да сябе Ваду і Вецер і пытаецца ў іх:

— Ну, што там чуваць? Як цяпер жывуць людзі з тае мясцовасці?

— Дрэнна,— адказаў Вецер.— Голад па ўсёй акрузе.

— Просяць дажджу,— сказала Вада,— але я не магу паслаць без твайго дазволу.

— Ну, а што яны сабе думаюць? — пытаецца Сонца.— Што між сабою гавораць?

— Гавораць, ніколі глуміць хлеб не будуць,— адказалі Вада і Вецер.— Толькі б ураджаю новага дачакацца.

Не ўвесь час гнеўным Сонца бывае. Адхінула яно шэрую пеляну пылу ад сухой, як попел, зямлі. Бачыць, стаіць на ўзгорку адзін дзядзька, трымае ў прыгаршчах зерне і просіць:

— Хмарка, дождждыку!.. Сыпні хоць кропельку!

І Сонца злітавалася.

— Ну, сыпні,— кажа Вадзе,— столькі кропель, колькі трэба на пасеў.

— А ты,— кажа Ветру,— пранясі хмары над палеткамі асцярожна... Градам не пабі, ліўнем не залі!..

Падумала Сонца і дадае:

— Пабачым, як яны зноў возьмуцца за працу...

Праз нейкі момант пайшоў роўны, спорны дождж. Такі, якога прасілі людзі...

Цяжка яны пакутавалі пасля голаду. Зноў харчаваліся травой — шчаўем, маладой крапіўкай. Грыбамі, ягадамі. Месцамі нават грыбоў і ягад не было. Грыбніцы павысыхалі. Ягаднік пагарэў.

І калі зноў людзі з тае мясцовасці дачакаліся і сабралі новы ўраджай, змалолі з яго муку і напяклі хлеба, то пакляліся вечна цалаваць яго... Сеяць і расціць, даглядаць і сабіраць, шанаваць і берагчы, як само жыццё. Так яно і цяпер. Жыта — ад слова «жыць»...

— Цяпер ты зразумеў, чаму людзі шануюць кожны кавалачак хлеба? — запытаўся ў мяне дзед.

Я сядзеў моўчкі і адчуваў сябе вінаватым, што не пацалаваў акрайчык хлеба. Людзі рабілі гэта, навучаныя голадам. Я ж не бачыў гора. І не хацеў бачыць. Я сядзеў, трымаючы ў руках свой акрайчык, і адчуваў яго, як жывога. Ён быў самым дарагім з усяго, што прыдбаў чалавек для свайго жыцця.

## ЖАВАРАНАК

Успамінаючы маленства, мне хочацца расказаць пра адзін выпадак, які здарыўся са мною на пашы. Мне заўсёды, як пачую жаваранка ў небе, здаецца, нібыта я зноў у дзяцінстве, стаю на ўзгорку ў доўгай дзядзькавай світе і слухаю спеў птушак, а перада мною шырокае, шырокае поле...

Калі здарыўся гэты выпадак, я якраз пасвіў авечкі. Пасвіць авечкі лягчэй, чым каровы. За імі не трэба надта бегаць, яны ходзяць гуртам, паслухмяныя, у шкоду не лезуць. Праз гэта, між іншым, такому пастуху не належала даваць падпаска; кожны гаспадар, у якога я бываў на чарзе, карміў і даваў мне верхнюю вопратку. Авечага пастуха і наймалі танней, хоць адказнасці тут — каб воўк не ўкраў ягняці,— бадай, больш, чым у якім статку. Я выганяў авечак на цэлы дзень. Кароў прыганялі ў сяло апоўдні падаіць, і пастух мог тым часам адпачыць. А я ўвесь дзень, у любое надвор'е, ад усходу да захаду сонца, хадзіў за авечкамі ў полі. Цэлы дзень, акрамя чарады, нікога не бачыш.

Адзінока і сумна.

Пасвіў я на папары. Гэта вялікі клін зямлі, пакінуты дзірваном да самай восені. На гэтым полі расла папарніца, трава, якую вельмі любілі авечкі. Калі яны, бывала, спрытна скублі, я ўзыходзіў на ўзгорак, глядзеў навокал і слухаў, як спявалі жаваранкі.

Нідзе так звонка не чуваць спеў жаваранка, як у чыстым полі. З высокага неба падае, льецца птушыны спеў, нібы мноства срэбных званочкаў узняло сонца аж пад воблакі. Стаіш і чуеш, як пранікае птушыная песня ў сэрца, напаўняе яго радасцю. З птушкамі не было маркотна ў полі. Я гэта адчуваў і старанна бярог крылатых сяброў. Колькі я знаходзіў іхніх гнёздаў на межах, у барознах, пад скібай ад плуга! Я ніколі не кратаў птушыную сям'ю. Я ведаў, калі

маленькія птушаняты выводзяцца, калі ў іх адрастаюць крылы. І мне здавалася, што жаваранкі, перапёлкі, курапаткі таксама ўжо ведалі мяне, прывыклі да мяне. Пырхнуўшы з гнязда, шэрае птушанё далёка не адлятала, а садзілася на галінку чарнобылю і глядзела ў мой бок па-свойску, смела.

Жаваранкі для пастуха — свой хор. Я любіў, як яны спяваюць да ўсходу. Я чуў, нават бачыў, як перад захадам сонца яны, нібы дамовіўшыся, узлятаюць высока-высока, адзін перад адным спяваюць пяшчотныя песні і, як толькі агніста-чырвоны шар патане, змаўкаюць, хаваюцца на спачынак. Дабранач! Гэтую пару — дадому — я і мае авечкі добра ведалі. Наўкол наступала вячэрняя цішыня.

Аднойчы ў поўдзень я стаяў на ўзгорку і глядзеў у неба, шукаючы ў блакітнай вышыні таго, хто заліваўся песняй. Сонца было ў зеніце. У такую пару дня большая палова птушак вісіць між небам і полем,— спявае самы магутны хор.

Авечкі хадзілі ў лагчыне. Я іх бачыў перад сабою, а сам стаяў, як паўнаўладны гаспадар іх лёсу, у шырокай світцы з саматканага сукна, жакетцы аднаго дзядзькі, у якога я быў на чарзе. Яна мне была да пят, і насіць яе можна было толькі расшпіленай, каб не паваліцца на хаду.

Я стаяў, а ветрык дзьмуў мне пад жакетку, і прыемны халадок асвяжаў цела. Рукавы ў жакетцы былі закасаны, у правай руцэ я трымаў пугу.

Я глядзеў угору, але ў залатым паднябессі заўважыў не жаваранка, а каршуна. Гэтага драпежніка я таксама ведаў і бачыў не раз. Ляціць ён, бывала, над палеткамі, махае гэтак паважна крыламі, а потым спыніцца на адным месцы і пачынае выглядаць на зямлі птушак або мышэй. Нагледзіць і кідаецца на ахвяру, са свістам рассякаючы паветра.

Каршун лунаў высока-высока і нібы глядзеў адтуль на мяне. Я зацікавіўся: каго ж ён высочвае, куды кінецца? Я спачатку і не прыкмеціў, як ад самай зямлі з песняй пачаў узнімацца мой сябрук-жаўрук. Срэбны званочак падымаў сваю песню ўсё вышэй і вышэй.

А каршун застыў на месцы. Ён быў з боку ад зыркага сляпучага сонца. Заўважыўшы, што драпежнік не кратаецца, я насцярожыўся. Няўжо ён цэліцца на жаваранка? Няўжо гэты званочак, захоплены ўласнай песняй, не бачыць, што ён сам набліжаецца ў кіпцюры да смерці! Я глядзеў затаіўшы дыханне.

І хоць адлегласць была яшчэ вялікая, драпежнік не вытрымаў, кінуўся ўніз. Уніз! Я тут жа страціў жаваранка з вачэй. Каршун, адзін каршун быў для мяне ў небе. Ён, як маланка, рассек паветра. Потым імклівы палёт пераламаўся. Драпежнік кінуўся ўбок, яшчэ ўбок. Вось ён амаль прыпаў да зямлі. І раптам над зямлёю палёт яго выраўняўся. Я аслупянеў. Каршун ляцеў на мяне.

І толькі калі драпежнік быў ужо зусім непадалёк, я ўбачыў, як спераду ў яго ляціць, кідаецца ў бакі шэры камочак. Я аж уздрыгнуў, калі ён, як куля, шмыгнуў мне пад крысо. Так хутка, смела і даверліва знайшла сабе птушка схованку! Я спачатку нават не мог зразумець, як

гэта здарылася, і міжволі замахнуўся на драпежніка пугай. Гнеўны крык вырваўся ў мяне з грудзей. У ім быў і гонар за давер'е жаваранка, і праклён драпежніку. Я і цяпер яшчэ бачу лютыя каршуновыя вочы, разяўленую дзюбу і растапыраныя кіпцюры. Ах, як ён неахвотна ўздымаўся ўгору!

Я не магу знайсці словы, каб перадаць пачуццё, якое тады ахапіла мяне. Дзесьці тут, пад крысом жакеткі, сядзеў трапяткі жаваранак. Ён перадаў мне разгон свайго палёту. Нейкі час я адчуваў сябе акрыленым, і на сэрцы было так лёгка, што мне здавалася, вось-вось я палячу.

Я апамятаваўся. Дзе ж ён там засеў у маёй свіце? Дзе жаваранак, якога я выратаваў ад смерці?

І толькі я зварухнуўся, як шэрая птушка пырхнула ў мяне з-пад крыса і паляцела пры самай зямлі. А неўзабаве зноў узвілася ў неба. Я стаяў радасны, узнагароджаны птушыным давер'ем. Дарагі жаваранячак, будзь упэўнены, я заўсёды цябе абараню!

## ІВАН МУРАВЕЙКА

Іван Андрэевіч Муравейка нарадзіўся 21 кастрычніка 1921 г. у вёсцы Таль Любанскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння Тальскай дзесяцігодкі ў 1939 г. паступіў у Мінскі Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. працуе ў любанскай раённай газеце «Будаўнік камунізму». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1964).

І. Муравейка ў асноўным піша для дзяцей. Яго першы верш «Зіма» быў надрукаваны ў 1936 г. у газеце «Піянер Беларусі». Маленькаму чытачу ён прысвяціў свае кнігі «Ручаінкі« (1956), «Вось якія мы» (1958), «Пра работу і ляноту» (1960), «Дружная сямейка» (1961), «Сняжынкі-смяшынкі» (1962), «Сем колераў вясёлкі» (1965), «Лясное возера» (1970), «Мы таксама падрасцём» (1971), «Дуб і дубок» (1977), «Няхай сонца не заходзіць» (1981), «Я прыдумаў казку» (1985). У гэтыя зборнікі ўвайшлі творы розных жанраў: сатырычныя і гумарыстычныя вершы, лічылкі і скорагаворкі, паэмы і казкі, вершы аб прыродзе. У першым зборніку вершаў для дарослага чытача «Песня над палямі» (1955) змешчана таксама некалькі вершаў для дзяцей.

### ЗАЛАТАЯ ЗОРКА

Сонца спаць пайшло за горку,
І заззялі ў небе зоркі.
Ноч лічы —
Не злічыш іх,
Прамяніста-залатых.
Іх мільён,
А можа — пяць!
Як жа хоць адну дастаць?
Рупіць знаць даўно Рыгорку.
На грудзях насіў бы зорку.

Ён у таты запытаў:
— Зорку з неба ты дастаў?
Паспрабуй дастаць і мне.
Усміхнуўся тата:
— Не!
Я, сынок, механізатар,
Я вадзіць умею трактар,
І камбайн, і грузавік,
Я — калгасны працаўнік,
На палетках спраў багата.
— Дзе ж узяў ты зорку, тата?

— Да яе, сынок, ішоў
Я не дзень, а шмат гадоў.
Поле збожжам засяваю,
Каб шумела
Ураджаем.
Бачыў, зернеткі якія?

— Залатыя, залатыя!
— А калі шуміць калоссе
І прыслаць камбайны просіць —
Ніва, ведаеш, якая?
— Залатая, залатая!
— А калі жніво настане
І твой тата на камбайне —
Збажына цячэ ракою...
— Залатою, залатою!

Здагадаўся сам Рыгорка:
— З залатых зярнятак
Зорка!

## НАЧНОЕ СОНЕЙКА

У наш двор манцёр
прыйшоў
І сказаў такое:
— У ваш дом мы
правядзём
Сонейка начное.
Зараз, дзеці, працягну
Провад проста праз
сцяну...
А як толькі спаць пайшло
Сонца залатое,
Засвяціла над сталом
Сонейка начное.
Ой, як весела усім!
Спаць не хочацца зусім.

## ЯК СЕЯЛІ АБАРАНКІ

Мы за вёскаю гулялі.
Там два трактары аралі.
— Будзем сеяць абаранкі,—
Трактарысты нам сказалі.

А Іванка засмяяўся:
— Цётка Ганка, дзядзька Вася!
Я сам бачыў — мама ўранку
Пякла ў печы абаранкі.

Дзядзька ж Вася, цётка Ганка
Запыталіся ў Іванкі:
— А з чаго, скажы, Іванка,
Пякла мама абаранкі?

А Іванка, хлопчык смелы,
Адказаў на гэта ўмела:
— З цеста круцяць абаранкі...
Тры мяхі мукі ў нас белай.

Трактарысты зноў спыталі:
— А мукі дзе вы дасталі?
Можа, ты ў сваім млыночку
Намалоў яе з пясочку?

— Не з пясочку, а з зярнятак
Намалоў мукі мой тата!
— Маладзец! — сказалі Йванку
Дзядзька Вася, цётка Ганка.—
Але ж дзераслі зярняты,
Не пытаўся ты у таты?

— На палях, дзе спее колас! —
Мы гукнулі ў адзін голас.—
Дзядзька Вася, цётка Ганка,
Хутчэй сейце абаранкі!

## ДВА АСІЛКІ

З веку ў век два асілкі жывуць.
Капаюць каналы і поле аруць.
Будуюць у тундры, тайзе гарады
І садзяць у жоўтай пустыні сады.
Багацці для нас дастаюць з-пад зямлі
І запускаюць да зор караблі.
З веку ў век два асілкі жывуць.
Вось яны, глянь! Іх рукамі завуць.

## АДМАРОЗІЎ ЛАПКІ

Коцік басаногі
Па сняжку гуляў.
Адмарозіў лапы
І заплакаў: — Мяў...

Што за дзіва гэта?
Трэба бегчы ў дом:
Снег такі халодны,
А пячэ агнём...

## ЛЯСНЫЯ ДАКТАРЫ

У густым бары адна
Занядужала сасна...

— Нехта есць маю кару,
Я засохну, я памру.
Не пражыць мне сто гадоў,
Трэба клікаць дактароў!..

І назаўтра на зары
Прыляцелі дактары:

— Вы нас выклікалі ў час —
Караеды точаць вас.

Паляцеў па лесе стук:
Тук-тук-тук! Тук-тук-тук!..

Весялей шуміць сасна —
Зноў здаровая яна:

— Буду жыць я сто гадоў,
Не забуду век дзятлоў,
Знакамітых дактароў!

## ЛІЧЫЛАЧКА

Раз!
І я зусім не сплю,
Фіззарадку я раблю.

Два!
Умывацца я іду
І спяваю на хаду.

Тры!
Чатыры!
За сталом
Ем аладкі з малаком.

Пяць!
Бягу хутчэй у сад —
Там клубнікі спелай шмат.

Шэсць!
Клубніку я дзялю —
Сашу, Раі, Васілю...

Сем!
Мы полем буракі,
Памідоры і гуркі.

Восем!
Пот закапаў з нас.
Адпачыць, напэўна, час.

Дзевяць!
Мы ўжо ля ракі.
Нас вітаюць лазнякі.

Дзесяць!
З берага — нырцом,
Пад вадою ўсе плывём.

А каб добра ўмець лічыць —
Трэба тройчы паўтарыць.

## ПРА МЫШКУ І КНІЖКУ

Мама Мыш
Купіла кніжку
Для сваёй дачушкі
Мышкі:

— Час табе
Ужо за парту.
На, грызі
Навуку ўпарта.

Мама Мыш
Прыйшла з работы:
— Без мяне рабіла
Што ты?

Адказала маме
Мышка:
— Натамілася
Я з кніжкай.
Гэтулькі было
Мне мукі,
Але згрызла ўсю
Навуку.

## ПАЎЛЮК ПРАНУЗА

Паўлюк (Павел Кузьміч) Прануза нарадзіўся 18 сакавіка 1918 г. у вёсцы Вылева Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. У 1941 г. скончыў філалагічны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута (цяпер Гомельскі дзяржаўны універсітэт). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Нясвіжскім педагагічным вучылішчы імя Якуба Коласа, потым працаваў настаўнікам у Нясвіжы.

Першыя вершы П. Пранузы з'явіліся ў друку ў 1936 г., а першы зборнік паэзіі «Разгневаная зямля» ў 1946 г. Затым выйшлі паэтычныя кнігі «Добрай раніцы» (1951), «У дальнім раёне» (1954), «Мае землякі» (1957), «Калі верыш» (1963), «Непаўторнасць» (1974), «Трываласць» (1978), «Сустрэчы» (1983).

П. Прануза плённа працуе на ніве дзіцячай паэзіі. Маленькаму чытачу адрасаваны зборнікі вершаў «Добры дожджык» (1960), «Я вясну малюю» (1962), «Дзе вясны пачатак» (1965), «Ручаёк» (1969), «Вясновыя тэлеграмы» (1976), «Фарбы восені» (1982), «Звініць ручаёк» (1988).

### ДОБРЫ ДЗЕНЬ

Толькі сонца кіне
Першы свой прамень,
Устаеш ты з ложка:
— Мама, добры дзень!

На тваёй галоўцы
Цёплая рука...
Па дарозе ў школу
Стрэў ты дружбака.

І яму гаворыш
З ласкай: «Добры дзень!»
Ён табе ўсміхнуўся
І з табой ідзе.
Ён твайму вітанню
І сустрэчы рад.
Хмарна, а святлеюць
Неба, кветкі, сад.

### МАМІНЫ РУКІ

Маміны рукі самыя лепшыя:
Няньчылі, гушкалі, лашчылі першыя.

Маміны рукі сардэчныя, смелыя.
Маміны рукі самыя ўмелыя.

Маміны рукі — рукі шчаслівыя.
Маміны рукі заўсёды цярплівыя.

Маміны рукі самыя светлыя.
Маміны рукі самыя ветлыя.

## СОНЕЙКА

Запытаў у маці
Раніцай Валодзя:
— А чаму так рана
Сонейка ўзыходзіць?

Адказала маці:
— Шмат у сонца справаў:
Выпеставаць колас,
Падбадзёрыць травы,
Выспеліць маліну,
Яблыкі, суніцы,
Падагрэць у рэчцы
Чыстую вадзіцу,
Цеплынёй на пляжы
Атуліць пясочак,
Каб ты мог з сябрамі
Загараць, сыночак.

## МЫЛА

Узяла Галінка мыла
І два вочкі ў ім зрабіла.

— А нашто? — спытала мама.
— А каб бачыла, дзе пляма.

## МЯККІ ЗНАК

Тата азбуку купіў —
Літары з пластмасы.
Словы розныя складаць
Натка узялася.

Першакласніца сястра
Хутка навучыла,
І складаюць на стале:
МАМА, РАМА, МЫЛА...

Натка, гляньце, і сама
ДЗЕН, АЛЕН складае.
Толькі хмурыцца яна —
Мяккі знак шукае.

Літару бярэ адну,
Потым і другую.
А ці мяккая яна?
На зубок спрабуе.

**Ж** падобна на жука.
**Ф** надзьмула шчочкі,
Быццам хто ў адно злучыў
Роўныя кружочкі.

**Т** — нібыта малаток.
**А** — нібыта хатка.
**С**— як тоненькі сярпок...
Мяккі знак шукáе Натка.

Дзе ён дзеўся?
Зноў бярэ
Літару, другую
І ці мяккая яна —
На зубок спрабуе.

## ЧАМУ ЗЗЯЕ ВЯСЁЛКА

У сяброўкі Лены
Верачка пытае:
— А чаму вясёлка
Гэтак ярка зззяе?

Збажыной лагодна
Зашумела поле:
— Аддаю вясёлцы
Свой зялёны колер.

Гаманілі ціха
На рачулцы хвалі:
— Свой блакіт вясёлцы
Мы падаравалі.

І сказаць нарэшце
Сонца захацела:
— Без мяне б вясёлка
Так не зіхацела.

# МІКОЛА ГАМОЛКА

Мікола (Мікалай Іванавіч) Гамолка нарадзіўся 11 сакавіка 1922 г. у вёсцы Брынёў Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1939 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З другога курса быў прызваны ў Чырвоную Армію, дэмабілізаваўся ў 1946 г. Працягваў вучобу на завочным аддзяленні універсітэта і працаваў рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, а затым супрацоўнічаў у газетах «Літаратура і мастацтва» і «Чырвоная змена». З 1951 па 1962 г. працаваў адказным сакратаром часопіса «Бярозка», з 1972 г. быў літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў Беларусі, а потым дырэктарам бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР (1980—1982).

Першыя вершы М. Гамолкі надрукавала ў 1937 г. бабруйская акруговая газета «Камуніст». Затым выйшлі два зборнікі яго вершаў «Зварот шчасця» (1946) і «Б'юць куранты» (1950).

Для юнага чытача М. Гамолка напісаў аповесці «Лета ў Калінаўцы» (1950), «Добры дзень, школа!» (1952), «Лясная крэпасць» (1980), «Сокалы-сакаляняты» (1986). У 1959 г. выйшаў навукова-фантастычны раман пісьменніка «Шосты акіян». У 1960 г. быў выдадзены зборнік апавяданняў «Шлях адкрыты».

М. Гамолка — аўтар п'есы «Бітва ў космасе», якую паставіў Тэатр юнага гледача (1963).

## ШЛЯХ АДКРЫТЫ

Ці ж мог праспаць Алёша гэтую раніцу? Ніколі! Учора бацька расказаў, што на світанні праз іх станцыю пройдзе бронецягнік. Зусім недалёка, дзесьці за лесам, стаіць фронт. Там і ўдзень і ўначы чуваць грымоты выбухаў. Снарады немцаў ірвуцца нават і тут, на станцыі. Алёша жыве з бацькамі не ў хаце, а ў склепе з маленькімі акенцамі. Хоць там і цемнавата, затое спакойна.

Многа дзіўнага бачыць і чуе хлопчык на сваёй лясной станцыі. Па чыгунцы бесперапынна ідуць цягнікі. Раней салдат везлі на фронт, а сёння адтуль у Мінск павінен прайсці бронецягнік. Бацька гаварыў, у Мінску — рэвалюцыя, Саветы. Але буржуі зноў хочуць захапіць уладу. На дапамогу рэвалюцыі бальшавікі з фронту і паслалі бронецягнік.

Калі хлопчык прачнуўся, бацькі ў склепе ўжо не было. Убаку, ля сцяны, спала маці з маленькай сястрычкай. Алёша асцярожна адчыніў дзверы, выйшаў на двор і пабег да станцыі.

На запасным пуці, пыхкаючы парай, стаяў цягнік. Пачыналася раніца, барвовая, халодная. Вецер гнаў на дарозе жоўтае вільготнае лісце.

Нечакана з-за крутога павароту чыгункі вынырнула дрызіна. Ля станцыі яна спынілася, адтуль выйшаў чалавек у скуранай куртцы і цёмных акулярах. Следам за ім выскачылі афіцэры.

Чалавек у скуранай куртцы махнуў пальчаткай і сказаў:

— Захапіце станцыю! Чыгуначнікаў арыштаваць!

— Ёсць! — казырнуў высокі афіцэр і першым пабег да жоўтага будынка вакзала.

Пачуўшы гэтыя словы, Алёша здрыгануўся. «Арыштаваць чыгуначнікаў! За што? Значыць, і тату...» Хлопчык абмінуў доўгі склад, выбег на пуці. Бацька клапатліва завіхаўся ля стрэлак.

— Та-атка! — закрычаў хлопчык.— Уцякай...

Бацька пачуў крык і азірнуўся. Афіцэры былі побач. Уцякаць

позна. Бацьку затрымалі і павялі на станцыю. Следам пайшоў і Алёша.

— Не плач, сынок, не плач,— суцяшаў бацька.— Я вярнуся...

У будынку станцыі было пуста. Алёша падышоў да выбітага акна. Бацьку падвялі да бруднай лаўкі, на якой сядзелі чыгуначнікі. Яны гнеўна размахвалі перад рыжым афіцэрам рукамі, аб нечым спрачаліся.

— Вы не маеце права нас арыштоўваць,— пачуў Алёша абураны голас дзядзькі Міхася, начальніка станцыі.— Мы нясём адказнасць за чыгунку.

— Вы — бальшавікі,— сказаў рыжы афіцэр.— Загадваю маўчаць!

— Вылезе ўсё вам бокам,— паволі, са злосцю адказаў дзядзька Міхась.— На станцыю ідзе бронецягнік...

Раптам Алёша пачуў у бакавым пакойчыку працяжны званок. Праз момант да слыху даляцеў сухі, надтрэснуты голас. Хтосьці размаўляў па тэлефоне.

— Так, так... Пускайце таварны на левы пуць. Станцыя Зазер'е ў нашых руках. Бальшавіцкі бронецягнік будзе затрыманы!

Размову па тэлефоне пачулі і чыгуначнікі. Дзядзька Міхась адразу падхапіўся з месца і кінуўся да дыспетчарскага пакоя. Рыжы афіцэр схапіў яго за руку, загарадзіў дарогу.

— Пусціце! Што вы робіце, панове? Гэта ж злачынства... Бронецягнік пойдзе пад адхон.

З дыспетчарскай выйшаў чалавек у скураной куртцы і ў цёмных акулярах.

— А табе што да таго? Пойдзе, бо там бальшавікі... Хе-хе-хе,— задаволена засмяяўся ён.

Алёша ўбачыў, як бацька апусціўся на лаўку. Потым падняў галаву, агледзеўся. Позіркі іх сустрэліся. Хлопчык прачытаў на твары бацькі боль, смутак і спалох. І вось вочы яго раптам бліснулі, загарэліся. Ён перахінуўся праз лаўку і сказаў:

— А ты, Алёша, чаго тут не бачыў? Ідзі і зараз жа перавяжы казу. Чуеш?

Цяпер і афіцэр заўважыў хлопчыка. Ён павярнуўся да акна, замахаў чорным рэвальверам.

— Ану, прэч адсюль! Прэч!..

Алёша адбег ад акна і паволі пайшоў да перона. Далёка над лесам закурыўся белы дымок. «Ідзе бронецягнік,— падумаў Алёша і радасна ўсміхнуўся.— Бацьку вызваляць... А навошта ён сказаў пра казу? Яе ж няма. Тыдзень назад прадалі...» Ззаду Алёша пачуў грукат. Павярнуўся і застыў на месцы: да станцыі падыходзіў таварны састаў.

«Перавязаць казу... Перавязаць казу...» — напомніў далёкі стук колаў хлопчыку. Алёша ледзь не прысеў ад страху. Як не зразумець гэтых слоў? Ён не раз чуў, як бацька, ідучы пераводзіць стрэлкі, жартаўліва казаў: «Пайду перавяжу казу». Значыць, бацька даў яму даручэнне. І не дзіўна, два цягнікі ідуць адзін аднаму насустрач. Яны сутыкнуцца і адбудзецца крушэнне... Бронецягнік не пройдзе да Мінска.

Хлопчык, як віхор, паляцеў па насыпу туды, дзе сыходзіліся сталёвыя ніткі рэек. З-за ляснога павароту наганяў яго пагрозлівы грукат пушчанага без машыніста таварнага саставу. А з другога боку таксама набліжаўся цягнік. Ён гукнуў на ўвесь лясны прасцяг, абвяшчаючы аб сваім падыходзе да станцыі.

Алёша яшчэ раз азірнуўся, але спатыкнуўся аб шпалу і ўпаў. А рэйкі ўжо дрыжалі, перадаючы магутны поступ цяжкіх колаў... Хлопчык падхапіўся і пабег шпарчэй. Вось і стрэлкі. Цяжкі чыгуначны рычаг... На стойцы — ліхтар... Алёша адкінуў клямку замка, налёг грудзьмі на рычаг.

Таварны састаў зусім блізка. Ужо добра відаць, як мітусяцца ля паравозных колаў шатуны.

Яшчэ крыху... Яшчэ... Рэйкі зарыпелі, пасунуліся і шчоўкнулі з вясёлым металічным звонам.

Хлопчык выцер рукавом твар. Ну, вось і мінулася бяда! Побач ужо мільгалі чырвоныя вагоны таварняка.

А з лесу поўным ходам ішоў бронецягнік. Ён каціўся па рэйках, нязграбны, цяжкі, з агністым сцягам, які высока развяваўся над пярэдняй браніраванай вежай.

Алёша радасна замахаў шапкай. Каля яго з грукатам, набіраючы хуткасць, прамчаўся бронецягнік.

## ВАСІЛЁВА БЯРОЗКА

Васільку пайшоў сёмы год. Ён рэдка бывае без якога-небудзь занятку. Усё нешта майструе, выдумляе. То плешча малатком іржавую жалязяку, то выстругвае палачку, то лепіць што-небудзь з гліны...

Бярэцца за ўсё ён горача, заўзята. Ды вось бяда — ніколі не даводзіць справы да канца. Раптам у яго прападзе ахвота, махне на ўсё рукою і шукае новага занятку.

Васількоў тата даўно заўважаў гэта і пачаў трывожыцца за сына: «Калі не пераменіцца хлапчук, цяжка будзе вучыцца ў школе. Там жа трэба старацца».

Куды сёння Васілёк пабег з двара — невядома. Трэба абедаць, а яго няма. Чым і дзе займаецца ён?

Тата выйшаў на вуліцу. Адсюль добра відаць дарога з дубамі па баках, шырокая лугавіна, пажоўклы бярозавы лясок.

Прыгледзеўся, бачыць, хлопчык хуценька збягае па крутой сцяжынцы ў яр. На яго плячах гойдаецца маленькая бярозка. Што задумаў Васілёк? Пасадзіць дрэўца? Вось маладзец які!

Васілёк хутка перабег лугавіну і выйшаў на вуліцу. Тата прыветліва ўсміхнуўся:

— Бярозку прынёс?

Васілёк узмахнуў запыленым чубам і зняў з плячэй дрэўца.

— Пасадзіць хачу.

— Добра, давай пасадзім. А дзе?

— Вось тут, пад акном,— паказаў хлопчык.

— Можна і тут,— адказаў тата.— Толькі зробім гэта пасля абеду. Збегаеш, набярэш яшчэ каля возера чорнай зямлі. Ведаеш дзе?

— Ведаю. Мы з мамай хадзілі туды капаць на расаднік.

Яны зайшлі ў двор. Васілёк беражліва паклаў бярозку за хатай у цяньку.

Пасля абеду ён адшукаў у сенцах кошык і пабег па чарназём. І толькі выйшаў на прыгуменне — бачыць, гуляюць хлопцы на выгане ў мяч. Ці ж можна ўтрымацца ад такой спакусы! Васілёк ударыў нагою мяч адзін раз, другі,— і хутка забыўся пра ўсё на свеце.

Толькі пад самы вечар прыбег ён дадому без кошыка.

— А дзе ж твая зямля для пасадкі? — запытаўся тата.— Забыўся?

— Забыўся.

— Бяжы хутчэй, а то карэнні ў бярозкі пасохнуць.

Васілёк падняў бярозку, потым ціха і абыякава сказаў:

— Я не буду гэтую садзіць. Заўтра другую прынясу.

— Што? — здзівіўся бацька,— не будзеш? Як жа так? Расла бярозка, расла, а ты — выкінеш? Яна жыць хоча...

Васілёк спахмурнеў. Тата заўважыў, што ў яго цяпер не было ніякай цікавасці да дрэўца.

— А можа заўтра? — стаяў на сваім хлопчык. Яму не хацелася вяртацца да возера. Там нікога цяпер не было.

— Ніякіх заўтра. Бярозка загіне. Трэба хутчэй яе пасадзіць у зямлю ды паліць вадою.

Хлопчык неахвотна пайшоў. Што зробіш — тата такі настойлівы...

Хутка Васілёк вярнуўся і прынёс поўны кошык чорнай зямлі. Пасля ўзяў рыдлёўку і выкапаў каля хаты ямку. Тата ўважліва назіраў за працай Васілька.

Калі бярозка была пасаджана, бацька задаволена сказаў:

— Ну, вось, цяпер ты малайчына! Помні, сынок, кожную справу трэба даводзіць да канца.

Мінула зіма. Вясной Васілёва бярозка моцна ўчапілася карэннямі за зямлю і весела зашумела зялёным лісцем.

## АНАТОЛЬ ВЯЛЮГІН

Анатоль Сцяпанавіч Вялюгін нарадзіўся 27 снежня 1923 г. у вёсцы Машканы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля заканчэння Машканскай сямігодкі вучыўся на рабфаку ў Віцебску. У 1939—1940 гг. займаўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага і адначасова супрацоўнічаў у рэдакцыях газет «Звязда» і «Чырвоная змена». Некаторы час быў вольным слухачом на сцэнарным факультэце інстытута кінематаграфіі ў Маскве. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў на Урал, некалькі месяцаў вучыўся ў Свярдлоўскім педінстытуце, а ў 1942 г. — у Лугінскай авіяшколе. Удзельнічаў у баях на Сталінградскім фронце, быў паранены. У 1945 г. вярнуўся ў Мінск, працаваў спачатку ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1945—1946), а потым у часопісе «Полымя» (1946—1969). У 1948 г. скончыў завочна Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага.

Упершыню ў друку А. Вялюгін выступіў у 1938 г. з вершам «Матчына песня», які быў змешчаны ў № 7-8 часопіса «Полымя рэвалюцыі». Першы зборнік вершаў «Салют у Мінску» выйшаў у 1947 г., праз два гады — зборнік «Негарэльская арка». Потым выходзяць кнігі паэзіі «На подступах» (1952), «На зоры займае» (1958), «Насцеж» (1960), «Адрас любві» (1964), «Вершы і балады» (1969), «Верасовы ўзятак» (1974).

Вялікую ўвагу паэт удзяляе творам для дзяцей і юнацтва, пра што сведчаць яго паэтычныя кнігі «Галубы» (1949), «Тры гудкі» (1951), «Рыбы нашых рэк» (1952), «Дзіцячы сад» (1954), «Вада і вуда» (1967).

А. Вялюгін — аўтар паэмы пра У. І. Леніна «Вецер з Волгі», якая адзначана Літаратурнай прэміяй імя Янкі Купалы (1964). У першай рэдакцыі паэма выйшла з друку ў 1963 г., новы яе варыянт з некаторымі дапаўненнямі і зменамі — у 1968 г.

А. Вялюгін плённа працуе ў дакументальным кіно. Па яго сцэнарыях пастаўлены фільмы «Балада пра маці» (1965), «Бацька Нёман» (1966), «Арліная крыніца» (1966), «Генерал Пушча» (1967), «Белая вежа» (1968, у сааўтарстве з С. Сплашновым), «Там, за ракой — Дзяржынава» (1968), «Агонь» (1969), «Таямніца Івянецкай пушчы» (1970), «Я — крэпасць, вяду бой» (1972), «А зязюлька кукавала» (1972), «Магілёў — дні і ночы мужнасці» (1974) і інш. У 1968 г. А. Вялюгін за кінасцэнарый «Генерал Пушча» ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР.

А. Вялюгін вядомы і як перакладчык на беларускую мову паэм «Каўказскі нявольнік», «Баярын Орша» М. Лермантава, асобных твораў У. Маякоўскага, М. Ціханава, Л. Украінкі, М. Рыльскага, А. Малышкі, Э. Межэлайціса, А. Міцкевіча, М. Канапніцкай, Ю. Тувіма і іншых паэтаў.

## ВЕЦЕР З ВОЛГІ

*(Урывак)*

### РАЗМОВА З ДАЧКОЙ

Упершыню сягоння
ты ўстала гэтак рана.
Калючая, тугая
вада страляе з крана.

У цішыні світання
здалося ўсё нязвычным:
хада твая...
і блузка
пад прасам электрычным...

Такі святочны клопат
на задуменным твары,
ажно падскочыў чайнік
і захлынуўся варам.

Пад капяжом, за форткай,
у дно пажарных бочак,
не моўкнучы, стукоча
срабрысты малаточак.

Цяпер на чорных дрэвах
кару пагладзь рукою —
адразу ўсе пупышкі
успалыхнуць ліствою.

Мы на паверсе шостым
пачулі, як заспаны
прамоклы парк закаркаў
у невадзе тумана.

Глядзі, глядзі, Ірынка,
якім святлом і звонам
усход наліўся — горад
у гальштуку чырвоным!

На піянерскім свяце
і ты, вясны надзея,
хвалюючыся, гальштук
упершыню надзенеш.

Дастала моўчкі маці
крылаты шоўк з шуфляды,
і вашыя на момант
сустрэліся пагляды.

— Насі,— яна сказала,—
чырвоны гальштук матчын.
Дарунак запаветны —
найлепшая са спадчын.

Калісь і я насіла
яго на шумных зборах...
Хавала, як па Мінску
хадзіў у касцы вораг...

Сябе адчула маці
такою маладою:
яе маленства поруч
сваю трымае долю.

І ямачкі на шчоках,
і кожная вяснушка —
усё агнём дарунка
асветлена.
Дачушка!

Без плямінкі твой гальштук,
як нашае сумленне.

Насі яго з павагай,
другое пакаленне.

Не проста на заняткі
у школу пойдзеш раннем —
вялікі шлях пачнецца
ўрачыстым абяцаннем.

Табе па трох ступенях
патрэбна дабірацца
на ясныя вышыні
навукі, дружбы, працы.

Не ў танны бляск танцулек,
не ў слодыч град клубнічных —
узнімуцца ступені
у глыб вышынь касмічных.

Няхай жа будзе чыстым
тваё, дачка, сумленне.
Расці, вучыся гэтак,
як рос, вучыўся Ленін.

Сягоння ўсёй дружынай
вы рушыце да плошчы,
куды зліюцца песні
пад барабанны пошчак.

На галубінай плошчы
граніт, халодны камень,
сагрэеце румянцам,
усмешкамі, вянкамі.

Ля помніка высокі
блакітны дзень вясновы
паўторыць, што змагацца
заўсёды вы гатовы.

І ў цішыні над плошчай
павее з Волгі вецер,
які сягоння крыгі
ва ўсім ламае свеце.
Вясновы
з Волгі
вецер...

## ПАЛАЦ ПІЯНЕРАЎ

Дзіцячыя горны,
Далёкія горны
Звіняць у азёрнай
Лясной старане.
У Мінску пачую —
Трывогай агорне
І нейкай самотаю
Сэрца кране.
Трывога —
Не вернецца к горнам дарога;
Самота —
Мае адзвінелі даўно.
І горад — двайнік маёй сталасці — строга
Вачыма салдата глядзіць у акно.
Узрушаны, выйду на вуліцы ўранку.
(Мой горад адрозніш ад іншых сталіц.)
Палац піянераў.
Дзяўчынка на ганку
З горнам каменным

Маўкліва стаіць.
Дзяцінства застыла
Маё,
Залатое!..
— Дзяўчынка,— крычу я,—
Хутчэй затрубі!
Мо' рэха адкажа з паляны лясное,
З глыбокіх гадоў
І далёкіх рабін,—
Дзяцінства прачнецца над хваляй азёрнай
І прыйдзе ў палац піянерскі на збор.
Ты чуеш, як горны,
Далёкія горны
Звіняць ля палатак
І славяць прастор?..

Дзяўчынка каменная ў майцы каменнай
Застылыя вусны адкрыла:
— Мой брат,
Я з горнам разбітым,
разбураны сцены,
Дзе колісь збіраўся вясёлы атрад.
Стагнаў тут расшчэпены бомбамі камень,
І градам звінела шкло светлых вітрын.
Над горам,
над п'янымі штурмавікамі
Я гнеўна трубіла.
Трубілі вятры.
Ляжалі пад цэглаю бітай мадэлі,
Якія рабілі калісьці з табой.
Сябры на машынах сапраўдных ляцелі,
Далёка адгэтуль ляцелі
У бой.
Палац бінтавалі сумётамі зімы.
Я доўга трубіла ў трывожны прастор...

...Гарніст, дарагі мой!
Прыйшлі мы,
Прыйшлі мы
З франтоў і прастораў радзімы
На збор.
Ты чуеш:
грымяць у пакоях сякеры,
І фарбаю пахне, і цёсам сырым.
Як цяжка пазнаць нас, сябры піянеры!
Палац уздымаем
Мы
Дзецям сваім.
Прабач мне, дзяцінства.

Цяпер я, дарослы.
На варце дзяцінства, бяссонны, стаю.
І прыйдуць у гальштуках вогненных вёсны
Глядзець, як на цуда, на працу маю.
Зноў смехам палац заіскрыцца
прасторны.

Дзяўчынка на ганку,
Затрубіш ты зноў!
І новыя горны,
Шчаслівыя горны
Праслáвяць жыццё працавітых
бацькоў.

## ПЕСНЯ ЗЯЛЁНАГА ДУБА

Падняў я сонца на галлі
пад посвіст салаўёў,
а нетры цёмныя зямлі
карэннем пераплёў.

Здаецца мне:
калі цяпер
пад бурай зашумлю,
не я трымаюся, павер,
за родную зямлю,

а на карэннях на маіх —
нябачаны цяжар! —
вісіць у кроплях дажджавых
зямлі зялёны шар.

Высокі, вечна малады,
у ззянні зор і рос,
свае гады,
як жалуды,
я на зямлю атрос.

Не помню, колькі мне гадоў.
Далёкі помню дзень:
у лесе сыты крык драздоў,
стагі ў лугах.
Сухмень...
Змарнеў ад болю і лістком
я варухнуць не мог.
Бывай, пад родным дубняком
зялёны мокры мох...

Мяне, маленькага, з лугоў,
дзе росы піў і рос,
хлапчук пад пахаю дамоў
з рыдлёўкай вострай нёс.
І на пясок упаў я з рук
пад шызым голлем сліў.
«Пасадзім тут»,—
сказаў хлапчук
на станцыі Разліў.

Ды выйшаў бацька хлапчука,
у мазалях рука,
мяне, гаротнага дубка,
падняў, нібы сынка.

Лісток завялы ён сарваў
і кінуў злосна ўбок:
«Такое дрэўца змарнаваў
дарэмна, галубок!

Не бачыў я, каб летні дуб
прыняўся ў сенакос,
няхай бы юны ветралюб
у родным лесе рос».

Хоць сок бруіўся па лістку,
падумаў я: канец...
Ужо не дуб я — на пяску
запылены дубец...

«Саджайце!.. Вырасце дубок!» —
пачулася здалёк,

не словы — кропелькі з аблок,
рашучы шпаркі крок.

Схіліўся добры чалавек
з газетай нада мной:
«У вашым садзе з веку ў век
шумець яму ліствой!»

І я, маленькі і прамы,
зірнуўшы навакол,
ступіў, ад радасці нямы,
у свой халодны дол.

Хоць плавілася над зямлёй
нябёс паўдзённых шкло,
а боль нясцерпны як рукой
з карэньчыкаў зняло.

Пасля ўначы шчаслівы кліч
не раз я чуў здалёк:
«А праўда вашая, Ільіч,—
расце, расце дубок!»

Я чуў, захутаны ў туман,
ці, можа, толькі сніў:
усё гавораць пра будан
на возеры Разліў.

У змроку добры чалавек
схіліўся нада мной:
«Дужэеш, любы? З веку ў век
шумі сабе ліствой,
краніся кронаю аблок
на досвітку, дубок!» —

І ён пайшоў, пайшоў у змрок,
рашучы, шпаркі крок...

Падняў я сонца на галлі
пад посвіст салаўёў,
а нетры цёмныя зямлі
карэннем пераплёў.

І жалудоў
і лісцяў медзь
на ўсю зямлю атрос.
Мне сотні лет і зім шумець
у бляску зор і рос.

Паломнікі з далёкіх рэк
пад кронаю стаяць.
— А дзе той добры чалавек? —
хачу я запытаць.

Па сцежках ленінскіх штогод
ад станцыі Разліў
ідзе, ідзе,
ідзе народ
з капальняў, хат і ніў.

Звіню, зялёны валадар,
дзяржаўнаю ліствой,
з нябёс крутых сумёты хмар
змятаю галавой.

Здаецца мне:
калі цяпер
пад бурай зашумлю,
не я трымаюся, павер,
за чэрствую зямлю,

а на карэннях на маіх —
нябачаны цяжар! —
вісіць у кроплях дажджавых
зямлі зялёны шар.

**СНЕГІРЫ**

Заснулі белыя палеткі.
Мароз загрукаў на двары.
Зірнеш з акна:
нібыта кветкі,
на сініх вербах снегіры.

Надзьмуты важна птушак воллі...
У шуме строгай сумятні
ані забудуцца ніколі
маленства снежаньскія дні.

Сіло стаяла ля дубровы.
Бяжы... узрушаны, бяры
трапёткі, вогненна-пуховы,
жывы кавалачак зары!

# АЛЯКСЕЙ ПЫСІН

Аляксей Васільевіч Пысін нарадзіўся 23 сакавіка 1920 г. у вёсцы Высокі Борак Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля сканчэння сярэдняй школы паступіў у 1938 г. у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску, але ў 1939 г. быў накіраваны на Беласточчыну літаратурным супрацоўнікам Бельскай раённай газеты. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на розных франтах, быў двойчы паранены. З 1946 г. працаваў у раённым друку, потым у абласной газеце «Магілёўская праўда». У 1958 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Саюзе пісьменнікаў СССР у Маскве. З 1974 г. працаваў сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў.

Першыя вершы А. Пысіна з'явіліся ў друку ў 1938 г. У 1951 г. выйшла першая кніга паэзіі «Наш дзень». Былі выдадзены зборнікі паэтычных твораў «Сіні ранак» (1959), «Сонечная паводка» (1962), «Мае мерыдыяны» (1965), «Твае далоні» (1967), «Пойма» (1968), «Да людзей ідучы» (1972), «Вярбовы мост» (1974), «Вершы» (1976), «Ёсць на свеце мой алень» (1978).

А. Пысін пісаў не толькі для дарослых, але і для дзяцей. Юнаму чытачу адрасаваны яго кнігі вершаў і паэм «Матылёчкі-матылі» (1962), «Вясёлка над плёсам» (1964), «Кавылёк» (1966), «Дзяўчынка Марыям» (1970), «Колькі сонцаў» (1979), «Аляксей, Дзяніс, Алёнка» (1984).

А. Пысін вядомы і як перакладчык. На беларускую мову ён пераклаў зборнік вершаў М. Ханінава «Жураўлі над стэпам» (1977), М. Джаліля «Маабіцкі сшытак» (1975, разам з С. Гаўрусёвым).

У 1968 г. за зборнік вершаў «Твае далоні» А. Пысіну прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы.

Памёр паэт 27 жніўня 1981 г.

## ВЯСЁЛКА НАД ПЛЁСАМ

Ад пасёлка да пасёлка
Ехаў гром.
Заірдзелася вясёлка
Над Дняпром.
Гэта — арка, гэта — арка
Да нябёс.
А пад аркай ходзіць хмарка.
Плешча плёс.

Яркіх колераў багата —
Сем якраз.
Што за свята, што за свята
Сёння ў нас?
Дожджык добры, працавіты
Сёння быў.
І пшаніцу ён і жыта
Напаіў.

## КОЛЬКІ СОНЦАЎ?

Я да цёткі ездзіла ў сяло
Там з-за лесу сонейка ўсплыло.

А была ў бабулькі ў гасцях,
Узнялося сонца там, дзе шлях.

Сонца ў нас — усходзіць з-за гары,

Колькі ж сонцаў? Мабыць, тры.

## ГРЫБЫ

Над лугамі,
Над балотамі
Хмарка ехала
З грымотамі.

Бліскавіцаю
Апаясана,
Стужкай вогненнай
Перавязана.

Запыталіся дубы:
— Што вязеш?
— Вязу грыбы.
Кажа хмарка:
— Зараз скіну
На зялёную раўніну!

Пачалі грыбы прасіць:
— Будзе сонца нас паліць,
Мы не бачым на лужку
Ні кусточка, ні цяньку.

— То спускайцеся ў балота,
Там заўсёды прахалода!
— Не,— грыбы сказалі разам,—
У балоце мы загразнем.
Апусці нас у лясы,
У густыя верасы,
Пад бярозы, пад асіны,
Пад калматыя хваіны,
Дзе цярушыцца ігліца,
Пахне смольная жывіца.

Развязала хмарка
паясы —
І сыпнуліся грыбы ў лясы!
І адразу ў глыбіні лясоў
Пазнаходзілі ўсе схоў:
Пад ігліцай,
Пад травіцай,
Пад галінкай,
Пад былінкай,
Пад бярозавым лістком,
Пад мяцёлкай-вераском.
А хто змог —
Схаваўся ў мох.
Толькі сёстры-сыраежкі
Засталіся каля сцежкі.

## ЯКІЯ БЫВАЮЦЬ ДАЖДЖЫ

З неба льецца дождж зялёны —
Зеланеюць вербы, клёны.

Ходзіць дожджык залаты —
Спеюць жоўтыя жыты.

Шэры дожджык сыпле, сыпле —
Ні лісточка ўжо на ліпе.

Бела ўсё, дажджоў няма —
Гэта ж к нам прыйшла зіма.

## ПІСЬМО ПТУШАК

Лёг сняжок пушысты,
Белы, як папера,
А на снезе птушкі
Ў каляровым пер'і.
Снегіры, сініцы,
Галкі-забіякі
На паперы гэтай
Пакідаюць знакі.
Цэлую гадзіну
Дзеці прастаялі,
Што гэта за знакі —
І не адгадалі.
Падышоў дзядуля,
Акуляры — ў рукі:
— Зараз адгадаем,
Дарагія ўнукі.
Гэта ж пішуць птушкі:
Ў іх няма кармушкі,
Просяць хоць бы трошкі
Зерняў, хлебных крошак.

## КАВЫЛЁК

### Паэма

Раскажу вам сёння, дзеці,
Ды не казку, а быль.
Хто з вас ведае, скажыце,
Што такое кавыль?
Рос калісьці ён усюды
На маўклівай цаліне.
А расказ мой пра вярблюда,
Пра вярблюда на вайне.

Не за дальнімі гарамі,
А бліжэй — па гэты бок
Папаўняўся на Урале
Запасны гарматны полк.
Кожны дзень у нас вучэнне;
Ваяваць — патрэбна ўменне,
Каб без промаху
Біць па ворагу,
Не паліць дарэмна пораху.
Скажа камандзір: «Выдатна!»,
Калі ты страляеш трапна,
Бранябойным падаб'еш
Танк, што выйдзе на рубеж.
Вельмі дрэнна — недалёт,
Вельмі дрэнна — пералёт,
Падвядзе няўмека фронт.

Падышоў да вартавога
У будзёнаўцы башкір
І пытае нават строга:
— Хто таварыш камандзір?

Вартавы размоў не любіць:
— Тут, дзядуля, не базар:
Ну куды вядзеш вярблюда?
Адыдзі пад ясакар!
Дзед на хлопца наступае:
— Што ж, па-твойму, я шпіён?
Я ў самога, брат, Чапая
Ў бой вадзіў свой эскадрон.

Маю ордэн за геройства,
На мяне ты не крычы.
Цяжка нашым там, на фронце,
Я хачу дапамагчы.

Сам стары я, не вайсковы;
Вось вярблюда аддаю,
Ён вынослівы, здаровы,
Хай паслужыць у баю.

Так застаўся з намі
Верблюдок.
Мы яго назвалі
Кавылёк.

У абозе папаўненне,
Ў строй становіцца вярблюд.
Толькі коні ў недаўменні:
Што яму патрэбна тут?

Ганарыцца конь буланы:
— З гэткім горбам ты — у строй?
Дабраволец, ці прызваны,
А ці проста на пастой?

Конь пярэсты збоку глянуў:
— Не твая, браток, вярста:
Ані выпраўкі, ні стану,
Ані грывы, ні хваста.

Ты, хітруга, вельмі ласы
На казённыя прыпасы,
На армейскі правіянт,
І, напэўна, сімулянт?

— Доўга будзеце смяяцца?
Што благога вам зрабіў! —
І пачаў вярблюд плявацца
Так, што вочы заляпіў.

Коні галавы схілілі,
Адчуваючы віну:
І чаго не падзялілі,—
Разам пойдуць на вайну.

То па полі, то па лесе
Эшалон
Бярэ разгон.
І вярблюд таксама едзе,
У вярблюда свой вагон.

Пакідае стэп і лета,
Кавыля сухога звон.

Едзе, едзе без білета,
На вайсковай службе ён.

Ад байцоў яму пашана,
І на станцыі любой,—
А ці позна, а ці рана,—
Ўсе к яму наперабой:

— Кавылёк, Кавылёк,
Пасмакчы сухарок.

Носяць сена: — Кавылёк,
Гэта твой паёк.

І — з брызентавым вядром:
— Вось вады мы набяром.
— Кавылёк, Кавылёк,
Ну яшчэ адзін глыток...

Едзе, едзе Кавылёк,
Едзе тыдзень, едзе два...
Ой, кавыль-кавылёк,
Горкая трава.

Паласа прыфрантавая,
Паравоз адпачывае.
Выгружаюцца салдаты.
І спускаюцца на дол
Танкі, коні і гарматы,—
Войска, войска навакол.

Запрагайся,
Кавылёк,
У гарматны
Перадок.

У танках
Смуглыя танкісты,
Каля гармат
Артылерысты.

На маршы крочыць
Кавылёк.
Гармату цягне
Вераблюдок.
Каляіны —
Бы ў пустыні,

Гарады —
Адны руіны.
Дрэвы звалены,
Вёскі спалены.
Толькі прысак ды жарства,
Пажаўцела ўся трава.

Вось сустрэча дык сустрэча,
Конь буланы цягне воз.
— Добры вечар!
— Добры вечар!
— Ты, напэўна, вадавоз? —

Здзекліва вярблюд пытае,
Аж губу ён скапыліў:
Не забыта крыўда тая,
Як з яго буланы кпіў.

Дзеці беглі на дарогу,
Ўсе глядзелі як на цуд.
Век не бачылі такога,
Каб сігаў тут сам вярблюд.

Сваё веданне яны
На хаду паказвалі:
— Хто у Афрыцы?
— Сланы.
— А вярблюд?
— У Азіі.

— Ты адкуль?
— З Уральскіх гор.
— А навошта
Носіш горб?
— Горб не лішні на спіне,
Горб патрэбен на вайне,
Горб — мой рэчавы мяшок.
Ён набіт па вузялок.

Размясціліся ў ляску
Пры дарозе-бальшаку.

Самалёт фашысцкі — «рама»
З чорным крыжам на баку
Кружыць
Над прывалам
Прама,
Выглядае, што ў ляску?

Свіст жалезны,
Немы віск.
Паляцелі
Бомбы ўніз.

Нібы ў час землетрасення,
Скалыхнуўся наш лясок.
Сосны падаюць з карэннем,
Трэскі,
Гліна
І пясок.

Дзе вярблюд? Ён не хаваўся,
Не задаў ён лататы:
Каля кухні затрымаўся
І агледзеў там катлы.

«У вялікім, мусіць, суп,
Ды не густа штосьці круп».

Каля кухні соль стаяла,
Галаву ён — у мяшок.
І — зусім турботы мала,
Што скупы ў байцоў паёк.

Для вярблюда соль — ласунак,
Самы лепшы пачастунак.
І не бачыць, і не чуе,
Як зенiткі рвуць блакіт:
Сам сябе вярблюд частуе,
Наганяе апетыт.

Соль упляжыў бы да дна,
Ды з'явіўся старшына.

Пасля солі Кавылёк
Выпіў цэлы ручаёк.
І выходзіць — дзве бяды:
Ані солі,
Ні вады.

Ноччу свой рубеж знаходзім,
На пярэдні край выходзім,
За акопамі — равок,
Там застаўся Кавылёк.

Чутна ў цемрадзі густой —
Вартавы гукае:
— Стой!

Устрывожаны салдаты,
І — хутчэй
За аўтаматы.
— Не страляйце, панікёры,—
Кажа камандзір з дакорам,—
Навастрыце лепей зрок,
Гэта ж наш Кавылёк!

А вярблюд бяжыць з падскокам
Проста на пярэдні край.
Можа, ранены асколкам? —
Паспрабуй ты угадай.
Праз акопы ён сігае,
З відавоку ўжо знікае.

Што здарылася з вярблюдам,
Ад чаго перапалох?
Пад гарэлым чорным дубам
Ён на вожыка прылёг.

Лёг на вострыя іголкі,
А яны ўпіліся ў бок,
Як пякучыя іголкі,
І — ўсхапіўся Кавылёк.

І не чуў ён, як гукалі
Нашы хлопцы наўздагон.
Потым...
немцы напаткалі
І забралі у палон.

— Ты, напэўна, перабежчык,
Уцякаеш ад сваіх?
А магчыма, ты — разведчык?
Гэй, паклічце вартавых!

Афіцэр у акулярах
Даў каманду абшукаць.
Настаўляе свой ліхтарык,
Каб было усё відаць.

Добра зубы палічылі,
Моцна ў вушы патрубілі.
Горб абмацвалі старанна —
Можа, рацыя схавана?

— Дзе служыў ты:
ў кавалерыі,
Сувязі ці артылерыі?

І якія ёсць гарматы,
Ці падвезены снарады?
Колькі лыжак у палку,
Колькі супу ў кацялку?

І за тое, што маўчаў,
Біць фашыст яго пачаў.
І выносіцца прысуд:
— Пойдзеш у абоз, вярблюд!

Можа, тыдзень, можа, болей
Кавылёк ужо ў няволі.
Хоць пры кухні служыць ён,
Ды не дадзен рацыён:
Ні крупінкі,
Ні сцяблінкі,
Ані макавай расінкі.

Повар выдумаў дазнацца —
Дзесяць сутак ці пятнаццаць
Без вады і без травы
Будзеш ты, вярблюд, жывы?

Кавылёк не еў, не піў,
Што загадвалі — рабіў.
І такі ён стаў слухмяны,
І дагодлівы, старанны.
Не спыняецца у возе,
Шэсць разоў ваду падвозіць,
Цягне кухню палявую
З тылу на перадавую.

І гагочуць немцы: — Гут,
Мы ў Сахары, мы ў пустыні,
Возіць нам абед вярблюд,
Горача — абед не стыне...

У дарозе повар дрэмле,
Знае ён: вярблюд не зверне
Ні направа, ні налева,
Не зачэпіцца за дрэва.

Дрэмле повар на світанні,
Ён сягоння недаспаў:
Быў у Фрыца на гулянні —
Імяніны той спраўляў.

Едзе кухня,
Едзе кухня,
Ані стукне,
Ані грукне.

Міма дзесь бабахне зрэдку,
Россып кулямётных трас.
Ні з разведкі, ні ў разведку
Не ідуць у гэткі час.

Кавылёк ужо сігае
Па нейтральнай паласе.
Хай фашысцкі ўзвод чакае,
Кухню ён не ім вязе.

Едзе кухня,
Едзе кухня,
Ані стукне,
Ані грукне.

А што, повар,
табе сніцца?
Хай табе прысніцца рай.
Коціць,
Коціць калясніца
Ды на наш пярэдні край.

Падхапіўся немец сонны,
Лыпае — няўжо не сон?
Абхітрыў вярблюд палонны,
Кухню ўзяў у свой палон.

Падымае немец рукі,
Немец Гітлера кляне.
— Засталіся дома ўнукі,
Пашкадуйце вы мяне...

Так вярнуўся Кавылёк
У гвардзейскі родны полк.

Цераз рэчку пераход,
Каму — рэчка, каму — брод.
Вораг сілы ўсе сабраў,
Не пакінуў перапраў.
Знішчаны усе масты,
Не плывуць даўно плыты.
І ля берага, вядома,
Ані лодкі, ні парома.

Над ракою, над вадой
Пачынаем зранку бой.
Ледзь сышоў туман світальны
З прыбярэжных паплавоў —
Сігануў агонь знішчальны
Можа, з тысячы ствалоў.

Мы з бярвенняў плыт зляпілі
І гармату ускацілі.
Пад абстрэлам, пад агнём
Мы на бераг той плывём,
І плывуць артылерысты,
Пехацінцы, сувязісты.

Рэчка стогне і гудзе,
А вярблюд уброд ідзе,
Дастае нагамі дно,
Крамяністае яно.

Цяжка ранен наш наводчык,
Памутнелі ў хлопца вочы,
Зараз пойдзе ён на дно,
Паратунку не відно.

Кавылёк, Кавылёк,
У цябе шырокі крок.
Паслужы нам, даўганогі,
Замест хуткай дапамогі!

На спіне сваёй гарбатай
Вынес Кавылёк салдата
З той кіпучай быстрыні,
З той бурлівай глыбіні.

Пасля бою — час прывала.
Дом разбіты, без акон.
— А каго вядуць з падвала?
— Бач, здаліся у палон
Штаб фашысцкі і ўся світа,
Вельмі важныя чыны,
Для парадаў былі сшыты
І мундзіры, і штаны.

Насцярожыўся адразу
Пахудзелы Кавылёк,
Бо не шмат мінула часу,
Як ад немцаў ён уцёк.

У кампаніі палонных
Пакідаў штабны падвал
Пры ўсёй форме і пагонах
Ваяўнічы генерал.

Столькі бляску, столькі
глянцу,
І такі парадны ён,
Бы цяпер на пагулянцы,
Проста робіць мацыён.

Кавылёк глядзеў, глядзеў,
Быццам вымавіць хацеў:
— Ты — з падвала?
Я — з Урала.
Плюнуў ён
На генерала.
Хтосьці хоча ўжо смяяцца,
Гледзячы на той мундзір.
— Перастань, вярблюд,
пляваццa,—
Кажа строга камандзір.—
Твой учынак — непрыстойны,
Трэба ж ведаць добры тон:
Генерал — у нас палонны,
Не ваюе болей ён.

Лета. Восень. І зіма.
Кавыльку
Няма
Пісьма.
Снег на ўсе дарогі лёг.
— Ёсць пасылка, Кавылёк!
Кавылёк,
Не сумуй,
За пасылку —
Патанцуй!

Скача, скача
Кавылёк.
Скок ды скок,
Скок ды скок.
Адчувае
Рытм
І такт,
Скача гэтак,
Скача так.

Батарэя плешча ў ладкі,
Заахвочвае імпэт:
Каб абуўся ты у тапкі,—
Вось бы даў кардэбалет!
— Хопіць, адпачні часінку,
Атрымай сваю пасылку!

Адмысловая пасылка,
Не мяшэчак

І не скрынка.
Паштальён —
З абедзвюх рук —
Уручае
Сена цюк.
Туга, туга спрасавана,
Па баках перавязана,
І — адкуль
Яно прыслана —
Не загадка,
Не сакрэт:
Не забыў
Вярблюда
Дзед.

Ехаў маршал Ракасоўскі
Па дарозе франтавой
Міма спаленае вёскі,
Дзе заціх нядаўна бой.

Кавылёк шагаў на маршы,
Перамешваў
Снег і бруд.
І спыніўся раптам маршал:
Скуль узяўся тут вярблюд?

Не ва ўзводзе, і не ў роце:
Ён адзін такі на фронце
І на ўсёй, на ўсёй вайне —
Воін з горбам на спіне.

— Дзе вярблюда вы ўзялі,
З Каракумаў прывялі?
Далажыў наш камандзір:
— Ды прывёў стары башкір...

— Дзякую, вярблюд, за службу,
За адвагу і за дружбу.
Ну, ваюй, ваюй, вярблюд,
Хутка Гітлеру капут!

Кавылёк шчаслівы быў:
Сам жа маршал пахваліў.

Шмат было яшчэ прыгод,
І закончыўся паход.

Мы з баямі наступалі,
Адбівалі,
Вызвалялі
Сотні гарадоў, мястэчак,
Перайшлі нямала рэчак,
Сухадолаў і раўнін,
Штурмам узялі Берлін.
За салютам быў салют,
Па Берліне йшоў вярблюд.

На Радзіму, на Радзіму! —
Абвяшчае паравоз.
І кладуцца кольцы дыму
То на поле, то на плёс.
Чуцен колаў перабор:
— Адкрывайце семафор!
І спяваюць рэйкі:
— Пераводзьце стрэлкі!
Эшалон бярэ разгон,
А ў вярблюда свой вагон.

Едзе, едзе Кавылёк,
Едзе тыдзень, едзе два.

Зелянее кавылёк —
Сухадольная трава.

## ВІТАЛЬ ВОЛЬСКІ

Віталь Вольскі (Віталь Фрыдрыхавіч Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 5 верасня 1901 г. у Пецярбургу. З 1919 г. служыў у Чырвонай Арміі, ваяваў з белафінамі на Карэльскім перашыйку, абараняў Петраград ад белагвардзейскіх банд Юдзеніча. У 1920 г. удзельнічаў у вызваленні Беларусі ад войск Пілсудскага, служыў у пагранічных войсках. Пасля дэмабілізацыі ў 1926 г. пачаў працаваць старшым інспектарам кінафікацыі Белдзяржкіно, з 1929 г.— дырэктарам Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (Віцебск).

В. Вольскі скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі імя У. І. Леніна, абараніў дысертацыю і стаў кандыдатам філалагічных навук (1934). У 1932—1936 гг. працаваў дырэктарам Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. У 1941—1944 гг. жыў у Маскве, загадваў аддзелам у рэдакцыі сатырычнай газеты-плаката «Раздавім

фашысцкую гадзіну», з лістапада 1943 г.— у рэдакцыі часопіса «Беларусь». На працягу 1948—1954 гг.— старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР.

З навуковымі артыкуламі аб вуснай народнай творчасці і тэатральным мастацтве В. Вольскі пачаў выступаць у 1926 г. на старонках часопісаў «Наш край», «Узвышша». У 1934 г. выйшла яго манаграфія «Сучасныя праблемы беларускай савецкай драматургіі». Ён напісаў манаграфію «Эдуард Самуйлёнак. Жыццё і творчасць» (1951), «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізму» (1958). В. Вольскі з'яўляецца адным з аўтараў падручніка «Беларуская савецкая літаратура для 9—10 класаў» (1948—1954), кнігі «Нарыс гісторыі беларускай савецкай літаратуры», выдадзенай у Маскве ў 1954 г., і дапаможніка для студэнтаў-філолагаў ВНУ БССР «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956).

Навуковую дзейнасць В. Вольскі плённа спалучае з мастацкай творчасцю. Напісаў п'есы-казкі для дзяцей «Цудоўная дудка» (1938, паст. у 1939) і «Дзед і жораў» (1939, паст. у 1939). Найбольшую папулярнасць прынесла пісьменніку п'еса «Несцерка» (1940, паст. у 1941 г.), за якую яму была прысуджана першая прэмія на Усесаюзным конкурсе на лепшы драматычны твор. У 1946 г. выйшла п'еса «Машэка» (паст. у 1954 г.).

В. Вольскі напісаў сцэнарыі дакументальных краязнаўчых фільмаў «Белавежская пушча» (1946), «Бярэзінскі запаведнік» (1965) і мастацкага фільма «Несцерка» (1955).

Вялікая заслуга пісьменніка ў стварэнні навукова-пазнавальных кніг для юнага чытача. Краязнаўчыя нарысы і апавяданні змешчаны ў яго кнігах «Па лясных сцежках» (1948), «У лясах над Бярозай» (1955), «Месяц за месяцам» (1956), «На бабровых азёрах» (1957), «Чайкі над Нараччу» (1959), «Родны край» (1961), «Старонкі нашай гісторыі» (1966), «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971), «Кніга падарожжаў» (1971), «Лёс Дункана» (1978), «Дзень добры, Бяроза!» (1984). Творчым вынікам падарожжа пісьменніка па Афрыцы сталі нарысы «Афрыканскае падарожжа» (1963) і «Эль Махрыб» (1965).

Памёр В. Вольскі 22 жніўня 1988 г.

## БЕЛАРУСКАЕ МОРА

«Беларускае мора».

Мне прыходзяць на памяць гэтыя словы. Так нярэдка называюць Нарач.

І сапраўды, гэта — самае вялікае возера Беларусі.

Плошча яго — восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня — трыццаць пяць метраў. Знаходзіцца яно на паўночным захадзе Мінскай вобласці.

Нарач адносіцца да азёр, якія не зарастаюць раслінамі. Вада ў гэтых азёрах чыстая, празрыстая, багатая на кісларод. Такія вялікія і глыбокія азёры называюцца алігатрофнымі. У іх адбываецца безупынны рух вады ад ветру і ад глыбінных плыней. Дзякуючы гэтаму прыбярэжная паласа не ператвараецца ў балота і возера застаецца чыстым і адкрытым. Над Нараччу амаль заўсёды дзьмуць вятры.

Паўночныя і паўночна-ўсходнія берагі Нарачы ўзвышаныя, паўднёвыя і заходнія — нізкія.

На паўднёвым усходзе з возера выцякае рэчка Нарач, якую мясцовыя жыхары называюць Нарачанкай. Звілістай стужкай прабіраецца яна сярод топкага балота, якое зарасло хмызняком і чаротам, у раку Вілію, прыток Нёмана.

На поўначы бераг возера закругляецца, набываючы правільную форму чашы, да краёў напоўненай вадой. З усходняга боку паўз возе-

ра ўецца дарога, абапал якой высяцца сосны, расце ядловец. Справа цягнецца цудоўны, сухі і вясёлы сасновы бор. Злева наступаюць на бераг хвалі.

На паўднёвым беразе лясоў няма. Да вады спускаюцца спадзістыя ўзгоркі. На іх расце толькі трава. Бераг нізкі, з зараснікам трысця і чароту.

На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра, плошча якога — трынаццаць квадратных кіламетраў. Непадалёку знаходзіцца возера Мядзель і маленькае возера Баторын.

З вяршыні кургана каля вёскі Мікольцы можна ўбачыць усе гэтыя азёры Нарачанскай групы.

Паўночную частку Беларусі нездарма называюць краем блакітных азёр. На поўнач ад Нарачы іх налічваецца некалькі тысяч, і малых, і вялікіх. Усе яны ўзніклі дваццаць — дваццаць пяць тысяч гадоў назад.

Вучоныя лічаць, што магутны ледавік, насунуўшыся ў чацвёрты раз з гор Скандынаўскага паўвострава, пакрыў усю гэтую мясцовасць пластом лёду таўшчынёю ў сотні метраў. Рухаючыся з поўначы на поўдзень, вялікія масы лёду драбнілі цвёрдыя па́роды, цягнулі іх з сабою і пакідалі на сваім шляху буйныя валуны, дробныя каменні, гліну і пясок. З матэрыялаў, прыцягнутых ледавіком, утварыліся марэны — высокія грады абломкаў горных парод. Пры гэтым узгоркі чаргаваліся з глыбокімі лагчынамі.

Калі ледавік пачаў раставаць, частка вады затрымалася ў лагчынах і нізінах, утварыўшы азёры. У спадчыну ад ледавіка засталіся не толькі гэтыя блакітныя азёры, не толькі шматлікія каменні, вялікія і дробныя, на палях Мінскай і Віцебскай абласцей, але і прыгожы, хвалісты рэльеф мясцовасці.

Марэнныя грады былі прыроднымі плацінамі, якія затрымалі расталую ваду ледавіка. Яны ўтварылі найбольш буйныя азёры, у тым ліку і Нарач — «Беларускае мора».

## ПЕРШЫ ВЫЛЕТ

Эдзік выйшаў на ганак, спыніўся, і незадаволена зірнуў навокал. Зноў кепскае надвор'е, зусім не летняе, як і ўсе апошнія дні! Зноў нельга купацца!

Халодны вецер гнаў па нізкім небе вялікія цёмныя хмары. Возера было сярдзітае, неспакойнае. З шумам каціліся на бераг мутныя зялёныя хвалі з белымі грабянямі.

Хлопчык спусціўся па прыступках і пайшоў мокрай пасля начнога дажджу сцежкай. Маці паслала яго назбіраць трускалак на агародзе.

Толькі ён хацеў сарваць і кінуць у міску першую ягаду, як раптам убачыў вялікага светла-шэрага птаха, які марна змагаўся з рэзкімі парывамі ветру. Птаха ўсё больш і больш адносіла ўбок. Вось ён ужо над самым агародам. Выставіў наперад доўгія ногі, нібы самалёт шасі перад пасадкай, і павольна прызямліўся адразу недалёка ад Эдзіка.

Хлопчык адразу забыўся і на міску, і на ягады, памкнуўся да птаха, што стаяў пасярод бульбы.

— Эдзік, хто гэта? — пачуўся ззаду голас сястрычкі Інкі. Яна хуценька збегла з ганка і апынулася каля брата.

Эдзік схапіў малую за руку.

— Ціха!..— прашаптаў ён.— Хіба не бачыш? Чапля!

Інка паслухмяна спынілася.

— Стой тут і не варушыся! — скамандаваў Эдзік, а сам пачаў асцярожна набліжацца да чаплі.

Птушка і не думала адлятаць. Стаяла нерухома, бо была маладая, нядаўна пакінула гняздо і яшчэ не прывыкла баяцца людзей.

Эдзік асмялеў, пасунуўся бліжэй, а чапля баязліва ўцягнула шыю ў плечы, згорбілася і не зводзіла з яго недаверлівага і адначасова цікаўнага позірку. Тады хлопчык падскочыў да чаплі і схапіў яе за спіну, каб яна не магла ўзмахнуць крыламі або стукнуць дзюбай. Адной рукой ён прыціснуў чаплю да сябе, а другой моцна трымаў дзюбу. Чапля не супраціўлялася, не спрабавала вырвацца.

— Хадзі сюды! — паклікаў Эдзік сястру.— Бачыш, якая прыгожая?

Цяпер і дзяўчынка магла добра разгледзець і белую гнуткую шыю, і жоўтую дзюбу, і круглыя залацістыя вочы, і нават чорную чупрынку на патыліцы, якая смешна вісела ззаду, нібы маленькая незаплеценая коска.

Інка асцярожна пагладзіла шчыльнае блакітна-шэрае апярэнне.

— Што ты будзеш рабіць з ёю? — запыталася дзяўчынка.

Да гэтай хвіліны Эдзік і сам добра не ведаў, нашто ён злавіў маладую чаплю, але, пачуўшы запытанне сястры, адказаў з пачуццём уласнай годнасці:

— Злавіў, каб табе паказаць. А цяпер аднясу ў поле і выпушчу. Хай ляціць куды хоча!

— І я з табою! І я!..— з захапленнем закрычала Інка.

Яны выйшлі з агарода і падаліся да лугавіны за пасёлкам. Ісці было недалёка, бо хата стаяла на самай ускраіне.

Эдзік нёс чаплю пад пахай, адной рукой усё яшчэ сціскаючы для пэўнасці дзюбу. Інка ступала побач, не зводзячы з птаха вачэй. Па вільготнай траве яны дайшлі да лугавіны і спыніліся. Тут, за кустамі, было зацішна. Эдзік паставіў чаплю на зямлю а сам адышоў з Інкаю ўбок. Вецер тым часам суняўся. Неба ачысцілася ад хмар. Выглянула сонца.

З цікавасцю сачылі дзеці за кожным рухам цыбатага птаха. Чапля зрабіла некалькі няўпэўненых крокаў наперад, агледзелася, страсянулася, узмахнула шырокімі, чорнымі на канцах крыламі і... адарвалася ад зямлі. Узляцела яна цяжка, нязграбна. Спачатку бездапаможна боўтала ў паветры нагамі і нібы кулялася з боку на бок. Потым рухі чаплі набылі ўпэўненасць. Галаву яна адкінула на спіну, ногі выпрастала назад. Палёт яе зрабіўся роўным, павольныя ўзмахі крылаў — рэдкімі, дужымі.

Інка памахала ёй на развітанне рукой.

Неўзабаве крылатая госця знікла за лазняком.

Брат і сястра вярнуліся на агарод і ўзяліся за трускалкі. Спелыя ягады прывабна чырванелі сярод зялёных лісточкаў. Урадзіла іх нямала, і былі яны ўсе буйныя, салодкія.

Калі дзеці пайшлі дахаты, набраўшы поўную міску духмяных ягад, Інка раптам спынілася.

— А куды паляцела шабля? — спытала яна, нібы ўспомніла нешта.

— Якая шабля? — не зразумеў Эдзік.

— Ну, птушка тая,— нецярпліва паўтарыла дзяўчынка.— Шабля! Ты ж сам казаў. Яна толькі што ў нас была. Мы яе выпусцілі.

Эдзік засмяяўся.

— Не шабля, а чапля,— паблажліва паправіў ён малую і з сур'ёзным выглядам знаўцы растлумачыў: — Можа, яна паляцела дамоў, на гняздоўе за балотам. Туды, дзе нарадзілася. У іх там гнёзды на соснах. А можа, яшчэ куды далей.

Ад таты Эдзік чуў, што маладыя чаплі, як толькі навучацца трохі лятаць, адразу пускаюцца ў самастойныя вандроўкі па наваколлі. Перасоўваюцца паасобку ў розных напрамках, з кожным днём усё далей. Трэба ж ім загадзя рыхтавацца да пералёту на поўдзень!

— Чаму яна была на нашым агародзе? — не супакойвалася дзяўчынка.— Чаго хацела?

— Нічога не хацела,— важна адказаў Эдзік.— Вецер быў надта моцны. Чапля стамілася і мусіла апусціцца. Крылы яшчэ не дужыя. Добра лятаць не навучылася, нявопытная. Відаць, гэта быў яе першы вылет у свет.

— Першы вылет,— задуменна паўтарыла Інка.

**ВЕРАСЕНЬ**

Верасень лічыцца па календары першым месяцам восені.

Сады і лясы змяняюць паступова сваю летнюю зялёную вопратку на асенняе ўбранне. Лісце на дрэвах пачынае жаўцець, набываючы розныя колеры і адценні. Сярод цёмных вечназялёных лапак ялін і сосен зіхаціць залатое лісце бяроз, ліп, клёнаў, вольхі.

У садах паспелі яблыкі, грушы.

У высокім сінім небе не чуваць ужо над полем звонкага спеву жаваранка. Не відаць у садах ні берасцянкі, ні чыжыка, ні шпакоў. Даўно ўжо няма салаўя. Па каменнях каля рэчкі не скачуць жвавыя пліскі. Усе гэтыя птушкі паляцелі на поўдзень, і мы іх не ўбачым да наступнай вясны.

Вада ў рэчках і азёрах празрыстая і халодная.

Мянтуз пакідае сваё летняе сховішча пад берагам і пачынае жыравацъ у мелкай вадзе.

Плоткі, акуні, галаўні, язі і іншыя рыбы збіраюцца ў чароды і шукаюць глыбейшых мясцін.

Толькі шчупак па-ранейшаму палюе ў адзіноцтве, але і ён ідзе ў глыб вадаёмаў.

У пачатку восені рыбы ў рэках і азёрах харчуюцца асабліва ўзмоцнена. Яны назапашваюць тлушч, які дапаможа ім перажыць

зіму ў халоднай вадзе пад лёдам. З надыходам халадоў рыбы становяцца ўсё менш рухавымі і паваротлівымі.

Пакінулі свае дазорныя вышкі канюкі, пільныя абаронцы палёў ад шкодных мышэй-палёвак.

На апусцелых нівах палёўкам няма чаго рабіць. Яны перабіраюцца бліжэй да чалавека і да збожжа — у гумны, хлявы, скляпы і стайні. Следам за палёўкамі перасяляюцца сюды на зіму і ласкі. Ад маленькай і спрытнай ласкі палёўкам цяжка схавацца. Маючы доўгае гнуткае тулава на кароткіх ножках, ласка можа пралезці за мышамі ў самую вузкую шчылінку, у самую цесную норку.

Палёўкі застаюцца на зіму ў полі толькі ў тым выпадку, калі яны здолелі на працягу лета назапасіць у норках пад зямлёй дастатковую колькасць збожжа і насення розных раслін.

Перабіраюцца палёўкі і ў лес, калі там хапае арэхаў і жалудоў. Тут іх ловяць лісіцы і барсукі.

Восенню барсукі наведваюць часам агароды, дзе любяць пажывіцца морквай і буракамі.

Адкарміўшыся за лета, яны ў верасні пачынаюць рыхтавацца да халоднай зімы.

Барсукі прыводзяць у парадак нару, выкідваюць з яе рознае смецце, высцілаюць сваё логава лісцем і сухой травой, затыкаюць мохам усе выхады з нары, каб было цяплей. Адначасова яны робяць і харчовыя запасы, якімі жывяцца позняй восенню, калі не выходзяць з нары па некалькі дзён. З надыходам халадоў, звычайна ў сярэдзіне лістапада, тлустыя і лянівыя барсукі засынаюць у сваіх логавах, таксама як і мядзведзі ў бярлогах.

Чародамі збіраюцца на балотах у верасні дзікія качкі і жыруюць, рыхтуючыся да выраю.

Маладыя жоравы таксама збіраюцца разам з бацькамі ў вялікае падарожжа. Яны вучацца лятаць строем, трохкутнікам і, пакінуўшы роднае балота, дзе нарадзіліся і выраслі, робяць для практыкі пробныя палёты над ваколіцай.

Харчуюцца жоравы цяпер не толькі на балотах, дзе яны ядуць розных чарвякоў, лічынак, жабак і карэнне балотных раслін, але і на палях. У канцы лета і ў пачатку восені яны трымаюцца бліжэй да палеткаў, куды прылятаюць харчавацца на золку. Асабліва любяць яны гарох.

Адлятаюць жоравы ад нас у кастрычніку. Гучным крыкам, нібы баявымі трубамі, абвяшчаюць яны ўсяму свету аб тым, што пачынаюць свой вялікі пералёт у цёплыя краі на зімоўку. Адзін за адным, у стройным парадку, узнімаюцца ў паветра і адразу набіраюць вышыню трохкутнікі жораваў. На чале кожнага кліна ляціць стары вопытны павадыр. Ляцяць яны высока над зямлёй. Першы вялікі прыпынак жоравы робяць у вусці Дуная. Так далятаюць яны да Егіпта.

На чужыне, у час зімоўкі, жоравы трымаюцца разам, вандруючы ўздоўж рэк. Яны дабіраюцца ўверх па Ніле аж да вытокаў яго ў Судане і Эфіопіі. Потым ляцяць назад і з надыходам вясны вяртаюцца на радзіму.

Набліжаючыся да родных мясцін, жоравы разбіваюцца на асобныя групы, а далей — на пары і гняздзяцца на балоце, дзе нарадзіліся, на купінах, каб можна было з вышыні свайго гнязда аглядаць ваколіцы...

У верасні ночы становяцца халоднымі. Раніцай на траве, на лістах хмызняку зіхацяць буйныя кроплі халоднай і чыстай расы. Над балотамі, над паплавамі сцелецца густы туман.

## КАСТУСЬ КІРЭЕНКА

Кастусь (Канстанцін Ціханавіч) Кірэенка нарадзіўся 12 снежня 1918 г. у вёсцы Гайшын Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1940 г. скончыў Гомельскі педагагічны інстытут і некаторы час працаваў настаўнікам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. К. Кірэенка працаваў у часопісах «Беларусь» (1945—1962), «Бярозка» (1962—1972), «Полымя» (1972—1986).

Першыя вершы К. Кірэенкі былі надрукаваны ў 1939 г. у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Полымя рэвалюцыі». У 1945 г. выдадзены зборнік вершаў «Ранак ідзе». Выйшлі кнігі паэзіі «Пасля навальніцы» (1947), «Мая рэспубліка» (1949), «Маякі», «Родны свет» (1952), «Любоў і дружба» (1955), «Светлая хваля» (1959), «Антонавы грахі» (1960, вершаваныя фельетоны), «Вернасць» (1961), «Смага» (1962), «Жывыя ідуць наперад» (1964), «Цёплая радуга» (1966), «Кніга ста песень» (1971), «Слухайце ластавак» (1974), «Сіні вырай» (1976), «Вёсны веснавацъ» (1979), «Дэкрэтам сэрца» (1983). К. Кірэенка — аўтар кніг публіцыстыкі «Амерыка здалёку і зблізку» (1971) і «Заўсёды з Радзімай» (1980), зборніка апавяданняў «Ручаіны шукаюць ракі» (1967), аповесці «Вандроўнае шчасце. Рыбацкая паэма» (1977). Паэт вядомы і як перакладчык твораў рускіх і ўкраінскіх паэтаў.

Юнаму чытачу К. Кірэенка вядомы як аўтар кніг вершаў і паэм «Алёнчына школа» (1951), «Зялёнае рэха» (1953), «Вясна-красна» (1956), «Сад піянерскі» (1960), «Слаўся, юнацтва» (1961), «Урачыстая песня» (1965), «Прысяга» (1969). Дзецям адрасаваў пісьменнік таксама аповесць «Сум і радасць дзеда Рэпкі» (1967) і кнігу апавяданняў «Алесева кніжка» (1972).

У 1963 г. за кнігу вершаў «Смага» К. Кірэенку прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы, у 1972 г.— Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы за зборнік вершаў «Кніга ста песень».

Памёр К. Кірэенка 15 верасня 1988 г.

### РАДЗІМА

Лепей за ўсё мне на свеце мясціна
Тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос.
Бэз пад акном і на полі каліна...
Ціхае сонца, блакіты нябёс...

Можа, другому не скажа нічога
Сціплая смолка на ўзлессі ў траве.
Мне ж у ёй радасць гучыць і трывога,
З ёю маё захапленне жыве.

Любы мне бору сасновага звоны,
Пошум прысадаў, што ўзбеглі на шлях.
Там, дзе бязмежна пралеглі загоны,
Сэрца ўбірае прыволле ў палях.

Выйдзеш за вёску — жытнёвыя хвалі
Коцяцца, цёплыя, плыняць наўсцяж...
Клічуць дарогі ў бясконцыя далі...
Самы ты вольны, край бацькаўскі наш!

Колькі мне маці тут песень спявала,
Колькі радзілася ў сэрцы тут мар,
Колькі мне ласкі жыццё аддавала,
Позіркам шчасця тут гледзячы ў твар.

Тут я быць верным і чулым вучыўся,
Сілу здабыў тут, якой не зламіць.
І сваёй роднай зямлі, дзе радзіўся,
Мне аніколі нідзе не забыць.

Дзе ні жыву, ўспамінаю да рыскі
Усё, аб чым слова ў душы берагу,
Кожны куточак, знаёмы і блізкі,
Усюды са мной.
Не згадаць не магу

Рэчкі люстранай, між лозаў і вязаў,
Што па лугах быстра воды нясе,
Поля, дзе смутак забудзеш адразу,
Сэрцам аддаўшыся светлай красе.

Матчыных слоў не забуду ніколі.
Дружбу шаную, што з вамі ствараў,
З вамі, сябрамі, якіх яшчэ ў школе
Роднымі сэрцу навечна абраў...

## ПАД ЗОРКАЙ ЧЫРВОНАЙ

То далі разлогаў,
То нівы, то ўзмежжы ў сіўцах.
Дарога, дарога
Бяжыць і бяжыць без канца...

Дарога, дарога,
Куды ты, куды ты бяжыш?
Дарога, дарога,
Чаго ты, чаго ты маўчыш?

Сказала дарога:
— Я з светам пазнацца хачу,
А колькі бягу я —
Нідзе я, нідзе не маўчу.
Пабачце, пабачце:
Як толькі пагляду стае,—
Высока, далёка
Стаяць абеліскі мае.

На кожным — імёны,
На кожным — бяссмерця пячаць.
Пачуйце, пачуйце —
Ні хвілі яны не маўчаць.

Вось тут, куды сёння
Прыйшлі вы шчаслівай гурбой,
Калісьці гарачы
Грымеў над дарогаю бой.

Назад ані кроку! —
Такі быў героям загад...
Ніхто не забудзе,

Як біўся тут
мужны салдат.

Вяртаўся з разведкі
Ён ранкам да штаба свайго.
Чужынцы ліхія
Вось тут акружылі яго.

Над ім самалёты,
Над ім агнямёты раўлі.
Каб выпаліць з сэрца
Любоў да бацькоўскай зямлі.

Над ім аж шалелі
Разрывы снарадаў і мін.
Каб духам скарыўся,
Забыў,
Чый баец ён і сын...

Ды ўсё ён адолеў,
Адданы Радзіме салдат.
Да кулі апошняй
Біў катаў яго аўтамат.

Да кулі апошняй
Крывавых караў чужаніц.
Пакуль на дарогу
Не ўпаў, дол крывавячы, ніц.

Героем няскораным
Ён у той ранак упаў.
Таму над дарогай
Навек абеліскам і ўстаў.

Пад зоркай чырвонай
Стаіць,
Наш вітаючы час.
І маці-Радзіму,
І новых сяброў сваіх —
вас...

Сказала дарога,
Не пынячы бег па зямлі,
І ясныя зоркі
Над ёю плылі і плылі...

Дарога, дарога,
Бяжыш ты да сонца амаль.
Вазьмі ты, дарога,
Нясі нашы роздумы ўдаль.

Паклон наш героям,
Удзячнасць ад сэрцаў вазьмі.
Пра нашу адданасць
Радзіме —
Скажы між людзьмі.

То далі разлогаў,
То нівы, то ўзмежжы ў сіўцах...
Герояў дарога,
Ў жыццё нас вядзі без канца!

## ВУЧУСЯ Ў ТАТЫ

Мой тата —
Слынны камбайнер,
Яго ў нас кожны знае.
У таты — Зорка на грудзях
Агніста,
Ярка
Ззяе.

Умее тата
Ўсё ў жыцці —
І я ім ганаруся.
І я гарнуся да яго,
І з ім я жыць вучуся.

Вучуся ў таты
Рана ўстаць
На працу —
Разам з сонцам.
Вучуся
Ўсіх людзей вітаць,
Быць іхнім
Абаронцам.

Як тата мой,
Хачу я быць
Сумленным,
Добрым,

Чыстым.
Як з нівы зернетка —
Любіць
Свет цэлы
Прамяністы.

І будзе ў мяне
Ўсякіх спраў —
Я ведаю —
Багата.
І веру —
Ўсе іх параблю,
Як дарагі мой
Тата!

## МІХАСЬ ДАНІЛЕНКА

Міхась (Міхаіл Пятровіч) Даніленка нарадзіўся 28 кастрычніка 1922 г. у пасёлку Ястрабка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча (1941) і Гомельскі педагагічны інстытут (1953). З 1953 г. працуе ў рэдакцыі газеты «Гомельская праўда».

Першае апавяданне М. Даніленкі «Баравым шляхам» было надрукавана ў 1940 г. у абласной газеце «Бальшавік Палесся». Першая кніжка апавяданняў «Мая песня» выйшла ў 1952 г., затым з'яўляюцца зборнікі апавяданняў і аповесцей «Майская навальніца» (1959), «Наваселле» (1964), «Наш дом» (1971), «Запаветны акіян» (1972), «Маці Мар'я» (1976), «Журлівіца» (1980), «Родная зямля» (1982).

Шмат працуе пісьменнік і ў галіне дзіцячай літаратуры. Яго творы для дзяцей увайшлі ў зборнікі «Вернасць слову» (1956), «Зачараваны гарлачык» (1961), «На вуліцы Сонечнай» (1963), «Ключы бабулі Зімы» (1986).

### БОТЫ-СКАРАХОДЫ

У Толі быў адзін капрыз. Купяць новыя туфлі ці сандалеты, а ён не рад. Моршчыцца, быццам укалоў аб цвік пятку, і хныкае:

— ЦісНуць!..

Купяць на размер большыя, зноў скардзіцца:

— Вя-лі-кі-я!..

І так — кожны раз.

У пачатку лета Толеў тата ўзяў адпачынак і сказаў:

— Збірайся, паедзем у вёску, да дзядзькі Арцёма. Ён табе пашые такія боты, што самі хадзіць будуць.

— Як гэта самі? — не зразумеў Толя.

— А як у той казцы пра боты-скараходы. Помніш, я табе расказваў?..

І вось яны ў вёсцы.

Дзядзька Арцём — шавец, працуе ў калгаснай майстэрні. Ён смуглы, як цыган, з чорнай барадою. Спачатку Толя пабойваўся барады: дзядзька казытаўся ёю пры сустрэчы. А потым асвоіўся, пасябраваў з дзядзькам. Той нават раіцца з ім, якія падэшвы паставіць пад боты, каб даўжэй насіліся.

— Гэтыя паставім пад боты брыгадзіра Лукаша,— гудзеў ён у бараду.— Надта ж спраўна ён у Доме культуры польку скача. І на рабоце — агонь... А да гэтых ботаў можна б і горшыя, ды так і быць: прыладзім і сюды добрыя...

— А чаму — горшыя? — пытаецца Толя.

— Дык гэта ж боты Івана Лаптуха. А ў яго вечна ногі баляць якраз тады, калі касавіца ці жніво. Ну і ляжыць Іван у цяньку пад вішнямі... Дык навошта, скажы, яму моцныя падэшвы?

Калі ні прыбяжыць Толя да дзядзькі Арцёма, той заўсёды трымае ў роце дратву і спрытна арудуе шылам.

— Мы і табе, хлопча, адгрукаем боты,— паабяцаў дзядзька і ўсміхнуўся: — Будзеш хадзіць са скрыпам-рыпам...

— Боты-скараходы? — ажывіўся Толя.

— Можна і боты-скараходы,— згадзіўся дзядзька.— Толькі трэба, каб ты крыху дапамог.

І Толя пачаў дапамагаць дзядзьку. Ён то насукваў дратву, то шоргаў па ёй кавалачкам ліпкай смалы, каб даўжэй не зношвалася. Нават паспрабаваў насячы з бярозавага цурбачка маленькіх цвічкоў. Вядома, не ўсё атрымлівалася, на далонях чырвоныя пухіркі ўсхапіліся. Ды дзядзька Арцём суцяшаў:

— Зажывуць рукі. Затое боты пашыем — усе задзівуюцца!

Нарэшце настаў дзень, калі Толя абуў свае боты-скараходы. Ступіў крок, ступіў другі, прыстукнуў аб падлогу абцасам і быццам на крылах панёсся з дому.

Вечарам бацька запытаўся:

— Ну як, сынок, лёгка ў ботах-скараходах?

— Ой як лёгка! Проста самі нясуць!

— Куды ж ты бегаў? — занепакоілася маці.— Можа, цiснуць яны? Вунь якія цяжкія!

— Лёгкія! — упарта пакруціў галавою Толя.— Проста самі нясуць!

— Дзіва што! — абазваўся дзядзька Арцём.— Толік жа сам боты шыў. Таму і лёгка ў іх бегаць.

## ЖУРКА

Бацька прынёс Толіку маладога жураўліка з перабітым крылом.

— Хутка халады пачнуцца. Акалее, загіне,— сказаў ён.— А мы яго выхадзім...

Калі Толік падыходзіў да птушкі, яна злосна шыпела, раскрывала дзюбу — спрабавала дзеўбануць хлопчыка. Не прывык Журка, каб яго рукамі гладзілі.

Толік са старога рэшата зрабіў птушцы ў сенцах гняздо. Два разы прывёў яго сюды нанач. А на трэцюю ноч Журка сам знайшоў сваё гняздо, доўга тупаў у ім — уладкоўваўся, каб ямчэй спалася,— і заціх.

— Заснуў,— радасна паведаміў Толік бацьку, як толькі той вярнуўся з лесу з чарговага абходу.

Крыло ў Журкі зажывала. Цяпер ён асмялеў — смешна дыбаў па пакоях, і нават сабака Шарык баяўся вострай журкавай дзюбы.

І Толіка Журка пачаў слухацца. Нават пасябраваў з ім. Мусіць, таму, што хлопчык яго карміў, бавіў свой час з ім.

...Доўга цягнулася зіма з завеямі і снегам. Але вось і вясна нарэшце прыйшла. Зазвінеў у высокім небе жаўрук, заспявалі свае песні берасцянкі, падала голас чорная жаўна.

— Хутка Журка паляціць ад нас,— сказаў аднойчы бацька Толіку.— Бачыш, як неспакойна ён па двары пахаджвае.

І праўда. Журка трывожна мераў двор і ўсё прыслухоўваўся да птушыных галасоў, што даносіліся з вышыні.

Аднойчы, калі высока ў блакітным небе плыў шнурочак жураўлёў і адтуль даносіліся іхнія галасы — быццам нехта трубіў на срэбраных трубах,— Журка падскочыў раз, другі, узмахнуў крыламі. Ён падымаўся ўсё вышэй і вышэй — даганяў тых жураўлёў, што вярнуліся з замаркіх краін да сябе дадому.

— Бывай, Журка,— памахаў яму рукой Толік.

## ЯНКА БРЫЛЬ

Народны пісьменнік Беларусі Янка (Іван Антонавіч) Брыль нарадзіўся 4 жніўня 1917 г. у Адэсе. Пачатковую адукацыю атрымаў у роднай вёсцы Загора Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, куды ў 1922 г. пераехалі яго бацькі. Скончыў польскую сямігодку (1931), працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. Вясною 1939 г. Янку Брыля мабілізавалі ў польскае войска; у верасні таго ж года ён трапіў у нямецкі палон, адкуль уцёк восенню 1941 г. і вярнуўся на радзіму. З кастрычніка 1942 г. Янка Брыль — сувязны партызанскай брыгады імя Жукава (Баранавіцкае злучэнне), а з пачатку 1944 г. да вызвалення Беларусі — партызан-разведчык і адначасова рэдактар сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала» і падпольнай газеты «Сцяг свабоды» (орган Мірскага падпольнага райкома партыі). З 1944 г. жыве ў Мінску.

Янка Брыль працаваў у рэдакцыях часопісаў «Вожык», «Маладосць», «Полымя», у Дзяржаўным выдавецтве БССР. У 1966—1971 гг.— сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Першы твор Янкі Брыля — верш «Апошнія крыгі» быў надрукаваны ў 1938 г. у газеце «Шлях моладзі», аднак сам пісьменнік пачаткам творчасці лічыць апавяданне «Марыля», часткова напісанае ў 1937 г. і закончанае ў 1943 г. Першая кніга «Апавяданні» выйшла ў 1946 г. пад рэдакцыяй і з прадмовай К. Крапівы. Праз год выходзіць зборнік апавяданняў і нарысаў «Нёманскія казакі». За аповесць пра калектывізацыю ў заходніх абласцях рэспублікі «У Забалоцці днее» (1951) Янка Брыль удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР (1952). Выйшлі аповесці пісьменніка «На Быстранцы» (1955), «Апошняя сустрэча» (1959). У 1962 г.— кніга апавяданняў і нарысаў «Працяг размовы», якая была адзначана Літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа (1963). Выйшлі кнігі нарысаў «Вачыма друга» (1956), «Сэрца камуніста» (1957). Пяру Брыля належаць раман «Птушкі і гнёзды» (1964), зборнікі лірычных мініяцюр «Жменя сонечных промняў» (1965), апавяданняў, мініяцюр і нарысаў «Вітраж» (1972), «У сям'і» (1976), «Акраец хлеба» (1977), «Ты жывеш» (1978), «Сёння і памяць» (1985), «Ад сяўбы да жніва» (1987), «На сцежцы — дзеці» (1988). У сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калеснікам стварыў кнігу «Я з вогненнай вёскі...» (1975). Янка Брыль — аўтар кніг «Роздум і слова» (1963, літаратурна-крытычныя артыкулы) і «Трохі пра вечнае» (1978, літаратурна-крытычныя артыкулы, творчыя партрэты).

У 1982 г. за аповесць «Золак, убачаны здалёк» (1979) пісьменніку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа.

У творчым багажы пісьменніка нямала апавяданняў для дзяцей. Для маленькага чытача выйшлі кніжкі прозы «Ліпа і клёнік» (1949), «Зялёная школа» (1951), «Светлае ранне» (1954), «Пачатак сталасці» (1957), «Жыў-быў вожык» (1976), «Сняжок і Волечка» (1983). Вядомы літаратуразнаўца В. Каваленка зазначае, што дзяцей Янка Брыль «заўсёды заўважае ахвотна, наглядае шмат і піша як пра асоб арыгінальных і нават... псіхалагічна складаных, сцвярджаючы гэтым самым ідэю асабовасці ў літаратуры як вельмі важную і надзённую» (*Каваленка В.* Жывое аблічча дзён. Мінск, 1979, с. 223).

Янка Брыль вядомы і як перакладчык на беларускую мову твораў Л. Талстога, А. Чэхава, І. Крылова, М. Горкага, П. Бажова, М. Канапніцкай, Э. Ажэшкі і іншых пісьменнікаў.

## ЖЫЎ-БЫЎ ВОЖЫК

Пачынаецца казачка так.

Жыў-быў вожык у лесе, а потым узяў ды памёр... Ды не той, пра якога хачу расказаць, а другі, зусім іншы — вялікі, стары. А нашага Тупчыка тата злавіў у лесе і прынёс у кішэні дахаты. І гэта не казка, а праўда.

Я быў тады яшчэ такі малы, што нават не хадзіў у школу.

Тупчык быў таксама малы, круглы, як шэры клубок, і калючы.

Тата вярнуўся з лесу і сказаў:

— Ну, Лёнік, я прынёс табе яблыка.

Ад радасці я забыўся, што яшчэ вясна, што яблыкаў яшчэ няма, і ўсадзіў руку ў татаву кішэню.

— Ай! — ускрыкнуў я, укалоўшы аб нешта пальцы.

І хацеў ужо нават заплакаць, але тата мой засмяяўся.

— Дзівак-чалавек, укалоў ды злуецца! — сказаў ён.— Ды гэта ж лепей за яблыка, ты паглядзі!

І ён выняў з кішэні маленькі калючы клубок.

Спачатку вожык наш ніяк не называўся. Ён нават разгортвацца не хацеў: як палажылі яго ў кутку, пад маім ложкам, так і ляжаў. Не на голай падлозе, а на імху. Тата сцягнуў граблямі са страхі старога хлява тры купіны моху, паслаў у кутку — і выйшла пасцель.

Мох зялёны, пушысты і цёплы. А шэры клубочак ляжыць на ім і ніяк не хоча разгортвацца. Я наліў яму ў сподак малака і паставіў каля самага моху. А вожыку хоць бы што...

Тады я лёг побач з ім на падлозе і хацеў ляжаць, пакуль ён не разгорнецца.

На дварэ змяркалася, і пад ложкам рабілася цёмна.

— Дурненькі ты,— сказала мама.— Ты яго толькі не чапай, ён і сам малако тваё знойдзе.

І праўда, толькі я лёг у ложак і ў хаце зрабілася ціха, як у куточку пад ложкам нешта ціхенька заварушылася і пачало вось гэтак чмыхаць:

«Ту-ту-ту-пых! Ту-ту-ту-пых!..»

А потым па дошках падлогі затупацелі маленькія мяккія ножкі.

— А што, не гаварыла я,— сказала мама.— Не палохайце яго, дык ён і малако пачне хлябтаць.

І праўда, мы памаўчалі, і неўзабаве пачулася, што нехта маленькі хлебча. Не так, як кот, а так, як парасяты,— плямкае.

— Ой, тата, я пагляджу.

Тата даў мне запалкі. Я ціхенька злез на падлогу, укленчыў, нагнуўся пад ложак і выняў з карабка запалку. Але як толькі яна чмыхнула і засвяціла, каля сподка я ўбачыў той самы калючы клубочак.

Ды ён ужо ляжаў не на імху, а на голай падлозе, і малака ў сподачку было менш, як раней...

Клубок тупацеў усю ноч, і за гэта мы пачалі называць яго Тупалам. А за тое, што ён хутка перастаў баяцца і не згортваўся больш, калі я пазіраў на яго, я ніколі не забываўся даваць яму есці.

Спачатку даваў толькі малако, а потым аднойчы разбіў яму на сподак яйцо. Тупала лішне не казырыўся,— панюхаў трохі і пачаў хлябтаць.

З нашым цюцікам Мурзам ён не хацеў сябраваць. Як толькі ўбачыць яго — у клубочак, і ўсё. Шчанюк спачатку хацеў панюхаць вожыка: дакрануўся носам да шэрых іголак, заматаў галавой і фыркнуў — не спадабалася. Тады ён прысеў, абняў клубочак лапамі і паспрабаваў яго ўкусіць. Але зноў укалоўся, ды гэтак балюча, што заззлаваў і пачаў уядацца, брахаць. Скакаў, скакаў вакол клубка, а потым яшчэ раз асмеліўся дакрануцца. Ударыў клубочак лапай, як кот па мячыку, заскуголіў, адбегся і лёг.

«Добрыя гулі,— хацеў ён сказаць,— я забаўляцца з табой хачу, а ты — нягодны, колешся».

Ды ён не сказаў гэтага, а толькі лізаў сваю лапу і скардзіўся, хныкаў.

Вусаты Фядот любіў грэцца на сонцы, калі яно свеціць у хату. Сядзе на падлозе, зажмурыцца і мурлыча. На Тупалу ён і глядзець не хацеў, не толькі што з ім гуляць. І нават калі клубочак разгарнуўся аднойчы, сам падышоў да ката і, наставіўшы лычок, панюхаў, наш Фядот толькі лыпнуў спрасонку вачыма, і ўсё. Сядзіць сабе, дрэмле, мурлыкае.

Няма з кім Тупалу пасябраваць.

І стала вожыку сумна.

У кухні нашай жыла квактуха з куранятамі. Спачатку яны былі маленькія, нібы камочкі жоўтага пуху, і ўсё пішчалі, дзяўбалі тварог і мітусіліся па земляной падлозе кухні, як сонечныя зайчыкі. А потым падраслі, квактуха пачала вадзіць іх на двор і толькі начаваць прыводзіла ў кухню. Сядзе пад лавай, затуліць іх крыламі, яны паціўкуюць трохі і спяць.

І вось Тупалу стала зайздросна. Уночы ён ціха залез пад квактуху, прымасціўся пад цёплым крылом і давай ад радасці варушыцца. Кураняты прачнуліся і заціўкалі. Квактуха хацела пашкадаваць іх, мацней прытулілася крыламі і раптам закрычала так моцна і так спалохана, што ўсе мы ў хаце прачнуліся.

Як толькі мама запаліла лямпу, квактуха ўсхапілася, сонныя кураняты з піскам рассыпаліся па кухні, а ў кутку, на тым месцы, дзе яны сядзелі, застаўся шэры калючы клубок. Квактуха пазнала яго, узлавалася і дзюбнула — моцна, балюча.

— Ну вось,— казала мама, выносячы Тупалу з кухні,— вось ты і зарабіў. Бачыш, чаго табе захацелася, жэўжык!

Каб жэўжыку было весялей, я зняў аднойчы са сцяны люстэрка і паставіў яго на падлозе. А ён ужо тупаў па хаце і ўдзень, не баючыся нікога. Падышоў да люстэрка, наставіў лычок, паглядзеў і надзьмуўся. Каб пастрашыць таго, што ў люстэрку. А той, што ў люстэрку, надзьмуўся таксама, і вось яны абодва разам зрабілі: «Пых!»

Мы засмяяліся, тата і я, а вожык вельмі здзівіўся. Што такое?.. Паглядзеў, паглядзеў у люстэрка, асцярожненька дакрануўся чмысікам да шкла і як быццам усё зразумеў. Адышоўся і больш не глядзеў у люстэрка.

Тады тата сказаў мне:

— Лявон...

Заўсёды мяне называлі Лёнікам, але як толькі тата хацеў пагаварыць са мной, як з дарослым, ён гаварыў мне Лявон.

— Ведаеш што, Лявон,— сказаў ён тады,— давай выпусцім вожыка, га?

— А навошта? — здзівіўся я.

— Як навошта? Ён пойдзе да іншых вожыкаў.

— Ну і што?

— Як што? Зробіць сабе хатку дый будзе жыць. І яму будзе там вельмі добра і весела, не тое што ў нас. Што ты скажаш, Лявон?

— І панясём яго з табой у лес? — спытаўся я.

— Навошта ў лес? Пусцім у грады, а ён ужо сам куды захоча, туды і пойдзе.

І мы занеслі Тупалу ў агарод.

...Кажуць, што ў той вечар я выйшаў на вуліцу і там, дзе стаялі мужчыны, сказаў:

— Добры вечар. Хочаце, я вам казку скажу?

— Ну, скажы.

І я сказаў:

— Жыў-быў вожык у лесе, а потым узяў ды памёр.

— Што, і ўсё?

— Ну, пэўна ж усё. У казцы. А нашага мы выпусцілі. Во!..

## ЛАЗУНОК

Позняя ноч. Пад нагамі паскрыпвае свежы, марозны снег. Безліччу дробных крупінак ён іскрыцца пад ціхім і сумным святлом вулічных ліхтароў. Час ад часу прагудзе аўтамашына або, выкрасаючы дугой сінія іскры, прагрукаціць амаль зусім пусты трамвай.

Над цёмнымі руінамі і рэдкімі агнямі горада зноў, як да вайны, пераклікаюцца гудкі заводаў. У адказ ім з вакзала або з далёкай ускраіны даносіцца не менш задорны гудок паравоза.

Вялікія вокны друкарні напоўнены яркім святлом. Яны будуць свяціць усю ноч.

Гэта вялізны, уцалелы ад бамбёжак і пажараў гмах стаіць ціха, без зычных гудкоў. Толькі зусім блізка праходзячы каля яго, можна пачуць нутраны, прыглушаны сценамі гул, вельмі падобны да шуму марскога прыбою.

Гэта гудзе друкарскі цэх.

Суцэльным гулам ракочуць вялізныя ратацыённыя машыны — камбайны друкарскай справы. Сіпяць і ляскаюць малыя руплівыя «амерыканкі». Да суму аднастайнымі раскатамі гудуць машыны, што называюцца плоскімі. Іх шум нагадвае марскі прыбой. Не толькі шум! Гледзячы ўздоўж лініі дзесятка гэтых машын на тое, як з-пад вальцаў узад ды наперад з мерным грукатам раскачваюцца талеры[1],— зрокам памяці бачыш, як кішыць на пяску пена, як неспакойна

[1] Талер — рухомая металічная дошка ў друкарскіх машынах, на якой змяшчаецца набор.

варушыцца галька, як пырскаюць угару ўсплёскі хваль, у бяссільнай злосці штурмуючы валуны...

Думы і вобразы заключаны ў металёвыя радкі набора.

Палосы — старонкі будучай кнігі — таксама строга і стройна заключаны ў форму. Па спускавой дошцы на барабан спаўзаюць белыя аркушы. Чорныя вальцы раз-пораз убіраюць пад сябе нагружаны наборам талер. З барабана на доўгія лучыны «пальцаў» сплываюць аддрукаваныя аркушы. Побач з машынай няспынна расце стапа паперы.

Падлетак Міхась Лазунок першую ноч стаіць каля плоскай друкарскай машыны. Ён увесь напоўнены радасцю працы над кнігай.

Праўда, найбольш складаная і адказная частка работы зроблена без Міхася. Майстар сам спусціў і прыправіў форму, сам адрэгуляваў накладку, сам зрабіў заліўку і змазку машыны. Міхасю засталося толькі стаяць ды глядзець — наглядаць за спраўнасцю друкавання. Аднак, нягледзячы на гэта, хлопец адчувае сябе бадай што зусім паўнаякасным майстрам.

З вышыні сваіх пятнаццаці год ён важна глядзіць на машыну. Вось яна і вялізная, і хітрая, і шмат чаго ў ёй ён не паспеў дагэтуль зразумець, а ўсё ж такі яна поўнасцю падначалена яму. Варта толькі павярнуць вось гэтую ручку ў адзін бок — і ўся гэтая музыка спыніцца, у другі — пойдзе зноў.

Апрача таго, хто ж яму тут перашкодзіць уяўляць сябе майстрам? Сапраўдны, значыцца дарослы, майстар Іван Сымонавіч стаіць ажно каля трэцяй машыны. Абапал Міхася стаяць такія самыя, як ён, падлеткі. Усе яны — былыя вучні рамесніцкай школы паліграфістаў, першы выпуск пасля вайны. Іх школа знаходзіцца тут жа, на першым паверсе. У друкарні не хапае рабочай сілы, і таму іх выпусцілі са школы датэрмінова, у канцы першага навучальнага года. Яны паспелі прайсці толькі палову курса. Ды і гэты год не быў належна выкарыстаны з-за пасляваенных цяжкасцей. Шмат часу заняла прыборка памяшкання і ўстаноўка вучэбных машын, зімой было страшна холадна. І ў выніку — яны прыйшлі ў друкарню амаль што навічкамі. Аднак, гледзячы на іх, можна думаць, што кожны з іх таксама, як Міхась, лічыць сябе ледзь не майстрам. Дык чаму ж Міхасю не лічыць?

Другі доказ Міхасёвай сталасці ёсць тое, што сам Іван Сымонавіч паставіў на талеры, збоку набора, яшчэ адно неабходнае слова: «Лазунок». Унізе кожнага аркуша стаіць лічба 3, а тады — «Якуб Колас. Дрыгва». Лічба 3 — гэта чарговы нумар друкарскага аркуша. Якуб Колас — гэта імя і прозвішча пісьменніка, які напісаў кнігу пад назвай «Дрыгва». Слова «Лазунок», Міхасёва прозвішча, пастаўлена на полі аркуша дзеля таго, як сказаў майстар, што Міхась лічыцца сёння, на трэцяй змене, адказным за якасць друку. Якуб Колас адказвае за тое, як напісана кніга, а Міхась Лазунок — за тое, як яна будзе надрукавана. І як тут пасля гэтага не ганарыцца?

Звыш усяго, як апошні доказ Міхасёвай сталасці, да яго прыстаўлена памочніца — Люда Міронычык, таксама з іхняга выпуску. Яна

шмат большая за Міхася, а ўсё ж такі стаіць каля яго толькі прыёмшчыцай. Так што можна нават час ад часу, з ахвоты, зрабіць ёй сякую-такую заўвагу. Міхась даўгавата глядзіць на тое, як Люда здымае са стала аддрукаваныя аркушы і адносіць іх на стапу. Усё ў яе ідзе як трэба. І за што б тут учапіцца?..

— Цётка,— кажа нарэшце Міхась,— вы можа паменш хапалі б?

— Што? — пытаецца Люда, не дачуўшы праз гоман машын.

— Што, што... Паменш, я кажу, адбірай.

— А што табе да гэтага? Баліць?

— Як гэта што? Прыёмка павінна быць спраўнай. Не ведаеш, мусіць.

— Ай-ёй! Які ж ты зрабіўся начальнік! Глядзеў бы от лепш на сябе.

Ну што ж, прыёмшчыца яўна недысцыплінаваная. Але «начальнік» не мае больш у запасе адпаведных сваёй годнасці слоў, і таму ён вырашае проста прамаўчаць. Ён кладзе ў кішэні зашмальцаваных портак чорныя ад змазкі і фарбы рукі, важна цыркае слінай праз зубы і адыходзіцца ад машыны.

Міхасёвым суседам справа, каля машыны № 7, стаіць Толя Касёнак, больш вядомы па хатняй яшчэ мянушцы — Цыган. Толя старэйшы за Міхася на адзін толькі год, але вышэйшы ён нават за Люду. Наогул увесь іх выпуск — сто сорак хлопцаў і дзяўчат — усе большыя за Міхася. За тое яго празвалі Бабашкай[1] яшчэ на пачатку вучобы, як толькі пачалі знаёміцца з прабельным матэрыялам.

Бабашка, не вымаючы з кішэняў рук, важна глядзіць на верхні аркуш цыганкоўскай прадукцыі. Таксама мне работа! Падумаеш — нейкія бланкі друкуе! Чорная рука пакідае цёплую кішэню і перагортвае адзін — другі дзесятак аддрукаваных аркушаў. Тое самае! Бабашка зноў кладзе руку ў кішэню, зноў важна цыркае слінай праз зубы і нейкі момант думае над тым, як тут найлепш сказаць Цыгану аб перавазе такой, скажам, працы, як друкаванне трэцяга аркуша «Дрыгвы», над усімі відамі дробных друкарскіх формаў — усімі гэтымі бланкамі, квіткамі... Ён толькі хоча пачаць, як раптам праз гул машыны даносіцца сур'ёзны голас дарослага:

— Эй, малы! Грамадзянін!..

Гэта — майстар. Бабашка, выхапіўшы рукі з кішэняў, лётам ляціць да машыны.

— Ты што, на рабоце ці на рынку? — пытаецца Іван Сымонавіч.

— На рабоце, таварыш майстар,— больш пакорна, чым разгублена, адказвае Міхась.

— На рабоце, брат, так не стаяць. Гэта што?

Майстар паказвае рукой на тры пакамечаныя аркушы.

— Гэта, таварыш майстар, брак,— яшчэ больш пакорна адказвае Міхась.

---

[1] Бабашка — брусочак, які ўжываецца для запаўнення пустых месц у наборы.

Больш тут нічога не скажаш. Машына як быццам у нейкай змове з Іванам Сымонавічам. Так усё было спраўна, а як толькі Міхась адышоўся, «пальцы» чамусьці няўдала прынялі два лісты, скамячылі іх, а трэці ліст наогул сышоў з барабана парваны. І майстар таксама спрытны: умомант заўважыў!..

Як толькі Іван Сымонавіч адышоўся, Міхась з цвёрдым намерам больш ні на крок не адыходзіцца ад сваёй машыны пачынае сачыць за працай «пальцаў».

— Таварыш майстар! Таварыш майстар! — чуваць ціхі, прыглушаны гулам машын голас. Міхась чуе яго, але не адварочваецца. Ён ведае: гэта Люда. Яна стаіць каля папяровай стапы, адвярнуўшыся, і толькі прыкідваецца, што нешта робіць.

— Міхаіл Бацькавіч!..

Міхась робіць выгляд, што гэта яго не датычыцца.

— Таварыш Лазунок, што гэта ў вас? Няўжо брак?

Далей Люда не можа трываць: яна садзіцца на стапу і звонка смяецца.

Хочучы давесці дзяўчыне, наколькі вышэй ён стаіць над усім гэтым блазенствам, Міхась пачынае высвістваць, робячы зусім абыякавы выгляд.

Пасля, крыху супакоіўшыся, ён заціхае і задумваецца.

...Падумаеш, колькі там гэтага браку! Аднак...

Аднак у памяці зноў паўстае, як жывы, той самы дзядуля...

Было гэта больш месяца таму назад, яшчэ ў школе. На перапынку Міхась з нуды прадзьмухаў у абмерзлай шыбе акна невялікае круглае акенца. Стала, нарэшце, і не выходзячы з класа, відаць, што робіцца на вуліцы. Людзі ідуць. Прайшло тры машыны. Два салдаты ў кажухах праехалі на санях каля самага тратуара. А потым Міхась зацікавіўся толькі дзядулем. Ён ішоў тым бокам вуліцы, уздоўж высокага шэрага плота. Спаважна ступаў па снезе, апіраючыся на кіёк.

— Зірні,— сказаў Міхась гэтаму самаму Толю Цыгану.

— Вось прыдумаў, Бабашка! І рад яшчэ як невядома што! — сказаў Цыган. А ўсё ж прыгнуўся да Міхасёвага акенца і пачаў цікаваць.

— Дзядулю бачыш каля плота? — спытаўся Міхась.

— Бачыш, бачыш... Я яго знаю, не толькі што бачу. Гэта ж, Бабашка ты, Якуб Колас. Ён у друкарню прыходзіў аднойчы. Мне тады завуч паказваў. Відаць, новую кніжку прыносіў. О, паглядзі,— сказаў Толя, зноў прыгнуўшыся да акенца,— ён і цяпер у друкарню ідзе. Вунь і папка пад пахай, таксама як той раз...

Дзе там глядзець у акенца! Міхась хапіў шапку і выбег на ганак.

Дзеля таго, каб Якуб Колас звярнуў увагу на маленькага друкарскага вучня, хлопчыку трэба было хаця б прывітацца. А ён стаяў, дашчэнту разгубіўшыся ад захаплення. Ды дзе там, зрэшты! — ад прывітання толькі, можа, нават і Коласу цяжка было б здагадацца, што рабілася ў той час у Міхасёвай душы... Дзеля гэтага трэба было б шмат аб чым расказаць.

Перад усім трэба было б сказаць, што ў гэтай маленькай дру-

карскай Бабашцы, нягледзячы на яго пятнаццаць год, жыве зусім сталае сэрца. І аб тым расказаць, дзе і як яно, гэтае сэрца, так хутка пасталела.

Фашысцкія бомбы не далі Міхасю скончыць нават чацвёртага класа. Замест школы хлопчык пайшоў з бацькамі ў лес, да партызан. Расказаць бы аб тым, як ён сядзеў у балоце ў час апошняй блакады, як яго там знайшла і выцягнула за нагу аўчарка... Фашысты спачатку білі яго таксама, як усіх дарослых, а потым разам з дарослымі везлі ў таварным вагоне. Сёння ён ведае, што іх тады везлі паліць у печах Трасцянецкага лагера смерці. Тады ён гэтага не ведаў, таксама як не ведаў ніхто з дарослых. Не ведаў, але не хацеў, каб яго вёз некуды пракляты, ненавісны вораг. Бабашка скочыў у дзверы вагона, а потым куляўся, быццам падстрэлены заяц, з высокага насыпу пад адхон. Па ім стралялі — але дарэмна.

Пасля трэба было б яшчэ расказаць пра тое, як ён вярнуўся дахаты, у родны калгас. Толькі з мамай і Верай, старэйшай сястрой, бо тата іх адразу пайшоў удагон за ворагам. Расказаць бы аб тым, як маленькі чатырнаццацігадовы хлапчук ішоў сюды цэлых сорак кіламетраў пешкі. Лідзія Пятроўна, настаўніца, прачытала ў газеце, што тут адкрываецца школа, у якой будуць вучыць друкаваць кніжкі. І ён адразу пайшоў. Як ён блукаў па вуліцах зусім незнаёмага горада, пакуль не знайшоў сабе сякога-такога прытулку!.. Як ён думаў пра хлеб, пакуль для іх не наладзілася сталоўка! Як ён мёрз у сваім летніку, пакуль ім не выдалі форменнай вопраткі!.. Расказваць аб гэтым трэба было б хоць бы для таго, каб давесці, што ён, Міхась, нічога не збаяўся. Што вось дамогся свайго: ён тут хутка закончыць вучобу і будзе па-сапраўднаму друкаваць кніжкі. Надрукуе тады і дзядулевы — усе тыя казкі і вершы, што так хвалявалі калісьці малога Міхаську!..

Трэба, безумоўна трэба было б аб усім гэтым расказаць. Але бедны Бабашка не асмеліўся, ды і не паспеў. Ён так разгубіўся, што нават не змог прывітацца.

Вялікія вокны друкарні зусім замураваны дзівоснымі ўзорамі дзеда-мароза. За імі — над горадам — позняя ноч. А ў цэху — незмаўкаючы гул машын, аднастайны, як гоман марскога прыбою.

З-пад барабана на доўгія лучыны «пальцаў» няспынна плывуць аддрукаваныя аркушы. Маленькі друкар Міхась Лазунок пільна сочыць за імі і марыць...

...А што, каб цяпер — адчыняюцца раптам дзверы і ўваходзіць той самы дзядуля. Яшчэ больш: ён падыходзіць сюды, да машыны, і спачатку не кажа нічога, а проста бярэ верхні аркуш і моўчкі глядзіць. І толькі ўбачыўшы, як спраўна Міхась Лазунок друкуе яго Талаша, дзядуля кажа: «А як жа ты называешся, хлопча?»

«Ох ты, таксама надумаўся! — прыемна ўздрыгвае Міхась, як быццам прачынаючыся ад салодкай дрымоты.— Чаго ён пойдзе сюды так позна? Зрэшты, без пропуску яго і не ўпусцяць. Ды і наогул ніколі ён сюды і не хадзіў...

А чаму б яму і не прыйсці? — зноў вяртаюцца цёплыя мары.— І пропуску яму ніякага не трэба: яго сам дырэктар прывёў бы. Тут я кнігу яго друкую, дык як жа яму не зірнуць! А што, як, і праўда, цяпер...»

Ох вы, мары! Не верыцца, не верыцца, а потым зноў — цік! — і паглядзіш на дзверы. Немагчымае здасца настолькі магчымым, што па ўсім табе раптам забегаюць салодка-казытлівыя мурашкі. Апусціш над працай галаву — і здаецца, што вось ён, дзядуля, стаіць над табой і глядзіць... Зробіцца неяк горача-горача, добра-добра. Проста так-такі і верыш, што вось ён стаіць ды глядзіць...

— Ну, памочнік, як справы?

Ох ты!.. Ну, чаго, гэта ж майстар. Іван Сымонавіч глядзіць на Міхася і ўсміхаецца.

— Бачыш,— кажа ён, памаўчаўшы,— глядзець трэба пільна, уважна, а задумвацца лішне каля машыны не варта. Наша, брат, справа з табой такая, што мы нічога асаблівага не прыдумаем. «Дрыгвы» мы, братка, з табой не напішам. А за гэтую штучку дык нам будзе брыдка.

Скажы ты, і як ён заўважыць: гэтая «штучка» — маленькая доўгая плямка паміж радкамі слоў.

— А я, таварыш майстар, не заўважыў,— зусім вінавата гаворыць Міхась.

— Нічога, паробіш хоць з палавіну майго — заўважыш...

Іван Сымонавіч паварочвае ручку матора ўлева, і вялікая машына паслухмяна спыняе працу. Пакуль ён, запаліўшы над высунутым талерам лямпачку, шукае і выраўноўвае ў прабельным матэрыяле тую «штучку», якая робіць зусім непатрэбную ў кнізе плямку,— Міхась сочыць за працай яго вялікіх запэцканых рук.

— Таварыш майстар...

— Ну?

— Ці можна мне ўзяць адзін такі ліст дахаты? Чытаць.

— А ты любіш чытаць? — пытаецца майстар, не адрываючы позірку ад работы. Яму, відаць, зусім неўпрыцям, што гэтым пытаннем ён закрануў найбольш жывое месца ў душы свайго памочніка.

— Ого! — радасна кажа Міхась.— Я чытаю, таварыш майстар, вельмі многа. Бо вось вам — зірніце сюды.

Іван Сымонавіч перастае стукаць і глядзіць на Міхася.

— Працуем мы, таварыш майстар, восем гадзін. Застаецца — шаснаццаць,— гаворыць Міхась. На слове «восем» ён загінае адзін палец, а на «шаснаццаць» — два.— Шаснаццаць гадзін я свабодны. Ну, дык вось і чытаеш.

Іван Сымонавіч умее заўважаць. І цяпер ён адразу заўважае, што галоўнае тут — не «шаснаццаць гадзін»...

— Табе б, малец, вучыцца,— кажа ён, цёпла пазіраючы ў вочы Бабашкі.

— А я і пайду,— усцешана адказвае Міхась.— У вячэрнюю школу для дарослых.

Пакуль Іван Сымонавіч, выпрастаўшыся, папраўляе заключку,

Міхась вырашае, нарэшце, спытацца ў яго пра сваё найбольш важнае.

— Дзядзька,— кажа ён, першы раз сёння выходзячы са службовага тону,— скажыце мне, а гэтае вось слова... ну, прозвішча маё на лісце, яно і ў кнізе застанецца?

Іван Сымонавіч і тут адразу здагадваецца, у чым справа.

— Вядома, застанецца,— кажа ён.— На тое мы яго і паставілі, каб засталося.

Гаворачы гэта, Іван Сымонавіч неяк дзіўна ўсміхаецца. Але Міхась не заўважае гэтага. Ён усміхаецца шчыра і радасна.

Некалькі дзён пасля гэтага галоўны рэдактар выдавецтва, падпісваючы да выпуску ў свет першы, так званы «сігнальны», экземпляр новага выдання аповесці Якуба Коласа «Дрыгва», зрабіў тэхнічнаму рэдактару заўвагу.

— Наогул, уражанне даволі прыемнае,— гаварыў ён, гартаючы кнігу.— Чаму, аднак, паважаны Лазар Міронавіч, мы з вамі ніяк не можам поўнасцю пазбавіцца недахопаў? Хоць два, хоць адзін, хоць маленькі,— а ўсё ж такі павінна нешта быць. Вось і тут: няма чаго іншага, дык хоць абрэзку сапсавалі. Ну, чаго гэта варта, зірніце.

Ён павярнуў разгорнутую кніжку бокам. На полі, даволі такі далёка ад краю, стаяла зусім непатрэбнае ў кнізе слова — «Лазунок».

— І тут вось, і тут,— гартаў старонкі галоўны рэдактар.

Убачыўшы яшчэ некалькі разоў гэта лішняе слова, тэхрэдактар, нарэшце, згадзіўся, што гэта — хоць і нязначны, але таксама недахоп.

Згадзіцца з гэтым ніяк не змог бы толькі той, чыім прозвішчам было гэта «лішняе ў кнізе» слова. Дзе там лішняе! Міхась ледзь дачакаўся таго дня, калі ў кіёску з'явілася «Дрыгва» — першая кніга, у стварэнні якой ён прымаў непасрэдны ўдзел.

І вось яна, нарэшце, у яго руках!

Іван Сымонавіч не ашукаў: на палях кнігі ажно вунь колькі разоў паўтараецца Міхасёва прозвішча. Пусціш старонкі з-пад пальца — дык толькі і мігае: Лазунок, Лазунок, Лазунок... Шкада толькі, што сям-там яно прыхвачана нажом, як быццам распілавана наўздоўж. Ну, ды гэта — драбніца! Бываюць і горшыя недахопы.

Бабашка доўга стаіць каля кіёска, бясконца гартае кнігу, і ўсмешка не сходзіць з яго вачэй.

## ЛІПА І КЛЁНІК

### 1

Зялёны домік дарожнага майстра стаіць каля самай шашы.

Праязджаючы тут на машыне, на хаду можна заўважыць толькі зялёныя сцены, зялёны плоцік, белыя ліштвы вялікіх акон і стракаты чарапічны дах. Потым абапал дарогі зноў пабягуць дрэўцы прысадаў, тэлеграфныя слупы і за слупамі то поле, то лес...

Не заўсёды заўважыш з машыны, што ў гэтым прыгожым, адзінокім доміку жыве Ліпа, дзяўчынка, якой нядаўна пайшоў пяты год.

Спачатку, калі яна прыехала ў гэта домік, Ліпе было вельмі цікава стаяць пры дарозе, махаць рукамі на кожную машыну і на кожную з іх нацкоўваць свайго неразлучнага сябра — старога калматага сабаку Дзіка.

Аднойчы Ліпа нават не вытрымала: паплявала ў маленькія жмені таксама заўзята, як гэта робяць хлопчыкі, разагналася і пабегла на другі бок шырокай-шырокай і гладзенькай, як стол, асфальтавай паласы. Яна не дабегла і да палавіны шашы, як раптам з-за горкі — адзін і другі раз — сярдзіта загудзеў сігнал машыны. Маленькія босыя ножкі занылі ад страху. Ліпа затупацела на месцы, а потым заплакала: «Мама!» Машына спынілася, і шафёр, адчыніўшы дзверцы кабіны, хацеў нешта крыкнуць. Але Дзік накінуўся на яго з такім злосным абураным брэхам, што дзядзя шафёр сам спалохаўся, залез назад у машыну і паехаў далей.

З таго часу Ліпа ніколі больш не адважваецца без таты ці мамы пераходзіць на той бок шашы. І наогул цяпер яна вельмі рэдка стаіць пры дарозе. Хіба толькі тады, калі па шашы ідзе адразу вельмі шмат машын ці паўзе і грукоча, аж вушы баляць, які-небудзь вялізны замурзаны цягач.

## 2

Мама з татам паехалі ў горад разам, але ўвечары мама вярнулася адна. Ды затое яна прывезла Ліпе такі дарагі і доўгачаканы падарунак — пушыстую белую шубку.

Мама апранула сваю залатую дзяўчынку, трапяткімі ад радасці пальцамі зашпіліла ўсе гузікі шубкі, а тады падхапіла малую на рукі, павярнула тварыкам да лямпы і з захапленнем крыкнула:

— Ах ты, Снягурачка!..

І Ліпа адразу забылася на той смутак, што тата вернецца толькі заўтра. Яна захацела адразу ісці ў новай шубцы гуляць. Ды мама сказала, што позна, што ноч на дварэ, а мароз сёння гэтак кусаецца, гэтак цісне!.. І Ліпа пахныкала трохі, а потым згадзілася. Ну, добра, яна пачакае, пакуль зноў будзе дзень, няхай толькі мама дазволіць не скідаць сёння шубку ўвесь вечар.

Мама пасмяялася і дазволіла. Але ў хаце было цёпла: спалохаўшыся марозу, бабуля спаліла ў грубцы вялізнае бярэмя бярозавых дроў. Неўзабаве Ліпа скінула новую шубку, а сама лягла і пачала чакаць, калі ж нарэшце прыйдзе дзень.

Яна паляжала, падумала трошкі, а потым спыталася:

— Мама, а клёніку сёння ці холадна, мама?

## 3

Клёнік рос на тым баку шашы, цераз якую Ліпе няможна было пераходзіць. Рос не адзін, а разам з іншымі дрэўцамі, якія ў гэтую восень былі пасаджаны абапал дарогі з гасцінца ў калгас. Там былі клёнікі, ліпкі, бярозкі. Былі нават чатыры яблынькі і адна груша. Яны раслі адразу за клёнікам, які пасадзіла Ліпа...

Ну, не зусім сама, бо яна толькі трымала яго над ямай, пакуль два хлопцы прысыпалі карэнне клёніка зямлёй.

Хлопцы завуцца Уладзік і Шура. А яшчэ там былі і Міхась, і Марылька, і Волечка... Ой, як многа дзяцей, ажно цэлая школа!

Спачатку яны садзілі, а Ліпа стаяла ў адчыненай фортцы зялёнага плота і глядзела туды, за шашу. Прыслухоўваючыся да дзіцячага гоману, вялізны Дзік раз-пораз прыпадымаў галаву, плюшчыў вочы ад сонца і дабрадушна малаціў хвастом па штакетах адчыненай форткі. А Ліпа гэтак хацела туды, да дзяцей!

І дзеці як быццам адчулі гэта. Яны падышлі да шашы і пачалі крычаць:

— Дзяўчынка! Дзяўчынка, а ён не кусаецца?

— Не-е! — гукнула Ліпа, устаўшы на пальчыкі.— Наш Дзік малых не кусае!

— Дык ты ідзі да нас! Будзем дрэўцы садзіць!..

— А мне тата казаў не хадзіць за дарогу. І мама казала!..

— А мы цябе пе-ра-вя-дзём!..

Два хлопцы — якраз тыя самыя Уладзік і Шура — перабеглі цераз шашу, узялі Ліпу за рукі і, баязліва азіраючыся то на вялізнага калматага сабаку, што бег за дзяўчынкай, то на прыгорак, з-за якога магла паказацца машына, асцярожна пайшлі па асфальце.

Цёця настаўніца, якая была трохі далей, каля іншай чародкі дзяцей, спачатку пакрычала на хлопцаў за тое, што яны прывялі сюды маленькую дзяўчынку без дазволу яе мамы ці таты, а тады ўзяла Ліпу на рукі, пагаварыла з ёй і зусім так, як мама, пацалавала і ў адну і ў другую шчочку.

А дзеці выбралі Ліпе самы меншы і самы найлепшы клёнік.

Ён стаіць цяпер недзе ў полі, прывязаны перавяслам да слупка, трымаецца гэтай саламянай ручкай за апорыну, як той маленькі хлопчык, што сам не ўмее хадзіць. А на дварэ гэтак холадна, а ў полі гэтак шмат снегу!..

— Мама,— пытаецца Ліпа, ніяк не могучы заснуць,— а калі я пайду пагляджу яго, мама?..

## 4

На досвітку па пругкіх гурбах снегу за сцяной асцярожна зашастаў заяц.

Пачуўшы яго, у сенцах зялёнага доміка стары калматы Дзік насцярожыўся, нездаволена пабурчаў і, нарэшце, зусім залаваўшы, пачаў брахаць, нібы стукаць у бубен: «Бум! Бум! Бум!»

Знячэўку спалоханы заяц падскочыў, кінуўся ўбок і стралой паляцеў па гурбах.

Уранку Дзік доўга пятляў па заячых слядах вакол доміка і невялічкага саду, а потым некуды знік.

І вярнуўся ён толькі тады, калі ў адчыненай фортцы зялёнага плота, шчасліва жмурачы вочы ад сонца, ужо стаяла Ліпа.— Снягурачка ў белай пушыстай шубцы.

Дзік падышоў да Снягурачкі і, як заўсёды, прытуліўшыся да яе,

падставіў сваю вялікую галаву пад маленькую руку дзяўчынкі, нібы хочучы сказаць:

«Дзень добры, Ліпа. Пагладзь мяне, пачапай мае доўгія вушы».

— Ану цябе! — сказала Ліпа, надзьмуўшыся.— Ты мне шубку забрудзіш. Пайшоў!

І, выняўшы руку з пушыстай, таксама беленькай муфты, піхнула Дзіка ад сябе. Але Дзік не пакрыўдзіўся.

«Вось бачыш, якая ты! — замахаў ён хвастом.— А я толькі хацеў табе нештачка паказаць».

І тут ён раптам падскочыў ад нейкай, аднаму яму вядомай радасці, пачаў кружыцца, прысядаць на пярэднія лапы і клікаць:

«Бум! Бум! Бум! Ідзём! Ідзём!»

Ліпа засмяялася і пабегла за ім па чысценькім, бліскучым снезе.

5

У тым, што Ліпа зноў не паслухала тату і маму — зноў адна перабегла шашу,— сёння вінават быў Дзік. Ён забег на той бок і пачаў, прысядаючы, клікаць:

— Бум! Бум!

А потым яшчэ вінаваты і сонца, і новая шубка, і снег. Гэтак радасна, гэтак хараша, гэтак цёпла! Ліпа падумала трохі, яшчэ раз азірнулася назад, а потым, выняўшы з муфты рукі, пабегла. Бягом перабіраючыся цераз глыбокія ўзорыстыя каляіны аўтамашын, яна спатыкнулася і ўпала цёплымі ручкамі ў снег. Адразу спалохалася — ён жа такі казытлівы, пякучы,— а потым засмяялася і пачала крычаць.

— Дзік! Дзічок, пачакай, я іду!..

Калматы Дзік не толькі пачакаў сваю маленькую, пушыстую і белую як снег сяброўку,— ён вярнуўся назад і пабег з ёю разам. Яны перабеглі шашу, апынуліся на вузкай, абсаджанай дрэўцамі дарозе, і тады раптам Ліпа ўспомніла нешта, спынілася і сказала:

— Дзік, а вунь дзе мой клёнік! Вунь дзе, вунь там... От дурны, і не ведае.

Ліпа стаяла на цвёрдай, утаптанай коньмі дарозе, а Дзік — за дрэўцамі, на цаліне.

— Бяжым, бяжым, Дзічок, сюды!

Але Дзік толькі ведаў сваё: перад ім, быццам нейкі ўзор, зноў слаўся панадны, хвалюючы заячы след. Той самы, па якім ён нядаўна забег так далёка ў поле, амаль да самага лесу. Таго самага зайца, што швэндаўся ноччу за іхняй сцяной.

— Бум! Бум! Бум! — забрахаў Дзік, задзёршы ўверх вялікую вушастую галаву, і на яго, на сабачай, мове гэта азначала: «Не, лепш сюдой! Сюдой!»

Ды Ліпа не паслухала яго: яна пабегла дарогай. І толькі каля самага клёніка звярнула на цаліну, прабегла трошкі, не пратоптваючы шэрымі валёначкамі пругкую, заскарыненую гурбу, а потым спатыкнулася і зноў упала цёплымі ручкамі ў снег. Аднак не заплакала. Яшчэ ўсё шалпочучыся ў снезе, яшчэ ўстаючы, яна закрычала:

— Клёнік, міленькі, як ты жывеш?..

## 6

З сініх вачэй Снягурачкі адна за другой пакаціліся дзве гарошыны буйных слязін. А потым яшчэ, і яшчэ дзве...

Ліпа не плакала б — Ліпа не плакса! — ды вось нехта нягодны зламаў два маленькія дрэўцы. Не клёнік, а тыя яблынькі, што пасадзілі Волечка і Шура. Не зламаў, а абдзёр і пагрыз увесь ствалок і паабламваў усе галінкі.

Каб супакоіць Ліпу, Дзік дабрадушна матлошыць хвастом, пераступае з нагі на нагу і, задзіраючы ўгору вушастую галаву, разгублена паскавытвае... Ну, і як тут давесці малой, што нядобры і брыдкі — той самы заяц, што ва ўсім вінавата старая, якая не выйшла адчыніць Дзіку, не выпусціла яго, а толькі, не злазячы з печы, пастукала ў сцяну, каб ён маўчаў... А цяпер вось — глядзіце!..

Дзік спачатку бурчыць, а потым, зусім зазлаваўшы на зайца, пачынае брахаць: «Бум! Бум! Ну, пачакай, пападзешся, вушасты!» — лаецца Дзік на сваёй, на сабачай, мове.

Але Ліпа не хоча яго зразумець.

Раптам яна перастае плакаць, выцірае вочы кулачкамі ўжо халодных рук, хавае кулачкі ў муфту і кажа, таксама як тата, зусім па-даросламу:

— Дзік, на, цю, на!

Асцярожна сыходзіць з цаліны на дарогу, яшчэ раз азіраецца назад, туды, дзе мама і бабуля, а потым то ціха, спаважна ідзе, то зноў вымае з муфты ручкі і бяжыць... Бяжыць не дахаты, а ў той бок, дзе зусім недалёка для тых, хто ўжо вырас вялікі, стаіць новая школа.

Следам за Ліпай бяжыць вялізны калматы Дзік. На гэты раз зусім паслухмяны, ні разу не збочваючы з дарогі і не забягаючы наперад.

## 7

Марознай зорнай ноччу на шашы то прасунуцца ціхія сані, то зноў прамчыцца машына. Далёка чуваць, як пад дугой патрэньквае стары званочак, яшчэ далей разносіцца і гул і фырканне матораў. Затуліўшыся ў цёплай кабіне ці падбягаючы, каб сагрэцца, за санькмі, людзі гутараць, кураць, маўчаць.

А тым часам у ціхім зялёным доміку, каля самай дарогі, спіць Снягурачка.

Новая шубка і муфта вісяць цяпер у шафе.

Калматы Дзік ляжыць у сенцах. Ён то злосна бурчыць праз сон, відаць, успамінаючы нешта непрыемнае, то зноў прыслухоўваецца, ці не лазіць па снезе той самы шэры, вушасты нягоднік...

А Ліпа спіць.

І сніцца ёй, што заяц зноў прыбег да прысад па калгаснай дарозе. Хацеў абгрызці яшчэ дзве яблынькі, якія пасадзілі Маечка і Уладзік. Ды ўсе дрэўцы стаяць ужо ў пушыстых саламяных шубках. Ліпа сказала, і дзеці прыйшлі, паабвязвалі яблынькі саломай. Тады заяц вырашае абгрызці Ліпін клёнік. За тое, што яна хадзіла

ў школу. Але клёнік таксама ўжо не баіцца зайца. І яго абвязалі саломай — у шубцы і ён. Стаўшы на заднія лапы, заяц пнецца дастаць галінку. А клёнік, як той малы, што сам не ўмее хадзіць, плешча ў ладкі такімі, як Ліпіны ручкі, лістамі і весела, звонка смяецца.

І Ліпа смяецца таксама. Смяецца праз сон. Яе зноў вязуць цераз шашу на санках, таксама як удзень. Цягнуць санкі і Шура, і Уладзік, і Волечка... Многа-многа дзяцей, ажно цэлая школа! Дзік бяжыць паміж імі і весела, галасна брэша: «Бум! Бум!» А потым цёця настаўніца бярэ Ліпу на рукі, аддае яе маме і кажа:

— Вы не злуйце на Ліпу, яна была ў нас. Сёння Ліпа — вялікая цаца!

А клёнік яшчэ ўсё смяецца і плешча ў маленькія ладкі...

## ЧЫМ НАКАРМІЛІ МІШУТКУ

Люда наогул любіць і ўмее прыдумваць.

Яшчэ калі яна была зусім маленькая, трохі больш за паўтара года, і тата, стоячы на верандзе, трымаў яе на руках, Людачка заўважыла, як пад застрэшкам у павуціне б'ецца і ные муха.

— Пуця! — сказала яна, працягнуўшы заслінены пальчык.— Пуця гу-та-та!..

А «пуці» было не да гушкалкі.

Потым неяк, гадоў яшчэ праз паўтара, глянула малая раненька ў акно і ўсцешылася:

— Ой, мама, а сняжок які за ноч падрос! Большы яшчэ, як учора!..

Цяпер ужо Людачцы пяты год.

Сёння нядзеля, і тата не пайшоў на работу. Люда прачнулася, бачыць — Пампушка яшчэ спіць, мама ўжо кудысьці пайшла, а тата сядзіць ды чытае. І Люда задумалася, падпёршы кулачком пасля сну не вельмі румяную шчаку.

— Ну, што? — спытаўся, пачакаўшы, тата.— Што, мая цёцямаркоця?

— Тата, а Маша ж з'ела ўсю пахлёбку!..

— Якая Маша? Якую пахлёбку?

— А там, што мама ўчора нам чытала: пра Машу і пра трох мядзведзяў.

— Ну і што?

— Маша з'ела ўсю пахлёбку, а чым жа мядзведзіха накарміла тады малога Мішутку?

— Т-ак... Тут, брат, і сапраўды задача...

— А я, тата, думала, думала і прыдумала!

— Ну?

— Вось паслухай. Маша пайшла тады ў лес па грыбы?

— Ну, скажам, па грыбы.

— І назбірала грыбоў?

— Трэба думаць, што назбірала.

— А потым яна спалохалася мядзведзяў і ўцякла праз акно... А грыбы ж свае яна забылася!.. Ага! І Мішуткава мама падсмажыла іх маленькаму... Праўда?

# ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

Павел Нічыпаравіч Кавалёў нарадзіўся 18 лістапада 1912 г. у вёсцы Склімін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Вучыўся ў сямігодцы, а потым на кароткатэрміновых педагагічных курсах у Магілёве, пасля заканчэння якіх у 1930 г. некаторы час працаваў настаўнікам пачатковай школы ў вёсцы Пожар. Затым быў сакратаром рэдакцыі клімавіцкай раённай газеты «Камуна», смалявіцкай раённай газеты «Шлях калектывізацыі». У 1936 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава і быў накіраваны на працу ў рэдакцыю газеты «Звязда». На старонках гэтай газеты і з'явіўся першы нарыс П. Кавалёва «Узаемная любоў» (пра гомельскую настаўніцу М. Прудніkаву). У гады Вялікай Айчыннай вайны быў адказным сакратаром газеты «Савецкая Беларусь», працаваў у Цэнтральным штабе партызанскага руху (1943—1944), потым — у апараце ЦК КПБ (1944—1946). Быў сакратаром Саюза пісьменнікаў БССР (1946—1955), потым рэдактарам часопіса «Вожык» (1955—1967), галоўным рэдактарам часопіса «Полымя» (1967—1972).

Літаратурную дзейнасць П. Кавалёў пачынаў як журналіст. Спрабаваў свае сілы ў паэзіі, але пасля перайшоў на прозу. У 1943 г. выйшаў яго нарыс «Аляксей Антоненка», затым з'яўляюцца нарысы «Герой Савецкага Саюза Уладзімір Лабанок» (1945), «Калгас імя Янкі Купалы» (1948), «Сярод людзей калгасных» (1959), «На ўсё жыццё» (1985). П. Кавалёў — аўтар кніг апавяданняў «У новы дзень» (1952), «Каб шчасліва жыць» (1953), апавяданняў і аповесцей «Сонца ў вокны» (1962), «Пакінь нас, трывога» (1977), аповесцей «Падзенне Хвядоса Струка» (1967), «Дзень першы, ноч апошняя» (1980), а таксама зборнікаў сатыры і гумару «Пісьмо ў два адрасы» (1959), «Павер, кахаю...» (1969), «Як здароўе, доктар?» (1972).

П. Кавалёў выступае і як літаратуразнаўца. Выйшлі яго манаграфіі «Беларуская савецкая літаратура ў пасляваенны перыяд» (1950), «Беларуская савецкая літаратура ў барацьбе за мір» (1951). Пісьменнік пераклаў на родную мову асобныя творы М. Твэна, А. Чэхава, Ю, Збанацкага, С. Баруздзіна і іншых пісьменнікаў.

Нямала піша П. Кавалёў і для дзяцей. Юнаму чытачу адрасаваны яго аповесці «Андрэйка» (1948; 2-е, дапрацаванае выданне — 1970), «Лёнька Гром» (1961), «Чырвоны лядок» (1969), «Спытай сябе, Аніска» (1985), зборнікі апавяданняў «Згублены дзённік» (1954), «Сябры мае, дзеці» (1959), «Малы мужчына» (1966), «Жыві сабе, зайчык» (1975), «Пра нашу Дашу» (1982).

## ДАШЫН ДЗЯДУЛЯ

### 1

Неяк раніцою, як толькі дзеці ў садзіку смачна паснедалі, выхавацелька Антаніна Якаўлеўна сабрала іх каля сябе. Малыя падумалі, што зараз, як заўсёды, яна пачне што-небудзь цікавае чытаць ці распачне вясёлыя гульні. А тут, як толькі дзеці нарыхтаваліся слухаць, выхавацелька спытала:

— Дзеці, хто з вас ведае, які сёння дзень?

Малыя на нейкі момант аціхлі, пачалі адно на аднаго запытальна пазіраць, а потым шаптацца. І вось праз якую хвіліну ці дзве пачулася дружнае, калектыўнае:

— Чацвер! Чацвер!

— Правільна, малайцы,— голасна пахваліла сваіх выхаванцаў Антаніна Якаўлеўна.

А крышачку памаўчаўшы, сказала:

— А ці ведаеце, што сёння якраз дваццаць другое красавіка?

— Ведаем! Ведаем! — закрычалі хорам малыя.

— А што ў гэты дзень нарадзіўся наш дзядуля...— выхавацелька, прыплюснуўшы вейкі, знарок прыціхла.

На нейкі момант паўтарылася ўсё тое, што было хвіліну таму назад. Дзеці адразу аціхлі, паглядзелі адно на аднаго, пачалі азірацца на ўсе бакі. Запанавала цішыня. Зусім нязвыклая.

І раптам пачулася, ды такое гучнае, бадзёрае:

— Ленін, наш дзядуля Ленін нарадзіўся!

Гэта падаў голас Казік Русановіч. Гэта ж яму татка сёння раніцою, як адводзіў у садзік, сказаў, што дваццаць другога красавіка — дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

— Ага, Ленін, дзядуля Ленін! — адразу весела і ўсе разам паўтарылі за Казікам дзеці.

— Малайцы! Бачу, вы ўсё ведаеце! — зноў пахваліла дзяцей Антаніна Якаўлеўна, а да мякенькіх беленькіх валасоў на галаве Казіка пяшчотна дакранулася і лёгенька паварушыла іх.

Дзеці ўважліва глядзелі на сваю любімую выхавацельку, чакалі, што яна запытае ці скажа далей. А Антаніна Якаўлеўна такі не маўчала.

— Вось толькі ці ведаеце вы, што ў нашым горадзе жыве адзін старэнькі дзядуля, які...— і яна зноў зрабіла кароценькую паўзу.

— Не, не ведаем! Не ведаем! — шчыра і дружна прызналіся малыя і бліжэй памкнуліся да выхавацелькі.

— У нашым горадзе жыве адзін дзядуля, які сустракаўся з Уладзімірам Ільічом Леніным.

Кожнае слова Антаніна Якаўлеўна вымаўляла выразна, голасна.

Малыя моўчкі, як зачараваныя, глядзелі ў твар выхавацелькі.

— Сёння ён, гэты дзядуля, прыйдзе да вас у госці,— паведаміла Антаніна Якаўлеўна, кладучы свае цёплыя, ласкавыя рукі на галоўкі бліжэйшых да сябе выхаванцаў.

Малыя заварушыліся, запляскалі ў ладкі, а некаторыя аж заскакалі на месцы.

## 2

Пасля абеду, як заўсёды, у садзіку была гадзіна сну.

Ды сёння хоць і заплюшчвалі, як раілі нянькі, дзеці вочкі, але заснуць не маглі. Яны баяліся праспаць абяцаную сустрэчу з цікавым дзядулем.

Жаданая сустрэча адбылася, як толькі скончылася гадзіна адпачынку і дзеці таропка, спяшаючыся выпілі па кубачку цёплага малака.

Старэнькі, сівенькі, невялічкага росту, але яшчэ дужы дзядок, на грудзях у якога было мноства ордэнаў і медалёў, увайшоў у групу разам з Антанінай Якаўлеўнай.

Дзеці сцішыліся.

Выхавацелька сказала:

— Вось, дзеці, да вас у госці прыйшоў дзядуля, давайце яго павітаем.

Пачуліся крыху бязладныя воплескі.

А Антаніна Якаўлеўна казала далей:

— Дзядуля Рыгор Арцёмавіч сустракаўся з Уладзімірам Ільічом

Леніным. Мы ўжо не раз гаварылі з вамі пра любімага Ільіча. Вы і малюнкі пра яго малявалі, і вершы вучылі, і песеньку спявалі, і падарункі для ленінскага музея майстравалі. А сёння давайце паслухаем паважанага госця, Рыгора Арцёмавіча Смірнова.

Калі Антаніна Якаўлеўна назвала прозвішча дзядулі, адна з дзяўчынак хуценька нахіліла сваю галоўку ўніз і схавала яе за плечы сваіх сяброў. Гэта заўважыў толькі адзін Рыгор Арцёмавіч, усміхнуўся і пачаў гаварыць:

— У тую сустрэчу, якая запомнілася мне на ўсё жыццё, я атрымаў ад Уладзіміра Ільіча падзяку. А было гэта так...

Дзядуля крыху памаўчаў, а потым загаварыў далей:

— Познім зімовым вечарам стаяў я на варце Крамля каля ўваходных варот з боку Аляксандраўскага парку. Ва ўсіх, хто ішоў у Крэмль, мы, вартавыя, павінны былі правяраць дакументы. Розныя ж людзі сустракаліся тады, і трэба было вельмі пільнавацца, каб не прабраўся у Крэмль вораг і не нарабіў там якой шкоды.

Рыгор Арцёмавіч паглядзеў на выхавацельку, быццам пытаючыся ў яе, ці так ён кажа малым. Антаніна Якаўлеўна толькі бліснула яму вясёлымі вачыма.

— І вось,— расказваў далей госць,— бачу: нетаропка, але ўпэўнена прастуе да варот чалавек. Каўнер яго паліто ўзняты да самае шапкі-вушанкі так, што нават твару яго амаль не відаць. Крочыць чалавек спакойна, па баках не азіраецца. Я загарадзіў яму дарогу, патрабую:

— Ваш пропуск, грамадзянін!

Чалавек спыняецца, хуценька засоўвае руку ў кішэнь, дастае свой дакумент, падае яго і сам тварам да мяне паварочваецца. Я зірнуў на фатаграфію, на чалавека і адразу ж, вядома, пазнаў Уладзіміра Ільіча. Збянтэжыўся я, скажу вам, але хуценька выцягнуўся ў струнку і кажу: «Прабачце, таварыш Ленін, не пазнаў вас у такую мяцеліцу»...

Дзеці, затаіўшы дыханне, слухалі. А Рыгор Арцёмавіч гаварыў:

— Ён жа, што б вы думалі, пяшчотна так, лёгенька дакрануўся да майго пляча рукавічкай і сказаў:

— Аб'яўляю вам падзяку за пільную службу! — І пайшоў у Крэмль.

— А назаўтра,— відаць было, як хваляваўся дзядуля Рыгор Арцёмавіч,— наш камандзір сабраў усю крамлёўскую каманду і перад усім строем аб'явіў пра гэту ленінскую падзяку... Вось так гэта, дзеці, было... Такая сустрэча...

Рыгор Арцёмавіч доўга моўчкі глядзеў на малых. Малыя ж пляскалі з усіх сіл у далонькі — дзякавалі за расказ. Потым ён адшукаў вачыма Дашу, усміхнуўся ёй і дадаў:

— Вось і кажу я сваёй унучцы Дашы, вунь яна тут сядзіць, усім вам, дзеці, кажу — любіце Ільіча, нашага вялікага настаўніка, а ў школу пойдзеце — вучыцеся добра, па-ленінску жывіце!

Праводзілі Дашынага дзядулю ўсёй групай. Антаніна Якаўлеўна дзякавала за сустрэчу, доўга паціскала руку старога камуніста, прасіла часцей заходзіць да іх у госці.

А дзеці, як толькі дзверы за Рыгорам Арцёмавічам зачыніліся, кінуліся да Дашы, пачалі яшчэ распытваць пра дзядулю. І Даша адчула найвялікшую гордасць за свайго дзядулю.

### ДЗІВА-ПТУШАЧКА

Больш за месяц на Гомельшчыне стаяла гарачыня. Спякотнае паветра, здаецца, звінела, як напятая струна. Сонечныя праменні апоўдні былі падобны на распаленыя іголкі. Кветкі пачалі вянуць і засыхаць, лісце на гародніне пажоўкла, а на дрэвах скручвалася ў трубачкі.

Дзядуля Мацвей сказаў унукам, што прыехалі да яго ў госці:

— Яй, яй, такой гарачыні і не памятаю...

Днём Даша, яе брацік Юрачка і іх сябар, сусед Віталік, збіраліся ў цёмных, без вокнаў, сенцах і сядзелі там ажно да вечара. Віталік, як старэйшы, расказваў казкі.

К вечару гарачыня спадала, і яны выходзілі на вуліцу.

Дашы з Юрачкам, гарадскім унукам дзеда Мацвея, цікава было ўсё, што тут, у вёсцы, адбываецца. А дзед, калі меншала гарачыня, то бульбу акучваў, то агуркі паліваў, то яшчэ што рабіў па гаспадарцы. У такую пару дня ён не сядзеў у хаце.

Вось і сёння выйшлі дзеці на падворак. Глянулі сюды-туды, а дзеда не відаць. Адчынілі вузенькую брамку, што вяла ў агарод. Прыгледзеліся. Дзед стаяў са шлангам у руцэ пад самай вялікай яблыняй. Струмень вады, якую падаваў з калодзежа насос, даставаў да самай макаўкі яблыні.

Цікава стала дзецям. Такога яны яшчэ не бачылі. Ціхенька падышлі да дзеда бліжэй.

А вось і ён іх заўважыў. Неяк таямніча, шэптам, дзед паклікаў іх да сябе:

— Дашачка, Юра, Віталік, ідзіце сюды...

І ён паказаў, з якога боку лепш падыходзіць да яго.

Віталік, як старэйшы, пайшоў першы... Ішоў ён, ціха і асцярожна ступаючы якраз туды, куды паказваў дзед. Даша з Юрачкам ішлі след у след, прадчуваючы нешта цікавае, невядомае.

Калі дзеці наблізіліся, дзед Мацвей прыклаў пальцы да вуснаў, маўляў, ні гуку, і рукою паказаў стаць усім за яго спіною. Дзеці паслухаліся.

— Глядзіце туды,— ледзь чутна сказаў дзед, а сам усё вышэй і вышэй падымаў шланг.

Дзеці пачалі ўглядацца. Сонца, якое хілілася да захаду, асвятляла пырскі, і яны здаваліся прыгожымі рознакаляровымі крышталікамі.

Дзед Мацвей не маўчаў.

— Глядзіце, глядзіце,— ледзь не шаптаў ён і вачыма клікаў дзяцей сачыць за струменьчыкам вады, які ён накіроўваў у самую гушчэчу.— І не варушыцеся! — Сам дзед стаяў нерухома на адным месцы, толькі ледзь-ледзь то падымаў, то апускаў шланг, асцярожна трымаючы яго ў руках.

— Ой,— войкнуў Юрачка.

— Ш-ш, ціха,— шыкнуў на яго дзед.

І раптам Даша і Віталік таксама ўбачылі на галінцы варухлівую маленькую-маленькую птушачку-камячок. Яна імгненна паварочвалася то адным, то другім бокам, падстаўляючы пад пырскі вады ўсю сябе. Крыльцы яе трапяталіся, галоўка круцілася, ножкі ажно танцавалі. Ва ўсім гэтым была такая радасная здаволенасць ад купання, што дзіва-птушачка нікога не заўважала.

Але вось птушачка зляцела ўніз, жвава крутанулася перад дзедам і борздзенька падалася ў суседні з вёскаю лес.

Дзед зірнуў на ўнукаў і радасна ўсміхнуўся.

— Бачыце,— сказаў ён,— пакупалася ў мяне, падзякавала і паляцела. Гэта ж ад такой пякельнай спёкі ўсе ручайкі і рэчачкі ў наваколлі перасохлі... Дзе ж ёй, беднай, калі не ў мяне, асвяжыцца, бадзёрасці займець...

## ЖЫВІ САБЕ, ЗАЙЧЫК!

Мінулым летам мы з таткам ездзілі да дзеда ў вёску. Дзедава хата стаіць пры самай вуліцы. Хто ні праходзіць — нам відаць.

Неяк самымі прыцемкамі вуліцаю прайшла з пашы калгасная жывёла, а следам за ёю павольна ішоў пастух, камлюкаваты дзядзька Ігналь. Ідзе ды нешта шэранькае трымае на руцэ, да грудзей прыхінае.

Углядаемся мы з дзедам праз акно і нічога не можам разабраць.

— Ці не зайчыка пастух злавіў? — падаў думку дзед.

Тут я бягом кінуўся да Ігналя, а следам за мною Надзейка, мая меншая сястрычка. А Ігналь спыніўся так паважна сярод вуліцы, шарачка да грудзей туліць ды пяшчотна так гладзіць яго.

— Ой, які прыгожанькі... Маленькі... Глядзі, Алесь! — радасна кажа мне сястра.

— Магу падарыць,— усміхаецца Ігналь.

— Дзякуй вам! — Надзейка кінулася да шэранькага, ды пастух не адразу аддаў зайчыка.

— Падару, але з адною ўмоваю, каб вы яго вылечылі. У зайчыка хворыя заднія лапкі. Нейкі злачынца падбіў яго... Летам на зайца паляваць забаронена, а той страляў, мабыць. Зайчыку цяпер асаблівы догляд патрэбен. А мне самому часу няма... Бярыце...

І дае мне ў рукі шэранькі камячок. Я асцярожна ўзяў яго, прыціснуў да грудзей, як рабіў пастух, і панёс на двор.

Зайчык утуліў галаву, палажыў на спіну доўгія вушы і толькі вусікамі паводзіць ды вочкамі міргае, а сэрца яго так калоціцца, што, здаецца, вось-вось выскачыць.

Дзед выйшаў нам насустрач, усміхаецца. Таксама, відаць, рады, што мы зайчыка нясём.

— А дзе мы яго будзем трымаць, дзядуля? — спытала Надзейка.

— Пачакайце, зараз што-небудзь прыдумаем.

Ён пайшоў пад паветку і прынёс адтуль вялікую скрынку з дзірачкамі па баках. Туды мы і пусцілі нашага зайчыка. Потым пабеглі,

нарвалі канюшыны, маркоўніку, адламалі некалькі капусных лістоў. Зайцы ж вельмі любяць капусту. Палажылі ўсё гэта ў скрынку, а заяц і ўвагі не звяртае.

— Ён хворы, яму малачка трэба,— сказала Надзейка і пабегла ў хату, прынесла адтуль сподак. Тата, які дагэтуль толькі наглядаў за намі, прынёс паўшклянкі свежага малака.

Налілі малако ў сподак, паставілі ў скрынку. Зайчык ані блізка да яды. Адварочваецца ды шчыльней у куточак туліцца, вусамі толькі паводзіць. Адыдзем мы крыху, дык ён спрабуе ўзняцца на пярэднія лапкі, а заднія толькі валакуцца.

Тады тата ўзяў шарачка за вушы ды пыскаю — у малако. Выходзіць, гэтага толькі і не ставала. Зайчык аблізнуўся раз, другі, нахіліўся сам да малака і языком «клёк-клёк...».

Узрадаваліся мы:

— Калі п’е — будзе і есці...

— Ну, не трэба яго турбаваць. Няхай адпачывае,— сказаў дзед і занёс скрынку з зайчыкам у клець.— Там яму зацішней будзе.

Цяпер у нас з Надзейкай з’явіліся свае клопаты: як прачнёмся, дык адразу да зайчыка ў клець. То малака занясём, то капусных лістоў. Зайчык перастаў нас баяцца: есць папоўніцы, але чамусьці дрыжыць пры гэтым, быццам баіцца ці куды спяшаецца.

Мінула больш за тыдзень, і я заўважыў, што зайчык наш пачаў ачуньваць. Як няма нікога, стане асцярожна на заднія лапкі і барабаніць пярэднімі па сценцы. Падыдзе хто — ён зноў у камячок згорнецца і схаваецца адразу ў куточак.

...Учора вечарам мы сустрэліся з дзедам у клеці.

— Ну, папраўляецца шарачок. Што ж вы далей будзеце рабіць з ім?

Я і сам не ведаў, што рабіць. І раптам вырашыў:

— Выпушчу, як зусім паправіцца.

— Правільна зробіш,— згадзіўся дзед,— няхай гуляе пасля папраўкі на волі...

Зайчыка збіраліся глядзець штодзень усе суседскія хлопчыкі і дзяўчынкі. Але вельмі блізка да яго мы з Надзейкай нікога не падпускалі.

Я да таго звыкся з шарачком, што аднойчы пачаў прасіць тату ўзяць яго з сабою ў горад. Хацеў сябрам паказаць... А Надзейка дык і слухаць не хацела, што з зайчыкам давядзецца развітацца.

І вось неяк раніцой прыйшоў я да зайчыка. З харчамі. Зірнуў у скрынку — няма шэрага. Няма паблізу і дзеда. А калі я ўваходзіў у клець, яна была ўжо адамкнёна. Значыць, нехта тут ужо быў. А ключы ж толькі ў дзеда. Убачыўшы яго пад паветкай, я кінуўся да дзядулі са слязамі:

— Няўжо наш зайчык уцёк?

— Не, ён гойсае ў клеці па засеку,— адказаў дзядуля. Потым падышоў бліжэй да мяне, ласкава крануў за плячо і спытаў:

— Можа, выпусцім?

— Давайце, пакуль Надзейка спіць, менш слёз будзе,—згадзіўся я.

І выпусцілі мы зайчыка ў агарод... З якой радасцю пабег ён, толькі — кульгець-кульгець...

Жыві сабе, зайчык!

### АДДАЙ ПРЫВІТАННЕ

Часта Дашына бабуля ходзіць у госці да старэйшай дачкі. А як вяртаецца дадому, заўсёды мае ў сумцы пакуначак з цукеркамі ці яшчэ з якімі прысмакамі — для Дашы.

Дзеду бабуля кажа:

— Прывітанне табе ад старэйшых унукаў.

— А мне? — пытае Даша.

— І табе прывітанне ад Зойкі і Марынкі.

— То давай яго хутчэй! — патрабуе Даша.

### ПАДЗЯКА

Да прыпынку падышоў аўтобус. Дзіма разам з маці зайшоў праз пярэднія дзверы. На першых крэслах сядзелі маладыя людзі. Яны адразу ж усталі, каб даць месца Дзіму і яго маці.

Аўтобус крануўся. Праз два ці тры прыпынкі ў аўтобус зайшла бабуля. Дзіма хуценька ўсхапіўся з крэсла, каб села бабуля.

— Дзякуй табе, унучак,— сказала тая і села.

Калі даехалі да свайго прыпынку і выйшлі з аўтобуса, Дзіма спытаў:

— Мама, а за што кажуць дзякуй?

— За ўсе добрыя справы, за павагу да людзей,— адказала маці.— І табе бабуля падзякавала за тое, што ты ёй, старэнькай, месца ўступіў.

Дзіма заўсміхаўся. Яму ўпершыню сказалі дзякуй.

## АЛЕНА ВАСІЛЕВІЧ

Алена Сямёнаўна Васілевіч нарадзілася 22 снежня 1922 г. у засценку Даманшчына (цяпер вёска Ліпнік) Слуцкага раёна Мінскай вобласці. На восьмым годзе жыцця засталася без бацькоў, выхоўвалася ў сваякоў. Пачатковую адукацыю атрымала ў роднай вёсцы, сямігодку закончыла ва Урэччы. Вучылася ў Слуцкім педвучылішчы, закончыла Рагачоўскі настаўніцкі інстытут (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ў эвакуацыі ў Арэнбургскай вобласці, працавала ў калгасе, потым бібліятэкарам у шпіталі, пісарам у воінскай часці. Уражанні тых гадоў знайшлі сваё адлюстраванне ў апавяданнях, што змешчаны ў кнізе «Пісар страявой часці» (1969). У 1943 г. пераехала ў Харкаў, а ў 1944 г. вярнулася ў Беларусь. У 1946 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, потым працавала літаратурным кансультантам у Курскім абласным выдавецтве (1946—1950). У 1950 г. пераехала ў Мінск і пачала працаваць загадчыкам аддзела культуры часопіса «Работніца і сялянка», потым — загадчыкам рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтваў «Мастацкая літаратура» (1972—1981) і «Юнацтва» (1981—1982).

Шлях у літаратуру для А. Васілевіч пачаўся ў 1947 г., калі часопіс «Беларусь» надрукаваў яе першую аповесць «У прасторах жыцця». Неўзабаве яна піша другую аповесць «Шляхі-дарогі» (1950), у якой расказваецца аб вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і аднаўленні разбуранай вайной гаспадар-

кі. Плённа працуе А. Васілевіч у жанры апавядання, адрасуючы многія са сваіх твораў юнаму чытачу. Адна за адной выходзяць кнігі апавяданняў «Блізкія знаёмыя» (1954), «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958), «Апавяданні» (1959), «Падслухала сэрца» (1960), «Калінавая рукавічка» (1963), «Я з вамі» (1964), «Адно імгненне» (1975). У 1977 г. выйшаў зборнік апавяданняў і аповесцей «Мыс Добрай Надзеі», а ў 1985 — кніга апавяданняў «Шурка Рэмзікаў». Значным дасягненнем сучаснай літаратуры для юнацтва стала тэтралогія «Пачакай, затрымайся...» (1972), якую складаюць аповесці «Расці, Ганька» (1966), «Доля знойдзе цябе» (1968), «Новы свет» (1970), «Пачакай, затрымайся...» (1972). За тэтралогію ў 1976 г. А. Васілевіч прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. У 1986 г. выйшла кніга «Люблю, хвалююся — жыву», у якой пісьменніца дзеліцца роздумам аб жыцці і літаратуры.

## КАЛІНАВАЯ РУКАВІЧКА

Чаму рукавічка, калі казка будзе пра чырвоную каліну, пра старую яліну-казачніцу, пра ветра-бяздомніка?

А вось паслухай.

Расла на ўзлессі каліна. Была, была ўсё маленькай ды раптам, зусім неяк непрыкметна, вырасла. Зацвіла белым цветам, закрасавала — на дзіва і зайздрасць усім суседнім дрэвам.

— Ф-фарсуха,— пазіраючы на яе, аж трэсліся ў лажку асіны. Яны былі заўсёды бледныя і зялёныя, і заўсёды ім было холадна.

— Падумаеш, выстраілася,— шапталі хмурыя яліны. Яны насілі цёмнае адзенне і размаўлялі толькі шэптам.

Учэпістыя калючыя дубкі, што раслі на схіле пагорка, таксама непрыхільна паглядалі на маладую каліну: яна зусім не звяртала на іх увагі.

Толькі старая яліна-казачніца спачувальна пазірала на каліну-прыгажуню і жаласнаківала галавой:

— Пацвіце, пакрасуецца ды і завяне. Не яна першая, не яна апошняя... Па лесе гуляе бура, ломіцца грубая жывёла, чалавек ходзіць... А ў яго нядобрыя рукі. Ён ломіць і крышыць усё, што ні стрэне на дарозе...

Яліна-казачніца пражыла доўгае жыццё і ўсяго нагледзелася за свой век.

Нарадзілася яна ў гэтым лесе даўным-даўно. Яшчэ да пажару. Тады тут жыла і яе маці, маладая стромкая яліна, і бабуля, гэтакая ж, як яна сама цяпер, згорбленая і пахмурая... А потым па лесе прайшоў пажар. Цэлы тыдзень, схапіўшыся загрудкі з агнём, змагаўся лес супраць смерці. Цэлы тыдзень агонь нішчыў лясны род. Згарэла маладая прыгожая яліна-маці, згарэла старая бабуля. Не засталося нікога ні з радні, ні з суседзяў. Нейкім цудам уратавалася ў гэтым пекле толькі яна — маладзенькая ялінка. Пажар не абмінуў і яе, але яна выжыла. Сагнулася на адзін бок, пакалечаная, але ўсё-такі жыла!

Мінуў год, за ім другі — і на пажарышчы пачалі адскакваць маладыя вясёлыя бярозкі, палез сям-там ельнік, пайшла ўсякая лясная драбяза.

Мінула яшчэ некалькі гадоў, і вялікае лясное няшчасце, як і ўсё на свеце, пачало забывацца...

Вось чаму яліна-казачніца была самай старэйшай і самай мудрай у гэтым лесе.

Цэлымі днямі пагойдвалася яна ды моўчкі прыглядалася да лясного жыцця: як трымаюцца і пра што вядуць гутарку маладзейшыя дрэвы, аб чым пяюць птушкі, куды лятае вецер-бяздомнік... Прыглядалася, прыслухоўвалася і ўсё шаптала сабе нешта, усё нешта шаптала...

А ноччу, калі ў лесе рабілася цёмна, хоць выкалі вока, да яліны-казачніцы прылятала старая сава. Днём яна спала, а ноччу гойсала па лесе, шукала сабе спажывы.

— Гэта ты, паўночніца,— незадаволена сустракала яе яліна,— не люблю я тваіх сквапных вачэй... Усе кругом спяць, а ты ўсё шнырыш, усё шнырыш па лесе.

— Я днём выспалася,— пазяхала сава,— а ноччу ў мяне паляванне: дзе дурное соннае зайчаня схаплю, дзе на мышыную сям'ю натраплю. Ху-ху-ху!

— Зладзейка ты...

— Ху-ху-ху! — зноў на самае вуха старой яліне рагатала сава.— Ты вельмі добрая...

І — мах-мах крыламі — знікла ў цемры.

— Паляцела...— бурчала ўслед ёй яліна-казачніца, пільна прыслухоўваючыся да шолаху ў вавёрчынай хаце.

Вавёрка жыла па суседству з ялінай у цёплым асінавым дупле. Яна была свавольніца і балаболка. Але старая яліна паважала вавёрку за працавітасць і спрыт.

Усё лета рыжым полымем гойсала яна з дрэва на дрэва. Быццам нельга было прыдумаць іншага занятку. Але варта было толькі азваца недзе яшчэ зусім далёка восені, як вавёрка кідала гульні і бралася за работу. Рамантавала сваю хату. Высцілала яе цёплым мохам. Заканапачвала ўсе дзірачкі. Потым з ранку да вечара насіла ў свой свіран смачныя лясныя арэхі. Не прысядала ні на хвіліну...

Старая яліна толькі дзівілася: адкуль у вавёркі столькі сілы, каб цэлымі днямі цягаць гэтыя ношкі? І сама не вытрымлівала. Набярэ поўны прыпол духмяных зярністых шышак і высыпле вавёрцы.

— На вось табе. Будзеш зімой лускаць і дзякаваць бабулі-яліне.

— Дзякуй, дзякуй, бабулечка. Яны такія смачныя, такія смачныя,— дзякавала вавёрка, набіваючы да столі засекі ў сваім свірне.

І зноў: цок-цок — зноў рыжай маланкай мільгала ў суседнім арэшніку.

Ого, вавёрка была вельмі дбайная, вельмі руплівая гаспадыня. Пра гэта не раз гаварыла старая яліна і дзятлу-бондару і зязюлі-мачысе.

— Паглядзі, як трэба пра дом клапаціцца ды пра дзяцей: і каб цёпленька ім было, і каб смачненька. А ў цябе, матухна, паслухай, як плачуць дзеці,— дакарала яна зязюлю.

І сапраўды, у лясным гушчары, дзесьці далёка-далёка, чутно было адзінокае жаласнае ку-ку...

— Няхай не лётаюць гэтак далёка, дык і блудзіцца не будуць, няхай дома сядзяць...— адмахвалася ад папрокаў зязюля.

— Дома,—ківала галавой яліна.— Дома... Які ж у іх дом? Вунь ты падкінула іх да мухалоўкі... Ну гадуе яна іх, ну корміць. Але ж не родная маці. Смачнейшага чарвячка яна аддасць не тваім дзецям, а сваім...

— Не твая справа,— не жадала слухаць яліну зязюля,— усюды ты свой нос уткнеш...

— Ага, не хочацца слухаць праўду. Горкая яна...— казала ўслед зязюлі яліна і, крыху памаўчаўшы, ужо дакарала дзятла:— А ты чаму такі дурны? Вучыўся б вось у ваверкі. Глядзі, што ёй абыходзіць... Адамкнула свіран, нагрэбла арэхаў ці шышак, і гора ёй мала. Сядзіць сабе ў цяпле, ласуецца. А ты штодня з гэтым сваім долатам па лесе лётаеш. А ці многа ім заробіш, калі холад гэткі і дзень — не згледзіш, як ён і праміне...

Дзяцел-бедалак і праўда — зіма не зіма, холад не холад — дзень пры дні павінен зарабляць сабе на пражытак.

— Ат, цётачка, колькі мне чаго трэба,— звычайна адказваў ён старой яліне.— Дзяцей я пагадаваў. Старая мая, вы ж самі ведаеце, яшчэ леташняй зімы не перазімавала... Дык колькі мне аднаму трэба... От жа пражыву неяк зіму. Балазе, кажух цёплы маю.

— Так, так, дзіва што пражывеш,— незадаволена бурчала яліна.

Як і ўсе старыя, яна не любіла, калі з ёю не згаджаліся.

Яна змаўкала, збіраючыся крыху падрамаць. Але тут налятаў халодны сівер. Ён трос яе, выкручваў скурчанае ад старасці і холаду голле і ўзнімаў такі свіст і трэск, што спуджаная ваверка зашывалася ў сваё дупло і не дыхала, быццам яе там і не было.

— Шалёны,— адмахвалася старая яліна,— адкуль цябе прыгнала!

— Ой, цётухна, адкуль прыгнала, не пытай. Скажы лепей, куды гоніць! — рагатаў вецер.

— Ведаю ўжо... Ляці сваёй дарогай, шыбенік.

Сівер узмахваў доўгім расхлістаным халатам, перакручваўся некалькі разоў у паветры і імкліва знікаў.

— Ох, скруціць ён галаву гэтай дурной каліне! Вунь як яна хіліцца, ледзь не да самай зямлі яму кланяецца...

Старой яліне з узгорка было добра відаць усё, што рабілася на ўзлессі.

І сапраўды, маладзенькая каліна яшчэ больш чырванела і харашэла, сустракаючы ветра.

— Ляцім са мною па свеце! — шаптаў ёй вецер-сівер.— Што ты тут бачыш, стоячы вунь ужо колькі год усё на адным месцы, усё пры гэтай дарозе?

— Людзі тут ходзяць і ездзяць...

— «Людзі ходзяць і ездзяць...» Дурная ты! Ты паслухай, што кажа пра гэтых людзей старая яліна. Яны загубяць цябе, паламаюць твае рукі... А ягады твае — навошта яны ім!

— Не кажы так. Мае ягады лечаць людзей... У цябе няма сэрца, і ты не ведаеш, як гэта цяжка, калі яно баліць. А людзі ўмеюць варыць з маіх ягад лекі і лечаць імі сэрца...

— «Людзі», «Лекі»... Навошта яны табе здаліся! Мы з табой

паляцім за мора, паляцім да такіх высачэзных гор, якіх ты і не сніла ніколі. І ты тады забудзеш пра гэты свой лес, пра гэтую дарогу, на якую ты дзень і ноч глядзіш, як утрапёная.

— І ніколі больш не вярнуся сюды?

— А чаго?

— Не, я не здолею... Я высахну і памру без свайго лесу,— плакала каліна.

— Ну, дык і заставайся тут! А мне няма часу з табой валаводзіцца. Не спадзявайся, каб я яшчэ лятаў да цябе...

Вецер-сівер узмахваў сваім халатам, пранізваў каліну смяротэльным холадам. Каліна калацілася, дрыжала, і на зямлю чырвонымі ягадамі сыпаліся яе горкія слёзы.

— Пачакай, не пакідай мяне адну!..— стагнала яна наўздагон ветру.

Але вецер ужо не чуў яе.

* * *

А калі настала зіма і ў лесе не было ўжо ніводнага зялёнага лісціка, ніводнай кветачкі, ішла гэтай самай дарогай, каля якой расла каліна, жанчына з маленькім хлопчыкам.

— Мамачка! — закрычаў хлопчык і запляскаў у далоні.— Зірні, зірні — ягады!

Яны спыніліся.

— Гэта каліна, сынок. Бачыш, якая яна: зіма, мароз, а яна не баіцца...

— Можна сарваць?

— Толькі асцярожна. Не паламі галінак.

Хлопчык ірваў чырвоныя калінавыя ягады, клаў іх у сваю рукавічку і пяшчотна прыгаворваў:

— Не бойся, калінка-малінка. Мае ручкі не злыя. Галінак тваіх не паломяць, вершалінкі не скрышаць. Толькі ягадкі сарвуць — маме на лякарства...

Так ён прыгаворваў і ўсё клаў і клаў у сваю рукавічку чырвоныя ягады. І каліна радавалася: ашукваў яе вецер, і яліна-казачніца памылялася. Добрыя ў чалавека рукі, разумныя...

Вось і канец гэтай лясной казцы. Той маленькі хлопчык захацеў назваць яе казкай пра калінавую рукавічку.

Ну што ж: няхай сабе рукавічка, няхай сабе калінавая...

## ДОЛЯ ЗНОЙДЗЕ ЦЯБЕ

*(Урыўкі)*

### ЛЕНІНАВА ДЗЯРЖАВА

— Ну, а тваё прозвішча як? — паказвае на Ганьку настаўнік. Сам ён сядзіць на табурэтцы за сталом і запісвае ўсіх дзяцей у тоўсты шэры журнал.— Падыдзі да стала і скажы нам усім.

Прозвішча?.. Ганька не ведае. Яна ведае сваю «фамілю»: Гурновіч. Ганька Гурновіч. А прозвішча ў яе няма.

— У мяне няма...— так яна адказвае і настаўніку, баючыся зірнуць яму ў вочы: раптам ён раззлуецца, што яна без прозвішча, ды возьме адправіць яе дадому.

— Няма?.. Як няма?

— У мяне фаміля...

— А-а...— кажа настаўнік.

— У яе няма прозвішча! У яе фаміля-аміля! — раздаецца на ўвесь клас смех нейкага хлапчука з задняе парты.

Ганька ад сораму і гора гатова праваліцца скрозь зямлю: ва ўсіх дзяцей ёсць прозвішча, а ў яе няма.

— І няма нічога смешнага,— строга спыняе таго, хто смяецца з Ганькі, настаўнік.— Яна сказала па-руску: «фамілія»... А па-беларуску будзе «прозвішча». Усе вы, дзеці, ведаеце? — звяртаецца да класа настаўнік.

— Усе-э...— няпэўна гудзе некалькі галасоў.

— Ну, а калі ведалі і не ўсе, дык цяпер будзеце ведаць. І ты будзеш, Ганька, ведаць, што тваё прозвішча Гурновіч?

Ганька моўчкі ківае галавою: буду ведаць...

— Вось і добра.

Настаўнік зусім не злуецца, і Ганька смялее і ўзнімае на яго вочы. Ого, яна пазнала яго адразу: гэта ж ён з камсамолкай Аўдоццяй прывозіў на возе да іх у засценак пастаноўку... Але яна, вядома, не кажа пра гэта.

— А як завуць твайго бацьку? — далей пытаецца ў Ганькі настаўнік.

Ганька маўчыць зноў.

— Бацьку твайго як завуць, Ганька? — паўтарае настаўнік.

— У мяне няма...

— У яе нічога няма! І прозвішча няма, і бацькі таксама няма! — зноў заходзіцца ад смеху на задняй парце той самы хлапчук. Ганька не бачыць яго твару, аднак усёй сваёй істотай адчувае, што ён нядобры і злы.

Тое ж самае кажа і настаўнік:

— Жук Іван, устань!

Хлапчук устае. І цяпер Ганька бачыць яго круглы, як рэпа, твар.

— Брыдка і нядобра смяяцца з таго, у каго няма бацькі ці маці.— Голас настаўніка строгі, і сам ён строгі.— І той, хто гэта робіць,— кепскі чалавек, дрэнны таварыш... А вы ўсе, дзеці, прыйшлі ў школу вучыцца быць добрымі людзьмі і быць добрымі таварышамі... І табе, Жук, брыдка! Ты ў класе самы большы. Сядай!

Жук Іван чырванее і робіцца што бурак.

— А вы, дзеці, самі як думаеце, кепска ці не крыўдзіць таварыша? — устае з табурэткі і звяртаецца да ўсяго класа настаўнік.

— Кепска-а-а! — у адзін голас выносіць свой прысуд злу клас.— Кепска. Вельмі кепска.

— А вось гэта табе, Ганька, сшыткі і альбом для малявання.

Буквары, задачнікі і па алоўку настаўнік дае ўсім дзецям. А вось сшыткі і альбом дае з усяго класа Ганьцы першай.

Ганька і рада, яна і не адважваецца браць іх. За гэта ж усё, мусіць, настаўніку трэба заплаціць. А ў яе няма грошай.

— Бяры, бяры, Ганька,— мусіць, здагадаўшыся, што трывожыць яе, падахвочвае Ганьку настаўнік і тут жа звяртаецца да класа: — Падніміце, дзеці, рукі, у каго з вас яшчэ няма бацькі ці маці.

У класе паднімаецца некалькі рук.

— Вам, як і Ганьцы, я таксама дам сшыткі і альбомы. Дам без грошай, бо іх купіла вам школа за грошы, што прыслала дзецям-сіротам наша дзяржава... А хто з вас, дзеці, ведае, якая наша дзяржава, як яна завецца? — далей пытаецца ў класа настаўнік, разносячы сшыткі і альбомы для малявання тым вучням, у каго няма бацькоў.

Клас перашэптваецца, пераглядаецца, але маўчыць. Ніхто не ведае. Не ведае і Ганька. Яна ўсё яшчэ не выпускае з рук багацця, падараванага ёй настаўнікам... На ружовых вокладках сшыткаў намаляваны Ленін. Ён у кепцы, у камізэльцы (у дзядзькі Мікалая таксама ёсць такая камізэлька, толькі ў дзядзькі старая — яшчэ амерыканская), у чаравіках... Ганьцы здаецца, што Ленін глядзіць проста на яе, проста ёй у вочы глядзіць, як бы яна ні павярнула сшытак.

— Ніхто не ведае, дзеці? — паўтарае сваё пытанне настаўнік.

Пра дзяржаву не ведае ніхто.

— А хто быў наш самы вялікі правадыр?

Правадыра Ганьчын клас ведае... Як жывы, прыжмурыўшыся ў добрай усмешцы, глядзіць ён са сцяны, з партрэта ў рамцы, абвітай вянком дзеразы.

— Ле-э-нін! — дружна адгукваецца настаўніку клас.

— Ленін! — не адстае ад класа і Ганька.

Правадыра-то ведае яна даўно! Яшчэ як мама жыла і вучыла яе чытаць. Тады яшчэ Ганька вывучыла ў календары, што вісеў на сцяне ў цёткі Іваніхі: «Ленін — вялікі правадыр рабочых і сялян...»

— Малайцы, дзеці! — хваліць настаўнік.— Правільна, правадыр наш Ленін. А дзяржава наша завецца...

— Ленінава дзяржава!..— не дае дагаварыць настаўніку, першы здагадваецца і выгуквае на ўвесь клас Жук Іван.

— Правільна, Жук Іван,— цяпер ужо хваліць і яго настаўнік.— Дзяржава наша, дзеці, таксама ленінская, Савецкая дзяржава.

Ганька аглядваецца на Жука Івана: можа, ён ужо і не такі благі, калі адзін з усяго класа адказаў на настаўнікава пытанне. Яна ж не адказала...

У гэты час на калідоры чуецца залівісты голас званка. Ганька ўздрыгвае ад неспадзеўкі, хіба ўжо скончыўся ўрок?

Урок скончыўся. Настаўнік загортвае журнал.

— А цяпер, дзеці, ідзіце на перапынак. Пагуляйце, пабегайце на двары,— дазваляе ён,— а на другім уроку мы з вамі зноў будзем вучыцца.

І Ганьчын клас бяжыць на перапынак.

## ЧАЙ

Чай — гэта перш-наперш вялізныя, аж сіняватыя — такія белыя драбы цукру! Цукар ляжыць гарой у глыбокай талерцы. Талерка стаіць на століку ў чайной (так завецца маленькі пакой, дзе гатуюць чай). Трэба, не штурхаючыся, падысці да століка і ўзяць з талеркі адзін дроб. Толькі адзін. (Вядома, лепш пацэліць большы...) Потым тут жа, з яшчэ большай, толькі жалезнай, талеркі (яе завуць падносам) належыць узяць лусту пірага. Белага, пшанічнага, гэткага, якія пякуць толькі на вялікдзень! (На каляды нават такіх пірагоў не пякуць.) Пасля цукру і пірага ідзе «сам» чай: вялікая бляшаная конаўка з малюнкамі птушак, кветак і дрэў... Конаўку гэту з ручкай трэба ўзяць з другога стала — большага, дзе стаіць мо сто ці тысяча гэткіх конавак з гарачым чаем.

У чайной суцішаны смех, шэпт, таўхатня. Нехта некаму наступіў на нагу, нехта абліўся і апёк рукі гарачым чаем. Нехта, баючыся заплакаць уголас, плача ціхенька, шмыгаючы носам...

— Не спяшайцеся, дзеці. Не трэба штурхацца. Усе паспееце, усім хопіць... Перапынак у нас вялікі. Гэта наш абед.

Настаўнік і цётка Мар'я — прысадзістая, у шырокай спадніцы і квятастай кофце — памагаюць дзецям разабрацца з цукрам, з пірагом, з чаем.

— Не штурхайцеся, дзеткі. Не пхайцеся. Памаленьку,— стрымлівае дзяцей цётка Мар'я.

І калі нарэшце ўсё разбіраецца, зноў усім класам варочаюцца і садзяцца кожны за сваю парту. У чайной цесна, а спецыяльнага пакоя для абеду няма — таму «чай» будзе ў класе.

— Жук Іван, а ты чаму не п'еш чаю? — пытаецца настаўнік. Ён на вялікім перапынку не ідзе ў той пакой, дзе адпачываюць настаўнікі. Ён прысутнічае на «чаі».

— А я ўжо выпіў.

— А цукар з пірагом у цябе чаму ляжаць?

— Цукар?.. Цукар з пірагом я занясу Маньцы. Яна хворая.

— Гэта твая сястра?

— Угу... Малая.

— Ну што ж,— памаўчаўшы, кажа настаўнік,— ты добры брат. Калі сястра хворая — занясі ёй. А сам чай з цукрам і пірагом вып'еш заўтра.

Настаўнік сядзіць за сталом, чытае кніжку і, рэдка адрываючыся ад чытання, нібыта між іншым, гаворыць класу, занятаму ядой і чаем.

— Я ведаю, дзеці, аднаго такога чалавека, які ў вельмі цяжкі час... У вельмі галодны час...— Настаўнік гаворыць паволі, падбіраючы словы,— калі яму людзі, якія пра яго вельмі клапаціліся і любілі яго, і шкадавалі яго... Калі, кажу, людзі прыслалі гэтаму чалавеку вельмі смачныя рэчы: і цукар, і рыбу, і масла... Ён адмовіўся і нічога, ні кавалачка, не ўзяў сабе.

— І нічога не паспытаў нават? Нават цукру?..— моцна, на ўвесь клас, дзівіцца з задняе парты Жук Іван. Ён другагоднік і таму самы смелы ў класе.

— Нічога не паспытаў. Ні драбочка нават! Наадварот. Гэты чалавек загадаў усю тую смачную яду, якую яму прыслалі тыя людзі, ён загадаў аддаць... пераслаць дзецям. Дзецям-сіротам, якія не мелі бацькоў і жылі ў дзіцячым доме... Чалавек той ведаў, што дзеці галодныя, што ў іх няма ўдоваль нават хлеба. А ён хацеў, той чалавек, каб дзеці ніколі не былі галодныя... Гэта было адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. І чалавек той быў...

Настаўнік робіць вялікую паўзу і паварочвае галаву да партрэта на сцяне.

— Ленін! — адразу здагадваецца клас.

— Правільна, дзеці. Уладзімір Ільіч,— святлее тварам настаўнік.— Вось бачыце, мы з вамі сёння ўжо і навучыліся. Вось вы ўжо і ведаеце... І ты, Жук Іван, вельмі добра зрабіў, што ўспомніў пра сваю хворую сястру. І ўсе вы, дзеці, заўсёды павінны памятаць і павінны рабіць дабро таму, каму кепска, каму трэба помач. Як памятаў пра гэта заўсёды і ніколі не забываў...

Ганька жахаецца: дык няўжо ж і гэты Жук Іван, як Ленін?.. А яна сама — ці пакінула б яна гэты свой дроб цукру і кавалак пірага (дарэчы, ні цукру таго, ні пірага ў яе ўжо і следу не засталося)... Ну каму? Цётцы Фядоры, Валі, Ціму?.. Ганька вагаецца, пакутуе ў думках і ўсё ж мусіць сама сабе прызнацца: не, цётцы яна не пакінула б. І Ціму і Валі таксама не пакінула б... Вось Кордзю (калі ён захварэе...) яна пакіне абавязкова! І сёстрам сваім — Сашы, Анюце і Ніне, хоць яна і не жыве ў іх,— яна таксама пакінула б паспытаць...

А ўвесь дроб цукру яна пакінула б толькі маме. І больш нікому!

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

Ніл Сямёнавіч Гілевіч нарадзіўся 30 верасня 1931 г. у вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сямігодкі ў вёсцы Гайна працаваў калгасным паштальёнам (1945—1947). Вучыўся спачатку ў Мінскім педагагічным вучылішчы (1947—1951), сумяшчаючы вучобу з працай настаўніка пачатковых класаў у адной з школ Мінска, потым — на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, пасля заканчэння якога (1956) займаўся ў аспірантуры пры ім. Працяглы час (1960—1981) працаваў на кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна. З 1980 г.— першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, з 1981 г.— сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Першыя вершы Н. Гілевіча былі надрукаваны ў 1946 г. у часопісе «Бярозка». У 1957 г. выйшла першая кніга паэзіі «Песня ў дарогу». Затым з'явіліся кнігі лірыкі «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959), «Неспакой» (1961), «Бальшак» (1965), «Перазовы» (1967), «Лісце трыпутніку» (1968), «А дзе ж тая крынічанька?» (1972), «Запаветнае» (1975), «Актавы» (1976), «Святлынь» (1984), «Повязь» (1987). У 1985 г. выйшаў раман у вершах «Родныя дзеці». Выдадзены таксама зборнікі сатыры і гумару «Званковы валет» (1961), «Да новых венікаў» (1963), «Ці грэх, ці 2» (1970), «Як я вучыўся жыць» (1974), «Русалка на Нарачы» (1974), кніга п'ес «Начлег на буслянцы» (1979).

Значнае месца ў творчасці Н. Гілевіча займаюць творы для дзяцей. Ён з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў «Сцяжок на мачце» (1959), «Зялёны востраў» (1963), «Дождж-грыбасей» (1966), «Калі рана ўстанеш» (1983), «Добры чалавек» (1987). Асаблівай папулярнасцю ў дзяцей карыстаюцца загадкі паэта, што ўвайшлі ў зборнікі «Сіні домік, сіні дом» (1961) і «Загадкі» (1971). Вучням старэйшага школьнага ўзросту адрасаваны зборнік вершаў і паэм «Як дрэва карэннем» (1986).

Паэтычную дзейнасць Н. Гілевіч плённа спалучае з працай у галіне мастацкага перакладу. У перакладах на беларускую мову выйшлі анталогіі сучаснай і класічнай балгарскай паэзіі «Ад стром балканскіх» (1965), «Хай зорыць дзень!» (1973), «Сто гадоў. Сто паэтаў. Сто песень» (1978), кніга паэзіі для дзяцей «Чарадзейны ліхтарык» (1968). За перакладчыцкую дзейнасць урадам Народнай Рэспублікі Балгарыі Н. Гілевіч у 1966 г. узнагароджаны ордэнам Кірыла і Мяфодзія 1-й ступені. Паэт перакладае таксама з рускай, украінскай, славенскай, сербахарвацкай, польскай, лужыцкай і іншых славянскіх моў.

Н. Гілевіч з'яўляецца ўкладальнікам і рэдактарам шэрагу фальклорных зборнікаў, выдаў некалькі навуковых прац па беларускай фалькларыстыцы: «Наша родная песня» (1968), «З клопатам пра песні народа» (1970), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975), «Паэтыка беларускіх загадак» (1976). Н. Гілевіч — аўтар кнігі «Акрыленая рэвалюцыяй: Паэзія «Маладняка» (1962), зборнікаў літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў «У гэта веру» (1978), «Удзячнасць і абавязак» (1982), «Покліч жыцця і часу» (1983), манаграфіі аб балгарскай паэзіі «Верная вялікім запаветам» (1977).

За кнігу «У добрай згодзе» (1979) і шматгадовую перакладчыцкую дзейнасць паэт удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1980).

## КАЗАЧНАЯ ЗЯМЛЯ

Я — беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я — беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма!

Я — беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля.

Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!

Я — беларус, і я клянуся,
Што пад сцягамі з кумача
Я ні на крок не адступлюся
Ад запаветаў Ільіча!

## ДОБРЫ ЧАЛАВЕК

Як слаўна, як хораша ўранку
На ўзлессі вясновай парой!
І хлопчык прыбег на палянку —
Ён чуецца тут як герой.

Нічога смяльчак не баіцца —
Ён мае арэхавы прут,
Каб нават ад воўка адбіцца,
Калі той надарыцца тут.

Вось бачыць ён яркую зёлку,
Памкнуўся яе сашчыкнуць —
Ды ўгледзеў на былцы кароўку,
Што божай адвеку завуць.

Паўзе яна ўгору няспешна,
Занятая справай сваёй.
Любуецца хлопчык уцешна
І лічыць «радзімкі» на ёй.

Кароўка ж у крапачках дробных
Спакойна былінку хіне.
— Я знаю: ты добры, ты добры —
І ты не пакрыўдзіш мяне!..

На хвілю задумаўся хлопчык
Дый бегма пусціўся ўпадскок.
Аж бачыць: ля сцежкі, на ўзбоччы —
Малюсенькі, кволы дубок!

Яшчэ і лісточкаў зялёных
На дрэўцы нямнога зусім.

І хлопчык, як быццам знаёмы,
Прыветна схіліўся над ім.

А юны нашчадак дубровы
Зашорхаў лісткамі, бы ў сне:
— Я знаю: ты добры, ты
добры —
І ты не пакрыўдзіш мяне!..

Ад радасці хлопчык наўзавад
Гатоў быў імчацца праз лог,
Ды раптам, спалохаўшы нават,
Успырхнула птушка з-пад ног.

Зірнуў ён — а долках
гняздзечка
З травінак-былінак сухіх
І пяць жаўтаватых яечак,
У шэрачках-плямках рудых.

А птушачка, сочачы зводдаль,
«Ю-лі» ды «ю-лі» на сасне:
— Я знаю: ты добры, ты
добры —
І ты не пакрыўдзіш мяне!..

Яшчэ весялейшым зрабіўся
Наш хлопчык... Далей ён
бяжыць
І зноў у здзіўленні спыніўся:
Крынічка ў аеры блішчыць!

Празрыстая — нібы акенца,
І бачна, як з долу, са дна —
Бы сэрца жывое там б'ецца —
Штуршкамі пульсуе яна.

І хлопчыку чуцен цудоўны,
Бязгучны той булькат на дне:
— Я знаю: ты добры, ты
добры —
І ты не пакрыўдзіш мяне!..

Ах, як гэта радасна ведаць,
Што, лічачы сябрам сваім,
Усе цябе любяць і вераць,
Што крыўды не зробіш ты ім!

Вяртаецца хлопчык дахаты
І свеціцца ўвесь нездарма,
І песенька весняга свята
Зрываецца з вуснаў сама.

## ЗЁЛКІ

Заўтра я павінна ўстаць
Раненька, з зарою:
Пойдзем зёлкі мы збіраць —
Людзям на здароўе.

Святаяннік, дзівасіл,
Сухацвет і піжму —
Каб было на лекі ўсім —
Буду рваць я ўвішна.

Палячыцца каб маглі
Сталыя і дзеці
Сокам роднае зямлі,
Што сабраны ў цвеце.

Каб адчулі ўсе душой,
Колькі сілы-моцы
У лясной і лугавой
Беларускай зёлцы!

## ВІТАЮ ВЯСНУ

Мне сягоння роўна сем,
Я ўжо не малая:
На грудзях — глядзіце ўсе —
Зорачка палае!

Я іду, а вокан шкло
Зіхаціць прыветна.
Горад сонцам заліло.
Цёпла. Чыста. Светла.

Ад зялёных ліп наўкол
Водар-пах разліты,
Я махаю ім рукой:
— Добры дзень вам, ліпы!

Кветкі весела глядзяць,
Разамкнуўшы вейкі.
І я рада прывітаць:
— Добры дзень вам, кветкі!

Птушкі свішчуць там і тут,
Пырхаюць пяюшкі.
Ім таксама мой салют:
— Добры дзень вам, птушкі!

Добры дзень, вясна-красна,
Як ты люба ўсім нам!
Прыгажэй цябе няма,
Слаўная часіна!

## СВЯТЛАФОР

Я ў горад з дзедам Юлісем
Прыехаў першы раз.
Ідзём сабе, любуемся,
Ды ашчаджаем час.

Бо нам, калі па шчырасці,
Патрэбна скрозь паспець:
І спраў багата вырашыць,
І горад паглядзець.

Вось бачым: цераз вуліцу
Вялізны магазін.
Гукаю дзеду Юлісю:
— Давай перабяжым!

А дзед глядзіць уважліва
І мне наперакор:
— Чакай, вунь нешта важнае
Нам кажа святлафор.

А кажа нам ён, сокале:
«Ні з месца! Стойце там,
Пакуль зялёным вокам я
У твар не гляну вам!

Каб вы паспелі ў радасці,
Таварыш пешаход,
І да глыбокай старасці
Дайсці без перашкод —

Праз вуліцу не рвіцеся
Няўцямна, як у сне,
А кожны раз спыніцеся
І гляньце на мяне!»

Я слова святлафорава
Запомніў назаўжды.
Са мной на вулках горада
Не здарыцца бяды.

## «ВЕТЛІВЫ» ХЛОПЧЫК

Ну й «ветлівы» хлопчык!
(Хто кемны — зважай!)
Заходзіць аднойчы
Бабулька ў трамвай.

Заходзіць бабулька,
А месца — няма.
Сказаць «уступіце»
Не можа сама.

А «ветлівы» хлопчык
Насупраць сядзіць
І пільна ў акно
Пазірае, глядзіць.

Прыкінуўся хлопчык
Нявінным такім,
Як быццам бабулькі
Не бачыць зусім.

І толькі нарэшце
Ля школы сваёй
Ён ветліва кажа
Бабульцы старой:

— Садзіся, бабулька,
Мне злазіць цяпер...
А быў жа той хлопчык,
На жаль, піянер.

## У ЛУЗЕ

Колькі кветак ля ракі!
Сінія, як вочкі,
Незабудкі і браткі,
Смолкі і званочкі.

І мядунка, і герань,
Слёзкі, мята, кашка!
Сто букетаў назбіраць
Тут за дзень няцяжка.

Паміж кветак, у траве,
Не разгледзець Светку:
Толькі бант на галаве
Мільганецца зрэдку.

Рве па кветачцы адной,
Выбірае з густам.
Нечакана для самой
Напаткала бусла!

Не спалохаўся ані
Прыгажун цыбаты:
Хоць за дзюбу пацягні
І вядзі дахаты.

— Я ж цябе не зачаплю,
Мілы, добры бусел,
Я сабе букет раблю,
Вось ён — палюбуйся!

А цыбаты — хоць бы што!
І не чуе Светку!
Можа быць, дзяўчынку ён
Палічыў за кветку?

## ЗІМОЙ У ЛЕСЕ

Мяккі, пульхны, нібы з ваты,
Мітуслівы і таўсматы
З неба снег шыбае,
І кладзецца навакола,
І прыемна, і вясёла
У вачах мільгае.

Лес сівы стаіць сцяною —
Нерухомаю, нямою,
Ён такі ж прыгожы,
Мілы сэрцу, як і летам.
Пахадзіць на лыжах лесам —
Што быць лепей можа?

Тут прывольна і зацішна
Між ялін, прыбраных пышна,
Велічна-ўрачыстых,
Між сасонак анямелых,
Між бярозак срэбна-белых,
Між дубоў вячыстых.

Паглядзіш навокал — здасца,
Што ў дзівоснай нейкай казцы
Апынуўся раптам:
Асцярожна, асцярожна! —
Тут з Марозам стрэцца можна —
З белым, барадатым.

Тут ён дзедаву дзяўчынку
Прыгалубіў, сірацінку,
Каб не мерзла ў снезе...
Зачараваны, гляджу я:
І царэўна-прыгажуня
Тут, напэўна, недзе...

Мяккі, пульхны, нібы з ваты,
Мітуслівы і таўсматы
З неба снег шыбае,
І кладзецца навакола,
І прыемна, і вясёла
У вачах мільгае.

## ЗАГАДКІ

Закаціўся пад плот,
Лёг у баразёнцы,
Паласаты жывот
Грэючы на сонцы.
*(Гарбуз)*

Па зямлі я не хаджу
І на неба не гляджу,
Вочы маю — не міргаю,
Маю рот — не гавару,
Ёсць і хвост, але не звер я

І не птах, хоць ёсць і пер'е,
Хаты зроду не будую,
Ды ні трохі не бядую.

*(Рыба)*

Распрануўся мал-малышак
І саскочыў голы з вышак,
Пакаціўся па руках,
Апынуўся на зубах.

*(Арэх)*

Што за загадка,
Прашу адгадаць:
Пад латаю латка
І швоў не відаць?

*(Качан)*

У белым сарафане,
Пад хусткай зялёнай
Сумуе на паляне
Танклявая Алёна.

*(Бярозка)*

Чырвонае цельца,
Каменнае сэрца,
Віннае на смак.
А завецца як?

*(Вішня)*

Чатыры родныя браты,
Як толькі нарадзіліся,
Дык пад адным
капелюшом
Жыць цэлы век згадзіліся.

*(Стол)*

Што за дрэва ў свеце ёсць,
Што дупло ў яго наскрозь,
А ў дупло забраўся пісар:
Вечна піша і маўчыць,
Ростам гэткі ж, як
і дрэва,—
Толькі нос з дупла
тырчыць.

*(Аловак)*

Не світка, а сшыта,
Не куст, а з лістамі,
Маленькага росту,
Прыгожага стану.
Хто яе знае,
Той розум мае.

*(Кніга)*

Белы голуб
Прыляцеў,
Белым крыллем
Шалясцеў
І з усёй зямлі
Навіны
Расказаў
За паўгадзіны.

*(Газета)*

## ЕЎДАКІЯ ЛОСЬ

Еўдакія Якаўлеўна Лось нарадзілася 1 сакавіка 1929 г. у вёсцы Старына Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыла Глыбоцкае педвучылішча (1948), філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага (1955). Некаторы час працавала рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. Вучылася на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве, якія скончыла ў 1960 г. Затым працавала літработнікам газеты «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Работніца і сялянка», галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка».

Першыя вершы Е. Лось з'явіліся ў рэспубліканскім друку ў 1948 г. У 1958 г. выйшаў у свет першы зборнік вершаў «Сакавік». Затым былі выдадзены кнігі паэзіі «Палачанка» (1962), «Людзі добрыя» (1963), «Хараство» (1965), «Яснавокія мальвы» (1967), «Вянцы зруба» (1969), «Перавал» (1971), «Галінка з яблыкам» (1973), «Лірыка» (1975), «Лірыка ліпеня» (1977), «Валошка на мяжы» (1984). Выйшлі з друку зборнікі апавяданняў «Пацеркі» (1966), «Травіца брат-сястрыца» (1970).

Плённа працавала Е. Лось і ў галіне дзіцячай паэзіі. Паэтычныя творы для юнага чытача склалі зборнікі «Абутая ёлачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964), «Зайчык-выхваляйчык» (1970), «Смачныя літары» (1978). Маленькаму чытачу адрасаваны таксама зборнік «Дванаццаць загадак» (1974).

У перакладзе Е. Лось на беларускай мове выйшла кніга вершаў рускага паэта С. Баруздзіна «Краіна, дзе мы жывём» (1977).

Памерла Е. Лось 3 ліпеня 1977 г.

## РАДЗІМА

Куранты праб'юць праз гадзіну,
і ціша агорне зямлю...
Сваю дарагую Радзіму,
як родную маці, люблю!

Яна мне штодзень адкрывае
шырока скарбніцы свае.
Ключом жураўліным гукае,
лясною крынічкай пяе.

Мне свецяць высокія зоры,
гудуць правады нада мной.
Як сінія вочы — азёры,
і бор — аксамітнай сцяной!..

Я рады, што тут нарадзіўся,
дзе ласкай вітае абсяг.
Над намі высока узвіўся
чырвоны наш ленінскі сцяг.

Тут біліся мужна за волю
мае маладыя дзяды.
Ніякі іх вораг не здолеў,
іх подзвігу жыць праз гады...

І радуе кожны світанак,
агні камунізм запаліў.
Айчына між першых змаганак
за шчасце і мір на зямлі.

Па мяккай ад лісця сцяжыне
у школу вучыцца бягу.
А вырасту — роднай краіне,
як маці маёй, памагу!

## ВУЛІЦА БЕРАСЦЯНСКАЯ

Гула тут калісьці
труба-берасцянка,
пастух сустракаў
свае росныя ранкі.
Рыкалі рагулі,
бляялі ягняткі —
тупалі ў пыле
сонныя статкі...
Вулку таму
Берасцянскай назвалі,
хоць тут машыны
даўно зарыкалі
і збудавана
многа падрад
высокіх дамоў
і садоў дашкалят...
А што, раскажы,
на тым месцы было,
дзе твайго дома заззяла святло?

## РУКАВІЧКІ

Па сняжку бяжыць сястрычка,
а на ручках — рукавічкі.
Рукавічкі, як цюльпаны,—
чырвань воўнай вышываны!
Ці заўважылі вы, дзеткі:
у дзяўчынкі —
ручкі-кветкі!

## ДАЖДЖЫНКА

Ты, дажджынка,
як дзяўчынка,—
скок ды скок па лужы!
Не баішся весняй веі,
не баішся сцюжы.
Кропелька,
на твар мне падай,
па лістку каціся
і ў сем колераў вясёлкі
весела свяціся!

## СМАЧНЫЯ ЛІТАРЫ

«О» — нібы фасолька,
«Т» — нібы грыбок,
«І» — нібы гарошына,
а пад ёй стручок...
Літары запомню
без лішняй гаманы.
Як жа не запомніць:
смачныя яны!

## ЧОРНЫ ДЗЯТЛІК

Чорны дзятлік
на сасне
тэлеграму
б'е вясне.

— Чорны
дзятлік,
што ж ты
брудны,
дзе твой
беленькі
нагруднік?

— Ён на мне,
ды не ў пару
зачарніўся
аб кару.

Вось як
вычышчу
карыцу
ад казявак —
буду мыцца!

## АД ДУБА ДА ДУБА...

Ад дуба да дуба,
ад зруба да зруба,
ад палкі да палкі,
ад галкі да галкі!
Лічыся, лічыся,
імчыся, імчыся,
ад дуба да дуба,
як жолуд, каціся.
І хутка хавайся
ў градзе-барадзе —
знайду я хоць дзе!

## КАЗКА ПРА ЛАСКУ

Ціха, дзеці,
Паслухайце казку
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку!

Дзе жыве яна,
Як выглядае,
З кім сябруе,
Каму памагае.

* * *

Неяк Ласку угледзеў
Сяргейка,
Хоць і слёзы блішчалі
На вейках.

Захварэў неўспадзеўкі
Хлапчына.
Сінява залягла
Пад вачыма.

Парашкі ён глытаў
І пілюлі,
Смеху хлопчыка
Доўга не чулі.

І тады да ягонага
Ложка
Падышла, нібы цень,
Басаножка.

Падышла неўзаметку
Малая,
За плячыма —
Каса залатая.

— Ты Сяргейка? —
Пытае ласкава
І плыве каля ложка,
Як пава.

— Ты хварэеш?
Замучылі лекі?
Пацярпі,
Не хвалюйся, маленькі!

Хочаш — коўдру тваю
Я папраўлю!
Хочаш — кветак у шклянку
Пастаўлю!

Каля хворага
Без адпачынку
Завіхаецца
Тая дзяўчынка.

Лоб малога пагладзіла,
Бровы,—
І Сяргейка заснуў,
Як здаровы.

І ў сне ўжо,
Што быў нібы казка,
Ён пытае:
— Скажы, калі ласка,
Хто ты?
— Ласка.
— Якая?
— Такая,
Што маленькім
Заснуць памагае.

— Дык застанься са мной,
Мая Ласка!
— Я спяшаю ў калгас,
Да Тараскі!
І, махнуўшы хусцінкаю
Белай,
Неўпрыкметку пайшла,
Паляцела.
Ціхі хлопчык
Ажно засмяяўся:
Ён з хваробай сваёй
Развітаўся!

* * *

Пасварылася з Надзяй
Ларыска.
І за што?
З-за малочнай ірыскі!
Да дзяўчынак прыходзіла цёця.
Надарыла цукерак блазноце.

І дражэ, і «падушак»,
і «мішак»...
Немалое багацце ў малышак!

Адно цешся з салодкіх
І еш
Ды сябровак частуй ты...
Дык не ж!

Стала крыўдна старэйшай —
Ларысцы,
Што ў Надзеі —
Яшчэ і ірыскі!

Вось старэйшая,
Каб не журыцца,
Адабрала ірыскі
Ў сястрыцы.

Хто паможа
Надзейцы ціхмянай?
Хто ёй верне
Прысмак адабраны?

Можа, цёця?
Яна на рабоце.
Можа, мама?
На працы таксама.

Памагла ёй
Дзяўчына-краса,
За плячмі —
Залатая каса.

І адкуль яна толькі
Ўзялася,
Як пазнала,
Што спрэчка ўзнялася?

На маленькіх нагах
Неабутых
Падышла да дзяўчынак
Надзьмутых.

Белай хусткаю
Твар абмахнула,
На сястрычак
Лагодна зірнула.

— Я завуся,— гаворыць ім,—
Ласкай.
Вы паслухайце
Простую казку!
Я прыйшла
Ад Сяргейкі-
Хварэйкі,
Я прыйшла
Ад Тараскі-
Падпаска.

Сумаваў той без ласкі
Са статкам,
Калі ў поле падаўся
За таткам.

А пасля пабыла я
За морам,
За бязмежным
Блакітным прасторам.

Там чакаў мяне
Бедны, пануры
Хлопчык з чорнаю-
Чорнаю скурай.

У краіне,
Дзе сонца багата,
Гэты хлопчык
Застаўся без таты.

Тату ворагі злыя
Забілі,
Бо змагаўся ён
Супраць насілля.
Супраць гора змагаўся
Адважна,
Клікаў волю
Ў свой край неабсяжны...

Пацямнелі,
Як быццам ад ночы,
Васільковыя
Ласчыны вочы.

Залатую касу
Запляла,
Пацішэлых сястрыц
Абняла.

І тады запытала
Ларыса:
— А як хлопчыка клічуць?
— Патрысам.

І ўжо шэпчуцца ціха
Дзяўчынкі...
Ім цяпер
Не да прыкрых учынкаў!

Трэба другу
Пісьмо напісаць,
Падарунак яму,
Пераслаць.

І пачула тут госця:
«Патрысік!
Шлём табе мы салодкіх
Ірысак.

І дражэ,
І «падушак»-малышак,
Толькі з'елі мы
Некалькі «мішак».

З падарункам прымі,
Калі ласка,
Нашу светлую
Шчырую Ласку!

Не гаруй,
Мы цябе не забудзем
І пра татку
Раскажам мы людзям.

Будзем дружныя мы
Між сабою
І навек
Пасябруем з табою!..»

* * *

Вось вам, дзеці,
І ўся мая казка
Пра дзяўчынку харошую —
Ласку.

Ласка ўсіх вас
Пабачыць жадала,
Але часу ў яе
Дужа мала.

А таму покуль стрэнецца
З вамі,
Будзьце, дзеці,
Ласкавыя самі!

## УЛАДЗІМІР ЮРЭВІЧ

Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч нарадзіўся 22 ліпеня 1916 г. у вёсцы Дуброва Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Скончыў будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута ў 1941 г. Завочна вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1939—1941). З 1932 г. працаваў на Беларускім радыё. Некаторы час быў уласным карэспандэнтам «Литературной газеты» па Беларускай ССР (1954—1959), затым адказным сакратаром часопіса «Маладосць» (1959—1970), дырэктарам Літаратурнага музея Янкі Купалы (1970—1972). З 1972 г. працаваў на Беларускім тэлебачанні, а потым у часопісе «Коммунист Белоруссии» (1974—1979). З 1979 г.— літкансультант Саюза пісьменнікаў БССР.

Друкавацца пачаў У. Юрэвіч у 1949 г. Выйшлі яго літаратуразнаўчыя кнігі «Слова і вобраз» (1961), «Шматгалоссе жыцця» (1965), «Погляд» (1974), «Абрысы» (1976).

У. Юрэвіч — аўтар зборнікаў апавяданняў для дзяцей «Тараскавы турботы» (1966), «Дзе начуе сонца?» (1970), «Дождж на колах» (1977), «Нястрашны страх» (1986).

Пяру пісьменніка належыць нарыс для школьнікаў пра сталіцу рэспублікі «Мінск учора, сёння, заўтра» (1982), а таксама — «Янка Купала: Нарыс жыцця і творчасці» (1983).

## НЯСТРАШНЫ СТРАХ

Пайшлі дзед з Лукашком у суседнюю вёску па малако. Забавіліся і дамоў вярталіся позна ўжо, калі сонца села на спачын. Сцямнела неяк адразу.

Дарога ішла праз лес. Не такая ўжо і вялікая дарога, але дзеду клыпаць па-старэчаму больш чым паўгадзіны. Ды і Лукашок не надта разганяўся, бо цёмна, пад нагамі нічога не відаць. Часам ён чапляўся сандалямі аб карані дрэў. Абапал дарогі павырасталі нейкія чорныя высокія волаты ў касматых бурках. Лепш выйсці на сярэдзіну дарогі і глядзець толькі наперад. Яна хоць і невыразна, але свеціцца. Унук з дзедам гэтак і зрабілі.

Каб было весялей ісці, дзед Лукаш пачаў расказваць, як у сорак першым у такую ж цемрадзь прадзіраўся з групай разведчыкаў праз густы ельнік, каб перайсці за лінію фронту. Загад быў — дастаць «языка».

— Як гэта — дастаць языка? — здзівіўся Лукашок.

— А так, жывога немца даставіць у штаб, каб дапытаць яго, бо наш полк збіраўся ісці ў наступленне. Дык вось, прадзіраліся з гадзіну ці, можа, больш, ужо нават страцілі надзею выбрацца на прастору, як раптам дрэвы парадзелі, уперадзе засвяцілася нейкая палоска, і мы выйшлі на дарогу. Дарога заўсёды куды-небудзь давядзе, быць не можа. Дастаў я свой компас, адпусціў тормаз, стрэлка заківалася, і адразу стала ясна, куды нам падавацца, каб на паўночны захад трапіць... Мы і пайшлі, моўчкі, каб не выдаць сябе, такі закон у разведчыкаў — маўчаць. Раптам перад намі нешта шэрае заківалася і нібы ліхтарык бліснуў. «Стой,— кажу хлопцам,— ні кроку... Бачыце?» Лявон кажа: «Не, нічога не бачу». Грышка таксама не бачыць, толькі Юзік пацвердзіў: «Ага, нешта бліскае, нібы воўк вачыма...» Думаю: што ж рабіць? Страляць нельга, можна немцаў насцярожыць. Парашылі збочыць з дарогі, але так, каб не спускаць яе з відавоку. Ідзём, і тое нешта, што бліскае, перад намі нібы ідзе.

Спыніліся. І тое нешта спынілася. Мы ідзём — яно ідзе, мы спыняемся — яно таксама замірае і перастае бліщчаць. «Калі воўк, дык учацвярых справімся»,— падумаў я і ціха скамандаваў: «Наперад! Аўтаматы напагатове». Ідзём, а вачэй не спускаем з таго месца, дзе бліскаўкі тыя, бывае, узнікаюць. «Ведаеш, Лукаш, што гэта? — кажа Лявон.— Там, мусіць, пень гнілы. І не адзін...» — «Давайце абступім гэта дзіва кругом, паназіраем з розных месц,— кажу я і камандую: — На дзесяць крокаў разыдзіся!»

Ціпыня. Каб хто паварушыўся. Раптам Юзік напаўголаса гэтак гаворыць: «Нехта там стаіць». Чаго ж марудзіць? Камандую: «Абступаем. Толькі дружна!» Рынуліся ўміг наперад. Бліскаўка знікла. Перад намі сапраўды пень асінавы трухлявы. Ды не адзін, шмат іх тут. Ляда старое з-пад асінніку. Лявон адкалупнуў кавалачак той трухлі ды пад шынель схаваў, прыгледзеўся. «Хадзі-тка сюды, хлопцы, глядзіце!» Першы ступіў я і, прыгнуўшыся да Лявона, зазірнуў яму за пазуху, а там сапраўды нібы лямпачка ад ліхтарыка

свеціцца. Во як было з намі, разведчыкамі, ледзьве страляць не пачалі. У страха, кажуць, вочы вялікія.

— А хіба страх з вачыма? — запытаўся Лукашок.

— У чалавека вочы,— адказаў дзед,— але ад страху ён, бывае, вылупіць іх, каб лепш бачыць... І тады звычайную елку ў лесе ноччу за волата-страшыдлу прымае, а пень трухлявы за ваўка, які вачыма бліскае. Але гэта ўжо нястрашны страх, бо ведаеш, ад чаго ён.

Тым часам дзед з унукам мінулі лес, наперадзе добра была відаць дарога, а на пагорку раптам засвяціліся агеньчыкі іхняй Раёўкі.

— Дзеду, а «языка» вы тады ўсё-такі здабылі? — спытаў Лукашок.

— А як жа, ды яшчэ якога гаваркога... Начальнік нашай разведкі перад строем падзяку аб'явіў усім.

— Падзяку за страх? — з'едліва спытаў унук.

— За тое, што разгадалі нястрашны страх і заданне выканалі.

## ДЗЕ НАЧУЕ СОНЦА

Таццянка ўвесь час сябруе з дзедам. Мама і тата вельмі занятыя, з работы позна прыходзяць. Бабуля дома тупае. А дзядуля, калі забірае ўнучку з сада, возьме яе за руку ды — у парк гуляць.

Парк — праз вуліцу. Адну Таню не пускаюць і цяпер, калі ёй ужо шэсць мінула. Ведама, увесь час машыны снуюць і снуюць. Трэба выбраць момант, каб перайсці вуліцу. А гэта ўмее толькі дзядуля.

У парку дзед з Таццянай вы́хадзіў усе куточкі. Яны пераседзелі на кожнай лавачцы, перастаялі пад кожным дрэвам.

Надвячоркам, калі сонца збіраецца на спачын, ідуць заўсёды на горку да планетарыя. «Што такое планетарый?» — спыталася неяк бабуля ў Таццянкі. І ўнучка адказала, як магла: «Гэта такі дом, як капялюш. Толькі ён не на галаве сядзіць, а на зямлі стаіць. У гэты дом ходзяць кіно глядзець. А кіно там пра зоркі, пра месяц. Дзед кажа, што мне яшчэ рана ў тое кіно хадзіць. Трэба падрасці. А пакуль?»

— Пакуль глянем лепш, як сонца заходзіць,— гаворыць кожны раз дзядуля і прысаджваецца на лавачцы ля каруселяў.

І яны глядзяць. Бачаць заўсёды адно і тое ж. Калі садзіліся, сонца вісела над тымі дамамі, што за паркам. А пасядзелі трошачкі, і яно ўжо да будынка опернага тэатра дакацілася. Вось-вось схаваецца ў ім.

— Дзеду, сонца ў тэатры начуе? — раптам запыталася Таня.

— Ага, унучка, у тэатры,— адказвае не задумваючыся дзед.— Тэатр жа вялікі. У ім — тысяча крэслаў.

— А тысяча гэта многа?

— Табе на цэлы дзень лічыць хопіць.

— А мы ў тэатр сходзім?

— Сходзім. Абавязкова сходзім.

І яны былі ў тэатры. І бабулю з сабой бралі. Глядзелі балет пра доктара Айбаліта. Ой, як там хораша было — малпачкі, ліска,

зайчыкі, вавёрачка, жырафа высокая-высокая... Усіх іх добры доктар Айбаліт вылечыў, і ўсе яны потым танцавалі. А сонейка свяціла моцна-моцна, як улетку.

У тэатры яны былі зімой. На вуліцы ішоў снег, а на сцэне было светла-светла. «Гэта сонейка ад мяцеліцы схавалася сюды»,— думала тады Таццянка і сапраўды верыла, што сонца ў тэатры начуе.

Верыла, пакуль не ўбачыла, як сонца за лес садзіцца.

Было гэта аднойчы цёплым летнім вечарам. У парку ціха-ціха, ні ветрыку. Дзед і кажа:

— Таццянка, хочаш падняцца высока-высока? — А сам паказвае на тое кола, што на горцы ў парку. За кола паначапляны такія лавачкі-калыскі. Садзяцца людзі і падымаюцца ўгару, а потым уніз апускаюцца.

Таццянка ведала, што маленькіх адных туды не пускаюць. А дзеда не адважылася прасіць.

І вось ён сам падахвоціўся.

Таня падумала, памаўчала, глянула на самы верх, вочкі заплюшчыла, а потым і пытаецца:

— З табой, дзеду?

— Са мной.

— Калі з табой, то паедзем.

Дзед купіў у касе два білеты. Узышлі прыступкамі на пляцоўку, аддалі білеты цётцы і пачакалі, пакуль пад'едзе чарговая лавачка. Дзядуля падняў Таццянку, пасадзіў і сам спрытна ўскочыў. Лавачка закалыхалася і неўзабаве спынілася. Кола рухалася ўперад. Таня з дзедам ехалі ўгору.

Сонца чырвоным шарам паўзло, як заўсёды, да опернага тэатра. Садзілася на дах.

Таццянка зірнула ўніз і ўбачыла, што зямля паплыла ад яе. Яна ўхапілася за дзядулеву руку і задрыжала:

— Ой, дзеду, баюся я!

— А ты, Танечка, не глядзі долу,— супакойваў унучку дзед.— Вунь туды глянь, наперад. Якая любата!

І Таццянка ўбачыла цырк, дрэвы ў парку, музей Янкі Купалы, шэрую стужку вады — гэта рака Свіслач — і мост цераз яе.

Усё неяк паменшала, нібы ў кіно. Праз мост імчаліся маленькія, нібы цацачныя, аўтобусы, таксі, тралейбусы. Па вадзе плылі невялічкія лодкі.

Таня з дзедам падымаліся павольна ўсё вышэй і вышэй. Направа відзён помнік, што на плошчы Перамогі, а лявей — будынак тэлецэнтра, проста ж спераду — оперны тэатр.

Толькі што гэта: сонца было на самым яго даху, а цяпер стаяла над зубчастай сiняватай сцяной.

— Вунь там, бачыш, Таня, горад канчаецца. А тая сіняя сцяна ў зубчыкі — гэта лес за горадам. За той лес і садзіцца сонца,— тлумачыць дзед.

Тым часам Таццянка з дзедам паехалі ўніз. Дрэвы на зямлі большалі, бліжэлі... І было ўжо зусім не страшна.

А калі апусціліся да пляцоўкі, першы сышоў дзядуля і адразу падхапіў Таню пад пашкі.

Таня з дзедам пайшлі дарожкай уніз, бліжэй к дому.

— Дык, значыць, сонейка спіць за лесам? — раптам запытала ўнучка.

— Яно толькі хаваецца за лес, каб свяціць другім гарадам, што па той бок зямлі,— тлумачыў дзед.

Унучка глядзела на дзеда і нічога не разумела.

— А што, у зямлі два бакі?

— У зямлі шмат бакоў. Яна круглая, як мяч.

— Як мяч?

— Але.

— А чаму ж яна тут такая роўная? — І Таня прытупнула ножкай.

— Вось пойдзеш у школу, тады пра ўсё будзеш ведаць,— супакойваў дзед унучку.

— І дзе начуе сонца, буду ведаць?

— Будзеш, будзеш ведаць, што сонца ніколі не спіць. Няма яму калі спаць. Яно адно, а людзей і не палічыш колькі. І ўсім трэба свяціць, каб усе былі загарэлыя, здаровыя, вясёлыя.

## АЛЕГ ЛОЙКА

Алег Антонавіч Лойка нарадзіўся 1 мая 1931 г. у Слоніме Гродзенскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1953), аспірантуру пры ім (1956). З 1956 г. працуе выкладчыкам беларускай літаратуры ў гэтым жа універсітэце. А. Лойка — доктар філалагічных навук (1969). прафесар (1971), з 1985 г. загадвае кафедрай беларускай літаратуры.

З першым вершам «Святочным ранкам» А. Лойка выступіў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» ў 1951 г., вершы маладога паэта друкаваліся ў часопісе «Маладосць». Выйшлі зборнікі вершаў і паэм «На юначым шляху» (1959), «Задуменныя пралескі» (1961), «Дарогі і летуценні» (1963), «Блакітнае азерца» (1965), «Каб не плакалі ка́ні» (1967), «Дзівасіл» (1969), «Калі ў дарозе ты...» (1971), «Шчырасць» (1973), «Пачуцці» (1976), «Лінія жыцця» (1978), «Скрыжалі» (1981), «Нявоўныя даты» (1983), «Пралескі ў акопах» (1987).

Нямала вершаў і казак А. Лойка напісаў для дзяцей. Ён аўтар паэтычных зборнікаў «Як Тоня рэха шукала» (1962), «Карагод дзівосных прыгод» (1966), «Каля млына» (1972), «Дзе хто начуе?» (1977), «Пра дзеда Аяяй і бабу Оёй» (1984).

А. Лойка вядомы таксама як крытык і літаратуразнаўца. Ён напісаў манаграфіі «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура» (1959), «Новая зямля» Якуба Коласа: Вытокі, веліч, хараство» (1961), «Максім Багдановіч» (1966), «Сустрэчы з днём сённяшнім» (1968), «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя» (1972), а таксама кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў «Паэзія і час» (1981). А. Лойка з'яўляецца аўтарам вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд» (ч. 1, 1977; ч. 2, 1980), за які ўзнагароджаны Дыпломам гонару ВДНГ СССР (1982), і адным са складальнікаў хрэстаматыі для ВНУ «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» (1971; 2-е, дапрацаванае і дапоўненае выданне — 1988). У 1982 г. у Маскве выйшла яго кніга «Янка Купала» (у серыі «Жизнь замечательных людей»), на беларускай мове выйшаў раман-эсэ пра Янку Купалу «Як агонь, як вада» (1984).

А. Лойка шмат працуе і ў галіне перакладу. Пераклаў на беларускую мову кнігу выбраных твораў П. Верлена «У месяцавым ззянні» (1974), асобныя творы М. Някрасава, Р. Гамзатава і іншых паэтаў.

## У ЗІМОВЫМ ЛЕСЕ

У зімовым лесе
Снежна, снежна,
снежна.
Сарокам няўежна,
А зайцам няўлежна —

Сонца іх не грэе,
Вецер іх марозіць,
Аднаму мядзведзю
Цёпла у бярлозе.

У зімовым лесе
Іней, іней, іней
На сасонках сініх,
На старых асінах,

Ён сядае нават
Срэбнай павуцінай,
Калі лось задрэмле,
На рагах ласіных...

У зімовым лесе
Ціха, ціха, ціха,
Зрэдку мітуснецца
Ў голлі снегірыха,

Войкне, баючыся,
Што знячэўку спевам
Інею карункі
Ацярушыць дрэвам.

## ВЕРАБЕЙЧЫК

Верабейчык, верабей,
Шэранькая птушка,
Не чырыкай на вярбе,
Не будзі дачушкі.
Спіць яна салодкім сном
На падушцы белай,
І прыціх увесь наш дом,
Быццам анямелы.
Толькі ты адзін у нас
Гэткі несвядомы:
На галінцы ля акна
Ціўкаеш без стомы.
Ці маленькіх у цябе
Не было ніколі,
Што на сонечнай вярбе
Ты шуміш, сваволіш.
Верабейчык, верабей,
Шэранькая птушка,
Не чырыкай на вярбе,
Не будзі дачушкі!

## ПАСЛЯ НАВАЛЬНІЦЫ

Пасля навальніцы
На кожнай хваінцы,
На кожнай іглінцы —
Па круглай
дажджынцы.

Зачэпіш галінку,
І з шумам дажджынкі
Спадаюць з іглíцы
Малой навальніцай.

Спадаюць і росяць
Касу і сукенку,
З адной навальніцы
Аж сотня маленькіх.

Ды Тоню прысесці
Не змусіш сушыцца,
Бяжыць, каб натрэсці
Аж сто навальніцаў.

Каб сосны дужэлі,
Радзілі суніцы,
Ну як не натрэсці
Аж сто навальніцаў?!

І светла міргалі ёй
З кожнай хваінкі
Дажджынкі,
дажджынкі,
Іглінкі, іглінкі!..

## СУНІЦЫ

Суніц у зялёнай
Дуброве нямала.
Там з мамаю Тоня
Суніцы збірала.

Дала мама Тоні
Маленькі збаночак.
Ды Тоня ў збаночак
Суніц браць не хоча.

— Ой, мама, пакіньма
Суніц хаця крышку

Вавёрцы, зязюльцы,
Камарыкам, мышкам;

А мо і мядзведзіха
З дзецьмі таксама
Захоча суніцаў,
Як Тонечка з мамай.

Дык чым жа сунічнік
Гасцей пачастуе,
Калі ўсе суніцы
Ў збаночак збяру я?!

## ДЗЕ НАЧУЕ СОНЦА

Ветрык ціха гушкаў
Сойку на сасонцы.
Сакаталі птушкі:
— Дзе начуе сонца?..

— Ды ў цырку,
няйначай,
Бо ўвесь дзень не плача,
А весела скача,
Як чырвоны мячык!..

— Не ў цырку,
а ў склепе
Фар і батарэек,

Бо чаму так слепіць,
Бо чаму так грэе?

— Не! За агародам,
У маку агністым,
Там, дзе пчолкі мёдам
Пахнуць залацістым!..

Толькі задрамала
Сойка на сасонцы:
Спала і не чула,
Дзе начуе сонца!..

## СПРЫТНЫ ЎНУЧАК, ЯК КАЎБОЙ...

Спрытны ўнучак, як каўбой,
Ледзь прачнецца раніцой,
Аб'яўляе цацкам бой,
Усе нішчыць — да адной.
— А-я-яй!..— дзед Аяяй
Ушчувае.— Не чапай!..

Ну, а бабка Оёёй:
— О-ё-ёй!..— крычыць.—
Пастой!..
Спрытны ўнучак, як каўбой,
Кажа ёй: — Сама пастой,
Я ж — прылягу адпачну,
Цацкі зноў ламаць пачну.

Просіць дзедка Аяяй:
— Дарагі, не пачынай!..

Ну, а бабка Оёёй:
— О-ё-ёй!..— крычыць.—
Пастой!..

— Я магу і пастаяць,
А хто ж будзе іх ламаць?..
— Я! — сказаў дзед Аяяй.—
Ану — коніка давай,
Верталёт давай і лук...
— Не чапай! — азваўся ўнук.

Лямантуе ўнук: — Пастой,
Я каўбой і не каўбой,
Будзем мірныя з табой:
Цацкам мір! Канчаем бой!

# АРТУР ВОЛЬСКІ

Артур Вітальевіч Вольскі (Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 23 верасня 1924 г. у Дзяржынску Мінскай вобласці. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1941), працаваў мастаком у БДТ-2, які знаходзіўся ў эвакуацыі ў г. Уральску. У 1942 г. быў прызваны ў армію, служыў на Далёкім Усходзе, удзельнічаў у баях супраць імперыялістычнай Японіі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у рэдакцыях газеты «Чырвоная змена», часопісаў «Бярозка», «Вясёлка». У 1962 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працяглы час (1966—1978) працаваў дырэктарам Беларускага тэатра юнага гледача, потым — дырэктарам Дома літаратара Саюза пісьменнікаў БССР (1978—1979). З 1980 г. быў літаратурным кансультантам СП БССР, з 1981 г. працуе ў выдавецтве «Юнацтва».

Сваю першую аповесць «Родная семья» А. Вольскі напісаў на рускай мове ў сааўтарстве з таварышам па службе ў арміі Б. Іртышскім (Хабараўск, 1953). Затым выйшлі на беларускай мове зборнікі вершаў А. Вольскага «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982), «Чалавек, якому баліць» (1984).

Творчасць А. Вольскага для дзяцей пачалася з кнігі «Маленькім сябрам» (1955). Неўзабаве выйшлі зборнікі паэзіі і прозы «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж?» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1985), «Ад А да Я прафесія мая» (1987).

А. Вольскі з'яўляецца аўтарам п'ес для дзяцей «За лясамі дрымучымі» (у сааўтарстве з П. Макалём; паст. у 1958 г.), «Марынка-крапіўніца» (у сааўтарстве з П. Макалём; паст. у 1963 г.). П'еса-казка «Сцяпан — вялікі пан» (1979) пакладзена на музыку і пастаўлена ў 1979 г. на сцэне Тэатра музычнай камедыі.

## КРАСАВІК

Яшчэ ў лагчыне
снег не знік,
не апрануў лістоту ўзлесак,
а ўжо смяецца красавік
вачмі блакітнымі пралесак.
А на вадзе
усё гудзе,
зіхцяць на крыгах іскры
пырскаў...
Калісьці
ў гэткі самы дзень
радзіўся хлопчык у Сімбірску.

Ён у душу сабе ўвабраў
святло,
цяпло
вясновых промняў;
і скрыгат крыг,
і шолах траў
ён з першых дзён сваіх
запомніў.

У тыя дні падслухаў ён
і цяжкі смутак чалавечы,
і песню сумную,
і стогн
дзяцей нядолі і галечы.
Ішлі гады...

Да ранніх рос
ён юнаком ля Волгі марыў,
каб сонца ззяла ўсім з нябёс,
не пакідаючы абшараў.

І вось
паводкаю народ
пайшоў за ім,
каб мару здзейсніць...

Грыміць на рэках крыгаход,
жаўрук нясе да сонца песні.
Штогод
у вызначаны час
вясна спяшаецца палямі,
дзень нараджэння Ільіча
яна святкуе разам з намі.

## КАРАБЛІКІ

Блішчаць
на сонцы капелькі
нявысахлаю смолкаю.
Куды плывуць караблікі
рачулкаю Вясёлкаю?

На іх запалкі —
мачтамі
пад флагамі кумачнымі.
Барты —
кара сасновая.
Работа — адмысловая.

Бяжыць,
задраўшы штонікі,
каманда карабельная.
Яшчэ не штормы — штормікі,
яшчэ вясна суцэльная.

Нібыта чайкі,
ластаўкі
над грэбелькай праносяцца.
— Гэй, адчыняйце застаўкі,
Эскадра
ў мора просіцца!

## ЧАРНІЧКА

У засені сосен,
Дзе мох ды іглічка,
Расла-даспявала
Красуня-чарнічка.

Калі на світанку
Не бачыла хмарак,
Расой умывала
Свой кругленькі
тварык.

А потым на сонейку
Плечыкі грэла.
Нібы негрынятка,
Яна загарэла.

Быў друг у чарнічкі —
Зялёны лісточак.
Схаваў ён яе
Ад вавёрчыных вочак.

Складала вавёрка
Грыбы на палічкі,
Але не прынесла
Чарняўкі-чарнічкі.

І вожык праходзіў
Сцяжынкаю блізкай.
Павёў у паветры
Кірпатаю пыскай.

Але і яму,
Не мяняючы звычкі,
Лісток не дазволіў
Пакрыўдзіць чарнічкі.

Шукала спажывы
Мядзведзіца ўранку.
І вось на чарнічную
Выйшла палянку.

Расселася, тлустая,
Як сярод хаты.
І сонца схавала
Спіною кашлатай.

Грабе сабе злева,
Грабе сабе справа,
І злева і справа —
Мядзведжая страва.

Няўжо для чарнічкі —
Апошні дзянёчак?
Ды не пахіснуўся
Зялёны лісточак!

Ва ўвесь свой расточак
Устаў абаронца...
І вось ужо зноў
Паказалася сонца.

Ах, што за лісточак!
Такі невялічкі,
Мядзведзіцы нават
Не выдаў чарнічкі.

## ПРА КАВАЛЁЎ І КАРАЛЁЎ

Кава́лі зброю кавалі́,
каб іх кара́лі каралі́.

І думаў кожны чалавек,
што так — спрадвек,
што так — навек.

Але аднойчы кавалі
у змову тайную ўвайшлі:

— Як з'есць іржа
апошні меч,
не будзе чым галовы сеч!..

Магутна дыхалі мяхі —
кавалі ў кузнях лемяхі.

І страх напаў на каралёў:
— Што нам рабіць без кавалёў?

— Не хочуць зброю больш
каваць!
— Як між сабой нам ваяваць?
— Упокат спіць без мечаў раць!
— Чым кавалёў саміх караць?

Праз колькі лет,
праз колькі зім
На свеце ясна стала ўсім:
нішто — кароль без каваля
і ўсё — каваль без караля.

## І Я ХАЧУ СЛУЖЫЦЬ

Вакол сцягоў
віецца
сняжынак карагод...
Дзень Арміі Савецкай
святкуе наш народ.

Мы ў радасці
аж скачам —
святочны
ў нас настрой:
прыйшоў
у сад дзіцячы
былой вайны герой.

І я
яго вітаю,
трымаю
за руку...
А Зорка Залатая
гарыць на пінжаку.

І ордэнаў багата,
і ззяюць медалі...
За подзвігі
салдату
іх у вайну далі.

Ён быў байцом пяхоты.
Ішоў
праз гром і дым.
Аж пяць фашысцкіх дотаў
узяты
з бою
ім.
З акопаў Сталінграда
пайшоў ён
на Берлін.
Не кланяўся снарадам
і не ўцякаў ад мін.

Пад свіст варожай кулі
не гнуў ён галавы...
Цяпер,
як мой дзядуля —
і сціплы
і сівы,—
глядзіць на нас ласкава,
канчаючы расказ:

— Я ў бой
не дзеля славы
хадзіў, а дзеля вас.
Каб свет
не ведаў войнаў,
каб мірна
жыў народ,
працуючы спакойна,
не знаючы нягод,

каб вы
раслі такімі,
якімі мы былі, —
адданыя Радзіме
сыны сваёй зямлі.

Жывіце ж,
дзеці,
ў шчасці
і ў дружбе,
як адзін...

Нядаўна
ў энскай часці
пачаў служыць мой сын...

Чырвоны сцяг віецца.
Пациху снег імжыць.
У Арміі Савецкай
і я
хачу служыць!

**ДАБЯРУСЯ ДА НЯБЁС**

Мама ўпрошвае няспынна:
— Еш, сынок,
матулю ўсцеш.
Не па днях,
а па гадзінах
бацьку ты перарасцеш!..
Я стараюся заўзята.
Хутка стану ростам
З тату.
Кашу-манку,
геркулес
і з варэннем ем
і без.
Бо —
прызнаюся цяпер —
маю я адзін намер:
мне б да неба
дарасці —
больш не знаў бы
радасці!
Зоркі з неба
ў свята
маме
проста зняў бы я
рукамі.
Зоркі — што!
Адны забавы.
І важнейшыя ёсць справы!
Стаўшы ростам
да нябёс,
шмат карысці б
я прынёс.
Скажам —
спёка,
бы ў пустыні.
Ураджай
вось-вось загіне.
Дождж патрэбен?
Ну, дык што ж,
калі трэба —
будзе дождж!
Хмарку справа,
хмарку злева
я ў адну гарну...
— Та-тах!
Грымнуў гром.
Ідзе залева
па палях
і па садах.
Што? Замнога?
Больш не трэба?
Час ужо ачысціць неба?
Калі ласка!
Я на плечы
хмару ўзяў,
адношу ўбок.
Неабсяжная сінеча
чысцінёю цешыць зрок.
Збажына ўзнялася.
Дрэвы
ажылі пасля залевы.
Сонцам
ззяе небакрай.
Слаўны ўродзіць
ураджай!
Пастараўшыся як след,
брацца час
і за абед.
Але вось бяда якая —
не прадбачыў я

бяды:
мне кватэра замалая,
не магу ўвайсці туды.
У акно?
Ды ўсё адно —
не пралажу і ў акно!
Мама
вынесла б талерку.
Ды талерка —
што за мерка?
Есці зараз давядзецца
мне не меней,
чым з вядзерца.

Не!
Вялізны рост —
не надта.
Лепей выраcту,
як тата.
А тады...
І гэта праўда,—
я кажу табе ўсур'ёз:
стану
смелым касманаўтам,
дабяруся
да нябёс!

**КАЛЫХАНКА**

Змрок ляжыць навокал,
як гушчар лясны.
Да сцямнелых вокнаў
падыходзяць сны.

Спаць усім належыць
на зыходзе дня.
Недзе ў Белавежы
дрэмле зубраня.

Між ялін кашлатых,
у сваім дупле,
спяць ваверчаняты
ў цішы і ў цяпле.

І крыклівай сойцы,
што ў гняздзечку спіць,
аж да ўсходу сонца
дзетак не будзіць.

За акном мільгае
зорак карусель.
Глянь, табе міргае
Зорны Карабель.

Спяць у лузе краскі —
ты чаму не спіш?
Можа, сёння ў казку
ў сне ты паляціш...

**АД А ДА Я ПРАФЕСІЯ МАЯ**

Хто працуе на сяле
шчыра і заўзята,
каб было ў нас на стале
усяго багата?
Каб у радасці цвіла
з году ў год
няспынна
і магутнаю была
родная краіна?
Пра гэта вам
ад **А** да **Я**
раскажа азбука мая.

АГРАНОМА, як вядома,
не застаць вясною дома.
Аглядае поле ён,
каб дало багаты плён.

БУЛЬБАВОД, бульбавод —
у турботах круглы год.
А інакш, скажы, адкуль бы
мелі б мы удосталь бульбы?

У вёсцы ўрач ВЕТЭРЫНАРНЫ
таксама час не траціць марна —
і ўдзень гатовы і ўначы
жывёле хворай памагчы.

ГАНЧАР — сапраўдны чараўнік.
Ён гліны ўзяў камяк,
і вось збанок на крузе ўзнік,
а потым — круглы гляк.

Нельга сельскай гаспадаркі
уявіць нам без ДАЯРКІ,

хоць даўно ўжо звычная
дойка электрычная.

Лістота апала пад ветрам асеннім,
і ЕГЕР участак абходзіць лясны,
глядзіць, каб хапіла
ласям і аленям,
дзікам і казулям кармоў да вясны.

ЖЫВЁЛАВОД глядзіць жывёлу,
і вынік працы ўсім відзён:
бычок маленькі быў і кволы,
а сёння з цэнтнер важыць ён.

ЗААТЭХНІК — кнігу ў рукі,
у яго такі занятак:
па ўсіх правілах навукі
развіваць калгасны статак.

Калгасу кожнаму цяпер
патрэбен вельмі ІНЖЫНЕР,
бо без яго тэхнічных ведаў
калгас бы поспехаў не ведаў.

КАВАЛЬ хоць і не гне падковы,
ды робіць людзям шмат паслуг.
Ён змайструе дэталь гатовы,
наладзіць барану ці плуг.

Шумець, расці маладняку,
дзе бор стары адчуў знямогу...
І лес удзячны ЛЕСНІКУ
за клопат і за дапамогу.

Плывуць камбайны
— «Колас», «Ніва»,
за імі ў жыце — чысты след.
МЕХАНІЗАТАРЫ да жніва
падрыхтавалі іх як след.

НАСТАЎНІК вучыць нас і ў школе
і па-за школай вучыць нас,
каб мы любілі ферму, поле,
каб шанавалі свой калгас.

Горды я і тата — горды,
бо пачулі сёння ўказ:
атрымае днямі ОРДЭН
наш праслаўлены калгас.

З калгаса ў горад з кожным годам
ідзе ўсё болей бочак з мёдам.
А даглядае пчол ПЧАЛЯР —
іх друг і рупны гаспадар.

Знае ўсё РАХУНКАВОД —
дзе даход, а дзе расход.
Лічыць з ім рублі і тоны
калькулятар электронны.

Вырас дом, прыгожы самы.
Ад зары — у вокнах жар.
Хто рабіў для вокнаў рамы,
дзверы хто рабіў? СТАЛЯР.

Ён арэ, скародзіць, сее
і камбайн вадзіць умее.
На сяле таму ўсе чыста
паважаюць ТРАКТАРЫСТА.

УЧОТЧЫК строгі ўлік вядзе,
кім колькі зроблена і дзе.
Работы не цураецца —
з усімі сам стараецца.

Як толькі ўбачыш ФУРАЖЫРА,
дык адчыняй вароты шырай.
На ферму ён кармы вязе,
каб свінні большалі ў вазе.

Чорны, белы хлеб ці здобу
еш, але не забывай
быць удзячным ХЛЕБАРОБУ,
што вырошчваў ураджай.

У ЦЯЛЯТНІЦЫ — дзетсад.
Не для дзетак, для цялят.
А цяляткі — нібы дзеткі,
ім і догляд трэба гэткі.

Па ўзгорках, па лугах стракатых
ЧАБАН пасе авечы статак.
Увосень будзе шмат для дзетак
і рукавічак і шкарпэтак.

ШАФЁР, хоць страчан рэйсам лік,
машыну ўпэўнена вядзе.
Нагружан з верхам грузавік,
ані зярнятка не ўпадзе.

Работа лепей спорыцца
ў цяпле ды пры святле.
ЭЛЕКТРЫК, як і ў горадзе,
патрэбен на сяле.

Каб выпадковых страт не несці,
разлікі ўсе законна весці,
патрэбны стаў па новым часе
і ЮРЫСКОНСУЛЬТ у калгасе.

А — Я? Яшчэ ў дзетсадзе я.
Але ў калгасе — ўся сям'я.
І, як апошні скончу клас
ці нават інстытут,
я не пакіну свой калгас,
мая работа — тут!

## ЯДВІГА БЯГАНСКАЯ

Ядвіга Іосіфаўна Бяганская нарадзілася 29 лютага 1908 г. у г. Верхне-Удзінску (цяпер Улан-Удэ Бурацкай АССР). У 1922 г. разам з бацькамі пераехала ў Мінск. Скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1930), затым працавала выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў школах Мінска. Некаторы час жыла на Далёкай Поўначы (1937—1948). У 1949 г. вярнулася ў Беларусь. Працавала рэдактарам перадач для дзяцей і юнацтва на Беларускім радыё (1955—1964).

Першыя вершы Я. Бяганскай былі надрукаваны ў 1926 г. у часопісе «Маладыя араты» і ў газеце «Беларуская вёска». Пазней яна пераходзіць на прозу і піша пераважна для дзяцей. Першая аповесць «Далёка на Поўначы» выйшла ў 1954 г., а ў 1956 г.— у перакладзе на рускую мову (у Магадане). Затым паявіліся зборнікі апавяданняў і аповесцей «Жэнеў галубок» (1958), «Сустрэча з морам» (1962), «Зосіна зорачка» (1965), «Кожны марыць стаць Калумбам» (1968), «Нечаканая сустрэча» (1978), «Сланечнікі» (1980), «Ля самага сіняга мора» (1982). У кнізе «Над ракой Шушай» (1977) пісьменніца расказала пра жыццё У. І. Леніна ў ссылцы ў Шушанскім, яго дружбу з шушанскімі дзецьмі.

Я. Бяганская вядомая як перакладчыца на беларускую мову твораў польскіх і славацкіх пісьменнікаў.

### ПАШЫНА РАДАСЦЬ

Паша яшчэ ніколі не бачыла столькі кніжак. І паліцы імі застаўлены, і скрыня да верху набітая, і на стале Уладзіміра Ільіча заўсёды ладны стосік. Мусіць, ва ўсім Шушанскім няма столькі кніжак, колькі ў доме Ульянавых. Вось і сёння з воласці вялікі пачак прынеслі. Іх прыслалі здалёку, з самай Масквы. А як ім узрадаваўся Уладзімір Ільіч!

— Ну, Надзюша, цяпер мы з табой разбагацелі! — весела казаў ён, праглядаючы кніжкі.— Гэта ж якраз тое, што нам так патрэбна.

«Ну, якое ж гэта багацце? — дзівіцца Паша.— Гэта ж не золата, не серабро, не грошы. Што за іх купіш?» — разважае яна, пазіраючы на Уладзіміра Ільіча і Надзежду Канстанцінаўну, якія так цешацца з прысланых кніжак.

«Кніжнікі!..— ласкава сама сабе называе іх Паша, і ёй здаецца, што гэтая, прыдуманая ёю мянушка, вельмі падыходзіць да яе гаспадароў.— Цікава, што ў іх, у гэтых кніжках?» — думала не раз Паша.

Неяк пад вясну Паша прастудзілася. Ёй не дазволілі ўставаць з ложка, паілі рознымі лекамі, гарачым малаком, чаем. Дні цяпер цягнуліся вельмі марудна, і Паша не ведала, чым заняць сябе.

— Ой, як надакучыла мне хварэць! — пажалілася аднойчы Паша.

— Ведаю, што надакучыла,— лагодна ўсміхнулася ёй Надзежда Канстанцінаўна.— А хочаш, я табе пачытаю?

Пашы ніхто ніколі не чытаў кніжак. Яна чула толькі, як чытаў у царкве дзяк, але не вельмі разумела тое яго чытанне.

— Пачытайце,— абыякава прамовіла Паша.

Надзежда Канстанцінаўна прынесла кніжку, пагартала яе і, падсеўшы бліжэй да Пашы, пачала чытаць пра дзядулю Мазая і зайцаў. Паша слухала як зачараваная. Як не падобна было тое, што чытала Надзежда Канстанцінаўна, да нуднага царкоўнага чытання дзяка! Як усё тут было зразумела, цікава і проста. Перад усхваляваным уяўленнем Пашы паўставала яе роднае Шушанскае, яго людзі, іх справы і жыццё.

— Ой, дык гэта ж пра нашага Сасіпатыча! Ён жа таксама летась у паводку ратаваў малых зайчанят! — усклікнула Паша.

А калі Надзежда Канстанцінаўна скончыла чытаць пра дзядулю Мазая, Паша нясмела папрасіла:

— Пачытайце яшчэ...

— Падабаецца?

— Ага,— кіўнула Паша і, зручней уладкаваўшыся на падушцы, падрыхтавалася слухаць.

— Прачытаю я табе пра дзяўчынку Сашу,— сказала Надзежда Канстанцінаўна. Яна знайшла ў кнізе патрэбную старонку і пачала чытаць.

І зноў перад вачамі Пашы паплылі знаёмыя змалку малюнкі. Разам з дзяўчынкай Сашай Паша любавалася каласістай збажыной, збірала ў лузе кветкі, пляла вянкі, бегала да гумна, адкуль далятаў зладжаны перастук цапоў. Разам з Сашай яна ляцела на санках з ледзяной горкі... Як складна, як хораша напісана пра ўсё гэта ў кніжцы! А Надзежда Канстанцінаўна тым часам чытае далей:

> Плакала Саша, як лес высякалі,
> Ёй і цяпер яго шкода да слёз,
> Колькі было тут вясёлых бяроз...

І Паша раптам успамінае, як і яна плакала, калі неяк ранкам, прыбегшы на ўзлесак, не ўбачыла вясёлых кучаравых бяроз. Яны ляжалі пад сонцам ссечаныя, паніклыя.

— Гэта пра мяне...— задуменна гаворыць Паша, успамінаючы той сумны ранак, і слёзы вось-вось гатовы пасыпацца з яе вачэй.

— Ну, на сёння хопіць,— кажа Надзежда Канстанцінаўна і загортвае кніжку.

— Хораша напісана, складна,— узрушана гаворыць Паша, асцярожна праводзячы рукой па вокладцы кніжкі.

— Кніжку гэтую напісаў Някрасаў,— кажа Надзежда Канстанцінаўна і паказвае Пашы партрэт паэта, змешчаны ў кнізе, расказвае пра яго жыццё.

— Някрасаў...— ціха паўтарае Паша, углядаючыся ў партрэт паэта.

З гэтага дня Паша зусім іншымі вачамі пачала глядзець на кніжкі. Яна цяпер ведала, што пад сціплай кніжнай вокладкай можна прачытаць шмат цікавага. З асаблівай пашанай Паша глядзела на кніжку

Някрасава. Часта, застаючыся дома адна, яна брала яе ў рукі, разгортвала, усміхалася паэту, які глядзеў на яе з партрэта, узіралася ў радкі яго вершаў. Як ёй хацелася раскрыць таямніцу кожнай літары, кожнага слова, з якіх складаліся гэтыя роўныя радкі! За такім заняткам і захапіў яе аднойчы Уладзімір Ільіч. Паша не чула, як ён увайшоў у пакой, як падышоў да яе і стаў за плячамі. І толькі калі Уладзімір Ільіч асцярожна дакрануўся да яе пляча, Паша хуценька загарнула кніжку і паклала на месца.

— Хочаш навучыцца чытаць? — запытаў Уладзімір Ільіч.

— Ой, як хачу! — шчыра прызналася Паша.

— Зараз мы знойдзем табе настаўніцу,— з хітрынкай у вачах сказаў Уладзімір Ільіч.— Ды вось яна і сама да нас ідзе,— прамовіў ён і, абняўшы Пашу за плечы, рушыў насустрач Надзеждзе Канстанцінаўне.— Надзюша, я хачу зрабіць табе адну вельмі важную прапанову.

— Якую? — пацікавілася Надзежда Канстанцінаўна.

— Ці не магла б ты навучыць нашу Пашу грамаце?

— З вялікай прыемнасцю, Валодзя. Я і сама ўжо думала аб гэтым,— ласкава пазіраючы на разгубленую і шчаслівую Пашу, сказала Надзежда Канстанцінаўна.

Паша аказалася надзіва здольнай і стараннай вучаніцай. Гадзінамі яна магла сядзець над сшыткам і выводзіць літары, якія паказвала ёй Надзежда Канстанцінаўна.

І як жа ўзрадавалася Паша, калі, знайшоўшы ў сваёй любімай кніжцы патрэбную старонку, яна павольна, па складах, прачытала верш пра дзядулю Мазая і зайцаў. Паша чым хутчэй пабегла да Уладзіміра Ільіча, каб падзяліцца з ім сваёй радасцю.

— Малайчына, Паша! — пахваліў яе Уладзімір Ільіч.

### А НА ШУШЫ ДЗІВА ДЗІЎНАЕ

«І што гэта здарылася на рацэ, што людзі бягуць на Шушу, як апантаныя?» — думае Мінька, выходзячы за браму.

— Гэй, Мінай! Чаго стаіш? Айда на раку, паглядзім, што там за дзіва такое! — кліча яго Санька Ермалаеў.

Мінька кідаецца следам за Санькам. І хоць у вялізных валёнках, якія бацька зрабіў навырост, не дужа разгонішся, Мінька стараецца не адстаць ад сябра.

А вось і рака. Скаваная льдом, яна спіць, застыла ў абдымках абсыпаных снегам паніклых лозаў. Але сёння тут тлумна і шумна.

Праціскаючыся між дарослых, Мінька з Санькам выбіраюцца наперад, каб убачыць нарэшце, што ж тут такое сталася. Апынуўшыся на беразе, хлопчыкі ажно разяўляюць раты ад здзіўлення.

Пасярэдзіне ракі, нібы тая птушка, лётае чалавек. Ой, а што гэта ў яго на нагах такое бліжчастае ды вострае? Нажы, ці што? І як толькі ён на іх трымаецца, як не падае? Вось дзіва! Ды яшчэ выкрунтасы розныя робіць, пакідаючы на лёдзе дзівосныя ўзоры. Рукі ён трымае за спіной, крыху прыгнуўшыся наперад, і лётае, лётае, нібы птушка.

— Санька, дык гэта ж Ільіч! — крычыць Мінька.

— Ільіч? — здзіўлена абзываецца Санька.— Ну, вядома, ён! Як

жа гэта ён на гэтых нажах коўзаецца? Як трымаецца? — дзівіцца хлопчык.

— Гэта, дзеці, канькі,— чуюць раптам хлопчыкі знаёмы голас. Яны азіраюцца і толькі цяпер заўважаюць, што побач з імі стаіць Надзежда Канстанцінаўна.

— Канькі... конікі...— паўтарае паціху Мінька, не зводзячы вачэй з Уладзіміра Ільіча. Ніколі ў жыцці ён не бачыў гэтага цуду. Ніхто ў Шушанскім не мае такіх конікаў, ці, як іх, канькоў.

Неўзабаве Уладзімір Ільіч падлятае да Надзежды Канстанцінаўны і запрашае яе сесці ў сані, а хутчэй нават не ў сані, а ў крэсла, да якога прымацаваны палазы. Надзежда Канстанцінаўна асцярожна сыходзіць на лёд, садзіцца ў крэсла. Уладзімір Ільіч падхоплівае яго і лёгка коціць перад сабой.

— Глядзі, глядзі! Вось дзіва! — ускліквае адна з дзяўчат, што стаяць на беразе.

— Каб хаця не перакуліў яе, не дай божа! Гэта ж так імчыць! — спалохана гаворыць яе сяброўка.

Павазіўшы крыху Надзежду Канстанцінаўну, Ільіч кіруецца да берага, дапамагае ёй сысці з крэсла і весела звяртаецца да малых, якія стаяць наперадзе.

— А ну, хто тут смелы? Выходзь ды сядай хутчэй у крэсла.

— Я, я, я! — чуюцца галасы дзяцей.

— Станавісь у чаргу па двое! — падае каманду Уладзімір Ільіч.

Першыя селі ў крэсла Мінька з Санькам. Уладзімір Ільіч загадаў ім моцна трымацца за поручні і пакаціў. Хутка бягуць сані па звонкім бліскучым лёдзе, толькі вецер свішча ў вушах ды калючыя сняжынкі сякуць расчырванелы твар. А Уладзімір Ільіч прыбаўляе ходу, смяецца.

Зрабіўшы ладны круг па рацэ, ён кіруе крэсла да берага, дзе з нецярплівасцю чакаюць дзеці, і другая пара шчасліўчыкаў займае месца ў крэсле.

— Ну, здаецца, усё! — усміхаецца Уладзімір Ільіч, высаджваючы з крэсла апошнюю пару. Ён робіць заключны круг, здымае канькі і, расчырванелы, вясёлы, разам з малымі вяртаецца дадому.

А праз некалькі дзён з Уладзімірам Ільічом выходзіць на лёд Санька Ермалаеў. Бацька змайстраваў яму драўляныя канькі і падшыў адшліфаванымі да бляску кавалкамі жалезнага абруча. Не такія яны, вядома, як у Уладзіміра Ільіча, але, дарма, коўзацца можна. Праўда, коўзацца на каньках не такая простая справа. Дастаецца добра і бакам, і таму месцу, на якім сядзіш, як ляснешся раптам аб лёд.

— Хадзем, я павучу цябе, як трэба коўзацца на каньках,— прапануе Уладзімір Ільіч.

І пад яго каманду Санька пачынае асвойваць не такую ўжо і простую, як здаецца на першы погляд, канькабежную справу.

А цераз некалькі дзён са сваімі самаробнымі канькамі на Шушу выйшлі яшчэ два «канькабежцы».

— Нашага палку прыбыло! — весела прывітаў іх Уладзімір Ільіч.

## МІНЬКАЎ ЗАЯЦ

— Глядзі, што я табе прынёс! — кажа Мінька, асцярожна адчыняючы дзверы ў пакой Ільіча.

Вочы ў Мінькі блішчаць, шырокая ўсмешка расплываецца па твары. Ён падыходзіць да стала, за якім сядзіць Уладзімір Ільіч, і асцярожна адхінае крысо свайго каптана. Адтуль выглядае заечая пыска.

— Паслухай, як б'ецца ў яго сэрца, паслухай,— гаворыць Мінька.

Уладзімір Ільіч прыкладае да мяккай поўсці далонь.

— Бяры, бяры, гэта я табе прынёс,— пазіраючы на Уладзіміра Ільіча шчаслівымі вачамі, кажа Мінька.

— За падарунак дзякую,— усміхаецца Уладзімір Ільіч і асцярожна дастае з запазухі Мінькі зайца.— Дзе ж ты яго ўзяў?

— На ўзмежку ля Шушы злавіў. Ён уцякаў ад сабакі, а я — напярэймы яму, прысеў, раскінуў каптан. Ён і скочыў мне пад крысо.

— Не пашанцавала даўгавухаму. Ратаваўся ад аднаго лаўца, а трапіў у пастку другога,— трымаючы зайца за вушы, смяецца Ільіч.

— Каб жа ён не скочыў да мяне за пазуху, яго б сабака разарваў,— сур'ёзна тлумачыць Мінька.

— Гэта праўда,— згаджаецца Уладзімір Ільіч.— Толькі што мне з ім рабіць? Вось задача!

— А ты яго ў клетку пасадзі ды кармі. А як падгадуецца трохі, скуру злупі ды шапку сабе цёплую пашый. З вушамі, як у мяне. Ну, а мяса зайцава можна засмажыць ды з'есці,— па-гаспадарску раіць Мінька.

Уладзімір Ільіч глядзіць на Міньку, усміхаецца ледзь прыжмуранымі вачамі, а пасля гаворыць:

— А ты ў зайца запытаў, ці згодзен ён, каб мы шапку з яго пашылі?

— Ён жа не чалавек, а заяц,— смяецца Мінька.— Заяц гаварыць не ўмее.

— Твая праўда, не ўмее. Але ж і яму жыць хочацца. Як ты думаеш, Мінай, хочацца? Ён усю доўгую зіму гараваў, калеў на марозе, галадаў, ад воўчых зубоў ратаваўся, ледзь вясны, бедны, прычакаў. І раптам цяпер паміраць мусіць. Давай мы лепш вось што з табой зробім. Хай гэту ноч заяц пераначуе ў хаце, ачомаецца крыху, сілы набярэцца, а заўтра раніцай мы занясём яго ў лес ды выпусцім на волю.

Мінька пазірае на Уладзіміра Ільіча і паціскае плячамі.

— Як хочаш,— кажа ён.— Толькі ж шапка цёплая табе трэба.

— Якая з яго цяпер шапка? Ён жа толькі-толькі ліняць пачаў. Бачыш, як поўсць з яго лезе. Ды і наедку з яго зараз ніякага: адны рэбры ды скура. Ну, то як, дамо гэтаму бедалагу волю? — хітравата падміргвае Міньку Ільіч.

— Як сабе хочаш,— пераступаючы з нагі на нагу, зноў адказвае Мінька.

Праз ноч заяц ачуняў і павесялеў. Раніцай Уладзімір Ільіч пасадзіў яго ў кош, зверху кош абвязаў хусцінкай і выйшаў на ганак.

— А мы ўжо тут! — весела паведаміў Мінька.

Мінька быў не адзін. На ніжняй прыступцы ганка побач з ім сядзелі яго сябры — Пятрок і Санька.

— Ну, то пайшлі,— скамандаваў Уладзімір Ільіч.

Хлопчыкі падхапіліся і разам з Уладзімірам Ільічом падаліся ў лес.

Хораша ў лесе вясновай раніцай. Цёплае сонейка пранізвае яго сваімі праменнямі, вясёлымі агеньчыкамі ўспыхвае ў кроплях расы. У маладой зеляніне дрэў звіняць, заліваюцца птушкі.

Калі адышліся ў глыб лесу, Уладзімір Ільіч спыніўся на сонечнай палянцы, паставіў на пянёк сваю ношку і, звяртаючыся да Міні, весела прамовіў:

— Ну што ж, Мінай, выпускай на волю свайго палонніка.

Мінька развязаў хусцінку, схапіў зайца за вушы і апусціў яго на зямлю. Апынуўшыся на волі, заяц нейкі момант сядзеў і не варушыўся. Але варта было Уладзіміру Ільічу пляснуць у далоні, як ён раптам падскочыў і, як апантаны, кінуўся ў лясны гушчар.

— Бывай, даўгавухі! Ды глядзі, не трапляйся нам на вочы ўвосень! — весела ўсклікнуў Уладзімір Ільіч.

## ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА

Васіль Фёдаравіч Хомчанка нарадзіўся 12 студзеня 1919 г. у вёсцы Канічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля сканчэння Бялынкавіцкай сямігодкі ў 1934 г. паступіў у Мінскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум, з другога курса перавёўся на рабфак пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Некаторы час працаваў на Далёкім Усходзе на будаўніцтве чыгункі і на лесанарыхтоўках (1937—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам мінамётнага ўзвода. У 1951 г. скончыў Ваенна-юрыдычную Акадэмію ў Маскве. Звольнены з арміі ў запас у 1968 г. У 1972—1985 гг. працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

В. Хомчанка пачаў пісаць на рускай мове. Яго першае апавяданне «Анисов бор» было надрукавана ў 1954 г. у альманаху «Владимир». Ва Уладзіміры выйшлі першыя зборнікі апавяданняў для дзяцей «Куда исчез гриб» (1957), «Перчатки генерала Доватора» (1959) і кніга апавяданняў для дарослых «Жаворонок» (1958). На беларускай мове для юнага чытача выйшлі зборнікі апавяданняў «Наша вячэра» (1959), «Рукавіцы генерала Даватара» (1960), «Суседзі» (1962), «Чырвоны мак» (1964), «Верны рыцар» (1965), «Тваё чэснае слова» (1965), «Зімовы дождж» (1968), «Сустрэча з цудам» (1969), «Паляванне на львоў» (1970), «Цёплая зямля» (1971), «Я ўжо вялікі» (1972), «Уначы пад сонцам» (1974), «Паклон» (1976).

В. Хомчанка — аўтар аповесцей «Чырвоныя хвалі» (1968), «Я прынёс вам радасць» (1981), рамана «Вяртанне ў агонь» (1978). У 1982 г. выйшаў зборнік аповесцей і апавяданняў «Бацькава шабля», у 1985 — «Чэкістам стала вядома». Аповесць пісьменніка «Пры апазнанні — затрымаць» (1983) прысвечана паэту-дэмакрату Ф. Багушэвічу. У 1988 г. выйшла кніга аповесцей і апавяданняў «Стрэл у акно».

Для дзяцей В. Хомчанка пераклаў на беларускую мову казку Р. Кіплінга «Чаму ў слоніка доўгі нос» (1974).

### ДАРАГІ ПАДАРУНАК

Летам 1922 года хворы Ленін адпачываў у Горках, пад Масквой.

У Горках прыгожы парк. Ленін любіў хадзіць па яго дарожках. І амаль заўсёды з ім былі яго маленькія сябры — дзеці. Многія хлапчукі прыбягалі да Леніна з суседніх вёсак.

Быў сярод іх і Сяргейка, хлопчык сарамлівы і нясмелы. Усе дзеці расказвалі Леніну аб сваіх навінах, чыталі на памяць вершы і спявалі

песні. А Ленін таксама чытаў ім вершы. Сяргейка не ведаў ніводнага верша, а песні спяваць саромеўся. Ён быў самы маленькі з усяго гурту.

Аднойчы Сяргейка сказаў Леніну:

— А я ўвосень у школу пайду. Мне тата аловак купіў. І сшыткі, і пяро.

— Малайчына,— пахваліў Уладзімір Ільіч.— А ты ўмееш чытаць?

— Не,— пакруціў галавой Сяргейка.

— Тады давай вучыцца.

Ленін дастаў з кішэні фрэнча газету, падсеў да хлопчыка.

— Што гэта? — паказаў ён пальцам на вялікую круглую літару.

— Кружок,— не задумваючыся, адказаў Сяргейка.

Дзеці засмяяліся.

— Правільна, кружок. Толькі ён называецца літарай «О». А гэта? — зноў спытаў Ленін.

Другая літара мела дзве палачкі з перакладзінай пасярэдзіне. Сяргейка хацеў назваць яе лесвічкай, але сябры апярэдзілі яго.

— «Нэ!» — разам крыкнулі яны.

— Не «Нэ», а «Н»,— паправіў Ленін.

— Я таксама чытаць навучуся,— сказаў Сяргейка і пачырванеў.— Яны ўжо ўсе ходзяць у школу...

— Вядома, навучышся,— згадзіўся Ленін.— І чытаць і пісаць.

— Толькі ў мяне буквара няма,— прызнаўся Сяргейка.

— І ў нашым класе ўсяго тры буквары было,— сказаў хтосьці з дзяцей.

— Так,— задумліва прамовіў Ленін.— Мы цяпер бедныя. Няма ў нас пакуль што ні кніг, ні хлеба ўдосталь. І дзеці яшчэ не ўсе вучацца... Але хутка мы будзем усё гэта мець. І ў кожнага вучня будзе буквар. Абавязкова.

Развітваючыся з дзецьмі, Уладзімір Ільіч сказаў Сяргейку:

— А тваёй бядзе мы пастараемся дапамагчы.

Дні праз тры Уладзімір Ільіч зноў сустрэў у парку дзяцей і, хаваючы штосьці за спіной, яшчэ здалёк крыкнуў:

— А ну, хто з вас адгадае, што ў мяне ў руках?

Дзеці пачалі наперабой адгадваць. Нехта крыкнуў, што грыб, другому здалося, што шышка яловая. А хтосьці нават сказаў, што ў Леніна жывая вавёрка.

— А я ведаю,— сказаў Сяргейка.— Буквар.

— Правільна, Сяргейка. Буквар і ёсць,— усміхнуўся Ленін.— Ты адгадаў, табе ён і належыць.

І Ленін падаў Сяргейку новенькі, з прыгожымі малюнкамі і вялікімі літарамі буквар.

Прысеўшы на траве між дзяцей, Уладзімір Ільіч пачаў вучыць хлопчыка чытаць.

— Ма-ма,— паўтараў за Леніным Сяргейка.— Ма-ша. Мы не ра-бы...

Калі Сяргейка прыйшоў у школу, ён ужо ўмеў чытаць і ведаў на памяць усе вершы з буквара.

— Хто цябе навучыў чытаць? — спытала ў Сяргейкі настаўніца.

— Ленін,— адказаў хлопчык, і ўсе ў класе паглядзелі на яго з зайздрасцю.

Доўга потым яшчэ вучыўся Сяргейка, шмат прачытаў кніг, але са сваім першым букваром — падарункам Леніна — ніколі не расставаўся.

## ЧЫРВОНЫ МАК

Яго прозвішча мала хто ведаў. У горадзе ўсе звалі яго дзядзькам Раманам ці проста садоўнікам. Жыў ён у маленькім, нібы цацачным, доміку, які туліўся ля самага яра. Вакол доміка з вясны да першага снегу цвілі кветкі. У доме ўсе вокны былі застаўлены вазонамі. Круглы год ішлі сюды людзі па кветкі.

Яму споўнілася семдзесят год, калі грымнула вайна. Апаўдні над горадам праляцелі самалёты і скінулі бомбы. Некалькі бомб упала на плошчы. Яны зруйнавалі скверык з фантанам, разбурылі бліжэйшыя будынкі. А праз чатыры дні ў гарадскім доме культуры размясцілася фашысцкая ваенная камендатура.

Жыхары горада цяпер рэдка паказваліся на вуліцы. А калі хто трапляў на плошчу, то бачыў, як адзінока корпаўся там чалавек. Гэта быў садоўнік.

Па сваёй ахвоце працаваў ён з ранку да вечара. Расчышчаў заваленыя зямлёй клумбы, засыпаў ямы. Да яго падыходзілі немцы, паблажліва ляпалі па плячы, гаварылі: «Гут, гут. Карашо». Калі клумбы і дзялянкі былі гатовы, ён пасеяў нейкія кветкі, высадзіў расаду. Потым насіў вёдрамі ваду і паліваў клумбы.

Многія гараджане пры сустрэчы з садоўнікам злосна кідалі яму ў вочы: «Выслужваешся, вужака!» Стары адмоўчваўся. Знаходзіліся і такія, што спрабавалі ўночы вытаптаць кветкі на плошчы. Камендант выдаў спецыяльны загад, у якім прыгразіў павесіць кожнага, хто будзе псаваць клумбы. Тады невядомыя выбілі ў доме садоўніка ўсе вокны. Але стары ўпарта прыходзіў на плошчу, рыхліў глебу, падсяваў насенне, саджаў новую расаду. Здавалася, гэтыя клумбы сталі самым галоўным у яго жыцці.

Кветкі на плошчы пайшлі ў рост, пачалі цвісці. Запунсавелі аксамiткі і амаранты, распусцілі свае махры леўкоі, дружна выбіліся сіваватыя сцябліны макаў. Макамі была засеяна самая вялікая дзялянка. Над клумбамі, як калісьці ў мірныя дні, гудзелі пчолы, лёталі матылькі. Ветрык разносіў на плошчы тонкі водар кветак.

Аднойчы раніцай зацвіў і мак. Ён успыхнуў крывава-чырвоным агнём адразу на ўсёй дзялянцы. Кожны пялёстак быў нібы язычок полымя. Але самае незвычайнае першым заўважыў адзін хлопчык, які зірнуў на клумбу з паркана. У хлопчыка ад хвалявання моцна затахкала сэрца. Ён саскочыў на зямлю і колькі меў сілы памчаўся да сваіх сяброў. А неўзабаве то адзін, то другі з жыхароў горада, быццам ідучы па справе, зварочваў да плошчы і праходзіў паўз скверык. Некаторыя часам прыпыняліся і падоўгу стаялі, углядаючыся ў клумбы. У вачах людзей свяцілася радасць.

Калі ўзысці на пагорак, што быў недалёка ад скверыка, то можна было прачытаць жывое, з чырвоных макаў, слова:

— Ленін.

Цяпер нарэшце зразумелі людзі, для чаго стараўся дзядзька Раман.

А мак цвіў і цвіў. Адны пялёсткі асыпаліся, на змену ім расцвіталі другія, і слова «Ленін» не згасала.

І каму было асабліва цяжка, хто пачынаў траціць веру ў свае сілы, той ішоў на плошчу і чытаў гэтае агністае і неўміручае слова. І яму рабілася лягчэй.

Аднойчы фашысцкі камендант, выйшаўшы на балкон, таксама прачытаў на клумбе тое слова. Як ашалелы, кінуўся ён у камендатуру, і ўжо праз некалькі хвілін грузавік з салдатамі імчаўся па вуліцы. Каля садоўнікавага доміка машына спынілася. Салдаты разбілі замкнутыя дзверы, але гаспадара не знайшлі. Тады яны спалілі дом, а вярнуўшыся на плошчу, вытапталі і вырвалі на клумбе ўвесь мак.

Людзі сумна пазіралі на завялыя пялёсткі маку, якія разносіў па плошчы вецер. І раптам маленькая дзяўчынка, што праходзіла з маці паўз скверык, паказала на клумбу пальчыкам і прачытала:

— Ле-нін.

— Ленін,— прачыталі разам з ёю людзі.

Сінія і жоўтыя браткі, што раней былі заслонены макам, склалі гэтае неўміручае слова.

На другой клумбе гэтае слова ўтваралі ружовыя аксаміткі. Між імі расла непрыкметная пахучая рэзеда, і таксама чыталася: Ленін.

А старога садоўніка надзейна хавалі людзі. І жыў ён у іх аж да самага вызвалення горада.

### САЛДАЦКАЯ КРЫНІЦА

Калісьці ля нашай вёскі займаліся салдаты. Вучыліся ваяваць: стралялі, акопы капалі, наступалі.

Была спёка. Адзін салдат захацеў піць. Ён дастаў з чахла рыдлёўку і пачаў расчышчаць крынічку, што выбівалася з-пад зямлі ля старой алешыны на лужку. Калі вада адстаялася, салдат прагнаў смагу і пайшоў сваёй дарогай.

Другі салдат крынічку паглыбіў. Яна забруіла, напоўнілася да берагоў. Салдат набраў вады ў біклагу для сяброў, сам напіўся.

Назаўтра салдаты прынеслі да крыніцы бярвенцы і зрабілі зруб. Хтосьці з іх сплёў коўшык з бяросты, павесіў яго ля крыніцы на суку алешыны.

Салдаты праз тыдзень паехалі і ніколі больш у нашу вёску не вярталіся. А крыніца засталася. Вада ліецца цераз бярвенцы, і па лузе міма вёскі бяжыць ручаёк, вясёлы, звонкі, чысты, як сама крыніца. Уся вёска п'е тую ваду. Дзеці, якія калісьці талакой бегалі за салдатамі, цяпер ужо выраслі. Новыя дзеці, вядома, не памятаюць, як прыязджалі ў вёску салдаты, а ўсё адно называюць крыніцу салдацкай. Так і гавораць:

— Пайшлі на салдацкую крыніцу.

Добрую памяць пасля сябе пакінулі салдаты.

## ПАКЛОН

Хлопчык катаўся на каньках і праваліўся пад лёд. Дзеці, якія гулялі побач, закрычалі, забегалі, але ніхто не адважыўся кінуцца ратаваць хлопчыка.

На шчасце, па беразе ішоў салдат. Ён пачуў крык і, скінуўшы на бягу шынель і шапку, скокнуў у рэчку. Нырнуў і неўзабаве падняў над галавой хлопчыка. Салдату было ў рэчцы па шыю, і да берага ён ішоў, крышачы лёд.

Сабраліся людзі, прыбегла маці хлопчыка, плача, дзякуе салдату, запрашае дамоў абсушыцца.

Салдат выліў з ботаў ваду, апрануў шынель і бягом памчаўся ў свой ваенны гарадок. Ніхто не паспеў у яго нават імя спытаць. І ў твар ніхто не запомніў.

Назаўтра ў наш ваенны гарадок прыйшла жанчына, расказала, як салдат выратаваў яе хлопчыка, і папрасіла паказаць таго салдата. Мы аб'явілі па ўсіх ротах, каб салдат з'явіўся ў штаб. Чакалі, чакалі, а той так і не прыйшоў.

Тады падвялі жанчыну да строю і сказалі: «Шукайце самі салдата, вы ж яго бачылі». Жанчына прайшла паўз строй раз, другі і не пазнала нікога. Яна вельмі засмуцілася, што не можа падзякаваць салдату.

— Маладыя такі,— сказала яна.

Зноў агледзела строй, расчаравана махнула рукой — усе былі маладыя.

— Камсамольскі значок на гімнасцёрцы бачыла.

Але амаль ва ўсіх салдат на грудзях блішчалі камсамольскія значкі.

Жанчына пайшла да варот, потым вярнулася, стала перад строем і нізка, нізка пакланілася ўсім салдатам.

## ЦВІК

Ішоў Вася па вуліцы і знайшоў цвік. Цвік быў новы, бліскучы. Пахваліўся знаходкай суседскай Тані.

— А я цвік знайшоў, во!

— Дай мне,— папрасіла яна.

— А навошта табе? — спытаў Вася.

Яна і не ведала, навошта ёй такі цвік. Гэта ж не лялька, з якой можна гуляць.

Вася падышоў да трактарыста, які нешта ладзіў у трактары.

— Дзядзька, я цвік знайшоў. Не вы згубілі?

— Не, не мой,— адказаў трактарыст.— Гэта, відаць, дзед Іван згубіў. Ён сёння купляў цвікі ў магазіне.

Вася пайшоў да дзеда Івана. Дзед рабіў новыя вароты. Яны ляжалі на зямлі, а дзед прыбіваў да іх дошкі такімі ж, як у Васі, цвікамі.

— Дзед Іван, я на вуліцы цвік знайшоў.

Дзед узяў у Вані цвік, прымераў са сваім.

— Такі, як мой. Можа, і згубіў, калі нёс.

— Дык вазьміце сабе,— сказаў Вася.

— Што ж, дзякуй, спатрэбіцца.

Дзед прыставіў той цвік да варот і трохі ўбіў яго ў дошку. Даў малаток Васю і сказаў:

— Забі ты.

Вася забіў.

— Моцна будзе трымаць дошку,— радаваўся ён,— не адарвецца.

— Малайчына,— пахваліў дзед Васю,— выручыў твой цвік.

— Ага, калі б не ён, то адна дошка ў варотах была б не прыбіта.

### ВЕНІКІ

Пеця навязаў бярозавых венікаў на зіму, каб парыцца ў лазні, і павесіў іх пад страхой пуні.

«Хопіць нам на ўсю зіму»,— цешыўся ён.

Прыйшла зіма, халодная і вельмі снежная, надзьмула высокія гурбы. Яблыні ў садзе па голле патанулі ў снезе. А каля пуні, дзе віселі венікі, гурба даставала да самай страхі.

Аднойчы выйшаў Пеця на агарод узяць венік і ледзь не заплакаў. Ад венікаў адны агрызкі засталіся. Усе венікі з'елі казулі ды зайцы. Толькі сляды свае пакінулі. Не адну, відаць, ноч звяры прыходзілі карміцца.

Пеця прывёў бацьку да пуні, паказаў:

— Во, усе венікі з'елі.

— З'елі і дзякуй сказалі.

— Каму?

— Табе. Падкарміў іх у суровую зіму, выручыў.

Наступным летам Пеця з сябрамі нарыхтаваў венікаў і звярам. Розных: бярозавых, асінавых, лазовых. А бацька стажок сена паставіў. Калі ласка, звяры, прыходзьце карміцца, толькі нашых венікаў не чапайце.

Звяры і прыходзілі. Нават лася бачылі, скуб сена са стажка.

## РЫГОР БАРАДУЛІН

Рыгор Іванавіч Барадулін нарадзіўся 24 лютага 1935 г. у вёсцы Гарадок Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959). Працаваў у рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», часопісаў «Бярозка», «Беларусь», «Полымя». З 1969 г. працуе рэдактарам выдавецтва «Беларусь», а з 1972 г.— у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Друкавацца пачаў у газеце «Чырвоная змена» ў 1954 г. Першая кніга вершаў «Маладзік над стэпам» выйшла ў 1959 г., затым — «Рунець, красавацъ, налівацца» (1961), «Нагбом» (1963), «Неруш» (1966), «Адам і Ева» (1968), «Лінія перамены дат» (1969), «Рум» (1974), «Свята пчалы» (1975), «Абсяг» (1978), «Вечалле» (1980), «Амплітуда смеласці» (1983), «Маўчанне перуна» (1986). Гумарыстычныя і сатырычныя творы склалі зборнікі «Дойны конь» (1965), «Станцыя кальцавання» (1971), «Журавінка» (1973), «Прынамсі» (1977), «Мудрэц са ступаю» (1988).

Маленькаму чытачу Р. Барадулін прысвяціў вершы і казкі, што склалі зборнікі «Мех шэрых, мех белых» (1963), «Красавік» (1965), «Экзамен» (1969), «Ай! Не буду! Не хачу!» (1971), «Што было б тады б, калі б?» (1977), «Ці пазяхае бегемот?»

(1981), «Азбука не забаўка» (1985), «Індыкала-кудыкала» (1986). Юнаму чытачу адрасаваны кнігі вершаў і паэм «Вяртанне ў першы снег» (1972), «Суровая вымова» (1976).

Р. Барадулін вядомы як перакладчык на беларускую мову твораў Д. Байрана, А. Міцкевіча, Б. Брэхта, Я. Райніса, С. Ясеніна, П. Тычыны, Э. Межэлайціса, А. Вазнясенскага, Я. Еўтушэнкі і іншых паэтаў. У 1976 г. за зборнік вершаў «Рум» і пераклад выбранай лірыкі Ф. Гарсія Лоркі «Блакітны звон Гранады» Р. Барадуліну прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы.

За паэму «Балада Брэсцкай крэпасці» (1975) паэту прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі.

## СВЯТА НАШЫХ СВЯТ

Сцягоў чырвоных вадаспад
І горнаў
Спеў срабрысты
Яднае
Свята нашых свят —
Кастрычнік урачысты.

Не згасне ў памяці эпох,
Здзяйсненняў дзёрзкіх поўны,
Пачатак нашых перамог —
Кастрычнік векапомны.

Свабодзе крылы распрасцёр,
Паслаў планеце вёсны,
Наш горды герб
Узнёс да зор
Кастрычнік заранослы.

Рака
Бярэ выток з ручча,
Абвал —
З захмарнай кручы.
Прарочым словам Ільіча —
Кастрычнік неўміручы!

## КОЛЬКІ РАНІЦ МЕСЦІЦЬ РАНЕЦ?

Як памножыш на гады
Дні і месяцы,
Тады
Падлічыць набудзеш шанец,
Колькі раніц
Месціць ранец.

Раніц многа
Ранец месціць.
Кожны дзень
І кожны месяц
Іх кіруе ў школу рана,
Каб вучыліся старанна.

Ты расцеш —
Растуць гады.
Не сцішаючы хады,
Раніцы ідуць з табой
З першай радасцю,
Журбой.

Першая
Ступае тая,
Жоўтым лісцем залатая,
Следам —
Раніца другая,
Першай партай дарагая.
Раніцай вясёлай трэцяй
Промень хітра ў вокны свеціць.

Добрых раніц
Шмат у школе —
Не забудзеш іх ніколі:
З першаю тваёй пяцёркай,
З акцябрацкай зыркай зоркай,
З гукам горна,
Сцягам гордым,
З першым у жыцці рэкордам,
Хай пакуль што не сусветным,
З першым смуткам
Самым светлым.

У вяснушках лісця,
Рыжы
Раніцу прывеціць рад
Задуменны лістапад.

Снежань
Раіць дбаць пра лыжы.
Нават грозны месяц люты
Запытаецца,
Чаму ты
Не прыходзіш на каток
Правяраць на звон лядок.
Сакавік качае снежкі,
Красавік казыча ўзмежкі.
Вострыць май
На нудных ікал,
Запрашае да канікул.

Кожнай раніцы
Усмешка
Непаўторная такая.
Да Краіны Ведаў
Сцежка
У дарогу вырастае.

Раніцы з табою ўсе —
У лістах,
Снягах,
Расе.
З іх,
Турбот і шчасця поўны,
Твой
Пачаўся
Дзень працоўны.

**ВІНАВАТЫ ТУТ НЕ СШЫТКІ**

У Мікіткі двойкі ў сшытку
Шыі гнуць,
Як тыя гусі.
Абяцае ўсё Мікітка:
— За вучобу я вазьмуся.
Сшытак новы завяду
І, нібы на паваду,
Ўсе пяцёркі павяду.

З захапленнем,
Са стараннем
Ён рашаў задачу ўранні,
Толькі так пяром вадзіў —
Кляксу з бохан пасадзіў.
Уздыхаў Мікітка горка:
— Зноў не будзе мне пяцёркі...
А назаўтра
Жвава, вёртка
Маляваў хлапец вавёрку.
Так малюнкам захапіўся,
Што на хвост зусім забыўся.
— Не было б хваста ў вавёркі,
Атрымаў бы я пяцёрку...

Потым з дружбаком Ягоркам
Коўзаўся Мікітка з горкі.
Прапусціў урок хлапчына,
Ды знайшлася зноў прычына:
— Каб не горка, не Ягорка,
Я б дамоў прынёс пяцёрку...
І адна ў яго гаворка:
— Каб ды каб,
Я б меў пяцёрку...

Сшыткі новыя заводзіў,
Толькі з двойкамі прыходзіў.

**СЕМ ЯНОТАЎ**

У суботу
Сем янотаў
З раніцы
Вучылі ноты.

Ледзь адзін адолеў
до,
Уздыхнуў:
— На гэтым до!
Вельмі ж сумная навука,
Не навука, а дакука.

А другі дайшоў да
рэ:
— Нешта ў горле мне дзярэ.
Не навука, а сухоты,
Без яе жылі яноты!

Трэці — узяць не можа
мі:
— Што тут галаву тлуміць!
Часу у мяне багата,
Лепей слухаць казкі таты.

А чацвёрты:
— Што мне
фа,
З двойкай можа быць графа,
Не!
Навука не па мне —
Хай яна мяне міне!

Пяты кажа:
— Чую
соль —
Працінае вушы боль.
Невясёлая навука.
Буду маме пець на вуха.

Шосты моршчыцца на
ля:
— Неяк вывучу пасля!
Лепей бегаць ля галля,
Чым выводзіць ля ды ля.

Сёмы ўзненавідзеў
сі:
— Хоць мяне ты укусі,
Хоць прасі, хоць не прасі,
Мне цягнуць абрыдла сі!

Ахапіла ўсіх лянота —
І не вывучылі ноты.

## РЭГУЛІРОЎШЧЫК

Зай-рэгуліроўшчык
Атрымаў жазло.
Ані ў кога
Лепшага
Пэўна не было.
Морквінка чырвоная,
А зялёны хвост,
Морквін хвост
Паказвае —
Рухайся наўпрост.
Морквінку чырвоную
Раптам узнясе —
Рух увесь
Спыняецца
І стаяць
Усе.
У рэгуліроўшчыка
Усё ішло
Як след.
Толькі непрыкметна
Падышоў
Абед.
З'еў
Святло зялёнае
Зайчык пакрысе.
І на шумнай вуліцы
Згрудзіліся ўсе.
А калі чырвонае
Згрыз
Святло
Пацíху —
Выпусціў на вуліцу
Зай
Неразбярыху.

## НА ШАШЫ І ЛЯ ШАШЫ

Штохвіліны на шашы
Шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
Шорах,
Шум птушыны.
За машынаю машына.
Нешта шэпча
Шына шыне.
Шпак шыкуе
На шыпшыне.
А пад шатамі ў цішы
На ляшчыне спарышы.
У капелюшы спарыш,
Пашукай спарыш, малыш!
Шпарка па шашы ў кашы
Пашыбуюць спарышы.
Шэпча шустрая шаша:
— Не спяшайцеся, ша-ша...

## ЯК ВОСЕНЬ ДРЭВЫ АШУКАЛА

Вяслуюць крыламі буслы,
Плывуць,
плывуць
над светам.
Атаваю,
Іржышчам злым
Пайшло упрочкі лета.
Свае ўладанні
На зары
Абходзіць восень важна,
Заходзіць у лясы,
Бары
Ды ціха дрэвам кажа:
— Паабшарпаліся зусім,
Апратка ў вас старая,
На сонцы выцвіла.
Усім
Я вам зычліва раю:
Хутчэй скідайце лахманы,
Азябнеце ў тумане!
Я ж прынясу вам без маны
Навюткае убранне.
Усю зіму
Сястра вясна
За морам кросны ткала,
І з раннім выраем яна
Тканіну пераслала.
Спяшаў, ляцеў
Да гнёзд сваіх
Гарласты гурт грачыны,
Аднак не мог забраць усіх
Сувояў зяляніны.
Я запрагу вятроў
І ўраз,
Ледзь толькі сонца ўстане,—
З-за мора прывязу для вас
Навюткае убранне...

Гарыць агонь
Па ўсёй зямлі.
На возеры,
Ў канаўцы —
Кляны
Сям'ёю пачалі
Маўкліва распранацца.
І ясень
Прыклад даў вярбе.
Рабіны сумавалі,
Адно пакінулі сабе
Гарачыя каралі.

Дрыжыць:
— Не трапіць у бяду б! —
Асіна ўся ад страху.
І расшпіліў
Плячысты дуб
Цяжкую апранаху.

Адкуль узяўся той вятрэц,
Як ухапіў за полы.
Дуб-тугадум,
Стары мудрэц,
Стаяць застаўся голы.

У восені
Зашмат турбот
І ніякой падмогі.
Пакуль праверыла ўмалот,
Паразмяла дарогі...

Пакуль яна
Знайшла вятроў —
Пасліся ў лузе недзе,—
Пакуль запрэгла,—
З-за лясоў
Мароз са снегам едзе.

## АЗБУКА НЕ ЗАБАЎКА

Азбука
Не забаўка.
На паперы злітныя,
Быццам хвалі з-за буйка,
Наплываюць літары.

Літары
Ад **А** да **Я** —
Пчолы з дружнага рая:
Носяць мёд
У соты ведаў.

Просяць,
Каб усё ты ведаў.
Паступова,
Пакрысе
Іх запомніць
Трэба ўсе.

— Агу! — **А** голас падае.
А — найвялікшая павага,
Бо пачынаецца з яе
Айчына,
Азбука,
Адвага.

**Б**еларусі ўсёй бязмежжа
Гэта літара хавае:
Бульба,
Бераг,
Белавежа,
Бор і вышка буравая.
У чырвоных новых ботах
Бусел тужыць па балотах.

**В**алун параіў валуну:
— Падстаў спіну,
А я зірну,
За плотам далячынь якая.
Так і вякуюць валуны,
Зрасліся ля слупа яны.
Адзін глядзіць,
Другі чакае.

**Г**лянь,
Сагнула даланю,
Г,
Каб змерыць глыбіню.
Дзе яно,
Глухое дно?
З галавой Г не відно!

**Д** зрабілася, што кадка.
Тут патрэбна фіззарадка!
Падагнуўшы смешна ногі,
Прысядае да падлогі.

**Е**халі вясёла сані,
Мчаліся тры рысакі.
Е чарнела за лясамі
Быццам елка ў тры сукі.

А над елкай
Дзве сарокі
Пільнавалі шлях далёкі,
Ці яшчэ гняздо чыё.
Непаседныя чысцюлі
Елку толькі ледзь кранулі,
З Е раптоўна стала **Ё**.

**Ж**аўранак звініць
над жытам.
Сонца ўстала з-за лясоў.
Жне камбайн
з вясёлым спрытам
Промні спелых каласоў.

**З**ябка збіўшыся ў камяк,
Падагнуўшы лапкі,
Зайка-віславух абмяк —
Злосны сівер зябкі.
Вымаўляе З завея,
Так, што неба ружавее.

**І**скры,
Ад салюта іскры
Падаюць на абеліскі.
Каб не меў ты долі горка**Й**,
Па́лі волаты ў баі.
І — як абеліск над зоркай.
Як прамень, прамое І.

**К**радком ступае пакрысе.
Што за спіною К нясе?
Куды ідзе,
Нясе каго?
Як хочаш,
Сам спытай яго!

**Л**апа льва
Ці ножка лавы
Злева так стаіць
Ці справа?
Лапа ў кошкі,
Лапа ў рысі.
Лепш за лапы не бярыся!

**М**оўчкі я і ты ішлі,
А звялі далоні,
Сталі МЫ,
І на зямлі

Смех звініць сягоння.
З М — на ўвазе гэта май —
Мама,
Мір
І светлы Май!

**Н**евядома хто парэзаў
На кавалкі лесвіцу:
Шмат драбін
Для ўсіх гарэзаў,
Ды па іх не лезецца.
У навуку шлях круты —
Не забудзь пра гэта ты!

**О**кае, окае
Кола крутабокае,
Бо, падняўшы сотню тон,
Самазвал бярэ разгон.
З Белавежы наш БелАЗ
Возьме ўсіх зуброў за раз.

**П**акуль збіраюць
новы дом
Без гэбля, без сякеры,
Пустуе без дзвярэй праём,
П просіць:
— Дайце дзверы!

**Р**уку пад паху Р бярэ.
Уранні росна на двары.
Смех ухапіўшы за руку,
Пабег Раман дагнаць раку.
З Р пачынаецца расклад.
Рабочы час раскладу рад.

**С**тынуць капытоў сляды
І не выпадкова
Грэе сонца ў халады
Месяца падкова.
Хто падкову ўзнёс на неба,
Зразумець самому трэба!

**Т**элеантэны не ад страху
Уздрыгваюць на кожным
даху,
Яны павінны
Штохвіліны
З усёй зямлі лавіць навіны.
Запамінаецца адменна:
Т — тонкая тэлеантэна.

**У**бок, угору ад ствала
Галінка ціха ў рост пайшла.
У-у — вые ў неба воўк зімою
З ашчэранаю пашчай злою.

**Ў** — запалілі факел звыкла,
І ў той жа момант
Цемра знікла.

**Ф**ыркае, надзьмуўшы шчокі,
Ф забылася на ўрокі,
Як сур'ёзнай быць такой —
Смех за кожнаю шчакой.

**Х** — нажніцы ад знямогі
Выпрасталі рукі, ногі —
Хай іголка-даўгашыя
Хвартухі даўгія шые!

**Ц**япер ісці далей
пара нам.
Ц — цяжкая цыстэрна
з кранам.
Крыху павернеш кран
яшчэ —
Цурок з цыстэрны пацячэ.

**Ч**акае ўпарта арляня,
Калі пакліча вышыня.
Квартал,
Дзе ўзрос за гмахам гмах,
Нібы арліных крыл размах.
І вельмі важнае таму,
Што пачынае ўсе «чаму?».

**Ш**эпча штосьці
шасцярня,
Быццам Ш — яе радня.
І зусім не для забавы
Шасцярня скрыпіць зубамі.
Далічыўшы да шасці,
Можна ўжо шукаць ісці!

**Э**х! — Э праходу не дае,
Язык паказвае сярдзіта,
Таму ў канцы шукай яе,
А не ў пачатку алфавіта.

Юны стане чэмпіёнам —
Бач, як гоніць мяч са звонам,
Вучыць кемлівасць сваю.
Даланя з мячом,
Як Ю.
Ты пяеш і я пяю —
Кожны песеньку сваю.

— Я ў канцы быць
не магу! —
Выстаўляе Я нагу.
Той, хто я́кае зашмат,
Ставіць сам сябе назад!

Ведай,
Да навук ахвочы,
Азбука —
Вучэння вочы!
Азбука —
Ад **А** да **Я** —
Спадарожніца твая,
У краіну ведаў шлях
Пачынае па складах.
Са складоў
складзецца слова.
Слова —
Добрых спраў аснова.

### КАЛЫХАНКА

Ціха ноч ступае
З зорнаю сявенькай.
Па сінім Дунаі
Дзед плыве сівенькі.

А вязе ён кадку,
Мёд салодкі ў кадцы.
Кожнаму дзіцятку —
Па цікавай казцы.

Мёдам вочкі мажа,
Доўга казку кажа.
А гэтага дзеда
Дзеткам трэба ведаць.

Не рыпнуць завесы,
Калі зойдзе ў хату.
Добрым сном завецца
Дзядок барадаты.

Ты, дзядок, у лодку
Забяры Ілонку —
Няхай засынае
На сінім Дунаі.

Як засне — да мамы
Прывязі малую.
Хвалі б'юць памалу,
Месячык вяслуе.

Плыві, плыві, лодка,
Засынай, Ілонка!
Лю-лі, лю-лі, лю-лі!
Зораньκі паснулі.

## ВАСІЛЬ ЗУЁНАК

Васіль Васільевіч Зуёнак нарадзіўся 3 чэрвеня 1935 г. у вёсцы Мачулішча Крупскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылішча (1954), аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959). Затым працаваў у рэдакцыях газет «Рабочае юнацтва» (1959—1960), «Піянер Беларусі» (1960—1966). У 1972—1978 гг. быў галоўным рэдактарам часопіса «Бярозка». Працаваў у часопісе «Маладосць» — спачатку намеснікам (1966—1972), а затым галоўным рэдактарам (1978—1892). З 1982 г. ён сакратар праўлення СП БССР.

Друкавацца пачаў з 1954 г. Выдадзены зборнікі вершаў і паэм В. Зуёнка «Крэсіва» (1966), «Крутаяр» (1969), «Сяліба» (1973), «Нача» (1975), «Час вяртання» (1980), «Світальныя птушкі» (1982), «Лукам'е» (1984), «Жніўны дзень» (1985), «Вызначэнне» (1987). Гумарыстычныя вершы склалі зборнік «Качан на п'едэстале» (1973).

В. Зуёнак — аўтар кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў «Лінія высокага напружання» (1983).

Плённа працуе В. Зуёнак у галіне дзіцячай паэзіі. Дзіцячыя творы паэта склалі зборнікі «Вясёлы калаўрот» (1965), «Жылі-былі пад вадой» (1969), «Сонечны клубочак» (1972), «Будзем сілы набірацца» (1974). У 1987 г. выйшаў з друку зборнік вершаў, казак, жартаў, загадак «Хата, поўная гасцей». Юнаму чытачу паэт адрасаваў таксама кнігі нарысаў «Любіць прыроду — любіць Радзіму» (1962), «Працай славіцца чалавек» (1963).

У 1974 г. за кнігу вершаў «Сяліба» паэту прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі, за паэму «Маўчанне травы» (1980) — Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы (1982).

## ПОЛЕ

Поле — не толькі зямля,
Гэта і неба, і ветрык,
І васілёк, што здаля
Свеціць душою прыветнай.

Гэта і жаўранка спеў —
Першынца хмаркі вясёлай,
Гэта надзеі пасеў,
Мудрасці жніўная школа.

Гэта і дождж, што ідзе,
Каб з ярыной паяднацца,
Гэта бяссонне людзей
І хлебадайная праца.

Поле — не поле без нас.
І перапёлка ў жыце
Кліча:
— У першы свой клас,—
Дзеці, у поле бяжыце!

## ЗОРКІ ВЫПАЛІ Ў БАРЫ

Вы не бачылі, сябры,—
Зоркі выпалі ў бары!

Дзе ні глянеш,
на паляне —
Пад лістамі, ля пянькоў —
Сотні зыркіх аганькоў.

Свецяцца жарынкі —
Цёплыя смяшынкі,
Сонечныя дочкі —
Зваблівыя вочкі.

У бары, у бары
Дол увесь іскрыцца,
У бары, у бары
Выспелі суніцы!

## БУДЗЕМ СІЛЫ НАБІРАЦЦА!

Лета Юзю прывяло
На канікулы ў сяло.
Рады дзед і баба рада —
Напякла стажок аладак:
— Еш, унучак, папраўляйся,
Сіл, унучак, набірайся...
Спалавініў Юзя «стог»,
У цяньку спачыць прылёг.
Падрамаў на жываце —
Дзень да поўдня праляцеў,
Павярнуўся на спіну —
Дзень даўным-даўно мінуў...
Ранкам выйшаў у паход —
Аж за школьны агарод.
Толькі ж трэба так, скажыце:
Заблудзіўся Юзя ў жыце...
Не відаць ні хат, ні сонца...
Нібы ў джунглях тых
бясконцых,
Крочыў Юзя так і гэтак,
Вызначаў напрамкі свету,
Бабку, дзеда
Небарака
Клікаў, клікаў — і заплакаў:
— Не бадзяцца,
не стамляцца —

Ехаў сілы набірацца...
Дык нашто ж,
Нашто я лез
У дрымучы гэты лес!..
Працаваць юннаты йшлі,
Юзю беднага знайшлі
І сказалі:

— Годзе хныкаць,
Лепш вазьмі-тка, брат,
матыку —
Папрацуем у ахвоту
Ды ў футбол згуляем потым,
Загараць пачнём, купацца, —
Будзем сілы набірацца!

**ЗАГАДКІ**

**Маўчун**

Кліч — не кліч:
маўчыць зацята,
Як пяску набраў у рот:
Некалі —
будуе хату
Пад зямлёю чорны...
*(Крот)*

**Пых-пых**

Песні ўсе пяюць наўкола,
А ў яго — слабенькі голас...
— Пых! Пых! — дайце ножык:
Зробіць дудку сабе...
*(Вожык)*

**Жмуркі**

Днём і ноччу
куркі
Гуляюць у жмуркі.
Нават
певень
аслеп —
Бо зацвіў...
*(Кураслеп)*

**Вясною**

Яноту сніцца
добры сон,
Бо каля носа
кветка-...
*(Сон)*

**Канікулы**

Кліча ў луг,
а не на ўрок
Сіні-сіненькі...
*(Званок)*

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч нарадзіўся 26 лістапада 1930 г. у Оршы Віцебскай вобласці. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі ў Пермскай вобласці, пасля ў Чкалаве. У 1944 г. вярнуўся на радзіму, атрымаў сярэднюю адукацыю ў Оршы. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Кіеўскага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі (1954) настаўнічаў у вёсцы Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці (1954—1956), а потым два гады працаваў настаўнікам у Оршы. У 1960 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя, а потым Вышэйшыя сцэнарныя курсы (1962) у Маскве.

Упершыню У. Караткевіч выступіў у друку з вершам «Машэка» ў 1955 г. Неўзабаве выйшла ў свет кніга паэзіі «Матчына душа» (1958), потым — «Вячэрнія ветразі» (1960), «Мая Іліяда» (1969), «Быў. Ёсць. Буду» (1986). Караткевіч — таксама аўтар зборнікаў апавяданняў «Блакіт і золата дня» (1961), раманаў «Нельга забыць» (1962), «Дзікае паляванне караля Стаха» (1964; твор экранізаваны), «Каласы пад сярпом тваім» (1968; твор экранізаваны), «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1972), «Чорны замак Альшанскі» (1979; твор экранізаваны), кніг аповесцей і апавяданняў «Чазенія» (1970), «Вока тайфуна» (1974), «З вякоў мінулых» (1978), «Зброя» (1981).

У. Караткевіч вядомы і як драматург. Ім напісаны п'есы «Млын на Сініх Вірах» (1957, паст. у 1959 г.), «Званы Віцебска» (1977, паст. у 1974 г.), «Кастусь Каліноўскі» (паст. у 1978 г.), «Калыска чатырох чараўніц» (паст. у 1982 г.).

У. Караткевіч пісаў і для дзяцей. Юнаму чытачу адрасаваны яго зборнікі «Казкі» (1975), нарысы «Белавежская пушча» (1975), «Зямля пад белымі крыламі» (1977).

За раман «Чорны замак Альшанскі» пісьменніку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа ў 1984 г.

Памёр У. Караткевіч 25 ліпеня 1984 г.

### КАЦЁЛ З КАМЕНЬЧЫКАМІ

Давай з табой сядзем і пагаворым. Ты што, спаць збіраешся ці хворы? Тады заставайся ў цёплым ложку. А калі ты здаровы і ты здаровая, то давайце сядзем на пашчапаныя бярвенні, ля прызбы, на лаўкі, а каму зручна — той і проста на падлозе.

І ўявім мы, што памчалі мы на нашым дыване-самалёце ў вясёлкавы наш з табою край, у сівую нашу з табой даўніну.

Ці бачылі вы паўночныя нашы ўзгоркі? Яны не дужа высокія, але ўсё ж верас на іх на некалькі дзён робіцца сівы. Ад падмарозкаў.

І сівыя робяцца старадаўнія валуны, камяніскі, камні, каменьчыкі. А пасля пачынаюць пакрывацца шкляным, ружовым на ўсходзе лядком — за́берагам шматлікія нашы з табой азёры. А выкапаную бульбу даўно ўжо звезлі ў хаты і свірны, звалілі ў капцы.

Дык вось было гэта даўно, вельмі даўно, так даўно, што ў нашай з табой краіне яшчэ не было тады бульбы.

Стаялі тады на беразе маленькага чыстага возера — існае вочка зямлі — дзве хаты. У адной, багатай ды ганарлівай, жыў мужык Ігнат. Нядобры ён быў чалавек, жонку замарыў работай, дзеці ад хатняга рабства ў свет пайшлі. А гаспадар усё не ўтаймоўваецца, усё пад сябе грабе. Усё наваколле прыдушыў, глытай.

— Забыўся, што ў труны кішэняў няма,— горка пажартавала добрая Мар'я, бліжэйшая суседка. Бо яе хата бліжэй за ўсіх стаяла. Хата яшчэ з дзядоў, моцная, але зусім недагледжаная. Бо гаспадара ўзялі на вайну і засталася жанчына адна з маленькімі дзецьмі. Аж

пяцёра, і кожнае на пстрычку ніжэй за другое. І кожнае ўвесь час галоднае.

Пакуль бацька быў, сяк-так перабіваліся, а тут...

Словам, запанаваў на нашай зямлі самы страшны, самы подлы грэх, імя якому **Несправядлівасць.** Гэта калі адзін не можа заснуць, бо аб'еўся, а другі — бо галодны. А дзеці — дык тыя нават плачуць з голаду. Кепска. Ніколі не дапамагай **Несправядлівасці.** За іншае, можа, і даруюць. За гэтае — не.

...Позняя, халодная была вясна. Такое самае лета. А восень яшчэ горай. Завылі вятры, уздзьмуліся рэкі, пашалелі азёры. Сатлелі травы на паплавах. Ад бацькі чуткі няма. Прыйшла чарга Мар'і ісці па дапамогу да суседа. А той сядзіць, далоні пад азадак паклаў ды пыхкае, як вожык. Нажэрся свіння-свіннёю.

— Ну што?

— Пазыч мне, суседзе, меру ячменю ды меру фасолі. Я табе за гэта вясной адраблю.

— Адро-обе. Вясно-ою. Вясной усё наваколле адрабляць прыйдзе. А ты да таго часу ледзь ногі цягаць будзеш, а шчанюкі твае, можа, і не пацягнуць зусім. А можа, ты і ўдава цяпер. То й ён не адробіць. Не дам.

Рабіць няма чаго. Прыйшла бедная жанчына ў сваю халупу і, не запаліўшы нават лучынкі, упала на ўслон.

Цёмна. Цёмна за акном. Цёмна. Нізкія чорныя хмары і выхаду няма.

Да іншых суседзяў бегчы? Памаглі б, але і там тое самае. А дзецям што? Дзеці не ведаюць, як дарослым хлеб дастаецца. Цяжкай працай, часам — прыніжэннем. Калі зразумеюць — пашкадуюць. А тут плачуць толькі на розныя галасы: «Сільна і слёзна», як у старых кнігах пісалі:

— Матухна!

— Зязюленька!

— Пакармі нас!

— Хлебца дай!

— Акраец!

Што рабіць беднай Мар'і. Вырашыла яна дзяцей падмануць.

— Вы ляжце зараз. Засніце. А я пайду бабоў назбіраю. Навару ды буду вас карміць.

Дзеці не засынаюць. Тады пайшла кабета, назбірала на полі дробных каменьчыкаў (а іх было сапраўды як бобу), высыпала ў кацёл і паставіла на агонь. Настолькі бедная была хата, што і печкі няма.

Варацца каменьчыкі. Паснулі дзеці. Супакоіліся. Разбудзіць матка — наядуцца. Варацца каменьчыкі — да канца свету ім варыцца. Да канца свету плакаць матцы.

Ажно ўваходзіць у хату нейкі чалавек. Сам доўгі, кашчавы, з кіем, торбай, адкуль нейкія травы тырчаць. І вочы пранізлівыя:

— Добры вечар у хату. Пусціце абагрэцца.

— Грэйся, добры чалавек. Толькі пачаставаць цябе няма чым.

— А што ж у катле варыш?

— Гэта, добры чалавек, каб дзяцей прысыпіць да заўтра,— і прыўзняла крышку катла.

— Гэт-та што такое?

— Камні. Муж у войску — можа, й забілі. Прасіла ў суседа чагосьці — не даў. Толькі й засталося на гэтай зямлі беднаму чалавеку каменьчыкі есці.

— Што ж ён?! Дзецям не даў?! Проста дзецям?!

— Не даў.

— Д-добра,— сказаў незнаёмы.— Бяры кацёл. Пайшлі.

Прыйшлі на надзел. Незнаёмы паставіў кацёл, азірнуўся: ля хаты Ігнат стаіць. Цікуе. А што гэта яны там робяць? Чаго кацёл прынеслі?

А незнаёмы той быў Вялікі Чараўнік. Толькі чараваць яму ў жыцці дадзена было тысячу разоў і засталіся лічаныя разы. І нічога ён тым сваім чараўніцтвам не дабіўся. Як дагэтуль ішло, так і пасля.

«Але тут,— думае,— здужаю».

Узяў ён з катла жменю каменьчыкаў і са свістам, як з сявенькі, сыпануў па раллі. І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ.

— Што ж ты,— паскардзілася Мар'я.— Так загон благі, а ты яшчэ й каменьчыкамі, што сабрала, падсяваеш.

— Маўчы,— сказаў той.— Глядзі, што будзе.

— Так ёй,— сказаў Ігнат.— Таксама мне, дзеці. Ва ўсіх дзеці. Муж на вайне. Гм, таксама мне, страшная штука вайна.

А незнаёмы сыпе і сыпе. Увесь загон каменьчыкамі засеяў. Россып. Дзецца няма дзе.

Мар'я плача. Ігнат смяецца. Балаган на кірмашы, і толькі.

— Глядзі, жанчына,— сказаў незнаёмы.

Тая зірнула — і вачам не паверыла: растуць каменьчыкі. Вунь ужо камяні сталі. Памерам з два кулакі.

— Збяры частку, пакладзі ў кацёл,— сказаў незнаёмы.— Пастаў варыць дзецям.

У Ігната вочы на лоб палезлі. А жанчына панесла кацёл з камянямі ў хату. Прыйшла — камяні яшчэ падраслі.

— Глядзі, жанчына, за адзін дзень я табе ўсё пакажу. Заўтра будзеш капаць. А ва ўсе наступныя разы будзе гэта цягнуцца цэлае лета. Глядзі.

І тут камяні пачалі зарывацца ў зямлю. Як ружовыя, жоўтыя і белыя парсючкі. Ігнат аж счумеў. Вачыма толькі водзіць, нібы ў чужы гарох залез, а яго, злодзея, заспелі.

Пачакалі яны крыху — з'явіліся з зямлі парасткі, гусцець пачалі.

— Прынясі, кабета, матыку,— сказаў незнаёмы.

Тая прынесла. Расточкі ўжо ў кусцікі ператварыліся.

— Пацяпай вось так. Загарні ім ножкі ў кажушок... І яшчэ раз загарні.

А кусцікі ўжо амаль кусты.

І вось ужо на кустах заззяла мора кветак. Белыя, ружовыя, лілаватыя, ружова-белыя зорачкі. І ўсе з жоўтым сэрцайкам.

— Вось цяпер можаш яе памацаць на выбар,— сказаў незнаёмы.— Гэта як дзеці галодныя.

І выняў два камяні з-пад куста.

Пасля засумавалі кусты, паблякла іх лакіравана-шурпатая, зялёная зверху і матавая спадыспаду паверхня, пасохла гікаўё.

— Ну вось, заўтра будзеш капаць. На ўсю зіму хопіць,— сказаў незнаёмы.— І з суседзямі падзяліся.

— Ясна,— сказала Мар'я, бо ўжо далятаў з хаты сыты, некаменны дух.— З суседзямі найперш.

— Мне! Мне! — кінуўся Ігнат.— Мне перш за ўсё! Мне! Я іх кармлю-паю!

— І на работу наймаеш? — спытаў незнаёмы. Выняў адзін камень, і той закурэў у ягоных руках, а чалавек разламаў яго, пасаліў і стаў есці.— І не адмовіў ім у ежы, калі галадалі?

— Мне! Мне! Наймаю, кармлю.

— Добра,— сказаў незнаёмы.— Набяры мне кацёл каменьчыкаў са свайго поля. Ды хутчэй.

Ігнат чуйдух прыляцеў з катлом. Самых буйных, з кулак, камянёў нацягаў.

— Во! Во! У мяне ж і каменьчыкі. Во ў мяне, дык камні з кулак. А гэтыя ж лайдакі, хіба ў іх камні. Слёзы, а не камні.

— Слёзы,— сказаў незнаёмы.— Дык хочаш, каб у цябе яшчэ больш стала? Усё ж ёсць. Што даў — такі і плод.

— Мне! Мне! У мяне і камні.

— Глядзі-і,— сказаў незнаёмы і сыпануў камяні па Ігнатавым полі. І яшчэ. Засеяў усё поле.

— Ну вось. Даў сёння хлеба яе дзецям?

— А што. Галадранцы. Самога з'ядуць, як мяккі будзеш.

Незнаёмы махнуў рукой.

Камні пачалі расці. Усе трох стаялі і глядзелі, як яны растуць: каменьчыкі — камні — камяні — камяніскі. Усё поле закрылі — Ігнат аж падскокваў.

— Ну чакайце, за такімі вы яшчэ й да мяне ўсе прыбяжыце. Прыйдзеце, любенькія, як прыпрэ.

Паглядзеў на яго незнаёмы, плюнуў.

— Ну вось, маеш,— сказаў.

— А чаму яны не зарываюцца?

— А таму, што вечна ім заставацца на вачах у людзей, як кожнаму скнарству, як кожнай жорсткасці, як кожнай нелюбові да людзей, як кожнай Несправядлівасці.

І пайшоў з жанчынай да яе хаты.

Кінуўся шчаслівы гаспадар да поля — не поле, а суцэльная каменная крушня. Валуны велічынёю з хату. На тысячу год наперад з зямлі вылезлі.

Пакуль дзеці, незнаёмы і жанчына елі ў хаце «камяні» — усё наваколле чула з-за каменнага мура дзікі рык і выццё. Выў і рыкаў Ігнат.

А пасля незнаёмы ўстаў.

— Пайду,— сказаў ён, закінуўшы за плечы торбу.

— Чым мне табе аддзякаваць?

— Нічым. Дабрынёю да людзей. Ды гэтага дабра ў цябе заўжды хапала.

— Пайду пагляджу, як сусед. Звар'яцеў, пэўна.

— Нічога. Я ж кажу... дабра ў нас хапала. Залішне.

І пайшоў у свет, абапіраючыся на кій. Пад касыя асеннія хмары. Насустрач пералётам, што, калючыя, каціліся яму пад ногі. Ужо зводдаль азірнуўся — Мар'я і дзеці глядзелі яму ўслед, маленькія на чорнай раллі.

— Гэй! А імя ёй будзе — Бульба! — крыкнуў ім незнаёмы.

І так з'явілася на Беларусі Бульба.

## ЧОРТАЎ СКАРБ

У нейкім прыгожым краі, трошкі бліжэй Сонца і трошкі далей ад Месяца, у краі, багатым залатымі нівамі, празрыстымі рэкамі, сінімі азёрамі ды цёмнымі пушчамі... Словам, у тым, краі, дзе мы з табою жывём, стаяла, а можа і цяпер стаіць адна хата.

А жыў у гэтай хаце селянін па імені Янка. Здаровы, як зубр, добры і не дужа мудры. Было ў яго пяцьдзесят сыноў, сорак валоў і кошка. Ну, можа, не пяцьдзесят сыноў, а тры, не сорак валоў, а два. Але кошка была, гэта ўжо можаце мне паверыць. Пярэстая. З чатырма лапамі. З адным хвастом.

Араў Янка зямлю, пасвіў каровы і хмары. І жыў бы зусім добра, каб не звалілася на яго бяда.

Было гэта даўно. Так даўно, што на Беларусі тады яшчэ вадзіліся чэрці. І ў кожнага з тых чарцей было сваё месца працы.

Адзін жыў у вадзе, пасвіў шчупакоў, лінёў ды акунёў. Быў зялёны і калматы, вельмі падобны на купу твані. Звалі яго Вадзянік.

Другі жыў у лесе, пасвіў аленяў і быў падобны на аброслы мохам пень. Калі сустрэнеш, то і не адрозніш. Звалі яго Лесавік.

Але быў і трэці, што жыў па хатах і пасвіў цвыркуноў. Гэты быў самы шкодны. Рожкі ў яго былі, як у козкі, зубкі, як часначок, хвосцік, як памялцо.

І аблюбаваў гэты чорт Янкаву хату. І не тое, каб са злосці шкодзіў, а проста быў свавольнік. Толькі ад тых свавольстваў Янку аж плакаць хацелася. Дзіва што! Ты ж таксама не ад злосці сваволіш? Ну вось, а бацькі часам плачуць. Кепска!

Не стала ў хаце ад чорта спакою. Пазаплятае коням грывы так, што пасля не расчэшаш, а думаюць на сыноў. Вяршкі з малака зліжа, а думаюць на бедную кошку. Часам узімку так завые ў коміне, што ў людзей мароз па скуры і страшна на двор выходзіць. Ці забярэцца ў комін, з'едзе па ім і насыпе ў капусту сажы.

А то раніцай вынуць з печы пірог і здзівяцца: на пірагу невялічкі адбітак. Гэта чорт на гарачае цеста адпачываць садзіўся. Грэўся з марозу.

Зусім не стала жыцця. Янка ішоў начаваць, нават у холад, на сена ў адрыну. Ледзь бедных дзяцей не памарозіў. І вырашыў урэшце, праз гэтыя чортавыя выбрыкі, забіць хату дошкамі і падавацца з дзецьмі, коньмі, валамі і кошкай некуды за свет. Кінуўшы сваю радзіму, цёмныя пушчы, светлыя рэкі ды чыстыя воды. І стала б на Беларусі меней яшчэ адной сялянскай хатай, каб не пачуліся аднойчы вечарам па дарозе цяжкія крокі.

Тупу-тупу-тупу,
Нясе Мішка ступу.
Ў ступе ўперамешку
Цукар і арэшкі,
Разынкі й цукеркі
Ў залатой паперцы.
Па шляхах, палетках
Нясе Мішка дзеткам
Салодкую ступу.
Тупу-тупу-тупу...

Ішоў павадыр з мядзведзем. Хадзілі яны ад сяла да сяла.

Павадыр песні спяваў і граў на цымбалах. А мядзведзь паказваў, як бабы ваду носяць ды як дзеці гарох крадуць. І гэтым яны з мядзведзем карміліся.

— Здароў, Янка. Ці не пусціш нас з Мішкам пераначаваць? — спытаў павадыр.

— Мне што? Начуйце,— адказаў Янка.— Толькі ж я сам на сене сплю.

— А што такое?

— Ды чорт у мяне ў хаце завёўся. Так сваволіць, што ратунку няма. Верыш, на пірагах адпачывае. У коміне вые. І часам, у цёмныя ночы, нешта ў падпеччы, як жар, гарыць.

— Гэ-э,— сказаў павадыр.— Не ўсе ж такія неразумныя, як твайго бацькі дзеці. Каб гэта павадыр, ды яшчэ з мядзведзем, нейкага там чорта спалохаўся?! Не бывала яшчэ такога на свеце.

— То ідзі. Капусты пад'еш. Там яшчэ гаршчок з паранай рэпай ёсць, дык, калі нічога за ноч не здарыцца, то раніцай падсілкуешся. А я на сена. Як сцямнее, я ў хату ісці баюся.

Ну вось, пасёрбаў павадыр капусты, пакарміў Мішку ды заваліўся дрыхнуць на лаве. А мядзведзь прымасціўся ля печы і таксама засоп на ўсе насавыя загорткі.

Гэта было так даўно, што тады яшчэ на Беларусі нават бульбы не вадзілася. Сказаць каму — не павераць. Замест бульбы парылі рэпу ці бручку. І вось спіць павадыр і сніць, як ён заўтра смачна будзе рэпай снедаць.

Толькі глухая ноч запала — чорт тут як тут. Скаціўся комінам, узняўшы цэлую хмару сажы, і пачаў у печы, злодзей такі, шнарыць і мацаць. Як кажуць, ты за парог, а ён за пірог. Узняў накрыўку. Павеяла сытым духам.

«Ага, рэпа. Вось гэта якраз тое, што мне трэба. Я люблю рэпу».

Але ж у печы цёмна, як... у печы. То чорт адсунуў засланку, вывалак гаршчок на прыпечак, сеў, звесіўшы ногі, і пачаў ласавацца салодкай паранай рэпай, а лушпайкі ўніз кідаць.

«Нічога, гаспадыня заўтра падмяце. Трэба ж, каб і ёй работа была».

Упала адна лушпіна мядзведзю на нос, і той прачнуўся. Злізнуў з носа — салодка. І пачаў Мішка ў цемры нюхаць, знаходзіць лушпінне ды чмякаць.

Чорт пачуў, што нехта ўнізе чмякае ды ліжа. А ён жа ведаў, што ў хаце нікога, акрамя кошкі, няма. І вось нейкая там кошка чмякае ды

сапе і не дае яму, чорту, чужой рэпы спакойна пад'есці.

Развярнуўся ён ды і піхнуў кошку нагой.

— Апсік! Апсік, гадасць такая!

Ну вось. А мядзведзь гэта табе не кошка. І я табе даваць мядзведзю выспятка ніколі не раю.

Пакрыўдзіўся Мішка. Згроб чорта ў ахапак, сцягнуў з прыпечка і давай яго мяць, давай яго прасаваць, давай яго лапамі валтузіць ды калашмаціць, давай абходжваць, лупцаваць, малаціць ды дубасіць, давай яго за рогі круціць, як сідараву казу, ды дзерці смяротным боем.

Ледзь вырваўся чорт з мядзведжых абдымкаў. Узляцеў на прыпечак. Сяк-так выкараскаўся праз комін. Скаціўся са страхі ды і чкурнуў далей ад хаты. У пушчу, як ашалелы.

А мядзведзь, задаўшы чорту чосу, зноў заснуў, як пшаніцу прадаўшы.

Раніцаю ўсе ўсталі і падумалі, што гэта мядзведзь рэпу з'еў. Здзівіліся, што не пабаяўся лезці ў гарачую печ, і ўзрадаваліся, што з'еў зусім мала. Што ж, мядзведзь не першы і не апошні ў свеце адказваў за чужыя грахі.

Пасля ўсе даелі тое, што заставалася ў гаршку. Мядзведзь нават яшчэ паскакаў дзецям. І пайшлі яны з павадыром зноў, ад мястэчка да мястэчка, ад сяла да сяла. Пад сонцам і дажджом.

Тупу-тупу-тупу,
Нясе Мішка ступу...

Але з таго часу чортава гарэзаванне як нажом адрэзала. Коні здаровыя, сажы ў капусце няма, на пірагах ніхто не адпачывае. У коміне, праўда, нехта часам вые і з падпечку часта нешта свеціць, але гэта ўжо цярпець можна. Раздумаў Янка кідаць сваю хату.

Толькі на гэтым гісторыя не скончылася, не думайце. Неяк пад восень араў Янка свой клін пад азіміну. Мокра, касы дождж, нізкія чорныя хмары. Аж бачыць, з-пад хмар, з самага акаёму нехта ідзе да яго па раллі. Прыгледзеўся — ага, стары знаёмы, чорт.

Ідзе ўвесь мокры, як цуцык пад залевай. На кожным капыце па пуду гліны наліпла. Пад носам ад прастуды вісіць вялізная кропля. А насоўкі ж ён не мае. Як ты часам, калі дома забудзеш. А капытом не дужа высмаркаешся. Ідзе такі няшчасны, такі жаласны і ўбогі, што нават Янка яго пашкадаваў:

— Ты куды гэта?

— А так,— сказаў чорт.— У свет.

Памаўчалі. Пасля чорт пытае:

— А скажы ты мне, ці ўсё яшчэ ў цябе тая кошка?

Янка быў чалавек не дужа мудры ды і не ведаў, пра якую кошку размова:

— А няго ж,— кажа.— Ясна, што ў мяне. Ды яшчэ і шасцёра кацянят прынесла.

— І ўсе ў матку?

— Ага. Усе пярэстыя, з чатырма лапамі, з адным хвастом.

— З лапамі, з лапамі,— сказаў чорт.— Даліся мне тыя лапы.

— Дальбог аж шасцёра!

— Ну, то я, мабыць, ніколі да цябе не прыду,— уздыхнуў чорт.— А трэба было б. Дужа трэба.

— Гэта чаму?

— Ат! Закапаў я ў цябе ў падпеччы казан з золатам. Скарб. І трэба было б выкапаць, але як тваю кошку ўспомню — бр-р-р! — ну яго. Хай прападае.

— Ты, як зусім змерзнеш, прыходзь. Глядзіш, рэпу зварыш, дзяцей пакалышаш.

— Н-не. Кошкі баюся. А рэпы гэтай я цяпер да самай смерці ў вочы бачыць не магу.

Ды і пайшоў сабе полем, пад дождж, ледзь цягнучы пудовыя ногі. Такі гаротны небарака.

А Янка дaараў клін і пайшоў дахаты. І толькі там успомніў, што нештачка ў падпечку свяціла і чорт пра нейкі скарб казаў.

Пачалі капаць ў падпеччы і — на табе — выкапалі вялізны закураны казан з золатам і чырвонцамі. Нібы жар, разлілося святло па хаце.

Так ужо свяціла, так паліла, так пякло, што ўсе аж распранацца пачалі.

Чорт пасля таго ў моцныя маразы ўсё ж прыходзіў. Толькі прасіў кошку ў камору выкідаць. Капусту Янку варыў і дзяцей калыхаў. З таго часу і пайшла прыказка, што шчасліваму і чорт дзяцей калыша.

А на той чортаў скарб паставіў Янка сабе і ўсяму наваколлю новыя хаты, свірны, адрыны, новыя стайні. Сады пасадзіў, млын паставіў.

Ва ўсіх сялян па сорак сыноў ды дачок, па сорак коней ды валоў. І ўсе хаты, як звон. І ў кожнай хаце на акне, на сонейку, кошык. А ў кожным кошыку кошка. І ў кожнай кошкі па шасцёра кацянят. Во шчасце дык шчасце!

І таму, калі ты жывеш шчасна і радасна, ніколі не дражні мядзведзя ў звярынцы і не кідай у кошку не тое што каменем, а нават мяккай грудкай зямлі. Бо гэта ж яны зрабілі калісьці так, што табе добра. Ды і наогул ні ў кога нічым не кідай і нікога не дражні.

Тады ўсім будзе хораша на гэтай прыгожай зямлі, што ляжыць крышку бліжэй Сонца і крышку далей ад Месяца. Людзі будуць працаваць, кошкі будуць вуркатаць, а мядзведзі насіць табе і ўсім іншым дзецям салодкія ступы...

Тупу-тупу-тупу.

## ІВАН НАВУМЕНКА

Іван Якаўлевіч Навуменка нарадзіўся 16 лютага 1925 г. у мястэчку Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады працаваў у рэдакцыі газеты «Бальшавік Палесся» (Мазыр), адначасова завочна вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, які скончыў у 1950 г. Некаторы час працаваў у «Звяздзе». Скончыў аспірантуру пры універсітэце, абараніў кандыдацкую дысертацыю і стаў працаваць на кафедры беларускай літаратуры гэтага ж універсітэта (1954—1973). Доктар філалагічных навук (1969), прафесар (1971), член-карэспандэнт АН БССР (1972), акадэмік АН БССР (1980). З 1973 г.— дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1982 г.— віцэ-прэзідэнт АН БССР.

Друкавацца пачаў у 1955 г. У 1957 г. выйшаў першы зборнік апавяданняў І. Навуменкі «Семнаццатай вясной», у 1958 г.— «Хлопцы-равеснікі», у 1960 — «Верасы на выжарынах», у 1966 — «Таполі юнацтва», за які пісьменніку прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1967). І. Навуменка — аўтар аповесцей «Снежань», «Мой сябар Пятрусь», «Пераломны ўзрост» (1958), «Трымценне дубовага лісця» (1962), «Бульба» (1964), «У бары на світанні» (1971), «Развітанне ў Кавальцах» (1974), «Апошняя восень» (1976), «Замяць жаўталісця» (1976), «Інтэрнат на Нямізе» (1978). Раманы «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), «Сорак трэці» (1973) прысвечаны барацьбе савецкіх людзей у жорсткіх умовах нямецка-фашысцкай акупацыі. Пяру пісьменніка належаць таксама раманы «Смутак белых начэй» (1979) і «Летуценнік» (1984).

І. Навуменка — аўтар літаратуразнаўчых прац «З глыбінь жыцця» (1960), «Пісьменнікі-дэмакраты» (1967), «Кніга адкрывае свет» (1978). У 1972 г. за кнігі «Янка Купала: Духоўны воблік героя» (1967) і «Якуб Колас: Духоўны воблік героя» (1968) пісьменніку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа.

Піша І. Навуменка і для дзяцей. Гэтыя творы былі змешчаны ў дзіцячых часопісах «Вясёлка», «Бярозка» («На канікулах», «Балотца між лесу» і інш.), а ў 1959 г. выйшла з друку аповесць «Вайна каля Цітавай копанкі». Вучням сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту адрасаваны яго зборнікі апавяданняў і аповесцей «Сярэбраныя мхі» (1983) і «Пераломны ўзрост» (1986).

## ВАЙНА КАЛЯ ЦІТАВАЙ КОПАНКІ

*(Урывак)*

Белагаловы Косця любіў чытаць. Кнігі прывабілі яго вельмі рана, з дзевяці ці нават з васьмі гадоў. Маці з раніцы ішла на работу, малодшая сястра не ўмешвалася ў Косцевы справы, клапоцячыся толькі аб сваіх лялька́х, якіх трэба было і накарміць, і абшыць. Косця быў самастойны і незалежны. Ён рабіў што хацеў у сваёй прасторнай хаце з двух пакояў. І ён чытаў. Чытанне займала большую частку таго часу, якога ў Косці было колькі хочаш. Да дванаццаці год хлопец праглынуў, мабыць, болей за сотню кніг. Магчыма, па гэтай прычыне Косця і вылучаўся сярод астатніх хлопцаў Першамайкі. Ён заўсёды ўсё ведаў. Ён мог расказаць і пра пустыню Сахару, і пра Паўночны полюс, і пра тое, што людзі хутка паляцяць да зорак.

Здавалася, на белым свеце не існуе ніводнай загадкі і таямніцы, пра якую б белагаловы Косця нічога не ведаў. Першамайскія хлопцы гарнуліся да Косці і даражылі яго сяброўствам.

Была, вядома,яшчэ адна надзвычай важная прычына, якую нельга скідаць з рахунку, калі гаварыць пра папулярнасць Косці на Першамайскай вуліцы. Дзверы яго хаты гасцінна расчыняліся перад кожным, хто б пажадаў сюды зайсці. Тут было заўсёды людна. Хлопцы таўкліся ў Косці ад ранку да вечара. Ніхто на іх не крычаў, і ніхто не ўмешваўся ў іх справы. Косця вызначаўся надзвычай добрым і памяркоўным характарам: ён дазваляў у сваёй хаце ўсё. У яго гулялі ў шашкі, майстравалі розныя машыны і хітрыя штукі, а калі на стале ляжаў бохан хлеба, то адломлівалі па ёмістаму кавалку і елі, нібы свой уласны. Нездарма пазней, калі арганізавалася камуна, Косцева хата стала штабам.

Яша і Калашкан штодня хадзілі цяпер на Першамайку. Яны, як свае, купаліся ў копанцы, гулялі з першамайцамі ў «ялавога» і «кругавога». Каля самай копанкі стаялі ўжо качэлі. Іх памагалі ставіць і

Яша з Калашканам. Яны разам з усімі хлопцамі неслі слуп ад самай старой грэблі. Змітрок у дадатак забяспечыў першамайцаў жалезным колам, якое ён прывалок з дому. Без гэтага кола, што круцілася на самым версе слупа, не было б ніякіх качэляў. Так што цяпер Яша і асабліва Змітрок мелі свае заслугі перад Першамайкай і ніхто не мог папракнуць іх за мінулае.

З Лізай Яша таксама памірыўся. Ён убачыў яе ў першы ж дзень, як яны прыйшлі на Першамайку. Яшу было вельмі сорамна за тое, што ён тады ўзяў Лізу ў палон. Але яна пра гэта не ўспамінала сама і, здаецца, ніколькі не крыўдавала за мінулае.

— У цябе ёсць сшыткі? — спытала Ліза.

— Пяць штук,— Яша паглядзеў у зямлю.— І адзін леташні, падпісаны. Але ён зусім чысты...

— А ў мяне дваццаць. Мне мама купіла...

Яша маўчаў. Ён не мог пахваліцца такім багаццем.

— Я табе два сшыткі дам,— сказала Ліза.— І сцірку дам, у мяне дзве...

Вядома, і пасля гэтага сшыткаў у Лізы заставалася больш, але Яша лішняга не хацеў.

Яша аднойчы спытаў у белагаловага Косці пра камуну. Ён яшчэ не дужа верыў, што яна ў першамайцаў ёсць. Аркадзь Панядзелак расказваў пра агарод, майстэрню і сталовую, але нічога гэтага Яша не бачыў. Таму ён думаў, што Аркадзь проста хлусіў. Нельга ж два самакаты і тую маленькую будачку, дзе ляжыць трохі яблыкаў, лічыць камунай... Камуна ўяўлялася Яшу чымсьці вялікім, прыгожым, дзівосным, што бывае толькі ў казцы.

Косця засмяяўся.

— Камуна — гэта не казка,— сказаў ён.— Проста ўсе людзі будуць некалі так жыць. Мы робім усё разам, вось табе і маленькая камуна. Ты ж адзін качэлі не паставіў бы...

Нічога дзіўнага, незвычайнага першамайцы сапраўды не рабілі. Але ў іх было весела. Таму Яша і Змітрок, як толькі здаралася вольная часіна, беглі на Першамайку. Адзін раз яны ўбачылі нешта зусім новае. На Косцевым двары стаялі аж тры тачкі. На іх хлопцы грузілі нейкія палкі.

— Гэта крушына,— растлумачыў Косця.— Мы яе сушылі, а цяпер возім здаваць. Пудоў дваццаць у нас. Мы грошы збіраем на лыжы і канькі.

Яша і Калашкан не верылі сваім вушам. Яны ніколі не думалі, што за крушыну плацяць грошы. Яе ж у лесе можна наламаць колькі хочаш.

— Мы і лазу здавалі,— хваліўся Косця.— І ўжо зарабілі сорак восем рублёў.

Яша ледзь не плакаў. У яго не было ніанькоў, ні лыж. Каб ён ведаў, то даўно б перайшоў да Косці і сушыў бы гэтую самую крушыну.

Першамайцы нагрузілі свае тачкі і павезлі крушыну. Яша і Змітрок ішлі за імі ўслед з апушчанымі галовамі. У іх былі толькі канькі-дзеравяшкі, і спадзявацца на лепшае пакуль што не прыходзілася.

— Можа, вы будзеце яшчэ сушыць крушыну? — з надзеяй спытаў Яша.

— Не, болей не прымаюць,— Косця, мабыць, шкадаваў, што залішне пахваляўся.— Будзем яшчэ здаваць косці і жалеза.

— Мы касцей і жалеза можам сто пудоў назапасіць,— загарэўся Яша.

— Здадзім тады разам,— паабяцаў Косця.

У Яшы нібы выраслі крылы. Ён ужо бачыў новыя снягурачкі, якія справіць, і ўяўляў сабе, як будзе на іх імчацца па звонкім ільду.

Гэтыя першамайцы былі проста цудоўныя хлопцы. Яны не толькі сушылі крушыну, збіралі косці і жалеза. Яны яшчэ хадзілі абкопваць дубкі, лавілі капканамі кратоў і нават памагалі касіць калгаснае жыта. Яша цяпер бачыў, што Косця не хваліцца. На Першамайцы такі была камуна...

Яша хутка здагадаўся: белагаловага Косцю болей за ўсё на свеце цікавілі планёры. Першамайскі камандзір нават не даваў нікому патрымаць планёр у руках, а хаваў яго ў сваёй хаце на печы. Ён склеіў планёр па малюнку, які быў змешчаны ў часопісе. Першамайскія ж хлопцы, здаецца, не вельмі цікавіліся авіятарскімі захапленнямі свайго камандзіра. Яны нават падколвалі яго.

— Не паляціць твой планёр,— раўнадушна гаварылі яны.— Летась жа не паляцеў.

Косця злаваўся.

Нарэшце настаў дзень выпрабавання. Яша прыйшоў на Першамайку яшчэ з раніцы. Яму дужа хацелася паглядзець, як паляціць планёр. Першамайскія хлопцы сабраліся ля Косцевай хаты. Сам Косця сядзеў на даху. Адтуль ён і запусціў планёр. Але гэты планёр далёка не паляцеў. Ён пратрымаўся ў паветры, можа, якіх секунд пяць і ўпаў на вуліцу ў пясок. Косця злез з даху прыгнечаны і змрочны. Усе бачылі, што добрых планёраў ён клеіць яшчэ не ўмее...

Але гэта былі дробязі — самакаты, крушына, планёр — у параўнанні з тым, што хутка адкрылі Яша і Калашкан на Першамайцы. Першамайскія хлопцы, аказваецца, трымалі моцную дружбу са старым Лявонам, які пасвіў калгасных коней. Канюшня знаходзілася ў канцы вуліцы, і, калі гналі коней на начлег, можна было скакаць верхам праз усю Першамайку. Гэта асабліва ўзрадавала Яшу. Колькі ён марыў, каб прамчацца верхам на кані на вачах ў настаўніцы Марыі Рыгораўны і Лізы. Цяпер яго мара была блізка да здзяйснення.

Яша, хвалюючыся і баючыся, што яму адмовяць, у той жа дзень папрасіўся ў Косці ўзяць яго на начлег. Косця ахвотна згадзіўся.

— Мы пасвім коней да поўначы,— прызнаўся Косця.— Стары Лявон спіць толькі да першых пеўняў, а потым прачынаецца і спаць не можа. Але спіць ён моцна і баіцца, каб коні не нарабілі шкоды. А за тое, што мы пасвім, ён дае нам колькі хочаш ездзіць верхам...

Гэта было цудоўна. Пра лепшае Яша не мог і марыць. У той жа вечар ён скакаў на кані. Ён ляцеў услед за белагаловым Косцем і бачыў, што Марыя Рыгораўна стаяла ля сваіх веснічак. Яна, зда-

ецца, таксама заўважыла Яшу. Толькі Лізы ў гэты час на вуліцы не было. Але Яша ўсё адно радаваўся. Ён цяпер ужо ведаў, што і Ліза ўбачыць яго на кані. Коней жа гоняць на начлег кожны вечар.

Цудоўная летняя ноч над зямлёю. Справа была вёска, злева — шырокі расісты луг, а зверху — неба, засеянае, можа, мільярдам зорак. На поплаве хлопцы расклалі агонь і паселі вакол яго ў кружок. Стары Лявон прымасціўся воддаль, накрыўся з галавой кажухом і адразу захроп. Прагныя языкі агню лізалі сухое ламачча, яно весела патрэсквала, і полымя шугала высока ўгору. Ад гэтага цемень яшчэ болей згушчалася, за дзесяць крокаў ад вогнішча цяжка было штонебудзь убачыць. Недзе ў вёсцы, ля клуба, спявалі камсамольскія прыпеўкі пра кудлатага папа і кулака, рыпаў гармонік, а тут на лузе толькі гарэў агонь ды зрэдку пазвоньвалі званкамі коні.

Косця расказваў пра Афрыку. Ён гаварыў так маляўніча і пераканаўча, нібы вандраваў па Афрыцы сам. Яша слухаў і, здаецца, бачыў на ўласныя вочы густыя трапічныя лясы, перавітыя ліянамі, высокія какосавыя пальмы, на якіх віселі арэхі, кожны велічынёй з галаву. Па афрыканскіх гушчарах блукалі тыгры і львы, у водах блакітнага Ніла плавалі ненажэрныя кракадзілы. Але Яша крочыў за Косцем па Афрыцы і не адчуваў ніякага страху. Побач былі хлопцы, белагаловы Косця. Перад імі, дружнымі і з'яднанымі, адступала ўсё...

Свет раскрываў перад прыціхшымі хлопцамі свае бясконцыя дары і цуды. І было незабыўна хораша ад адчування багацця жыцця, ад таго, што не ўсё яшчэ адкрыта і знойдзена на зямлі, што можна яшчэ быць і магеланамі і калумбамі. У небе блішчалі зоркі, гарэў агонь, звінелі званкамі коні. І тут ля агню разгараліся і плылі ў неабсяжную далячынь хлапечыя мары...

Яша цяпер разумеў, чаму першамайцы слухаюць Косцю. Ён не быў такі дужы, як руды Алёша, затое ён быў вельмі разумны. Яша дзівіўся: як можна столькі ўтрымаць у галаве? Галава ў Косці, здаецца, была такая самая, як і ў другіх, а ведаў ён, можа, у сто разоў болей...

Першамайка вабіла Яшу, як магніт. Ён ужо не мог пражыць дня, каб не збегаць да белагаловага Косці, не пакруціцца на качэлях. Змітрок Калашкан быў таксама сваім чалавекам на Першамайцы. Яго там паважалі за праўдзівасць і незалежнасць характару. Да першамайцаў хадзілі гуляць Алесь Бахілка і другія хлопцы. Бахілка як камандзір Тарабанавага палка спачатку трохі пабойваўся, але яго таксама ніхто не крануў, і Алесь пасмялеў. Аднаго Аркадзя Панядзелка не любілі на Першамайцы, і ён не паказваў туды носа. Руды Алёша ўсё хварэў, і пра яго ніхто не ўспамінаў. Усім было добра і без Алёшы.

Але Тарабан напомніў пра сябе сам. Аднаго разу, калі Яша вяртаўся з Першамайкі дадому, ён нос у нос сутыкнуўся з Тарабанам. Той сядзеў на беразе Цітавай копанкі і, відаць, спецыяльна пільнаваў Яшу.

— Дзе быў? — грозна спытаў Алёша.

Яша хлусіць не ўмеў і расказаў усю праўду.

— Я з вамі пагавару яшчэ,— паабяцаў Алёша.— Не ўцячэ ад мяне ні твой Калашкан, ні Бахілка. Можаш ім перадаць...

І Тарабан, даўшы моцнага кухталя, адпусціў Яшу.

— Калі яшчэ пойдзеш на Першамайку, то будзе не гэтак,— прыгразіў ён.— Зарубі сабе на носе...

Крыўда перапаўняла Яшавы грудзі. Якое права мае гэты Алёша ўсімі камандаваць і з усіх здзекавацца? Рад, што ў яго здаравенныя кулакі. Яша на першым часе не ведаў, што рабіць. Ісці скардзіцца Косцю яму не хацелася. Ён жа ўсё-такі служыў у Тарабанавым войску, і Косця тут ні пры чым. Але Яша нават не дапускаў думкі, што заўтра не пойдзе на Першамайку. Хлопец пабег агародамі да Калашкана. Змітрок, выслухаўшы навіну, раззлаваўся.

— Я ведаў, што гэты Тарабан будзе яшчэ лезці,— рашуча сказаў ён.— Трэба яго правучыць.

Яны рушылі да Бахілкі. Бахілка спачатку вагаўся, але калі Яша расказаў яму пра Алёшавы пагрозы, набраўся ваяўнічасці. Утрох яны падышлі да Тарабанавага двара. Яны хадзілі, можа, цэлую гадзіну і з выклікам свісталі, пакуль Алёша заўважыў іх. Нарэшце ён выйшаў са свайго двара.

— Ногі ліжаце Косцю! — падступіў ён да Калашкана.— Думаеш, гэта вам так пройдзе...

— Ты да нас не лезь, Тарабан,— Змітрок гаварыў спакойна.— Мы будзем рабіць што захочам...

Калашкан хацеў абысці Тарабана, але той загарадзіў яму дарогу. Тады да рудога Алёшы падышлі Яша з Бахілкам.

— Мы цябе не чапаем, і ты нас не чапай,— дрыжачым ад узбуджэння голасам сказаў Яша.— Хопіць табе камандаваць...

Тарабан схапіў Яшу загрудкі. У тую ж хвіліну Калашкан падставіў ножку, а Бахілка тузануў яго за плечы. Тарабан упаў, а ўсе трое стаялі. Алёша ўсхапіўся. Ён проста шалеў ад злосці. Цяпер ён кінуўся з кулакамі на Калашкана. Паўтарылася тое самае — трое былі намнога дужэй за аднаго. Алёша ўстаў з зямлі, але біцца ўжо не кідаўся. Ён неяк адразу звяў, адчуўшы, што адзін нічога не зробіць. Угнуўшы галаву ў плечы, Тарабан пайшоў у свой двор...

Насупраць Тарабанавага двара, на выгане, хутка сабраліся амаль усе хлопцы, якія ваявалі ў Алёшавым войску. Не было толькі Аркадзя Панядзелка і Лузаніка. Хлопцы пра ўсё ўжо ведалі, але ніхто не заступіўся за Алёшу. Усе смяяліся, гаманілі, а Тарабан адзін хадзіў па сваім двары. Яшу зрабілася нават шкада Алёшы. Усё-такі ён смелы хлопец. Ён жа і не дурны. Ці нельга з ім дамовіцца проста, без ніякай бойкі? Яша ўжо хацеў сказаць пра гэта Бахілку і Калашкану, каб паклікаць Алёшу і памірыцца, але Тарабан у гэтую хвіліну выйшаў з двара сам.

— Па аднаму цяпер не хадзіце,— крычаў ён.— Галовы паадкручваю...

— Не палохай,— адказаў Калашкан.— Не баімся.

— Генерал без арміі! — крыкнуў Яша.

Тарабан зноў знік на сваім двары. Мірыцца ён не хацеў... Назаўтра трэба было ў школу. Па Яшу забег Змітрок. І зусім нечакана прыйшоў Косця Кветка. Ён яшчэ ніколі не быў на Яшавым двары.

— Пакажыце мне свайго голуба,— папрасіў Косця.

Яша вынес на двор клетку. Туркалік ужо вырас зусім. Распусціўшы хвост, ён насіўся па клетцы і вуркаваў. Косця глядзеў на голуба моўчкі.

— Яму сумна аднаму,— сказаў ён нарэшце.— Давай пусцім яго на волю.

— Ён прывык у мяне,— сказаў Яша, бо яму шкада было выпускаць голуба.— Ён нікуды не паляціць...

— Калі не паляціць, тады вернецца да цябе. Давай паспрабуем...

Яша неахвотна адчыніў дзверцы. Голуб вырваўся з клеткі і, зрабіўшы над дваром два няўпэўненыя, павольныя кругі, імкліва пачаў набіраць вышыню. Праз хвіліну ў небе відаць была толькі шэрая кропка, якая набліжалася да лесу.

— Не вернецца,— з сумам зазначыў Яша.

— Значыць, знойдзе сваіх,— сказаў Косця Кветка.

Хлопцы пакрочылі ў школу. Пра Тарабана яны нават не ўспомнілі. Ён болей не займаў у іх думках ніякага месца, смелы Алёша Тарабан. Ён не ведаў ні пра ледавікі, ні пра Хрыстафора Калумба, ні пра тое, што ў хуткім часе людзі паляцяць да самых зор...

## БАЛОТЦА МІЖ ЛЕСУ

Калі Пятрок ідзе па грыбы, то звычайна абмінае невялікае балотца з чэзлымі хвойкамі, бярозкамі, што растуць між асакі і куп'я. Што там знойдзеш? З усходняга боку да балотца падступае града старых дубоў, і Пятрок туды таксама не заглядвае, бо дол у дубняку травяны, суцэльны дзёран, і ніякі грыб на такой зямлі не вырасце.

Якраз у гэтым месцы пралягае насыпаны пясчаны шлях, які нібы лінейкай аддзяляе дубовую граду ад цёмнай сцяны грабняку. Граб — рэдкае дрэва, расце ён толькі тут. Пятрок думае, што і дубы, і цёмны, густы грабняк падняліся пасля таго, як у гэтым месцы пралягла дарога. Бо звычайна дрэвы ў лесе змешваюцца, і дубы, няхай сабе паасобныя, маглі расці па правы бок дарогі, як грабы — па левы. Можа, той і другі лес быў нават спецыяльна пасаджаны.

Калі Пятрок уступае ў лес, ён забывае пра ўсё на свеце. Для яго нібы настаюць святыя хвіліны. Кожная дзялянка лесу мае свой нораў, характар і выклікае ў душы адпаведны настрой. Сярод дубоў, высачэзныя шаты якіх нават у яснае надвор'е як бы вядуць патаемную размову з вятрамі, Пятрок адчувае сябе ўрачыста, нібы ў хораме, з думак, пачуццяў знікае ўсё дробязнае, нікчэмнае. Светлы, чысты бярэзнік выклікае такія ж светлыя і чыстыя пачуцці. А сярод ружовых верасоў з рэдкімі выноснымі соснамі на іх бясконцым абсягу хочацца марыць пра будучыню...

У час школьных канікулаў, калі пачынаюць расці грыбы, Пятрок ледзь не штодзень шастае ў лес. Грыбнікоў шмат, не так проста назбіраць хоць паўкошыка грыбоў, і перад тым, як пайсці ў лес, Пятрок заўсёды трывожыцца. Іншы раз ён нават ноччу прачынаецца ад неспакойнай думкі: ці знойдзе што-небудзь у лесе?

У самім лесе трывога пакідае Петрака. Дзень на дзень не падобны. Сёння ў адным месцы грыб падымеш; заўтра ў другім.

Гэты дзень быў для хлопчыка надзвычай шчаслівы. Удача напаткала на самым пачатку. Ніколі не заворчваў ён у дубняк, а сёння як бы што падштурхнула. Пятрок сыходзіць са шляху і вачам не верыць: на травяным доле, проста на дзёрне, сядзяць вялікія і моцныя, як капыты, баравікі. Іх сем ці восем штук. Відаць яны здалёк: проста сыдзі са шляху і бяры. Толькі, як і Пятрок, ніхто не верыў, што пад дубамі па траве могуць расці баравікі, не хадзіў тут, таму баравікі выраслі вялікія.

Знайшоўшы баравікі пад дубамі, Пятрок і ў грабняк заварочвае, які раней гэтак жа абмінаў. І тут пад апалым лісцем яму ўдаецца знайсці некалькі маладзенькіх баравікоў. Лес нібы адкрывае перад ім свае спрадвечныя таямніцы.

Калі ўдача, дык удача! Найбольш адорвае хлопчыка белагаловымі, схаванымі ў шчыльнай шорсткай траве баравічкамі невялікая паляна, якой хмуры цёмны грабняк аддзяляецца ад чарнічнага, наскрозь прагрэтага сонцам бору. Ён і раней знаходзіў тут грыбы. Але сённяшні паход у лес не ідзе ні ў якое параўнанне з усімі папярэднімі. Амаль поўны кошык грыбоў, добрая палова якіх баравікі, назбіраў Пятрок. Горды і шчаслівы ад сваёй удачы, прыйшоў дадому.

Дома Петрака чакае неспадзяванка. Бацька просіць памагчы згрэбці сена, і Пятрок, хоць трохі баляць ногі, згаджаецца.

І вось удвух з бацькам яны ідуць у той самы лес, дзе з раніцы Пятрок збіраў грыбы. Мінаюць дубовую граду і грабняк, паляну, дзе хлопчыку гэтак пашанцавала, прыходзяць на край атуленага лесам балотца.

Усё тут абходжана, зведана да дробязей і разам з тым як бы незнаёма. Пятрок зграбае сена, гоніць валкі, кідаючы даволі абыякавыя позіркі на дубы, на сваю грыбную паляну, што размешчана якраз насупраць балотца, праз шлях. Ён не адчувае ніякага ўзрушэння. Лес як лес. Сваю грыбную, таямнічую казку ён цяпер хлопчыку не расказвае. Сонца пайшло на схіл, яго прамяні кранаюць толькі вяршаліны дрэў, ад якіх кладуцца доўгія цені.

Сена шмат, бацька выкасіў усё балотца, размешчанае між лесу. Пятрок зграбае сена ў валкі, потым яны з бацькам складаюць яго ў копы. Ужо цямнець пачынае, а работа яшчэ не скончана.

Нарэшце чуваць лёскат калёс. Едзе старэйшы брат Валодзя. Пятрок з бацькам выносяць копы на бераг балотца, каб льга было адразу класці сена на воз. Пад'ехаўшы, Валодзя адразу пачынае займацца гэтай справай.

Бацька бярэ насілкі за кароткія канцы, пры самай капе, Петраку пакідае доўгія. Ён робіць так дзеля таго, каб сын меней стамляўся. А Пятрок сама ўвайшоў у ахвоту. Ён увесь дзень на нагах, але можа яшчэ працаваць хоць усю ноч. Стомы не адчувае. Такая, як цяпер, работа прыносіць вялікае задавальненне. Не меншае, чым збор грыбоў.

Калі на воз усклалі тры капы, Пятрок лезе ўтоптваць сена. Бо за-

стаюцца яшчэ дзве капы, якія абавязкова трэба забраць. Не прыязджаць жа па іх яшчэ раз.

Бацька падае Петраку гладкі драўляны рубель, спераду воза ўстаўлены ў вераўчаную пятлю. На рубель закідваецца вяроўка ззаду, сена ўціскаецца як толькі можна. Цяпер яно па дарозе не растрасецца.

Вось і скончана работа. Усё Петракова цела ные ад стомы. Але гэтая стома прыемная. Столькі за дзень зрабілі!

Ужо ноч вісіць над лесам. Лес Петраку здаецца зусім незнаёмым, загадкавым, таямніча-зацятым, але яшчэ прыгажэйшым, чым раніцай, калі ён прыходзіць сюды па грыбы.

## ПАВЕЛ ТКАЧОЎ

Павел Іванавіч Ткачоў нарадзіўся 3 верасня 1930 г. у вёсцы Скадаінаўка Шахцінскага раёна Растоўскай вобласці. Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Працаваў у рэдакцыях газет «Зорька», «Піянер Беларусі», часопіса «Бярозка». З 1969 г. загадвае кафедрай рускай класічнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, доктар філалагічных навук (1981).

Піша на рускай і беларускай мовах, друкуецца з 1955 г. Паспяхова працуе над ленінскай тэмай. Выйшлі зборнікі яго апавяданняў «Мікіткаў падарунак» (1960), «Акцябраты — твае сябры» (1962), «Вішнёвая квецень. Апавяданні пра Леніна» (1965; 2-е, дапоўненае і перапрацаванае выданне — 1971), «Самае галоўнае. Штрыхі да партрэта Ільіча» (1977), «Пра самага чалавечнага» (1985), «У ліпені 1917 года» (1986). П. Ткачоў — аўтар аповесцей «Пра Сяргейку і лясных жыхароў» (1961), «Сэрца камунара» (1966), «Пілiпка з Галубінай слабодкі» (1969), «Граніца была побач» (1972), «Як разгаралася полымя» (1982). У 1980 г. выйшла кніга выбраных твораў «Час світальнай зоркі». Пісьменнік — аўтар нарысаў «Імя Леніна ў сэрцы нашым» (1963), «Люся Герасименко» (М., 1968), «Пралескі яе вясны» (1988, аповесці і нарысы) і адзін са складальнікаў кнігі «Піянеры — героі» (1962).

Мастацкую дзейнасць П. Ткачоў плённа спалучае з навуковай. Напісаў некалькі літаратуразнаўчых прац аб памфлеце: «Вечный бой: Памфлетное наследие Я. Галана и традиции М. Горького» (1970), «Иду на «вы» (1975), «Границы жанра» (1977), «Сатиры злой звенящая строка...»: Природа смеха в памфлете» (1980).

## ВІШНЁВАЯ КВЕЦЕНЬ

На двары імжыць асенні дождж. Час ад часу бразгае аканіца. Андрэйка глядзіць у акно. Непадалёку ад іх дома — мануфактурная фабрыка. За ёю раскінуўся горад Глухаў. Але зараз нічога не відаць. Начная цемра ахутала ўсё — і фабрыку, і горад. Хлопчык бачыць толькі, нібы ў цёмным люстэрку, свой твар: кірпаты нос ды чорныя вочы-гузікі.

— І чаго глядзіш? — пытаецца маці.— Быццам нешта бачыш.

Андрэйка паварочваецца. У матчыных руках мільгаюць пруткі. Цёплыя панчохі будуць яму на зіму.

— Ат, гарэзнік,— маці цягне нітку.— Андрэйка, прагані яго.

Гарэзнік — гэта кот Васька. Шэра-паласаты. Ён заўсёды любіць падурэць. Вось і цяпер, быццам мышку, клубок нітак схапіў.

Саскочыў Андрэйка з лаўкі — і да ката. А ён пад ложак схаваўся.

Гадзіннік б'е адзінаццаць разоў. Андрэйку даўно пара спаць. Ды хіба ж можна! Тата хутка павінен вярнуцца. З Горак, ад Леніна. Ён

і яшчэ некалькі рабочых з фабрыкі паехалі наведаць хворага Уладзіміра Ільіча. Хлопчык цяжка ўздыхае: шкада, што яго не ўзялі. Пакрыўдзіўся тады Андрэйка. І было за што. Ён жа падказаў, які падарунак завезці Леніну.

Яны, дарослыя, доўга меркавалі. Андрэйка слухаў, слухаў, а потым кажа:

— Калі я хварэў, дык мама мяне вішнёвым варэннем вылечыла.

Засмяяліся рабочыя, а Пятро Сцяпанавіч — ён на фабрыцы за галоўнага — сказаў:

— А што, таварышы. Добрую думку падказаў Андрэйка. Вішні нашы, уладзіміркі, на ўсю Расію славяцца. Прыемна будзе Уладзіміру Ільічу ў вішнёвым садзе адпачываць.

Перад ад'ездам у Горкі тата з Андрэйкам пайшлі ў сад і выкапалі семнаццаць маленькіх дрэўцаў. Каб кожны рабочы пасадзіў. Васемнаццатую, самую лепшую вішаньку, Андрэйка хацеў сам адвезці.

— Малы ты яшчэ — сказаў тата.— А дарога цяжкая, далёкая. Падрасцеш крыху — тады і паедзем з табою.

Ніколі не плакаў Андрэйка, нават калі тыдзень назад нос да крыві разбіў. Балела моцна, але цярпеў. А тут слёзы самі з вачэй пакаціліся. Ён жа так марыў убачыць Леніна!

— Вазьмі! — і ён аддаў бацьку вішаньку,— за мяне пасадзіш.

...Імжыць за акном дождж. Ноч на двары. А тата ўсё не прыязджае. Вейкі робяцца нейкімі ліпучымі, самі склейваюцца. Хоча Андрэйка расплюшчыць вочы, ды не можа.

— Кладзіся ў ложак,— здалёк даносіцца голас мамы.

Маўчыць Андрэйка. Спіць ён.

Ранкам, ледзь толькі развіднела, прачнуўся хлопчык, падхапіўся з ложка і да таты:

— Прыехаў?

— Прыехаў!

— У Леніна быў?

— Быў, Андрэйка, быў. Прыехалі мы ў Горкі днём. Сустрэла нас Марыя Ільінічна, сястра Леніна. Павяла ў пакой. Не паспелі зайсці — насустрач Уладзімір Ільіч. Вясёлы. Усміхаецца. З кожным за руку прывітаўся.

— Сядайце, сядайце, таварышы,— запрашае нас.

Прыселі мы. Пачалі размаўляць. Ленін распытваў пра наша жыццё, пра фабрыку. Хутка праляцеў час. На развітанне я гавару:

— Падарунак мы вам, Уладзімір Ільіч, прывезлі.

Спахмурнеў Ільіч.

— Навошта,— кажа,— падарунак. Усім рабочым перадайце: не трэба мне падарункаў пасылаць.

Потым, калі даведаўся, што мы прывезлі вішанькі, узрадаваўся. Вельмі любіць ён дрэвы.

А табе, Андрэйка, Уладзімір Ільіч дзякуй перадаў і наказаў, каб добра вучыўся. Вось так, сынок.

Тата ўскудлаціў Андрэйку валасы і падняўся: пара на фабрыку ісці. А хлопчык рады. У вачах агеньчыкі гараць. І яго вішанька пасаджана ў ленінскім садзе! Праз некалькі год зацвіце яна, ягадкі

з'явяцца. Чырвоныя, спелыя. Уладзімір Ільіч сарве ягаду і ўспомніць пра Андрэйку. А вучыцца Андрэйка будзе добра, каб ведаць усё, усё.

* * *

Мінула шмат год. Разросся вішнёвы сад у Горках Ленінскіх. А калі дрэвы пачалі старэць, зноў прыехалі глухаўскія ткачы. Сярод іх быў і Андрэй Пятровіч, той самы хлопчык Андрэйка. Цяпер ён працуе інжынерам на фабрыцы. Падрэзалі рабочыя сухія галінкі. На месца старых пасадзілі маладзенькія дрэўцы. Як і раней, кожную вясну белай квеценню ўкрываецца сад, неўвядальны сведка народнай любві да Леніна.

## НАКАЗ

Зранку Уладзімір Ільіч праводзіў пасяджэнне Савета Працы і Абароны. Яно зацягнулася. Адразу ж пасля пасяджэння Ленін паехаў на сход рабочых аднаго маскоўскага завода. Некалькі дзён назад рабочыя папрасілі Уладзіміра Ільіча выступіць перад імі.

Вярнуўся з завода, нават не паспеў у кабінет прайсці — тэлефаністка паведаміла:

— На провадзе камандуючы Заходнім фронтам. Просіць некалькі хвілін.

Ільіч цікавіўся ў камандуючага ўсім: ці ёсць зброя, як з харчаваннем, вопраткай... Пад канец сказаў:

— Галоўнае — людзей беражыце.

Затым прыйшлі хадакі ад сялян. Наперадзе стары з сівой вялізнай барадою.

— Праходзьце, таварышы. Сядайце,— запрасіў Уладзімір Ільіч.

— Ды мы... прабачце, пастаім,— камечачы ў руках шапку, адказаў сівабароды.

— Ну, гэта вы дарэмна. У нагах праўды няма. Хіба не так кажу? — звярнуўся Ленін да сялян.

Усе засмяяліся. Прыселі на крэслы.

Гутарку пачаў стары, звалі яго Іванам Андрэевічам.

— Прыйшлі да вас, Уладзімір Ільіч, са скаргай на свой Савет. Цэглу мы падрыхтавалі на новую царкву... Дык тую цэглу забралі ў нас...

— Так. Кажаце, забралі... А вам вельмі патрэбна новая царква?

— Як вам сказаць...

— Проста і кажыце. Як думаеце.

— Старым памаліцца недзе ж трэба, а маладыя... тыя не надта ходзяць. Ім кніжкі падавай.

— Вось бачыце — кніжкі. Царква хоць старая, але ёсць. А школы няма. Маладыя пакрыўдзяцца на вас.

— Яно вядома...

Пад канец гутаркі вырашылі: Ленін пашле Савету распараджэнне вярнуць сялянам цэглу, а сяляне ўсе разам, гуртам пабудуюць школу.

— Значыцца, разам! — сказаў стары селянін.— Разам яно і пана лягчэй біць. Прыказка ў нас такая.

— Вельмі правільная прыказка.

Ленін цёпла развітаўся з сялянамі, праводзіў іх да дзвярэй.

Потым зайшоў Кржыжаноўскі па пытанню электрыфікацыі краіны. І толькі а чацвёртай гадзіне Уладзімір Ільіч сеў за пісьмовы стол. Роўнымі радкамі клаліся словы: «...мне хацелася б сёння пагутарыць на тэму аб тым, якія асноўныя задачы Саюза камуністычнай моладзі...»

На слове «моладзі» Уладзімір Ільіч спыніўся. Адвёў позірк ад паперы. Задумаўся. Міжволі ўспомнілася дзяцінства, школьныя гады. Вось ён вяртаецца з гімназіі дамоў. Вясёлы ўбягае ў калідор. Дзверы бацькавага кабінета адчынены — Ілья Мікалаевіч працуе. Праходзячы міма кабінета, ён, Валодзя, скорагаворкай дакладвае: «З грэчаскай пяць! З нямецкай пяць! З алгебры пяць!» Бацька задаволены.

— З алгебры пяць! — услых гаворыць Ленін і ўсміхаецца.— Не, голас не той...

Падняўся з крэсла, падышоў да акна, дзе стаяла разложыстая зялёная пальма. Адзін ліст пажоўк. Ленін абышоў пальму, стаў бліжэй да акна. Адсюль відаць Троіцкая вежа, двор Крамля. Добра пабудавана вежа — на вякі. Залюбаваўся Ільіч ёю, прыгажосцю восеньскага дня і нават не пачуў, як увайшла сакратар.

— Прабачце, Уладзімір Ільіч,— пошта.

— Калі ласка, Лідзія Аляксандраўна, пакладзіце на стол. Я зараз,— сказаў Ленін, не адрываючы позірку ад акна.

Здавалася, Ільіч забыўся на ўсё. Адышлі ўбок дзяржаўныя турботы. Хараство вежы прыцягнула ўвагу, захапіла думкі. Але не, не так гэта. Глядзеў Ільіч на вежу, а думаў пра пачатыя тэзісы свайго выступлення на з'ездзе камсамола, пра задачы юных камуністаў. Ім — сённяшнім хлопцам і дзяўчатам — даводзіць да канца справу, пачатую старэйшымі ў кастрычніку 1917 года, ім будаваць камунізм. І поспех залежыць...

Думкі перапыніў стук у дзверы. Зноў увайшла Лідзія Аляксандраўна.

— Уладзімір Ільіч, званіла Надзежда Канстанцінаўна: час абедаць.

— Абедаць? — здзівіўся Ленін і дастаў кішэнны гадзіннік. Пятая гадзіна. Папрасіў Лідзію Аляксандраўну: — Перадайце, што хутка буду, зараз іду.

Прыпыніўшыся ля стала, Ільіч прагледзеў пошту. Увагу прыцягнуў вялікі канверт з шэрай паперы. На канверце дзіцячым почыркам напісана:

«Масква, дзядулю Уладзіміру Ільічу Леніну».

А крыху ніжэй:

«Ад Васіля Адамчыка з Магілёўскай губерні».

— Гм. Та-ак. Дзядуля...

Усміхнуўся Ільіч і ўзяў канверт і газету «Правда» з сабою.

— Калі што — званіце на кватэру,— папрасіў Лідзію Аляксандраўну.

Пасля абеду — некалькі вольных хвілін. Ільіч разгарнуў «Праўду» і перасунуў крэсла да акна: цемнавата ў пакоі. Але тут жа адклаў газету: успомніў пра пісьмо. Акуратна раскрыў нажніцамі канверт. Дастаў пісьмо і — малюнак. Чалавек-асілак з мячом на кані. Ад асілка ўцякаюць ворагі. І няма ім ратунку. Хвіліна, другая — блісне маланкаю меч...

Пад малюнкам — подпіс: «Ленін-асілак».

— Надзюша,— паклікаў Ільіч Надзежду Канстанцінаўну.— Ты толькі глянь! Я — асілак!

Ленін засмяяўся. Паглядзела Надзежда Канстанцінаўна малюнак і таксама засмяялася. Потым сказала:

— А здольнасць у мастака ёсць. Вучыцца яму трэба.

— Так, так, вучыцца...

— Адкуль ён? — Надзежда Канстанцінаўна ўзяла канверт.— Тут толькі губерня ўказана. Поўнага адраса няма.

— Кажаш — няма. А мо ў пісьме? — Ленін разгарнуў пісьмо і пачаў чытаць:

«Добры дзень, дарагі дзядуля Ленін!

Піша гэтае пісьмо Васіль Адамчык з Магілёўскай губерні.

У першых радках, дарагі дзядуля, прымі паклоны ад маці маёй, Ганны, ад сялян нашай вёскі і ад мяне. І яшчэ — малюнак пасылаю. Маці кажа, што ён вельмі добры. Старшыні Савета дзядзьку Сцяпану і яго жонцы цётцы Аўдолі малюнак таксама спадабаўся. Дзядзька Сцяпан нават пахваліў мяне — сказаў: «Малайчына, Васілёк. На тваім малюнку Ленін сапраўдны». А дзядзька Сцяпан маніць не будзе, бо ён бачыў цябе. Было гэта ў Петраградзе. Тады ты з браневіка выступаў. Я хацеў і такі малюнак зрабіць. Ды ніколі браневіка не бачыў.

Я вельмі прашу, дарагі дзядуля Ленін: напішы такую паперу дзядзьку Сцяпану, каб ён запісаў мяне ў Чырвоную Армію. Багацеяў хачу біць. А то ў нашай вёсцы гаворка ідзе, нібыта хутка вернецца тутэйшы пан Ліснянскі. Зямлю адбярэ, кніжкі мае і алоўкі папаліць ды яшчэ свіней ягоных прымусіць пасвіць.

Я прасіў дзядзьку Сцяпана. А ён кажа: «Трэба падрасці, а цяпер самы час вучыцца. Хутка школу адкрыюць — вось там і ваюй з кніжкамі». Дык, калі ласка, напішы нашаму старшыні дзядзьку Сцяпану, няхай пашле мяне ў Чырвоную Армію. Бывай здаровы, дзядуля Ленін!

*Васіль Адамчык»*

Кончыў чытаць Ільіч пісьмо і сказаў:

— Правільна робіць старшыня Сцяпан: цяпер галоўная задача моладзі — з кніжкамі ваяваць. Шкада, што адраса няма... Надзечка, мне пара.

Да позняй ночы гарэла святло ў вокнах кабінета Леніна. Уладзімір Ільіч рыхтаваў наказ беларускаму хлопчыку Васільку, мільёнам такіх хлопчыкаў і дзяўчынак, іх старэйшым братам і сёстрам, усім будучым пакаленням: «...задачы моладзі наогул і саюзаў камуністычнай моладзі і ўсякіх іншых арганізацый у прыватнасці можна было б выказаць адным словам: задача заключаецца ў тым, каб вучыцца».

# БАРЫС САЧАНКА

Барыс Іванавіч Сачанка нарадзіўся 15 мая 1936 г. у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. У 1960 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У студэнцкія гады супрацоўнічаў у часопісе «Полымя». З 1976 па 1986 г. быў сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Першае апавяданне «Плынь» надрукаваў у 1956 г. у часопісе «Маладосць». Услед за першым зборнікам апавяданняў «Дарога ішла праз лес» (1960) выйшлі кнігі «Барвы ранняй восені» (1962), «Зямля маіх продкаў» (1964), «Пакуль не развіднела» (1966), «Апошнія і першыя» (1968), «Дарогі» (1971), «Аксана» (1971), «Памяць» (1973), «Чужое неба» (1975), «Тры аповесці» (1976), «Ваўчыца з Чортавай Ямы» (1978). У 1979 г. быў выдадзены раман «Вялікі Лес». Б. Сачанка — аўтар зборнікаў гумарыстычных апавяданняў «Вол-фігурыст» (1966), «Халасцяк» (1969), кнігі літаратуразнаўчых артыкулаў «Жывое жыццё» (1985).

Маленькаму чытачу Б. Сачанка адрасаваў зборнікі апавяданняў «Кошык малін» (1985) і «Бабка Адарка» (1987). У апошнім па часе выдання зборніку змешчана, акрамя апавяданняў, казка «Скарга».

Б. Сачанка пераклаў на беларускую мову паасобныя творы польскіх, рускіх пісьменнікаў.

За кнігу прозы «Ваўчыца з Чортавай Ямы» пісьменніку прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа (1982).

## ХЛЕБ

Было гэта даўно. Адразу ж пасля вайны. У голад.

Маці прынесла аднекуль акрайчык хлеба. Доўга-доўга разглядала яго, нюхала, паварочвала і так і гэтак, нібыта не верыла вачам сваім, што на далоні ў яе ляжыць хлеб — сапраўдны жытні хлеб, спечаны з чыстай, без ніякага дамешку, мукі, на подзе печы, на свежым дубовым лісці, прожылкі якога так прыгожа адбіліся на скарынцы. Потым яна нейк, як мне падалося, аж надта борзда і неахайна разламала акрайчык напал: адзін кавалак дала мне, а другі палажыла на стол, пад абрус.

— Гэта Толіку... Вернецца з лесу — то павячэрае...

Сама ж, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу.

Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з'еў, праглынуў мігам. І, вядома, ані не наеўся, толькі раструдзіў яшчэ больш свой голад. Хвілін колькі я не мог нідзе знайсці сабе месца. Чамусьці лазіў на печ, пад ложак, выбягаў на двор і зноў — каторы раз! — вяртаўся назад у хату. Потым усё ж не вытрымаў. Падсеў да стала, адгарнуў абрус, узяў у руку той кавалачак хлеба, што пакінула была маці Толіку, майму старэйшаму брату. Не есці ўзяў. Проста так, паглядзець. Палюбавацца хлебам, як любавалася кагадзе маці. І тады раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла, брату пакінула хлеба намнога больш, чым дала мне. Ад братавага кавалачка я адшчыпнуў крошачку. Толькі крошачку. Адну маленечкую, малюпасенькую крошачку. Укінуў яе ў рот. Пачаў жаваць. Калі пракаўтнуў, не заўважыў, як пальцы самі, не пытаючы ў мяне на тое згоды, адшчыпнулі яшчэ крошачку. Маленечкую, малюпасенькую крошачку...

...Схамянуўся я тады, калі на маёй далоні асталася адна абшчыпаная скарыначка. Што я нарабіў?! Што скажа маці, брат, калі вернуцца дахаты?..

Хуценька-хуценька я палажыў скарыначку на стол, накрыў яе абрусам. Але спакуса з'есці хлеб увесь, каб яго і духу не было ў хаце, каб ім і не пахла нават, была такая вялікая, такая неадольная, што я не выцерпеў — зноў падсеў да стала, узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот...

Брат вярнуўся з лесу, як заўсёды, позна, на змярку. Ён цэлы дзень быў на леспрамгасаўскай дзялянцы, абсякаў суччa, зарабляў грошы, каб было за што нашай сям'і жыць. Дома есці ў нас не было нічога. І спаць брат лёг у той вечар галодны. Ён доўга варочаўся на пасцелі, не засынаў: няйнакш, яму мроіўся той кавалачак хлеба, які пакідала яму маці і які з'еў я...

Ніхто — ні маці, ні Толік — ні ў чым мяне не папракнулі. Ні ў той вечар, ні пасля. Яны былі старэйшыя, я меншы.

Але калі я цяпер успамінаю той хлеб, які належала з'есці брату і які з'еў я, і той вечар, калі брат лёг праз мяне спаць галодны, мне робіцца не па сабе. Здаецца, аддаў бы ўсё, каб толькі не было ў мяне такога ўспаміну, каб як-небудзь пазбыцца, выкінуць яго са сваёй галавы. Лепей бы быў я тады галодны, лепей бы я лёг спаць не еўшы! Хай бы не я, а брат з'еў мой хлеб!..

Ды не! Таго, што было, не вернеш, не пераробіш. І з памяці сваёй, як бы ні хацеў, не выкінеш. Не, не выкінеш!..

### КОШЫК МАЛІН

Навальніца дагнала мяне, калі я не ад'ехаў і кіламетра ад лесу. Я націскаў, як толькі мог, на педалі, чуючы, што за спіною вуркоча гром, але ўсё роўна ўцячы ад дажджу не ўдалося,— дарога скрозь вузкая, каранiстая, і шмат дзе трэба было каціць веласіпед.

Бліснула маланка, і з грукатлівым абвалам грому хлынуў лівень. Я спыніўся і хуценька пачаў адвязваць ад багажніка плашч, які, выязджаючы з дому, захапіў на ўсякі выпадак, бо пякло і парыла.

Палявая дарога ўмомант раскісла, усюды пабеглі ручайкі, і ў калдобінах заблішчалі каламутныя лужыны. Чорт ведае што рабілася ў небе! Бы там нябачны хто мяшаў вялізнай мешалкаю незвычайнае варыва,— хмары дыбіліся, лезлі адна на адну...

Плашч мала ратаваў ад дажджу, і я, пастаяўшы, пакаціў памаленьку веласіпед да вёскі, што відаць была кіламетры за тры ад лесу. Раптам бачу: расплёскваючы лужыны, у падкасаных штоніках бяжыць, прыкрыўшы рукамі галаву, напярэймы мне хлапчук. Яшчэ здалёку крычыць:

— Дзядзечка, дайце плашч!.. Маліны мокнуць...

Я глянуў, куды паказваў рукою хлопчык. Скрозь сівую сетку дажджу я ўгледзеў у полі, ля куста вербалозу, жанчыну... Доўга не думаючы, я кінуў на абочыне дарогі веласіпед, а сам сiганyў цераз поле проста да жанчыны. Яшчэ на бягу скінуў плашч і падаў жанчыне, тая прыкрыла ім паўнюткі кошык спелых і буйных, апырсканых дажджом малін і, выпраставшыся, сказала неяк ціха, гледзячы ў вочы:

— Дзякуй вам. А то я ўжо думала, прападуць маліны... Мы ж

цэлы дзень петаваліся, каб варэнне зварыць. Сын у мяне ў горадзе. На заводзе...

Дождж ліў як з вядра, а жанчына і хлапчук стаялі і моклі, не прыкрытыя нічым, і радаваліся, што не прападуць маліны. За кампанію мок і я, думаючы пра маці, родную, бясконца дарагую маці, якая гатова на ўсё, абы толькі прынесці хоць трошкі радасці дзецям...

## БАБКА АДАРКА

Ні ў кога, мабыць, няма такой бабкі, як бабка Адарка ў Аленкі. Добрая, ласкавая, працавітая. Калі ні прыйдзе Аленка да яе, усё нешта робіць. То каля печы ў хаце завіхаецца, то ў гародзе сее, садзіць, поле, акопвае, то ў лес па ягады ці грыбы спяшаецца. І ўсё быццам камусьці кланяецца, шэпча. Але і пачаставаць умее. І не купленым у магазіне, а сваімі рукамі вырашчаным, сабраным, прыгатаваным. Чаго толькі няма ў бабкі Адаркі! Морква, бручка, мак, гарох, гуркі, памідоры, гарбузікі, арэхі... А што да садавіны, ягад розных, грыбоў, то... І сушаныя, і смажаныя, і вараныя, і квашаныя...

Нідзе ў вёсцы на сотках так не родзіць, як у бабкі Адаркі. Што ні пасее — усё ўродзіць. І як! Гарбузы — не падняць, памідоры — па кулаку, бульба, морква, бручка — з зямлі не выбраць. І калі ў лес па ягады ці па грыбы бабка Адарка пойдзе — ніхто з ёю не справіцца, больш не прынясе.

— Адарка нейкія сакрэты ведае! — кажуць у вёсцы пра бабку людзі.

Неяк бабка Адарка, ідучы ў лес, і Аленку з сабой узяла. І па дарозе, як і звычайна, кланялася і ўсё нешта шаптала, шаптала. Аленка не вытрывала — спытала:

— Каму ты, бабка, кланяешся, што ты шэпчаш?

— Людзям, зямельцы, сонейку,— заўсміхалася бабка.— І не шапчу, а дзякуй кажу. Надта ж яны шчодрыя, дабром за дабро, ласкай за ласку плацяць, усё для жыцця, шчасця нам даюць.

І ў лесе, калі ягады пачаліся, брала іх і ўсё кланялася, шаптала, няйначай, кожнай галінцы, кожнай ягадцы дзякавала.

Вось якая ў Аленкі бабка Адарка!

## НАСЦЕЧКА

З горада ў вёску да бабы і дзеда прыехала ўнучка Насцечка.

— Ну-ну,— казалі тата і мама.— Паглядзіце, у каго яна ўдалася?

І дзед, і баба спадабаліся Насцечцы. Ды так, што, калі тата і мама пачалі збірацца ехаць назад у горад, Насцечка склала бантікам губкі, заплакала.

— Не хачу нікуды ехаць. Хачу ў дзеда і бабы жыць.

Дзед і баба толькі таго і чакалі.

— Няхай пераначуе ў нас,— узяліся яны ўгаворваць тату і маму.— Калі што якое — заўтра прыедзеце і забераце.

Тата і мама паслухаліся.

Ні на крок не адыходзілі ад унучкі дзед і баба. І накармілі яе, і напаілі, і спаць палажылі.

Прачнулася раніцай Насцечка і доўга не магла зразумець, дзе гэта яна. Калі ж нарэшце зразумела, здагадалася, саскочыла з ложка, патэпала босымі ножкамі туды, дзе была кухня. Адчыніла дзверы — і ўбачыла бабу і дзеда. Баба, нагнуўшыся над дзіўнай драўлянай пасудзінай, нешта секла, а дзед... Што ж гэта такое рабіў дзед? Сядзеў на табурэціку і біў малатком па нечым бляшаным — дзінь-дзінь-дзінь!..

— Дзед, што ты робіш? — спытала Насцечка.

— Касу кляпаю,— заўсміхаўся ў свае пышныя пшанічныя вусы дзед.

— А навошта табе каса?

— Касою я накашу карове сена. Карова з'есць яго і дасць нам малака. А з малака, як ты ведаеш, і смятана, і тварог, і масла.

— А ты, баба, што робіш? — падышла бліжэй да бабы Насцечка.

— Я сяку бульбу,— лагодна адказала баба.— Усыплю сюды мукі, развяду цёпленькаю вадою ды свіней накармлю. Вырастуць свінні — і мяса, і сала, і каўбасы будуць.

Пастаяла Насцечка, паглядзела на дзеда і бабу і кажа:

— Дзед сена будзе касіць, баба свіней карміць. А мне што рабіць?

— О! Абы ахвота была, а работы ў нас на ўсіх хопіць.

Кінула баба сячы бульбу, узяла місачку, насыпала ў яе залацістых зярнят.

— Я вось пайду свіней карміць, а ты,— падала яна місачку з зярнятамі Насцечцы,— курэй накорміш. Куры наядуцца зярнят і яечачка табе свежае знясуць...

Прыехалі з горада тата і мама, бачаць: стаіць іхняя Насцечка сярод двара, сыпле курам ячмень, а тыя дзяўбуць яго ды ціхенька — ко-ко-ко! — перамаўляюцца, няйначай, радуюцца, што памочніца ў дзеда і бабы з'явілася, хваляць яе.

Глядзелі на Насцечку тата і мама, любаваліся, вачэй не маглі адвесці. Малая, а якая малайчына! Цяпер яны пэўна ведалі: будзе з яе клапатлівая гаспадыня-працаўніца.

## ВІСАРЫЁН ГАРБУК

Вісарыён Сцяпанавіч Гарбук нарадзіўся 24 лістапада 1913 г. у вёсцы Шкілякі Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Чашніцкую сямігодку (1930), Лепельскі педтэхнікум (1933). Некаторы час працаваў настаўнікам Дварэцкай няпоўнай сярэдняй школы (1933—1935) і адначасова завочна вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. У 1935 г. перавёўся на стацыянарнае аддзяленне гэтага інстытута. З 1940 г. працаваў выкладчыкам мовы і літаратуры і загадчыкам навучальнай часткі Мехаўскай сярэдняй школы на Віцебшчыне. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абароне Масквы, вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях на Одэры і за Берлін. У 1946 г. захварэў на поліартрыт, доўгі час быў прыкаваны да ложка. Жыве ў Пяцігорску.

В. Гарбук піша на беларускай і рускай мовах. Першае апавяданне «Путешествие в будущее» было апублікавана ў часопісе «Семья и школа» ў 1957 г. Неўзабаве выйшлі кнігі апавяданняў «Не шукаю спакою» (1963), «Лицо в полоску» (1967; на рускай мове). Пісьменнік піша пераважна для дзяцей. Маленькаму чытачу адрасаваны яго кнігі «Танюшкины рассказы» (Стаўрапаль, 1964; на рускай мове), «Алачка-забывалачка» (1964), «На маім акне» (1966), «Незнарок і знарок» (1968), «Такіх кветак

не бывае» (1971), «Хто такія мы» (1973), «Мышки и Мишки» (Стаўрапаль, 1974; на рускай мове), «Са мной здарылася неверагоднае» (1977), «Горад без папугайчыкаў» (1983). Для дзяцей пераклаў на беларускую мову і апрацаваў казкі народаў Паўночнага Каўказа (склалі зборнік «Напітак волатаў», 1969).

## НЕЗНАРОК І ЗНАРОК

Лужына яшчэ здалёк убачыла Юру і ўзрадавалася.

— Бяжы сюды, пагуляй са мной! — паклікала яна.

Юра з разгону пераскочыў цераз лужыну, толькі пырскі ва ўсе бакі паляцелі з-пад чаравікаў.

— Давай гуляць, хто вышэй падскочыць,— сказаў Юра.

Лужына, нібы дураслівае шчаня, то адступала перад хлопчыкам, то хапала яго за ногі, узлятала фантанам і абсыпала дажджом. Нарэшце яна так раздурэлася, што абліла Юру з галавы да ног.

— Ай! — спужаўся хлопчык.— Што я цяпер буду рабіць?

— Бяжы да мяне! — паклікала Юру гліна, што ляжала непадалёку.— Мяне дождж размачыў, і ты налепіш сабе цацак.

Прысеў Юра перад глінаю і ўзяўся за работу. Вылепіў ракету, паставіў яе на пляцоўку для запуску. Побач выстраіліся самалёты і самазвалы. Вартаваць ракетадром даручыў кату Цімку і аўчарцы Сігналу, якіх вылепіў пасля.

Зірнуў Юра на свой касцюмчык, уздыхнуў і пабег па вуліцы.

Тут убачыў яго высокі плот і пачаў дражніцца:

— А ты не ведаеш, што я за спіной хаваю?

— Падумаеш,— адказаў Юра,— узлезу на цябе і пагляджу.

— Не, не ўзлезеш. Я высокі.

Падбег Юра да плота і пачаў караскацца. Узабраўся, сеў, паглядзеў наўкол і сказаў:

— Хто перамог?

— Пабачым, як ты злезеш,— усміхнуўся плот.

— Магу нават саскочыць,— пахваліўся Юра.

— А я цябе не пушчу,— плот учапіўся сучком за Юркаву куртачку.

— А я ўсё роўна саскочыў,— адказаў Юра, апынуўшыся на зямлі.

Калі хлопчык сядзеў наверсе, яго ўбачылі каменьчыкі, насыпаныя каля хаты цёткі Дашы, і паклікалі да сябе:

— Нам так абрыдла ляжаць на адным месцы. Пагуляй з намі.

Падбег Юра да каменьчыкаў і пачаў падкідаць іх угору.

Усім было весела, і кожны каменьчык спяшаўся хутчэй трапіць у рукі да хлопчыка.

Раптам адзін, самы нецярплівы, вырваўся з пальцаў у Юры і паляцеў зусім не ў той бок. Юра і ахнуць не паспеў — дзын! Каменьчык разбіў шыбу ў акне цёткі Дашы і заляцеў у пакой.

Спалохаўся Юра, разгубіўся. Але тут яго выратавалі ногі. Яны самі — хлопчык і вокам не паспеў міргнуць — прынеслі Юру дадому.

— На каго ты падобны! — пляснула рукамі маці.

— Я незнарок,— адказаў Юра.

— Што ж ты цяпер будзеш рабіць? — спытала маці.

— Не ведаю.

— Хіба ты забыўся, чаму я цябе вучыла?

— Не: зрабіў дрэннае незнарок — папраў на добрае знарок.

— Ну дык бярыся за работу.

Юра зняў куртачку, зашыў яе, вымыў, павесіў сушыць, паваксаваў чаравікі, памыўся сам, пераапрануўся і моўчкі падышоў да маці.

— Вось і малайчына! — пахваліла маці.— Але чаму ты такі сумны?

— Эх,— уздыхнуў Юра,— так незнарок усё робіцца. Мама, я да цёткі Дашы павінен схадзіць. У яе шыба разбілася.

## ТАКІХ КВЕТАК НЕ БЫВАЕ

Неяк гэтым летам мая суседка, пяцігадовая Таня, збірала на лузе кветкі: рамонак, шчамяліцу, глухую крапіву, трыпутнік,— сцяблінку да сцяблінкі. Яна паказвала іх мне і казала:

— Во якая прыгожая кветка!.. І гэтая прыгожая... І вось гэтая. Я занясу іх бабулі і пастаўлю ў вазу.

— А ты пашукай непрыгожую,— сказаў я.— Самую непрыгожую.

Таня ўважліва паглядзела мне ў вочы і, убачыўшы, што я гавару зусім сур'ёзна, задумалася.

— Такіх кветак не бывае,— нарэшце адказала яна. Потым яшчэ падумала, зноў паглядзела мне ў вочы і рашуча запэўніла: — Нідзе не бывае!

## НЕ БЫЛО Б І СОНЦА

Пяцігадовая Леначка гуляла на вуліцы з сяброўкамі. Дзяўчаткі вазілі ў скрынцы самаробную лялька і невялічкае кацяня. Нечакана Леначку паклікалі.

— Бяжы дадому, твой тата прыехаў!

Леначка спалохалася немаведама чаго і, кінуўшы лялька, пабегла дахаты.

За сталом сядзелі зусім незнаёмыя дзядзька і цётка ў ваенным адзенні. Заплаканая маці падхапіла Леначку на рукі, пасадзіла на дзядзькавы калені і загадала:

— Абдымі і пацалуй нашага татку.

— Вось якая ты ў мяне! — сказаў дзядзька.

Яго дужыя рукі асцярожна прытулілі дзяўчынку. Леначка адчула ля шчакі халодныя медалі і пяшчоту пальцаў, якія паволі гладзілі яе плечы, шыю, твар. Каля вуха заласкатала. Засмяяўшыся, яна раптам ускінула хударлявыя, запэцканыя ў пясок ручаняткі і, абняўшы бацьку за шыю, спыталася:

— А ты цяпер, татка, назаўсёды?

Цяжка ўздыхнуўшы, бацька адказаў:

— Але, мая дачушка, назаўсёды.

Калі назаўтра раніцай цётка развіталася з імі, а маці пайшла на працу, Леначка засталася дома з бацькам. У насцеж расчыненыя вокны ліўся пах ліпавага цвету. На падлозе ляжалі квадраты сонца. Бацька сядзеў ля акна і слухаў расказы дачкі.

— Мы з мамкай чакалі цябе, чакалі... Мамка варэнне варыла... А я пальчык апякла. І язык.

Раптам Леначка таямніча сказала:

— Тата, а я бачыла.

— Што ты бачыла?

— Бачыла, як ты ўчора вочы вымаў і клаў у шклянку з вадой. А чаму мае вочы не вымаюцца?.. Тата, чаму ты маўчыш?.. Тата, а яны без цябе бачаць?

— Не, дачушка, не бачаць. Ідзі пабегай!

— Не хачу.

— Ну, пакліч маму!

— Ты хочаш абедаць? — Леначка падхапілася.— Зараз.

Зачыніліся дзверы, і былы салдат Аляксандр Мацвееў застагнаў, абхапіў галаву рукамі і захістаўся з боку ў бок, нібы адчуў нясцерпны пякучы боль. Такой нясцерпнай пасля дачушкіных слоў стала цемень, якая ахутала яго на ўсё жыццё.

Толькі праз дзве гадзіны Леначка з мамай вярнуліся з дзіцячага сада, дзе маці працавала выхавацелькай.

— Ну, як наш тата, не сумаваў без нас адзін? — спытала маці. Яна падышла да бацькі, абняла яго. Падбегла, прытулілася да таты і Леначка.

— Што ты, маці! Я слухаў жаваранка,— адказаў тата. Я так даўно яго не чуў... А памятаеш, Воля, там, на дарозе, каля дуба, у які ўдарыў пярун, мы стаялі апошні раз... А над балотам стагналі кнігаўкі. Ты плакала...

— А помніш, я сказала, што ты вернешся! Да нас вернешся. І я ўсе гады верыла...

— А я дзе была, калі тата ішоў на фронт? — спытала Леначка.

— Цябе яшчэ не было.

— Зусім не было?

— На свеце не было. Яшчэ не нарадзілася,— засмяялася маці.— Як пачне задаваць пытанні, толькі адказвай!..

— А мы за вайну з мамкай так нацярпеліся без цябе! — як дарослая, сказала Леначка.— І ты, тата, без нас нацярпеўся?

— І я, дачушка!

Ён узяў Леначку пад локці і, не выпускаючы з рук, пачаў гушкаць. Потым прытуліў, пацалаваў і сказаў:

— Нацярпеліся, дачушка, каб больш ніколі не цярпець. Я не бачу цябе, Леначка... Ні мамы не бачу, ні сонца. Нічога не бачу. Але мы адваявалі сонца для вас. І мне хочацца жыць...

На двары Леначка сказала сваім сяброўкам:

— Мой тата не бачыць ні мяне, ні мамы. Але каб тата не быў на фронце, не было б і сонца.

## АЛАЧКА-ЗАБЫВАЛАЧКА

У нашым дзіцячым садзе ёсць дзяўчынка Алачка. Раней яна ўвесь час забывала сваё імя. І празвалі яе Алачка-забывалачка.

Неяк раз нянька паклікала адну дзяўчынку:

— Мілачка, дзе ты? Ідзі шакаладку сваю вазьмі!

Замест Мілачкі падбегла да няньні Алачка-забывалачка і стала перад ёю.

— Хіба ты Мілачка? — здзівілася нянька.

Алачка заміргала вачыма і кажа:

— Мне здаецца, што я Мілачка.

— А можа, ты Алачка? — пытаецца нянька.

— Няўжо я Алачка? — глытаючы слінкі, уздыхнула наша забывалачка.— Мне так хочацца быць Мілачкай...

А то накідае Алачка смецця на падлогу або паломіць цацку. Пачнуць шукаць, хто гэта нарабіў. Наша забывалачка возьме і схаваецца.

— Ала, Алачка, дзе ты? — клічуць яе.

А яна ні гу-гу! Не абзываецца.

Нарэшце знойдуць яе і кажуць:

— Што ж ты маўчала?

— А я думала, што вы другую дзяўчынку шукаеце.

— Дык ты ж у нас адна Алачка,— дзівяцца нянькі і выхавацельніцы.— Хіба ты забылася?

— Забылася,— адказвае Алачка.

— І што смецця накідала, таксама забылася?

— Таксама,— адказвае наша забывалачка.

Аднойчы надзела Алачка Петрыкаву шапку і стала сярод хлопчыкаў.

— Ты хто? — спыталі ў яе.

— Хлопчык,— адказала яна.

— А як цябе зваць?

— Петрык.

Выхавацельніца ніяк не магла зразумець, як гэта ў групе апынуўся лішні хлопчык, а дзяўчынкі не хапае. Думала, думала, пакуль не здагадалася, хто ў гэтай блытаніне вінаваты.

І дома ў Алачкі заўсёды што-небудзь здаралася.

Шукае яе маці, шукае старэйшая сястра.

— Ала, Алачка! Дзе ты? Абед астывае.

Алачка ж гуляе непадалёку і маўчыць.

— Ты чаму не абзывалася, калі мы цябе клікалі? — пытаецца маці.

— А я тады была не Алачка, а Мушка-зелянушка,— адказвае хітруха.

Аднойчы вярнулася Алачка з вуліцы ўся з галавы да ног мокраямокрая, хоць бяры ды выкручвай.

— Дзе ты так выкупалася?! — здзівілася маці.

— Я не выкупалася,— запярэчыла дачушка.— Гэта я на белай хмарцы пракацілася.

— На якой такой белай хмарцы?

— Што ў лужыне пасля дажджу засталася,— спакойна адказала Алачка.

Нядаўна прыйшла ў садзік Алачкіна мама. Узрадавалася дзяўчынка, бяжыць да яе.

— Хіба ты мая дачушка? — пытаецца маці.

— Твая! — упэўнена адказвае Алачка.

— Штосьці не помню. Здаецца, у мяне была другая дачка: Лідачка ці Жэнечка.

— Не, мама. У цябе я адна! І завуць мяне Алачка.

— Няўжо? — дзівіцца маці.— Ніяк не магу ўспомніць. Пайду дахаты. Успомню — зноў прыйду.

Напалохалася Алачка, што маці сапраўды забудзецца на яе. І ўсе забудуцца. Пераблытаюць з другой дзяўчынкай або нават з хлопчыкам.

А потым зірнула на маму і прытулілася да яе.

— Ты, мамачка, мяне не забыла! — радасна сказала дзяўчынка.— Па вачах бачу. Я твая Алачка-незабывалачка.

## ГОРАД БЕЗ ПАПУГАЙЧЫКАЎ

Валодзя, худзенькі хлопчык з вялікімі задуменнымі вачыма на бледным твары, апрануты ў цёплы пушысты гарнітур, застаўся дома адзін. Бацька з маці пайшлі на работу, а сястрычку адправілі да бабулі. Валодзя доўга хварэў, і ў школу яго пакуль што не пускалі.

Каб не адстаць у вучобе, Валодзя рыхтаваў урокі, чытаў, маляваў. Ён прыбіраў кватэру, сам на электрычнай плітцы padаграваў яду, але ўсё надакучыла. Захацелася да дзяцей на вуліцу, у Дом піянераў. Калі б з ім у гэтыя дні былі хто-небудзь з птушак або звяроў. Але вожык і чарапаха спяць у склепе, а кошка і рыбкі ў акварыуме надакучылі.

Хлопчык марыў аб незвычайным. У далёкай Бразіліі ў кожнай сям'і жыве анаконда — да дзесяці метраў даўжыні. Без яе ні адно дзіця кроку не ступіць. Яна — смерць для ўсіх ядавітых змей. Пяшчотная, нібы кацяня. Валодзя сядзеў бы з ёю на тахце і забаўляўся.

Вядома, пра анаконду можна толькі марыць. Надзеі ніякай. Але ў аўтобусе аднойчы ён бачыў дзядка, які трымаў на каленях клетку. У клетцы сядзелі два папугайчыкі — зялёны і блакітны. Дзядок падрабляў голас, свіркаў. Птушкі дружна адгукваліся. Было вельмі весела. Гаварыў, што папугайчыкаў вязе ўнучцы.

Не можа быць, каб ні ў кога ў горадзе не было гэтых дзіўных птушак...

Хлопчык зручней прымасціўся ля тэлефона, паклаў перад сабой кнігу абанентаў і адшукаў спіс хатніх адрасоў.

Абакалін Н. В.— 29-47, Абакрын В. С.— 74-91, Абалкін Ю. Ю. Можа, лепш пачаць з канца? Вось Яшчук І. І.— 22-00, Якарчэня Н. В. ... І тут нейкія незнаёмыя, строгія прозвішчы. Не, ні з пачатку, ні з канца, а лепш з сярэдзіны...

Доўгія гудкі з перапынкамі ідуць адзін за адным: ту-у-у- — цішыня, зноў — ту-у-у... ту-у-у... Ніхто не падыходзіць.

Валодзя ўявіў: недзе ў горадзе на другім або трэцім паверсе ёсць кватэра. Кухня, спальня і пакой, калідор і ванна. У пакоі — стол, шафа з кнігамі, тэлевізар, у спальні — канапы, шыфаньер з люстэркам. І нідзе нікога. Толькі вада з крана на кухні: пюнь, пюнь, пюнь.

Хлопчык смялей набраў наступны нумар. Кароткія гудкі: ту-ту-ту. Хтосьці размаўляе.

У газетах пішуць, што хутка тэлефоны заменяць відэатэлефонамі. Ля кожнага апарата — экран, бачыш, з кім гаворыш. Тады нельга будзе розным недарэкам свавольнічаць па тэлефоне: «Дайце трыццаць тры сігналы праверкі» або «У вас прышчэпкі ёсць? Павесьце адну сабе на язык».

21-21. Лёгка запомніць. І прозвішча не страшнае: Папчанка М. М. «Ту-у-у», і адразу — «Я слухаю». Сярдзіты гучны бас. Валодзя ўздрыгнуў. «Я слухаю»,— нецярпліва паўтарыў бас.

«Высачэзны, тоўсты, у шэрым, з гальштукам, лысіна, бровы чорныя... Сядзіць за сталом, нібы дырэктар у школе, піша»,— уявілася Валодзю. Але чаго маўчаць? Смялей!

— У вас папугайчыкі ёсць?

— З падобнымі пытаннямі належыць звяртацца да адміністрацыі адпаведных устаноў,— адказаў бас і паклаў трубку.

Расхацелася пытацца.

На шэрай зямлі брудныя плямы снегу. Воддаль за акном рыжаватая сцяна шматпавярховага дома. Цёмныя прамавугольнікі акон. У адным чамусьці ўсе дні гарыць лямпачка. І нідзе нікога.

Пазваніць яшчэ...

Пасля першага гудка цікаўнае, нясмелае: «Хто там?»

Дзіцячы голас. Відаць, дзяўчынка. Адна ў пакоі. Бабуля, відаць, пайшла ў магазін або сядзіць на кухні ля пліты і вяжа.

— У вас папугайчыкі ёсць?

— А хто пытае: хлопчык ці дзяўчынка?

— Хлопчык.

— Мне мама забараніла гаварыць з хлопчыкамі.

— Чаму?

— Бо яны ўсе хуліганы.

Валодзя не ведаў, што адказаць. Дзяўчынка трубку не клала. І зноў цікаўнае:

— А навошта табе папугайчыкі?

— Гуляць з імі.

— Ты адзін?

— Але.

— Як цябе зваць?

— Валодзя.

— А мяне — Зіна. А што ты робіш?

— Хварэю.

— І я хварэю. Мне вельмі сумна.

— І мне.

— У цябе таксама нікога — ні брата, ні сястры?

— Сястру адаслалі да бабулі.

— А я зусім адна.

Валодзя пачуў, як дзяўчынка ўздыхнула.

— Ой, нехта зараз зойдзе! — заспяшалася Зіна.— Дзе ты жывеш? Скажы нумар! Заўтра пазва...

Не дагаварыўшы, яна паклала трубку.

Валодзя ўсміхнуўся. Размова па тэлефоне яму падабалася.

На наступны выклік доўга ніхто не адгукаўся, але хлопчык не клаў трубку — слухаў песню, якая гучала па лініі:

Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.
Пасаджу капусту
Ні рэдка, ні густа.
Пайду я рана,
Капуста парвана,
Пайду я позна,
У капусце...

Рэзкае і кароткае «Алё-ё!» абарвала песню.

— У вас... скажыце, калі ласка... папугайчыкі ёсць?

— Што?

— У вас папугайчыкі ёсць?

— Не паспеў навучыцца трубку трымаць, а ўжо хуліганіш. Вось паклічу міліцыю, і твайго бацьку аштрафуюць, а тэлефон абрэжуць.

Голас хрыпаты. Нейкая зласлівая старая, відаць, падобная на тую, што жыве ў суседнім пад'ездзе. Курыць і крычыць на хлапчукоў, а з пераносся пудра сыплецца.

— Якіх табе, хлопча, папугайчыкаў трэба? — здзівіў Валодзю пявучы голас невядомага Памяранцава А. А. Хтосьці, падобны да чарадзея з казак.

— Аўстралійскіх.

— А навошта?

— Навучыць размаўляць.

— Эге, мілы! А тыгра або гіпапатама табе не хочацца? Кракадзіла ці кобру? Во гэта дзіва. А лепш за ўсіх, ведаеш, каго?

— Не-а.

— Нашага верабейку. Ты толькі прыгледзься да яго. Якая ва ўсім незалежнасць! Вось дзе характар! А што такое папугаі і папугайчыкі? Трашчаць, на ўсе галасы паўтараюць даўно паўторанае. Вось яно як, хлопча.

Валодзя засмяяўся, хоць і не зусім зразумеў, што сказаў гэты Памяранцаў.

Пры наступных выкліках хлопчыку зноў не шанцавала. Або не адгукаліся, або адказвалі «Не, няма» і адразу клалі трубку. Валодзю абрыдла званіць.

— Ніяк не магла дазваніцца! — здзівілася маці, вярнуўшыся з працы.— Усё занята. Ты з кім размаўляў?

— Я папугайчыкаў пытаў,— адказаў Валодзя.

— І на цябе не сварыліся? — строга сказала маці.— Глядзі, а то нам тэлефон выключаць.

Назаўтра Валодзя ўспомніў пра папугайчыкаў толькі тады, калі ўбачыў праз акно дзяўчынку з партфелем. Пазваніць Зіне? А нумар забыўся. Здаецца, гэты. Вось узрадуецца.

Далікатны жаночы голас: «Я вас слухаю» выклікаў у хлопчыкавай памяці твар тоўстай жанчыны з цырульні, якая падстрыгала яго і ўсё распытвала, кім працуе бацька, маці, дзе яны жывуць.

— Скажыце, калі ласка, у вас папугайчыкі ёсць?

— Як вы сказалі?

— У вас папугайчыкі ёсць?

— Даруйце — не разумею. Зараз падыдзе муж.

Валодзя ў здзіўленні пачуў прыглушанае:

— Ідзі сюды!.. Я не магу... Там пытаюцца пра нешта незразумелае... Ды не, пад дзіцячы голас.

— Я слухаю,— насцярожаная, але паспешлівая інтанацыя, нібы ў настаўніка па арыфметыцы.

— У вас папугайчыкі ёсць?

— А каму вы звоніце?

— Вам.

— Нам! Як прозвішча і па якім тэлефоне?

Валодзя назваў прозвішча і нумар тэлефона.

— А адкуль вы даведаліся?

— З нашай кніжкі.

— Вось што, малады чалавек,— раззлаваны голас гучаў так рэзка, што аж затрымцела ў трубцы.— Я такімі глупствамі не займаюся! І вам не раю!

— Перапужаліся,— уголас сказаў Валодзя.

Ён чамусьці ўспомніў пра вочка, якое ўставіў іх сусед у сваёй кватэры. Перш чым пусціць каго, гаспадар доўга глядзіць у вочка. І ў гэтых, мабыць, тое ж самае. А дзверы на тры замкі. І на паштовай скрынцы нумарны замочак.

— Дзяўчаткі, ціха! — пачулася ў трубцы пасля таго, як хлопчык набраў новы нумар — Што-што? Папугайчыка? Можа, лепш папугайку? У нас ёсць. Марынка, цябе запрашаюць! Хочуць пазнаёміцца.

Валодзя ціхенька націснуў на рычажок.

— Табе з заамагазінам трэба б сазваніцца. Але шкада, у нашым горадзе такога магазіна няма,— пачуў ён спакойны голас мужчыны, як набраў яшчэ адзін нумар.— Што ж прыдумаць? Магчыма, што ў каго ёсць папугаўчыкі, у таго няма тэлефона. Ты даўно шукаеш?

— Даўно.

— Але, брат, задача нялёгкая. Не вырашыць адразу. Настойлівасць і час патрэбны. Мабыць, хварэеш, калі ўзяўся за такія пошукі?

— Я паправіўся, а ў школу не пускаюць.

— У майго пляменніка акурат такая непрыемнасць. Але ён без тэлефона,— з людзьмі ніякіх кантактаў... Ну, вось што. Ты дай свае каардынаты, адрас, тэлефон... На рабоце ў мяне заўтра выхадны. Я ў сяго-таго распытаю і заўтра пазваню. У гэты ж час — у пятнац-

цаць нуль-нуль. Дамовіліся?.. Запісваю. Ого, брат, мы, аказваецца, цёзкі! Мой нумар не забудзеш? А пошукі працягвай.

— А кім вы, дзядзька Валодзя, працуеце?

— Ну, брат, не ўсё адразу. Пры сустрэчы пагаворым. Ясна?

— Ясна! — адказаў хлопчык.

Ён паклаў трубку. Уявіў сабе дзядзьку Валодзю. Спачатку дзядзька Валодзя быў падобны на марака Жору, які мінулым летам вярнуўся са службы. Усе хлапчукі гужам хадзілі за ім. Шкада, паехаў вучыцца. Потым успомніўся дзядзька Мікола — машыніст электравоза. Потым... Хутчэй бы пазваніў. Калі б ён жыў у гэтым доме...

Шукаць папугайчыкаў расхацелася. Пазваніла маці, потым Соня, шэф з іх піянерскага звяна. Дзяўчынка расказала, што ў школе, што задалі на заўтра. Валодзя запісаў. Радасць не пакідала яго ні на хвіліну.

— Соня, а мне папугайчыка абяцалі. Я па тэлефоне пазнаёміўся. Каб ты ведала, які гэта чалавек! Мой цёзка! Вось убачыш, ён з ваенных. Нядаўна дэмабілізаваўся. Так і кажа: «Заўтра ў пятнаццаць нуль-нуль».

Хлопчык ледзь дачакаўся заўтрашняга дня. Ён баяўся, што на іх лініі раптам абарвецца сувязь ці сапсуецца тэлефон у дзядзькі Валодзі. Баючыся забыць, паўтараў нумар. Рупіла пазваніць самому. Ён набіраў першую лічбу, другую, трэцюю, а на апошняй спыняўся. Калі дамовіліся, нельга непакоіць.

У пятнаццаць нуль-нуль пачуўся званок.

— Я слухаю.

— Вітаю цябе, цёзка. Як здароўе?

— Добрае.

— Ты скажы, да цябе можна зайсці?

— А як жа! Я і маме, і тату пра вас казаў.

— Вельмі добра. Хвілін праз дваццаць буду.

Дзядзька Валодзя быў не падобны ні на марака Жору, ні на дзядзьку Міколу. Значна старэйшы, з кіёчкам і накульгваў.

— Праходзьце!.. Сядайце!.. А я думаў...

— Ты думаў — я зусім малады,— засмяяўся дзядзька Валодзя.

— Вы франтавік, як і мой дзядуля? З «кацюш» стралялі? Праўда? І Берлін штурмавалі?

— Так, брат, адгадаў,— усміхнуўся госць.— Артылерыстам быў. А да Берліна не дайшоў. Пад Варонежам параніла. А дзе твой дзядуля?

— У шпіталі. Яму кожны год трэба лячыцца.

— Знаёмая гісторыя. Ну дык бліжэй да справы.

З кішэні пінжака дзядзька Валодзя выцягнуў невялічкую кардонную каробачку, напакаваную ватай, і дастаў з яе...

— Што гэта?

Хлопчык разгубіўся і не ведаў, што сказаць.

— Ну... Курынае яйка.

— Зусім правільна! — узрадаваўся дзядзька Валодзя.

Ён асцярожна паклаў яйка на стол пасярод невялічкага кальца,

якое зрабіў з вяровачкі, што выцягнуў з кішэні. Потым устаў, адышоў ад стала да дзвярэй і прытуліў абедзве далоні да рота.

— Кр-ру, кр-ру! — пачуўся далёкі, нібы крык крумкача, гук.— Кр-ру, кр-ру, кр-ру!

Яйка само нібы зварухнулася на стале, падкацілася да вяровачкі.

— Такога дзіва ніколі не бачыў? — спытаўся дзядзька Валодзя.

— Не-а,— адказаў хлопчык.

— І не ведаеш, чаму яно круціцца?

Валодзя пакруціў галавой.

— Скора здагадаешся. А не здагадаешся — скажу... Ну, вось што, брат. Папугайчыкаў няма. Але, я мяркую,— гаварыў дзядзька Валодзя,— і без іх абыдземся. Сваіх цудаў вакол нас — поўным-поўна... Вось што. Я пакіну яйка са скрыначкай. Давай паставім ля батарэі. Табурэтка ёсць? Цудоўна! Праз паўгадзінкі паслухаеш. А гадзіны праз дзве-тры будзеш сведкам... Не будзем забягаць наперад. Тады мне пазвоніш. Дамовіліся? А пакуль — бывай!

Не прайшло і дваццаці хвілін, як Валодзя, прытуліўшы вуха да скрыначкі, пачуў выразнае:

— Тук-тук. Тук-тук-тук. Тук-тук.

— Жывое! — узрадаваўся хлопчык.— Куранятка!

А калі з дзірачкі ў шкарлупіне паказалася дзюбачка, Валодзя кінуўся да тэлефона, хуценька набраў нумар і на момант збянтэжыўся, пачуўшы надта ўжо далікатны жаночы голас:

— Я вас слухаю.

«І зноў тыя самыя баязліўцы,— падумалася хлопчыку.— Бедная Зіна. І як я да іх трапіў?»

— А папугаі ў вас... Я ведаю, ведаю! — неяк само сабою вырвалася ў Валодзі.— І ў дзвярах вочка! А дзверы зачыняюцца на тры замкі з ланцужком!

— Хто гэта? Хто гаворыць? Хто гэ...

Валодзя больш не слухаў. Ён зразумеў, што замест двойкі набраў тройку. І Валодзя нанава круціў дыск.

— Дзядзя Валодзя! Куранятка прадзяўблося! — крычаў хлопчык.— І я здагадаўся, чаму яйка пакацілася...

## АНАТОЛЬ ГРАЧАНІКАЎ

Анатоль Сямёнавіч Грачанікаў нарадзіўся 8 верасня 1938 г. у вёсцы Шарпілаўка Гомельскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння Гомельскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту (1960) працаваў інжынерам, быў на камсамольскай рабоце. У 1969 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў загадчыкам аддзела літаратуры газеты «Літаратура і мастацтва» (1969—1971), намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі (1971—1976). З 1976 г.— галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка», з 1978 г.— часопіса «Бярозка», з 1982 г.— часопіса «Маладосць».

Упершыню выступіў у друку ў 1957 г. Першы зборнік вершаў «Магістраль» выйшаў у 1964 г., потым з'яўляюцца кнігі паэзіі «Круглая плошча» (1971), «Грыбная пара» (1973), «Начная змена» (1975), «Дрэва на выспе» (1977), «Калі далёка ты...» (1979), «Палессе» (1983), «Верасень» (1984), «Я вас люблю...» (1986).

Для дзяцей А. Грачанікаў пачаў пісаць у канцы 60-х гг. Напачатку яго вершы

і казкі друкаваліся ў часопісах, а потым былі выдадзены асобнымі зборнікамі: «Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара» (1980), «Валерка і лятаючая талерка» (1983), «Жывая вада» (1985), «Зорны палёт» (1988).

У перакладзе А. Грачанікава выйшла кніга вершаў сучасных афганскіх паэтаў «Ватан — значыць Радзіма» (1987).

У 1974 г. за зборнік вершаў «Грыбная пара» А. Грычанікаву прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі.

У 1984 г. паэту прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы за кнігі вершаў «Палессе», «Валерка і лятаючая талерка» і «Казку пра Івана-ганчара і пачвару цара».

## КАЗКА ПРА ІВАНА-ГАНЧАРА І ПАЧВАРУ ЦАРА

Жыў-быў у нейкім царстве
цар —
Усемагутнейшы ўладар.
Цар як цар:
Адных любіў,
Тых, хто супраць быў,—
Забіў.

Ў гэтым царстве кожны пан
Па тры скуры драў з сялян.
Тлусцелі сытыя вяльможы,
Крычалі:
— Цар у нас харошы!
Хоць і навокал жабракоў
Было, як летам камароў.
Штогод касіў прыгонных мор,
Ды весяліўся царскі двор.

Музыкі гралі.
Танцавалі
Там і паненкі, і панкі.
І на ўвесь свет
Цара ўслаўлялі
Прыдворныя пісарчукі.

І кожны ў дрыжыках глядзеў
На церам, дзе сам цар сядзеў.
Але «наместнік бога» — цар
Нікому не паказваў твар.
Ніхто з вяльможнага двара
Не бачыў у жыцці цара.
Не знаді нават плеткары:
Ці малады ён,
Ці стары?

Хацеў пранырлівец аднойчы
Спазнаць:
Каму ж пяюць хвалу?
Дык ранкам на гандлёвай
плошчы
Знайшлі, нябогу, на калу.

Прыціхлі тлустыя вяльможы,
Шапталі:
— Цар у нас харошы!
Ніхто асмеліцца не мог
Убачыць:
Хто ж зямны іх бог?

На свеце, што ні гавары,
Старэюць нават і цары.
І вось, як цар пачаў старэць
І ўсё часцей прыгадваць смерць,
Рашыў займець ён свой партрэт,
Перш чым пакінуць гэты свет.
Каб на яго маліўся люд
У царстве вечна там і тут.

Усемагутны цар зароў:
— А ну, падаць мне мастакоў!
Пара нахлебнікам, пара
Намаляваць свайго цара!
І стражнікі цягнулі іх,
Каму урэзаўшы пад дых,
Каго агрэўшы бізуном.
Пад царскім стоячы акном,
Чакаў, гадаў прыдворны люд:
Які ім вынес цар прысуд?

Ды ад вышэйшага указу —
Намаляваць цара партрэт —
Яны ўсе пачалі адразу
Смялей глядзець на белы свет.

І кожны думаў:
«Мо мяне

Вялікі шанец не міне?
У царскай міласці і ласцы
Я буду жыць тады,
Бы ў казцы...»

І выбар ганаровы паў
На мастака, што маляваў
Вяльмож, іх жонак і сынкоў,
Паслоў заморскіх і купцоў.
Яшчэ — ён гэтым ганарыцца —
Намаляваў саму царыцу.

На люд зірнуў ён пераможна
І — юрк у церам асцярожна.
Нібы з вясновага загону
Чарвяк які, але шпарчэй
Падпоўз лісліва ён да трону,
Нат не ўзнімаючы вачэй.
А калі глянуў, то заенчыў:
— О, божа!
Хто ж цябе скалечыў?!

Была ў цара адна нага,
Нібы зламаная дуга.
І вока выперла на лоб...
Не цар, крый божа,
А цыклоп!

— Малюй! —
Сказаў пагрозна цар,
Усемагутнейшы ўладар.

— Я намалюю, намалюю,
Цара ад сораму ўратую.
Ці ж можа быць пачварай цар,
Нам богам дадзены ўладар?

Ці мала-доўга маляваў —
І вось партрэт цару падаў.

Быў на партрэце гэтым цар —
Ні даць ні ўзяць —
Намеснік бога.
І вочы, ажывіўшы твар,
Глядзелі ўзвышана і строга.
Яго кульгавая нага —
Не паламаная дуга,
А трону добрая падпорка.
Адразу бачна:
Калі дзе
Хто пад пяту ёй
Пападзе —
Таму навекі
Стане горка...

Ды цар пазелянеў ад злосці,
Аж затрашчалі ў целе косці:
— Ты не мастак!
Ты — хлус, лайдак!

Дык вось ты марыш пра якога
Усемагутнага цара!
Ну, што ж,
Ідзі служыць да бога!

І кат, пакліканы з двара,
Рукой нядрогкай —
Раз і два! —
І паляцела галава...

Пасля — у дрыжыках ад страху,
Больш не хаваючы тугі,
Папоўз да трона, як на плаху,
З прыдворных мастакоў — другі.

Прыкінуў ён і так і сяк,
Лічыўся ж неблагі мастак,
І ледзь не выкрыкнуў:
— Ура! —
Рашыўшы маляваць цара
Такім, як ёсць на самай справе:
Пачвару хіжага ў няславе.

Зрабіў адно суровым вока,
А сапсаванае бяльмом
Прыўзняў ён трошкі над ілбом,
Каб людзі бачылі здалёку,

Што цар і цешыць, і карае,
Што ласку ён і сілу мае.
А той, засохлаю нагою,
Нібыта косткаю якою,
Ён можа кожнага агрэць,
Ды так, што можна адубець...

Калі ж
Зірнуў цар на малюнак
Адным крывавым вокам коса,

Мастак адчуў, што паратунак
Яго чакае на нябёсах:
Ці ж можа быць пачварай цар
Усемагутнейшы ўладар?

Цар скалануўся ўвесь ад гневу,
Нібыта ў навальніцу дрэва.
Вяльможаў трэсла, як чарот...
Ад замка ў розныя канцы
З шырокіх крапасных варот
Ляцелі стражнікі-ганцы.

— Хто намалюе з вас цара? —
Амаль у кожнага пыталі.
І людзі ў жудасці маўчалі.
Ганцы далей,
Далей скакалі:
— Хто намалюе з вас цара?

— А што, мо паміраць пара
Яго вялікасці?
То трэба
Старога падсадзіць на неба,—
Сказаў хлапец,
Ганчар Іван.
— Чакайце,
Дамайструю збан,
Сваёй нявесце падару,
Тады вядзіце ўжо к цару.
Ганцы раней, вядома, хлопца
Цягнулі б сілай на вяроўцы,
Паддаўшы добрага ляшча.
Цяпер жа, нібы паніча,
Ды на каня — за рукі, ногі,
А ўсім астатнім —
Прэч з дарогі!

І быў прывезены Іван
У замак, як заморскі пан.
— Ты будзеш цар?
Здароў, здароў!
Ты, мабыць,
Як дзіцёнак роў.
Бач, твар распух.
Ці хворы мо?
Тады адвар травы дамо.
Пап'еш яго ты дзень ці два,
І прасвятлее галава.

Чаму нягеглы ты, худы?
І з вокам, бачу, нелады.
І нешта левая нага,
Нібы зламаная дуга.
Ты, кажуць,
Хочаш мець партрэт,
Які б уславіў на ўвесь свет
Цябе, цара-уладара.

Цар здрыгануўся, як гара,
І на Івана так зірнуў,
Нібы стралой яго праткнуў.

А што Іван?
Іван — не пан.
Да справы прыступіў Іван.
Цара круціў ён так і сяк,
Нібы ў сваёй ганчарні гляк.

— Дакруцішся! —
Аж буркнуў цар,
Усемагутнейшы ўладар.

«Калі ўжо ўзяўся, як тут быць,
Які з цябе партрэт зрабіць? —
Стаяў у одуме Іван:
Усё-ткі цар жа, а не збан...—

Што гэта?
На падлозе кроў.
Відаць, галовы мастакоў
Ляцелі тут, як качаны...
Ці ж вінаватыя яны?»

І думы хлопца залуналі,
Што з веку ў век
І з году ў год
Цары народ свой абіралі
І прыгняталі свой народ.

І цараванне,
Панаванне,
Твая вялікасць, дабрадзей,
Па сутнасці, ёсць паляванне,
Ёсць паляванне на людзей.

Ганчар так думаў,
Маляваў.
А сярод залы — чорным ліхам

Цар на адной назе стаяў,
І злосна соп, і цяжка дыхаў.

— Ну, вось і ўсё! —
Сказаў ганчар.—
Прымай, гатовы мой тавар.

Зірнуў цар скоса.
І ажыў.
Малюнак незвычайным быў.
Цар выглядаў на тым малюнку,
Як бог
Адменнага гатунку.

На кургане стаяў там цар,
Усемагутнейшы ўладар.
Прыжмурыўшы сляпое вока,
Ён з лука цэліўся высока
У неба, дзе жывая цэль:
Плыў урачыста журавель.

А той засохлаю нагою,
Што выпінался дугою,
Ён абапёрся на валун...

Быў грозны цар,
Нібы Пярун.
Не дзеля царскага вар'яцтва
Іван карціну маляваў.
Усёю сілаю мастацтва
Ганчар з пачварай ваяваў.

Аслупянеў і ўбачыў цар,
Што у мастацтве ца́р — ганчар.
У царстве побач два цары?!
— Памры! — усклікнуў цар.—
Памры!

І са сцяны свой лук схапіў.
Але Івана не забіў,
Сам пасінеў, замармытаў,
Упаў ад злосці
І сканаў.

Цары трухлеюць і царкі,
Ды ўсемагутна, несціхана
Легендамі цераз вякі
Сягае слава
Пра Івана

### ПЛАНЕТА ДЗЯЦЕЙ

Так на свеце ўжо вядзецца,
Што дзяцінства нам даецца,
У жыцці даецца раз.
Гэта самы светлы час.

Хай жа стане
Планета людзей
Цудоўнай планетай
Шчаслівых дзяцей!

Каб сабраць на свеце гора
Ды схаваць глыбока ў мора,
Вось бы весела было,
Шчасце ў кожны б дом
прыйшло!

Хай жа стане
Планета людзей
Цудоўнай планетай
Шчаслівых дзяцей!

Каб спыніць на свеце войны,
Стаў бы кожны дзень спакойны.
Гэта лепшая з надзей
І дарослых і дзяцей.

Хай жа стане
Планета людзей
Цудоўнай планетай
Шчаслівых дзяцей!

### ДРУЖБАКІ

Сябравалі
Змалку ўтрох:
Дзіма,
Яша
І Цімох.

Праўда
Ў прымаўцы гучыць:
Іх вадою
Не разліць!

Пройдзе лета.
Прыйдзе час —
Пойдуць дзеці
Ў першы клас.

Толькі
Як рашыць задачу?
Кожны хлопчык
Ледзь не плача.
Ходзяць
Чуткі ўжо наўкруг:
Там усе
Сядзяць па двух.

Калі сядуць
Дзіма, Яша —
Што Цімох
Пра гэта скажа?
Калі
Дзіма і Цімох —
Яша б сам
Сядзець не змог.

А з Цімохам
Сядзе Яша —
Дзіма
Што пра гэта
Скажа?

Словам,
Як ты ні круці,
Цяжка выхад
Ім знайсці.

Не сумуйце,
Дружбакі!
Верце,
Гэты час настане,

Калі першы клас
Такім,
Як вы самі,
Дружным стане!

### БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ

Беларускія
Краявіды...
Пераразвоны
Азёр і бароў.
Над палеткамі
Бульбы і жыта —
Песня
Велічных курганоў.

Гэта наша
Зямля дарагая,
Гэта нашы
Лугі і палі,
Над якімі
Спрадвеку лунае
Бусел —
Сімвал
Бяссмерця
Зямлі.

## ПАВЕЛ МІСЬКО

Павел Андрэевіч Міська нарадзіўся 14 сакавіка 1931 г. у вёсцы Знамя Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955) працаваў у раённым і рэспубліканскім друку (1955—1971), затым у часопісе «Полымя» (1971—1972) і выдавецтве «Мастацкая літаратура» (1972—1980).

Першае апавяданне П. Місько апублікаваў у 1958 г. У 1967 г. выйшаў з друку яго зборнік апавяданняў «Калодзеж», затым — кнігі апавяданняў і аповесцей «Калянае лісце» (1974), «Між мінулым і будучым» (1986). Пяру пісьменніка належаць зборнікі гумарыстычных апавяданняў «Дзівак-чалавек» (1972), «Чэрці ў коміне» (1978), «Вясельны марафон» (1984). Ён з'яўляецца аўтарам раманаў «Мора Герадота» (1976), «Градабой» (1980). П. Місько вядомы і як аўтар кніг нарысаў «Гаспадыні свайго лёсу» (1968), «Дрэва жыцця» (1973), а таксама аднаактовых п'ес «Канфлікт мясцовага значэння» і «Ліха крадзецца ціха».

У творчым багажы пісьменніка нямала твораў для юнага чытача. Ён напісаў дакументальную аповесць «Падарожжа ў калгас» (1970), гумарыстычную «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, а часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972), фантастычную «Грот афаліны» (1985). Аповесці, апавяданні, казкі склалі кнігі «Зямля ў нас такая» (1971), «Прыгоды Бульбобаў» (1977), «Эрпіды на планеце Зямля» (1987).

## ПРЫГОДЫ БУЛЬБОБАЎ

*(Урывак)*

### БЫЛІ СЛЯПЫЯ, СТАЛІ ВІДУШЧЫЯ

А я ўжо думаў, што нічога на свеце лепшага і не трэба...

Праўда, спачатку нават не думаў. Проста адчуваў, як мне добранька, калі спіш каля чагосьці цёплага, мяккага, варухлівага, вялікага. І пахучага. Я гэты родны пах не пераблытаю ні з якім іншым. Бо ёсць яшчэ каля мяне нешта варухлівае, але не такое вялікае. Яно і пахне крыху не так. І не пасмокчаш яго. Праўда, я спрабаваў пасмактаць — за вуха ці за хвосцік, але смаку ніякага. Так — забаўка. А вось калі патыцкаешся мордачкай у тое вялікае і цёплае, зловіш такую сусолачку...

Ой, не магу!.. Цмокнеш раз, другі, і ў рот табе пальецца такое салодкае, смачнае, духмянае. Толькі каўтай, не марудзь. І каўтаеш, пырхаеш, аж захлёбваешся, і чуеш, як у тваім жывоціку цяплее, а па ўсім целе перакочваецца прыемная млявасць, ахоплівае дрымота. Ах, якая дабрыня!

А сёння толькі прачнуўся, пазяхнуў, як штосьці балюча рэзнула ў правае вока. Я перапужаўся і зноў заплюшчыў яго. От жа дзіва, га? Што гэта магло б такое быць? Што са мною сёння здарылася? Зноў паціху расплюшчваю вока — і зноў заплюшчваю ад страху. Ай-яй-яй! Так светла-светла наўкол, здаецца, нават у табе самім усё свеціцца. А сярод светлага ёсць яшчэ больш светлае — кружок. На яго ажно глянуць балюча, хіба як прыплюшчыш павекі, зробіш вузенькую шчылінку.

— Ну, што ты мне міргаеш адным вокам? Добрай раніцы, сынок!

Тое цёплае і вялікае, з-за каго я спалохана паглядваў на светлы кружок, узнялося нада мною. Не ўсё: адна толькі вялікая галава з вялікімі вушамі і вялікімі добрымі вачыма.

— Што, кажу, падміргваеш мне? Давай умывацца. Але спачатку пацягніся добра, каб усе жылкі затрашчалі, фіззарадачку зрабі.

Калі я пацягнуўся як след, галава схілілася нада мною, лізнула мне нос і губы, правае і левае вока, за вушамі, зноў вочы — правае і левае.

— От та-ак... От та-а-ак... Каб добра вочкі глядзелі,— вурчала галава.

Я ўжо бачыў на абодва вокі, у вачах больш не рэзала, як спачатку.

— Хто ты? — прапішчаў я.

— Твая мама.

— Ма-а-а-ама-а...— Мне зрабілася лёгка і радасна. Дык вось яно хто — тое вялікае, цёплае, добрае! І смачнае, пахучае! Гэта проста мая мама. Мама, мама!

— А хто я?

— Мой сынок, сабачаня. Ну, а ты чаго не прачынаешся? — мама лізнула і тое цёплае, што ляжала справа ад мяне каля мамінага жывата. Такое, як і я, па росту і масці такое — шэранькае.— Уставай! Брацік твой зусім-зусім прачнуўся, у яго ўжо вочкі глядзяць. А ты... Эх ты, лежабок...

Мама вурчала і ўмывала яго языком. Усяго — ад носа да хвосціка. Брацік мой салодка мружыў вочы, крахтаў ад задавальнення. Але чаму мама яго ўсяго мые, а мяне толькі палізала ў пыску, у вочкі, за вушкамі? Што я — горшы за брата? Калі ён мне брат, то хто я яму? Таксама брат.

Два браты, абодва роўныя, і мама нас павінна любіць аднолькава.

Я не паспеў добра пакрыўдзіцца, як мама зноў пачала лізаць мяне, умываць і спінку, і жывоцік, і пад лапкамі.

— Ух-ха-ха! Ой, ха-ха-ха! — Ад казытання мяне разбірае смех — не вытрываць проста. А язык у мамы мокры, шурпаты, але і далікатны.

Мама сказала, што цвёрдае і халоднае, крыху цемнаватае вакол нас — дошкі будкі. А светлы, яркі-яркі кружок на адной сценцы — лаз. Ну, выхад, значыць. Мама паабяцала, што з гэтага дня будзе многа-многа нам расказваць.

Добра ў нашай будцы каля мамы. Утульна, мякка, цёпла. І светла! Як добра, калі светла, а не цёмна. Бачыш, куды ступаць, і не стукаешся носам.

А што там, за гэтым светлым-светлым кружком, за дзвярыма?

Мама пакарміла нас, брацік зноў соладка захроп, паклаўшы на мяне тоўстую мордачку. Бач ты яго, прывычку ўзяў — наверх узбірацца. Не паддамся!

Я вылузаўся з-пад яго і ўбачыў, што мама шмыгнула ў лаз і знікла з вачэй.

Куды яна пайшла? Яна думала, што я сплю і можна ісці.

Але ж я не сплю!

Брат спіць, а я не сплю.

Што там, за гэтым светлым-светлым кружком, за дзвярыма? Адкуль столькі ўсякіх гукаў далятае. Я нібы не чуў іх да сённяшняга дня. Нібы з'явіліся ў мяне не толькі вочы, але і вушы.

Што там?

## ХТО КАГО ВЫБРАЎ

Пакуль я так думаў і прыкідваў — што там, за светлым кружком, у будцы пацямнела. Я ўзрадаваўся: мама вяртаецца! Ажно не. Дзірку-выхад амаль закрылі дзве галавы. На маміну не падобныя. Мордачкі ў іх пляскатыя, ружаватыя, не такія, як у мамы і брацiка. Але ёсць на мордачках і насы, і раты, і вочы, і вушы. Вочы добрыя, як у мамы. А ўсё астатняе — проста смех: насы тырчаць кругленькія,

вушы таксама паўкруглыя, прасвечваюць ружовым і тапырацца ў бакі. Раты маленькія. Абедзве галавы вельмі падобныя адна на адну, мабыць, гэта браты, як і мы.

— Ой, Толя... Яны ўжо глядзяць! — сказала левая галава.

— Гэты, што глядзіць,— мой! — сказала правая галава, якую назвалі Толем.

— А тоўсценькі — мой! — сказала левая галава.

Толя прасунуў у будку ружовую лапу і пагладзіў мяне па галаве. Прыемна, нібы мама палізала. І не страшна!

— Булька... Булька...— гаварыў Толя і гладзіў, а ў мяне ад асалоды ажно вочы заплюшчваліся.

Булька мяне зваць! А я і не ведаў!

— А мой — Боб! Бобка, хадзі сюды! — у будку прасунулася другая ружовая лапа з пальцамі і схапіла майго брата за каршэнь. Боб падрыгаў лапамі і знік у лазе.

— Няхай бы спаў! Ты чалавек ці хто? — накрычаў на яго Толя. Але і сам раптам схапіў мяне за загрывак, і я задрыгаў лапамі ў паветры. «Мама!» — хацелася закрычаць мне ад страху, але я толькі віскнуў.

І ніколечкі нам не балела. Гэтыя чалавекі не ведаюць, што так мама нас карае. У нас яшчэ і вочы не глядзелі, а Боб ужо лез да мяне сварыцца за сусолку. Яму здалося, што малако ў маёй смачнейшае, чым у яго. Ён адбіраў, а я не даваў. Тады мама страсянула Боба за каршэнь і паклала на сваё месца. Дала пысаю кухталя і мне — каб не сварыліся больш.

І я гэта добра помню!

Чалавекі пасадзілі нас сабе на калені і гладзілі, гладзілі...

«Булька, Булька...» — лашчыў мяне Толя. Ён вёў рукою ад носа па лбе, па карку, па спінцы. Нават мой хвосцік памераў — хаваецца ў кулачку. І так мне прыемна было і зусім-зусім не страшна. Добра, што я выбраў сабе Толю! Ну, няхай не я, а ён мяне выбраў, дык што? Якая розніца? Мы адзін аднаго выбралі.

— Коля, а ў твайго Боба кончык хвосціка белы! — сказаў мой Толя.

— Ой, праўда! — Коля з радасці падняў Боба за пярэднія лапы, паглядзеў яму на жывот, бо хвосцік Боба быў там. Боб падціснуў яго ад страху.— Дык ты белахвосцік?! От, добра, цяпер мы вас не пераблытаем.

А Боб вісеў так, вісеў і ад страху пусціў маленькі фантанчык. Коля айкнуў і адхінуўся ад яго, пачаў атрэпвацца.

Добра, што ў Боба знайшлася такая прыкмета. Але ж вельмі мала таго белага — мо з кіпцік даўжынёю.

Так і сядзелі каля будкі Толя і Коля і ўсё гладзілі нас. Боб супакоіўся, пазяхнуў і заснуў у Колі на руках. Мне таксама соладка драмалася, але я стараўся глядзець. Хоць адным вокам. Параўноўваў Толю і Колю. З твару яны кропачка ў кропачку падобныя, аднолькава адзетыя.

— Я пад майку свайго...— сказаў Коля, адцягнуў нешта на жываце, як шкурку, і паклаў у схованку Боба.

Хацеў і Толя са мною такое зрабіць, але пачаў раптам гаварыць «ха-ха-ха!» і паказваць на Колеў жывот. Майка ў тым месцы, дзе ляжаў Боб, зрабілася мокрай-мокрай.

«Як мы іх будзем пазнаваць, хто чый? — думаў я.— Няма ў іх хвастоў, няма белага кончыка на хвасце».

Стамілася маё правае вока глядзець — столькі святла на двары! Я заплюшчыў правае і расплюшчыў левае. Які вялікі двор! Гэта ж колькі на ім можна паставіць такіх будак, як наша? Мо больш, чым белых валаскоў на хвасце ў Боба. А каля нас узвышалася і цягнулася сцяна такой высокай і вялікай будкі-дома, што не хапала вачэй, каб усё агледзець за раз. У сцяне былі і дзверы, толькі не круглыя, як у нашай будцы, і яны зачыняліся закрываткаю. Мабыць, у такіх будках-дамах жывуць чалавекі. І толькі я так падумаў, як закрыватка прыадчынілася і адтуль выскачыла наша мама, смачна аблізнулася.

— Пальма бяжыць! Кладзі назад! — спужаўся Коля.

Нас хуценька паклалі ў будку. Але чаго было баяцца? Наша мама добрая, яна не кусаецца, вунь — ветліва махае хвастом.

Сабакі, значыць, могуць хадзіць у чалавечы дом. А чаму не хочуць лезці да нас у будку Толя і Коля? Змясціліся б, толькі трэба ім крыху скруціцца. Хай бы і яны пажылі з намі!

— Толя! Коля! Ідзіце есці! — пачуўся недзе на двары чалавечы голас.— Мыйце рукі — і есці!

— Тата заве! — усхапіўся Коля. Любіў, мабыць, паесці, як і Боб.

А што такое тата? Ці хто такі? Тое самае, што і мама, ці не? Я стаў пярэднімі лапамі на Боба і выглянуў з будкі. Тата Колі і Толі быў каля дзвярэй у дом. Гэта таксама чалавек, толькі куды большы і здаравейшы за Толю і Колю. Значыць, Толя і Коля яшчэ не сапраўдныя чалавекі, а дзеці. І такое дзіва! Толя і Коля ішлі да таты на задніх лапах, і тата стаяў на задніх лапах. Пярэднія целяпаліся так сабе, яны, відаць, і называліся рукі. Але нашто іх было мыць? На руках жа не ходзяць. І нашто ім яны, калі вісяць без карысці? Хаця я ўжо ведаю нашто. Імі можна браць за каршэнь лепш, чым зубамі. Можна імі і па галоўцы гладзіць.

І яшчэ я прыгледзеў: на кожнай руцэ ў іх многа пальцаў, і ўсе — доўгія.

### МАМІНА МАМА

Мама і тата Натальку з сабою на Чорнае мора не ўзялі. Паехалі адны загараць на непрыгожым шэрым пляжы, купацца ў нясмачнай, салёнай і горкай вадзе. А Натальку завезлі ў вёску да мамінай мамы — бабы, значыць.

Паплакала Наталька, развітваючыся з мамаю і татам.

— Ды не плач ты, яны скоранька і прыедуць,— сказала баба.— Хадзем лепш я табе жывую загадку пакажу: тоўсценькі коцік ушчаміўся ў плоцік.

Знайшлі тую загадку. Пляцёнкаю ўскарабкаўся на плот гарбузнік. Вісяць на ім вялізны гарбуз і маленькі гарбузік.

Хутка Наталька забыла, што ў яе недзе ёсць мама і тата. Толькі раз успомніла, забедавала:

— Бабуля! Авой, авой... Мама і тата будуць салёныя?

— Паглядзім,— усміхнулася баба.— Прыедуць — лізнеш. А зараз сама знайдзі такую загадку: за сонцам ганяецца, а з месца не сыдзе.

Знайшла загадку Наталька толькі з бабінаю дапамогаю.

— Дык вось жа яна — сланечнік. Бачыш, куды ён глядзіць? У бок вуліцы, на сонца. А вечарам будзе за хлеў глядзець, на захад.

Праверыла вечарам Наталька — праўда. Ну і дзіва ж!

Месяц праляцеў вельмі хутка. У Натальні было столькі спраў, што кожны вечар з ног валілася. Не хапала сілы самой памыць ногі. І баба ёй памагала. Паіла цёплым малаком і несла на ложак. А пакуль несла, Наталька засынала ў бабы на руках.

Прыехалі мама і тата з мора забіраць Натальку ў горад. Глядзіць яна, а мама і не чорная, хоць у Чорным моры купалася: светла-карычневая. А вось тата і праўда чорны. Як цалаваліся, Наталька лізнула аднаго і другога. Не салёныя!

Развіталася Наталька з бабаю і расплакалася. Але ехаць у горад трэба: у мамы і таты канчаўся водпуск. Усю дарогу ў горад і шмат дзён у горадзе Наталька ўсё расказвала пра вёску, пра бабу і дзеда, пра тое, як раскрывалі яны розныя таямніцы, сакрэты, адгадвалі загадкі. Расказвала і новыя казкі. Вось і сёння праслухала па тэлевізары калыханку, а сон недзе заблудзіўся, не хоча прыходзіць.

— Мама, адгадай, дзе цукеркі растуць? — папыталася Наталька з таямніча-загадкавым выглядам.

— Ну дзе... Мо на фабрыцы?

— А от і не ведаеш, а от і не ведаеш! На калгасным полі! Мы з бабаю хадзілі палоць буракі. А яны цукровыя, салодкія, я лізала. З буракоў робяць цукар, а з цукру — цукеркі.

— Праўда што — дзіва,— згаджаецца мама.

— Тата, а зараз ты адгадай сакрэт,— паклікала Наталька і тату.

— Загадвай.

— Яблыні, вішні, грушы цвітуць, потым з кветак робяцца плады. Так?

— Ну, так,— згаджаецца тата.

— Бульба таксама цвіце, расце кусцікамі і цвіце. Думаеш, бульбінкі з кветак робяцца?

— Ну, мабыць жа, так,— знарок паціскае тата плячыма.

— Ой, тата! Бульба такая хітранькая! Кветкі зверху, а бульбінкі ў зямлю хаваюцца. От як!

— А вось булкі і хлеб у магазіне растуць,— усур'ёз кажа мама. Наталька аж заходзіцца ад смеху.

— Не ашукаеш, не ашукаеш! Я табе загадку бабіну загадаю: хто пад сябе ўсё горне, але аддае людзям? Ага, не ведаеш! Камбайн, вось хто!.. Я на ім каталася, як дзеду абед насілі. Камбайн пад сябе каласкі гроб, гроб, гроб... А з каласкоў зярняткі вымалочваліся. З зярнятак робяць муку, з мукі цеста, з цеста булкі і хлеб. Вось як! Мы з бабаю пра гэта казку прыдумалі.

— Якая ты ў нас малайчына! — пагладзіла мама Натальку па галаве.— На другое лета паедзеш да бабы?

— Паеду!

— І мы з табою паедзем. Нам сумна было без цябе.

Нарэшце Наталька ўкладваецца. А сну ўсё няма. Уздыхае гучна:

— Ох, што там цяпер баба робіць?..

Яшчэ паляжала трохі.

— Мама, а кароўка заснула ўжо?

— Заснула, заснула. Спі і ты.

— Я вам заўтра казку раскажу, як малако робіцца,— абяцае Наталька, і вочы яе заплюшчваюцца.

На гэты раз неўгамонніца засынае.

## МІКОЛА ЧАРНЯЎСКІ

Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Чарняўскі нарадзіўся 16 студзеня 1943 г. у вёсцы Буда-Люшаўская Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1966 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, вучобу ў якім (на вячэрнім аддзяленні) сумяшчаў з працай на Беларускім радыё. З 1966 г. працуе ў часопісе «Бярозка».

Друкавацца М. Чарняўскі пачаў у 1958 г. Піша пераважна для дзяцей, якім адрасаваны кнігі яго паэзіі «Дзе лета канчаецца» (1963), «Апошні бой» (1967), «Сонца ў хованкі гуляе» (1970), «Кліча горн» (1974), «Адрас наш — дзіцячы сад» (1975), «Парад» (1976), «Залатая ніва» (1977), «Дзе пяцёркі прадаюцца?» (1978), «Я збіраюся на БАМ» (1979), «Хто сябруе з добрым днём?» (1981), «Звініць званок» (1982), «Зоркі-зорачкі» (1984). М. Чарняўскі — аўтар кнігі дакументальных паэм для юнага чытача «Навечна з сонцам» (1987).

Пяру М. Чарняўскага належаць зборнік вершаў для дарослага чытача «Чалавечнасць» (1971), зборнікі сатыры і гумару «Казёл-моднік» (1978), «І не косяць, і не жнуць...» (1981), «Камар на матацыкле» (1985).

### МАЙ

Не пазнаць зусім
Вясковых вуліц,
Не пазнаць праспектаў
гарадоў —
Свой убор святочны апранулі,
Май вітаюць
Крыламі сцягоў.

А ў гаях, садах
Ад песень звонкіх,
Зведаўшы цяплынь дажджоў
густых,
Пругкія зялёныя далонькі
Працягнулі сонейку
Лісты.

Зноў павеяў
Цёплы майскі вецер,
Гладзіць грыўкі
Маладой травы.
Піянерскіх гальштукаў —
Прыгледзься! —
Ярка ззяе колер агнявы.

Свята —
І ў прыродзе, і ў народзе,
Радасць —
Рэхам коціцца ў прасцяг:
Па-над намі,
Бы зара на ўсходзе,
Палымнее
Перамогі сцяг.

Ён лунае
Зорна, прамяніста

Над жыццём,
Над весняй сінявой...
Дзякуй, сцяг,
За мірнае дзяцінства!
Дзякуй, май,
За ясны позірк твой!

## ЗОРАЧКА-ПЯЦЁРАЧКА

Песні любім горача,
Шмат чытаем кніг.
Наша ў класе зорачка —
Лепшая з усіх.

Праца шчыра спорыцца.
Зоркі зіхацяць.
Нас пяцёра ў зорачцы,
Вучымся — на пяць.

Весела нам, хораша
Жыць сям'ёй адной,
Наша ў класе зорачка —
Не разліць вадой!

Нашай дружнай зорачкай
Ганарыцца клас:
Зорачкай-пяцёрачкай
Называюць нас.

## ЗЯЗЮЛЬКА

— Зязюлька, зязюлька,
Дзе сёння была?
Ці многа, прызнайся,
Гадкоў раздала?

— Я ў пушчу лятала,
У сад за раку,
Каго б ні сустрэла,
Вітала: ку-ку!

Сустрэўся мне ў пушчы
Вясёлы атрад
Дзяцей гаманлівых,
Дзяцей-акцябрат.

Іх слухала песні
І ў шатах густых
Гадоў адлічыла ім —
Хопіць на ўсіх!

А ў садзе хлапчук мяне
Быццам чакаў:
Як сонечны зайчык,
Між дрэў ён скакаў.

Убачыць стараўся
Мяне на суку:
«Зязюлька, зязюлька,
Скажы мне: ку-ку!»

Я дзесяць гадкоў
Накувала яму.
Чаму гэтак скупа,
Так мала чаму?

Бо знаю Алеся,
Бо чула яго:
Лічыць да дзесятка
Умее ўсяго.

Няхай падрасце —
Зноў у сад прылячу,
І сотню,
І болей
Гадоў адлічу!

## ЛУГАВАЯ КАЗКА

Пытаўся званочак:
— Скажы мне, вятрыска,
Чаму ты няўседа такі?
Лятаеш высока і нізка —
Ля хмар і над поймай ракі...
— У хованкі я не гуляю
Ні ў небе, ні тут, на зямлі:
Я цёмныя хмаркі ганяю,
Каб дожджыкі ўсюды лілі...

Пытаўся званочак:
— Скажы мне, вятрыска,
Чаму ты свавольнік такі?
Лятаеш далёка і блізка,
Дзе кружыш,
А дзе — напрасткі...

— У хованкі я не гуляю.
Хоць лётаю шмат — не зважай:
Я нівы наўсцяж аглядаю,
Турбуюся: як ураджай?
На лузе, дзе травы па пояс,
З пракосаў збіраю расу,
Чмяліную песню з сабою
Ад краскі да краскі нясу...

— Чаму ты, каго ні спытаеш,
Здаешся загадкаю ўсім?
То цёплы,
То золкі бываеш,
То моцны,
То слабы зусім?

— Такі ўжо характар мой,
квеце,
Лятун я,
Шчырун,
Жартаўнік.
А што адбылося б на свеце,
Каб раптам я некуды знік?..

Пытаўся званочак:
— На гэты лужочак
Чаму заглядаеш часцей?
Ці сонца тут больш,
Ці прывабней куточак,
Ці травы і кветкі гусцей?

— Сюды я часцей заглядаю,
Бо шчырага сябра займеў.
Я тут, па-над лугам, лятаю,
Каб ты не тужыў,
А — звінеў!

## КЛЯТВА МАРАТА КАЗЕЯ

Як напаў на нас вораг знянацку —
Ад крыві пабарвеў далягляд.
За Радзіму, за маці, за бацьку
Мужна помсціць пакляўся Марат.

«Я адпомшчу!» — пачулі бярозкі.
«Я адпомшчу!» — пачулі бары.
І панеслі ад вёскі да вёскі
Гэту клятву Марата сябры.

Ды бяда ўсё ж сустрэла Марата —
У засаду патрапіў Марат.
Адбіваўся хлапчына заўзята,
Ды раптоўна заціх аўтамат.

Сонца промень крывавай палоскай
У вачах мільгануў, пацямнеў...
Затуліць не паспелі бярозкі,
Родны бор засланіць не паспеў.

Абступілі чужынцы Марата —
Да сваіх не прабіцца ўжо, не!
Хоць патронаў няма, ёсць граната:
— Падыходзьце, бярыце мяне!

І узняўся, на карнікаў рушыў,
Гневам помсты — граната ў руках!..
Не, ён клятвы сваёй не парушыў —
І застаўся жывым у вяках!

## ДАНУТА БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава нарадзілася 1 студзеня 1938 г. у вёсцы Біскупцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1962 г. скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута і настаўнічае ў Гродне.

Друкавацца Д. Бічэль-Загнетава пачала ў 1958 г. Выйшлі паэтычныя зборнікі «Дзявочае сэрца» (1961), «Нёман ідзе» (1964), «Запалянкі» (1967), «Доля» (1972), «Ты — гэта ты» (1976), «Браткі» (1979), «Дзе ходзяць басанож» (1983), «Загасцінец» (1985), «Даўняе сонца» (1987).

Д. Бічэль-Загнетава шмат піша і для дзяцей. Маленькаму чытачу адрасаваны яе зборнікі вершаў «Перапёлка» (1968), «Грыб-парасон» (1969), «Дзічка» (1971), «Рыжая палянка» (1971), «Дагані на кані» (1973), «Лузанцы» (1982), «Габрынька і Габрусь» (1985).

У 1984 г. за кнігу вершаў «Дзе ходзяць басанож» Д. Бічэль-Загнетавай прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы.

### НАША РАДЗІМА

Перад вачыма
наша Радзіма:
росаў бязмежжа
і Белавежа.
Зубрык махнаты
ходзіць ля хаты.

Заблуквае ў сны
конь вараны.
Нёман адбіўся
ў матулі ў вачах.
Тут я нарадзіўся
і выйшаў на шлях.

### СОНЦА, ВЕЦЕР І СВІЦЯЗЬ

У тоні Свіцязі вецер
закінуў блакітны венцер.
Хваля грукоча ў дно —
За Нёманам чутно.

Жоўтае Свіцязі донца,
шаўковыя берагі.
Возера Свіцязь і сонца —
цёплыя два кругі.

### НЁМАН

Здаецца здалёк нерухомай
нястрымная плынь ракі.
Ды гэта ж імклівы Нёман!
Бяжым да яго напрасткі.

Разліўся Нёман шырока,
плыве — неабдымны, даўгі.
Хлопчыкам і сарокам
не трэба Нёман другі.

Штурмуюць ягоныя хвалі,
стрымліваюць разгон.
Ды хто тут плыўцоў пахваліць,
як не магутны ён!

### УНУЧАК ЛЁНІК

Бабулю шкадаваў
унучак Лёнік:
— Стамілася?
Ідзі прысядзь на ўслонік.
Я вымыю гаршчок і апалонік.
А добра, каб у нас

быў дужы слонік!
Скруціў бы ў кола хобат,
нібы вобад,—
ты абаперлася б на дужы хобат.
У магазін хутчэй
схадзіў бы слонік —
прынёс бы ў хобаце
смятаны слоік.
— Памыты ўжо
гаршчок і апалонік!
Схадзі ты ў магазін,
унучак Лёнік!

### СТРАКАЗА І ЖАБКА

На купіне квакала жабка:
— Нарадзіцца б мне лепей
стракозкай —
стракатала б высока над лозкай!
Хай тады паганялася б Гапка!
У стракозкі слёзы-дажджынкі:
— У зялёнай вадзе азярца
добра плаваць, даваць нырца
і хавацца ад Гапкі-дзяўчынкі.

## АВЯР'ЯН ДЗЕРУЖЫНСКІ

Авяр'ян Сафонавіч Дзеружынскі нарадзіўся 10 чэрвеня 1919 г. у вёсцы Хляўно Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску (1937—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў карэспандэнтам і супрацоўнікам газет у Краснаярскім краі, Калінінскай вобласці, Маскве. У 1945 г. вярнуўся ў Мінск, працаваў загадчыкам аддзела рабочай моладзі газеты «Чырвоная змена» (1945—1949). З 1949 г.— рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР, з 1972 г. працуе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а з 1981 г.— у выдавецтве «Юнацтва».

Свой першы верш А. Дзеружынскі апублікаваў у 1942 г. у раённай газеце «Дело Октября» Калінінскай вобласці. У 1959 г. выйшаў першы зборнік вершаў «Песні маладосці», праз два гады — «Калінавы цвет». Многія вершы паэта пакладзены на музыку («Песня аб міры», «Песня аб Мінску», «Мінскі вальс», «Мяцеліца», «Беларусь» і інш.).

Значнае месца ў паэзіі А. Дзеружынскага займаюць творы для дзяцей. Ён з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў «Цуды ёсць на свеце» (1960), «Дзе жыве зіма» (1962), «Карагод» (1963), «Ляцелі дзве птушкі» (1964), «Яе завуць Каця» (1965), «Кую-кую ножку» (1967), «Смешкі і пацешкі» (1968), «Добры ветрык» (1969), «Чабарок» (1970), «Ластаўка» (1971), «Бегунок» (1972), «Каласок» (1975), «Конікі-будаўнікі» (1977), «Цягнік-працаўнік» (1978), «Вяселікі» (1979), «Добрае сэрца» (1980), «Касмічны агарод» (1981), «Той, хто працуе...» (1984), «Працалюбы» (1987).

### ВАСІЛЁК

Стаіць,
Выглядаючы з жыта,
Як зорачка-знічка
Здалёк,
Што ўпала
Іскрынкай
З блакіту,
Палеткаў краса —
Васілёк.

Калі расцвітае
Цуд гэты,
На полі
Яшчэ гарачэй,
Буяе,
Квітнеецца лета
І фарбы прыроды —
Ярчэй.

Стаіць,
Паглядае з пагорка,
Як зорка
Аднекуль здалёк,
Часцінка
Любімай старонкі,
Часцінка зямлі —
Васілёк.

## ХЛЕБНАЯ СКАРЫНКА

Пахне
Хлебная скарынка
Цёплым ветрыкам,
Хваінкай,
Летнім дождЖыкам
Грыбным,
Лугам,
Полем аржаным,
І асенняй пазалотай,
Ды натхнёнаю
Работай.

## КОЦІКІ

На вярбіне коцікі —
Жоўценькія роцікі,
Лапачкі пуховыя,
Спіначкі шаўковыя.

Зябнуць раннем коцікі,
Аж дрыжаць варкоцікі.
— Коцікі, коцікі,
Абувайце боцікі.

Коцікі ўсміхаюцца
І не абуваюцца,
Днём вясеннім коцікам
Цёпла і без боцікаў.

Коцікі, коцікі —
Жоўценькія роцікі,
Лапачкі пуховыя,
Спіначкі шаўковыя.

## ПРАЛЕСКА

Прыгрэла сонейка
На ўзлеску,
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць
І слухае пралеска,
Як ціха
Дыхае зямля.

## ЖУРАВІНКА

Журавінка-ягадзінка,
Вузенькі лісточак,
У маленькай
журавінкі —
Кветка, як званочак.

Ружавее журавінка,
Сонцам налiваецца,
Чырванее,
Палымнее,
Соку набіраецца.

Вельмі любіць
Журавель
Ягадкі-кіслінкі.
Ну, а мы з табой
Кісель
Зварым з журавінкі.

## БРУСНІЦА

Ну і ягада-
хітрыца:
Долу
Туліцца
Брусніца,
Каб ніхто
Пазнаць не мог,
Дзе брусніца,
А дзе мох.

## ДОБРАЕ СЭРЦА

Падзьмуў
Моцны вецер
Над рэчкай —
З берага
Ўпала гняздзечка
Ад плыні глыбокае
Блізка.
Няшчасце вялікае
Ў пліскі —
Загінуць
Яе дзіцяняткі —
Маленькія плісяняткі.
Па беразе крочыў
Хлапчынка.
Пачуў ён
Той самай хвілінкай,
Калі захацеў
Парыбачыць,
Што хтосьці
Ціліўкае-плача.
Тады аглянуўся
І ўбачыў — бяда,
Трох птушанятак
Затопіць вада,
Ляжалі яны
І не зналі,
Што поблізу
Плешчуцца хвалі,
А побач гняздо —
Іх калыска...

Тут лётала
Бедная пліска.
Да дзетак наблізіцца,
Сядзе,
Самота
Ў птушыным паглядзе,
У вочках
Такая трывога.

«Тут трэба
Мая дапамога»,—
Падумаў хлапчук
І ў момант які
Прыладзіў гняздо
На грудку, ля ракі,
Затым
У птушыную хатку
Прынёс
Трох малых
птушанятак.
І пліска.
Заўважыла гэта.
Яна прыляцела
Да дзетак.

Хлапчук
Рыбку вудзіў
І клаў у вядзерца.
Ён меў
Вельмі добрае
Сэрца.

## ВЕРАСЕНЬ

Чарадзейны
Верасень
Заквітнеўся
Верасам.

Голле
Дуба-волата
Ён прыбраў
У золата.

На рабінках
Быццам кралі.
Гэта —
Ягады-каралі.

А кляновае
Адзенне —
Фарбаў
Рознае адценне.

Як у хустачках
Дзяўчынкі,
Чырванеюць
Дзве асінкі.

Чарадзейны
Верасень
Расквітнеўся
Верасам.

## ІВАН СЯРКОЎ

Іван Кірэевіч Сяркоў нарадзіўся 4 студзеня 1929 г. у вёсцы Пакалюбічы Гомельскага раёна Гомельскай вобласці. У час службы ў Савецкай Арміі скончыў артылерыйскае вучылішча (1952). Пасля дэмабілізацыі (1955) працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк». У 1960 г. перайшоў на Гомельскую студыю тэлебачання, спачатку старшым рэдактарам, а з 1961 г.— галоўным рэдактарам. У 1962 г. скончыў завочна факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З'яўляецца сакратаром Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР (з 1977 г.).

Першыя гумарыстычныя апавяданні і фельетоны з'явіліся ў друку ў 1965 г. У дзіцячай літаратуры дэбютаваў аповесцю «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968), якая была адзначана другой прэміяй на рэспубліканскім конкурсе. У 1970 г. напісаў працяг гэтай аповесці — «Мы — хлопцы жывучыя», за якую атрымаў першую прэмію Усесаюзнага конкурсу на лепшы твор для дзяцей і юнацтва.

### МЫ З САНЬКАМ У ТЫЛЕ ВОРАГА

*(Урыўкі)*

#### МЫ ПРЫГЛЯДАЕМСЯ, ШТО ДА ЧАГО

Першыя дні, пасля таго як немцы занялі нашы Падлюбічы, на ўсходзе за лесам яшчэ грымела. І мы з Санькам не трацілі надзеі, што не сёння-заўтра нашы вернуцца. А калі над вёскай паказаўся савецкі «ястрабок», нам і зусім стала зразумела — хутка немцы пабягуць. І раптам немаведама адкуль ударылі зеніткі, заваклі неба чорныя хмары дыму. «Ястрабок» узвіўся ўгору, развярнуўся і знік за хмарай. Паступова сціхла і за лесам.

Схлынулі з вёскі немцы. Яны рушылі далей на ўсход. Паехаў і наш дудар са сваім лупатым курашчупам. Бабуля ім і шчаслівай дарогі пажадала:

— Едзьце, каб вас калёсы пераехалі...

Мы з Санькам сядзім на прызбе і трымаем нараду. Калі вернуцца нашы — невядома: можа праз тыдзень, а можа і праз месяц. Мы апынуліся ў тыле ворага. Што нам рабіць — ісці адразу ў тыя партызаны ці крыху пачакаць, пакуль і другія пойдуць?

— Давай прыгледзімся, што да чаго, можа вінтоўку знойдзем ці наган,— прапанаваў Санька.— А потым і пакажам ім, дзе ракі зімуюць.

Адчапіўшыся так-сяк ад Глыжкі, мы выскачылі на вуліцу і пабеглі да школы. Бяжым і змены прыкмячаем. А змен цікавых вельмі багата. Каля сельмага ўпаў снарад і выкапаў яму, як у Скока на агародзе. Другім снарадам ссекла самую высокую тапалю каля школы. Буслінае гняздо раскідана па дарозе, і сам бусел ляжыць нежывы ў пыле.

— Хто бусла пакрыўдзіць — таму не бачыць шчасця,— успомніў Санька. Я таксама веру гэтаму. Але што зараз зробіць свайму забойцу мёртвая, акрываўленая птушка?

Шмат год прылятаў бусел вясной з далёкага поўдня на школьныя таполі, прыносіў на сваіх крылах цяпло і радасць нам, дзецям. Бусел прыляцеў — неўзабаве канікулы. Шмат год ён выводзіў са сваёй

бусліхай буслянят. Яны выраслалі на нашых вачах, вучыліся лятаць. Мы сачылі, як яны, падужэўшы, узнімаліся высока-высока, пад самае неба, і кружылі над вёскай, расправіўшы шырокія лёгкія крылы.

Аднойчы бусел прыляцеў з лугу, трымаючы ў сваёй чырвонай дзюбе нейкую вяроўку. Седзячы ў гняздзе, незнарок упусціў яе.

Гэта была не вяроўка, а гадзюка. Мёртвая гадзюка. За гэта мы любілі бусла.

І вось ён ляжыць сам у дарожным пыле, нежывы, акрываўлены. Больш не ўзнімецца пад воблакі, не зробіць развітальнага круга перад вылетам у вырай. Яго забілі немцы.

Мы пахавалі бусла недалёка ад дарогі, замест помніка паклалі на яго магілу вялікі камень.

Думаючы пра буслінаю долю, мы падышлі да сельмага. Дзверы расчынены насцеж, у вокнах ніводнай шыбы.

Ткнулі туды насы і ўбачылі Міцьку Малаха. Ён кідаў цэглу на пустыя бутэлькі, якія ляжалі ў куце.

— Мангол, што ты робіш?

— Б'ю бутэлькі,— адгукнуўся Міцька, і вочы яго схаваліся ў хітрыя шчылінкі.

— А навошта?

— Каб немцам не дасталіся.

Мы з Санькам хмыкнулі:

— Патрэбны яны немцам...

— Яшчэ як патрэбны! — упэўнена адказаў Міцька, выбіраючы больш важкую цагліну каля разбуранай печы.— Яны бензіну ў іх паналіваюць, а потым у нашы танкі будуць кідаць.

А і сапраўды ж! Як жа пра гэта мы забыліся? Яшчэ калі толькі пачалася вайна, мы самі збіралі бутэлькі з-пад сітра, з-пад газы, з-пад піва,— якія траляліся,— і здавалі іх на прыёмны пункт. Гаварылі, што гэтыя бутэлькі патрэбны Чырвонай Арміі. Кожная бутэлька — спалены фашысцкі танк. А тут гэтых бутэлек цэлы воз. Добра, што немцы іх не бачылі, а то заграбасталі б.

І мы пачалі дапамагаць Міцьку. Каб было цікавей, выстраілі посуд радамі, быццам гэта фашысты, і цаглінай:

— Агонь!

Утрох мы хутка расправіліся з бутэлькамі і пайшлі далей. Глядзім — праўлення калгаса няма, адно пажарышча. Цагляная грубка разбурана, навокал валяюцца розныя абгарэлыя паперы: ведамасці, квітанцыі, працоўныя кніжкі калгаснікаў.

Міцька знайшоў абгарэлую пішучую машынку. Мы выцягнулі яе на траву, пакруцілі, павярцелі — не працуе. Ну, куды яе? Грымнулі каменем раз-другі, раструшчылі, растаўклі, каб не дасталася ворагу.

Воддаль ад пажарышча валялася жалезная скрыня, цяжкая-цяжкая, з месца не скранеш. У такіх скрынях хаваюць грошы. Але ніякіх грошай у ёй няма, скрыня паламаная, дзверы, як сказаў Міцька, з мясам выдраны.

— Гэта Няўмыка,— паведаміў ён, пастукаўшы босай нагой па жалезу.

— Няўмыка ў турме,— не паверыў Санька.— Можа, хто іншы.

— Быў! — сказаў Міцька і цыркнуў слінай скрозь рэдкія зубы. Цыркаць слінай Міцька мастак. Ні ў каго з нас так не выходзіць, як у яго.

Да вайны Кузьма Няўмыка ў калгасе не працаваў, рэдка жыў дома. Ён гаварыў, што з яго спецыяльнасцю толькі ў горадзе і быць. Што ў яго за спецыяльнасць, у вёсцы ведалі старыя і малыя. Ён краў у паяздах чамаданы, выразаў на базары кішэні, лазіў па кватэрах. Гэта я сам часта чуў ад дарослых.

Іншы раз Кузьма з'яўляўся ў вёсцы з перавязанай галавой, з сіняком пад вокам, а то і зусім родзічы прывозілі ледзь жывога. Тады па вуліцы хадзілі чуткі, што Няўмыка дзесьці не на таго нарваўся. Але праходзіў тыдзень-другі, і ён, адляжаўшыся, зноў знікаў.

Бывала і так, што Кузьма вяртаўся з горада ў новых хромавых ботах, дарагім касцюме, з поўнай кішэняй грошай. Тады з яго хаты, якая стаіць якраз супраць новай школы, з раніцы да ночы чуліся п'яныя песні, шум і гвалт. Гэта Няўмыка біў сваю Усцінню — худую, заўсёды перапалоханую жанчыну. Вочы ў яе вялікія і круглыя, нібы пятакі, таму ўсе і завуць Няўмычыху Савой.

Ёсць у Няўмыкі хлопец Коля. Ён пайшоў у школу на год раней нас з Санькам, але мы дагналі яго ў другім класе. Колю нават пасадзілі разам са мной. На першым жа ўроку Няўмыканёнак украў у мяне каляровыя алоўкі, і на перапынку мы пабіліся. Пасля гэтага настаўніца нас рассадзіла.

Коля — хлопец здаровы, як і яго бацька, і такі ж руды, і такі ж злодзей. Толькі ён не ходзіць у горад, а крадзе ў вёсцы. Бывала зойдзе ў сельмаг з доўгім дротам, на канцы якога вострая дзюбка. Толькі прадавец адвернецца, ён дзёўб — і булка або коржык у руках. Лаві яго потым, даганяй.

Летам, калі людзі ў полі, разведае Няўмыканёнак, у каго хата без нагляду, выставіць шыбу, палазіць у печы па гаршках, павыцягвае з баршчу мяса, паздымае з гладышоў вяршкі, а грошы блізка — і грошы забярэ. Яго лавілі, надзіралі вушы, білі лазой і крапівой, вадзілі да бацькі, калі той быў дома. Але нічога не дапамагала. Які дуб, такі клін, які бацька, такі сын.

Перад самай вайной Няўмыка абакраў сельмаг, і яго, мабыць, у пяты раз пасадзілі ў турму.

— А пазаўчора ён цэлы воз дабра з горада прывалок,— расказваў Міцька.— Шафы, люстры, адзенне абярэмкамі насілі.

Тут мы вырашылі, што Няўмыка — гад, што такіх трэба душыць, і пайшлі глядзець, што робіцца ў новай школе.

Па дарозе мы крыху пастаялі каля хаты-чытальні, на якой ужо вісеў партрэт Гітлера. Пад партрэтам надпіс: «Гітлер — вызваліцель». Але мы і без надпісу здагадаліся, хто гэта такі,— не раз да прыходу немцаў бачылі малюнкі ў газетах. І тут тая ж касая пасачка валасоў над ілбом, тыя ж вусікі, тыя ж калючыя злосныя вочы. Побач з партрэтам загад на нямецкай і рускай мовах: хто будзе хаваць камісараў і яўрэяў — таму расстрэл.

Я ўспомніў, як немцы зламалі Міронаву яблыню, як ішлі па ага-

родах танкі, як лавілі Пёкліну свінню, успомніў нашага дудара з курашчупам, таго немца, што кідаўся да маці з нажом, і сказаў:

— Добры вызваліцель.

— Гад ён,— падтрымаў мяне Міцька і прапанаваў: — Давай мы яму вочы выдзерам цвіком.

Міцька дастаў з кішэні гарэлы цвік, залез на прызбу, каб можна было дастаць Гітлера. Але ў гэты момант з былога сельсавета выйшлі два немцы, і мы пусціліся наўцёкі. Вочы ў Гітлера засталіся цэлыя.

У чарапічным даху школы, якраз у тым месцы, дзе мы сядзелі з Санькам, калі лазілі глядзець на Стараселле, вялізная дзірка. Голыя рэбры кроквы абгрызлі асколкі. Адна кроквіна звісае над сцяной, калышацца ад ветру і рыпіць.

Раптам расчыніліся школьныя дзверы, і адтуль высунуўся руды, успацелы твар Няўмыкі. Рэдкія, чырвоныя валасы прыліплі да мокрага лба. Ён цягне кніжную шафу. Шафа не пралазіць у праём, і Няўмыка натужна сапе, крэкча, лаецца на свайго Няўмыканёнка, які без толку блытаецца ў яго пад нагамі.

— А ну, патрымайце дзверы! — закрычаў ён са злосцю на нас.

Ніхто не паварушыўся з месца, а Міцька, дык той нават агрызнуўся:

— Няма дурных!

Няўмыка толькі коса зірнуў і вывалак шафу на ганак без нашай дапамогі. Тут ён узваліў яе на плечы і пацягнуў у свой двор. Коля пакрочыў следам. Калі ён праходзіў міма нас, Санька злаўчыўся і ўбрыкнуў яго босай нагой. Я не вельмі гучна, каб не пачуў сам Няўмыка, сказаў Колю, што ён рудая сучка, а Міцька паказаў кулак.

— А яны б'юцца і дражняцца,— паскардзіўся ён бацьку, а потым, адбегшы на бяспечную адлегласць, запусціў у нас цаглінай. Нам з Міцькам нічога, а Саньку цагліна трэснула па назе. Цяпер Санька не даруе гэтага праклятаму Рудзьку да магілы.

У школе ўсё было перавернута дагары нагамі. Новыя парты, за якімі нам не давялося пасядзець і аднаго ўрока, выкінуты з класаў у калідор. Частку іх ужо хтосьці пасек, паламаў. У класы немцы, як і ў нашу хату, нацягалі саломы. Усюды валяюцца пустыя пачкі ад нямецкіх цыгарэт, шматкі газет, бляшанкі з-пад кансерваў — розныя патрэбныя нам рэчы.

Я ўзяў сабе два цыгарэтныя пачкі з прыгожымі малюнкамі, Санька знайшоў яшчэ зусім новае лязо ад брытвы, а Міцьку пашанцавала больш за ўсіх. Ён выкапаў у саломе бляшанку з-пад гуталіну. Бляшанка была незвычайная. Збоку яе прымацавана бліскучая круцёлка. Павернеш круцёлку, і вечка адчыняецца само. Міцька сказаў, што ў гэтую бляшанку ён будзе што-небудзь класці і насіць у кішэні. Мы вельмі зайздросцілі яму і шкадавалі, што немцы забылі толькі адну такую добрую рэч.

У бібліятэцы на падлозе валяюцца кніжкі. Многія з іх падраныя, запэцканыя бруднымі ботамі. Апрача немцаў тут пахадзіў і Няўмыка. Гэта ён іх павыкідаў з шафаў. Паглядзела б на ўсё гэта наша Антаніна Аляксандраўна, якая нярэдка сварылася на нас толькі за тое, што крыху замусоліш старонку пальцам!

У Санькі аж вочы заблішчалі ад сквапнасці.

— Давай дамоў занясём,— прапанаваў ён.

Ды не так проста занесці. Кніжак навалена пад самыя падаконнікі. Мы выбіраем, на наш погляд, толькі самыя цікавыя: пра пагранічніка Карацупу, пра Гарыбальдзі — італьянскага змагара за свабоду, пра конніка без галавы, пра дзеда Талаша, пра Цімура і яго каманду, пра Хаджу Насрэдзіна.

Амаль да вечара мы носім кніжкі дахаты, дзесятай дарогай аббягаючы немцаў.

Я нанасіў кніжак поўную дзежку, якая цяпер усё роўна будзе пуставаць, бо агуркі і капусту вытапталі біцюгі. У Санькі на гарышчы атрымаўся цэлы штабель. Міцька напакаваў дзве скрынкі з-пад яблык. Мы не ўкралі кніжкі. Прыйдуць нашы — аддадзім у школу. А пакуль што, калі будзе час, пачытаем.

## САНЬКА АБЯЗЗБРОЙВАЕ ВОРАГА

Ляціць над лугам на павуцінні бабіна лета. Адцвітаюць у траве апошнія краскі. Сонца прыпякае, як у жніўні.

А Санька нічога гэтага не хоча заўважыць, усю дарогу ён праклінае сваю збродлівую казу.

Пад самай вёскай на балоце, у густых зарасніках лазы, мы наткнуліся на незнаёмага чалавека. Ён выйшаў нам насустрач з-за куста так нечакана, што ўцякаць ужо было позна. Першае, што нам кінулася ў вочы, гэта перавязаная акрываўленай анучай рука. Разглядзелі больш уважліва — юнак гадоў васемнаццаці, абарваны, стомлены, мурзаты і худы.

— Вы з гэтага сяла? — спытаў ён.

— З гэтага,— насцярожана адказаў Санька.

— Немцы ёсць?

Мы з Санькам пераглянуліся: чаму гэта ён пра немцаў пытае? Хто ж ён такі?

— Не ведаем. Мы кароў у Плёсах пасвім,— растлумачыў я незнаёмцу.

— А хлеба ў вас не знойдзецца?

Хлопец акінуў нас галоднымі вачыма і, відаць, зразумеўшы, што пытанне гэта лішняе, уздыхнуў і сеў на купіну.

Крыху асвоіўшыся, мы асмялелі, і Санька спытаў:

— А ты хто такі?

— А ніхто,— адказаў хлопец.— Прынясіце лепш хлеба. І паглядзіце, ці ёсць немцы ў вёсцы.

— Ты, можа, партызан? — пытаецца Санька.

— Можа,— паціснуў плячыма хлопец і загадаў: — Ану, хутчэй!

— А нас возьмеш з сабой? — таргуецца мой сябар.

Хлопец крытычна агледзеў нас з галавы да ног і адрэзаў:

— Без зброі не бяром.— А потым пужнуў: — Ну?!

Мы пусціліся з усіх ног выконваць яго даручэнне. Нарэшце такі мы сустрэлі сапраўднага партызана! Цяпер трэба не ўпусціць моманта і прасіцца ў атрад, трэба штосьці такое зрабіць, каб паказаць,

што мы баявыя, геройскія хлопцы. Тады нас прымуць без размоў, не паглядзяць, што няма і па трынаццаць.

Немцаў у вёсцы амаль у кожным двары. Толькі нашу хату абмінулі. Затое ў Санькавай размясціўся афіцэр. Цётку Марфешку выгналі ў сенцы, але ў сенцах па начах холадна, і яна спіць у суседзяў.

Мы аббеглі ўсе вуліцы, ткнулі насы ва ўсе двары, у завулкі. Санька налічыў дзесяць грузавікоў, а я дванаццаць і дзве легкавыя машыны. Санька збегаў і да палявой кухні, дзе салдаты атрымлівалі абед. Праўда, тут яго заўважыў повар і адразу ж запрог — прымусіў цягаць з калодзежа ваду. Хлопцу гэта не спадабалася. Ён прывалок два вядры і, як толькі немец адвярнуўся, даў драла.

Дамоў ён прыйшоў апоўдні. Каза спакойна стаяла ў хлеўчыку і ела траву. У сенцах нікога не было. Затое, калі Санька сунуў нос у пярэднюю хату, адкуль рыкнула:

— Цурык!

Відаць, гэты афіцэр — важная птушка, калі пад вокнамі ў двары ўвесь час таўчэцца вартавы, а ў пярэднюю хату не толькі што Саньку і яго маці нельга заходзіць, самі немцы заходзяць баязліва.

Што робіцца за зачыненымі дзвярыма, не можа бачыць ніхто. Ніхто, апрача Санькі. Дашчаная перагародка калісьці была аблеплена каляровымі паперкамі і старымі газетамі. Аднак клей, звараны з мукі, вельмі спадабаўся мышам. Цяпер сцяна абшарпаная не горш за Санькавы штаны.

У адной з дошак, якраз супраць печы, быў калісьці невялікі смаляны сучок. Санька неяк раней прабіў у сучку дзірку, накрышыў у яе серкі з запалак, заткнуў зверху цвіком і агрэў як мае быць абухом. Хацеў, каб пеканула. А яно не пеканула. Сучок разам з цвіком выскачыў у пярэднюю хату, і атрымалася добрая, гладкая, круглая адтуліна. Праз яе відаць усё на свеце.

Спачатку за перагародкай нічога цікавага не было. Здаравенны афіцэр з шырокай чырвонай патыліцай, якая складваецца над каўняром гармонікам, разглядае карту. Другі сухі, як кіёк, перавязаны рэменем, стаіць побач і робіць выгляд, што яго карта таксама цікавіць. Спачатку яны мірна паміж сабой гергеталі, затым таўсташыяму штосьці не спадабалася, і ён закрычаў, пырскаючы слінай. Чым далей, тым больш яго разбірала. Нарэшце ён грымнуў па стале кулаком, і сухі немец выскачыў за дзверы чырвоны, быццам печаны рак.

«Ух і злосны ж»,— падумаў Санька. У яго ўжо здранцвелі ногі і самлела спіна. Сядзець, сагнуўшыся ў крук, вельмі нязручна.

Па падлозе прагрукаталі салдацкія боты, гэта немец панёс белы эмаліраваны тазік і ручнік. Начальнік, зняўшы з сябе мундзір, таксама пайшоў на двор — будзе мыцца.

На стале побач з тоўстай скуранай сумкай паблісквае чорнай халоднай сталлю пісталет. У Санькі ёкнула сэрца. Вось яна, зброя.

— Узяць, узяць, узяць,— застукала кроў у вісках.

— А калі зловяць? — на нейкі момант завагаўся Санька. Але без зброі і ў партызаны не бяруць.

Гэта адбылося на працягу адной хвіліны. Санька хуценька выскачыў з-за мяшка з просам, на пальцах падбег да дзвярэй і ўзяўся за

ручку. З-за коміна саскочыў кот, якога маці прынесла замест павешанага радыстам Паўлем. Саскочыў, быццам кованы конь. Санька аж уздрыгнуў.

Ніхто ніколі не чуў, каб дзверы ў гэтай хаце рыпелі. А тут, калі трэба прашмыгнуць ціха, яны рыпнулі старымі, нямазанымі варотамі. Аж у грудзях пахаладзела.

Тры хуткія крокі, і пісталет у руках. Куды яго? З пісталетам на вачах у немцаў не выскачыш. Ён адцягнуў кішэню так, што штаны трэба трымаць рукамі. Загнаным зверам Санька аглянуўся на дзверы, на вокны. У двары маячаць каска і штык. Акно на вуліцу прыадчынена. За вокнамі дашчаны плот, яблыня і густы высокі бульбоўнік.

— Шух-х! — зашамацеў бульбоўнік, і пісталет знік пад пажаўцелым ужо лісцем.

Санька глянуў на дзверы.

— Шух-х! — паляцела наўздагон за пісталетам і палявая афіцэрская сумка.

У сенцах Санька схаваўся за ступу і прыціх. Сэрца калоціцца, нібы злоўлены верабей. Нават у пот кінула. Нават дыхаць перастаў. А немец фыркае на двары маржом.

«Чыстаплюй!» — са злосцю падумаў Санька.

Глянцавыя, хромавыя боты прагрукаталі за два крокі ад Санькі. Таўсташыі фашыст, асвяжыўшыся, быў у добрым настроі. Ён на хаду выціраў свае гладкія ружовыя шчокі і напяваў вясёлую песеньку.

Як толькі ляпнулі дзверы, Санька выскачыў з-за ступы, але на парозе сутыкнуўся з салдатам і выбіў у яго з рук эмаліраваны тазік. Немец вылаяўся і паддаў нашаму камандзіру кованым ботам. Той куляй зляцеў з ганка і расцягнуўся пад самымі нагамі вартавога, які заржаў так, быццам яго казыталі пад пахамі. У сваю чаргу ён даў Саньку дабаўкі і закрычаў услед:

— Русь, русь!

У нашым двары Санька ніяк не мог аддыхацца.

— Пойдзем, калі добра сцямнее,— сказаў ён мне.— Трэба забраць пісталет і сумку.

Зразумела, што ні мой сябар, ні я нікому і не заікнуліся пра тое, хто нас чакае ў лазе на балоце і куды мы збіраемся. У такіх выпадках лепш трымаць язык за зубамі.

## МЫ — ХЛОПЦЫ ЖЫВУЧЫЯ

*(Урывак)*

### «У ЛУКОМОРЬЯ ДУБ ЗЕЛЕНЫЙ...»

Школа. Добры дзень, школа! Даўно ўжо мы не сядзелі ў класах, не бегалі на перапынках па гулкіх калідорах, даўно гэтыя сцены і старыя таполі на двары не чулі вясёлага званка. Як пайшлі мы ў маі сорак першага года на канікулы, дык не тры месяцы цягнуліся яны, а тры гады.

У школе спалі чужыя салдаты, нават стаялі нямецкія коні, а потым ляжалі ў класах гурбы снегу і гуляў па калідорах вецер.

А сёння раніцай у старой нашай школе, дзе калісьці была валасць, зноў зазвінеў званок.

Пакуль што толькі ў старой. На цагляную, што збудавалі перад самай вайной, у сельсавета не хапае, як кажа дзядзька Скок, дзевяць грывень да рубля. Там па-ранейшаму пуста. Пад сценамі парос чартапалох, вечарам пад самымі кроквамі лятаюць кажаны, ды хлапчукі, гуляючы ў жмуркі, рэжуць на бітым шкле ногі.

Пакуль што сяк-так, на жывую нітку адрамантавалі толькі валасць, і сёння мы зноў селі за парты. Праўда, гэта толькі так гаворыцца, што парты, а на самай справе гэта даўжэзныя ў адну дошку сталы. За такую «парту» лезе восем чалавек, а, калі добра паціснуцца, то і дзесяць. Дошкі не вельмі чыста пагабляваны, і Санька паспеў ужо загнаць у палец стрэмку.

Але нам сядзець не цесна. Першакласнікаў дык тых сабралася цёмная сіла, усе разам за тры гады сышліся, а ў нас багата хлопцаў не прыйшло. Толькі з нашых з Санькам сяброў двух няма. Міцька-Мангол на могілках. Яго немцы застрэлілі. А Пецька Чыжык памагае матцы карміць сям'ю. Сёння, ідучы ў школу, мы сустрэлі яго на вуліцы. Пецька ехаў вярхом на Буянчыку, з шыкам трымаючы ў зубах цыгарку.

— Дык ты не пойдзеш? — кіўнуў Санька галавой у бок школы.

— Не,— уздыхнуў Чыжык.— Не пайду. Трэба ж каму-небудзь і коней пасвіць, не ўсім вучонымі быць.

Ад сонца, ад начных вогнішчаў на лузе, ад дажджоў і сіверу твар у Чыжыка пачарнеў, пагрубеў — з выгляду не скажаш, што гэтаму хлопцу чатырнаццаць. Мужык — і годзе. Толькі дробненькі. І голас у Пецькі сіплы, прастуджаны.

Мы прыбраліся ў школу, як хто мог. Санька ў новай кашулі з парашутнага палатна. Цётка Марфешка яе на пуд жыта выменяла. Смык у штанах з брызентавай салдацкай плашч-палаткі. Яны моршчацца гармонікам, і ніякай сілай іх не разраўняеш. Адцягне Пецька рукамі штаніну ўніз — роўна, толькі за другую возьмецца, а першая — пстрык! — і зноў гармонікам. Не штаніны, а спружыны.

Кніжак мы сабе з Санькам так і не купілі. А сшыткі ёсць: два куплёныя ды яшчэ самаробныя са шпалераў. Тоўстыя, як біблія. Старонка чыстая, старонка размаляваная блакітнымі кветкамі — пішы і любуйся.

Такую ж «біблію» я пашыў і Глыжку. Ён сёння таксама прыйшоў вучыцца. Падхапіўся з пеўнямі — баяўся праспаць, па добрай волі памыў шыю. Бабуля яму ў вушы заглянула, а потым абодвух і за парог правяла:

— Ну ідзіце, грамацеі... Ды не хадзіце там на галовах.

Санька крыху багацейшы за нас з Глыжкам. Добра ж яму, калі немцы, як стаяў у іх афіцэр, абляпілі іхнюю хату белай паперай. Начальству не падабаліся абшарпаныя сцены. А цяпер, перад школай, гэта Саньку як знаходка. Пакуль маці была ў полі, ён навёў

свой парадак у хаце — абадраў сцены, ні шматка не пакінуў. Было яму ад маці! Мы з хлопцамі нават на вуліцы чулі, як Марфешка крычала:

— Ах ты, лядашчэ! Ах ты, гайдамака!

Санька ўсё гэта мужна перажыў. Затое зараз і ў вус не дзьме: мае сшыткі і блакноцікі.

Так мы падрыхтаваліся да школы.

І вось адчыніліся ў класе дзверы, умомант сціх гоман і смех — на парозе стаіць наша Антаніна Аляксандраўна. За вайну яна быццам і не перамянілася, такая ж дробненькая і сухенькая, толькі сіняя сукенка, якую настаўніца апранала на святы, зусім выцвіла. Усё тыя ж бліскучыя шкельцы самі, без аглобелек, трымаюцца на носе. Цяпер мы ведаем, як яны называюцца — пенснэ. Настаўніца абвяла ўважлівым позіркам клас, і ў акулярах адлюстраваліся вокны, «парты», партрэт на сцяне і мы з Санькам на лаўцы.

— Добры дзень, дзеці!

Адказваючы на прывітанне, мы з Санькам усміхнуліся адзін аднаму вачамі. Дзеці. Сказала б ужо як-небудзь інакш. Вунь Сонька Зыкава ўжо сабе валасы накучаравіла. Праўда, не надта, але прыкметна. Напэўна, крадком ад маці круціла на гарачы цвік. А ў Пецькі Смыка пушок пад носам расце. Адтапырыўшы губу, Смык скубе яго двума пальцамі, быццам вусы падкручвае. Ён так нашчыпаў сабе пад носам, што там аж чырвона. Праўда,у нас з Санькам яшчэ вусоў няма, бо мы не сядзелі, як Смык, па два гады ў класе. Але і мы таксама хлопцы нішто сабе. Калі б не вайна, то былі б ужо не ў чацвёртым, а ў сёмым.

У першы дзень мы амаль не вучыліся, а так — гаварылі пра жыццё. Антаніна Аляксандраўна ўсё дзівілася, як мы выраслі, расказвала пра сваю эвакуацыю на Урал, а мы ёй пра немцаў, пра мадзьяраў і італьянцаў. Пра свае геройствы таксама. Аказваецца, не толькі мы з Санькам насалілі фашыстам — у кожнага з хлопцаў знайшлося што расказаць. Адзін італьянскага каня ў балота загнаў, другі — афіцэрскі бінокль з-за коміна быццам незнарок скінуў, каб той разбіўся, трэці на кухні ў суп пяску насыпаў. Во трашчала ў фашыстаў на зубах! Былі і больш сур'ёзныя справы: кралі гранаты, хавалі параненых. Як мы, напрыклад, з дзедам Міронам — камісара.

Успомнілі, як кніжкі са школьнай бібліятэкі цягалі па хатах, калі паліцай Няўмыка павывальваў іх на падлогу з шафаў. Думалася, што гэта толькі мы з Санькам такія смелыя, а іх хавалі і Коля Бурэц — Храбры Заяц, і той жа Смык. Смык нават пахваліўся, нібыта за тыя кніжкі немцы ганяліся за намі па ўсіх Падлюбічах і ўслед стралялі. Мы з Санькам аж раты разявілі ад здзіўлення: успаміналі-успаміналі, калі тое было, і не ўспомнілі. Самому мне за кніжкі болей давялося пава̀яваць з бабкай. Разы два хацела імі дровы падпальваць у печы, калі трэсак сухіх не было. А немцы іх і не бачылі.

Антаніна Аляксандраўна ўпэўнена, што мы героі. Толькі дзякуючы нам у школе зноў будзе бібліятэка.

Не, бібліятэкі не будзе. У хлопцаў пагарэлі хаты, а разам з імі кніжкі. У нас з Санькам хаты цэлыя, але нашымі кніжкамі ўсю вайну

харчаваліся мышы. Можа, там і ўцалела якія два-тры дзесяткі.

— Усё адно героі,— пахваліла нас настаўніца.

І вось ужо тыдзень, другі і трэці ідуць заняткі, вось ужо Антаніна Аляксандраўна нам расказвае пра Пушкіна. Не пра таго, вядома, што жыве ля Казадоя. Пра таго мы самі ведаем. Гэта Сцёпка Піліпчыкаў, высокі, худы, чорны і кучаравы. За гэта яго і завуць Пушкіным, хоць ён і не ўмее пісаць вершаў.

У лукоморья дуб зелёный;<br>
Златая цепь на дубе том,—

чытае настаўніца, а Саньку пад бок штурхае Пецька Смык і канькае цягучым, надакучлівым шэптам:

— Сань, а Сань... Дай трубачку. Навошта яна табе?

Справа ў тым, што ў Санькі ёсць медная бліскучая трубачка таўшчынёй з аловак. З аднаго боку яна запаяна наглуха, а з другога, там, дзе таўшчэй,— разьба. Гэту трубачку згубіў нейкі разява, а Санька знайшоў. Цяпер ён хоча дома адпілаваць у ёй канцы і зрабіць сабе такую ручку, каб пяро хавалася ўсярэдзіну.

...И днём и ночью кот ученый<br>
Всё ходит по цепи кругом...

А Пецька з Санькавай трубкі хоча зрабіць свісток. Гэтых свісткоў у яго цэлая процьма. Робіць іх ён з палосак бляхі, з пустых гільз, з гарошынай усярэдзіне і без гарошыны, а потым прадае хлапчукам з малодшых класаў за скібку хлеба, за кавалак каржа ці за пару вялікіх антонавак. Хлапчукі самі бегаюць галодныя, затое свішчуць у свісткі ўдосталь.

Идёт направо — песнь заводит,<br>
Налево — сказку говорит...

А яшчэ Смык навучыўся з пятакоў каваць пярсцёнкі. Так скуе і так вышаруе, што золата не дакажа. Гэтымі пярсцёнкамі ён надзяліў ужо ўсіх старэйшых дзяўчат і маладзіц з Хутара.

...Там чудеса: там леший бродит,<br>
Русалка на ветвях сидит...

Санька не ўстаяў. Аддаў Смыку трубачку за гатовую ручку. Праўда, ручка тая была не вельмі важнецкая, крыху ржавая і пагнутая, затое прыдача добрая: пяро «86» і «жабка». Мякка так піша і зусім не драпае.

...Там на неведомых дорожках<br>
Следы невиданных зверей...

А Смык не слухае. Ён не можа дачакацца перапынку, выцягнуў з кішэні ножык і пачаў пад партай калупаць Санькаву трубку. Робіць ён гэта ўмела. Вочы пільна і аддана глядзяць на настаўніцу. Здаецца, ён увесь там, каля таго дуба, дзе ходзіць кот вучоны. З выгляду ні за што не скажаш, што ў Смыкавай галаве свісткі. А ножык так

і пілуе там, пад сталом. Увесь стол ходзіць ходырам. Бутэлечка з-пад ёду, у якой Васька Мамуля трымае чарніла, ледзь не пляснулася на падлогу. Яе схапілі ўжо на ляту.

Толькі Антаніна Аляксандраўна апусціць акуляры ў кнігу, Смык зірне пад стол на сваю работу і сядзіць, як святы ўгоднік. Напэўна, медная трубка паддаецца добра, таму што выгляд у Пецькі задаволены.

Избушка там на курьих ножках
Стоит без окон, без...

Выбух грымнуў так нечакана, што ў настаўніцы выпала з рук чытанка і зляцелі з носа акуляры. Дзяўчаты піскнулі, а мы з Санькам падскочылі з месца і ледзь не павалілі парту. На гэты раз Мамуліна бутэлечка бразнулася на падлогу, чарніла расцяклося лужынай, апырскала сцены.

Пецька Смык белы, як нябожчык. Ад перапуду ён не можа сказаць слова, толькі трасе губой і вавакае:

— А-ва-ва-ва...

З-пад яго валіць шызы едкі дым, здаецца, што Пецька гарыць, а на падлозе рассыпаны свежыя сасновыя трэсачкі, што адляцелі ад стала. На трэсачкі з чырвоных Смыкавых рук капае кроў.

У школе ўзняўся перапалох. Загаманілі ў суседніх класах, загрукалі дзверы. Да нас ускочыў дырэктар. Ён не распытваў, што тут здарылася, а, убачыўшы Пецькавы рукі, схапіў яго за плячо і павалок за сабой.

Антаніне Аляксандраўне зрабілася дрэнна. Яе пад пахі павялі з класа дзяўчаты. Заняткаў у той дзень болей не было. Дзяўчаты доўга сядзелі перапалоханыя, а хлопцы, крыху апамятаўшыся, спляліся спрачацца, што гэта ўзарвалася: адны кажуць — спецыяльная міна, другія — запал.

Калі мы ішлі дахаты, па дарозе нас дагнаў Смык. Ён вяртаўся з медпункта і нёс перад сабой забінтаваныя рукі. Пецька яшчэ храбрыўся:

— На правай руцэ вельмі пальцы пабіла, але косці цэлыя. Нічога страшнага!

А яшчэ ён вельмі бедаваў, што свісток не выйшаў. Во быў бы свісток — цэлая дудка. Які-небудзь першакласнік тыдзень хлеб за яго насіў бы.

Але не бывае ліха без дабра. Цяпер мы будзем на ўроках пісаць, мучыцца, а Пецька панам сядзець. І да дошкі не выклічуць, і дома ўрокаў рабіць не будзе. Як ён ручку возьме?

Дома, не паспеў я пераступіць парог, мая бабка, ужо дачуўшыся ад Глыжкі пра выбух у школе, папрасіла мяне:

— Хоць ты ўжо не рабі свісткоў, нячысцік!

Мне аж крыўдна зрабілася:

— Што я — малы?

— Малы — не малы, а розуму хопіць. Усе вы адным мірам мазаны.

І зноў за сваё:

— Ой, хоць бы ўжо хутчэй сам прыйшоў.

Сам — гэта, канечне, бацька. Ад яго ўжо даўно нічога не чутно. Бабка баіцца, каб нам казённага пісьма не прынеслі.

Але напрадвесні нам прынеслі звычайнае пісьмо. Піша бацька, што цяпер ён у нейкай Усходняй Прусіі. Піша, што мужыкоў там няма, а ёсць толькі баўэры[1]. Хаты цагляныя, крытыя чарапіцай. Не хаты, а крэпасці. Пад кожнай умацаванне з кулямётам. Горад там ёсць Кенігсберг[2], ці па-нашаму — Каралеўская гара. Думалі, што не выкалупаць адтуль фашыстаў, так заселі. Многа там нашых палегла, але і яны не ўседзелі.

Пасля баёў бацька хадзіў па каралеўскіх палацах. І хоць усё разбурана, але, відаць, багата жылі, чэрці. Толькі ім мала было свайго — нашага захацелі.

Смыкавы раны загаіліся. Толькі адзін палец цяпер не гнецца. Захоча Пецька каму-небудзь пагразіць, сцісне кулак, а ўсе думаюць, што ён пальцам кудысьці паказвае.

## «НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕМ»

У 1946 г. на старонках газеты «Піянер Беларусі» быў апублікаваны зварот піянераў 37-й школы г. Мінска да ўсіх школьнікаў рэспублікі з прапановай прысылаць пісьмы-ўспаміны сведак і ўдзельнікаў падзей Вялікай Айчыннай вайны. Рэдакцыя газеты атрымала амаль 400 апавяданняў, частка якіх і ўвайшла ў зборнік «Ніколі не забудзем» (1948).

Кніга «Ніколі не забудзем», як сказаў Якуб Колас у прадмове да яе, гучыць грозным абвінаваўчым актам супроць фашызму і ўсіх сіл, што хочуць развязаць новую вайну.

### ПАД СМЕРЦЮ

Мы жылі ў вёсцы Усохі Бягомльскага раёна. Сям'я ў нас была невялікая — шэсць душ: бацька, маці, сёстры Жэня і Ліда, брат Віця і я.

Жылі мы ціха і спакойна, але немцы ўсё разбурылі. Адбылося гэта так.

У 1943 годзе немцы блакіравалі наш раён. Усе жыхары схаваліся ў балоце. Немцы на аўтамашыне прыехалі ў вёску Усохі, але там нікога не было. Яны злавілі адну жанчыну з другой вёскі, Руні, і паслалі яе сказаць, каб усе людзі выйшлі з балота і вярнуліся дадому да дзевяці гадзін вечара, а не то іх усіх паб'юць. Але людзі не паслухаліся немцаў і не пайшлі дадому з балота. Яны казалі:

— Калі пойдзем дадому, дык нас усіх пераб'юць.

А назаўтра людзі з вёскі Ганцавічы спужаліся і выйшлі з балота. Як толькі яны прыйшлі дадому, немцы загналі іх у кароўнік і запалілі яго. Каторыя ўцякалі, тых забівалі. Тады згарэла вельмі шмат людзей. Мы засталіся ў балоце.

Немцы, як толькі спалілі людзей, пайшлі ў балота шукаць астат-

---

[1] Баўэр *(ням.)* — селянін.

[2] Цяпер гэта савецкі горад Калінінград.

ніх. Вось немцы ціха падышлі да першых будак і пачалі страляць. Тут яны забілі Чабатар Палюту і яе чатырох дзяцей. Усе людзі кінуліся ўцякаць хто куды. І мы пабеглі. Немцы стралялі па нас, але не трапілі. Так мы дабеглі да рэчкі. Але рэчка ў тым месцы была шырокая і глыбокая, і пераправіцца цераз яе нельга было. Тады мы пабеглі каля берага, і тут немцы нас дагналі і пачалі страляць у нас з аўтамата. Маці і бацьку забілі, і дзве сястры забілі, а брата ранілі ў правае вока. Ён закрычаў і схапіўся рукою за вока. Скрозь пальцы цякла кроў. Я падбегла да яго і стала выціраць яму кроў хусткай. У гэты час падбег немец і выстраліў: брат упаў і тут жа памёр. А немец усё страляў і раніў мяне ў левае плячо, а другая куля трапіла ў правую руку, але касці не закранула. Трэцяя куля зачапіла спіну. Мне зрабілася горача, і я паваліласся, а немец пайшоў — ён думаў, што я мёртвая. Гэта было рана, гадзін у дзесяць.

Увесь дзень я праляжала разам са сваімі роднымі. А пад вечар адна цётка, Волька, з вёскі Смалярова, лёгка раненая, устала і ўбачыла мяне. Яна памагла мне падняцца, і мы пайшлі. У адным месцы мы перабраліся праз раку ўброд. На тым беразе мы сустрэлі дзеда Янулю, які завёў нас да сваёй сям'і. Яны мне давалі есці, але я нічога не ела чатыры дні, толькі піла ваду. Потым яйка з'ела. Тут мяне знайшла дачка майго дзядзькі Алісея Алай, Маруся.

Але доўга ляжаць не давялося. Немцы бамбілі, стралялі, і нам зноў прыйшлося ўцякаць у балота. Я зусім аслабела, і мяне панеслі. Зрабілі насілкі на палках, разаслалі посцілку і так неслі. Мяне неслі два мужчыны, дзядзька і Герасімовіч Іван, а дзве дзядзькавы дачкі, Маруся і Ніна, неслі сына настаўніка, Геню. З мяне цэлы дзень цякла кроў. Потым Маруся перавязала мне раны. А мае родныя ляжалі ў балоце.

Калі немцы выехалі з вёскі, людзі сталі выходзіць з балота. Дзядзька папрасіў людзей, яны выкапалі яму на востраве і пахавалі маіх родных. Я не магла хадзіць і не бачыла, як іх хавалі.

У маёй мамы былі дзве сястры, якія жылі ад нас за дзесяць кіламетраў. Яны пачулі, што нашых родных немцы забілі, што я засталася адна, і прыехалі да мяне. Адна з іх, цётка Прузына, узяла мяне да сябе. Доктара нідзе не было, і цётка лячыла мяне сваімі лякарствамі. Я хварэла доўга, але цётка мяне вылечыла, і я цяпер бадзёрая, вясёлая і валодаю абедзвюма рукамі.

Бягомльскі раён,
Мсціжскі сельсавет, в. Рэм[1].

*Таня Алай*
1933

**МУЖНАСЦЬ**

У пачатку вайны мы выехалі з Мінска і пасяліліся ў пасёлку Выжары Смілавіцкага сельсавета Рудзенскага раёна. Тут жылі многія партызанскія сем'і.

[1] У канцы кожнага расказа пададзена месца жыхарства яго аўтара на той час, калі стваралася гэтая кніжка, а таксама прозвішча і год нараджэння *(заўвага рэдакцыі)*.

У навакольных лясах дзейнічаў партызанскі атрад Зельнікава. Мая мама падтрымлівала з ім сувязь, атрымлівала лістоўкі, а я са сваімі сяброўкамі разносіла іх па вёсках.

Раз мы сабраліся каля лесу і пачалі гуляць «у партызаны». У час гульні прыбег хлопчык Віця і кажа мне:

— Поля, бяжы дадому. Паліцаі забралі тваю маму.

Я кінула гульню і пабегла ў пасёлак. Мамы дома не было. Бабулька Ганна, якая жыла ў адным доме з намі, сказала мне, што прыехалі паліцаі і забралі маці. А за што, яна і сама не ведае. Я ўся закалацілася ад такой навіны.

— Куды ж яе павезлі?

— Не ведаю,— адказала бабулька.— Яны нічога не гаварылі.

Майго бацьку немцы павесілі яшчэ ў 1941 годзе. Потым забралі старэйшую сястру Раю і звезлі немаведама куды. Цяпер схапілі і маму. Засталася я адна. Што мне рабіць? Я не вытрымала, села на лаву і горка заплакала.

Праз некалькі хвілін на вуліцы заскрыпеў снег. Я глянула ў акно. Да хаты пад'ехалі сані. На іх сядзела сем паліцаяў. Убачыўшы мяне, адзін з іх кіўнуў пальцам, каб я выйшла. Я апранулася і выйшла. Слёз маіх як і не было. Як мага спакайней спытала, што ім патрэбна ад мяне.

— Садзіся і паедзем,— загадаў старшы.

— А куды? — спытала я.

— Не твая справа, шчанё! — грозна крыкнуў старшы.— Куды павязём, туды і паедзеш.

Я села ў сані. Дзьмуў халодны вецер, але я не адчувала сцюжы. Я думала пра маму. У дарозе паліцаі распытвалі мяне пра партызан. Я адказвала так, як мяне вучыў камандзір атрада: «Не ведаю» або «У партызанах ніколі не была».

Мяне прывезлі ў Смілавічы і пасадзілі ў пакой, у якім сядзела мама. Я вельмі ўзрадавалася, што ўбачыла яе. З ёй мне было зусім не страшна.

Хутка сцямнела, і мы ляглі на нары. Але не спалася. Мама абняла мяне за шыю і доўга навучала, як я павінна трымацца і што гаварыць на допыце. «Адказвай на такія пытанні,— гаварыла яна,— на якія можна. Што ж датычыцца партызан, дык ты нічога не чула і не бачыла. Калі будуць біць, не плач і маўчы. Пакажы, што ты не з плаксівых». Я сказала, каб мама не турбавалася: я хоць і малая, але ведаю, што да чаго.

Назаўтра нас дапытвалі: спачатку маму, потым мяне. У мяне паліцаі дамагаліся даведацца, дзе партызаны, колькі іх, дзе змяшчаецца штаб, якое ўзбраенне і інш. Я адказвала адно і тое ж:

— Не ведаю. У партызанах ніколі не была.

— Маніш! — закрычаў начальнік паліцыі і ўдарыў мяне бізуном. Я сціснула зубы і маўчала. Мая цярплівасць узлавала яго.

— Якая матка, такое і дзіцятка,— прасіпеў ён і загадаў вывесці мяне з пакоя.

Потым нас адправілі ў Рудзенск. Начальнік паліцыі злосна сказаў:

— Там з вамі разбяруцца па-другому.

У Рудзенску нас пасадзілі ў цесную і брудную камеру. Увечары нам прынеслі якойсьці мёрзлай бульбы. Мы крыху з'елі і ляглі на падлозе, але спаць не давялося. У камеры было холадна, з-пад падлогі дзьмула, чародамі бегалі пацукі.

— Адсюль нам, дачушка, наўрад ці ўдасца выбрацца,— сказала мама і цяжка ўздыхнула.— Але што б нас ні чакала, мы павінны трымацца да канца. Хай каты ведаюць, што нас лягчэй зламаць, чым сагнуць.

Раніцай нас паклікалі на допыт. Зноў пасыпаліся адны і тыя ж пытанні. Я гаварыла тое самае, што і ў першы раз. На допыце прысутнічаў паліцэйскі Сазонаў, які ведаў нас да вайны. Калі мы вярнуліся ў камеру, мама прагаварыла:

— Наш рускі чалавек, а дапамагае немцам. Якая ганьба! Як агідна на яго глядзець. Цяпер нам не мінуць шыбеніцы, абавязкова выдасць нас.

Надзеі на вызваленне не было. Мы сталі чакаць свайго канца. Мама часта паўтарала: «Хутчэй бы скончылася ўсё гэта».

Наступнай раніцай з суседняй камеры да нас данесліся злосныя крыкі. Я зацікавілася і падышла да сцяны. Крыкі паўтарыліся яшчэ мацней. Сценка аказалася дашчатай,і ў ёй былі шчыліны. Я перамагла страх і прыпала да яе. Тое, што я ўбачыла, прымусіла мяне задрыжэць усім целам. У камеры было чацвёра: нямецкі афіцэр, перакладчык і два канваіры. Перад імі стаяў малады хлапец. Выгляд меў ён жудасны: увесь у крыві, пад вачыма сінякі, замест вопраткі матляліся адны лахманы. Раскудлачаныя валасы пасмамі звісалі на лоб. За яго спіной, на дзвярах камеры, была выразана пяціканцовая зорка. Паказваючы на гэтую зорку, афіцэр праз перакладчыка пытаў:

— Навошта ты гэта зрабіў?

Юнак маўчаў.

— Пан афіцэр,— прамовіў перакладчык,— гэты нягоднік не хоча адказваць. Паглядзім, што ён скажа, калі такая ж зорка з'явіцца на яго спіне.

Афіцэр махнуў галавой у бок салдат. Тыя, як сабакі, падскочылі да хлапца і схапілі яго за рукі. Ударам бота яны павалілі яго на падлогу і пачалі выразаць на плячы зорку. Хлапец застагнаў. Мне зрабілася жудасна, і я адвярнулася.

Калі ўсё сціхла, я зноў глянула ў шчыліну. Хлапец, сабраўшы апошнія сілы, прыўзняўся на руках і сказаў: «Бывайце, таварышы, я паміраю за Радзіму! Адпомсціце за мяне...»

Канваіры падхапілі яго, выцягнулі на двор і кінулі ў канаву, якая была за баракам.

Апоўдні пачуліся крыкі ў камеры з другога боку. Праз такую самую шчыліну я ўбачыла, што дапытвалі 80-гадовую бабульку. Немец на ламанай рускай мове гаварыў:

— Засталося 15 хвілін. Будзеш адказваць?

Бабулька маўчала. І зноў...

— Засталося 10 хвілін. Будзеш адказваць?

У адказ ні гуку.

— Засталося 5 хвілін....

І нарэшце:

— Засталася адна секунда. Будзеш адказваць?

А потым грозна крыкнуў:

— Узяць яе!

Тут пачалося такое, што і сказаць нельга. Ёй абрэзалі вушы, выкалалі вочы... Я не магла глядзець, а толькі чула стогны бабулі. Калі яна была мёртвай, яе труп выкінулі ў канаву, дзе ляжаў невядомы хлопец.

Праз дзень нас выпусцілі. Калі нам сказалі, што мы можам ісці дадому, мы не паверылі сваім вушам. Мы чакалі смерці, а нам кажуць: «Можаце ісці дадому». Некалькі секунд мы стаялі, як аслупянелыя. І толькі пасля таго, як нам прапанавалі ачысціць камеру, мама хуценька выйшла і я ўслед за ёю.

Вярнуўшыся ў атрад, мы пайшлі да камандзіра. Мама пра ўсё расказала яму і на чым свет стаіць пачала лаяць здрадніка Сазонава. Камандзір атрада перапыніў яе і сказаў:

— Дарэмна лаеш яго.

— Чаму дарэмна? — абурылася мама.

— Ваша шчасце, што там быў Сазонаў.

— Што вы гаворыце? — здзівілася мама.

Камандзір спакойна растлумачыў:

— Сазонаў не здраднік. Ён падпольшчык. І гэта ён дапамог вам вызваліцца.

Мы ўсё зразумелі. Мама вінавата сказала:

— А я так кляла яго...

— Ну, што ж, ад гэтага яму нічога не станецца,— сказаў камандзір.

Апрача таго, мы даведаліся, хто такая бабулька. Яна была маткай камандзіра партызанскай брыгады (прозвішча яго я цяпер не памятаю). Пад выглядам жабрачкі яна пайшла ў Рудзенск, каб сабраць патрэбныя звесткі аб нямецкім гарнізоне. Адзін здраднік пазнаў яе і данёс у паліцыю. Яе схапілі і замучылі.

Мы засталіся ў атрадзе. Праз некалькі дзён мы пачулі, што немцы расстралялі падпольшчыка Сазонава. Мама і я вельмі шкадавалі яго.

г. Мінск, *Поля Нікалаева*
вул. Іванаўская, 36 (1933 г.)

**НА ФАШЫСЦКАЙ КАТАРЗЕ**

У часе блакіроўкі немцы забілі маю маці. Мы, дзеці, разбегліся хто куды. Я далучыўся да трох партызан і разам з імі пачаў уцякаць. У Пціцкім лесе нас сталі даганяць немцы. Схавацца не было дзе, і я ўзлез на дрэва. Немцы ішлі ланцугом і ўбачылі мяне. Яны размахвалі рукамі і крычалі, каб я злазіў. Я не паслухаўся. Тады яны далі некалькі выстралаў. Паўз маё вуха празвінела куля. Я ўздрыгнуў, але

не крануўся з месца. «Хоць мяне і заб'юць, але злазіць не буду»,— рашыў я.

Тады немцы падсеклі елку, і я разам з ёю ўпаў на зямлю. Я так моцна ўдарыўся, што спачатку не мог гаварыць. Немцы схапілі мяне і прывялі ў бункер. Пачаўся допыт. Праз перакладчыка яны спыталі ў мяне, чаго я сюды хадзіў.

— Баяўся, што немцы заб'юць, і ўцякаў,— адказаў я.

— А чаму ты быў з партызанамі?

— Яны сказалі, што з імі мяне не заб'юць...

— А каб цябе і забілі, то на свеце не паменшала б людзей,— злосна сказаў перакладчык і падаў знак рукою. Мяне завялі за перагародку і пачалі біць бізунамі. Але нічога не даведаліся.

Мяне прывялі ў вёску Аносавічы і загадалі пільнаваць захопленых у людзей кароў. Я паспрабаваў уцячы, але гэта мне не ўдалося. Мяне злавілі, набілі, завезлі на аўтамашыне ў вёску Навасёлкі Капаткевіцкага раёна і пасадзілі за калючы дрот. Там ужо знаходзілася многа нашых людзей. Праз тыдзень нас пагрузілі ў вагоны, замкнулі і павезлі ў Германію. У нашым вагоне былі адны толькі хлопчыкі, і так многа, што мы ляжалі адзін на адным. Шэсць канваіраў сцераглі нас, як сабакі. Мы думалі, што нас вязуць на смерць, і рашылі ратавацца.

На першай станцыі канваіры адчынілі дзверы. Хлопчыкі, як па згавору, рынуліся ў дзверы, збілі немцаў з ног, пачалі выскокваць з вагона і разбягацца хто куды. Я сядзеў каля дзвярэй. Калі на мяне пачалі напіраць, я скокнуў і паваліўся на зямлю. Не паспеў узняцца, як на мяне пачалі падаць другія. Яны так прыціснулі мяне, што я не мог устаць. Калі яны разбегліся і я хацеў узняцца, да мяне падскочыў канваір, схапіў за каўнер і, ударыўшы нагою ў спіну, павалок назад у вагон. Пасля гэтага выпадку немцы больш не адчынялі вагоны.

Праз тыдзень нас выгрузілі ў Берліне і пагналі ў канцлагер. Тут нас пастрыглі і пасярод галавы выбрылі палоскі. На рукавах зрабілі нашыўкі, на штанах — зялёныя лампасы. У лагеры мы прабылі нядоўга. Адтуль нас перавезлі ў горад Лангельфельд. Мы апынуліся ў канцлагеры, высока агароджаным калючым дротам. У цёмных сырых бараках былі нары ў чатыры паверхі. У кожным з іх змяшчалася па чатырыста — пяцьсот чалавек. Дзеці знаходзіліся разам з дарослымі. Цесната была страшэнная. Кармілі нас вельмі дрэнна. На нагах мы насілі драўляныя калодкі. Часта нас цягалі на допыт. У мяне хацелі дапытацца, хто я такі, чым займаўся, дзе і за што мяне злавілі... Я гаварыў, што, калі палілі вёску, я ўцёк у лес, там мяне і злавілі.

З кожным днём я слабеў усё больш і больш. Хутка я адчуў, што мне прыйдзе канец, і рашыў уцякаць. Але зрабіць гэта было нялёгка: немцы пільна ахоўвалі лагер.

Аднаго разу ноччу я заўважыў, што дарослыя выдралі акно і пачалі вылазіць з барака. Я — за імі. За варотамі лагера мяне злавілі вартавыя і прывялі ў барак. На допыце спыталі, чаму я ўцякаў. Я сказаў:

— Мяне тут морацъ голадам, і я не мог больш цярпець...

За гэта мяне так збілі, што ўсё цела было чорнае. Я не мог падняцца. Мяне прынеслі ў барак і кінулі на нары. Уранні пачалі выганяць на работу, але ў мяне не было сілы ісці. Тады мяне паставілі ў сярэдзіну, між дарослымі, і пагналі на завод.

На заводзе мяне прыставілі да станка і паказалі, што і як мне рабіць. Я павінен быў штампаваць шайбы. Я націскаў кнопку, і машына прабівала ў шайбе дзірку. Нада мною стаяў наглядчык і пільна сачыў за маёй работай. Я не меў права ні азірнуцца, ні глядзець па баках. Даволі было гэта зрабіць, як наглядчык біў кулаком па карку і на ўсё горла крычаў:

— Фэстэр арбайт! Хутчэй працуй!

Рабочы дзень цягнуўся 12 гадзін, і за гэты час есці не давалі. Я так знясільваўся, што ледзь стаяў на нагах. Калі работа канчалася, нас строілі ў калону і пад канвоем прыганялі ў барак. Там нам давалі па 100 грам прэлага хлеба і па літру варанай і несалёнай крапівы. З'еўшы галодны полудзень, мы па званку валіліся на нары. Сеннікі, набітыя стружкамі, былі вельмі цвёрдыя. У іх вадзілася шмат насякомых. Нылі рукі і спіна. У галаву лезлі розныя думкі. Заснуць адразу не было ніякай магчымасці.

На золаку нас паднімалі і зноў пад канвоем гналі на завод. Калі хто не ўставаў ад знясілення ці недамагання, таго моцна білі і прымушалі ісці. Пры гэтым гаварылі:

— Няма чаго прытварацца.

На маіх вачах збілі Галавача Пецю, які так аслабеў, што не мог падняцца з нараў.

Рабочыя не вытрымлівалі і паміралі. Штодзённа з барака выносілі па 10—20 чалавек. Іх трупы грузілі на аўтамашыну, вывозілі за горад, у лес, і там закопвалі.

Праз некаторы час нас перавялі на другую работу — загартоўваць часці для самалётаў. Рабочыя не хацелі дапамагаць немцам і стараліся шкодзіць, як маглі. Яны то недагартоўвалі, то перагартоўвалі. Калі немцам удалося выявіць шкодніцтва, пачаліся допыты. У мяне імкнуліся даведацца, хто з рабочых гэта зрабіў. Я хоць ведаў, але не прызнаўся. За гэта мяне моцна адлупцавалі. Дарослых збівалі да смерці. Тонік Васіль не перанёс пабояў і назаўтра ж памёр. Нягледзячы на катаванні, рабочыя трымаліся дружна, і немцам не ўдалося выявіць, хто шкодзіў. Немцы ўзмацнілі нагляд, але і гэта не дапамагло. Рабочыя ўхітраліся шкодзіць і пасля гэтага.

Цяжка было ў канцлагеры. Жылі мы горш за скаціну. Я ўсё часцей і часцей успамінаў родны дом. «Эх,— думаў я,— каб хоць на хвілінку злётаць дадому, убачыць сваіх». Але гэта было немагчыма. Немцы пільна сцераглі нас і на кожным кроку гаварылі, што мы ўжо ніколі больш не вернемся на радзіму. Балюча было чуць гэта.

У пачатку 1945 года да нас у барак трапіў адзін наш ваеннапалонны баец. Убачыўшы яго, зняволеныя пачалі бедаваць. Тады ён ціха сказаў:

— Не бойцеся, хутка нас вызваляць.

— Адкуль ты ведаеш? — спыталі ў яго.

— Я быў разведчыкам,— сказаў ён і расказаў, што робіцца на франтах.

Ад яго мы даведаліся, што нашы ідуць на Берлін. Усе вельмі ўзрадаваліся: да гэтага часу мы нічога такога не чулі. Але некаторыя гаварылі, што нам усё роўна не мінаваць пагібелі.

— Нас ці пазабіваюць, ці папаляць,— казалі яны.

Мне чамусьці думалася, што я абавязкова застануся жывы і вярнуся дадому.

У канцы красавіка немцы забегалі. Потым пачалі праходзіць адступаючыя нямецкія часці. Наш завод быў замініраваны. У поўдзень сталі выводзіць здаровых людзей. Тыя, што не маглі хадзіць, засталіся ў бараку. Такіх набралася чалавек пяцьсот. Сярод іх быў і я.

Нас замкнулі, а барак падпалілі з двух канцоў. У бараку падняліся страшэнныя крыкі, плач. Людзі лезлі ў вокны, але канваіры спіхвалі іх назад. Я бегаў з аднаго канца ў другі, але выбрацца не мог. Потым і на сярэдзіне барака пачало прыпякаць. У адным месцы дашчаная сцяна зусім прагарэла і абвалілася. Я падумаў, што ўсё роўна загіну, і рынуўся ў гэтую дзірку. З гэтага боку канваіры не пільнавалі. Таму мне і ўдалося выскачыць з барака.

Калі я апынуўся на двары, на мне гарэла вопратка. Я хутка скінуў яе, і ўсё ж у мяне абгарэлі валасы, твар, рукі, ногі. Ад болю я не мог ісці і прысеў на зямлю. Тут наляцелі амерыканскія танкі і прагналі немцаў. Праз некаторы час усе, хто выратаваўся, адправіліся на радзіму.

Капаткевіцкі раён. *Андрэй Бараноўскі*
(1932 г.)

## ЗМЕСТ

А д с к л а д а л ь н і к а 3
У с т у п 4
В у с н а я н а р о д н а я т в о р ч а с ц ь 19

*Калыханкі*

Спі, дачушка, спі 19
А ты, коцік, не хадзі 19
Люлі-люлі-люлі, пайшоў кот па дулі 20
Люлі-люлі-люлі, прыляцелі куры 20
Баю-баю-баю-бай 20

*Забаўлянкі*

Сарока-варона 20
Ладу-ладу-ладкі 21
Кую-кую ножку 21
Гоп-гоп, і-га-га 21

*Песні*

Зайчык маленькі 21
Перапёлачка летавая 21

*Заклічкі*

Ідзі, ідзі, дожджыку 22
Божая кароўка 22

*Лічылкі*

Раз, два, тры, чатыры 22
Каціласяторба 22
Энікі-бэнікі 22

*Прыказкі і прымаўкі*

*Загадкі*

*Казкі*

Дзіва 24
Зайкіна хатка 26
Разумная дачка 27
Пану навука 32
Цудоўная дудка 34

**Паўлюк Багрым**

Зайграй, зайграй, хлопча малы... 36

**Францішак Багушэвіч**

Бог не роўна дзеле 38
Воўк і авечка 38
Калыханка 39

**Адам Гурыновіч**

Каток 40
Рыбак 40

**Цётка**

Сынок маленькі 41
Мой сад 41
Лес 42
Сіроцінка 43
Сварба 43
Журавель і Чапля 44
Міхаська 44

**Янка Купала**

Праз вайну 51
Адвечная песня *(Урывак)* 52
Зімой у лесе 54
Песня і казка 54
Сын і маці 55
Мароз 57
Кароль 58
Арлянятам 59
Піянерскае 60
Нашаму святу 61
Алеся 61
Хлопчык і лётчык 62

**Якуб Колас**

Вясна *(Урывак)* 64
Прылёт птушак 65
Дуб і чароціна 65
Восень 66
Зіма 67
Лета 68
Вясковая дарога 68
Два маразы 69
Мужык і пан 70
Цяжкая доля 71
Песня птушкі 71
Зіма 73
На рэчцы зімою 73
На лузе 75
У старых дубах 75
«Дзеравеншчына» 79
Песня аб вясне 82
Піянерская песня 82
Дзед-госць 83
Савось-распуснік 83
Рак-вусач 86
Страшнае спатканне 94
Міхасёвы прыгоды *(Урывак)* 99

**Максім Багдановіч**

Музыка 105
Зімой 105
Завіруха 105
Слуцкія ткачыхі 106

Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык 106

**Змітрок Бядуля**

Малыя дрывасекі 111
Дзе канец свету? 112
Юлька 115
Гаспадарка 120
Сняжынкі 120
Калыханка 120
Скарб 121
Музы́ка 124
У шалашы 126

**Алесь Гарун**

Добрыя дзеці 130
У прыпар 131

**Янка Журба**

Дзед Мароз 132
Коцік 132
Напрадвесні 132
Пастушок 133
Шпак 133
Пчолка 133
Першыя сняжынкі 133
Наша ёлка 134

**Алесь Гурло**

Мой край 134
Нашы птушкі 135

**Зоська Верас**

Сонейка грэе 136
На імяніны 136
Птушыная ёлка 136

**Кузьма Чорны**

Юзік і Ягорка 139
Насцечка *(Скарочана)* 141
Маленькая жанчына 156

**Уладзімір Дубоўка**

Як унук дзеду дапамог 161
Як сінячок да сонца лётаў 163
Чые рукі прыгажэйшыя 165
Праўдзівы хлопчык 167

**Міхась Лынькоў**

Міколка-паравоз *(Урыўкі)* 169
Васількі 181

**Андрэй Александровіч**

Наш дзень 186
Калыханка 187
Дашын карандашык 187
Лясная байка 188
Пра качак, шчупака і мячык Янука 188

**Янка Маўр**

Чалавек ідзе *(Урывак)* 189
Слёзы Тубі 194
ТВТ *(Урывак)* 198
Максімка 201
Шчасце 209

**Алесь Якімовіч**

Каваль Вернідуб *(Скарочана)* 211
Вераб'ёвы госці 219
Першае яечка 221
Апоркі 222
Чарнавочка 227

**Паўлюк Трус**

Журавель 231
Будзь гатовы, піянер! 231
Ой, з-за горкі... 232

**Пятрусь Броўка**

Мая Айчына 233
Родныя словы 233
А хіба ёсць, што забываюць? 234
А ты хоць дрэва пасадзіў?.. 234
Раніцу люблю 235
Надыход восені 235

**Пятро Глебка**

Беларусь 236
Наш сцяг 236
На рэчцы 237
Ягады 237

**Максім Лужанін**

Хто робіць пагоду *(Урыўкі)* 238
Снег 243

**Васіль Вітка**

Ленін 244
Мы будуем метро 244
Калыханкі, пацешкі, скорагаворкі, лічылкі, загадкі 246
Дударык 248
Вавёрчына гара 249
Дыялогі з унучкамі 258
Трывога ў Ельнічах 259
Лідачка і хмара 264

**Станіслаў Шушкевіч**

Лясная калыханка 266
Кузня 266

Казка-быль пра рэпку 267
Журавы 267
Колькі кіпцікаў у кошкі 267
Хрыпаты пеўнік 268
Ліса з магнітафонам 268
Дванаццаць пасланцоў 270
Смуткуючы, цвілі кветкі 271


**Сяргей Грахоўскі**


Агеньчык у акне 274
Ленінцамі вырасцем 276
Землякі 277
Жмуркі 277
Дзяцел 278
У лесе 278
Сонечная сцежка 278
Лета 279
Ласяня 279
Калыханка 279


**Алесь Пальчэўскі**


Акрайчык хлеба 280
Ліпка 283
Аля і Галя 284


**Тарас Хадкевіч**


Чырвоная зорка 286
На лыжах 291


**Эдзі Агняцвет**


Вочы майго дзеда 298
Хто пачынае дзень? 298
Край сяброў маіх 298
Першае слова 299
Параска і падказка 300
Скорагаворкі 300
Васіль Сяргеевіч 301


**Максім Танк**


Быліна 308
Піянерскі гальштук 310
Хлеб 310
Сняжынкі 311
А-а, А-а!.. 311
Галінка і верабей 311
Жук і слімак 312
Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні 313


**Міхась Калачынскі**


Прамень са Смольнага 316
Размова з жураўлём 317
Хачу падрасці 317
Раніца ў лесе 318


**Пятро Рунец**


Лёнева таполька 319
Сур'ёзная размова 320
Сланечнік 321


**Пімен Панчанка**


Заўсёды гатовы! 323
Дзеці вайны 324
Песня пра Мінск 324
Гальштук 325
Унучкам 325
Салодкая лячэбніца 326


**Іван Грамовіч**


Кавалачак хлеба 327
Жаваранак 331


**Іван Муравейка**


Залатая зорка 333
Начное сонейка 334
Як сеялі абаранкі 334
Два асілкі 334
Адмарозіў лапкі 335
Лясныя дактары 335
Лічылачка 335
Пра мышку і кніжку 335


**Паўлюк Прануза**


Добры дзень 336
Маміны рукі 336
Сонейка 337
Мыла 337
Мяккі знак 337
Чамуззяе вясёлка 337


**Мікола Гамолка**


Шлях адкрыты 338
Васілёва бярозка 340


**Анатоль Вялюгін**


Вецер з Волгі *(Урывак)* 342
Палац піянераў 343
Песня зялёнага дуба 345
Снегіры 346


**Аляксей Пысін**


Вясёлка над плёсам 347
Колькі сонцаў? 347
Грыбы 347
Якія бываюць дажджы 348
Пісьмо птушак 348
Кавылёк 349

**Віталь Вольскі**

Беларускае мора 355
Першы вылет 356
Верасень 358

**Кастусь Кірэенка**

Радзіма 360
Пад зоркай чырвонай 361
Вучуся ў таты 362

**Міхась Даніленка**

Боты-скараходы 363
Журка 364

**Янка Брыль**

Жыў-быў вожык 366
Лазунок 368
Ліпа і клёнік 374
Чым накармілі Мішутку 379

**Павел Кавалёў**

Дашын дзядуля 380
Дзіва-птушачка 383
Жыві сабе, зайчык! 384
Аддай прывітанне 386
Падзяка 386

**Алена Васілевіч**

Калінавая рукавічка 387
Доля знойдзе цябе *(Урыўкі)* 390

**Ніл Гілевіч**

Казачная зямля 395
Добры чалавек 395
Зёлкі 396
Вітаю вясну 396
Святлафор 397
«Ветлівы» хлопчык 397
У лузе 398
Зімой у лесе 398
Загадкі 398

**Еўдакія Лось**

Радзіма 400
Вуліца Берасцянская 400
Рукавічкі 400
Дажджынка 401
Смачныя літары 401
Чорны дзятлік 401
Ад дуба да дуба... 401
Казка пра Ласку 402

**Уладзімір Юрэвіч**

Нястрашны страх 405
Дзе начуе сонца 406

**Алег Лойка**

У зімовым лесе 409
Верабейчык 409
Пасля навальніцы 409
Суніцы 410
Дзе начуе сонца 410
Спрытны ўнучак, як каўбой... 410

**Артур Вольскі**

Красавік 411
Караблікі 412
Чарнічка 412
Пра кавалёў і каралёў 413
І я хачу служыць 413
Дабяруся да нябёс 414
Калыханка 415
Ад А да Я прафесія мая 415

**Ядвіга Бяганская**

Пашына радасць 417
А на Шушы дзіва дзіўнае 419
Мінькаў заяц 421

**Васіль Хомчанка**

Дарагі падарунак 422
Чырвоны мак 424
Салдацкая крыніца 425
Паклон 426
Цвік 426
Венікі 427

**Рыгор Барадулін**

Свята нашых свят 428
Колькі раніц месціць ранец? 428
Вінаваты тут не сшыткі 429
Сем янотаў 429
Рэгуліроўшчык 430
На шашы і ля шашы 430
Як восень дрэвы ашукала 431
Азбука не забаўка 431
Калыханка 434

**Васіль Зуёнак**

Поле 435
Зоркі выпалі ў бары 435
Будзем сілы набірацца! 435
Загадкі 436

**Уладзімір Караткевіч**

Кацёл з каменьчыкамі 437
Чортаў скарб 441

**Іван Навуменка**

Вайна каля Цітавай копанкі *(Урывак)* 445
Балотца між лесу 450

**Павел Ткачоў**

Вішнёвая квецень 452
Наказ 454

**Барыс Сачанка**

Хлеб 457
Кошык малін 458
Бабка Адарка 459
Насцечка 459

**Вісарыён Гарбук**

Незнарок і знарок 461
Такіх кветак не бывае 462
Не было б і сонца 462
Алачка-забывалачка 464
Горад без папугайчыкаў 465

**Анатоль Грачанікаў**

Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара 471
Планета дзяцей 474
Дружбакі 474
Беларускія краявіды 475

**Павел Місько**

Прыгоды Бульбобаў *(Урывак)* 476
Маміна мама 479

**Мікола Чарняўскі**

Май 481
Зорачка-пяцёрачка 482
Зязюлька 482
Лугавая казка 482
Клятва Марата Казея 483

**Данута Бічэль-Загнетава**

Наша Радзіма 484
Сонца, вецер і Свіцязь 484
Нёман 484
Унучак Лёнік 484
Страказа і жабка 485

**Аваяр'ян Дзеружынскі**

Васілёк 485
Хлебная скарынка 486
Коцікі 486
Пралеска 486
Журавінка 486
Брусніца 486
Добрае сэрца 487
Верасень 487

**Іван Сяркоў**

Мы з Санькам у тыле ворага *(Урыўкі)* 488
Мы — хлопцы жывучыя *(Урывак)* 494

**«Ніколі не забудзем»** 499

Учебное издание

**ХРЕСТОМАТИЯ ПО БЕЛОРУССКОЙ ДЕТСКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ**

Составитель **Шавловская** Мария Федоровна

Минск, издательство «Вышэйшая школа»

На белорусском языке

Вучэбнае выданне

**ХРЭСТАМАТЫЯ ПА БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

Складальнік **Шаўлоўская** Марыя Фёдараўна

Рэдактар А. І. Марчанка
Малодшы рэдактар Р. А. Маслоўская
Мастак вокладкі Л. А. Паляшчук
Мастацкі рэдактар У. І. Шолк
Тэхнічны рэдактар І. П. Ціханава
Карэктар Л. А. Шлыковіч

ІБ № 2857

Здадзена ў набор 30.08.88. Падпісана да друку 27.02.89. Фармат 60×90 /16. Папера кн.-журн. Гарнітура звычайная новая. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 32. Умоўн. фарбаадбіт. 32. Ул.-выд. арк. 34,95. Тыраж 45 000 экз. Заказ 1787. Цана 1 р. 50 к.

Выдавецтва «Вышэйшая школа» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220048, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005. Мінск, вул. Чырвоная, 23.

1 р. 50 к.

# ХРЭСТАМАТЫЯ
*па беларускай дзіцячай літаратуры*